Канстанцін Мерляк

# Дзейнасьць Кастуся Мерляка на эміграцыі



Constant Mierlak

# Activity of Constant Mierlak in the Emigration.

## Penetrating and Practical Approach

In Belarusan

New York — 1992

Канстанцін Мерляк

# Дзейнасьць Кастуся Мерляка на Эміграцыі

Праніклівасьць і практычны падыход

Нью Ёрк — 1992

Copyright © by Autor
Library of Congress Cathalog Card Number 92-60535

Printed in the United States of America by "Polacak"

Сягоньняшнія кнігі —
гэта заўтрашнія справы.

Гэнрых Манн

Полацак



Партрэт работы Сямёна Геруса

# Прадмова

Праца-ўспаміны Кастуся Мерляка ёсьць гісторыя беларускай эміграцыі, што пачалася пасьля другой сусьветнай вайны. Яна вяжацца да падзеяў своеасаблівых, хоць і цэнтральных па значэньню. (Ёсьць іншыя працы-апісаньні мясцовага лягернага жыцьця беларусаў у Нямеччыне, беларускіх інстытутаў альбо арганізацыяў на эміграцыі. Рыхтуецца праца па агульнае гісторыі беларускай эміграцыі. У былой БССР афіцыяльная кліка старалася замоўчываць аб сьведамай беларускай эміграцыі. Часта ў друку паяўляліся паклёпы на «здраднікаў радзімы» ды «злачынцаў», пісалася аб эміграцыі нясьведамай.)

Дзейнасьць Кастуся Мерляка верціцца з галоўнай плыньню беларускай эміграцыі 1945-1990 гадоў і яго асабісты ўдзел у галоўным рэчышчы падзеяў. Гэтаксама адлюстраваны ўплыў аўтара, сваёю ініцыятываю й дзейнасьцю, на ход некаторых падзеяў. Варта адзначыць удалы збор дакумэнтацыі беларускіх эміграцыйных інстытуцыяў, арганізацыяў, клюбаў і іншых групаваньняў; улік важнейшых зьездаў, спатканьняў, сьвяткаваньняў, паседжаньняў. А таксама азначэньне ўсяго гэтага дакладнымі датамі, пералікамі прозьвішчаў асобаў кіраўнікоў ды цэлых упраў, кірунак дзейнасьці аўтара ў структуры кіраўніцтва беларускаю эміграцыйнаю палітыкаю, наагул, і з Радаю БНР у прыватнасьці.

Першыя спробы сваіх арганізатарскіх і лідэрскіх сілаў К.Мерляк спрабаваў у Аргентыне (1947-1954). Як відаць з вынікаў, гэта быў прыроджаны выбух здольнасьці й энэргіі. Адзін чалавек перамог горы цяжкасьцей: малую сьведамасьць беларускай эміграцыі й моцную савецкую агентуру. Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне стала моцнай арганізацыяй, а беларускае імя заваявала месца ў урадавых і інтэрнацыянальных колах. Беларускі эўрапейскі цэнтр (БНР) быў абнадзеяны, што, нарэшце, у Паўдзённай Амэрыцы беларуская справа стала на ногі.

Аднак найбольш праявілася асоба К. Мерляка ў ЗША. Хоць Прэзыдэнт БНР быў у Эўропе, цэнтрам беларускага эміграцыйнага жыцьця (крывічоў) стаўся Нью Ёрк. Падмацаваў гэты цэнтр, трэба сказаць, якраз К.Мерляк, што пераехаў з Аргентыны ў 1954 годзе.

У ЗША, асабліва ў Нью Ёрку, пасьля другой сусьветнай вайны сабралася як эліта, так і ладная грамада сьведамых беларускіх эмігрантаў. Тут паўстала Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне ў Амэрыцы, пачала працаваць Беларуская Праваслаўная Аўтакефальная Царква, зарганізаваліся беларускія вэтэраны, беларуская моладзь ды іншыя арганізацыі. І гэтаму ўсяму Рада БНР спрабавала даць беларускі «сапраўдны» кірунак.

Недалёка ад Нью Ёрку (каля 40 міль) у Саўт Рыверы, Нью Джэрзі зьявіўся другі беларускі цэнтр (зарубежнікаў), дзе БЦР «натхняла» сваіх эмігрантаў. Размахам лідэраў і людзей гэты цэнтр быў меншым .

Упамянуты Нью-Ёркскі цэнтр бээнэраўцаў у 1954 годзе быў даволі свабодны, ня шмат хто пачуваўся да абавязкаў. І царква патрэбная, і арганізацыі патрэбныя, але-ж гэта ўсё трэба рабіць бясплатна, траціць час, людзі вымогі ставяць, дый свайго будынку няма. Часта бывала, што на паседжаньні нават сябры ўправы не хацелі прыходзіць. А перавыбарчых сходаў многія цураліся, бо возьмуць і выбяруць у кіраўніцтва.Тады што? Цягні лямку! Калі хто прыехаў новы, неасьведамлённы із сытуацыяй, дык адразу пападаў у кіраўнікі арганізацыі (ці ён падыходзіў, ці не). З прыездам К. Мерляка сытуацыя зьмянілася.

К.Мерляк зь сям'ёю прыехаў у Нью Ёрк 29 ліпеня 1954 году. Чалавеку 35 год, поўны энэргіі, добрых намераў. І трапіў у беларускі цэнтр, дзе аб яго дзейнасьці столькі пісалі ў нашай прэсе. Маючы ўжо зроблены капітал у Аргентыне, быў прыняты з адкрытымі душамі, чуўся як дома. Ён даволі хутка пазнаёміўся зь людзьмі, зь беларускімі ўстановамі й арганізацыямі. Заўважыўшы, што ў цэнтры ёсьць шмат недацяжкаў і нязробленае работы, пачаў плянаваць, каб неяк вывесьці беларускую калёнію Нью Ёрку ў людзі. Бо й маліцца не было свайго кутка ды не было, дзе прытуліцца беларускім арганізацыям.

Зразумела, што з прэзыдыюму Рады (куды К.Мерляк быў датарнаваны) дарога вяла ў цэнтральныя арганізацыі. Дык чалавеку дзейнаму гэта й ёсьць галоўнае поле дзейнасьці. У дадатак, тут якраз патрэба была дапамога, асабліва прэстыж сяброўства й прэстыж кіраўніцтва. Сябры арганізацыяў ня бачылі кіраўнікоў, што хацелі з энтузыязмам працаваць, праводзіць у жыцьцё беларускія

й жыцьцёвыя патрэбныя справы. Гэтак вельмі хутка К.Мерляк стаўся сябрам БАПЦ, БАЗА й адфільяваных пры БАЗА арганізацыяў. А як праніклівы, каб ведаць, як справы йдуць, як іх палепшыць, ён стараўся ўсюды быць, усюды браць голас, а пры патрэбе ставіць упрокі й вымогі, калі гэта было на карысьць беларускай справе. Як адна асоба выказалася: «Калі Мерляка не пускаюць праз дзьверы — улазіць праз вакно».

Добраю рысаю К.Мерляка, як кіраўніка й дыплямата, была пранікліваськць у амэрыканскае асяродзьдзе ды навядзеньне знаёмстваў з вартаснымі асобамі палітычнага сьвету. Тое-ж самае—навязаньне зносін зь міжнароднымі арганізацыямі й іх кіраўнікамі. Здольнасьць знаёміцца ўвяла пазьней К.Мерляка ў шырокае кола высокапастаўленых асобаў у Вашынгтоне, а гэта дало мажлівасьць рабіць пашырэньне беларускага імя на амэрыканскім і інтэрнацыянальным узроўні.

Якасьці прыроджанага лідэра: жыцьцёвая схільнасьць працаваць ў арганізацыях, працавітасьць, здольнасьць сужыцьця зь нізамі й вярхамі, лёгкасьць навязаньня знаёмстваў і тонкі нюх палітычнае атмасфэры,—зрабілі К.Мерляка ў Нью Ёрку цэнтральнаю асобаю беларускага арганізаванага жыцьця. Ад старшынства акруговай управы БАЗА дайшоў да старшыні Галоўнай Управы. А як кардынальная асоба масавай арганізацыі, ён уплываў на ўсё беларускае грамадзкае й рэлігійнае жыцьцё. Дзякуючы ягоным намаганьням, пошукамі й сувязямі з адпаведнымі дзелавымі людзьмі, даволі хутка быў куплены будынак для царквы й прытулак для беларускіх арганізацыяў.

За нейкіх чатыры—пяць гадоў побыту К.Мерляка ў ЗША беларускае арганізаванае жыцьцё памысна разьвівалася. Пашырэньне беларускага імя ў палітычных колах сапраўды выплыла на дзённае сьвятло. К.Мерляк трапіў праз свае знаёмствы ў вашынгтонскія палітычныя кулуары, а таксама ў мясцовыя ўстановы. Звычайна, пры сьвяткаваньнях угодкаў 25 Сакавіка амэрыканскі кангрэс і сэнат шырока камэнтаваў беларускую нацыянальную праблему ды прыймаў беларускія дэлегацыі.

Усё ішло добра й памысна разьвівалася, прадбачваўся добры вынік на будучыню. Але ў пачатку 1950-х гадоў Стэйт Дэпартмэнт ЗША зарганізаваў Амэрыканскі камітэт вызваленьня. Мэта яго была

«вызваляць» народы, паняволеныя камуністычнымі рэжымамі. Гэта быў адказ ЗША, асабліва Савецкаму Саюзу, за пасяганьні Масквы на інтарэсы Амэрыкі й Заходняга сьвету наагул. Амэрыканскі камітэт вызваленьня арганізаваў тады радыё «Вызваленьне» ды Інстытут для вывучэньня СССР у Мюнхене. БНР на чале з прэзыдэнтам М.Абрамчыкам навязала супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам і атрымала Беларускую сэкцыю на радыё, а таксама працоўныя месцы ў Інстытуце. Праца пачалася, і усё выглядала прыстойна.

Усё-ж, тады мелася наўвеце, што можа паўстаць канфлікт паміж Савецкім Саюзам і Амэрыкай (ці Захадам). А як Савецкі Саюз шматнацыянальны, дык трэба было заангажаваць большыя нацыянальнасьці на эміграцыі ды ўстанавіць, як яны будуць вызваляцца ад камунізму ў СССР. Ад расейскага боку былі прадстаўлены пяць партыяў і па адным прадстаўніцтве ад іншых народаў на перамовы. Зразумела, што Амэрыканскі камітэт (ці Стэйт Дэпартмэнт) вёў палітыку русафільскую й падтрымоўваў расейцаў. Прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцей хацелі, каб расейцы (як і Амэрыканскі камітэт) згадзіліся адразу на іхнюю незалежнасьць пасьля перамогі над камунізмам. Але расейцы не гадзіліся. У іх быў адзін адказ: перш перамагчы камунізм, а пасьля будзем гаварыць аб незалежнасьці. Гэта значыць—наперад нічога не вырашаць. (Расейскае слова «не предрешать»). Адсюль усе гэтыя перамовы з Амэрыканскім камітэтам і той пэрыяд прыняў назоў «непрадрашэнства».

У пэрыядзе непрадрашэнства Амэрыка даволі шчодра фінансавала староны, што прыступілі дамаўляцца, як яны будуць вызваляцца. Аднак прэзыдэнт М.Абрамчык із сваімі блізкімі дарадчыкамі лёгка пайшлі на супрацоўніцтва. І Амэрыканскі камітэт ня бачыў патрэбы даваць больш грошаў на беларускую працу эмігрантам, бо яны й бяз гэтага згадзіліся, што перш трэба перамагчы камунізм, а незалежнасьць Беларусі прыйдзе пасьля. Расейцы атрымалі вялізныя сумы за непрадрашэнства: у 1953 г. мільён даляраў толькі на «Чеховское издательство» ў Нью Ёрку, а сколькі на дзеяньне партыяў? Іншыя нацыянальнасьці, асабліва цюрскія народы, атрымоўвалі вялікія сумы таму, што былі ў апазыцыі да непрадрашэнства, іх Амэрыканскі камітэт проста хацеў купіць.

У часе непрадрашэнства К.Мерляк, які арыентаваўся ў палітыцы Амэрыканскага камітэту й амэрыканскай палітыцы наогул, за-

няў пазыцыю рэальнага падходу з боку БНР як фармальнага, так і практычнага. Па-першае, прынцып БНР—гэта незалежнасьць Беларусі, і прэзыдэнт не павінен непасрэдна вязацца з непрадрашэнствам. Па-другое, калі Амэрыканскі камітэт раздае грошы, дык чаму не стварыць апазыцыю да беларускага прадстаўніцтва (якое дамаўляецца з Амэрыканскім камітэтам), каб гэткім чынам атрымаць грошы на дзейнасьць сваіх арганізацыяў (выданьне газэтаў ці часапісаў), г.зн., каб Амэрыканскі камітэт пачаў апазыцыю падкупляць.

У 1960 годзе, вонкі сэсыі Рады БНР К.Мерляк пастанавіў пагаварыць на тэму «апазыцыі» з прэзыдэнтам М.Абрамчыкам сам-насам. Вынікам гутаркі было, што прэзыдэнт «падумае аб гэтым і адкажа К.Мерляку». Ад гэтае гутаркі К.Мерляк стаўся «ворагам народу» у БНР. Прэзыдэнт Абрамчык і група даверу выдалі прысуд Мерляку: здрада кірунку БНР. Пастанавілі адсунуць гэтага пасягальніка на ўладу з кіраўнічых становішчаў як БНР, так і ўсіх ейных арганізацыяў. І пайшло ўсё ўверх дном! Наступныя гады былі часам пазбаўленьня К.Мерляка права кіраваць беларускім палітычным, грамадзкім і царкоўным жыцьцём.

Гэта была самая неабдуманая й блізарукая палітыка М.Абрамчыка й яго дараднікаў. Яна прывяла да дэзарганізацыі ў Радзе БНР, падзел у Ньюёркскім аддзеле БАЗА, цывільны суд БАПЦ і падзел прыходу ў Брукліне, Нью Ёрк. У выніку царкоўнага суду ў 1968 г. БАПЦ пачала ізноў судзіцца ў 1980 годзе й пакуль не відаць пазытыўнага выніку.

У міжчасе, ад 1968 году, К.Мерляк і людзі, што адчувалі правільнасьць яго дзеяньня, зарганізаваліся ў Беларуска-Амэрыканскае Аб'яднаньне ў Нью Ёрку, арганізавалі новы праваслаўны прыход у Рычмон Гіл, Нью Ёрк, збудавалі новую царкву й незалежна ад нікога моляцца й працуюць. А галоўнае, пазбавіліся сварак, інтрыгаў і непатрэбнае валакіты.

Ад часу, калі я пазнаў К.Мерляка, аж да сёньня, я ўпэўніўся ў адной справе: за што-б ён ні браўся, было зроблена; да каго-б ў арганізацыях ён ні зьвяртаўся, каб нешта было выканана, было выканана, ніхто не адмаўляў нэгатыўна. Каб асоба карысталася падобнымі здольнасьцямі ці аўтарытэтам, яна мусіць мець у сабе задаткі калі ня генія, дык чалавека, народжанага лідэрам, кім, я лічу, ён і ёсьць.

Тое, што сталася пасьля гутаркі К.Мерляка з прэзыдэнтам М.Абрамчыкам «сам-насам» у 1960 годзе, прайшло, рэч непаваротная. Аднак над гэтым можна разважаць і даходзіць да пэўных высноваў: як трэба й як ня трэба рабіць. Хоць тут вяжацца пытаньне аднаго чалавека (К.Мерляка) й выглядала-б нязьменных людзей няма, усё-ж агульная справа пацярпела ў лягеры крывічоў. І пацярпела настолькі, што сёньня (ужо 20 год) церпяць БНР, арганізацыі й, асабліва, БАПЦ, бо ня могуць выбрацца із зачараванага кола. Браў-бы удзел пасьлядоўна ў гэтым арганізованым жыцьці К. Мерляк, напрошваецца адказ, ўсё было-б лепш. Але так ня сталася.

Дарагія чытачы! Далей перад Вамі кніжка Кастуся Мерляка. Яна напісана адкрыта й шчыра: аб сабе, сваёй дзейнасьці, аб дакладным прабегу часу ў жыцьці беларускай эміграцыі (1945-1990 гг.). Лёгка чытаецца й асабліва павучальная.

**Васіль Шчэцька.**
**Рычмонд Гіл, 28 сьнежня 1991 г.**

# Частка першая

# Паходжаньне — мясцовасьць

Канстанцін Мерляк нарадзіўся ў вёсцы Дзетамля 25 сьнежня 1919 году. Вёска Дзетамля мела ў 1932 годзе каля 40 двароў, якія былі раўнамерна распаложаныя па абодвух бакох вуліцы.

Пасьля камасацыі ў 1932—1933 гадох дамы ў вёсцы парадзелі, бо, прынамсі, адна трэцяя гаспадарак перабралася на хутары. Сям'я Кастуся таксама перабралася ў 1934 годзе на хутар за рэчку, якая ўпадала ў Нёман. Вёска Дзетамля, як і навакольныя чатыры вёскі, была спаленая немцамі ў сьнежні 1942, пад час акцыі супраць партызанаў. Пасьля вайны, пачынаючы ад восені 1944 году, вёска Дзетамля паволі пачала адбудоўвацца ў тым самым парадку, у якім знаходзілася перад вайною. Яна акружаная лясамі. З аднога боку—лесам графа О'Рурке. Паводля мясцовай легенды, граф О'Рурке быў ірляндзкага паходжаньня. Ён дастаў у гэтым раёне ў падарунак вялікі маёнтак ад цара Аляксандра I за спаленьне маста на рацэ Бярэзіна падчас адступленьня арміі Напалеона з-пад Масквы ў 1812 годзе. З другога боку вёска была акружаная лясамі, якія належалі да гаспадароў вёсак Дзетамля, Пудзіно й Васілевічы.

Вёска Дзетамля геаграфічна знаходзіцца ў 4 км ад Нёмана, 4 км ад вялікае вёскі Аціьмінава, 12 км ад Бярозаўкі над Нёманам, у якой пабудаваная вялікая сусьветнай славы шкляная гута «Нёман», 22 км ад мястэчка Іўя, 12 км ад мястэчка Ўселюб, дзе пры Польшчы знаходзіліся гміна, паліцыя, праваслаўная царква, каталіцкі касьцёл, рэзыдэнцыя графа О'Рурке, каса Стэфчыка, бровар і нямала жыдоўскіх крамаў, а таксама ў 24 км ад горада Наваградак.

Адрас пры Польшчы быў: Wies Dzietomla gmina Wsielub
powiat Nowogrodzki, woj. Nowogrodzkie.

Адрас сучасны: Рэспубліка Беларусь,
Горадзенская вобласьць, Наваградзкі раён.
сельсавет Аціьмінава, вёска Дзетамля

# Паходжаньне —Радня *

Прозьвішча Мерляк або Мярляк пісалася ў розным часе й краінах як Mierlak, Merlak, Marlak, Merlack. Прозьвішча Мерляк ня ёсьць распаўсюджаным у Беларусі, і ягонае глыбейшае паход - жаньне няведамае. Аднак установлена, што ў 1861—1863 гг. два браты: адзін зь якіх Несьцер, (другога імя няведама) атрымалі надзел зямлі, даны царом, Аляксандрам II.

Несьцер атрымаў свой надзел з аднаго канца вёскі, а ягоны брат з другога. Такім чынам, у Дзетамлі стварыліся дзьве лініі сем'яў Мерлякоў.

Вінцусь Мерляк, другі сын Несьцера (а іх было трох), дзед Кастуся, быў жанаты з Аксіняй Кірэл зь вёскі Воркавічы. Яны мелі трох дзяцей: Анну (цётка Кастуся), Ільлю (бацька Кастуся) й Юрыя (дзядзька Кастуся).

Ільля, сын Вінцуся й бацька Кастуся, нарадзіўся 2 жнівеня 1886 году (па новаму стылю ў дзень прарока Ільлі), а памёр 1 сакавіка 1971, пражыўшы 85 гадоў. Ён закончыў Наваградзкае «городское училище» й да вайны 1914 году быў настаўнікам мясцовай школы. З пачаткам першай сусьветнай вайны быў змабілізаваны ў Расейскую армію. У арміі служыў інтэндэнтам, займаючыся даставай вопраткі, прадуктаў і зброі для войска на нямецкім фронце. У 1918 годзе, па загаду Рэвалюцыйнага Камітэту, Ільлю арыштавалі ў Пецярбурзе за тое, што супраць загаду бальшавікоў здаць ім эшалон зброі, ён адправіў яго на фронт. За гэта яго й ягоную каманду меліся паставіць пад расстрэл, але Ільлі ўдалося ўцячы ды схавацца ў пляменьніцы жонкі, якая жыла ў Пецярбурзе.

Вярнуўшыся ў Дзетамлю, Ільля заняўся сваёю гаспадаркаю. Бацькоўскі надзел быў падзелены з братам Юрыям, які ў 1932 годзе выэміграваў у Бразылію з ўсёй сям'ёю (бо гаспадарка ня была вялікай). Старэйшы брат Ільлі й Юркі, Янка, памёр у маладым веку.

Акрамя надзелу зямлі была, як называлі, «купча», 10 дзесяцін (прыблізна 14 гэктараў) лесу недалёка ад Нёмана. Гэты лес быў ас-

---

* A Genealogy of the Mierlak Family, by Constant Mierlak, New York, 1980

наўным жаралом грашовага даходу. Лес Ільля прадаваў патроху, кожны год на «папяроўкі» (ёлка ішла на паперу) і сплаўляў Нёманам за граніцу. Алешына дастаўлялася ў Бярозаўку на формы шкляных вырабаў у гуце «Нёман». Да гэтага яшчэ даходзіў даход з продажу семя лёну й адкормленых парсюкоў.

Пад Польшчай Ільля быў радным гміны Уселюб, здаецца, толькі адну кадэнцыю і солтысам вёскі Дзетамля некалькі кадэнцыяў да верасьня 1939 году.

Вольга Цехановіч, дачка Антона, жонка Ільлі (яны пажаніліся ў 1912 годзе) і маці Кастуся, нарадзілася ў 1890 годзе ў вёсцы Яўсевічы каля Вераскава, Любчанскага раёну Горадзенскай губэрні. Памерла 25 кастрычніка 1942 году, пражыўшы 52 гады. Вольга была наймалодшая ў сям'і, мела двух братоў: Аляксандра й Юліяна й чатырох сясьцёр: Анну, Антаніну, (дзьвюх сёстраў імёны нявედамыя).

Ільля й Вольга мелі пяцёра дзяцей: Аўгена, Канстанціна (Кастуся), Івана, Алену (яе клікалі Лёлька) і Мікалая.

Старэйшы брат Кастуся Аўген памёр у 1929 годзе, пражыўшы ўсяго 15 гадоў.

Іван, малодшы брат, нарадзіўся ў Дзетамлі ў 1921 годзе. Скончыў паўшэхную школу пры Польшчы. У 1944 годзе яго змабілізавалі ў Чырвоную армію. На паўдзённым фронце ён браў удзел у штурме Будапэшту й Вены. Пасьля вайны ў канцы 1946 году ажаніўся з Стэфаніяй Грушай. Зараз жыве ў Дзетамлі. Працаваў у калгаснай кузьні. (Калгас у Дзетамлі быў сарганізаваны пасьля вайны. Ён абдымаў яшчэ другія 4 вёскі з упраўаю ў вёсцы Ацьмінава).

Іван і Стэфа маюць чацьвёра дзяцей: Тамару, Ірэну й Канстанціна (яны блізьняты) й Аўгена.

Тамара скончыла пэдагагічны інстытут, пражывае ў Бярозаўцы. Ірэна закончыла гандлёвы інстытут ў Маскве. Там выйшла замуж за аднаклясьніка Капітанава й цяперака жыве зь сям'ёй у Гомелі.

Канстанцін закончыў афіцэрскую школу, ажаніўся й служыць у войску, недзе ў Сібіры, у ранзе палкоўніка. Паводля ліста ягонага бацькі, яму не падвышаюць рангі дзеля таго, што ягоны дзядзька Кастусь пражывае ў Злучаных Штатах Амэрыкі.

Аўген, наймалодшы сын Івана, закончыў гаспадарчы інстытут у Горадні. Адбыў два гады службы ў войскуй працуе аграномам.

Алена (Лёлька) Сосік, сястра Кастуся, нарадзілася 12 чэрвеня 1923 году ў Дзетамлі, дзе хадзіла ў мясцовую школу. Выйшла замуж у 1943 годзе за аднавяскоўца Івана Сосіка. Калі ў 39-м прыйшлі Саветы, ён з сваім братам Уладзімірам выехаў у Польшчу й жыў у Варшаве. Вярнуўся дадому восеньню 1941 году пасьля заняцьця Беларусі немцамі. Іван быў змабілізаваны ў Савецкую армію й быў ранены на фроньце. Пасьля вайны працаваў у калгасе загадчыкам мэханічнай кузьні, дзе з сваім шваграм рамантавалі калгасныя прылады. Алена й Іван Сосік мелі чацьвёра дзяцей: Барыса, Данілу, Аляксандра й Ільлю.

Барыс, першы іх сын, нарадзіўся у 1944 годзе, а ягоным хрышчоным бацькам быў дзядзька Кастусь. Хлапец памёр 24 чэрвеня 1956 году, пражыўшы ўсяго 14 гадоў. Даніла нарадзіўся ў 1949 годзе. Па заканчэньні савецкай дзесяцігодкі хацеў паступіць у ваенна-марскую школу, але яму адмовілі із-за таго, што яго дзядзька Кастусь жыве за граніцаю. Аднак ён закончыў Маскоўскі ўнівэрсытэт і дастаў дыплём інжынера гэалёгіі. Ажаніўся з украінкаю Ленай, мае сына Андрэя, народжанага ў 1972 годзе, і дачку Волю, народжаную ў 1983. Даніла жыве й працуе ў Крывым Розе, Днепрапятроўскай вобласьці на Ўкраіне.

Аляксандра (Шура) Быкава, пляменьніца Кастуся, нарадзілася ў 1952 годзе ў Дзетамлі. Яна закончыла Ленінградзкі ўнівэрсытэт і атрымала ступень інжынера біяхіміі. У 1975 годзе вышла замуж за Сяргея Быкава, інжынера электронікі. Маюць дваіх дзяцей: Антося й Кацярыну. Пражываюць у Выбаргу, што каля Санкт-Пецярбургу.

Ільля, наймалодшы сын Алены, народжаны ў 1955 годзе, закончыў гаспадарчы інстытут у Горадні, адслужыў два гады ў арміі й працаваў у калгасе аграномам. У жніўні 1986 года, калі быў на вакацыях у свайго брата Данілы ў Крывым Розе на Украіне, памёр зь няшчаснага выпадку на возеры.

Мікалай Мерляк, наймалодшы брат Кастуся, памёр ва Ўселюбе 16 лістапада 1942 году, маючы ўсяго 10 гадоў.

Жыцьцё Мерлякоў не было лёгкае, асабліва пасьля вызваленьня Заходняе Беларусі Саветамі. Адразу-ж пачалася нагонка жыхароў Дзетамлі ў калгас. Толькі сяляне не сьпяшылі ісьці ў яго, і мясцовая ўлада ня здолела зарганізаваць калгас да нямецка-савецкае вайны.

Пасьля году нямецкай акупацыі паявіліся ў навакольных лясох партызаны. У сапраўднасьці гэта былі спачатку малыя групы бандытаў—грабежнікаў, арганізаваныя астаткамі Савецкае арміі, якія не пасьпелі ўцячы перад наступам немцаў. Гэтыя банды пад імем «партызанаў» ніякай акцыі супраць немцаў не праводзілі, а толькі займаліся рабаваньнем і тэрорам мясцовага насельніцтва.

Восеньню 1942 году бандыты зрабавалі й спалілі гаспадарку сям'і Сымона Сосіка, якая два дні перад наступам немцаў была арыштаваная праз НКВД і вывезеная ў Сібір. У гэтую ноч бандыты зрабавалі сям'ю Кастуся й пабілі яго матку за тое, што яна бараніла сваю неабходную вопратку. Кастусь, даведаўшыся пра гэта, прыехаў зь Ліды й з аддзелам ўселюбскае міліцыі забраў сваю сям'ю й усё, што было магчыма, з Дзетамля ды перавёз сваіх жыць у мястэчка Ўселюб.

Летам 1944 года пасьля другога «вызваленьня» Саветамі, Ільля Мерляк з дачкою Аленаю й унукам Барысом вярнуліся ў Дзетамлю, там збудавалі зямлянку, у якой жылі да павароту з вайны сына Івана й зяця Івана Сосіка. Сын пабудаваўся на папялішчы, на хутары, а зяць — на сваёй зямлі з краю вёскі.

Пасьля вайны было вельмі цяжкое жыцьцё, але дзякуючы таму, што Ільля працаваў кладаўшчыком у калгасе й меў магчымасьць хоць жменю зерняў прынесьці ў кішэні да дому, сям'я неяк выжыла.

Прамежак часу між 1927 і 1935 гадамі ня быў цікавы ў жыцьці Кастуся й няшмат цікавых падзеяў засталося ў яго памяці. Аднак важнейшыя падзеі, якія засталіся ў памяці й у большай меры ўплылі на фармаваньне яго характару, тутака адзначым.

Кастусь пайшоў у школу ў 1927 годзе. Беларускую мову выкладаў настаўнік Коршун, але нядоўга. На другі год прыехала з Станіслававa маладая настаўніца Марыя Гэйслерувна й пачала вучыць па-польску.

У 1932 годзе пачалася камасацыя зямлі вёскі Дзетамля. Камасацыя палягала на тым, што з даўгіх, а ў некаторых выпадках вузкіх палосак, рабілі хутары. Так як дзядзька Кастуся Юры ў гэтым годзе выбіраўся эміграваць з усёй сям'ёй у Бразылію, дык ён прадаў сваю землю. У выніку, бацька Кастуся мусіў перабрацца на хутар.

Пачынаючы ад сямі гадоў, у вольныя хвіліны й у летнія канікулы Кастусь памагаў бацьку на гаспадарцы. І не было ніякае гаспадарскае працы, якую-б Кастусь ня выконваў. Але таксама кожную хвіліну часу выкарыстоўваў на чытаньне кніжак зь мясцовай бібліятэкі й тых, што пападалі пад руку. У гэтым часе прыглядаўся да мясцовага жыцьця, наведваў царкву, прыслухоўвася да размоваў бацькі з гасьцямі, якіх не бракавала, калі бацька быў радным гміны й солтысам вёскі. Аднак думаў, як пакінуць вёску й цяжкое жыцьцё на гаспадарцы, якая не была вялікай, каб дзяліць яе з братамі.

Марыў ён пра Амэрыку, калі чытаў лісты, якія бацька атрымоўваў ад прыяцеля Юліяна Пятроўскага з Вільмігтону, штату Дэлявэр. Пятроўскі быў жанаты на пляменьніцы па лініі яго маткі. Думаючы пра гэта ўсё, пастанавіў аднойчы Кастусь пакінуць вёску ды йсьці ў сьвет. Але куды й як?

Матэрыяльныя магчымасьці бацькі не дазвалялі йсьці Кастусю ў Наваградак, каб вучыцца далей. Адзіная магчымасьць набыць асьвету была Беларуская гімназія ў Наваградку, але, нажаль, яна ўжо некалькі гадоў была зачыненай палякамі. Нягледзячы на тое, што земляробства Кастусю не падабалася, ён злажыў заяву ў ральнічую школу ў Кушалеве, куды яго прынялі. Такім чынам, бацька заладаваў на воз муку, сала ды іншыя прадукты, як аплату за навуку й утрыманьне, ды даставіў Кастуся 1 кастрычніка 1935 году на заняткі.

# Школа ў Кушалеве

Ральнічая школа ў Кушалеве Наваградзкага павету была двухгадовай зь летнім перапынкам на практыку. Практыку можна было адбываць у школе, якая мела вялікую гаспадарку, або на сваёй уласнай. Кастусь выбраў бацькоўскую гаспадарку. Практыка адбывалася пад наглядам настаўнікаў, якія наведвалі рэгулярна гаспадарку й правяралі вынікі на месцы.

У школе акрамя агульных прадметаў вучылі землябробству, гадоўлі хатняе жывёлы, агародніцтву, бортніцтву й адміністрацыі. Навучэнцы школы маглі працаваць эканомамі ў маёнтках або вясьці свае собскія гаспадаркі.

Кастусь у школе апынуўся адным з наймалодшых вучняў, бо навучэнцы былі рознага веку, нават і па дваццаць гадоў. Зьехаліся яны з усяго Наваградзкага ваяводзтва.

Акрамя лекцыяў і практычнай працы на школьнай гаспадарцы, у школе праводзіліся падрыхтавальныя вайсковыя заняткі. (Przysposobienie Strzeleckie).

Летам у 1936 годзе ў Кушалеўскай школе адбылася двухтыднёвая экскурсыя да Гдыні. З Наваельні да Варшавы ехалі цягніком, а з Варшавы да Гдыні плылі параходам па Вісьле. У Варшаве адведалі Каралеўскі замак, стары горад, заалягічны сад ды шмат іншых аб'ектаў сталіцы Польшчы. Плывучы па Вісьле, зьведалі па дарозе гарады: Торунь, Быдгошч, Гданьск. У Гдыні Марскі дварэц і ўсё, што варта было пабачыць. Зрабілі экскурсыю ў глыб Балтыйскага мора ды доўгім падарожжам у цягніку вярнуліся назад у школу. Кастусь бяз граша, пешшу з Наваградка прыбыў дадому.

Падчас наступнага зімовага сэмэстру Кастусь атрымаў лекцыю на ўсё сваё жыцьцё. Зімою выбраўся ў Наваградак да свайго стрыечнага брата Аўгена Цехановіча (Аўгенаў бацька Юліян быў братам маткі Кастуся), які працаваў прадаўцом у гуртоўні тытуню й папярос, каб пазычыць два злотых. Аўген грошаў не пазычыў, ён сказаў: «Табе грошы не патрэбны». Вяртаючыся да школы, Кастуся захапіла завея ды такая вялікая, што ёй ледзьве дабраўся да інтэрнату. Цягнуўшыся па завеянай дарозе, прырок сам сабе, што ніколі не павінен дапусьціцца да такога стану, каб шукаць пазыкі ў так малой суме, ды яшчэ якая была адмоўлена. Да такога стану

Кастусь ніколі не дапусьціўся ў сваім жыцьці й ня раз у душы дзякаваў Аўгену за такую «навуку».

Пасьля адбыцьця двухтыднёвага вайсковага вучэньня ў лягеры над Бугам за горадам Бярэсьце й летняй практыкі, якая моцна палепшыла гаспадарку бацькі, Кастусь закончыў «ральнічую» школу на выдатна, што дапамагло яму паступіць у школу «Спулдзельчосьці Рольнічай» у Налэнчове, Люблінскага павету.

Кастусь, замест чым ехаць дадому, вырашыў папрацаваць бясплатна ў банку «Спулдзельчым» у Навагрoдку й уладзіўся на практыку. Дырэктарам банку быў пан Казлоўскі, а сакратаркай — пані Моравска. Пакой на вуліцы Перасека й утрыманьне забясьпечыў яму бацька. Рэкамендацыі з школы «ральнічай» і банку дапамагалі яму дастацца да школы ў Налэнчове, а таксама далі гарантыю атрымаць стыпэндыю зь «Ізбы Рольнічай» у Вільні.

Перад ад'ездам у школу, банк «Спулдзельчы» ўручыў Кастусю грашовы падарунак з пажаданьнямі посьпеху ў навуцы. За гэтыя грошы ён купіў сабе першы камплектны касьцюм ды яшчэ пакінуў трохі грошаў на дарогу.

## Школа ў Налэнчове

Школа «Спулдзельчосьці Рольнічэй» была адзінай школай у Польшчы й падлягала беспасрэдна Міністэрству рольніцтва.

У гэтай школе рыхтавалі кадры да працы ў каапэратывах сельска-гаспадарчых і прамысловых. Па заканчэньні школы навучэнцы хутка знаходзілі працу, а ў той час у Польшчы было вельмі цяжка знайсьці якую-небудзь пасаду. Працу вучні знаходзілі ў каапэратывах як прадаўцы, зарыхтоўшчыкі, бухгалтары, а здабыўшы практыку, як кіраўнікі, арганізатары, бракіроўшчыкі й рэвізоры.

Школа знаходзілася ў Налэнчове, недалёка ад Любліна, у курортным прыгожым месцы з палацамі й вільлямі, куды прыезджалі лячыцца й адпачываць багатыя людзі. (Між іншым, там была вілья пана Бэка, міністра замежных справаў Польшчы).

На курсе было каля 60 вучняў, якія паходзілі з усяе Польшчы. Трэба зазначыць, што праваслаўных беларусаў было толькі траіх: па аднаму з Навагрoдчыны, Вялейшчыны й Падляшша. Украінцаў

было чатырох. Праграма школы была вельмі шырокай, а заняткі інтэнсыўныя. Акрамя агульнаасьветных і тэхнічных прадмэтаў вывучаліся каапэратыўныя рухі ў Англіі, Нямеччыне, Даніі й нават каапэрацыю Савецкага Саюзу.

У сярэдзіне сэмэстра, летам 1938 году школа наладзіла вялікую экскурсыю, у часе якой наведалі важнейшыя каапэратыўныя прадпрыемствы агулам і ў асаблівасьці гарады: Лодзь, Радом, Катовіцэ, Кракаў, Сандомеж, Замосьце й другія.

У гэтай школе Кастусь запрыязьніўся з украінцам па прозьвішчы Бойка, які быў старэйшы за яго на пару гадоў. Бойка быў бібліятэкарам настаўніцкай бібліятэкі, зь якой вучні маглі карыстацца толькі з дазволу аднаго з прафэсараў. У школе былі яшчэ дзьве бібліятэкі, адна агульная, а другая каапэратыўная. Бойка пазнаёміў Кастуся з украінскім пытаньнем пад Польшчай, а праз гэта Кастусь моцна зацікавіўся беларускай нацыянальнай справай. Дзякуючы прыязьні з Бойкам, Кастусь карыстаўся бібліятэкай бязь ведама прафэсараў.

Так як «Ізба Рольніча» ў Вільні не прысылала абяцанай стыпэндыі, а школа прыгадвала аб залегласьці, Кастусь у другой палове сэмэстру напісаў ліст да «Ізбы Рольнічай» у Вільні з прыгаданьнем аб абяцанай стыпэндыі. Ліст Кастуся быў ня надта ветлівы, але даволі вымагаючы, з запытаньнем, што за прычына ў затрымцы стыпэндыі. «Ізба Рольніча» прыслала гэты ліст дырэктару школы й напэўна далучыла свой афіцыяльны ліст з камэнтарыямі. Дырэктар Пачос, асоба арыстакратычнай паставы, на адной із сваіх лекцыяў прачытаў ліст Кастуся й у прысутнасьці ўсіх вучняў сказаў, што ліст нявытрыманы й патрабаваньні напісаныя не ў адпаведнай форме. Ён запрапанаваў вучням выказацца ў гэтай справе. Выказваньні вучняў былі прыхільныя й непрыхільныя, ў залежнасьці, хто іх выказваў. У канцы дыскусіі дырэктар заявіў, што за такі праступак Мерляк быў-бы змушаны пакінуць школу, але як вынятак, за добрыя адзнакі ў навуцы, ён застаецца закончыць навуку, а школа пачакае з аплатай. «Ізба Рольніча» ў Вільні грошы пераслала ў школу вельмі позна, так што Кастусь рэшткі стыпэндыі атрымаў, ужо будучы дома.

# У міжчасе

Zwiazek Gospodarczy, Spoldzielnia z Odpowiedzialnoscia Ograniczona або Гаспадарчы Саюз, Каапэратыва з Абмежаванай Адказнасьцю, быў зарганізаваны вылучна «асаднікамі» Наваградчыны. Старшынёю ўправы каапэратыву быў п. Кухарскі, які між іншым займаў розныя пазыцыі ў адміністрацыі павету й ваяводзтва, а кіраўнікам каапэратыву быў п. Залескі, які паходзіў з Валыні. Быў ён маладога веку, жыў з маткай. Галоўная крама, склад, знаходзіліся на Замкавай вуліцы, дзьве філіі былі ў Наваградку й адна ў Наваельні.

Канстанцін Мерляк быў прыняты на працу ў гэтую каапэратыву ў лютым 1939 ў якасьці бухгалтара зь месячнай аплатай 130 злотых і кватэрай у доме, дзе знаходзілася канцылярыя каапэратыву, з боку Замкавай вуліцы. Гэта было нямалым дасягненьнем, бо ў ваяводзкім горадзе многа ўрадоўцаў куплялі прадукты на павер. Гэта дало магчымасьці рахункаводу пашырыць знаёмства з тагачаснай польскай элітай. Праца й жыцьцё ў Наваградку ў 1939 годзе былі вельмі цікавымі й напружанымі. Людзі на нешта спадзяваліся, але ня ведалі ці добрае, ці дрэннае.

У галоўнай краме на Замковай працавала прадаўшчыцай сястра адваката Міхася Тулейкі. М.Тулейка быў сталым адвакатам каапэратыву, вёў усе легальныя справы. Знаёмства з Тулейкамі й наведваньне іхняга дому дало магчымасьць глыбей запазнацца з беларускай справай, бо яны мелі багата беларускіх віленскіх выданьняў, якімі Кастусь карыстаўся. Другім цэнтрам беларускасьці быў дом стрыечнага брата Кастуся Аўгена Цехановіча на Слонімскай вуліцы, дзе зьбіраліся мясцовыя й прыезжыя беларусы ды дыскутавалі бягучыя палітычныя падзеі.

Адным з найцікавейшых прыяцеляў Кастуся быў Журко з Гарадышча, каля Наваградка. Свайго часу ён вучыўся ў Беларускай гімназіі, дзе палякі арыштавалі яго за «камуністычную дзейнасьць» разам з цэлай групай. Усіх засудзілі на пяць гадоў зьняволеньня. Адседзеўшы тэрмін, ён вярнуўся дадому. Ня маючы што рабіць, ён абіваўся па Наваградку, дзе прыпадкова й спаткаўся з Кастусём. Ягоныя погляды на палітыку моцна адрозьніваліся ад поглядаў другіх прыяцеляў Кастуся тым, што яны былі левыя й

прасавецкія. Па доўгай дыскусыі Кастусь згадзіўся даць яму да дыспазыцыі сваю кватэру, забясьпечыў пішучай машынкай і паперай для яго падпольнай працы. Гэта было якіх два месяцы перад вайною.

У чэрвені 1939 году Кастуся паклікалі на «пабаровую» камісію ў польскае войска ў Наваградку. Зьявіўшыся на камісію, Кастусь убачыў старшыню каапэратыву п. Кухарскага, які аказаўся сябрам камісіі. Усё ішло добра, пакуль не паставілі пытаньні: якога веравызнаньня й якою моваю Кастусь карыстаецца дома. Адказ быў: праваслаўнае веравызнаньне, беларуская й польская мовы. Гэта моцна зьдзівіла Кухарскага, які пачаў паціху перагаварвацца зь сябрамі камісіі. Назаўтра Кухарскі прыйшоў у канцылярыю каапэратыву й адразу зьвярнуўся да Кастуся: «Вы зруйнавалі вашую кар'еру сваімі адказамі, а мне зрабілі непрыемнасьць, бо я перад гэтым вас рэкамэндаваў». Адказ быў: «Я не магу маніць». Інцыдэнт гэты застаўся без пакараньня, бо вайна, якая распачалася 1-га верасьня, радыкальна зьмяніла ўсе пляны людзкога жыцьця.

Такім чынам, Кастусю не давялося пабываць у польскай арміі, а таксама ніколі ня бачыць «Вшэхніцы» ў Варшаве, на якую плянаваў паступіць у наступным годзе, каб прадаўжаць навуку.

# Савецкая акупацыя

## 1939-1941

Лета ў 1939 годзе ў Наваградку прайшло актыўна, але спакойна. Палітычныя падзеі не варажылі нічога добрага, што моцна ажыўляла грамадзтва, вычувалася трывога аб прышласьці. Падтрымоўвалі настрой аповяды тых, хто пабываў на сусьветнай выстаўцы ў Нью Ёрку, ды гастролі Нора-Нэй, артысткі з Варшавы. Не зважаючы на надыходзячую буру, вячэрняе й начное жыцьцё ў Наваградку было прыемнае й шумнае.

Але раніцою 1-га верасьня 1939 году, як гром, праляцеў гук па горадзе: «Вайна! Вайна! Вайна!» Немцы ўдарылі па Польшчы. Горад стаўся другім: сумным, устрывожаным, трагічным, а ноччу цёмным, без асьвятленьня, каб пазьбегчы бамбардыроўкі.

Некалькі дзён перад 17-м верасьнем заўважаўся рух людзей, пакідаючых Наваградак, які з кожным днём павялічваўся. Гэта выяжджалі высокія польскія ўрадоўцы, якія прадбачылі на падставе ваенна-палітычных падзеяў прыход Саветаў.

У нядзелю рана, 17-га верасьня, ужо весь горад ведаў, што Савецкія войскі перайшлі граніцу й ідуць на захад. Каля поўдня ніякае ўлады ў горадзе ня было. Людзі пачалі зьбірацца абапал Карэліцкай вуліцы, адкуль спадзяваліся пабачыць ўваход Чырвонай Арміі. Пад вечар, напэўна, усе жыхары былі на вуліцах. І вось паказаліся першыя байцы: у сьпічастых шапках, доўгіх шэрых шынэлях, зь вінтоўкамі на плячах. Яны йшлі па баках вуліцы, а пасярэдзіне паволі цягнуліся танкі. Сям-там паказаліся чырвоныя сьцягі й пачулася спарадычнае : «Ура!» Так прайшла ўся ноч.

Назаўтра ўсе працаўнікі каапэратыву сабраліся ў канцылярыі. Кіраўнік Залескі не зьявіўся. Кастусь з усімі разам пастанавіў адчыніць краму й дзейнічаць так, як-бы нічога новага ня здарылася, пакуль не атрымаюць новыя дырэктывы.

Каля палудня прыйшоў знаёмы Кастуся Журко й заявіў, што старшыня ўправы каапэратыву Кухарскі арыштаваны, і што ён ставіць ахову перад магазынамі, каб людзі не разьбіралі «дзяржаўнага» дабра. Далей сказаў: «А вы, таварыш Канстанцін Мерляк, ад сёньня зьяўляецеся адказным за ўсе справы каапэратыву».

У гэтым-жа часе праз галосьнікі на грузавіках у горадзе падалі новы загад, прыблізна наступнага зьместу: «Да ўстанаўленьня часовае адміністрацыі горада Наваградка грамадзяне павінны захоўвацца спакойна й выконваць нармальна свае абавязкі. За беспарадкі й рабаўніцтва будзе прыменена кара сьмерці праз расстрэл. Для агульнага дабра ўстанаўляецца вартасьць аднаго рубля на роўні з польскім злотым».

Паадчыняліся крамы, уласьнікамі якіх былі пераважна жыды. Людзі пачалі ўсё раскупліваць, асабліва савецкія байцы, якія прадаўжалі праходзіць праз горад. Яны куплялі ўсё, што трапляла пад рукі. Не прайшло двух тыдняў, як крамы былі пазачыненыя. Уласьнікі, зарыентаваўшыся ў становішчы, якое не абяцала хуткае даставы новых тавараў, вырашылі захаваць тавар для сябе, што аказалася пазьней вельмі карысным для вымены на прадукты.

Праз некалькі дзён зьявіўся ў канцылярыі пан Бялыніцкі, сябра ўправы каапэратыву, які прапанаваў Кастусю забраць усе грошы каапэратыву, якіх было нямала пасьля такой вялікай распрадажы, ды выехаць у Варшаву, якая была занятая немцамі.

Над пытаньнем, што рабіць далей, Кастусь задумоўваўся й раней, праводзячы гутаркі із сваімі прыяцелямі беларусамі, а таксама з таварышам Журко. Журко стаўся неадлучным ягоным сябрам. Ён паінфармаваў, што адбывалася ў часовай управе гораду й раённым камітэце камуністычнае партыі, і Кастусь быў здэцыдаваны застацца на Бацькаўшчыне. Дзеля гэтага ён пану Бялыніцкаму адказаў: «Я не памешчык, я беларус, і я застаюся на сваёй зямлі, бо мне няма чаго баяцца». Далей Кастусь парадзіў яму пайсьці ў магазін на Ваяўскую вуліцу, узяць там грошы, сколькі іх будзе, даць распіску прадаўшчыцы (польцы) ды ехаць з Богам, што той і зрабіў.

Пазьней Кастусь ня раз варочаўся да гэтага мамэнту й думаў, што зрабіў добра або дрэнна, у залежнасьці ад таго, у якіх абставінах знаходзіўся.

У палове кастрычніка 1939 году «камісар» (так яго называлі) таварыш Рыхлін, які насіў уніформу НКВД, прыслаў у каапэратыў упаўнаважанага мясцовага жыда з паведамленьнем, што каапэратыў пераймаецца патрэбсаюзам г. Наваградка. Кастусь здаў касу, г. зн. з упаўнаважаным устанавілі паводля кнігаў стан наличных

грошаў у злотых і рублях ды здалі грошы ў мясцовы банк, які пазьней стаўся Дзяржбанкам у Наваградку. З тавараў у крамах не было чаго здаваць, амаль усё было распродана. Кастусь выбраўся з каапэратыўнай кватэры на Татарскую вуліцу.

У патрэбсаюзе працы было мала, дык Кастусь пачаў разглядацца, дзе найлепш было-б уладзіцца ў новай сацыялістычнай сыстэме. Пасьля наведаньня некалькіх адміністрацыйных і гаспадарчых установаў дайшоў да высновы, што банк будзе яму найлепш адпавядаць. Як пазьней аказалася, банк у Савецкім Саюзе быў кантралёрам, а гэтым самым дыктатарам эканамічнага жыцьця. Да гэтага заробкі ў банку былі вышэйшыя чымся ўва ўсіх іншых установах. У канцы лістапада 1939 году Кастусь злажыў заяву й быў прыняты ў Дзяржаўны банк у Наваградку на пасаду памочніка старшага крэдытовага інспэктара.

У банку трэба было з усім азнаямляцца й усяму вучыцца, а перадусім пазнаваць «мірную» палітыку камуністычнае ўлады, якая прынесла «вызваленьне». Гэта вымагала наведваньня розных зборак і мітынгаў, усьведамленьня ды ўдзелу ў дэманстрацыях у знак удзячнасьці за прынесенае шчасьлівае жыцьцё.

Па нейкім часе ў банку запрапанавалі паехаць на курсы крэдытовых інспэктароў у Беласток, на што Кастусь ахвотна згадзіўся. Курсы трывалі шэсьць месяцаў, ад пачатку травеня да канца лістапада 1940 году. На курсе было каля сарака асобаў, пераважна з тэрыторыі Заходняй Беларусі. Акрамя банкаўскай савецкай сыстэмы, тэхнікі й расейскай мовы, нямала часу прысьвячалі гісторыі камуністычнай партыі ды савецкай палітыцы наогул.

У чэрвені 1940 году паклікалі Кастуся на камісію ў Беласток, якая знайшла яго здольным служыць у Чырвонай Арміі.

Па заканчэньні курсаў, у часе якіх Кастусь атрымоўваў стыпэндыю ў суме стаўкі працаўніка банка, ён быў накіраваны ў вабласную кантору Дзяржбанку ў Баранавічах. Пасьля тыднёвага азнаямленьня, яго назначылі на пасаду старшага крэдытовага інспэктара ў Карэлічах на Валяўскі раён. Усе ўстановы Валяўскага раёна знаходзіліся ў мястэчку Карэлічы, бо Валяўка была толькі вялікай вёскай.

У банку кіраўнічыя пасады былі абсаджаныя насланым пэрсаналам: упраўляючы, галоўны бухгалтар, касір і старшы крэдытовы

інспэктар Канстанцін Мерляк, якога ўсе ўважалі за «ўсходніка», таксама прысланага на працу. Рэшта пэрсаналу былі мясцовыя людзі.

Кастусь не пасьпеў усталявацца ў Карэлічах, як яго выклікалі ў Баранавічы на службу ў Чырвонай Арміі. Але ён, найперш чым пайсьці ў вайсковую камэндатуру, зьявіўся ў вабласной канторы Дзяржбанку, дзе яму зрабілі гадавую адтэрміноўку, з прычыны займанага становішча ў Дзяржбанку. Адтэрміноўка на год збавіла Кастуся ад непазьбежнай сьмерці на фронце або лягеры палонных . (Ніхто з знаёмых равесьнікаў Кастуся не вярнуўся дадому зь нямецка-савецкае вайны 1941-1945 гадоў).

У Карэлічах таксама знаходзіўся раённы прафэсыйны Саюз фінансавых працаўнікоў, гэта значыць, працаўнікоў фінансавага аддзелу раённай управы Дзяржбанку й ашчаднай касы. Аднойчы сакратар склікаў мітынг Саюзу фінансавых працаўнікаў па поваду добраахвотнай падпіскі на дзяржаўны Заем, каб дэманстрацыйна адзначыць закончаную акцыю Займу. Пару тыдняў перад гэтым Кастусю даручылі сабраць падпіску Займу сярод банкаўскіх працаўнікоў. Кожны «дабрачынец» павінен быў падпісацца на суму аднаго месяца зарплаты, што раўнялася 100 працэнтам. Аднак аказалася, што працаўнікі банку падкачалі, пападпісваліся на малыя сумы, шмат меньш як 100 працэнтаў.

На мітынгу выступіў з прамоваю кіраўнік ашчаднай касы, які быў адказны за падпіску на Заем цэлага раёну. Яго прамова была тыповай для савецкага прапагандыста. Перш, ён пачаў гаварыць аб магутнасьці Саюза, аб мудрасьці бацькі працоўных усяго сьвету Сталіна, аб шчасьлівым жыцьці пад кіраўніцтвам роднае партыі й аб вызваленьні Заходняе Беларусі з-пад панскай Польшчы ды зьеднаньні беларускага народу, за што працоўныя моцна ўдзячныя, і сваю ўдзячнасьць выказваюць у падпісцы на Заём звыш 100 працэнтаў. Далей ён сказаў, што Савецкі Саюз акружаны ворагамі сацыялізму. Капіталісты ўсяго сьвету толькі й чакаюць нагоды, каб нашую радзіму разваліць. Але гэта ня ўсё: «У нас ёсьць яшчэ шмат унутраных ворагаў, якія перашкаджаюць будаваць камунізм. Вось, напрыклад, ня ходзячы далёка, у Дзяржбанку падпіска на Заем правалена. Падпіска была даручана старшаму крэдытоваму інспэктару таварышу Канстанціну Мерляку, які не правёў на-

лежнае агітацыі сярод служачых банку. У выніку, людзі падпісаліся меньш як на 50 працэнтаў. Мы павінны гэта справіць і быць больш чуйнымі, каб гэтага не паўтарылася ў прышласьці».

Кастусь узяў голас і сказаў, што асабіста ён падпісаўся на 110 працэнтаў, і гэта можа пацьвердзіць галоўны бухгалтар Дзяржбанку. Калі ходзіць пра агітацыю на Заём, то ён, як «заходнік» (тутака ўсе пераглянуліся з зьдзіўленьнем, бо думалі, што ён прысланы), лічыў, што прыезджыя працоўныя, выхаваныя ў камуністычным духу, ведаюць лепш за яго, якое значэньне мае Заём для савецкай дзяржавы. Ведаючы, што ўсе служачыя Дзяржбанку вялікія патрыёты й моцна адданыя Савецкай уладзе, было-б лішнім агітаваць, асабліва ня будучы прапагандыстам.

Гэты факт не застаўся незапісаны ў адпаведных органах. Хутка прыехаў з вабласной канторы Дзяржбанку з Баранавіч інспэктар праверыць працу Кастуся. Інспэктар быў знаёмы з Кастусём з часоў яго пабыту ў Баранавічах і ніякіх недахопаў не знайшоў. Да таго Кастусь памог яму зрабіць боты ў мясцовай арцелі. Перад ад'ездам інспэктар праўдзіва шапнуў Кастусю, каб той уважаў, бо за ім сочаць.

Ня трэба было быць празорлівым, каб ня бачыць да чаго йшлі Саветы, і што яны выраблялі. Перад імі насланыя палякамі людзі разам з асаднікамі займалі ўсюды пасады й усім кіравалі. Яны адначасна праводзілі палянізацыю беларускага насельніцтва. Саветы рабілі тое самое. Усе становішчы займалі насланыя савецкія людзі, пераважна партыйныя або камсамольцы, якія ў сваю чаргу праводзілі русыфікацыю. Органы НКВД нішчылі капіталістычны кляс. Пад лёзунгам ачысткі ад палякаў, арыштоўвалі й вывозілі ў Сібір, пачынаючы ад сяброў Грамады, багатых сялянаў, інтэлігенцыі й, канчаючы нават сябрамі КПЗБ. Сябра Кастуся Журко, адданы камуніст, прасьледаваны палякамі, быў высланы надалей на вёску працаваць у Сельцо, замест каб займаць назначанае становішча ў раённай управе.

У такой атмасфэры Кастусь, ведаючы, што за ім сочаць, працаваў і турбаваўся, што прынясе яму будучыня? Доўга ня прыйшлося чакаць. У нядзелю, 22 чэрвеня 1941 году немцы ўдарылі па Савецкаму Саюзу. Так пачалася другая сусьветная вайна, якая прынесла чалавецтву нечуваныя ў гісторыі жудасьці.

У гэтую нядзелю, , па абедзе, кіраўнік Дзяржбанку, паклікаў на нараду старшага крэдытовага інспэктара, галоўнага бухгалтара й касіра. Дастаў з браніраванай касы сакрэтныя лісты, у якіх былі дырэктывы, як банк мае дзейнічаць у часе ваеннага становішча ды заявіў, што бязь яго ведаму нікуды не адлучацца. Ужо назаўтра, па абедзе, паявіліся вайсковыя аддзелы, якія адступалі на ўсход. Дзень і ноч незьлічоная колькасьць рознае зброі, арыштаваныя вязьні, якія працавалі на будове аэрадромаў ды цывільныя насланыя чыноўнікі ўцякалі на ўсход ад наступу немцаў.

Гледзячы на ўсё гэтае, Кастусь прыгадаў любімы лёзунг бальшавіцкіх прапагандыстаў: «Будзем біць ворага на яго собскай зямлі». Не зважаючы на заяву Молатава, было зразумела, што хутка немцы зоймуць Карэлічы й пойдуць на ўсход без затрымкі. Кастусь пастанавіў не кіравацца на ўсход, а ісьці на захад, калі прыйдзе на гэта час. Перажыўшы падобнае становішча ў 1939 годзе ў Наваградку, прыйшло на думку не паўтарыць тое самое памылкі.

Першы кіраўнік Дзяржбанку Місюль, які паходзіў з Рэчыцы, быў адкліканы за тое, што ў касе не хапала грошаў. Скарбнікам быў пляменьнік Карэліцкага пракурора, які ня мог даць дастатковага тлумачэньня. Ня скарбніка, а кіраўніка перамясьцілі ў другое месца. Новы кіраўнік паходзіў зь Меншчыны й называўся Янка Каралькевіч. На закід, чаму называецца Янка, адказваў, што гэта астаткі беларусізацыі.

Аднаго дня, пад вечар, Кастусь ўзяў Янку на прагулку за горад і расказаў яму пра той момант, калі Бялыніцкі ў верасьні 1939 году нагаварваў узяць грошы каапэратыву ды выехаць зь ім у Варшаву. Кастусь запрапанаваў Янку зрабіць гэтак з грашыма банку, якіх было каля двух мільёнаў рублёў, прыхавацца на вёсцы, а пазьней пасяліцца ў Наваградку. Янка адказаў, што ён над гэтым падумае да заўтра.*

Назаўтра зранку з банку прыйшоў памочнік Кастуся, жыд па прозьвішчы Лібхабэр, і сказаў, каб Кастусь хутка прыйшоў у банк, бо кіраўнік яго зараз-жа патрабуе. Пры гэтым выказаў, што, на яго думку, банк будзе эвакуіравацца.Таксама заўважыў, што кіраўнік,

---

* Пра гэты эпізод з Дзяржбанкам пісала газэта «Голас Радзімы», ( № 39 (623) май, 1962 г.) у артыкуле А. Будзейкі «Ён цяпер жыве ў Нью Ёрку».

галоўны бухгалтар і скарбнік маюць пры сабе наганы. Кастусю ўсё стала зразумела. Сказаў памочніку йсьці назад у банк, бо ён будзе сьпяшацца апранацца. Але замест таго, каб ісьці ў банк, Кастусь заднім ходам хутка пайшоў да свае сымпатыі й у яе доме схаваўся.

Пад вечар гэтага дня кіраўнік банку, галоўны бухгалтар, скарбнік Лібхабэр ды яшчэ некалькі асобаў на трох вазох з грашыма й дакумэнтамі банку пакінулі Карэлічы ў кірунку Стаўпцоў.

Па трох днях ад выезду банку, а па сутнасьці па двух тыднях ад пачатку вайны, у Карэлічах стала вельмі ціха, ні душы на вуліцы. Усе, хто ўцякаў на ўсход былі далёка за Карэлічамі, а немцаў нават і слыху не было.

Наступнага дня, на сьвітаньні, Кастусь, сабраўшы свае важнейшыя рэчы, на веласіпедзе абочнымі дарогамі й лясамі вярнуўся дадому ў Дзетамлю.

# Нямецкая акупацыя

## 1941-1945

Перад самым летнім жнівом, калі патрэбная помач на гаспадарцы, ўся сям'я Ільлі Мерляка была дома. Іван, малодшы брат Кастуся, каб пазбавіцца калгасу, уладзіўся на працу ў шкляной гуце ў Бярозаўцы, быў ужо дома. Па нейкім часе, вярнуліся ў вёску браты Уладзімір і Іван Сосікі з Варшавы, (Іван Сосік у лютым 1943 году ажаніўся з Аленай Мерляк, сястрою Кастуся).

У вёсцы павесялела. Маладыя сталі зьбірацца й праводзіць у гутарцы вечары. Гутарка ішла пра вайну. Усе дзівіліся, чаму насупярак расхваленай агітатарамі савецкай магутнасьці, немцы хутка пайшлі наперад, а таксама, чаму немцаў нідзе не відаць.

Нарэшце, завітаў у вёску матарызаваны аддзел нямецкага войска. Немцы затрымаліся ў вёсцы на адзін дзень. Яны памыліся, пагаліліся, гаспадары пабралі іх ў хаты ды частавалі як маглі. Немцы ветліва дзякавалі й гаварылі: «Капут Сталіну», працягваючы рукой па шыі.

Прайшло лета, Кастусь стаў нудзіцца, седзячы ў вёсцы бяз ніякай дзейнасьці. Паехаў на веласіпедзе ў Навагрудак да свайго

стрыечнага брата Аўгена Цехановіча, каб даведацца, што там робіцца. Аказалася, што горад быў разьбіты, больш чымся ён сабе ўяўляў. Цэнтр быў цалкам зруйнаваны. У Наваградку стаяла нямецкая вайсковая камэндатура, жандармэрыя й цывільная ўлада ў жоўтых мундзірах. Зь іх дазволу жыхары гораду пачалі арганізоўваць беларускую адміністрацыю горада й раёна Наваградка.

Кастусь вярнуўся дадому, сабраў свае рэчы наладаваў на воз розных прадуктаў і пераехаў жыць у Наваградак. Кватэру наняў у татарына Аляксандровіча на Чырвонаармейскай вуліцы, што раней называлася Перацкага (у гонар міністра ўнутраных справаў Польшчы, якога забілі ўкраінскія нацыяналісты). Вуліца Чырвонаармейская пачыналася ад вуліцы Слонімскай і адыходзіла ўбок паралельна другім. Пры ёй знаходзіўся новы мадэрны шпіталь, нямецкая камэндатура й кватэры для нямецкіх афіцэраў. Пры гэтай вуліцы жылі: старшыня горада М. Буляк, раённы школьны інспэктар Гутар, Б. Рагуля ды ішныя.

Кастусь уладкаваўся працаваць у гаспадарчым аддзеле гарадзкой управы. Праца была разнастайная, кожны дзень было што іншае да працы, зьвязанае з гаспадарчым забесьпячэньнем горада. У гэты час старшынёю гарадзкой управы быў Панько. Дырэктарам адміністрацыі Дзяковіч, кіраўніком гаспадарчага аддзелу Цехановіч. Гарадзкая ўправа зь бегам часу пашырылася. Да яе даходзілі аддзелы асьветы, аховы здароўя, працы, бясьпекі й жыльлёвы.

Кастусь, як толькі ўладзіўся, зараз жа пачаў вывучаць нямецкую мову пад наглядам сяржанта Вэнцля, зь якім ён навязаў добрасуседзкія адносіны. Таксама пачаў вучыцца свае роднае мовы, зь якою да гэтага часу мала меў дачыненьня, акрамя сямейнае гутаркі.

Працуючы й жывучы ў Наваградку, хуткім тэмпам пашыралася знаёмства Кастуся з маладымі беларусамі, якія стварылі вялікую групу актыўнай энтузіястычнай і сьвядомай моладзі ў Наваградку пад кіраўніцтвам і наглядам старэйшых беларускіх дзеячоў. Гэтая група была душою й рухавіком беларускага жыцьця ў Наваградку. Пазьней зь яе многа людзей апынулася на эміграцыі: Я.Сажыч, Б.Рагуля, М. Рагуля, Ю.Т. і В. Мазуры, Л. Гутар, Г.Родзька, Г.Дзешук —Цішэўская, граф М.Хрэптовіч, В.Пляскач, Т. Мысьлівец, В.Падліпскі ды шмат другіх тут неперанічаных. Із старэйшых: сем'і

Орсы, Гарошкі, Бітуса, Куніцкага, Норыка, Родзькі, Русака, Стагановіча й інш.

У гэты час адна з важнейшых падзеяў была тая, што немцы сабралі з ваколіц і горада Наваградка жыдоў у гэта, якое памясьцілі ў судовых будынках на Карэліцкай вуліцы.

Кастусь з гарадзкой управы перайшоў працаваць у Беларускую Народную Самапомач на Наваградзкі раён. Кіраўніком раённае Самапомачы быў А. Стагановіч, а акруговае — П. Якуцэвіч.

Кіраўнік Беларускае Народнае Самапомачы ў Менску др. Я Ярмачэнка ў пачатку 1942 г. стварыў вайсковы рэфэрэнт пры Самапомачы, на чале якога стаў Ф.Кушаль.

Кіраўніком Самапомачы былі зробленыя захады перад генэральным камісарам Беларусі Вільгэльмам Кубэ, які даў згоду на арганізацыю Беларускае Самаахловы. Вайсковы рэфэрэнт Самапомачы зараз-жа пачаў арганізоўваць афіцэрскія курсы ў Менску.

Першыя афіцэрскія курсы адбыліся ў чэрвені 1942 году, а ў ліпені й жніўні адбыліся яшчэ 2-гія й 3-ція курсы. Гэтым-жа летам адбыліся падафіцэрскія курсы ў Наваградку й Баранавічах. Камандзірам падафіцэрскага курсу ў Наваградку быў Я. Сажыч.

На першых афіцэрскіх курсах быў Канстанцін Мерляк, які па заканчэньні курсаў атрымаў ступень старшага падафіцэра.

Кастусь з другімі афіцэрамі быў накіраваны ў Ліду дзеля арганізаваньня батальёну Беларускае Самаахловы на Лідзкую акругу. У Лідзе, у Гэбітскамісарыяце й жандармэрыі, групу беларускіх вайскавікоў немцы прынялі ветліва із зразуменьнем іхняга даручэньня. Прызначылі дом для закватэраваньня й хутка далі будынак на казармы першае кампаніі батальёна.

Абсталяваньне казармаў працягвалася больш як трэба, аж тут ужо пачалі прыбываць з раёну жаўнеры. Харчаваньнем павінна была забясьпечыць Беларуская Народная Самапомач, а зброю й абмундыраваньне павінны былі даць немцы. У міжчасе атрымалі некалькі вінтовак і гранат. Пачаліся вайсковыя заняткі. Але немцы з дастававай зброі й абмундыраваньня не сьпяшаліся. Зьнікла іхняя ветлівасьць і разуменьне патрэбы Беларускае Самаахловы.

Камандзір П. Касацкі із сваім штабам больш і больш дамагаліся зброі й абмундыраваньня. Аднаго дня, у канцы верасьня 1942 году гэбітскамісар Лідчыны выклікаў камандзіра Касацкага й усю яго

каманду ў сваю канцылярыю. У прысутнасьці мужа даверу інжынера А. Клімовіча камісар заявіў, што адклікаецца дазвол на арганізацыю Беларускае Самаахoвы, а па гэтаму ён прапануе распусьціць жаўнераў. Пасьля «патрыятычна-гарачае» прамовы, ён параіў усім прысутным ісьці ў народ і там пачаць дзейнічаць, як гэта свайго часу зрабіў Фюрэр Гітлер зь дзевяцьцю сябрамі: «...і бачыце, што яны зрабілі?»

Усім было вядома, што ў Лідчыне дзейнічае польская партызанка, якая моцна тэрарызавала беларускае насельніцтва, а гэтыя-ж немцы дастаўлялі зброю. Якраз у гэтым-жа часе на рынку ў Лідзе палякі забілі выдатнага беларускага дзеяча Ўсевалода Гільдэбранда. Так перастала існаваць Беларуская Самаахова. Ня толькі ў Лідзе, але ўва ўсёй Беларусі. Кастусь вярнуўся ў Наваградак.

Прыехаўшы з Ліды, Кастусь не застаў свае кватэры. Новы старшыня гарадзкое ўправы М.Буляк, які пераехаў зь Івянца, пасяліўся ў гэтым самым доме й далучыў Кастусёву кватэру да сваёй, каб такім чынам пабольшыць плошчу свайго памешканьня. Гэты факт арбітральнай рэквізыцыі кватэры абурыў Кастуся, і ён запатрабаваў раўназначнай кватэры на гэтай-жа самай вуліцы. Дзеля таго, што ўсе кватэры на гэтай вуліцы былі занятыя ў бальшыні немцамі, старшыня гораду зьменшыў кватэру гаспадара, каб запакоіць дамаганьні Кастуся.

У Наваградку заўважваліся вялікія зьмены: адміністрацыя гораду была поўнасьцю ачышчана ад польскага элемэнту, працаваў новаадчынены Беларускі народны дом, у якім адбываліся 'культурнага характару' імпрэзы, працавалі пачатковыя школы й гімназія, а настаўніцкая сэмінарыя падрыхтоўвала настаўнікаў.

Ад вайсковай камэндатуры ўлада перайшла ў рукі Гэбітскамісара Траўба, штабсляйтэрам быў Вольфмаер, сапраўдны прыяцель беларусаў. Была жандармэрыя, нямецкая служба бясьпекі. (С. Д)

Калі ў горадзе, нягледзячы на ваеннае становішча, жыцьцё праходзіла адносна спакойна, то па вёсках і ў лясох, партызанка праяўляла нямалую дзейнасьць, тэрарызуючы й рабуючы жыхарства. У многіх мясцох адміністрацыя не існавала.

Старшыня гораду й раёну запрапанаваў Кастусю стаць старшынёю трох сельскіх Саветаў: Сулятычаў, Нягневічаў і Ваўкавічаў. Кастусь згадзіўся пад умовай, што ўправа й канцылярыя будзе

знаходзіцца ў Наваградку. Такім чынам, канцылярыя памясьцілася на пачатку Карэліцкай вуліцы. Сакратарамі былі В.Таўлай і Шумскі, а шэсьць працаўнікоў выконвалі розныя функцыі.

Асноўнае даручэньне было: бараніць вясковае жыхарства ад немцаў і партызанаў. Немцы галоўна патрабавалі збожжа й жывёлу на мяса для войска. Партызаны патрабавалі тое самое й у дадатак забіралі ўсё, што ім трапляла пад рукі. Шумныя напады й рабаўніцтва партызанаў змушалі да дзеяньня немцаў. Немцы арганізоўвалі шырокія акцыі супраць партызанаў, падчас якіх, не разьбіраючыся ў справах, каралі нявіннае жыхарства: палілі вёскі, а людзей забіралі на прымусовую працу ў Нямеччыну. Людзі разьбягаліся й хаваліся або йшлі ў партызаны.

Каб у гэтае ўсё ўнікнуць, Кастусь паціху выклікаў паважнейшых прадстаўнікоў сельсаветаў і вёсак на нараду. На ёй ўсе разам пастанавілі парадак дзеяньня, які ў асноўным зводзіўся да двух мамэнтаў: для немцаў рабіць дастаўкі заўсёды меншыя іхняга запатрабаваньня, але ў такой колькасьці, каб не выклікаць нэгатыўнага падазрэньня. Тое самае рабіць з партызанамі, а перадусім старацца трымаць іх як найдалей ад вёсак і трымаць іхні шум як найцішэй. Гэтая тактыка дзеяньня й стратэгія лавіраваньня паўстрымала партызанскія напады. Таксама зьменшыліся нямецкія напады й акцыі на гэтай частцы тэрыторыі.

Паводля зьвестак, у Вільні жыла ў цяжкіх абставінах Лена Шырма, дачка дырыгента славутага беларускага хору Рыгора Шырмы, якога вайна захапіла на гастролях у Менску. Кастусь паехаў у Вільню, адшукаў і прывёз Лену ў Наваградак ды памог ёй уладкавацца сярод сваіх людзей.

Аднаго дня, будучы ў Менску, Кастусь накіраваўся ў гаспадарчы аддзел генэральнага камісарыяту, каб падпісаць дакумэнт на атрыманьне прадукту на фабрыцы. У накіраваным кабінэце, за сталом, сядзеў нейкі ўрадавец. На просьбу падпісаць прадстаўлены дакумэнт ён бяз цырымоніі падпісаў ды пажадаў шчасьлівага павароту ў Наваградак. Як пазьней аказалася, гэта быў Берут, які ў 1945 годзе стаў на чале ўраду Польскай Рэспублікі Людовай.

Аднаго дня пад восень 1943 году паявіліся ў Наваградку нямецкія, на першы пагляд, вайсковыя адзінкі. Аказалася, што гэта былі выбраныя часьці фармацыі СС. Сваімі незвычайнымі паводзі-

намі зьвярнулі на сябе ўвагу жыхароў гораду, а іхні загад не выходзіць на вуліцу напрацягу двух дзён, моцна ўсхваляваў грамадзтва Наваградка.

Кастусь на другі дзень задумаў адведаць Цехановічаў. Толькі дайшоў на Слонімскае вуліцы, як з хутка праязджаючага закрытага грузавіка пачуўся выстрал і крык: «Нах Гаўз, нах Гаўз!». Кастусь зразумеў, што гэта значыць, павярнуўся й пабегда дому. Назаўтра ён даведаўся, што зьліквідаванае гэта, а яго жыхары расстраляныя й пахаваныя ў лесе, каля Скрыдлева, якіх 5 км за Наваградкам.

У лістападзе 1943 году Наваградзкі эскадрон кавалерыі быў поўнасьцю зарганізаваны, і Кастусь Мерляк быў пакліканы ў эскадрон выконваць функцыю інтэнданта,*

Эскадрон памясьціўся ў былой школе Сясьцёр Назарэтанак пры вуліцы 25 Сакавіка, якая раней называлася 3 Мая. Зімой 1943-1944 гадоў эскадрон праводзіў заняткі, патруляваў горад Наваградак і акалічныя вёскі й мястэчкі. 25 сакавіка 1944 году быў дзень прысягі эскадрону. Яна адбывался на галоўным пляцы гораду вельмі ўрачыста ў прысутнасьці шматлікіх жыхароў і кіраўнікоў беларускае адміністрацыі ды прадстаўнікоў нямецкае ўлады.

Эскадрон ўзяў актыўны ўдзел у ажыцьцяўленьні агульнай мабілізацыі беларускай краёвай абароны, аб'яўленай Прэзыдэнтам Беларускае Цэнтральнае Рады прафэсарам Р. Астроўскім 6 сакавіка 1944 году. У гэтым часе эскадрон пабольшыўся на тры кампаніі й называўся «93-ці дывізыён БКА». Аднак, не зважаючы на гэта, яго надалей папулярна называлі Наваградзкі эскадрон або проста «рагуляўцы».

Эскадрон праяўляў надзвычайную актыўнасьць. Акцыі супраць партызанаў праводзіліся па ўсей тэрыторыі Наваградчыны й далей, якія трывалі больш як па тыдню. Абавязкам Кастуся было забясьпечыць жаўнераў харчамі, абмундзіраваньнем. Забесьпячэньне зброяй ды амуніцыяй належыла да кампэтыцыі камандзіра й афіцэра ім назначанага.

Надыйшла вясна 1944 году, ваенныя падзеі на ўсіх франтах не

---

* Пра арганізацыю й дзейнасьць Наваградзкага эскадрону кавалерыі напісана ў часопісе беларускае моладзі «Наперад», № 24, 25, 28, 1953 г. Лювэн, Бэльгія.

варажылі нічога добрага. Мясцовыя банды партызанаў, падмацаваныя вайсковымі камандзірамі й палітрукамі, скіданых Масквою на ўсёй тэрыторыі Беларусі, паралізавалі ўсялякія праявы жыцьця. Даезды былі небясьпечныя, бо партызаны рабілі частыя засадкі на праезжых вайсковых, а таксама й на цывільных людзей.

Кастусь, прааналізаваўшы існуючае становішча на франтох, а таксама палітычныя падзеі, весткі пра якія праходзілі праз радыё, нелегальна прывезенага зь Вільні, прыйшоў да высновы, што Саветы ізноў зоймуць Беларусь, магчыма ў гэтым годзе. І гэтым разам пацьвердзіў сваё папярэдняе жаданьне: у ніякім выпадку не заставацца пад Саветамі. Такі намер вымагаў перадусім псыхалягічнай і рэальнай падрыхтоўкі, гэта значыць, быць гатовым пры ўсякіх абставінах, у кожны час, рушыць на Захад з забясьпечаным раней транспартам.

У першую чаргу яму трэба было высьветліць становішча сваіх родных, якія пражывалі ў Уселюбе, 12 км ад Наваградку. У канцы красавіка зь лейтэнантам Велёндам паехалі ва Ўселюб. Кастусь зрабіў нараду з бацькам, братам Іванам, сястрою Аленаю й яе мужам.

Бацька Кастуся катэгарычна заявіў, што нікуды не паедзе, што будзе—то будзе, і не пакіне тут сваіх ужо пахованых жонку й двух сыноў. Брат і сястра з мужам сказалі тое самае. Кастусь, каб не забавіцца, тут-жа з усімі разьвітаўся, заехаў на могліцы каб разьвітацца з маткаю й братам Мікалаем, якія былі пахованы ў Уселюбе, і шчасьліва вярнуўся ў Наваградак. За паездку без дазволу й за рызыкоўнае наражаньне жыцьця, Кастусь із сваім прыяцелем дасталі вымову ад камандзіра эскадрону.

# Вялікая астатняя выправа эскадрону

Галоўнае камандаваньне жандармэрыі ў Беларусі з пачатку травеня й у чэрвені 1944 году паводзіла шырокамаштабную ачыстку ад партызанаў на тэрыторыі абапал ракі Бярэзіна, на захад лініі ад Полацка й на поўдзень аж да Барысава. Тры батальёны БКА, уключаючы Наваградзкі эскадрон, узялі ўдзел у гэтай акцыі на прызначаным адрэзку (паўночны усход ад Докшыцаў, у лясах заходняга боку Бярэзіны).

У Наваельні эскадрон заладаваўся на цягнік, спэцыяльна на гэта прызначаны праз Ліду, Маладэчна й Вялейку прыбылі ў Парафіянава, дзе разладаваліся й рушылі ў кірунку прызначэньня. Інтэндатура эскадрону са зьвязам жаўнераў для аховы ўлякавалася ў мястэчку Докшыцы.

У Докшыцах у той час стаяў Латыскі батальён і мясцовая нямецкая камэндатура.Тут таксама знаходзіліся вялікія майстэрні направы самаходаў, танкаў, матацыклаў і г.д. пад кіраўніцтвам нямецкае арганізацыі О.Т.

Кастусь, пад аховаю зьвяза жаўнераў, прадукты, фасаваныя ў Парафіянаве або Глыбокім, прывозіў у Докшыцы, пасьля чаго дастаўляў для жаўнераў на пункт знаходжаньня камандзіра, у мясцовасьці правадзімай акцыі.

Паводля афіцыйных дадзеных, тэрыторыя, праз якую праходзілі дарогі з Докшыц да Парафіянава, Глыбокага й да месца знаходжаньня эскадрону, была ачышчана ад партызанаў. Але гэта не адпавядала праўдзе, бо часта здараліся засадкі на канвоі, узрываліся міны. Інтэнсыўная акцыя прадаўжалася больш за месяц і дзесьці ў другой палове чэрвеня была спыненая. Эскадрон чакаў на далейшыя загады.

Падчас пастою, кожны дзень пад камандай ст. лейтэнанта Д. праводзіліся глыбокія патрулі ў тэрэн. Аднаго дня камандзір цэлае гэтае акцыі, немец у ранзе генэрала, пад аховаю свае жандармэрыі ў некалькіх лёгкіх самаходах праяжджаў праз «ачышчаную» тэрыторыю й раптам у лесе трапіў у партызанскую засадку. Яны ўсе загінулі-б, каб на гэты момант не наскочыў ст.

лейтэнант Д. са сваёй кампаніяй кавалерыі. У знак удзячнасьці эскадрон дастаў новае абмундыраваньне, лепшае ўзбраеньне й дадатковую порцыю «маркетэндэварэ».

Ад часу выезду на гэтыю выправу эскадрону быў прыдзелены афіцэр жандармэрыі, па паходжаньню аўстрыец, для абсарвацыі й лучнасьці з галоўным камандаваньнем. Гэты афіцэр большую частку свайго часу праводзіў на пастойцы інтэндатуры ў Докшыцах. Гэта яму было бясьпячней і прыемней, бо Кастусь дапільноўваў, каб яму ніколі не бракавала «шнапсу».

Некалькі дзён перад Другім Усебеларускім Кангрэсам, зьявіўся на пастойцы інтэндатуры чалавек і заявіў, што ён ёсьць спэцыяльны пасланец зь Менску й мусіць зараз-жа спаткацца з камандзірам эскадрону Б.Рагулям. Дзеля таго Кастусь запрапанаваў пасланцу ехаць зь ім на матацыклі. Нягледзячы на небясьпеку папасьці ў засадку партызан, яны рушылі ў дарогу.

На другі дзень пасьля кароткай канфэрэнцыі, камандзір Б.Рагуля выдаў загад напраўляцца на Парафіянава, бо немцы пакідаюць Віцебск і адступаюць на захад пад ціскам Савецкай арміі.

У Парафіянаве было цэлае пекла. Немцы давозілі сьвежыя сілы для ўтрыманьня фронту. Цягнікі з войскам, танкамі і ўсялякай зброяй даходзілі да Парафіянава, іх тут разладоўвалі, а пустыя цягнікі адпраўлялі назад. На запатрабаваньне аднаго цягніка для эскадрону, які закончыў сваю акцыю й вяртаўся на сваё месца прабываньня, немцы адказалі, што войска прывозіцца на фронт, а не забіраецца з фронту.

Аднак удалося дастаць два пустыя вагоны за падарунак аднае бочкі шнапсу адказным чыгуначнікам. У гэтыя два вагоны заладавалі правізацыю, зброю, абмундыраваньне, хворых і пару раненых ды пад камандаю ст. лейтэнанта С. направілі іх на Вільню.

Для эскадрону іншага выхаду ня было, толькі адступаць сваім собскім транспартам. Такім чынам, рушылі на Вялейку. Матарызаваныя часьці й кавалерыя ня мелі клопату, але пяхота па дарозе мусіла мабілізаваць конны транспарт. Вялейку мінулі без ніякіх перашкодаў і пад ранак наблізіліся да Маладэчна, якое было бамбардзіраванае савецкімі самалётамі ўночы. Сям-там гарэлі дамы.

Нямецкае камандаваньне накіравала ўсё адступаючае войска, якога было вялікая колькасьць, на Вільню, у тым ліку й эскадрон.

Аднак камандзір не падпарадкаваўся й павярнуў на Ліду, з мэтай вярнуцца ў Наваградак.

Што сталася-б з эскадронам, калі-б ён накіраваўся на Вільню, а не на Наваградак? На гэтае пытаньне ніхто яшчэ не адказаў, нягледзячы на тое, што некаторыя пазьней ставіліся негатыўна да дэцызыі камандзіра. Увесь эскадрон апрабаваў гэтую дэцызыію, бо кожны хацеў вярнуцца з тае ці іншае прычыны, нават і тыя, што ня мелі намер заставацца пад Саветамі.

Каля станцыі Багданаў, на запасовых лініях стаялі пустыя цягнікі. У адзін зь іх, што быў гатовы рушыць, камандзір пастанавіў заладавацца. Жаўнеры падцягнулі да вагонаў зімовыя заслоны ад сьнегу, па якіх заладавалі каней, вазы, самаходы, а рэшту жаўнеры падымалі на руках піхалі ў вагоны. За пару гадзінаў усё было гатовае да ад'езду, аднак немцы на станцыі заявілі, што цягнікі больш ня едуць на Ліду. Тут было даручана Кастусю дастаць пропуск на Ліду за ўсякую цану. Кастусь узяў двух жаўнераў, аднаму зь іх даў пяць бутэляк шнапсу, а другому ўсялякае закускі, й пайшлі да шэфа станцыі. За імі добра ўзброены зьвяз ціхенька акружыў будынак і ўстанавіў кулямёты на супраць вакон. З пачатку шэф станцыі не хацеў нават і гутарыць. Але глянуўшы ў вакно, пераканаўся, што трэба даць дазвол . Адвярнуўся да вакона і сказаў: "Sehr gut, fahren nach Lida", назаўтра цягнік быў у Лідзе, але й тут яго загналі на бочную лінію, дзе ня было падвышэньня да разладаваньня.

Эскадрон разладаваўся такім самым спосабам, як і заладаваўся, выбраўся на шашу й рушыў у кірунку Наваграда. Не даяжджаючы да мосту над Нёманам, якія тры кіляметры ад Бярозаўкі, спаткалі вялікі табар вазоў разьмешчаных абапал шашы, і мноства людзей. Аказалася, што гэта наваградчане з усёй адміністрацыяй пакідалі горад для Чырвонай Арміі й рушылі на захад, каб усьцерагчыся немінучай сьмерці, якую несьлі камуністы.

Чацьвёртага ліпеня 1944 году эскадрон у поўным строі з энтузіязмам увайшоў у горад Наваградак і разьмясьціўся ў сваіх казармах на вуліцы 25 Сакавіка. На вуліцах было поўна казацкага войска, уцекачоў й нямала мясцовага жыхарства. Назаўтра пракацілася вестка, што савецкі наступ устрыманы, а дзеля гэтага казацкае войска й эскадрон затрымаецца ў Наваградку.

Напрацягу наступных двух дзён жаўнеры эскадрону, якія былі змабілізаваныя ў сакавіку, разьбегліся па сваіх дамах. У казармах застаўся арыгінальны эскадрон, які складаўся з вучняў гімназіі й настаўніцкай сэмінарыі, да іх далучыліся яшчэ афіцэры, падафіцэры і жаўнеры, якія не жадалі заставацца. Яны пакінулі Наваградак 6 ліпеня 1944 году, позьнім вечарам.

Кастусь гэтым разам быў у свае нарачонае Надзі Гаворкі. Прыехаўшы дадому, яшчэ ня пасьпеўшы заснуць, пачуў стук у дзьверы . Гэта быў гаспадар дому Аляксандровіч, які сказаў, што Б.Рагуля й немцы яго шукалі, каб разам зь імі выяжджаў. Кастусь зразумеў у чым справа, хутка апрануўся, выскачыў на двор. Матацыкла не было, значыць дызэртыры забралі. Ён пабег ў казармы. На шчасьце, яшчэ застаў свайго шафёра Ч.Трухана, які ўжо ладаваў прадукты на грузавік, каб ехаць дадому. Аднак шафёр мусіў паехаць на Кастусёву кватэру, дзе Кастусь сабраў цывільную вопратку ды сёе-тое неабходнае, загадаў заехаць да Цехановіча, каб даведацца, ці выяжджаюць яны?

На панадворку застаў Соню, жонку Аўгена Цехановіча, якая заявіла, што яны нікуды ня едуць. На пытаньне: «А дзе рэшта сям'і?»,—адказала, што яны наводдалі ў жыце. Там сям'я й начавала, бо баялася бамбардыроўкі. «Дык бывайце здаровы!»,—сказаў Кастусь, сеў у кабіну грузавіка й паехаў. Праяжджаючы праз горад, забраў некалькі працаўнікоў штабу БКА й дзьве сёстры В.і Т. Мазураў ды ўсе разам хутка выехалі на дарогу ў кірунку Ліды. Было каля 10-й гадзіны раніцы, 7 ліпеня 1944 году. Ззаду застаўся ціхі, ні душы на віліцах, горад Наваградак. «Можа назаўсёды»,—падумаў Кастусь.

Дарога на Ліду была загружаная адступаючымі нямецкімі вайскамі рознай зброі й мноствам уцекачоў, ня толькі беларусаў, але казакаў, калмыкаў і іншы. Абапал дарогі казацкія аддзелы ахоўвалі ад нападу партызанаў адступаючых.

Пад вечар, пераехаўшы мост на Нёмане, у Сяльцах далучыліся да эскадрону, які затрымаўся на начлег. У гэтую ноч Ліда была моцна збамбардыраваная савецкімі самалётамі й была ў вагні, аб чым сьведчыла вялікае зорава на небасхіле.

На нарадзе з камандзірам афіцэры паставілі тутака разлучыцца. Наваградзкі эскадрон кавалерыі, што налічваў больш за 200

жаўнераў, накіруецца на Горадню лясамі й абочнымі дарогамі. А камандзір Б.Рагуля на сваім самаходзе. Інтэндэнт К.Мерляк з пэрсаналам БКА на грузавіку паедуць праз Ліду й злучацца ў Горадне з эскадронам.

Каля 10-й раніцы прыбылі ў Ліду. Ліда дагарала, на вуліцах ляжалі забітыя людзі й коні. Кастусь, ведаючы распаложаньне ў Лідзе са свайго папярэдняга пабыту, накіраваўся ў гараж Гэбітс-камісарыяту й там, на шчасьце, знайшлі дзьве каністры бензыну, што дало ім мажлівасьць даехаць да Горадні.

На дарозе апона ў грузавіку выпусьціла паветра, трэба было залатаць дзірку й напампаваць паветра ўручную, што заняло нямала гадзін. Камандзір, не губляючы часу, рушыў на Горадню з умовай там спаткацца. Кастусь зь цяжкасьцю уціснуўся ў калёну танкаў, грузавікоў і розных самаходаў адступаючых немцаў, каб ехаць далей.

На масьце ракі Дзітва стаяў нямецкі генэрал і кіраваў пераправай зь пісталетам у руцэ. Ён прапускаў толькі матарызаваныя фармацыі. Абапал дарогі калмыцкая дывізыя зь сем'ямі й уцекачы на вазох чакалі нагоды пераехаць на другі бок. О.Т. (арганізацiя Тодд) увіхалася направіць мост, які быў збамбардыраваны ў папярэднюю ноч. У раёне Ліды адбывалася моцная перастрэлка гарматаў.

9 ліпеня пад вечар прыбылі ў Горадню. Тут спаткаліся з Б.Рагулям і пяцьцю разьведчыкамі на конях з эскадрону, якія незалежна паявіліся ў Горадні. Зараз-жа на месцы было ўзгоднена, што эскадрон міне Горадню й накіруецца на Ломжу, а камандзір зь інтэндэнтам із падарожнікамі накіруюцца на Беласток. Пасьля нарады разьведчыкі вярнуліся да эскадрону. Гэты факт адлучыў камандзіра й інтэнданта ад Наваградзкага эскадрону кавалерыі назаўсёды.

Эскадрон дабраўся да Ломжы. Там ужо нямецкі генэрал Зыглінг арганізаваў з адступаючых адзінак БКА, паліцыі ды іншых службаў адмысловую дывізыю, якую назвалі «Беларуская дывізыя», або «Дывізыя Зыглінга». У гэтую дывізыю ўліўся Наваградзкі эскадрон кавалерыі, вынікам чаго ён афіцыяльна перастаў існаваць.

Час у Горадне быў выкарыстаны для направы грузавіка на далейшы шлях. На наступны дзень Б.Рагуля з афіцэрам нямецкае

жандармэрыі прыехалі на месца пастою й сказалі Кастусю сабраць дакумэнты, узяць грошы эскадрону й здаць іх. Прыехаўшы ў Штаб жандармэрыі, Кастусь здаў грошы, высыпаючы іх з партфэля на стол, а каб іх не лічыць, сказаў, што дакумэнты разрахунку засталіся загубленыя падчас сьпешнага выезду з Наваградка.

Затрымка ў Горадні трывала два дні, а на трэці выехалі ў кірунку Беластоку. У Беластоку заехалі ў Беларускі камітэт, але там ужо нікога ня было. Пераначаваўшы ў Беластоку, паехалі на Варшаву.

## Варшава

У Варшаву прыбылі 16 ліпеня 1944 году. Б.Рагуля, яго жонка Людміла й яго шафёр-сібірак памясьціліся ў гасьцініцы для афіцэраў. Спадарожнікі Кастуся, якія былі выехалі раней, пацясьніліся ў нямецкай школе, дзе ўжо былі разьмешчаныя наваградчане. Кастусь памясьціўся ў сваіх прыяцеляў Н.Х.

У Варшаве Кастусь хадзіў па-цывільнаму, часта карыстаючыся веласіпедам. У міжчасе наведаў Беларускі Нацыянальны Камітэт у Варшаве, дзе спаткаў старшыню др.М.Шчорса й Ю.Вежына. У горадзе адчувалася высокае напружаньне, часта здараліся перастрэлкі немцаў з палякамі.

Трэба было думаць, што рабіць далей, бо ўсходні фронт хутка набліжаўся да Варшавы. Кастусь на ўсякі выпадак вырабіў праз Беларускі Камітэт дакумэнты, каб мець магчымасьць застацца ў Варшаве. Ю. Вежын, выяжджаючы ў Італію, запрапанаваў Кастусю выехаць зь ім ды ўсунуў яму нумар свае адзінкі (фельдпост), кажучы: «Трымай на ўсякі выпадак, ён можа прыдацца».

Б.Рагуля ўвесь гэты час быў у разьездах. Аднаго дня зайшоў на кватэру Кастуся й сказаў: «Мы, г.зн. я й ты, пакідаем сёньня Варшаву, і хто хоча, можа з намі ехаць у Прусы Ўсходнія». Хутка сабраліся, Кастусь і шафёр заехалі ў школу, дзе былі затрымаўшыеся ўцекачы зь Беларусі. Усе спадарожнікі з Наваградку, а таксама яшчэ некалькі асобаў, у тым ліку й Н.Хмялеўская (з дому Бітус) з малою дачушкаю сабраліся, каб разам ехаць.

Пад самы вечар 1 жнівеня 1944 г. канвой, які складаўся зь легкавога самаходу й грузавіка, поўны пасажыраў, пакінуў Вар-

шаву, кіруючыся на Прусы Усходнія. Ад'ехаўшы каля дваццаці кіламэтраў ад Варшавы, пачулі праз радыё, што ў Варшаве пачалося паўстаньне палякаў супраць немцаў. Гэта было вялікае шчасьце для тых, хто выехаў з Варшавы, бо каб іх захапіла паўстаньне, яны загінулі-б, як многа іншых з рук палякаў або немцаў.

## Дальвіц

Пасьля двух дзён падарожжа, канвой прыбыў у Дальвіц, які знаходзіўся на палове шляху, між Інстэнбургам і Гумбіненам. Па адным баку чыгункі мястэчка Дальвіц, а па другім разьлёгся вайсковы лягер, акружаны лесам, добра дагледжаны й абсталяваны.

Немцы зараз-жа рэквізавалі самаход Б. Рагулі й грузавік К.Мерляка, заявіўшы, што ўсё гэтае ім больш ня будзе патрэбным. У гэтым лягеры немцы падрыхтоўвалі дэсантнікаў, якіх закідвалі ў тыл варожага войска для ўсякага роду дывэрсыяў.

Камэндантам лягеру быў немец латышскага паходжаньня, які валодаў расейскай мовай. Тут сабралася нямалая колькасьць вайскоўцаў з розных беларускіх фармацыяў. Падзялілі іх на зьвязы й пачалася поўная падрыхтоўка. Дзяўчаты вывучалі альфабэт Морзэ й другія спосабы камунікацыі.

Усім тым, хто падрыхтоўваўся, былі выдадзеныя адмысловыя пасьведчаньні, у якіх было сказана, што пры легітымацыі асобы ня пытаць, хто ён і што робіць. Гэты дакумэнт быў вельмі карысны, бо ён гарантаваў недатыкальнасьць паліцыі й усіх іншых органаў бясьпекі Нямеччыны.

У канцы жнівеня прыехаў у лягер старшы лейтэнант Ю.Мазура, каб забраць зь лягеру сваіх сёстраў Вару й Таню. Гэта сталася ў часе, калі ачышчалі рады ад няздольных і ненадзейных выконваць даручэньні ў тыле варожых войскаў. Кастусь заявіў кіраўніцтву, што ён пакідае лягер і выяжджае разам зь іншымі. Яго абяззброілі й забралі абмундыраваньне, ня ведаючы, што ён мае другі камплект у сваіх чамаданах. Перад ад'ездам Кастусь у гутарцы з Б.Рагулям сказаў, што ён не зьбіраецца ваяваць на чужой зямлі й за чужыя інтарэсы. Барыс сказаў: «Кастусь, ты ведаеш, што робіш». Так яны й разьвіталіся на даўгія гады. Даставілі іх да станцыі Інстэнбург і цягнікам даехалі да Кэнігсбэргу.

# Кэнігсбэрг

У Кэнігсбэргу памясьцілі групу з Дальвіц у вялікай царкве, дзе ўжо было нямала ўцекачоў ад бальшавіцкага наступу.

У Беларускім прадстаўніцтве ў Кэнігсбэргу Кастусь дастаў «камандзіроўку»—дакумэнт на праезд цягнікам да Вены. Плян быў ехаць у Францыю, але немцы не давалі прапускоў. На падставе атрыманых дакумэнтаў у прадстаўніцтве былі атрыманыя прадуктовыя маркі на адзін тыдзень. Маючы прадуктовыя маркі, можна было купіць у рэстаране талерку паранай брушкі й піва. Прабыўшы 5 дзён у Кэнігсбэргу, Кастусь сеў на цягнік і паехаў у Бэрлін.

# Бэрлін

У Бэрліне Кастусь заняў пакой у гатэлі каля Аляксандр Пляц. Бэрлін быў моцна збамбардыраваны й бамбардыраваньне амэрыканскімі самалётамі прадаўжалася амаль штоноч. Кожны жыхар гатэлю мусіў пакінуць пакой падчас «алярму» ды йсьці ў падземнае сховішча.

Рабіць гэта амаль кожную ноч Кастусю надакучала. Аднойчы ён вырашаў не ўставаць. Гаспадар гатэлю прыйшоў у пакой й заявіў, што згодна муніцыпальнага распараджэньня кожны павінен ісьці ў сховішча падчас налёту, за гэта адказны гаспадар дому. Ён пачакаў, пакуль Кастусь апрануўся, ды правёў яго да вуліцы.

Аказалася, што бамбардыроўкі ня можна было ігнараваць. Аднаго разу Кастусь спаткаўся з Запольскім, знаёмым з Наваградка. Яны не пайшлі ў сховішча, а працягвалі прахаджвацца па вуліцы, не зважаючы на бамбардыроўку. Але калі бомба ўпала блізка іх, ды асколкі цэглы ўдарылі па пятках, яны маланкаю пабеглі ў сховішча, у якое не маглі ўбіцца, так яно было запоўнена людзьмі.

Дні ў Бэрліне праходзілі наведваньнем рэстаранаў і кінатэатраў, у якіх Кастусь праседжваў цэлыя дні. Бэрлінскія прадуктовыя маркі канчаліся. Кастусь наведаў Беларускую Цэнтральную Раду, дзе пераканаўся, што яму там няма нічога да працы. Акрамя наведваньня БЦР і бюра для атрыманьня марак на харчы, усе іншыя ўстановы ён абыходзіў здалёк, што значыла: прыйшоў час пакінуць Бэрлін.

# Вена

З Бэрліна, праз Вроцлаў, Кастусь прыбыў у Вену 15 верасьня. Здаўшы свае два чамаданы на перахаваньне на станцыі, Кастусь пайшоў шукаць сабе месца на начлег. У бюро, дзе выдавалі харчовыя маркі (зноў толькі на адзін тыдзень) для ўцекачоў ад бальшавіцкага наступу, скіравалі яго ў нейкі будынак, дзе можна было толькі пераначаваць. Начлежнікі, якія былі пераважна ўцекачы з Балканаў, мусілі выходзіць з будынку раніцою, а варочацца на начлег вечарам.

Кастусь пазнаёміўся з адным харватам і разам зьведвалі Вену. Праходзячы па знакамітым Венскім парку, іх затрымалі дзьве асобы, агнеты, апранутыя па-цывільнаму. Яны прадставіліся як урадаўцы С.Д. і патрабавалі дакумэнтаў. Адзін зь іх, паглядзеўшы на дакумэнты, сказаў, што ўсе мусяць працаваць для перамогі. Усякія аргумэнты іх не пераконвалі. Урадаўцы пыталіся, чаму яны абодва яшчэ бяз працы. А працы тут ёсьць столькі, колькі лісьця на дрэве, паказаў пальцам на вялікі клён другі немец. Тады Кастусь выняў дальвіцкі дакумэнт і паказаў ім. Прачытаўшы яго, тыя перапрасілі, засалютавалі: «Гайль Гітлер» і пайшлі, забіраючы з сабою харвата, які ня змог ад іх абараніцца.

Ходзячы па Вене, Кастусь пастанавіў адведаць цётку Андрэя Трубэцкога, які даў яму адрас у Вене, калі выяжджаў з Наваградка ў 1943 годзе. Графіня Трубэцкая ветліва прыняла Кастуся, пачаставала чаем і бутэрбродам, распытала пра жыцьцё ў Наваградку пад Саветамі й пад немцамі, бо яна выехала яшчэ перад вайною 1939 году. На запытаньне, дзе Андрэй, яна адказала, зь сьлязамі на вачах, што ён загінуў у Бэрліне падчас бамбардыроўкі, калі паехаў па сваёй працы.

Гэтага дня ноччу была першая амэрыканская бамбардыроўка Вены й яе ваколіц. Яна была страшэннай і нарабіла шмат шкоды.

Папярэднія здарэньні, недахоп памешканьня ды пэрспэктыва папасьці ў лягер на прымусовую працу з нашыўкай «ОСТ» на грудзях, і змусілі Кастуся шукаць лепшага выхаду з становішча.

Маючы фэльдпост нумар, Кастусь надумаўся яго выкарыстаць, каб хутчэй выехаць зь Нямеччыны. Сьмела пайшоў у Франц

Ёзэф імпэрыял палац, у якім мясьцілася Обэр Командо Вэрмахт. Вартаўнік пры ўваходзе накіраваў яго на трэці паверх у адпаведны пакой. У тым пакоі яго прыняў маёр, якому Кастусь прадставіўся й растлумачыў мэту візыту. Маёр праверыў прадстаўленыя яму дакумэнты, узяў паперу, на якой быў напісаны фэльдпост нумар, і сказаў Кастусю прыйсьці заўтра ў гэты-ж самы пакой.

Назаўтра маёр сказаў: «Alles ist sehr gut»,— і папытаўся, калі ён думае выехаць. Кастусь сказаў, што патрабуе тры дні для палагоджаньня сваіх справаў. Адна зь іх ёсьць вельмі важная — гэта перахаваньне дзвюх валізак з прыватнымі рэчамі.

Маёр падумаў і скіраваў Кастуся ў Беларускае прадстаўніцтва ў Вене, дадаўшы, што там, напэўна, памогуць палагодзіць гэтую справу. Уручаючы патрэбныя дакумэнты й невялікую суму італьянскіх грошаў, пажадаў шчасьлівага падарожжа.

Кіраўніком Беларускага прадстаўніцтва ў Вене быў Я.Осінскі, а яго супрацоўнік Б.Кіт. Яны абодва згадзіліся перахаваць валізкі Кастуся, якія ён таго-ж дня й даставіў у прадстаўніцтва.

Назаўтра Кастусь спаткаўся з трыма знаёмымі з Баранавіч. Пасьля кароткай размовы. пастанавілі пайсьці ў добры рэстаран, каб яшчэ раз добра выпіць і паабедаць. (Ад некалькі тыдняў нічога іншага яны ня елі, як толькі брушку, якая ўжо ім абрыдла). Яны пайшлі ў Мітраполітэн гатэль, які быў перапоўнены афіцэрамі вышэйшага рангу, адступаючых з Балканаў.

Да занятага імі стала падыйшла афіцыянтка й папытала, які нумар пакою яны займаюць? Кастусь адказаў, што № 100, уціскаючы ў яе руку сотку марак. Тады афіцыянтка папыталася: «Што хочаце на абед?» Адказ быў: «Дзьве бутэлькі віна й ўсё, што можна дастаць». Афіцыянтка прынесла віно й зараз-жа пачала прыносіць без перапынку стравы. Гэты факт выклікаў зьдзіўленьне ў прысутных генэралаў і палкоўнікоў, што выражала не на добрае. Субяседнікі хутка разьлічыліся й шырокім крокам выйшлі на вуліцу, паціснулі адзін аднаму рукі ды пайшлі кожны ў сваім кірунку, мяшаючыся з публікай.

Пад вечар гэтага дня Кастусь выехаў цягнікам зь Вены праз Клягэнфург да Вэроны, куды прыбыў назаўтра, 24 верасьня 1944 году.

# Вэрона

У прыгожы восеньскі сонечны дзень, па абедзе, Кастусь выйшаў са станцыі пэрона на пляц, які быў запоўнены людзьмі. Пляц нагадваў Наваградзкі базар, дзе адны прадавалі, а другія куплялі, пры гэтым голасна таргаваліся на незразумелай мове.

Першы раз Кастусь пабачыў вінаград, купіў сабе поўкілаграма й адразу зьеў. Далей узяў павозку, паказаў адрас, дадзены яму ў Вене, і паехаў на сваё прызначэньне. Раптам павозка затрымалася, і павозчык паказаў пальцам на прыгожую вільлю, кажучы: «Кві». Пасажыр разьлічыўся і ўвайшоў у прыёмную, якая была прыцьмененая заслонамі ад сонца. У прыёмную зараз-ж ўвайшоў у нямецкай форме сяржант з мужчынамі ў цывільнай вопратцы. Ён прадставіўся як Гэр Вольф ды прадставіў па імёнах прысутных, якія аказаліся беларусамі. Гэтыя людзі й памаглі Кастусю ўляквацца.

Праз тры дні новыя знаёмыя паказвалі Кастусю горад, які аказаўся незачэпленым да гэтага часу вайною. Старажытны горад жыў нармальным жыцьцём: былі адчыненыя крамы, рэстараны, кінатэатры. Усюды поўна людзей, перамешаных з вайскоўцамі ў італьянскіх ці нямецкіх мундзірах. Тут напаткаліся на чарнакашульнікаў (гэта былі фашысцкія фармацыі «Дэль дучэ» Мусаліні).

28 верасьня Гэр Вольф забраў Кастуся й разам паехалі да Гарда. Мястэчка Гарда быў адпачынковым рэсортам, разьмешчаным над возерам Гарда. Гэр Вольф улякаваў Кастуся ў гатэлі, пазнаёміў зь італьянкай і сказаў: «Гэта сеньёра Бянка твая настаўніца італьянскай мовы да часу, пакуль я не прыеду па цябе». На працягу двух тыдняў Кастусь вучыўся гутарыць па-італьянску, наведваў навакольле возера Гарда й мястэчка Гардона на другім баку возера, дзе ў той час была рэзыдэнцыя Мусаліні, да якой блізка нікога не дапускалі.

У паловне кастрычніка прыехаў сяржант Вольф, забраў Кастуся й разам паехалі ў горад Парма. У вільлі каля Парма сяржант Вольф прадставіў Кастуся др. Шміту, які быў у цывільнай вопратцы, зараз-жа разьвітаўся й паехаў. Кастуся ўлякавалі ў пакоі на першым паверсе, паказалі сталоўку й парадзілі ісьці адпачываць, а назаўтра прыйсьці у кабінэт др. Шміта а 8-й раніцы.

Раніцой др. Шміт у мундзіры з рангай маёра, ветліва прыняў Кастуся, пазнаёміўся зь ім бліжэй, паставіўшы некалькі пытаньняў пэрсанальнага характару. Далей прыступіў да справы, паясьняючы, што мы (гэта значыць ён і Кастусь) належаць да «Абвэру». «Вы будзеце перакінуты на той бок фронту з даручэньнем пранікнуць у рады арміі генэрала Андэрса, а перадусім у дывізыю «Белавежа», якая пераважна складаецца зь беларусаў. Там будзеце нагаварваць беларусаў, каб яны пераходзілі з зброяй на нямецкі бок. Яны будуць далучаныя да існуючых беларускіх фармацыяў у Нямеччыне, каб разам змагацца за належнае месца для Беларусі ў новай Эўропе. На працягу наступных двух тыдняў, вы будзеце падрыхтованы да выкананьня даручэньня маімі інструктарамі. Гэта было-б ўсё. Аўвідэрзейн».

Выйшаўшы з кабінэту др. Шміта, Кастусь падумаў сам сабе: «Вельмі добра. Буду ўсё вывучаць, каб толькі папасьці да амэрыканцаў».

## Конрад Мацкевіч

На працягу двух тыдняў было зроблена наступнае: імя Кастуся зьменена на ймя й прозьвішча Конрад Мацкевіч, які па нацыянальнасьці паляк, каталік, народжаны ў Наваградку, вывезены ў Нямеччыну на працу ў 1942 годзе. Працаваў на фэрме каля Вроцлава, заангажаваны на працу праз арганізацыю «ТОДД», працаваў пры направе дарог; уцёк з працы ды перайшоў фронт з мэтай далучыцца да войска генэрала Андэрса, каб змагацца супраць немцаў за Бацькаўшчыну.

Два тыдні былі выкарыстаныя на інтэнсыўную падрыхтоўку для выкананьня даручэньня, як практычна так й ідэялягічна. Практычна: як захоўвацца пасярод цывільных і вайсковых, каб пазьбегчы арышту, як арыентавацца ў полі, у лесе й горадзе, каб пытаньнямі ня выклікаць падазрэньня. Інфармавалі аб структуры Польскае арміі, аб існуючых парадках. Вучылі, як распазнаваць афіцэрскія й падафіцэрскія рангі, вышуківаць «сваіх» людзей ды асьцярожна распачынаць нагаварваньне, каб пераходзілі на другі бок, індывідуальна або групова.

Для большага пераканананьня былі паданыя меркаваньні, што Нямеччына выйграе вайну, бо на гэта мае сакрэтную зброю, што ў прышлай Эўропе Беларусь будзе займаць пачэснае месца.

Перад ад'ездам немцы ўручылі ўсе патрэбныя дакумэнты й адзеньне, якое павінен мець працаўнік арганізацыі ТОДД. Далі заплечнік, ў які ўлажылі хлеба, масла, бутэльку каньяку, неабходныя першай патрэбы рэчы ну й грошы (італьянскіх лiраў каля паўмільёна, трохі нямецкіх марак і польскіх злотых). Два вайсковыя інструктары й Конрад селі ў самаход і паехалі ў кірунку фронту, які называлі лініяй Готык.

# Італія

30 кастрычніка 1944 года самаход з двума нямецкімі вайсковымі інструктарамі й Конрадам затрымаўся ў невялікім лясочку, на абочнай дарозе, перад вялікай гарою. «Адгэтуль вы пойдзеце праз гэтую гару на той бок. Там стаяць амэрыканцы», — сказаў старшы інструктар. Ён выняў карту, каб дакладна з'арыентавацца ў тэрэне. Паводзячы пальцам па карце, гаварыў: «Мы падвядзём Вас да дарожкі, якая вядзе на той бок гары, дзе разьмяшчаецца мястэчка Масса. Там стаяць Альянцкія войскі. Направа з гары зможаце ўбачыць Лігурыянскае мора». Паўтарыў інструкцыю, як пераходзіць фронт назад і падаў гасло «файдэ» з засьцярогай, каб не забыўся. Конрад разьвітаўся з адным інструктарам, а другі давёў яго да сьцяжынкі, сказаў: «Аўвідэрзейн»,—завярнуўся й пайшоў да самаходу. У гэтым месцы не было відаць і чуваць жывое душы, вакол была небывалая цішыня, нягледзячы на тое, што гэта была франтавая зона.

Конрад трохі пастаяў, глянуў на гадзіньнік (была трэцяя гадзіна папоўдні) і рушыў наперад, марматнуўшы пад нос: «З Богам, Параска».

Конрад ішоў не сьпяшаючыся. На змроку прыйшоў туды, дзе сьцяжынка разыходзілася й аб чым не было ўспаміну. Дык у які бок ісьці? Адказу не было, і ён ўзяў ўлева. Прайшоўшы пару

кіламэтраў, заўважыў у лесе будову ў форме хаткі. Прыблізіўся й убачыў, што гэта была сапраўды хатка з прычыненымі дзьвярыма. На кліч: «Гэй, гэй»,—ніхто не адказаў. Дзеля таго, што ўжо было вельмі цёмна йісьці далей было немагчыма, Конрад пастанавіў тут пераначаваць. Увайшоў у сярэдзіну, павярнуў у бліжэйшы кут, тупаючы нагамі сьцвердзіў, што лісьце сухое дык разьмясьціўся на начлег. Назаўтра Конрад раненька прачнуўся, ужо было бачна. Заглянуў у другі пакой, там ляжалі два забітыя мужчыны ў цывільным адзеньні. Кастусь схапіў заплечнік ды даў драла. Зараз-жа сьцяжынка скончылася й Конрад зразумеў, што йшоў ня той дарогай. Вярнуўся назад і пайшоў направа. Ідучы, думаў, што забітыя дзьве асобы, напэўна, былі італьянскімі партызанамі, якіх забілі немцы. Ён-жа праспаў ноч у іх таварыстве. Ідучы, дастаў з заплечніка кавалак хлеба й каўбасы зь няведамага мяса ды пачаў есьці.

Пад палудзень Конрад заўважыў, што пачаў спускацца з гары. Навокал цішыня й ні душы. Нарэшце, заўважыў некалькі жанчынаў, якія зьбіралі каштаны, выдаваючы, што яны яго ня бачаць. «Гэта малаважна, што не глядзяць, але я на правільнай дарозе», — падумаў Кастусь.

Пад вечар наблізіўся да мястэчка Масса. Пры ўваходзе на вуліцы заўважыў міліцыянера (карабінерэ) й накіраваўся да яго. Міліцыянт заўважыў чужога чалавека й рушыў насустрач. Конрад прывітаўся і спытаў: «Дзе ёсьць тутака амэрыканцы?» Міліцыянер гэта зразумеў і сказаў: «Я завяду». Па дарозе стаў пытацца, хто й што ды паказаўся вельмі ветлівым. Тут Конрад пабачыў у мундзірах амэрыканцаў. Перайшоўшы пару нядоўгіх вуліц, перад адным з выдатнейшых дамоў міліцыянер крыкнуў: «Аванті», адступіў назад, налажыўшы штых на вінтоўку й паказаў дзьверы, куды йсьці.

Увайшоўшы ў сярэдзіну Конрад убачыў, што за вялікім сталом сядзелі два амэрыканскія афіцэры, якія адрозьніваліся вопраткай ад тых на вуліцы. Міліцыянер зьвярнуўся да гэтых афіцэраў і па-італьянску сказаў:«Я злавіў «эспіёнэ» й прывёў яго вам».

Амэрыканец адправіў міліцыянера, папытаўся Конрада, на якой мове можна паразумецца, на што быў адказ: «На польскай і нямецкай». Амэрыканец паказаў другі пакой і сказаў чакаць. Конрад

выкарыстаў гэты час, каб перакусіць і падумаць, што ён ім будзе гаварыць.

Каля 7-й вечарам прыйшоў амэрыканец і па-польску папытаўся: «Як ты называешся й ці маеш зброю?» Адказ быў: «Конрад Мацкевіч, зброі ня маю».

«Вазьмі заплечнік і ідзі за мною». Конрад пайшоў у другі пакой, добра абсталяваны, дзе сядзелі 4-х амэрыканскіх афіцэраў і прысеў да аднаго, які гаварыў па-польску. Як аказалася пазьней, адзін зь іх ведаў нямецкую мову. Сказалі дастаць усё зь кішэні й заплечніка й пакласьці на стол Амэрыканцы усё дакладна пераглядзелі й пачалі допыт. Амэрыканец, які ведаў польскую мову, перакладаў пытаньні ў польскай мове, а на пытаньні на нямецкай Конрад адказваў па-нямецку. У асноўным, Конрад сказаў тое, што ён працаваў на гаспадарцы каля гораду Брэсляў. Там адзін немец, які гутарыў па-польску, заангажаваў яго перайсьці фронт і пранікнуць да польскае арміі. Гэта была нагода, зь якое Конрад скарыстаў, каб хутка вызваліцца ад немцаў і цяжкое працы на гаспадарцы. Канчаючы сваю «споведзь», Конрад запэўніў, што ён ніколі не зьбіраўся рабіць тое, чаго вымагалі ад яго немцы. Амэрыканцы забралі ўсе дакумэнты, грошы й каньяк, а той, што гаварыў па-польску, забраў польскія грошы, дадаўшы, што гэта на памяць. Зьвярнулі Конраду толькі заплечнік з прадуктамі.

Гэты-ж польскі амэрыканец завёў яго ў пакой пераначаваць. Доуга Конрад думаў пра тое, што ён зьмяніў у сваёй гісторыі, каб не прыйшлося забыцца. Моцна ён дзівіўся, што гэтыя амэрыканцы жавалі ўвесь час.

Назаўтра, 2-га лістапада 1944 году раніцою амэрыканец пасадзіў каля сябе Конрада на джып і яны паехалі. Ехалі цэлы дзень, пад вечар уехалі ў горад Флярэнцыя. Пад'ехалі да вялікае брамы, якая сама адчынілася й ўехалі на двор астрогу. Гэты астрог італьянцы называлі «Муратэ». Пасьля фармальнасьці: здачы й прыняцьця вязьня—вартавы завёў Конрада ў камеру № 245. Але перад тым узяў з заплечніка булку хлеба, ад якое адрэзаў вялікую палову й адразу пачаў есьці.

У камэры сядзелі тры вязьні. Зь іх дваіх былі засуджаныя на кару сьмерці й чакалі на подпіс фэдмаршала Аляксандра. Трэці вязень быў італьянскім памешчыкам, які чакаў на прысуд за

зьдзекі над ангельскімі палоннымі, якія працавалі ў ягоным фальварку. Цэлы тыдзень Конрад сядзеў у таварыстве гэтых вязьняў, якія ня прыносілі добрага насторю. Да таго ім ніхто не цікавіўся. Гэта моцна турбавала.

Нарэшце, Конрада выклікалі й прывялі ў будынак адміністрацыі, ў якім, на яго зьдзіўленьне, чакалі два энкавэдысты ў шапках з чырвонымі аколушкамі. Яны пачалі дапытвацца па-расейску, але Конрад сказаў, што ён не разумее й запатрабаваў польскага перакладчыка. Энкавэдыст паглядзелі адзін на аднаго й сказалі, што гэта: «Но руссо»,—і пайшлі, а вязьня адвялі назад у камэру.

Цераз два дні Конрада ізноў выклікалі й павезьлі ў другі будынак у горадзе, дзе над дзьвярыма вісеў ангельскі сьцяг.

У пакоі гэтага будынку, спаткалі яго два мужчыны ў ангельскіх мундзірах нявядомай рангі, з нашыўкамі на рукавах «Палестына». Яны абодва добра гаварылі па-польску. Конрад адразу зразумеў, што амэрыканцы яго перадалі ў рукі ангельцаў для правядзеньня дакладнага сьледзтва. Загадалі распрануцца да гала й стоячага дапытвалі. Па нейкім часе сказалі апрануцца й сесьці. Кастусь мусіў расказаць гісторыю свайго жыцьця, што было нялёгка, бо яна была моцна зьмененай. На працягу наступных трох дзён, ён мусіў упэўніваць, што ён паляк і каталік. Па некалькі разоў паўтараў «Здровас Марыя», «Ойчэ наш», і «Вежэ в Бога Ойца». Усялякімі спосабамі стараліся злавіць на няпраўдзе, але ім гэта не ўдалося.

Пасьля сьледства Конрада пасадзілі ў другую камэру, дзе сядзелі два італьянскія пілёты Сэрафіні й Пэтронэльлі, якім родныя прыносілі пачкі з харчамі. Яны дзяліліся ежаю з Конрадам, бо ў астрозе давалі толькі сто грамаў хлеба й кубак супу, які складаўся з гарачае вады й бураковага лісьця.

29-га лістапада 1944 году загадалі Конраду забраць з сабою ўсе рэчы й выходзіць. Ангельскія жаўнеры заладавалі прыблізна трыццаць вязняў, выдалі ім прадукты, сказаўшы, што гэта на два дні й рушылі ў дарогу. Конрад быў так выгаладаваны, што ўсё зьеў адразу, нічога не пакідаючы на наступныя два дні.

Гэтым разам падарожжа было на поўдзень, з затрымкамі трывала два дні. 2-га снежня 1944 году прыбылі ў лягер інтэрнаваных

ў горадзе Тэрні, 90 кіламэтрах на поўнач ад Рыму. Гэтага дня загадалі новапрыбыўшым распрануцца. Праз некаторы час прынесьлі ім назад іхняе адзеньне, якое было абсыпанае парашком ДДТ. Запрасілі пэрсанальныя дадзеныя, далі № 742, які, сказалі, заўсёды насіць на руцэ, ды завялі на трэці паверх аднаго з будынкаў, дзе мясьціліся выключна чужынцы «странеры». Інтэрнаваныя італьянцы мясьціліся на другіх паверхах і ў іншых будынках.

## Internee Camp "R"
## Лягер інтэрнаваных

Лягер інтэрнаваных у Тэрні займаў вялікую фабрыку натуральнай і сынтэтычнай гумы, якая калісьці памяшчалася ў некалькіх чатырохпавярховых будынках.

Камэндантам лягеру быў стары маёр-ангелец. Лягер ахоўвалі таксама ангельцы. А жаўнеры польскае арміі дастаўлялі прадукты й усё патрэбнае для гаспадаркі, утрыманьня вялікага лягеру.

У лягеру было больш за 1000 вязьняў мужчынаў і 300 жанчынаў (памешчаных у асобным блёку). Зьняволеныя былі падзеленыя на групы: чужынцаў, італьянцаў старэйшых (ня толькі векам, але й сваёю рангаю або становішчам) ды італьянцаў малодшых, якія мелі абавязак трымаць парадак унутры лягеру. Вонкавы парадак трымалі вольныя італьянцы, якім плацілі зарабатную плату.

Гэты лягер быў зборным пунктам абвінавачаных альбо падазроных цывільных і вайсковых людзей антыальянскай дзейнасьці на час іхняга дасьледваньня, якое пачалося толькі па заканчэньні вайны.

У групе чужынцаў былі амаль усе нацыянальнасьці з усяго сьвету, пачынаючы ад міністраў, амбасадараў, консулаў, паслоў, навукоўцаў, прафэсараў розных унівэрсытэтаў, розных палітычных кіраўнікоў, разьведчыкаў, дэсантаў, палітыкаў-нацыяналістаў, прапагандыстаў, сяброў усіх сакрэтных службаў, шмат ўсякіх іншых прафэсыяў і тых, зь якімі сьледчыя ня ведалі, што рабіць.

Італьянскі кантынгэнт пераважна складаўся з фашыстаў і нямецкіх калябарантаў усіх слаёў грамадзкага жыцьця: пачынаючы ад жонкі Мусаліні, а канчаючы звычайным працаўнiком.

Цэлы тыдзень заняло Конраду трохі ад'есьціся, бо кармілі добра (нават лішнія сухары выменьвалі на віно ў італьянцаў). У гэтым-жа часе трэба было азнаёміцца зь людзьмі, унутраным парадкам, а таксама задумацца над сваёй уласнай сытуацыяй.

Перадусім Конрад дайшоў да выснову, што для яго вайна скончылася з пэўнай дозай шчасьця, бо далейшая эпапэя магла скончыцца трагічна. Як доўга ён будзе сядзець у лягеры было невядома, але да канца вайны напэўна, далей час і абставіны пакажуць, як трэба дзейнічаць. А пакуль што, неабходна выкарыстаць час, каб падрыхтавацца да жыцьця пасьля заканчэньня вайны ў невядомай краіне, пажадана ў Амэрыцы.

Парадак дня, на першых пачатках, укладаўся так: раніцаю гімнастыка, перад абедам лекцыі італьянскай мовы, па абедзе—ангельскай мовы, вечарам культурныя заняткі.

У лягеры знаходзілася Ватыканская бібліятэка пад кіраўніцтвам Франьцішкана Габрыеля, былі спэцыяльныя лягерныя грошы, лягерная газэтка, мастацкія гурткі. Тут чыталіся на розныя тэмы рэфэраты, праводзіліся дыскусыі па палітычных, філёзафічных й гістарычных тэмах. Шмат часу прысьвячалася прароцтву, як будзе выглядаць сьвет пасьля вайны.

Вось толькі некалькі спэцыфічных фрагмэнтаў з культурнай дзейнасьці лягеру.

Прафэсар унівэрсытэту Піза з памяці прадэклямаваў «Дывіна камэдыя» Дантэ, што заняло яму два тыдні. Генэральны консул ў Амэрыцы Гіслінг прачытаў 14 лекцыяў пра ЗША. Прыяцель М.Ганды расказваў пра Індыю ды яе імкненьне да незалежнасьці. Асабліва былі цікавымі бясконцыя аповяды пра ваенныя разьведкі, спэцыяльныя выправы, сабатажы, падкопы пад штабы на франтах і г.д., або шахматныя спаборніцтвы, дзе Конрад перамог чэмпіёна горада Флярэнцыя (пасьля таго Конрад ніколі ня выйграў нават адной партыі, так той мсьціўся за свой пройгрыш). Аднаго разу запрапанавалі Конраду зрабіць рэфэрат на тэму «Жанчына ў Савецкім Саюзе». Ён згадзіўся й прачытаў яго ў жаночым блёку. Пасьля рэфэрату пазнаёміўся зь беларускай Вольгай Раманавай з

Магілёўшчыны да з адной украінкай Надзяй Х. У гэтым лягеры быў беларус Анатоль Грынкевіч з-пад Баранавіч, які апынуўся ў такіх-жа самых абставінах як і Конрад (ён прыбыў у лягер на месяц пазьней).

Да Вольгі Раманавай меў сымпатыю сяржант Віхлер, які працаваў у лягернай канцылярыі. Конрад папрасіў Вольгу, паўзьдзейнічаць на сяржанта, каб ён даў магчымасьць пабачыць Конрадавую справу. Незадоўга адной нядзелі, сяржант Віхлер выклікаў Конрада ў канцылярыю й паказаў яму ягоную справу. У папцы нічога не было акрамя загаду (ордэру) затрымаць Конрада Мацкевіча ў лягеры інтэрнаваных да далейшага распараджэньня. Дакумэнт быў невыразна падпісаны нейкім маёрам. Выглядала, што тыя сьледчыя палякі ў Флярэнцыі забралі з сабою ў штаб усе паперы, зьвязаныя зь ягонай справай.

Вольга Раманава была пазьней звольненая зь лягеру. Сяржант Віхлер заапекаваўся ею, уладзіўшы яе ў Рыме. Вольга выйшла за яго замуж і жыве зараз ў Англіі. Украінка, Надзея Х. была звольненая зь лягеру й была выслана дадому на яе ўласнае жаданьне.

У лягер прывозілі людзей усё менш і менш , а вывозілі ўсё больш і больш. Конрад меў нагоду пазнаёміцца з былым міністрам вонкавых справаў Вэнгрыі (потым ён быў выдадзены й асуджаны на сьмерць у Будапэшце), зь міністрам гандлю Харватыі Вранчыцам, які быў таксама выдадзены, але па дарозе яму ўдалося ўцякчы. (Пазьней ён апынуўся ў Аргентыне, і Кастусь супрацоўнічаў зь ім падчас свайго знаходжаньня там).

Пазнаўся з др. Вілісам, палітычным дарадцам у Ост Міністэрыюм у Бэрліне. (Др. Віліс вельмі шмат чаго расказваў пра палітыку Нямеччыны на Ўсходзе, асабліва пра справы, якія датычылі Беларусі. Ён знаў асабіста Гэнеральнага камісара Беларусі В.Кубэ). Запрыязьніўся зь В.Куэрэлям (італьянскі карэспандэнт і пісьменьнік на Ўсходнім фронце), зь пілётам А. Вронскім-Карачы, які быў прыдзелены да штабу на Ўсходнім фронце, з У. Кярапа, які быў перакладчыкам у штабе італьянскага войска на фронце ды зь іншымі італьянцамі й чужынцамі. Таксама ў лягеры было некалькі жыдоў, што супрацоўнічалі зь немцамі, але іх кудысь забралі.

У сьвеце адбываліся вялікія падзеі: 8-га травеня 1945 году капітуляцыя Нямеччыны, 26 чэрвеня арганізацыя ў Сан Францыско

Аб'еднаных Нацыяў. З 17 ліпеня й да 2 жніўня адбывалася славутая канфэрэнцыя ў Подздаме, бяз Рузвэльта (той памёр) і Чэрчыля (прайграў выбары), якая прынесла многа няшчасьця на многія годы для ўсёй Усходняй і Цэнтральнай Эўропы. 20 лістапада 1945 году распачаўся суд над ваеннымі праступнікамі ў Нюрэнбэргу.

Жыхароў ў лягеры пачало зьменшывацца: адных выдавалі ўладам іхняга паходжаньня, якія праводзілі над імі расправы, нямногіх, асабліва італьянцаў, выпускалі на волю або перадавалі мясцовым уладам пад суд.

Так праходзіў час. У чэрвені 1946 году лягер інтэрнаваных быў пераіменаваны на лягер палонных і быў перанесены з Тэрні ў ваколіцы горада Рычоне над Адрыятыкай Астаткі папярэдняга лягеру, прыблізна 300 асобаў, памясьцілі пад палаткамі ў невялікім лягеры, які быў акружаны з усіх бакоў лягерамі ваеннапалонных..

З аднаго боку быў вялізарны лягер нямецкіх ваеннапалонных. За ім быў лягер палонных Украінска-Галіцкай дывізыі, якою камандаваў генэрал Галічын. Украінскі лягер ня быў пільнаваны, а наадварот, ангельцы выкарыстоўвалі яго жыхароў пільнаваць нямецкіх палонных. Праз нямецкі лягер Конрад і Анатоль навязалі лучнасьць з украінцамі й зарганізавалі пры дапамозе немцаў пераправу італьянцаў, якія хацелі ўцячы зь лягеру, каб не папасьці пад мясцовы суд. Гэтыя суды былі абсажаныя пераважна камуністамі, якія строга судзілі фашыстаў.

Уцекача праз калючы дрот перадавалі немцам, а тыя—украінцам. Тыя ўцекача вывозілі за горад, адкуль па дамоўленасьці забіралі яго сваякі. За кожную апэрацыю, а іх было некалькі, атрыманыя грошы дзялілі на тры часьці.

Конрад за ўвесь час прачытаў незьлічоную колькасьць кнігаў, апанаваў добра італьянскаю, ангельскаю й нядрэнна францускаю мовамі. Надыходзіла восень, яму стала нудна й нецярпліва, дакуль ён тут будзе сядзець? У адказ пастанавіў уцячы зь лягеру. Прыдбаў нелегальна цывільную вопратку, меў трохі сабраных грошаў і быў гатовы да ўцёкаў. Дамовіўся з жаўнерамі-палякамі, якія дастаўлялі прадукты для лягеру, што яго вывязуць з пустымі бочкамі за лягер пры першай добрай нагодзе. Але здары-

лася іначай. Ангельцы прыгатавалі новы лягер з боку аднаго ваеннапалонных лягероў і пачалі ўсё туды перавозіць. Загадалі ўсім сабрацца й падрыхтавацца ісьці пяхотаю ў новы лягер, пра які ніхто нічога да гэтага часу ня ведаў. Конраду гэта не спадабалася, ён заявіў, што на раньняшняй гімнастыцы зьвіхнуў нагу й ня можа йсьці. Такім чынам, яго далучылі да іншых, якія былі сапраўды хворымі. Усіх іх перавезьлі на грузавіку.

Прыехаўшы ў новы лягер калегі Конрада сказалі, што ўжо 4-х італьянцаў уцякло праз дзірку ў плоце. Конрад пабег па цывільную вопратку. Аднак было запозна—ангельскія жаўнеры ўжо закрывалі калючым дротам тое месца, праз якое ўцяклі італьянцы. Заставалася толькі ўцякаць праз верх калючага дроту.

Вартавыя былі пастаўленыя з двох працілеглых бакоў, бо бок, дзе лягер прымыкаў да агароджы лягеру ваеннапалонных, ня трэба было наглядаць. Такім чынам, заставаўся толькі адзін бок на ўцёкі. Наглядчыкі Конрада сачылі за вартавымі, і як толькі тыя зыйшліся. г. зн. абодвы ў адзін час завярнуліся йсьці паволі ў кірунку другога лягеру, далі сыгнал уцякаць.

Конрад хутка ўзьлез на верх калючага дрогу й пачаў пералазіць на другі бок на перачэпцы з калючага дроту, перабіраючы рукамі па калючках са спушчанымі нагамі ўніз. Нажаль, калоша зачапілася за калючку й не давала пасоўвацца другога боку. Гэта заняло некалькі хвілін часу, каб вызваліць нагу ды зь цяжкасьцю падняцца наверх агароджы другога боку. У гэтым часе яшчэ 3-х італьянцаў перабраліся на той бок праз верх агароджы. Вартавыя тым часам вярнуліся назад, заўважылі суматоху й далі алярм. Конрад пабачыў, што ўжо няма куды сьпяшацца, скочыў проста ў вінаграднік. Італьянцы пачалі ўцякаць, перабягаючы рады вінаграду, што дало варце магчымасьць іх бачыць. Яны пачалі страляць у гору й крычаць: «Стоп! Стоп!» Нарэшце, ім удалося злавіць 2-х італьянскіх уцекачоў. Конрад прысеў пад вінаграднік і калі ўжо ўсё прыціхла, узяў вядро ад італьянца й разам зь імі пачаў зьбіраць вінаград. Вартавыя не заўважылі яго, бо ён быў у цывільнай вопратцы. Набраўшы з паўвядра вінаграду, папытаўся ў гаспадара, дзе ягоная хата, каб пакінуць вядро зь вінаградам. Той паказаў пальцам і з злосьцю сказаў: «Віл фашыста». Конрад узяў вядро й паволі пайшоў у кірунку хаты, паставіў вядро каля

дзьвярэй і накіраваўся йсьці да мястэчка ў адлегласьці 14 кіламэтраў. У гэтым мястэчку жыла жонка журналіста, прыяцеля Конрада В.Куэрэль. Ён быў выпушчаны зь лягеру шмат раней і зь ім было дамоўлена, што пры патрэбе Конрад можа скарыстаць яго дом, куды ён і накіраваўся. Незадоўга ўбачыў чалавека зь вядром вінаграду, у якім пазнаў аднаго з уцекачоў з лягеру. Італьянец моцна пакалечыўся, пералазячы праз калючую загародку. Конрад парадзіў пакінуць вядро, бо яны ўжо далёка адыйшлі ад лягеру, і завёў яго ў адну хату пры дарозе. Там той абмыўся з крыві, і яму перавязалі раны. Падзякаваўшы за зробленую паслугу, рушылі ў дарогу.

Аказалася, што гэты італьянец ня быў прыгатаваны да ўцёкаў. А зрабіў гэта таму, бо пабачыў, як другія ўцякаюць. Ён ня меў ніякіх грошаў, быў у лягернай вопратцы, не пабрыты, з доўгімі валасамі. Італьянец быў у разгубленасьці, ня ведаў куды йсьці. Конрад прапанаваў ямуісьці разам зь ім.

Ужо добра сьцямнела, калі яны ўвайшлі ў мястэчка па прызначэньню. Італьянцы сядзелі каля хатаў упоцёмках, асьвятленьня яшчэ ня было, пілі віно й моцна гаманілі. Трэба было знайсьці вуліцу ў дом уцёмку, што было немагчымым, бо людзі, у якіх яны пыталіся, маглі-б зьвярнуць увагу на чужынцаў ды падказаць міліцыі. Конрад пастанавіў знайсьці касьцёл і там дастаць інфармацыю. Скіраваўся ў цэнтр гораду. Хутка натрапілі на касьцёл, адчынілі брамку й зайшлі ў касьцёльны дом. Ксёндз, убачыўшы двух незнаёмых, моцна спалохаўся. Конрад яго супакоіў, запэўніўшы яго, што яму няма ніякае небясьпекі, перапрасіў яго за клопат яму створаны й сказаў, што будзе яму ўдзячны, калі ён завядзе іх да дому, падаючы адрас на картцы. Ксёндз паглядзеў на картку, усьміхнуўся й сказаў: «Хадзіцё за мною». Прайшоўшы некалькі вуліц, ксёндз пагрукаў у дзьверы. Жанчына выйшла й затрымалася. Ксёндз сказаў: «Выбачайце, але гэта не мая віна. Гэтыя дзьве асобы папрасілі мяне, каб я паказаў ваш дом».

—Я Конрад Мацкевіч, ваш адрас даў мне Вітторэ Куэрэль.

—А, сёнёр Конрадо, калі ласка, у хату, мой муж пра вас мне гаварыў.

Сям'я Куэрэль прыняла Конрада й яго спадарожніка вельмі гасьцінна й дала начлег. На жаль, Вітторэ ня быў дома, жонка ска-

зала, што ён знаходзіцца у Рыме, і яны мяркуюць таксама туды ўсе перабрацца.

Назаўтра сёнэра Куэрэль купіла ім два білеты на аўтобус да чыгуначнай станцыі.На станцыі яны купілі два білеты да Рыму. Правёўшы вольны час у парку, пад вечар яны ўлякаваліся ў вагоне й пачалі драмаць.

8-га кастрычніка 1946 года Конрад і яго спадарожнік прыбылі ў Рым, на станцыю Тэрмпні.

На станцыі ў Рыме спадарожнік Конрада патэлефанаваў сваёй маці, якая, не чакаючы доўга, прыбыла й спаткалася з сынам. Яна зьвярнула грошы Конраду, якія ён расходаваў на яе сына й дамовілася, што яна адвязе Конрада туды, дзе ён мае затрымацца. Тады сама паедзе з сынам недзе да знаёмых, каб міліцыя яго не знайшла.

Граф Аляксандр Вронскі-Карачы ўлякаваў Конрада ў памешканьні свае цёткі, якая была яшчэ на адпачынку ў Сыцыліі. Памешканьне знаходзілася над берагам ракі Тыбэр у прыгожай часьці горада й складалася зь дзевяці пакояў. Прыяцель Конрада прадставіў яго супэрінтэндэнту дому як сёнэра Канстанціно Мерляка, сваяка з Польшчы. А дзеля таго, што ён выяжджае за які месяц у Амэрыку, дык яго ня трэба мэльдаваць у міліцыі. Першым даручэньнем было дакумэнтальна пераіменаваць Конрада Мацкевіча на Канстанціно Мерляка, якое ўзяў на сябе Вронскі-Карачы. Адыходзячы, ён сказаў: «Карыстайся усім, што табе патрэбна».

Аляксандр Вронскі-Карачы меў шырокае знаёмства ў Рыме й цесныя сувязі з Ватыканам. Ён быў жанаты із сьпявачкай і кінаактрысай, якая выступала пад псэўданімам «Дэды Монтана». Адзін з найслаўнейшых яе фільмаў называўся «Удваіх цярпець лягчэй».

На другі дзень Аляксандр прынёс купоны на бясплатнае сталаваньне ў Ватыканскай сталоўцы, якая была створаная й добра абсталяваная для замежных уцекачоў, пакрыўджаных вайною. Адыходзячы, Аляксандр зьвярнуў увагу, што купоны выпісаныя для Канстанціно Мерляк. Усьміхаючыся, ён дадаў, каб больш прозьвішча Кастусь ніколі не мяняў. Праз два дні Аляксандр прынёс адрас духоўнай сэмінарыі «Русікум» і сказаў, што там ёсьць беларускія сьвятары, якія могуць памагчы зрабіць адпаведныя

дакумэнты. Кастусь, не губляючы часу, паехаў у «Русікум» і там знайшоў айца Льва Гарошку. Айцец Леў Гарошка выслухаў гісторыю Кастуся, паставіў некалькі пытаньняў, каб праверыць яго праўдзівасьць, і сказаў, што ён зробіць усё магчымае, каб палагодзіць справу дакумэнтаў. Сказаў, каб Кастусь назаўтра прыехаў да яго ў «Русікум».

Айцец Леў Гарошка й Кастусь назаўтра паехалі на «Віа Корсіка» ў Дом Марыянаў, дзе знаходзіўся айцец Чэслаў Сіповіч. Супэр'ёр Дому Марыянаў выдаў Канстанціно Мерляк адпаведнае пасьведчаньне з датаю 27 кастрычніка 1946 году. Гэтае пасьведчаньне й рэкамэндацыя Ватыканскай камісіі дапамогі пад № 1800, выдадзеныя 30 кастрычніка памаглі Кастусю атрымаць 5 лістапада 1946 г. пашпарт Чырвонага крыжа ў Рыме пад № 1662. Такім чынам, гэтага дня закончылася эпапэя Конрада Мацкевіча, а Кастусь Мерляк распачаў новы этап свайго жыцьця. Прыблізна ў гэтым часе Кастусь даведаўся, што ягоны спадарожнік уцёкаў быў арыштаваны падчас адведак жонкі й адасланы назад у той самы лягер.



# Рым

Вярнуўшыся да «сябе», Кастусь распачаў дзейнічаць, каб забясьпечыць сваё існаваньне ў Рыме на сёньня й думаць пра эміграцыю ў недалёкім будучым. Першай акцыяй было навязаньне лучнасьці із сваякамі ў Амэрыцы й Бразыліі Будучы ў лягеры, ня меў магчымасьці гэтага зрабіць дзеля цэнзуры, а тым больш, што там прабываў пад чужым прозьвішчам.

Айцец Чэслаў Сіповіч быў адзін з найактыўнейшых асобаў, вакол якога зьбіраліся беларусы, што пражывалі ў Рыме. Пры яго дапамозе Кастусь пазнаёміўся з пралатам Пётрам Татарыновічам, які пражываў у «Русікум», з вайскоўцамі генэрала Андэрса, А. Лашуком, П. Конюком і Г. Юзэфовічам. Яны парадзілі Кастусю наведаць польскі камітэт, які даваў дапамогу патрабуючым уцекачам.

Польскі камітэт займаў вялікае памешканьне й меў нямала працаўнікоў і дарадцаў. Камітэт разьдзяляў дапамогу для ўцекачоў, якую атрымоўваў з УНРРА (Інтэрнацыянальнай арганізацыі дапомогі ўцекачам), пазьней з І.Р.О.

Кастусь зарэгістраваўся ў польскім камітэце як беларус, польскі грамадзянін (абывацель) бязь ніякіх клопатаў ды пачаў атрымоўваць прызначаную яму дапамогу. Тут-жа ён спаткаў свайго зямляка Пятра Яблонскага. Той быў асабістай прыслугай вайсковага біскупа Гавліны ў арміі генерала Андэрса. Дзеля гэтага Яблонскі займаў пакой у студэнцкім доме (колегіо ірляндэзэ). Калі ён даведаўся, што Кастусь павінен выбірацца з кватэры з прычыны павароту з Сыцыліі цёткі графа Вронскі-Карачы, запрапанаваў Кастусю жыць зь ім у пакоі студэнцкага дому. Справу дазволу жыць ня студэнту ён палагодзіў пры дапамозе біскупа Гавліны. У першай палове лістапада 1946 году Кастусь пераехаў жыць у польскі студэнцкі дом, дзе жыў аж да выезду ў Аргентыну.

Кастусь, забясьпечыўшы сабе сякое-такое існаваньне, пачаў разглядацца, што рабіць далей? Патрэбныя былі грошы. Іх трэба было недзе зарабіць альбо йсьці «шукаць». У той час, у Рыме, шуканьне грошаў было вельмі папулярным заняткам.

Паваеннае эканамічнае, палітычнае й сацыяльнае становішча было моцна разбуранае ў Італіі. Прысутнасьць вялікай колькасьці

Альянцкіх войскаў, палонных й уцекачоў розных нацыянальнасьцей стварылі нагоду знайсьці грошы, асабліва ў вялікім і перапоўненым людзьмі Рыме. Гэта рабілася рознымі спосабамі. Адным зь іх была рэгістрацыя адрасу ў некалькіх камітэтах, як, напрыклад, у польскім, украінскім, расейскім, каталіцкім, праваслаўным, у УНРРА, І.Р.О. і г.д.

Першым заняткам Кастуся былі пераклады з польскае на ангельскую або італьянскую мовы розных справаў, а найчасьцей артыкулаў у газэты, якімі забясьпечваў Кастуся польскі камітэт.

Прафэсар Віленскага ўнівэрсытэту Уладыслаў Студніцкі патрабаваў сабе сакратара-машынапісца. У Камітэце паракамэндавалі яму Кастуся. Такім чынам, Кастусь дастаў сталы занятак— друкаваньне на машынцы пад дыктоўку прафэсара студэнцкай кніжкі «Амэрыка Полуднёва з увзгледненьнем Аргентына». Прафэсар Студніцкі па свайму палітычнаму погляду належаў да эндэкаў, знаў вельмі добра Беларусь, яе народ і добра гаварыў па-беларуску. І вось аднаго дня ён зьвярнуўся да Кастуся: «Няхай пан мне не пярэчыць, але я ведаю, што вы, пане Мерляк, ёсьць беларус, а не паляк. Не прыймайцеся, гэта нічога, я вельмі рады, што вы мне памагаеце пісаць кніжку, якая ёсьць сёньня вельмі патрэбная для эміграцыі».

Жонка прафэсара Студніцкага выкладала ангельскую мову для жаўнераў у Рыме. На кватэры ў іх цэлы пакой быў завалены прадуктамі: усякага роду кансэрвамі, якія атрымоўвалі з УНРРА, мукою, салам і шынкай, прывезенай зь Вільні. Кастусь моцна дзівіўся, якім чынам яны маглі ў такой колькасьці прывесьці шынку зь Беларусі?

Па выезьдзе прафэсара Студніцкага ў Англію Кастусь уладзіўся на працу як сакратар-перакладчык у Аб'еднаньне польскіх тэхнікаў у В.Брытаніі, аддзел у Італіі. Пасьля пайшоў працаваць у якасьці асыстэнта кіраўніка Мэдытэранеан Дыстрыбютэрс Ко. ў Рыме. Восеньню 1947 году Кастусь мусіў пакінуць працу ў гэтай кампаніі, бо чужынцы ня мелі права працаваць у Італіі пасьля падпісаньня мірнага дагавору ў Парыжы. Кампанія мусіла прыняць двох італьянцаў на ягонае месца.

У першых днях па прыезьдзе ў Рым Кастусь напісаў ліст да шэфа паліцыі гораду Вільмінгтон, штату Дэлявэр, з просьбай, каб

ён даручыў залучаны ліст Юліяну Пятроўскаму, бо ён забыўся яго дакладны адрас.

Прайшло каля трох месяцаў, аж Кастусь атрымоўвае ад Пятроўскага дзесятку даляраў, запрошаньне прыехаць у Амэрыку (афідэвіт) і білет на параплаў з адкрытай датай.

Толькі у 1955 г., пасьля дзевяці гадоў, Кастусь даведаўся, што ягоны ліст і факт, што шэф паліцыі гораду Вільмінгтон асабіста прывёз ліст ім ў дом, зрабілі вялікае ўражаньне на Пятроўскіх і яго суседзяў.

Маючы ўсе патрэбныя паперы на выезд у ЗША, Кастусь паехаў у Амэрыканскі кансулят у Наполі, каб дастаць візу. У кансуляце яго зарэгістравалі на эміграцыю ў ЗША, але сказалі, што ён павінен чакаць каля пяці гадоў на сваю чаргу, бо настолькі польская квота была ўжо перапоўненая. Для Кастуся гэта было вялікае расчараваньне. У чэрвені 1947 г. Кастусь атрымаў ад свайго дзядзькі Юрыя Мерляка афіцыяльнае запрошаньне ў Бразылію. Але Бразылія не імпанавала ды выехаць у той час ня было так лёгка дзеля недахопу транспарту.

У адзін прыгожы падвячорак, у касьцюме, купленым у лягеры, бяз гальштука, паволі ішоў Кастусь да Фантана Трэві, праз пляц Барбэрыні, уздоўж вія Вэнэто, праз браму ўвайшоў у парк Вільля Боргэзэ. Там была цішыня й там-сям можна было бачыць адзінокія асобы, задуменыя як і ён, паволі варушыліся між векавымі дрэвамі. Кастуся ня раз падзіўляў вечны горад Рым, цудам захаваны ад ваеннага зьнішчэньня. Проста не наглядзецца на манумэнтальныя працы геніяльных мастакоў і архітэктараў, помнікі й будовы якіх пратрывалі цэлыя стагодзьдзі. Ён ніколі ня думаў, ніколі ня мог адважыцца нават марыць, што ён зможа калі-небудзь пабачыць слаўны Рым. І вось ён тутака. Жыцьцёвы лёс, ня пытаючыся, прывёў яго сюды. І думкі яго пайшлі гэтым самым шляхам назад, дадому, да свае вёскі, да родных і прыяцеляў, якія засталіся там у цяжкіх умовах жыцьця, а можа хто зь іх і ня жыве?

Задуменны, нават і не заўважыў, што падыйшоў да берагу вэранды й затрымаўся якраз там, дзе калісьці стаяў Напалеон, заложыўшы руку за пазуху, ды пазіраў уздоўж шырокае віяле Консільяціонэ, якая вяла на пляц Ватыкану й упіралася ў калюмнады Базылікі сьв. Пятра.

—Цыгарэттэ сінёрэ!— Гэткімі словамі, прапануючы папяросы, перарваў думкі стары італьянец.

Кастусь проста машынальна выняў астатнія дзесяць ліраў і купіў адну цыгарэту «Камэдзь» ды закурыў яе. Ён пачуў прыемны запах, стала нейк лёгка на душы й пачуўся задаволеным, шчасьлівейшым, нават забыўся, што ён быў галодным, бо нічога ня еў ад раньня. Ад гэтага дня ён і пачаў курыць.

У вольны час, якога не бракавала, Кастусь часта спатыкаўся зь беларусамі, наведаваў «Русікум» і Дом Марыянаў У Доме Марыянаў адсьвяткавалі ў 1947 годзе 25 Сакавіка, дзень абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Тут Кастусь спаткаў прысутных гасьцей з Францыі: а.Францішa Чарняўскага й інжынера Лявона Рыдлеўскага, якія прыехалі як беларуская дэлегацыя да Ватыкану. Наступнага дня беларуская група пад кіраўніцтвам а.Ч.Сіповіча наведалі Базыліку сьв.Пятра, слаўны Ватыканскі музэй ды іншыя гістарычныя аб'екты.

Кастусь таксама браў актыўны ўдзел у таварысцкім жыцьці сваіх прыяцеляў італьянцаў, кола якіх павялічылася праз навязаньне лучнасьці зь сябрамі зь лягеру. Граф Вронскі—Карачы й яго жонка артыстка Дэды Монтана часта запрашалі да сябе на прыняцьці з розных нагодаў, а перадусім на опэры й канцэрты. Не абыйшлося бяз розных прапановаў для «комэндатроэ Канстанціно», што рабіць і чым заняцца, каб асесьці настала ў Італіі. Нават былі прапановы ажаніцца, зараз-жа сватаючы «сінёрыну», пры гэтым зазначаючы, што яна з багатай сям'і. У такіх выпадках Кастусь гаварыў, што выяжджае хутка ў Амэрыку, паказваючы білет на параплаў, а гэта яшчэ больш давала важнасьці ў вачох італьянцаў.

З хвілінай падпісаньня мірнага дагавору ў Парыжы італьянскія ўлады пачалі рэгістраваць і правяраць кожныя тры месяцы чужынцаў і ставіць пытаньні, калі й куды мае намер выехаць. Кастусю з гэтым ня было клопату, бо меў запрошаньне й білет ў Амэрыку, а толькі чакаў на візу. Усе вайсковыя адзінкі пачалі выяжджаць зь Італіі, у тым ліку й беларусы з войскам генэрала Андэрса выехалі ў Англію, толькі застаўся П.Конюх, які прадаўжаў свае студыі сьпеву.

Такія абставіны змушалі Кастуся паважней заняцца эміграцыяй. Ён даведаўся што лёгка можна выехаць у Вэнэзуэлю зь

перасадкай ў ЗША, тым больш, што меў білет да Нью-Ёрку. А калі надарыцца па дарозе нагода застацца ў Амэрыцы, варта зрызыкаваць. Кастусь пачаў вырабляць дакумэнты на выезд.

З рэкамэндацыяй монсінёра Мэйштовіча, кананістага й дарадчыка польскае амбасады пры Ватыкане, із пашпартам, выданым летувіскім консулям І.Лазорайтіс, удалося вырабіць візу ў Вэнэзуэлю. Засталося толькі чакаць на транспарт.

Каб ня губляць часу, Кастусь запісаўся на курсы кіраваньня самаходам. Злажыў заяву ў польскі камітэт, які прызначыў стыпэндыю ў вышыні поўнае аплаты. Па заканчэньні курсу ён дастаў «патэнтэ» на права кіраваньня самаходам у Італіі.

Кастусь часта наведваў пралата П.Татарыновіча, які заўсёды частаваў сваіх гасцьей лікёрам «Стрэга». Аднаго разу запрапанаваў Кастусю перапісаць на машынцы з лацініцы на кірыліцу кнігу «Куо Вадзіс» Г.Сянкевіча, якую ён пераклаў з польскае на беларускую мову. Кастусь ахвотна згадзіўся. Забраў машынку й рукапіс ды ўзяўся за працу. Калі быў змучаны, дык, каб адпачыць, выяжджаў зьведаць гістарычныя месцы, што апісваліся ў кнізе. Спачатку зьведаў бліжэйшыя Колісэум, Форум Романо, Тэрмі Каракала, Катакомбы. З далейшых мясьцінаў: Вія Апія, Віядутто Романо ды шмат іншых помнікаў і руінаў старажытнага Рыма.

У канцы лістапада, калі перапісваньне кнігі падыходзіла да канцу, да Кастуся завітаў пралат П. Татарыновіч. Яго візыта моцна зьдзівіла Кастуся, і ён падумаў, што мусіць быць нешта важнае. І сапраўды так было. Пралат, заняўшы месца ў крэсьле, спакойна спытаў, ці шмат засталося да заканчэньня. Адказ быў, што патрэба толькі адзін дзень.

—Ну, то вельмі добра. Канчай і зьбірайся выяжджаць з групай харватаў у Аргентыну. Вось тутака ўсе патрэбныя інфармацыі. Будзь гатовы на станцыі Тэрміні 2-га сьнежня а 5-й гадзіне па паўдні, дзе мы спаткаемся перад адʼездам у Гэнса.

Кастусь аж падскочыў з радасьці. Моцна дзякаваў пралату за спрытнае й ціхае палагоджаньне справы эміграцыі. Да адʼезду засталося толькі пару дзён, якія Кастусь выкарыстаў палагодзіць свае асабістыя справы ды разьвітацца з прыяцелямі. У Гэнове аргентынская эміграцыйная дэлегацыя на Эўропу памясьціла эмігрантаў у адпаведны будынак. На працягу двух дзён, кожны кан-

дыдат на выезд прайшоў камісыю па здароўю і па афармленьню дакумэнтаў. Кастусь атрымаў дакумэнт-візу, выданай аргентынскай дэлегацыяй, білет № 09256 на аргентынскі параплаў «Тукуман» і 100 пэзаў на дарогу. Адплылі з Гэноа да Буэнос Айрэс 6 сьнежня 1947 года.

# Буэнос Айрэс

Параплаў«Тукуман» быў запоўнены эмігрантамі па нацыянальнасьці харватамі, а па партыйнай прыналежнасьці «усташамі» (Усташа—харвацкая нацыянальная партыя). Акрамя іх былі эмігранты другіх нацыянальнасьцей, але не ў вялікай колькасьці: палякі, славенцы, славакі, альбанцы, некалькі украінцаў і адзін беларус. Падарожжа да Аргентыны было цікавае й вясёлае, бо на параплаве усяго хапала, нават віна. Надвор'е цэлы час было спакойным, толькі ўжо насупраць бразылійскага пабярэжжа, дзень перад прыездам да Буэнос Айрэс, усхадзілася вялікая бура й моцна калыхала параплаву, так што Кастусь праляжаў у ложку паўтара дня й ўстаў толькі, калі пачуў крыкі: «Буэнос Айрэс!»

23 сьнежня 1947 года Канстанціно Мерляк прыбыў у Буэнос Айрэс. Гэтага-ж дня выдалі асабістыя дакумэнты (цэдула дэ ітэнтідад) ды паказалі эміграцыйны гатэль, які знаходзіўся каля пляцу «Рэтіро».

У гатэлі затрымоўваліся ўсе новапрыбыўшыя эмігранты на час пакуль ня ўладзяцца на працу ды пакуль ня знойдуць сабе памешканьня. У той час на працу можна было ўладкавацца даволі хутка, але было цяжэй з памешканьнем, асабліва для сямейных.

Гэта быў летні сэзон у Аргентыне. У горадзе было даволі горача для прыежджых, але настрой навокал быў сьвяточны, бо гэта было напярэдадні куцьці перад Калядамі. Кастусь са сваімі спадарожнікамі выйшлі зьведаць бліжэйшую частку горада, ідучы па вуліцы сталі пацець, калі пабачылі ў вакне вялікага Дзеда Мароза, апранутага ў зімовую вопратку зь белым каптуром. Ён глядзў на іх і сьмяяўся з таго, што яны пацелі, а яму было хоць-бы што.

У эміграцыйным гатэлі Кастусь зь іншымі спадарожнікамі спаткаліся з прадстаўнікамі польскага таварыства імя Главацка-

га, якія запрасілі іх на куцьцю ў клюб. Яны гэта рабілі для сваіх «родакув» кожны раз, калі прыходзіў параплаў з эмігрантамі.

Нягледзячы на тое, што ў дакумэнтах Кастуся было запісана па прафэсыі «агрыкольторэ» (земляроб), каб было лягчэй выэміграваць, ён не зьбіраўся ехаць дзесьці далёка за горад капаць зямлю ды садзіць бульбу. Кастусь купіў газэту «Буэнос Айрэс Гэральд» на ангельскай мове ды пачаў сачыць за абвесткамі, у якіх шукаліся людзі на працу. Праз гэтую газэту дастаў працу ў «Сіты гатэль» як памочнік багажнага портэра, г.зн. вазіў віндаю багаж у пакоі або вывозіў з пакояў ды памагаў ладаваць у самаход ці наадварот, у залежнасьці прыяжджаў госьць ці ад'яжджаў.

За працу плацілі месячны заробак, месячнае харчаваньне і даходзіў барыш, які быў ня надта вялікі. З барышом аднаго разу ўзьнікла непаразуменьне, бо багажовыя атрымоўвалі барыш, але не дзяліліся з памочнікам. Аднойчы, калі Кастусь атрымаў тры пэзы барышу, гэта заўважыў старэйшы багажовы. Ён падыйшоў да Кастуся й сказаў, што яму належыцца палова барышу.

—Вы атрымоўваеце барыш, аднак са мною ня дзеліцеся.

—Так, бо толькі памочнікі дзеляцца, — адказаў багажовы.

—Дык калі так, то глядзіце,—Кастусь выняў зь кішэні тры пэзы, парваў іх на кавалачкі й пусьціў на вецер.

Багажовы ледзь не самлеў. Ачуняўшы, пайшоў на сваё месца. Ад гэтага часу ніхто не дамагаўся паловы барышу ды пачалі адносіцца да яго з асаблівай павагай.

Раз, ідучы на працу, Кастусь вычытаў у газэце, што патрабуецца бухгалтар ў галяндзкую параплаўную кампанію. Ён зайшоў у кафэйную, папрасіў паперы, напісаў заяву, занёс у гэтую кампанію й ўсунуў пад дзьверы (бо было яшчэ рана й канцылярыя была зачыненая). Пасьля некалькіх дзён атрымаў запрошаньне прыйсьці ў кампанію на перамовы ў справе працы. Інтэрв'ю ня было доўгім. Кастусь быў прыняты на працу, аднак запрапанаваная плата была такая самая як у гатэлі, але без харчаваньня. Прэзыдэнт і галоўны кіраўнік сказалі, што больш плаціць ня могуць і далі падумаць два дні.

Кастусю прыйшлося другі раз выбіраць эканамічную галіну, у якой працаваць. (Першы раз выбар паўстаў пры Саветах, калі ён пасьвяціў нямала часу, каб даведацца, дзе лепш плацяць. Ён вы-

браў Дзяржбанк. Аказалася, што Дзяржбанк плаціў найлепш сваім канцылярыйным працаўніком, і ён не памыліўся. Яшчэ ў Італіі думаў, дзе будзе найлепш працаваць, калі ён выедзе на эміграцыю. Па пэўным часе дайшоў да высновы, што марскі транспарт, калі на гэта здарыцца нагода, будзе найлепшым выбарам. Дзеля гэтага ён пастанавіў узяць гэтую працу, бо ў гатэль зь яго веданьнем мовы заўсёды можна вярнуцца. На другі дзень пайшоў у кампанію і заявіў, што працу прымае.

Галоўны кіраўнік сэньёр Г.Г. Обэрман сказаў: «Калі так, мы будзем плаціць на 30 пэзаў у месяц больш.» Кастусь пайшоў у «Сіты» гатэль, заявіў у канцылярыі, што за тыдзень пакідае працу. У гатэлі Кастусь працаваў ад 6-га да 31 студзеня 1948 году. У кампаніі Марытыма Голяндэса (Аргентына) С.А.К. (Compania Maritima Holandesa Argentina) S.A.C) пачаў працаваць 8-га лютага 1948 году. Да канца году Кастусь атрымаў тры падбаўкі ў аплаце за працу.

Кастусь пакінуў сваю часовую кватэру ды перайшоў жыць у гатэль «Парада», у цэнтры гораду пры вуліцы Рывадавія, з адным аргентынцам ў пакоі, каб плаціць меньш ды практыкаваць гішпанскую мову. Сталаваўся ён у тым-жа гатэлі.

Маючы працу й памешканьне, Кастусь узяўся вывучаць гішпанскую мову, бяручы вечарамі, тры разы на тыдзень, лекцыі ў прафэсара Руссо. Гэтак распачалося новае жыцьцё ў новым сьвеце ў экзатычнай краіне Аргентыне, у славутым і тэмпэрамэнтным горадзе Буэнос Айрэс.

Пасьля васьмі гадоў жыцьця ва ўмовах жахлівай другой сусьветнай вайны, прыйшоў спакойны час працы, навукі й грамадзкай дзейнасьці, але далёка, далёка ад родных, ад прыяцеляў, ад роднай вёскі й ад Бацькаўшчыны

Далей асабістае жыцьцё прайшло нармальным шляхам. Кастусю заняло больш за год апанаваць гішпанскаю моваю. У міжчасе прэзыдэнт кампаніі Т дэ Бор запрапанаваў вучыцца галандзкае мовы за кошт кампаніі , але Кастусь адклаў гэта на пазьней, матывуючы, што ён яшчэ вучыцца далей гішпанскай мове. А ў сутнасьці таму, што мовы яму надакучылі ды ня меў часу на іх з-за грамадзкіх абставінаў.

Ад 1-га студзеня 1950 году Кастусь заняў становішча заступніка шэфа бухгалтэрыі й фінансаў кампаніі, уласьнікам якой

быў галандзец Х.Ляндсмер. Новая пасада была з падвышанай платай. Калі на пачатку працы ў параплаўнай кампаніі ягоны заробак раўняўся заробку кваліфікаванага працаўніка на фабрыцы, то цяпер падвоіўся, а праз год патроіўся.

У самым канцы сьнежня 1948 году прыбыла ў Аргентыну, з Аўстрыі, сям'я Антона Губэрта, разам з дачкой Ганнай. Першы раз Кастусь спаткаўся з Ганнаю на Калядным вечары 1949 году, які ўпершыню ладзіўся Згуртаваньнем Беларусаў у Аргентыне. Першае знаёмства перайшло ў прыязень, потым у сымпатызаваньне, а пазьней у глыбейшае пачуцьцё, якое прывяло да сужэнства.

1-га верасьня 1950 году Кастусь і Ганна зарэгістраваліся ў гарадзкой управе Буэнос Айрэс як муж і жонка, а 16-га верасьня ўзялі шлюб у Ўкраінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай царкве пры вуліцы Суіпача Буэнос Айрэс. Вянчаў іх айцец пратаярэй Барыс Арыйчук. Вясельле адбылося ва ўкраінскім клюбе таварыства «Відрожаньне» паводля беларускай традыцыі: з сватамі, дружкамі, дружбакамі .

Пару месяцаў перад вясельлем Кастусь перабраўся жыць у прыгарадак Валентын Альсіна. Там з Ганнай яны й жылі пасьля шлюбу аж да выезду ў Амэрыку.



*Ганна Губэрт і Кастусь Мерляк у дзень шлюбу 16 верасьня 1950 г.*

Наступнай вялікай падзеяй ў жыцьці Кастуся й Ганны было нараджэньне 4 сакавіка 1952 году першага сына. Ахрысьціў яго айцец Барыс Арыйчук, імя народжанаму далі Юліян, Усевалод. Цывільныя ўлады не прызналі імя Усевалод, таму што на каталіцкім сьпіску такога імя няма. Кастусь з гэтай устаноўкаю не згадзіўся й падаў на апэляцыю, але, нажаль, яна была адхілена. Такім чынам, на царкоўнай мэтрыцы напісана Юліян, Усевалод, а на ўрадавай Юліян, Антон.

У канцы 1953 году Кастусь і Ганна паехалі ў горад Кільмэс, недалёка ад Буэнос Айрэс, побач якога будаваўся новы пасёлак, з мэтай нагледзець сабе дом. Мясцовасьць была прыгожай, зручны даезд цягнікам да гораду Буэнос Айрэс. Дом ім таксама спадабаўся. Пастанавілі яго купіць.

Аднак Кастусь не хацеў сьпяшацца з купляй, хаця жонка яго патроху падганяла. Ён не хацеў, каб засталіся нязьдзейсненымі ягоныя мары ад дзяцінства выехаць ў Амэрыку. Як раз у гэтым часе на працы прынесьлі яму кучу справаў да палагоджаньня і між паперамі была памылкова ўкладзена тэлеграма зь Нью-Ёрку, у якой пыталіся, якія ёсьць магчымасьці ў порце Буэнос Айрэс для разладаваньня пшаніцы. Нягледзячы на тое, што эканамічнае становішча было добра ведамае Кастусю, ён ніколі не спадзяваўся, што Аргентыне трэба будзе імпартаваць пшаніцу. Ніякіх магчымасьцей разладоўваць збожжа ў Аргентыне не было, бо на працягу яе існаваньня збожжа экспартавалі, а не імпартавалі.

Вось гэтыя два мамэнты заставілі Кастуся зайсьці да Амэрыканскага кансуляту ды праверыць, як стаіць справа зь яго выездам, бо ён свайго часу перавёў сваю рэгістрацыю на выезд у ЗША зь Наполі ў Буэнос Айрэс. Зрабіў гэта перад тым, як йсьці даваць задатак на дом і зложыць заяву на пазыку. Консул, які быў знаёмы з Кастусём ад даўжэйшага часу, сказаў, што калі ён ня выядзе ў гэтым годзе, то яго чарга прападзе, і ён ніколі ня зможа эміграваць ў Амэрыку.

Калі Кастусь вярнуўся да дому, Ганна запыталася, ці ўсё ён палагодзіў. Кастусь адказаў, што ён нічога не палагодзіў, бо яны выяжджаюць у Амэрыку.

Кастусь зараз-жа пачаў вырабляць патрэбныя паперы й прыгатаўляцца на выезд. На параплаве свае кампаніі «Альфэрат», зь

бясплатным білетам для Ганны й Юліка, Мерлякі адплылі ў ЗША 1-га ліпеня 1954 году. Перад ад'ездам было зладжанае разьвітаньне з сябрамі беларусамі й з супрацоўнікамі кампаніі. Кастусь, разьвітваючыся, прыабяцаў вярнуцца ў Аргентыну, а прэзыдэнт кампаніі, ўручаючы Ганне букет ружаў, пажадаў: "Good Luck"!



*Управа Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне, Буэнос Айрэс 1950 г. Стаяць зьлева направа: Іван Вашчыловіч, Кастусь Мерляк, Васіль Казлоўскі. Сядзяць зьлева направа: Мікалай Ланкевіч, Уладзімір Другавец і Лявон Петраш.*

# Беларусы ў Аргентыне

Аргентына па сваёй велічыні ёсьць другой краінай у Паўдзённай Амэрыцы. Яе тэрыторыя абыймае 1,084,439 кв. міляў і расьцягваецца ў даўжыню каля 2,300 міляў, а ў шырыню каля 1,000 міляў ад рэкаў Ля Плята й Парана на поўначы аж да Вагністай Зямлі на поўдзень; ад Атлянтыцкага акіяна да Андыйскіх гораў. Паводля статыстыкі 1951 году, Аргентына налічвала насельніцтва 19,108,000, а большая палавіна пражывала ў Буэнос Аўрэс і яе правінцыі.

Аргентына ёсьць фэдэральная рэспубліка, у якую ўваходзяць 22 правінцыі й фэдэральная акруга сталіцы Буэнос Айрэс. На чале рэспублікі стаіць прэзыдэнт і ён-жа выконвае функцыю прэм'ер-міністра. У 1946 годзе на прэзыдэнта быў выбраны палкоўнік Хуан Д. Пэрон. Яго жонка Эва Дуартэ дэ Пэрон была вельмі актыўнай у палітычным і грамадзкім жыцьці рэспублікі. Сваёю дзейнасьцю яна здабыла вялікую папулярнасьць насельніцтва й мела моцны ўплыў на сындыкат працоўных. Пасьля яе сьмерці 26 ліпеня 1952 году аслабела падтрымка грамадзтвам палітыкі ўраду.

Генэрал Пэрон быў адначасна кіраўніком партыі Хустыц'яліста (Справядлівасьці), якая была пазьней пераіменаваная на партыю Пэроніста. Побач з партыяй Пэроніста існавалі й афіцыяльна дзейнічалі партыя Дэмакратычных радыкалаў (галоўны апазыцыянер партыі Пэроніста), Саюз нацыяналістаў і Камуністычная партыя.

Нягледзячы на тое, што Аргентына ў сакавіку 1945 году ўступіла ў вайну на боку Аліянтаў супраць дзяржаваў «Восі», вонкавая палітыка была накіраваная на стварэньне трэцяе сілы ў сьвеце. Гэта значыць да існуючых двух блёкаў: камуністычнага пад гэгэмоніяй Савецкага Саюзу, капіталістычнага пад гэгэмоніяй Амэрыкі—мусіў далучыцца й блёк Хустыц'ялістаў пад гэгэмоніяй Аргентыны. Такая палітыка разыходзілася з палітыкай Амэрыкі й яна нацягвала на сябе непрыемныя наступствы.

Бязумоўна, генэрал Пэрон зрабіў вялікія сацыяльныя рэформы, а здабыты капітал падчас вайны дапамог падняць узровень жыцьця ды паставіць Аргентыну на першае месца ў Паўдзённай Амэрыцы.

Эканамічнае жыцьцё кіравалася ўрадавай інстытуцыяй «Аргентынскі інстытут разьвіцьця й абмену» згодна дактрыны Хустыц'яліста. Дактрына Хустыц'яліста палягала на тым, што інстытут закупліваў усе гаспадарчыя прадукты, прызначаныя на экспарт, (усякага роду збожжа, мяса, скуры, фрукты і г.д.) па загадзя ўстаноўленых цэнах ды экспартаваў іх за граніцу. Земляўласьнікі, аблічыўшы кошт прадукцыі ды забавязаньні паводля сацыяльных рэформаў, пабачылі, што яны перавышаюць устаноўленыя цэны. Яны перасталі сеяць і гадаваць жывёлу, у выніку чаго узровень жыцьця пачаў падаць.

Канфлікт, які ўзьнік між урадам і каталіцкаю царквою ў 1954 годзе, палітыка стварэньня трэцяе сілы ды эканамічны застой давялі да таго, што марское й сухапутнае камандаваньне збройных сілаў скінулі ўрад, а Прэзыдэнта Пэрона выслалі ў выгнаньне.

Прэзыдэнтам Аргентынскае рэспублікі быў назначаны збройнымі сіламі генэрал Эдуардо Лёмбардзі, які ў сваю чаргу быў скінуты й заменены генэралам Пэдро Арамбуру, які быў праціўнікам пэранізму. Ён і яго наступнікі давялі сваёю палітыкаю Аргентыну да таго, што Пэрон вярнуўся назад і быў выбраны ізноў на прэзыдэнта. Але гэта не памагло: краіна паступова бяднела, а палітычныя непаладкі сапхнулі яе да эканамічнага заняпаду й скрайняе беднаты.

Беларусаў у гэты час (1946-1950гг.) ў Аргентыне было каля 100,000. Пражывалі ў сваёй бальшыні ў горадзе й правінцыі Буэнос Айрэс. Гэта была эміграцыя з Заходняе Беларусі, у асноўным эканамічная, паміж якой знаходзілася многа грамадаўцаў і камуністаў з КПБ. У гэты лік беларусаў уключана эміграцыя з часоў перад першай сусьветнай вайны й пасьля другой сусьветнай вайны, якія былі, можна сказаць, у невялікай колькасьці[1].

Беларуская эміграцыя была зарганізаваная ў розных арганізацыях: грамадзкіх, культурных, спартовых. Было іх шаснаццаць.[2] Яны тварылі Фэдэрацыю Беларускіх арганізацыяў у Аргентыне.

---

1. "Survey Byelorussian National Group in Argentina" -- January 1954, Buenos Aires, Argentina.

2. Спісак Беларускіх арганізацыяў у Аргентыне гл. на с. 450-451

Зараз-жа пасьля вайны агенты савецкага прадстаўніцтва ў Уругваю й ад 1946 году ў Аргентыне прылажыліся да сарганізаваньня Славянскага Саюзу ў Аргентыне, да якога належалі ўсе арганізацыі славянскага паходжаньня, у тым ліку й Фэдэрацыя Беларускіх арганізацыяў у Аргентыне. Савецкія агенты пры арганізацыі Славянскага Саюзу добра выкарысталі паваенны настрой перамогі над фашызмам, які існаваў у грамадзтве (асабліва пераконваючым фактарам быў саюз Амэрыкі з Саветамі). Ідэёлягічна Славянскі Саюз быў пракамуністычны й поўнасьцю апанаваны і кіраваны савецкімі агентамі.

## II.

Калі Кастусь прыехаў у сьнежні 1947 г. у Буэнос Айрэс, то ён застаў ужо новых эмігрантаў, якія пачалі прыбываць у 1946 годзе, пераважна з Англіі (былыя жаўнеры 1-га і 2-га корпусу Польскае арміі). Пазьней сталі прыбываць беларусы зь Італіі, Нямеччыны й Аўстрыі.

Сябры Славянскага Саюзу, у тым ліку й беларусы, зьбіраліся на Пляц Рэтіро перад Эміграцыйным гатэлям і нападалі на новапрыбыўшых, абвінавачваючы іх у здрадніцтве свае Радзімы й калябаранстве зь немцамі. Яны называлі іх фашыстамі й крычалі: «Едзьце назад!». Тут пачыналіся контратакі прыежджых, перш слоўныя а потым фізычныя, якія пераходзілі ў бойкі й працягваліся, пакуль ня ўмешвалася паліцыя.

Гвалтоўныя дыскусыі й рукабойкі адбываліся ў сталоўках і рэстаранах на працягу некалькі гадоў. Такія інцыдэнты здараліся дзякуючы нахабным захаваньням зьбіральшчыкаў грошаў на дапамогу ахвярам фашызму або ў часе вельмі частых зборак на «боты Сталіну».

На працягу летніх, а па нашаму зімовых месяцаў, Кастусь наведваў Пляц Рэтіро, дзе можна было спаткацца зь беларусамі, якія прыяжджалі, і з тымі, хто іх спатыкаў. Другім месцам спатканьня была расейская праваслаўная царква, перш пад юрыздыкцыяй Сыноду, а пазьней пад юрыздыкцыяй Амэрыканскай мітраполіі. Вось у гэтых мясцох Кастусь пазнаёміўся з групай беларусаў,

якія прыяжджалі пераважна з Англіі:Мікалаем Ланкевічам, Алесям Карповічам, Аляксандрам Літвінскім, Васілём Казлоўскім, Сымонам Камаром, Мікалаем Кейзікам, Анатолем Грынкевічам, І.Вашчыловічам ды шмат іншымі. Зь імі ён і праводзіў гутарку ў справе стварэньня беларускае арганізацыі ў Аргентыне.

Кастусь палагодзіў фармальнасьці, якія былі прадумовай, каб арганізацыя пачала легальна існаваць і дзейнічаць. Украінскае таварыства «Відрожаньне» адпусьціла пакой у сваім клюбе для канцыляры і й афіцыяльнага адрасу новай арганізацыі.

4-га красавіка 1948 году адбыўся першы сход ініцыятыўнай групы беларусаў, на якім пастанавілі заснаваць беларускую арганізацыю — Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне з адрасам: вуліца Маза 150. Буэнос Айрэс, Аргентына[3]. На гэтым сходзе была выбраная ўправа з 3-х асобаў із старшынёю Канстанцінам Мерляком.

Першым даручэньнем было навязаць лучнасьць зь беларускімі арганізацыямі ў Нямеччыне й Англіі, з мэтай дапамогі ім эміграваць у Аргентыну. Адразу пасьля паданьня ў прэсе весткі аб паўстаньні беларускае арганізацыі, пасыпаліся індывідуальныя й ад розных арганізацыяў у Нямеччыне й Аўстрыі лісты ў справе эміграцыі. У канцы 1948 году ўправа ЗБА зладжыла ў дырэкцыю іміграцыі два сьпіскі з просьбай выдаць групавую візу на ўезд у Аргентыну беларусам зь Нямеччыны й Аўстрыі. Праз кароткі час дэкрэтам прэзыдэнта была ўстрыманая выдача групавых візаў. Але з дапамогай розных арганізацыяў у Эўропе й Аргентыне, беларусы прыбывалі па індывідуальных візах на працягу 1947-1949 гадоў.

У міжчасе былі ўведзеныя зьмены ў эміграцыйны закон ЗША, якія давалі шырэйшыя магчымасьці ўцекачом з акупаваных бальшавікамі краінаў, у тым ліку й беларусам, эміграваць у Амэрыку. Старшыня ўправы ЗБА К. Мерляк бачыў лепшыя ўмовы жыцьця ў Амэрыцы й у прыватных, так і афіцыяльных лістох не рэкамэндаваў эміграваць у Аргентыну.

У Аргентыне ўпарта праводзілася грамадзкая праца, якая ў 1948 і 1949 гадах па сутнасьці палягала на спатыканьне новапры-

---

3. Пазьней ЗБА было зарэгістравана праз сакратарыят культуры з №А07 560.

быўшых, інфармаваньне іх аб сытуацыі адносна пракамуністычнай акцыі «землякоў», аб магчымасьцях уладжаньня на працу ды забесьпячэньня кватэрай. У гэтым быў моцна заангажаваны ўвесь актыў ЗБА, аказваючы дапамогу, уключна з дапамогай фінансавай.

У гэтым годзе (1948) ЗБА было прынятае ў сябры Антыкамуністычнай Славянскай Лігі, якая была зарганізаваная пару гадоў таму назад супраць пракамуністычнаму Славянскаму Саюзу.

На вялікім антыкамуністычным мітынгу, зарганізаваным Лігай у Буэнос Айрэс 19 верасьня 1949 году, выступіў з прамоваю ў гішпанскае мове старшыня ЗБА К. Мерляк. Яго прамова з фатаграфіяй была поўнасьцю надрукавана ў газэце «Трыбуна Популяр» № 24, 11 кастрычніка 1948 г.

Першай імпрэзай, якую ладзіла ўправа ЗБА, быў Калядны вечар, 8 студзеня 1949 году, на якім спаткаліся як беларусы, што прыехалі два гады таму назад так і тыя, (сям'я Губэрта й сям'я Дземідзенкі), што прыехалі ўсяго два тыдні.

31-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі ўпершыню адзначаліся ў Буэнос Айрэс 27 сакавіка, 1949 году. Акадэмія адбывалася ў украінскім клюбе «Відрожаньне». Яе адкрыў ды прывітаў ад прадстаўнікоў мясцовае ўлады й іншых нацыянальных арганізацыяў старшыня ЗБА. Рэфэрат чытаў Петра Саўчыц. Госьці, вітаючы беларусаў з днём незалежнасьці, выказвалі ўзаемнае разуменьне.

29 травеня 1949 году адбыўся другі агульны сход ЗБА, на якім была выбрана новая ўправа ЗБА з 5-ці асобаў і з старшынёю К.Мерляком.

У гэтым-жа годзе, 7 жніўня, была зроблена яшчэ адна імпрэза, сяброўская вечарына. На вечар прыбыло нямала людзей із старое эміграцыі, каб пабачыць нацыяналістаў, так яны называлі новую пасьляваенную эміграцыю. На вечарыну прыйшлі ўсе сябры арганізацыі й нядаўнапрыехаўшыя. Вечар прайшоў удала, ён стаўся «візытнай карткай» на прышласьць.

Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне ў сваім заложаньні ідэялягічна было бээнэраўскае. Яго закладчыкі прыбылі ў Аргентыну з Англіі й ня былі дастаткова праінфармаваныя аб прычынах падзелу на «крывічоў» і «зарубежнікаў», які існаваў у Нямеччыне. Але з прыездам у Аргентыну сем'яў П.Саўчыц, др.М. Мінкевіч ды не-

жанатых М.Каленіка й П.Зенковіча трапілі й новыя весткі з грамадзка-палітычнага жыцьця ў Нямеччыне й Аўстрыі. Прывезеныя выясьненьні аб прычынах падзелу між палітычнымі напрамкамі БНР і БЦР не супадалі зь весткамі, падаванымі ў прэсе й прыватнай карэспандэнцыяй сяброў ЗБА. Артыкулы ў прэсе раскрывалі бэцээраўскую беспрынцыповасьць у дачыненьні да нацыянальных інтарэсаў Беларусі ды апартуністычны падыход у стратэгічнай дзейнасьці БЦР у існуючай палітычнай сытуацыі таго часу ў Эўропе.

Сябры ЗБА на агітацыю зарубежнікаў не зьвярталі ўвагі, а яны бачучы, што нічога ня зробяць, выступілі з арганізацыі. Нейкі час яны прабавалі нешта арганізаваць, але з выездам др.Мінкевіча далёка на правінцыю пра іхнюю дзейнасьць нічога асаблівага ня можна сказаць.

У канцы 1949 году ЗБА наняла памяшканьне й выбралася з украінскага клюбу «Відрожаньне». Ад гэтага часу адрас быў наступны:

Asociacion Bielorrusa en la Argentina
calle Coronel Sayos 2981
4 de Junio -Buenos Aires, Argentina.

10 сьнежня 1949 г. выйшаў першы інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне.

У ЗБА было зарэгістравана, што прыбылі ў Аргентыну: мгр. Уладзімір Шастак—з Аўстрыі, аграном Язэп Осінскі—зь Італіі (былы прадстаўнік БЦР на Аўстрыю), пратаярэй Мікалай Макарэвіч—з Англіі, (служыў свайго часу на Палесьсі), пратаярэй Васіль Вячорка—з Аўстрыі, (служыў на Палесьсі таксама).

# III.

Славянскі Саюз у Аргентыне аб'ядноўваў пракамуністычныя арганізацыі Украіны, Баўгарыі, Славэніі, Югаславіі, Чэхаславакіі, Польшчы, Расеі, Македоніі й Беларусі левага напрамку. Выняткам была бібліятэка «Івана Луцкевіча». Бібліятэка была выкінута з Фэдэрацыі Беларускіх арганізацыяў за тое, што яна не хацела прызнаваць дзявяты кангрэс Фэдэрацыі за трэці, чаго дамагалася ўправа Славянскага Саюзу.

Разрыў Ціта—Прэзыдэнта Югаслаўскай Фэдэрацыі—са Сталіным выклікаў разыходжаньні ў Славянскім Саюзе. Пра гэта аргентынскія ўлады (Коордынаціон Фэдэраль) былі праінфармаваныя й падрыхтоўваліся ў роўнай меры із Славянскім Саюзам да яго трэцяга кангрэсу.

Кангрэс меўся адбыцца 23, 24 і 25 сакавіка 1949 г. у Буэнос Айрэс. На яго прыехалі дэлегаты з Масквы, Бэлграду й другіх сталінскіх краінаў, якія былі акупаваныя Саветамі. Раненька, 23 сакавіка пачалі зьбірацца дэлегаты ды запрошаныя госьці. Між запрошанымі гасьцямі было шмат незапрошаных Саюзам, а запрошаных Коордынаціон Фэдэраль для «падмацаваньня» Кангрэсу. Вялікая заля не магла памясьціць нават большай часткі прысутных, яны стаялі ў дзьвярах і чарада далёка на пляцы.

Старшыня Славянскага Саюзу стараўся заклікаць публіку да парадку дня, як раптам нехта закрычаў: «Жыве Ціто!», а ў адказ пачуўся выкрык: «Жыве Сталін!» Зашумела бура, на якую чакалі незапрошаныя «госьці». Яны падмацавалі крыкі, і паляцелі ў паветра крэслы, лаўкі ды ўсё іншае, што было пад рукамі. Тут аказалася, што многія былі прыгатаваныя да бойкі, якая разгарнулася ў сапраўдную вайну. Зараз-жа прыехала паліцыя, якая была напагатове, і пачала разганяць ваюючы натоўп. Пры гэтым было арыштавана 14 камуністычных дзеячоў.

На дамаганьні нацыянальных арганізацыяў, у тым ліку й ЗБА, партыі Пэроніста ды аргентынскіх арганізацыяў правага напрамку, дэкрэтам прэзыдэнта Пэрона Славянскі Саюз у Аргентыне быў разьвязаны, а ўся маёмасьць сканфіскаваная.

Ад імя ЗБА, К. Мерляк рабіў захады, каб маёмасьць беларускіх арганізацыяў, што належалі да Славянскага Саюзу, была пера-

дадзена Згуртаваньню Беларусаў у Аргентыне. Ягоныя заходы не далі пазытыўных вынікаў. На перашкодзе быў папярэдні прыклад канфіскацыі нямецкай маёмасьці. Да таго-ж, у гэтым выпадку, патрэбна было-б разглядаць аднолькава заявы ўсіх нацыянальных арганізацыяў[4].

# IV.
# "Año del libertador general San Martin 1950"

(Год вызвольніка генэрала Сан Мартына 1950)

Для ўшанаваньня памяці генэрала Сан Мартына ў сотыя ўгодкі яго сьмерці быў прыняты закон, што да пастаўленай даты павінна быць дададзена «Год вызвольніка генэрала Сан Мартына 1950». 1950 год ў Аргентыне адзначаўся вельмі шумна, бо гэта была палова 20-га стагодзьдзя, і ўрачыста, бо споўнілася 100-годзьдзе ад сьмерці генэрала Сан Мартына, які ў аснаўным спрычыніўся да вызваленьня Аргентыны з-пад гішпанскага панаваньня й быў заснавальнікам Аргентынскае Рэспублікі.

ЗБА традыцыйна адсьвяткавала Калядныя сьвяты ды спаткала Новы год у Летувіскім клюбе на вуліцы Боэдо 737, у Буэнос Айрэс.

Вялікай імпрэзай 1950 г. было сьвяткаваньне 32-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі й сотых угодкаў з дня сьмерці генэрала Сан Мартына. Да выдрукаваных запросінаў быў далучаны прэсавы камунікат, які быў разасланы ў прэсу ды гасьцям. Праграма распачалася Божай службай у Ўкраінскай Аўтакефальнай Царкве, а акадэмія адбылася ў Летувіскім клюбе.

---

4. Газэта «Бацькаўшчына» № 71 і 72, 30-IX і 15-X—1951 г. «Беларуская Эміграцыя ў Аргентыне»—Гістарычны нарыс. К. Мацкевіч.
Bielorrusia y los Bielorrusos en la Argentina - Buenos Aires 1953, "La Imigracion Bielorrusa en la Argentina" p. 47-58.

1950 — Año del Libertador General San Martin



ASOCIACIÓN BIELORRUSA EN LA ARGENTINA

ZHURTAVANNIE BIELARUSAU U ARHENTYNIE

Sede social: Calle Coronel Sayos 2981

4 de Junio — Buenos Aires.

25 SAKAVIKA — MARZO 25
1918 — 1950

Año del Libertador General San Martín 1950

Conmemoración

32 ANIVERSARIO

de la proclamación de la Independencia
de la República Democrática Bielorrusa

Señor ......................................

Asociación Bielorrusa en la Argentina se complace en invitar a Ud. y familia asistir a la celebración del 32 aniversario de la proclamación de la Independencia de la República Democrática Bielorrusa y del centenario de la muerte de General San Martín, con el siguiente.

PROGRAMA

1. El día 26 de marzo de 1950 en la Iglesia Orthodoxa Ucraniana c. Suipacha 842 (altura de Cordoba 900) Capital, a las 9 horas se celebrará la Misa por Bielorrusia.
2. El mismo día en el salon Lituano, Av. Boedo 737 Buenos Aires a las 11 horas se celebrrá acto conmemorativo para el día Patria.

COMISION DIRECTIVA

Спадар ......................................

Згуртаваньне Беларусау у Аргэнтыне мае гонар зпрасці Вас з сядьею, узяць удзел у усьвяткаваньні 32 угодкау абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народной Рэспублікі і 100 угодкау са дня сьмерці Гэнерала Сан Мартына з наступнай

ПРАГРАМАЙ:

1 Дня 26 сакавіка 1950 у Праваслаунэй Украінскай Царкве пры вулицы Суіпача 842 (вышыня Кордоба 900) Капиталь а гадзіне 9. Служба Божая за Беларусь.
2 Гэтага дня у клюбе Літоуским пры вулицы Боэдо 737 Буэнос Айрэс, а гаузіне 11. - адбудзяцца Урачыстая Акадэмія з мастацкай часткай у чэсьць 25 Сакавика.

УПРАВА З. Б. А.

Важнымі мамэнтамі былі: рэфэрат К.Мерляка пра жыцьцё й дзейнасьць генэрала Сан Мартына ў гішпанскай мове й рэфэрат Г.Юзэфовіча пра 25 Сакавіка ў беларускай. Мастацкая частка складалася з дэклямацыяў патрыятычных вершаў у беларускай і гішпанскай мовах. Выступілі В. і Н.Фаміны, Н.Нядзелька і Г.Юзэфовіч. Прыгожа сьпявалі дуэтамі А.Грынкевіч і Л. Дземідзенка, В. і М. Бычкоўскія. Але асаблівую ўвагу заслугоўвала аргентынская артыстка Нэлі Гомэз, якая прасьпявала дзьве песьні: адну па-гішпанску, а другую «На выгнаньні» па-беларуску. Пра адзначэньне Дня незалежнасьці Беларусі былі зьмешчаныя артыкулы й зацемкі ў 4-х аргентынскіх газэтах.

У міжчасе бібліятэка й канцылярыя ЗБА памалу была ўладжаная. Сп. Сымон Камар падараваў у сьвятліцу радыёпатэфон для беларускае музыкі. У адным з пакояў быў уладжаны бар, які працаваў без прадаўшчыка. Адказны за бар сябра раз у тыдзень забіраў грошы, рабіў новыя закупы, а рэшту здаваў у касу арганізацыі. У сьвятліцы часта адбываліся сяброўскія сборкі, на якіх абгаварваліся розныя прыватныя й агульнага характару справы.

Уладкавацца на кватэру пасьля вайны было вельмі цяжка. Наплыў эмігрантаў з Эўропы й перасяленьне мясцовага жыхарства з аддалённых пасёлкаў у горад спрычыніліся да кватэрнага крызысу. Каб аблегчыць становішча з кватэрамі правінцыяльныя ўлады адпусьцілі вялікі кавалак зямлі па-за межамі фэдэральнае сталіцы Буэнос Айрэс каля Мілітарнае фабрыкі, адкуль можна было браць ваду, ды абвʼявілі: «Калі ласка, будуйцеся, зямля даецца вам бясплатна».

Эмігранты й мясцовае насельніцтва кінуліся будаваць сабе хаты. Так як ня было ніякага пляну распадзелу пляцоў, дык кожны займаў кавалак зямлі й пачынаў будавацца. Мясцовыя рабілі вельмі хутка. Яны прывозілі бляху, ставілі сьцены, накрывалі іх, а замест дзьвярэй ужывалі занавес з тканага матэрыялу. Эмігранты рабілі інакш: зямлю мясілі з саломай і засушвалі ў форме пустакоў. Калі сьцены былі гатовыя, іх тынкавалі, каб дождж не размываў. Іхнія хаты мелі стрэхі, вокны й дзьверы, яны выглядалі даволі ўнушальна.

Будова ішла хуткім тэмпам, так што за кароткі час уся зямля была занятая й для новапрыбыўшых не было месца, дзе будавцца.

У такім выпадку новапрыбыўшыя, асабліва «гаўчо» прывозілі матэрыял і пачыналі будаваць сабе хату на вольным месцы ранейшага пасяленца. Нярэдка здаралася, што недалёка ад уваходу ў хату стаяла будка суседа, якая служыла за ўборную. З часам стварыўся такі лябірынт, што цяжка было дайсьці да свае хаты. Аднак было характэрным тое, што людзкіх канфліктаў і праступстваў не было, толькі ў нядзелю можна было спаткаць сям-там падпіўшага чалавека. Многія новапрыбыўшыя беларусы скарысталі гэтую нагоду й пабудавалі свае хаты. Іншыя стараліся прыдбаць кавалак зямлі з мэтай будаваць сапраўдны дом.

З гутарак між собку сябры ЗБА даведваліся, дзе хто працуе ды якія мае заробкі. У большай колькасьці беларусы працавалі на будове. Нават паўстала свая кампанія, якая брала кантракты ды самастойна будавала шкілеты дамоў з жалезабэтону. Некаторыя працавалі ў тэкстыльнай і мясной індустрыі, а маладыя жанчыны ў швэйных майстэрнях.

З пераходам у сваю кватэру ўправа ЗБА пачала распаўсюджваць беларускую прэсу, якую атрымоўвала з Эўропы: «Бацькаўшчыну», «Божым Шляхам», «Зьніч», «За волю», «На шляху» ды іншыя выданьні, якія прысылаліся.

У гэтым годзе ЗБА зарэгістравала прыезд сем'яў А.Гімпеля, М.Лазюка й іншых. У сакавіку вярнуўся назад у Англію пратаярэй Мікалай Макарэвіч з матушкаю. Загадам іміграцыйнай дырэкцыі быў выселены з Аргентыны япіскап Панцелейман з Расейскае Зарубежнае Царквы, а пару месяцаў пазьней быў выселены з Аргентыны Саланевіч, знаны расейскі манархіст, які выдаваў сваю манархісцкую газэту ў Буэнос Айрэс.

Яшчэ ў 1950 годзе сталіся дзьве цікавыя падзеі. В.Краўчанка, працаўнік савецкай амбасады ў Канадзе, захапіўшы шпіёнскія дакумэнты, перадаў іх канадзкай паліцыі, а сам застаўся жыць у Канадзе. Ён прыехаў у Аргентыну, каб зрабіць канфэрэнцыю ды выступіць з прамовамі на сходах адносна савецкай шпіёнскай дзейнасьці. Улады гэтага зрабіць яму не дазволілі, і ён вярнуўся назад у Канаду. Другая падзея была тая, што Аргентынскі ўрад разьвязаў 32 розныя арганізацыі й палітычныя партыі.

1951 год распачаўся традыцыйным Калядным сьвятам, на якое сабралася нямала беларусаў з гораду ваколіцаў Буэнос Айрэс.

На ўвагу гэтага вечара заслугоўваў багаты канцэрт. Упершыню выступіў хор ЗБА пад кіраўніцтвам І. Гейхроха. Былі дэклямацыі Н.Нядзелькі, дуэты В. і М. Бычкоўскіх, Соні Хрось і А.Грынкевіча пад акампанімэнт З. Лойкі і Р. Кужаля.

33-я угодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі абыходзіліся ў горадзе Беразатэгі і ў Буэнос Айрэс.

У Беразатэгі на 25 Сакавіка ў праваслаўнай царкве быў адслужаны а. Васілём Вячоркам малебен за беларускі народ. Пасьля, на сяброўскім прыняцьці, быў прачытаны рэфэрат аб гістарычных падзеях ды Акце абвешчаньня незалежнасьці БНР.

Сьвяткаваньне ў Буэнос Айрэс адбылося 1 красавіка 1951 году. Служба божая адбылася ў Украінскай Праваслаўнай царкве, а ўрачыстая акадэмія ў Летувіскім клюбе. На акадэміі была прынятая рэзалюцыя адносна гэнацыду беларускага народу, які праводзіўся савецкім урадам у Беларусі. Разам з кніжкаю М.Абрамчыка «Я абвінавачваю Крэмль у забойстве майго народу» яна была высланая да Аб' еднаных Нацыяў у Нью Ёрк, на рукі генэральнага сакратара Трыгве Ліе.

20 травеня 1951 году адбыўся 4-ты агульны сход ЗБА, на якім была выбраная новая ўправа ў наступным складзе: Уладзімір Другавец—старшыня, Аляксандр Літвінскі—заступнік старшыні, Лявон Петраш—сакратар, Васіль Казлоўскі—скарбнік і Мікалай Ланкевіч—сябра ўправы.

Із справаздачы старшыні К.Мерляка за тры гады дзейнасьці, якім закончыўся арганізацыйны пэрыяд, прысутныя даведаліся, што ЗБА, як беларуская грамадзкая арганізацыя нацыянальнага характару была закладзеная 4 красавіка 1948 году з мэтамі:

Памагаць нашым суродзічам эміграваць з Эўропы ў Аргентыну.

Памагаць уладзіцца прыехаўшым ў Аргентыну на працу.

Арганізаваць беларускую калёнію для грамадзка-культурнага жыцьця, каб забясьпечыць абарону сваіх правоў і ахову нацыянальнае культуры.

Мець беларускае нацыянальнае прадстаўніцтва ў Аргентыне.

—Гэтыя даручэньні,—адзначыў К.Мерляк,—адпавядаюць кожнаму беларусу, незалежна вайсковец ён ці цывільны, бяз розьніцы партыйнага погляду, рэлігіі, часу прыбываньня ў Аргентыне, калі ён сапраўды пачуваецца сынам беларускае зямлі.

Далей дакладчык коратка спыніўся аб тым, што зроблена.

—Адтрымана 98 дазволаў на ўезд у Аргентыну зь Нямеччыны. Зложана просьба на дазвол 300 асобам эміграваць у Аргентыну зь Нямеччыны й Аўстрыі, але, нажаль, груповыя візы былі ўстрыманыя ўрадам. Пра дапамогу прыбыўшым сюды й нямногім ў Нямеччыне асобам вам добра ведама.

Грамадзкая дзейнасьць праявілася ў штогоднім сьвяткаваньні Калядаў і сустрэчы новага году, угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР, сяброўскіх вечарынках, зборак і культурных вечароў. Распаўсюджана толькі ў гэтым годзе больш за 1000 экзэмпляраў беларускае прэсы. У бібліятэку сабрана больш за 100 кніжак і каля 200 экзэмпляраў розных часопісаў. Навязаная лучнасьць з Аргентынскімі ўладамі, асабліва Коордынасіон Фэдэраль, з іншанацыянальнымі арганізацыямі, у асаблівасьці з Украінай, Славакіяй, Летувой, Харватыяй, Польшчай ды іншымі.

Старшыня ЗБА браў удзел у многіх канфэрэнцыях, ладжаных нацыянальнымі арганізацыямі й Коордынасіон Фэдэраль. Дзякуючы нашай актыўнасьці, пра Беларусь і пра нас Аргентынская прэса пісала 32 разы.

Быў высланы мэмарандум адносна беларусаў у Аргентыне Міністэрству ўнутраных справаў і Міністэрству замежных і культурных справаў Аргентыны. А таксама ліст у дырэкцыю «Голаса Амэрыкі» ў справе ўключэньня беларускае мовы ў сваіх перадачах, прывітальная тэлеграма Прэзыдэнту Пэрону з нагоды яго выбару на другую кадэнцыю Прэзыдэнтам Рэспублікі.

1951 год быў выбарчым годам Прэзыдэнта Аргентынскай Рэспублікі. З гэтай нагоды былі неабмежаваныя свабоды дзеяньня як правых, так і левых арганізацыяў, з чаго скарыстала беларуская арганізацыя «Белорусский Очаг», абнавіўшы сваю дзейнасьць.

Управа ЗБА заплянавала сяброўскую вечарыну й канцэрт на 30 чэрвеня 1951 году. Таксама на гэты дзень «Очаг» абʼявіў свае танцы. Упершыню ўправа ЗБА выдрукавала вялізарныя плякаты, рэклямуючы свой вечар у Чэхаславацкім клюбе ў горадзе Валетын Альсына ды ноччу пазаклейвала плякаты «Белорусского Очагу». Вечарына й канцэрт удаліся вельмі добра, на іх прыбылі беларусы з старой эміграцыі. Управа ЗБА, заахвочаная посьпехам папярэдняй вечарыны, пастанавіла яе паўтарыць 27 кастрычніка ў гэтым самым

клюбе. Таксама й гэтым разам былі выдрукаваныя вялікія плякаты й лятучкі, якія рэклямавалі аркэстру «Амэрыка» й канцэрт з выступленьнямі балетмайстра Уладзіміра Катовіча з балярынай Верай Безуглавай.

## V.

1952 год распачаўся традыцыйным Калядным вечарам 18 студзеня. Айцец Васіль Вячорка благаславіў бяседу за застаўленымі багата сталамі, якая прадаўжалася ў спалучэньні з мастацкімі выступленьнямі дуэтаў, салістаў і дэклямацыямі. Гэтым разам зьявіўся Дзед Мароз, які абдараваў падарункамі ўсіх дзяцей і дарослых.

З нагоды 34-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР Актам 25 Сакавіка ўправа ЗБА выдала заклік да беларускага грамадзтва ў Аргентыне, прэсавы камунікт і дэклярацыю, якія былі разам з запросінамі разасланыя для прэсы і ўрадавых чыноўнікаў Аргентыны.

Урачыстасьць распачалася 30 сакавіка Божаю службаю за Беларусь ва Ўкраінскай Праваслаўнай Царкве, дзе пасьля службы а.Барыс Арыйчук сказаў прынагодную й патрыятычную пропаведзь. Гэтага-ж дня адбывалася й урачыстая акадэмія з асабістым удзелам прадстаўнікоў нацыянальных арганізацыяў і мясцовай адміністрацыі гораду Буэнас Айрэс. Праграма распачалася Аргентынскім і Беларускім нацыянальнымі гімнамі ды прывітаньнямі гасьцей прадстаўніком Ураду БНР К. Мерляком у гішпанскай мове й старшынём ЗБА У.Другаўцом у беларускай. Пасьля рэфэрату аб гістарычных падзеях таго часу й аб Акце 25 Сакавіка зь вельмі цікавай палітычнай прамовай аб становішчы паняволеных народаў выступіў прадстаўнік Цэнтральнай Рэпрэзэнтацыі Ўкраіны Мігэль Ангель Рубінэц.

Навязваючы да 34-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР, управа ЗБА выслала ліст да Прэзыдэнта ЗША з посьбай улучыць беларускую мову ў перадачы «Голас Амэрыкі». Копіі гэтага ліста былі высланыя ў Дэпартамэнт замежных справаў Амэрыкі, сэнат ЗША, дырэктару «Голас Амэрыкі», Прэзыдэнту ЗША і спікеру палаты рэпрэзэнтантаў.

Пяты агульны сход ЗБА адбыўся 1 чэрвеня. Адкрыў яго а. Васіль Вячорка, запрошаны, каб абгаварыць справу заарганізаваньня беларускага праваслаўнага прыходу ў ваколіцах Буэнос Айрэс. У прэзыдыюм сходу былі выбраныя Вінцэнт Зарэцкі, Іван Гейхрох і Юліян Жыхар.

Справаздачу з агульнай дзейнасьці зрабіў старшыня У.Другавец, а фінансавую—скарбнік В. Казлоўскі. З справаздачаў прысутныя даведаліся аб праведзенай працы й стане арганізацыі. Падчас справаздачы старшыня прачытаў ліст, які быў высланы прэзыдэнту Пэрону ў справе аўдыенцыі для беларускай дэлегацыі. Таксама прачытаў адказы: адзін, дзе паведамлялася, што аўдыенцыя адбудзецца ў вызначаную дату, а другі, што аўдыенцыя адклікана з прычыны спробы замаху на яго ўрад 25 травеня вайсковымі адзінкамі гарнізону, размешчаным на базе, каля Буэнос Айрэс.

Пасьля дыскусыяў прысутныя ўдзялілі абсалюторыюм уступаючай управе ЗБА, якую перавыбралі ў поўным складзе на наступную кадэнцыю з старшынёю У.Другаўцом. У рэвізыйную камісію ўвайшлі К.Мерляк, М.Кейзік і І. Вашчыловіч.

Як маланка перад бурай прабягае неба, так па ўсяму сьвету па хвалях эфіру хутка прабегла вестка аб прадчаснай сьмерці жонкі Прэзыдэнта Эвы Пэрон. Сакратарыят інфармацыі заявіў, што 26 ліпеня 1952 году, а гадзіне 20:25 адыйшла назаўсёды, у веку 33 гадоў першая дама Аргентыны, абаронца працоўных і «дэскамісадос» (бескашульнікаў), кіраўнік духоўнага жыцьця Аргентыны. Гэтая вестка ўзварушыла ўвесь народ Аргентыны. Аргентынскі ўрад абʼявіў жалобу на 30 дзён і паведаміў, што нябожчыцы будуць адданыя ўсе ганаровыя прыслугі пры паховінах, якія прыслугоўваюць найвышэйшаму дастойніку дзяржавы.

Управа ЗБА на сваім надзвычайным пасяджэньні выдала камунікат, які быў высланы экспрэсам у інфарматыўныя агенствы й ўсёй Аргентынскай прэсе. Камунікат быў наступнага зьместу:

«Управа Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, як адзіны найвышэйшы прадстаўнік беларусаў у Аргентыне, на сваім надзвычайным пасэджаньні 3 жнівеня пастанавіла:

1.Задэкляраваць поўнае далучэньне да нацыянальнай жалобы, дзеля вялікай страты, якую прадстаўляе сабе сьмерць Высокапа-

важанай спадарыні Эвы Пэрон, асобы найбольш заслужанай і духоўнага кіраўніка аргентынскага народу.

2.Выслаць спачувальную тэлеграму яго Эксцэленцыі Прэзыдэнту Рэспублікі.

3. Адкласьці ўсе запраграмованыя вечарыны й зборкі на месяц жнівень у знак жалобы, якая акрыла гэты вялікі край.

4. Выслаць адмысловую дэлегацыю на паховіны дастойнай дамы й заклікаць ўсіх сяброў ЗБА й ўсіх беларусаў Аргентыны, каб узялі ўдзел у паховінах, у довад пашаны й падзякі за яе вялікую дабрату, якую, бязумоўна, скарысталі ўсе беларусы.

Зьмест тэлеграмы, высланай Прэзыдэнту Аргентынскай рэспублікі, быў наступным: «Ад імя беларускай калёніі ў Аргентыне, ветліва прашу Вас прыняць нашыя глыбокія спачуваньні з прычыны прадчаснай сьмерці нашай каханай спадарыні Эвы Пэрон.—Уладзімір Другавец, старшыня Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне».

У выніку гэтага праектаваная на 9-га жнівеня вечарына была адкладзена на 20-га верасьня 1952 году. Яна адбылася з посьпехам ў армянскім клюбе ў г. Валентын Альсіна.



*Дэлегацыя Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне пры гробе Эвы Пэрон у першую гадавіну яе сьмерці, 12 красавіка 1953 году. Буэнос Айрэс.*

У гэтым годзе таксама адбыліся наступныя імпрэзы, ладжаныя ўправай ЗБА: лекцыя «Дэнацыяналізацыя Беларусі» (чытаў інжынер Фока Фамін 19 ліпеня 1952 году) і 32-я ўгодкі Слуцкага паўстаньня з паніхідай па загінуўшых у змаганьні за Беларусь і рэфэратам.

Інтэрнацыянальная канфэрэнцыя тэлекамунікацыі ў Буэнос Айрэс распачалася 6 кастрычніка й трывала цэлы месяц. У гэтай канфэрэнцыі ўзялі ўдзел прадстаўнікі ад 63 краінаў, у тым ліку й ад БССР на чале з Аркад'евым. ЗБА й прадстаўніцтва Ураду БНР ў Аргентыне выслалі на рукі Прэзыдэнта канфэрэнцыі вытлумачэньне, што дэлегацыя БССР не прадстаўляе беларускі народ і зьяўляецца фікцыяй, створанай Масквою, бо у БССР няма свайго міністэрства камунікацыі. ЗБА зьвярталася з просьбай выдаліць савецкую дэлегацыю Беларусі ды замяніць яе дэлегацыяй ураду Беларускай Народнай Рэспублікі.

# VI.

Новы 1953 год традыцыйна распачаўся Калядным вечарам 10 студзеня. У праграме былі дэклямацыі й сьпевы, а самае галоўнае Дзед Мароз, які раздаваў для малых і старых падарункі. Гэтым разам Управа ЗБА выдала чарговы камунікат з навагоднімі прывітаньнямі й пажаданьнямі для беларусаў у Аргентыне.

12 красавіка 1953 годзе а гадзіне 10:30 дэлегацыя беларускай калёніі ў Аргентыне ўшанавала памяць Эвы Пэрон, складаючы вянок кветак у яе магілы. Гэтым актам распачалося падвойнае сьвята: 35-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР і 5-я ўгодкі існаваньня й дзейнасьці Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне. Беларускую дэлегацыю прыняў шэф цырымоніі, які кіраваў прабегам акту. Прабег цырымоніі фатаграфавалі прадстаўнікі аргентынскай прэсы.

Сымбалічная магіла Эвы Пэрон была ўладжаная ў будынку фундацыі яе імя, дзе на працягу цэлага году, пасьля яе сьмерці, ушаноўвалі памяць дастойнай дамы прадстаўнікі ўрадавых установаў, розных грамадзіх арганізацыяў, прафсаюзаў і грамадзтва цэ-лага сьвету. Пасьля злажэньня вянка ўсе паехалі да ўкраінскае царквы, дзе адбыўся малебен за беларускі народ.

Заля Летувіскага клюбу была ўдакараваная аргентынскім і беларускім сьцягамі, абапал якіх віселі партрэт прэзыдэнта Пэрона й Пагоня. А гадзіне 18-й госьці й сябры ЗБА занялі месца з прыгатаванымі й добра застаўленымі сталамі. К. Мерляк прывітаў гасьцей і каратка пазнаёміў з падзеямі, якія давялі да абвешчаньня незалежнасьці Актам 25 Сакавіка, за ажыцьцяўленьне якога й сёньня змагаецца беларускі народ.

У. Другавец расказаў пра пяцігадовую дзейнасьць Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне. Тут-жа ўсім прысутным была раздана кніжка «Беларусь і Беларусы ў Аргентыне» (**Bielorrusia y los Bielorrusis en la Republica Argentina**), выдадзеная ў гішпанскай мове Згуртаваньнем Беларусаў у Аргентыне.

Падчас банкету выступленьні прадстаўнікоў перапляталіся беларускімі песьнямі з кружэлак, награнfamы беларускімі студэнтамі ў Лювэне. З прывітаньнямі выступіў др. М.А. Рубінэц, генэральны сакратар Украінскага прадстаўніцтва ў Аргентыне, сп. Гешыс, старшыня Латвійскага Аб'яднаньня ў Аргентыне, сьвятар А. Ледніцкі, сябра Камітэту Вызваленьня Славаччыны, інжынер С.Слівіньскі, заступнік старшыні Саюзу палякаў у Аргентыне, генэрал Тодар Даўкантас—былы міністар абароны Летувы, рэпрэзэнтуючы Летувіскую калёнію ў Аргентыне.

Ад імя прысутных гасьцей аргентынцаў выступіў Мануэль Канібано, які адзначыў, што 5-ці гадовая дзейнасьць ЗБА зьмяніла пагляды аргентынцаў адносна беларускае эміграцыі, паказала беларускі народ і яго імкненьні, а перадусім здабыла давер у афіцыйных колах ураду. Ад сяброў ЗБА выступіла Вольга Гейхрох, якая дзякавала папярэдняй і цяперашняй управе за праведзеную працу.

Госьці мелі нагоду аглядаць выстаўку беларускае прэсы на чужыне, зладжаную М.Ланкевічам.

Кніжка «Беларусь і Беларусы ў Аргентыне» рассылалася на працягу цэлага 1953 году ва ўсе краіны Цэнтральнай і Паўдзённай Амэрыкі, у міністэрствы замежных і ўнутраных справаў, унівэрсытэты, бібліятэкі, навуковыя ўстановы й галоўныя газэты кожнай краіны. Кастусь асабіста наведваў амбасады кожнай краіны, уручаў ім па 3 экзэмпляры кніжкі й ад культурных аташэ атрымоўваў адрасы для яе рассылкі. Кніжка атрымала некалькі

прыхільных рэцэнзыяў на эміграцыі за выняткам каментарыя а. Льва Гарошкі, якому не спадабаліся зьмешчаныя ў ёй фатаграфіі.

31 травеня 1953 году адбыўся чарговы агульны сход ЗБА, на якім быў разгледжаны абшырны парадак дня. У новую ўправу былі выбраныя: Васіль Казлоўскі—старшыня й сябры: А. Літвінскі, М.Ланкевіч, Л. Петраш і А. Карповіч. У рэвізыйную камісыю ўвайшлі К.Мерляк, С.Камар і П. Кудрэз.

На гэтым сходзе абгаварвалася справа рэгістрацыі жадаючых выяжджаць у ЗША, якая праводзілася амэрыканскім консулятам ужо некалькі месяцаў. Каб выехаць ў Амэрыку пачалі запісвацца сябры ЗБА й наогул беларускае грамадзтва. Пасьля доўгай дыскусыі, сход дайшоў да высновы, што бяручы пад увагу існуючы палітычны й эканамічны стан у Аргентыне, трэба не перашкаджаць, а пры патрэбе дапамагаць у афармленьні дакумэнтаў на выезд у ЗША.

Да канца 1953 годзе ладзіліся некалькі вечароў зь лекцыямі. Так, 2 жніўня інжынер Ф.Фамін прачытаў лекцыю на тэму «Этнаграфічныя межы Беларусі», а 19 верасьня «Агульны ўступ да беларусаведы». 7 лістапада ў армянскім клюбе была зладжаная вечарына з народнымі выступленьнямі й беларускім буфэтам. 29 лістапада ў сьвятліцы ЗБА адбылася памінальная акадэмія з нагоды ўгодкаў Слуцкага паўстаньня.

У пачатку 1953 году была закончаная акцыя зьбіраньня вестак аб ахвярах бальшавіцкага тэрору ў Беларусі. Сабрана дакладных дадзеных аб 109 сем'ях, якія ў сваёй бальшыні мелі па дзьве й болей асобаў. Ліста была выслана ў Нью Ёрк, у прэзыдыюм Рады БНР на рукі сп. М.Панькова.

# ASOCIACION BIELORRUSA

EN LA ARGENTINA

Cnel. SAYOS 2981 VALENTIN ALSINA

***Tiene el honor de invitar a Ud. y familia al***

# Gran Baile Familiar

***amenizando la gran ORQUESTA***

## Característica POLA

QUE TENDRA LUGAR EL DIA **SABADO 7 DE NOVIEMBRE** 1953 A LAS 20.30 HS.

En el salón **ARMENIO**, Yatay 2454 - Valentín Alsina
(3 cuadras de Boulev. Valentín Alsina altura 2700)

Esperando verles entre los presentes, le saluda muy atte.

La comisión

---

# ZHURTAVAŃNIE BIELARUSAÚ U ARHENTYNIE

Cnel. SAYOS 2981 VALENTIN ALSINA

***maje honar zaprasić Vas z siamjoju na***

## SIABROŬSKUJU VIEČARYNU

jakaja adbudziacca u sybotu, dnia 7 listapada 1953 hodu a hadzinie 20.30 u **ARMIANSKIM** salonie pry vulicy Yatay 2454, Valentín Alsina.
(3 kvadry ad Boulev. Valentín Alsina na vyšyni 2700)

Żadajem pryjemnaj zabavy i da pabaćańnia.

Uprava ZBA

**Uvaha! Budzia svoj ulasny bufet!**

*Запрошаньне на сяброўскую вечарыну, ладжаную Згуртаваньнем Беларусаў Аргентыны 7 лістапада 1953 году.*

# УІІ.

Як заўсёды Новы 1954 год распачаўся 9 студзеня традыцыйным Калядным вечарам з праграмай, у якой былі прадбачаныя вячэра, сьпевы, падарункі для дзяцей і неспадзеўкі. Старшыня ЗБА Васіль Казлоўскі прывітаў гасьцей ды пажадаў усім шчасьлівага новага году. На прапанову Дзеда Мароза дзеці дэклямавалі вершы, якія развучылі з Аленай Зарэцкай, братам і сястрой Сакалоўскімі.



*Дзеці і Дзед Мароз на Калядным вечары, ладжаным Згуртаваньнем Беларусаў у Аргентыне 9 студзеня 1954 году. Буэнос Айрэс.*

Сьвяткаваньня 36-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР упершыню на эміграцыі распачалося радыёперадачай праз радыёстанцыю «Эксцэльёр» 28 сакавіка 1954 года, а гадзіне 9:30 раніцы. Напачатку поўгадзіннай праграмы прагучала малітва «Магутны Божа». Затым з прамовай у гішпанскай мове выступіў К. Мерляк. Разам зь інфармацыяй, прысьвечанай угодкам абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, ён паінфармаваў пра акупацыйную палітыку

расейскага бальшавізму, пра Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне й яе дзейнасьць ды падзякаваў ўраду й аргентынскаму народу за гасьціннае прыняцьцё беларускіх эмігрантаў. Далей перадаваліся песьні студэнцкага хору ў Лювэне з тлумачэньнем народнага фальклёру й зьместу песьняў, якія сьпяваюцца пры розных нагодах жыцьця ў Беларусі. Праграму, якая была вельмі цікавая, паўтарылі 3 красавіка дзьве радыёстанцыі «Дэль Пуэблё» й «Портэнё». 28 сакавіка быў адслужаны малебен за Беларусь, а па абедзе адбылася ўрачыстая акадэмія, прысьвечаня 36-м угодкам незалежнасьці Беларусі.

У травені 1954 году Управа ЗБА зладзіла адмысловы абед у прыватнай вільлі Лазара Майко для прадстаўнікоў Міністэрства ўнутраных справаў. Падчас абеда была парушаная патрэба сталых радыёперадачаў для беларускае калёніі. Праз тыдзень К.Мерляк атрымаў афіцыяльнае паведамленьне, што Міністэрствам інфармацыі адпускаецца раз на тыдзень 30 мінут часу для беларускіх перадачаў праз радыё «Эксцэльёр». Паведамленьне пачыналася словамі: «Разглядаючы вашую просьбу мы ўзялі пад увагу пазытыўную працу Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, а перадусім выдатную кніжку «Беларусь і Беларусы ў Аргентыне» ды астатнюю перадачу праз радыё «Эксцэльсёр».

Сёмы агульны сход ЗБА адбыўся 30 травеня 1954 году. Пасьля справаздачаў і ўдзяленьня абсалюторыюма ўступаючай управе, была выбраная новая. На старшыню быў выбраны У.Другавец зь сябрамі: А.Літвінскім, М. Ланкевічам, Л. Петрашам і Ак. Карповічам. У справаздачы старшыні было падана, што ў архіў Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, на рукі яго кіраўніка М. Панькова былі высланыя ў 1953 і 1954 годзе 110 дакумэнтаў і беларускія календары за 1941,1942, 1943, 1974 і 1948 гады.

Разьвітальны банкет спадарству Мерлякам з нагоды іх выезду ў Амэрыку 1 ліпеня зладзіла ЗБА 17 чэрвеня 1954 году ў Летувіскім клюбе ў Буэнос Айрэс. У банкеце ўзяў удзел заступнік шэфа Коордынасіон Фэдэраль дон Хозэ А.Колёдро з сваімі калегамі. Падчас свае прамовы ён уручыў Кастусю ліст ад свайго шэфа палкоўніка Хорхэ М. Осіндэ. Прысутныя прадстаўнікі ад нацыянальных арганізацыяў прамаўлялі й жадалі Мерлякам шчасьлівага падарожжа й ўсяго найлепшага ў Амэрыцы. Ад нацыя-

нальных арганізацыяў узялі ўдзел: ад украінцаў—др.М.А. Рубінец, ад харватаў—інжынер Гасіч, ад славакаў—др.С.М. Петыковіч, ад вугорцаў—дон Г.Кэлэмэнры, ад латышоў—капітан Гашыс, ад летувісаў—дон Ф.Ожымнскас, ад грузінаў—дон Л. Дакарыдзе, ад каўказцаў—інжынер Гомэляўры. Інжынер Сьлівінскі ад палякаў прыслаў тэлеграму. Ад імя ЗБА й ўсіх прысутных ўзяў слова старшыня У.Другавец, а Лявон Петраш уручыў Кастусю на памяць грамату, падпісаную ўсімі прысутнымі.



*Лявон Петраш уручае грамату прадстаўніку Ўраду БНР у Аргентыне Кастусю Мерляку на разьвітальным банкеце з прычыны яго выезду ў ЗША 17 чэрвеня 1954 году.*

Кастусь, разьвітваючыся, падзякаваў прадстаўнікам за прысутнасьць і пажаданьні, заклікаў іх да аб'яднаньня, каб разам вызваліцца з-пад расейска-камуністычнага панаваньня. Падняў тост за аргентынскі народ і яго прэзыдэнта генэрала Хуан дэ Пэрона ды разьвітаўся словамі: «Запэўніваю вас, нягледзячы на тое, што фізычна разлучаюся з сваёю другою Бацькаўшчынаю, яна застанецца назаўсёды ў маёй памяці. Бо немагчыма бацьку забыцца пра Бацькаўшчыну свайго сына —Аргентыну».



*Прысутныя госьці на разьвітальным банкеце спадарства Мерлякоў з нагоды іхняга выезду ў Амэрыку. Буэнос Айрэс, 17 чэрвеня 1954 г.*

Таксама гэтакімі словамі Кастусь разьвітаўся з Аргентынай у сваёй апошняй радыёперадачы 27 чэрвеня, якая была паўторна 3 ліпеня, у час, калі Кастусь разам зь сям'ёй плыў на параплаве.

**ASOCIACION BIELORRUSA EN LA ARGENTINA**

**Coronel Sayos 2981 - Valentín Alsina**

La Comisión Directiva tiene el agrado de informar a Vd. que serán difundidas varias radioaudiciones en el espacio denominado:

**"SENTIMIENTO Y VOZ DEL MUNDO"**

dedicadas a la Colectividad Bielorrusa en la Argentina por las siguientes Radioemisoras y durante los dias:

**27 de Junio de 1954 por L R 5 Radio Excelsior, a las 9.30 horas**

**3 de Julio de 1954 por L S 6 Radio del Pueblo, a las 9 horas**

**3 de Julio de 1954 por L S 4 Radio Porteña a las 17.45 hs.**

Esperando que nuestras audiciones serán escuchadas le agradecemos muy sinceramente.

LA COMISION DIRECTIVA

**ESTA INSTITUCION APOYA EL 2° PLAN QUINQUENAL**

*Праграма беларускіх радыёперадачаў праз радыё «Эксельсіор», «Дэль Пуэблё» і «Пэртэня».*

# Спроба арганізацыі рэлігійнага жыцьця ў Аргентыне

Апынуўшыся на эміграцыі,Кастусь моцна заангажаваўся ў арганізацыі беларускай калёніі ў Аргентыне й зарыентаваўся, што гэта вельмі цяжка рабіць бязь ніякае жыцьцёва практычнай базы, якая-б прыцягала й трымала разам людзей. Адразу пабачыў, што нават моцная нацыянальная сьведамасьць і патрыятызм ня ёсьць дастаткова моцным цэмэнтам, каб трымаць людзей стала пры арганізацыі, тым больш актыўна працаваць для грамадзтва ў той складаны час, калі асабістыя патрэбы моцна стаяць на перашкодзе.

Аналізуючы арганізацыйнае жыцьцё беларускае міжваеннае эміграцыі, стала відавочна, што ў яе нечага не хапала. Нямала людзей стварылі шмат арганізацыяў, нават сваю цэнтралю, а посьпехаў і дасягненьняў ніякіх. Пры першым варожым наступе ўсе разьбягаліся бязь ніякага супраціву. Дык чаму тады калёніі іншых нацыянальнасьцей трымаюцца моцна разам і паступова разьвіваюцца, багацеюць матэрыяльна, паралельна як багацеюць іхнія людзі?

Досьледы паказалі, што калёніі другіх нацыянальнасьцей былі арганізаваныя пры цэрквах. Напрыклад, палякі пры каталіцкіх, славакі—пры праваслаўных і каталіцкіх місыях, харваты й летувісы вылучна пры каталіцкіх храмах, украінцы пераважна пры грэка-каталіцкіх і таксама пры праваслаўных цэрквах, а беларусы гэтага ня мелі.

Праваслаўныя беларусы, ня маючы сваёй царквы, наведвалі расейскую, а каталікі прымкнулі да польскай каталіцкай царквы. Належачы да чужых цэркваў, хочаш ты таго або не хочаш, прыходзіцца належаць і да іхніх арганізацыяў. Пераканаўшыся, што беларуская калёнія доўга не ўтрымаецца бяз свае царквы (прыходы), Кастусь пачаў папярэднюю працу ў гэтым кірунку.

У пачатку 1949 году прыехалі ў Аргентыну два беларускія праваслаўныя сьвятары: а. Мікалай Макарэвіч і а.Васіль Вячорка. Айцец Васіль зь сям'ею пасяліўся ў горадзе Беразатэгі, якіх 60 км ад Буэнос Айрэс.

Найперш Кастусь пазнаёміўся з а. Мікалаем і пачаў яго нагаварваць, каб зарганізаваць прыход Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы. Айцец Мікалай, навучэнец духоўнае сэмінарыі ў Парыжы, служыў на Палесьсі, быў вывезены ў Сібір, адтуль трапіў у Польскі корпус генэрала Андэрса, дзе быў вайсковым капэлянам. Прыехаў у Аргентыну з Англіі з матушкай, дзяцей у іх ня было.

Пэрспэктыва жыць у Аргентыне й пачаць ад нічога арганізоўваць прыход, будаваць царкву ды яшчэ БАПЦ, да якое а.Мікалай ня меў сэрца, яму не імпанавала. Разьведаўшы дакладна сытуацыю, ён прыйшоў да высновы, што яму тут сьвятарскай кар'еры няма. Ён сабраўся й вярнуўся назад у Англію, прабыўшы ў Буэнос Айрэс каля году.

Айцец Васіль жыў пры сваёй сям'і. Ён пачаў арганізоўваць прыход, сабраў некалькі сем'яў беларусаў, казакоў і іншых. Нанялі гараж ды ўсе разам абсталявалі царкву. Пратаярэй Васіль некаторы час не належаў да ніякае юрысдыкцыі. Падчас літургіі ўспамінаў Канстантынопальскага Патрыярха й сьвятых беларускае зямлі. Да Расейскае Зарубежнае Царквы, пры ўсёй яго прыхільнасьці да расейшчыны, не хацеў належаць, бо меў нейкія засьцярогі да мітрапаліта Панцелеймана, а да Паўночна-Амэрыканскае мітраполіі яго не дапускалі прыхаджане не беларусы. Да БАПЦ яго адгаварваў Пётра Саўчыц, ужываючы ўсякія неверагодныя аргумэнты супраць БАПЦ.

У гэтым часе распачалася карэспандэнцыя між управай ЗБА, япіскапам Васілём (БАПЦ у Нямеччыне) й а. Васілём Вячоркаю. Сябры ЗБА зрэдку наведвалі прыход а. Васіля, але ўправа ЗБА заўсёды запрашала яго на сьвяткаваньні. Адбылося некалькі канфэрэнцыяў, адна зь іх з удзелам а. Барыса Арыйчука УАПЦ, але нічога не памагло. Айцец Васіль не адважыўся парваць з расейшчынай і далучыцца да БАПЦ.

Праўда, была зроблена спроба, каб а.Васіль беспасрэдна пайшоў пад апеку Ўсяленскага патрыярха. Кастусь дабіўся аўдыенцыі ў вікарыя Грэцкай праваслаўнай царквы монсіньёра Фотыёса Пантоса, які абяцаў справу палагодзіць, калі атрымае афіцыяльную заяву ад а. Васіля. Але Васіль Вячорка адказаў, што ніякае заявы пісаць ня будзе. На гэтым справа й скончылася.

Управа ЗБА, каб забясьпечыць духовую апеку для сяброў арганізацыі, зьвярнулася з просьбай да прыходу сьв. Пакровы УАПЦ, каб прынялі іх пад сваю апеку да часу зарганізаваньня свайго прыходу, на што ўправа прыходу й настаяцель Барыс Арыйчук ахвотна згадзіліся. Управа ЗБА ў чэрвені 1952 года сваім камунікатам аб гэтым паведаміла праваслаўных беларусаў.

Па прыездзе ў Аргентыну Кастусь адразу стаў цікавіцца старой эміграцыяй, вывучаючы яе сацыяльны склад, нацыянальную сьведамасьць, месца паходжаньня ды сучасныя абставіны, у якіх яны жылі. Аказалася, што большая частка зь іх былі малазямельныя праваслаўныя людзі, якія выехалі на эміграцыю, шукаючы лепшыя ўмовы жыцьця. Будучы мала сьвядомымі нацыянальна, яны лёгка паддаліся камуністычнай прапагандзе падчас і пасьля вайны. Меншая частка беларускіх эмігрантаў гэтага пэрыяду складалася з каталікоў і была больш нацыянальна сьведамая. Многія зь беларусаў мелі свае прадпрыемствы. Але яны належылі да польскай каталіцкай царквы, а тым самым і да польскіх арганізацыяў. Такім чынам, пасрэдна або беспрасрэдна дапамагалі палякам.

Кастусь зразумеў, што толькі з гэтаю групай беларусаў можна гутарыць. Ён са сваімі сябрамі пачалі вышукваць і навязваць знаёмствы. Кастусь пазнаёміўся з сп. Нядзелька, быўшым сакратаром гарадзкога суду ў Наваградку, грамадаўцам, які ў доўгіх гутарках расказваў пра грамадзкае жыцьцё беларусаў пад Польшчай. Сп. Нядзелька моцна зацікавіўся Кастусём, бо той толькі што прыехаў у Аргентыну, а ўжо ведаў мову й працаваў у параплаўнай галандзкай кампаніі. Гэта было нязвычайным здарэньнем сярод беларускае эміграцыі. Нядзелька дапамог пашырыць кола знаёмстваў, пазнаёміў зь сем'ямі: Гайлевіча, Паўлоўскага, Ількевіча, Мешкоўскага, Хроля, Фарына, Станкевіча, Скіпара. Лойкі, Сьвірковіча й іншыя.

На прапанову ўсупіць у ЗБА старыя эмігранты адказалі, што яны ўжо даўно зьбіраліся залажыць беларускі камітэт, зложыць грошы й купіць адпаведны будынак, дзе-б мясьціўся беларускі культурны цэнтр.

«Калі-б тут быў беларускі каталіцкі сьвятар, дык ён быў-бы нам гарантыяй, што ня станецца з намі, так як сталася з Славян-

скім Саюзам. У Аргентыне ўлада часта мяняецца, а гэтым самым і палітычная кан'юктура».

Яшчэ у 1951 годзе Кастусь зьвярнуўся да старшыні Рады БНР інжынера М.Абрамчыка аб патрэбе каталіцкага сьвятара-беларуса ў Буэнос Айрэс. У гэтай справе пайшлі лісты да пралата Пётра Татарыновіча ў Рым, да а. Льва Гарошкі ў Парыж, да а.Ч. Сіповіча ў Лёндан, да яго эксцэленцыі біскупа Б.Слосканса, апостальскага візытатара для беларусаў на чужыне й Б.Рагулі ў Лювэне.

Спачатку была зроблена прапанова, каб зьвярнуцца да сьвятароў, якія знаходзяцца ў Аргентыне, а менавіта да а. Альфонса Падзявы (Салезьняніна). Айцец Падзява пражываў у горадзе Мэндоза й працаваў настаўнікам у школе «дон Боско». Таксама да а.Грышанса (Марыяніна), у горадзе Розарыё, які па нацыянальнасьці быў латышом, але добра ведаў беларускую мову. Айцец Падзява на просьбу ўправы ЗБА адказаў, што згадзіўся-б пераехаць ў Буэнос Айрэс, калі-б яго ўлады на гэта далі дазвол. Управа ЗБА зьвярнулася да генэральнага інспэктара Салезьянаў дона Люіса Ваўлі ў горадзе Кордова з просьбай дазволіць а.Падзяве зьмяніць месца рэлігійнага жыцьця, але ніякга адказу так і не атрымала.

Што тычыцца айца Грышанаса, то той на запрос ЗБА адказаў, што яго гэта не цікавіць. Зьвяртаньне да кандыдатаў у Эўропе, а менавіта да а.Маскаліка, а.Салаўя й а. Чарняўскага, вынікаў таксама не прынесла. Кожны зь іх меў нейкія перашкоды, каб выехаць у Аргентыну.

# Савецкая дзейнасьць у Аргентыне

Ад самага пачатку навязаньня дыпляматычнай сувязі ў 1946 годзе Савецкага Саюзу з Аргентынай і прыезду ўпаўнаважанага пасла СССР у Буэнос Айрэс праводзілася актыўнае пранікненьне савецкіх агентаў у беларускія арганізацыі, каб праводзіць сваю прапаганду ды захочваць беларусаў вярнуцца на «Радзіму».

Зараз-жа пачаліся паяўляцца ў газэце «Наш голас», якая выдавалася Славянскім Саюзам у Аргентыне, артыкулы пра шчасьлівае й вольнае жыцьцё ў краіне сацыялізму. У гэтай газэце быў надрукаваны заклік, скіраваны да грамадзян Савецкага Саюзу, каб яны вярталіся дадому, бо іх чакаюць родныя й «Радзіма». Людзі пайшлі, можна сказаць, масава запісвацца на паварот дадому. Аднак у савецкім кансуляце сказалі: «Толькі грамадзяне могуць ехаць, а вы ўсе прыехалі як польскія поданыя. На ваш паварот дадому трэба чакаць на дазвол з Масквы. »[1]

У міжчасе людзі пачалі атрымоваўць газэту «За вяртаньне на Радзіму», выдаваную ў Усходнім Бэрліне, якая расхвальвала камуністычны лад ды заахвочвала вяртацца дадому. Адначасна, абвінавачвала новую беларускую эміграцыю, якая ачэрнівае Савецкі Саюз, у супрацоўніцтве з фашыстамі. З часам пачалі атрымоўваць гэтую газэту ўсе сябры ЗБА. Яе ніхто не хацеў чытаць, тым больш, што яна кампрамітавала іх перад аргентынскім грамадзтвам.

Кастусь сабраў пэўную колькасьць нумароў, занес да Коордынасіон Фэдэраль, схарактэрызаваў і заявіў, што беларусы, асабліва сябры ЗБА, ня хочуць яе атрымоўваць. Па нейкім часе газэта «За вяртаньне на радзіму» перастала прыходзіць, а аргентынская прэса падала ў верасьні 1952 году, што надзвычайны й упаўнаважаны пасол СССР Герогі Разанаў прыбыў у Аргентыну на месца ўпаўнаважанага пасла Смірнова, які вярнуўся ў Маскву.

Па прыездзе Разанава зноў разгарнулася прапагандная акцыя вяртаньня да дому, у Беларусь. Польскія пашпарты заменьвалі на савецкія, параплавы адпраўлялі людзей зь вялікім багажом у

1. «Бацькаўшчына», № 70 за 15 верасьня 1951 г. «Фашысты могуць ехаць на «родину», К.Мацкевіч.

Савецкі Сазюз. На першым параплаве ад'ехаў зь сям'ёй сябра ЗБА Іван Вежанскі. Гэты факт пацьвердзіў падазрэньне, што ён супрацоўнічаў з Саветамі й падаваў адрасы беларусаў, якія атрымоўвалі газэту «За вяртаньне на Радзіму». Іван Вежанскі аказаўся, у сапраўднасьці, Мікалаем Чырыкам зь вёскі Каковічы, Рэчыцкага раёну, Гомельскай вобласьці. Вярнуўшыся з Аргентыны, ён уладзіўся прадаўшчыком у г. п. Васілевічы гэтага раёну. Газэта «За вяртаньне на Радзіму» ў № 28 (118) за травень 1957 году памясьціла напісаны ім (або толькі за яго подпісам) артыкул пад назвай «Не, пан Мерляк, на хлусьні далёка не паедзеш». Вось што ён, між іншым, пісаў: «У 1952 годзе, спадзяючыся на тое, што гэтая арганізацыя хоць у нейкай ступэні будзе дапамагаць беларусам-бежанцам, я ўступіў у так званае Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне. Якое-ж было маё расчараваньне, калі я зразумеў, што ніякая гэта не нацыянальная арганізацыя, а проста зборышча прадажных душ, якія за амэрыканскія доляры льюць бруд на нашу краіну, вярбуюць шпіёнў для падрыўной дзейнасьці ў ёй. Арганізацыю гэтую стварыў чалавек нізкай і прадажнай душы К. Мерляк».



# Прадстаўніцтва Ураду БНР у Аргентыне

Грамадзкая дзейнасьць Кастуся Мерляка праводзілася ад імя Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне. Аднаго дня атрымаў ён за подпісам старшыні Рады БНР М.Абрамчыка Мандат Рады Беларускае Народнае Рэспублікі, які сьведчыў, што ён, спадар Мерляк Канстанцін, народжаны 25 сьнежня 1919 г. у в.Дзетамля, зьяўляецца сябрам Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з дня 5. 8. 1948. З таго часу палітычная дзейнасьць Кастуся ў Аргентыне адбывалася ад імя сэктару Рады БНР і ад імя прадстаўніцтва ўраду БНР ў Аргентыне.З разьвіцьцём беларускага грамадзкага жыцьця ў Аргентыне былі прынятыя ў Раду БНР яшчэ два сябры: Уладзімір Другавец і Мікалай Данкевіч. Такім чынам, у 1949-1954 гадах існаваў сэктар Рады БНР у Аргентыне, старшынёю якога зьяўляўся К.Мерляк. Дзейнасьць сэктару зьвязвалася зь дзейнасьцю ЗБА і прадстаўніцтвам Ураду БНР у Аргентыне.

**БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА**
**РАДА БЕЛАРУСКАЕ НАРОДНАЕ РЭСПУБЛІКІ**

**М а н д а т .**

Гэтым съветчыцца, што спадар М Е Р Л Я К Канстантын , народжаны 25 сънежня 1919 г. у в. Д з е т а м л я, зьяўляецца сябрам Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з дня 5.8.1948.

Па рыж, дня 7.8.1948.

М.Абрамчык

Старшыня Рады Б.Н.Р.



12 студзеня 1949 году К. Мерляку быў выдадзены дакумэнт наступнага зьместу: «Мы, Урад Беларускае Народнае Рэспублікі, гэтым сьведчым, што Спадар Мерляк Канстанцін зьяўляецца Прадстаўніком Ураду БНР у Аргентыне. Усе ўстановы й арганізацыі, прыязныя Беларускаму Народу, просяцца мець да Спадара Мерляка Канстанціна поўны давер і аказваць яму ўсю магчымую дапамогу й падтрымку ў выкананьні ім сваіх абавязкаў.»

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА
УРАД БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ
REPUBLIQUE DEMOCRATIQUE BIELORUSSIENNE
GOUVERNEMENT DE LA REPUBLIQUE DEMOCRATIQUE BIELORUSSIENNE

№ 51.../49 Гаспода 12.I.1949

МАНДАТ

Мы, Урад Беларускае Народнае Рэспублікі, гэтым сьветчым, што

Спадар МЕРЛЯК Канстантын

зьяўляецца Прадстаўнікам Ураду БНР у Аргентыне.

Усе ўстановы й арганізацыі, прыязныя Беларускаму Народу, просяцца мець да Спадара Мерляка Канстантына поўны давер і аказваць яму ўсю магчымую дапамогу й падтрымку ў выкананьні ім сваіх абавязкаў.

Важны да 31-га сьнежня 1949 году.

Беларуская Народная Рэспубліка

Дзяржаўны Сакратар Ураду БНР /Г.Палакевіч/

Прэм'ер-Міністар Ураду БНР /А.Кахановскі/

Маючы фармальнае прызначэньне рэпрэзэнтаваць Урад БНР на чужыне ў Аргентыне Кастусь распачаў сваю дыпляматычную дзейнасьць. У лютым і наступных месяцах 1949 года Кастусь асабіста прадставіўся міністру Міраславу Арцішэўскаму, прадстаўніку Польскага ўраду ў Аргентыне. Сп. Арцішэўскі свайго часу быў заступнікам Бэка, міністра вонкавых справаў Польшчы. У прыязнай размове высьветлілася, што ён супрацоўнічаў з урадам БНР у 1918-1920 гадах і паінфармаваны аб стане, у якім знаходзіцца Беларусь. Зь ім была абгаворана справа супрацоўніцтва й узаемнай падтрымкі ў змаганьні за вызваленьне абедзьвюх краінаў.

Далей Кастусь прадставіўся прафэсару Аўгену Анацкаму—прадстаўніку УНР ў Аргентыне, сп. Канстанціну Норкусу—рэдактару летувіскай газэты «Балзас» і генэралу Тодару Даўкантас—упаўнаважанаму Летувіскага ўраду ў Аргенгыне.

Прадстаўнік ураду БНР наведаў Амэрыканскую амбасаду 16 лютага 1949 году й правёў гутарку з другім сакратаром амбасады Джонам Шылокам. Размова трывала больш за паўгадзіны. Містэр Шылок моцна зацікавіўся беларускай справай і запрапанаваў часьцей спатыкацца дзеля абмену думак у справах супольнага зацікаўленьня.

Кастусь таксама наведаў канцылярыю Каордынасіон Фэдэраль (палітычны аддзел Міністэрства ўнутраных справаў Аргентыны), дзе ён быў прыняты палкоўнікам Осіндэ.

Пісьмова Кастусь прадставіўся Міністэрству вонкавых справаў Аргентыны, летувіскаму міністру ў Уругваю (які адначасна быў міністрам і на Аргентыну) др. Р.Олінсу, ўпаўнаважанаму Латвійскага ўраду ў Рыё дэ Жанэйро, Бразілія.

На пасяджэньні выканаўчага камітэту Фэдэрацыі Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы 25 сакавіка 1949 году Кастусь быў прадстаўлены прадстаўнікам: Альбаніі—др. Мубараку Топтані, Аўстрыі—міністру Эрнсту Старэнбэргу, Эстоніі—консулю Аляксандру Массакасу, Грэцыі—міністру Канстанціну Манядакіс, Баўгарыі—міністру Алякандру Занкофу, Харватыі—міністру Бранко Бэнзону, Вэнгрыі—міністру Арно дэ Бобрыку, Сэрбіі—міністру Мілану Стоядынаву, Латвіі—сп.М.Бітэ, Румыніі—генэральнаму консулю Тутусу Міхайлеску, Славакіі—міністру Фэрдынанду Дурчанскаму, Славэніі—др. Вінко Зорку, Чэхіі—капітану Ўладыславу Прахла.

Фэдэрацыя Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы ў Аргентыне была заснавана 7 лістапада 1948 году. У яе ўваходзілі прадстаўнікі ад 17-ці краінаў. Асноўная праца палягала на падрыхтоўцы матэрыялаў, якія былі высыланыя ўрадам Заходняга сьвету перад кожнай інтэрнацыянальнай канфэрэнцыяй, якія часта адбываліся з удзелам Савецкага Саюзу.

Фэдэрацыя правяла вялікую актыўнасьць у першыя гады свайго існаваньня. Адбываліся нязьлічоныя паседжаньні, на якіх разглядаліся розныя падзеі ў Эўропе. Быў зарганізаваны аддзел журналістаў, а праз яго наладжаны абмен прэсы. Толькі ў 1949-1950 гадах адбылося 23 паседжаньні, на якіх быў прысутны прадстаўнік ураду БНР. Аднак Фэдэрацыя, у сутнасьці, дзейнічала нелегальна. Яна была незарэгістраваная, таму што Аргентынскі ўрад з прэзыдэнтам Пэронам маніліся стварыць трэцюю сілу ў сусьвеце. У канцы 1950 году прадстаўнікі, прысутныя на паседжаньні, былі арыштаваныя, але адразу выпушчаныя на волю пасьля падпісаньня дэкларацыі, спыняючай дзейнасьць Фэдэрацыі.

29 чэрвеня 1949 году прадстаўнікі Фэдэрацыі, ў тым ліку й прадстаўнік Ураду БНР, разьвіталіся з Грэцкім міністрам Канстанцінам Манядакісам, які вяртаўся ў Грэцыю, каб ізноў узяць удзел у палітычным жыцьці свае краіны. Аднаго дня Кастусь быў выкліканы ў Коордынасіон Фэдэраль. Там яму паказалі мандат, выдадзены др.М.Мінкевічу праз БЦР, з запісам, што той зьяўляецца прадстаўніком Беларускай Цэнтральнай Рады ў Аргентыне. Кастусю заявілі, што такім чынам яны маюць прадстаўнікоў ад двух ўрадаў Беларусі. Кастусь па меры зьдольнасьці вытлумачыў палітычную сытуацыю, прычыны ўзьнікненьня двух «урадаў» на чужыне й заявіў: «Каго вы прызнаеце, той і будзе прадстаўніком ад беларусаў».

Па нейкім часе беларусы даведаліся, што др. М. Мінкевіч, які выехаў у правінцыю Сан Люіс працаваць лекарам, назначаны Міністэрствам аховы здароўя. Але на гэтым справа не закончылася. Пазьней паявіўся яшчэ адзін прадстаўнік ад беларусаў, нейкі пан Тэльмашэўскі, але яго кадэнцыя ня трывала доўга. Р.Астроўскі наведаў Аргентыну й свайго зяця др. М.Мінкевіча ў 1951 годзе. Знаходзіўся ў Аргентыне «інкогніта», з чаго ня былі задаволеныя яго прыхільнікі. Па нейкім часе Р. Астроўскі вярнуўся ў Эўропу.

У першай палове 1950 году праводзілася справа дапомогі беларускім студэнтам у Лювэне. Др. Б.Рагуля, старшыня Акадэміцкага аб'яднаньня на чужыне й прэзыдэнт М.Абрамчык навязалі лучнасьць з др. Джорджам Сантынам, старшынёй Інтэрнацыянальнага Саюзу студэнтаў у Бельгіі, які прыабяцаў дастаць ад Аргентынскага ўраду й фундацыі Эвы Пэрон фінансавую дапамогу на 100 стыпэндыяў для беларусаў, што будуць студыяваць у Лювэне. Кастусю даручылі, каб ён разам з др. Сантынам, калі той вернецца ў Буэнос Айрэс, давялі гэтую справу да канкрэтнага выніку. Было праведзена нямала розных канфэрэнцыяў, напісана нямала мэмарандумаў, усё было ўзгоднена, нават прыезд др. Б.Рагулі ў Буэнос Айрэс, але, нажаль, пасьля выезду др. Сантына назад у Лювэн, справа не была зрэалізаваная.

3-га чэрвеня 1950 году Кастусь наведаў Уругвай з мэтай азнаямленьня з грамадзкім жыцьцём беларусаў у горадзе Монтэвідэо й яго ваколіцах. Аказалася, што ў Монтэвідэо існавала «Беларускае таварыства імя Маскіма Горкага» з двума аддзеламі ў недалёкіх гарадох. Гэтае таварыства, як і іншыя арганізацыі, было апанаванае савецкімі агентамі й парадак у ей быў такі самы, як і ў арганізацыях у Аргентыне да часу іхняе ліквідацыі ў 1949 годзе.

На адным банкеце, ладжаным параплаўнай кампаніяй, у якой працаваў Кастусь, ён запазнаўся й запрыязьніўся з палітычна-культурным аташэ Чылійскае амбасады ў Буэнос Айрэс Люісам Морандэ. Кастусь правёў зь ім некалькі спатканьняў і той зацікавіўся беларускай эміграцыяй, нягледзячы на тое, што ў Чылі было ня шмат беларусаў. Сэнёр Морандэ прыабяцаў паспрабаваць дастаць некалькі стыпэндыяў для студэнтаў і даць дапамогу на культурную дзейнасьць ЗБА. Але ён паехаў у Чылі, так і не выканаўшы свае абяцаньні.

У студзені 1951 года Кастусь атрымаў паведамленьне з канцылярыі Ураду БНР, што сп. Пётр Манькоўскі пераняў ад сп. М.Тулейкі абавязкі Дзяржаўнага сакратара. Ад гэтага часу ўся карэспандэнцыя павінна была накіроўвацца на паданы адрас у Нью Ёрку. (Да гэтага часу ўсе справы накіроўваліся ў Нямеччыну або прэзыдэнту ў Парыж).

Падчас вакацыяў у ліпені 1951 году наведаў Буэнос Айрэс і беларускую калёнію Уладзімір Клімовіч, які быў па прафэсыі

мярнічы й свайго часу прыехаў сюды з Англіі разам з Г.Юузэфовічам. У. Клімовіч дастаў працу ў Міністэрстве земляробства й быў высланы працаваць мярнічым у правінцыю Сантьяго дэль Эстэро, якая мяжавала з Чылі. У.Клімовіч быў прадстаўніком Беларускага студэнцкага фонду на Аргентыну. Падчас спатканьня з Кастусём былі абгавораны справы студэнцкага фонду й зроблена прапанова вярнуць У. Клімовіча ў Буэнос Айрэс, дзе была патрэба ў людзях, . здольных працаваць на грамадзкай ніве. Кастусь запэўніў яго, што пры дапамозе знаёмага З.Кастэльлё, афіцыйнага архітэктара сталіцы Буэнос Айрэс, той атрымае пасаду мярнічага бяз ніякіх клопатаў. Клімовіч адказаў, што ён не пераедзе па прычынах прыватнага характару, а таксама, што грамадзкая праца яго не цікавіць.

31 ліпеня 1951 году Кастусь наведаў Міністэрства ўнутраных справаў Аргентыны ў справе, каб дэлегацыя Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне была прынятая прэзыдэнтам рэспублікі Генералам Хуан Д. Пэрон. На аўдыенцыі запэўнілі, што дэлегацыя будзе прынятая, калі ўправа ЗБА зложыць заяву на рукі прыватнага сакратара Прэзыдэнта ў Каза Розада.

У кастрычніку гэтага году ад старшыні рады БНР М. Абрамчыка быў атрыманы ліст з прапановамі стварэньня «Союзу освобождения народов России» СОНР). Патрабавалася, каб ў Аргентыне разглядзелі прапановы СОНР і выказалі свой пагляд, які будзе прадстаўлены на 6-й сэсіі Рады БНР, што мела адбыцца ў сьнежні 1951 году. Кастусь з двума сябрамі Рады БНР і некалькімі асобамі бэнээраўцамі справу разгледзелі й выказаліся, што прапановы й прынцыпы дзеяньня гэтага «саюзу» зьяўляюцца недэмакратычнымі й поўнасьцю супярэчаць ідэі й волі народу, выказанай Актам 25 Сакавіка.

Вырашылі, што расейцы як і іншыя народы мусяць згадзіцца на тое, што першы ўстаноўчы сойм на вольнай і этнаграфічнай Беларусі пастановіць з кім і ў якой форме прыступіць да Саюзу або Фэдэрацыі.

Як аказалася пазьней гэта быў пачатак фармаваньня палітыкі пад назовам «непрадрашэнства».

У студзені 1952 году Кастусь атрымаў ліст і фінансавую справаздачу ад У. Клімовіча, якую ён паабяцаў прыслаць падчас

свайго пабыту ў Буэнос Айрэс. У справаздачы было пададзена, што на дапамогу беларускім студэнтам было сабрана 735 пэзаў, а таксама як і каму былі перасланыя грошы. Астатак грошаў быў перададзены Г.Юзэфовічу. Акрамя таго была залучаная ягоная рэзыгнацыя з пасады прадстаўніка студэнцкага фонду на Аргентыну. Гэта была апошняя вестка ад У.Клімовіча. Пазьней дайшлі слухі, якія ня былі праверанымя, што Клімовіч памёр з ранаў, атрыманых у дуэлі, баронячы гонар па традыцыі «гаўчо». Гэнрык Юзэфовіч у пачатку 1952 году выехаў у Мадрыд Гішпанію, на студыі. Рэгулярная карэспандэнцыя Кастуся зь ім вялася аж да 1954 году, а пазьней заціхла раз і назаўсёды. Больш аб Юзэфовічу Кастусь нічога не чуў.

Прыяцель Кастуся Пётр Яблонскі, які яшчэ ў 1948 годзе прыехаў у Аргентыну, спачатку ўладзіўся на працу на фабрыцы. Праца на фабрыцы яму была не да спадобы й ён зрабіў на два гады кантракт на працу на «Агністай зямлі» ў засягу Паўдзённага Полюсу. Вярнуўся ў Буэнос Айрэс з грашыма. Пачаў іграць «вялікага пана», хадзіць на конныя перагонкі. Іпадромы ды любоў да жанчынаў давялі да таго, што пачаў на станцыі Рэтро прадаваць вязкамі часнок. Як даведаліся пазьней, Яблонскі прылучыўся да выправы ў Бразылію здабываць або вымываць золата ў рэчках. З гэтае працы ён ніколі не вярнуўся.

У жніўні 1952 году ў газэце «Бацькаўшчына», рэдактарам якое быў др. Стась Станкевіч, быў зьмешчаны вялікі артыкул пра Эву Пэрон, прэзыдэнта Пэрона й пра Аргентыну наогул. У артыкуле было шмат недакладнасьцей, нэгатыўных выказваньняў. Кастусь парэкамэндаваў управе ЗБА не распаўсюджваць гэтага нумару ў Аргентыне, бо ён мог-бы шмат пашкодзіць арганізацыі ў выпадку калі-б зьмест артыкула быў данесены да Коордынасіон Фэдэраль.

Пачынаючы з канца 1952 году, Кастусь пачаў атрымоўваць камунікаты, паведамленьні й інфармацыі аб стварэньні блёкаў, цэнтраў і фронтаў для змаганьня з бальшавікамі. Усё гэта выклікаў Амэрыканскі камітэт вызваленьня народаў СССР. Пазьней ён быў пераіменаваны на Амэрыканскі камітэт вызваленьня. Гэты камітэт імкнуўся стварыць каардынацыйны цэнтр, які кіраваў антыбальшавіцкім змаганьнем, якое будзе фінансавацца Амэрыкай праз камітэт вызваленьня.

Вось гэтае «фінансаваньне» спрычынілася стварэньню перш за ўсё СОНР «Союза Освобождения Народов России» з 5-ці расейскіх арганізацыяў, уключаючы ўласаўцаў і нацыянальных фэдэралістаў—русафілаў.

З другога боку 6 нацыянальных цэнтраў, а менавіта цэнтры: Беларусі, Украіны, Грузіі, Арменіі, Паўдзёнага Каўказу, Азэрбайджану (пазьней дайшоў цэнтр Казакіі) у Парыжы стварылі свой цэнтр і назвалі яго Міжнацыянальным антыбальшавіцкім каардынацыйным цэнтрам (МАКЦ). (Часьцей за ўсё яго называлі «Парыскі блёк»).

Расейскі блёк у перагаворах з амэрыканскім камітэтам. закідаў, што нацыянальныя цэнтры «прадрашаюць», называючы сябе «незалежнымі дзяржавамі», а нацыянальныя цэнтры казалі, што расейцы хочуць захаваць сваю імпэрыю, толькі не чырвоную, а белую. А дзеля гэтага яны прапаноўвалі «непрадрашаць», гэта значыць, што па зьнішчэньні камунізму ў СССР ўсе народы на «учредительном собрании в Москве» вырашаць сваю будучыню. Да таго-ж амэрыканцы сп.Пэч і адмірал Стывэнсан, прадстаўляючы Амэрыканскі камітэт, дамовіліся зь «блёкамі», а таксама й з паасобнымі арганізацыямі, якія да гэтага часу ігнараваліся (а іх было нямала ў кожнай нацыянальнай групе). Прафэсар. Р. Астроўскі, вярнуўшыся з Аргентыны як Прэзыдэнт БЦР, таксама стараўся быць улучаны ў гэты цэнтр, каб і бэцээраўцам нешта перапала з фондаў.

Каб устанавіць «плятформу» супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам вызваленьня, Прэзыдэнт Рады БНР разаслаў паведамленьне аб тым, што 7-я сэсія Рады БНР, з 12-цю пунктамі парадку дня, склікаецца на 9 студзеня 1953 году у Нью Ёрку. Ня маючы дакладных інфармацыяў пра ўсю справу й ніякіх канкрэтных прапановаў, Кастусь не рабіў рапарта Прэзыдэнту Рады БНР.

У верасьні 1953 году Кастусь атрымаў ліст а др. Ст.Станкевіча, у якім той, між іншымі справамі, пісаў: «Група беларусаў у Аргентыне зьвярнулася да мяне зь пісьмом з просьбай, каб я стараўся вас пераканаць ці ўгаварыць, каб вы іх не пакідалі й ня пераяжджалі ў Амэрыку. Яны пішуць, што ў Аргентыне вы зьяўляецеся адзіным, хто можа кіраваць вашай арганізацыяй, арганізаваць яе работу й выступаць перад аргентынскімі ўладамі. Яны зазначаюць, што ў выпадку вашага ад'езду ўся беларуская

праца ў Аргентыне ляжа на чатыры лапаткі. Аргентына вельмі важны для нас пункт сёньня, а ў будучыні, праўдападобна, будзе яшчэ важнейшы. Таксама Вашыя матэрыяльныя ўмовы, як мяне інфармавалі, у Аргентыне неблагія, якіх вы ў ЗША можаце й ня мець. Калі даведаўся аб гэтым Вашым праекце прэзыдэнт Абрамчык, дык таксама гэтым вельмі пераняўся».

Расейцы ў Эўропе й Аргентыне настойліва пераконвалі амэрыканцаў, што камунізм гэта не расейская, а інтэрнацыянальная справа, і пакуль ён ня будзе зьнішчаны, ня трэба «прадрашаць»[2]. Група СОНР з удзелам уласаўцаў зарганізавалі 26 лістапада ў Буэнос Айрэс мітынг, каб падмацаваць свае патрабаваньні перад Амэрыканскім камітэтам. Некалькі дзён перад мітынгам Кастусь спаткаўся зь інжынерам Філіпавым (іхнім лідэрам) па ягонай асабістай просьбе, з мэтай наладзіць супольнае супрацоўніцтва. Кастусь удзелу ў мітынгу ня ўзяў, але на ім быў прысутны інкогніта ад ЗБА М.Ланкевіч.

У студзені 1954 году быў атрыманы ліст ад А.Каханоўскага, старшыні Цэнтральнага камітэту Аб'еднаньня Беларускіх Нацыяналь-дэмакратаў, з залучанай копіяй ліста да прэзыдэнта Абрамчыка адносна кіраваньня вонкавай і ўнутранай палітыкі Рады БНР. Аргентынскі сэктар Рады БНР, ня маючы інфармацыяў адносна супярэчных поглядаў, ня мог заняць ніякага становішча.

4 лютага 1954 году ў Бэрлін, на канфэрэнцыю міністраў 4-х вялікіх дзяржаваў прадстаўнікам ЗША, Англіі й Францыі быў высланы мэмарандум, з пажаданьнем, каб пастановы канфэрэнцыі былі вынесеныя згодна й у духу Атлянтычнага чартару, чартару Аб'еднаных Нацыяў і Дэклярацыі правоў чалавека 1948 году. Мэмарандум быў падпісаны прадстаўнікамі 7-мі народаў Усходняе Эўропы, у тым ліку й ад Беларусі.

На запросіны Прэзыдэнта Аргентынскага сэнату Альбэроо Я. Ітурві, Кастусь быў ганаровым госьцем на ўрачыстым паседжаньні аргентынскага кангрэсу 7 травеня 1954 году, з нагоды прысягі віцэ-прэзыдэнта новавыбранага контрадмірала дон Альбэрто Тэсайрэ. Перад ад'ездам у Амэрыку Кастусь разьвітаўся з Аргентынай, высылаючы лісты ўдзячнасьці Прэзыдэнту Рэспублікі генэралу Хуан Д. Пэрон ды міністэрстам яе вонкавых і ўнутраных справаў.

---

2. Прадрашаць — г.з. вырашаць наперад

*Presidente de la Nación Argentina*

*Secretaría Privada*

saluda muy atentamente al señor CONSTANTINO MIERLAK, y al acusar recibo de su carta del día 14, dirigida al Excmo. Señor Presidente, se complace en trasmitirle sincero agradecimiento por los conceptuosos términos y elogiosas expresiones que le destina.

Retribuye la gentileza, haciéndole llegar los mejores votos por su ventura personal. -

BUENOS AIRES, 24 de junio de 1954.

D/L

*Адказ Прэзыдэнта Аргентыны генэрала Хуана Д.Пэрона на ліст удзячнасьці К.Мерляка*

# Пасьляслоўе

Пасьля выезду Кастуся, пачынаючы з 1955 году, пачалося перасяленьне («экзодус») беларусаў з Аргентыны. Перш пачалі ехаць на «Радзіму» беларускія эмігранты міжваеннага пэрыяду (1923-1938), каб «зажыць шчасьліва» ў Савецкай Беларусі. Выехала іх нямала, а колькі дакладна, мабыць, ніхто ня ведае. Каб даведацца, якое было іх жыцьцё пасьля павароту, трэба было чакаць 10 гадоў на тых, хто ўсё-такі вярнууся назад у Аргентыну ды ўсё расказаў. А вярнулася няшмат. Саветы назад пускалі толькі тых, хто нарадзіўся ў Аргентыне й толькі ў вынятковых абставінах.

Пачынаючы з 1957 году, пачалі выяжджаць беларусы ў Амэрыку, але тыя, якія прыехалі ў Аргентыну пасьля другое сусьветнае вайны. Між першымі прыехаў у 1958 годзе Уладзімір Другавец. (Па выезьдзе Кастуся, ён стаў на чале кіраўніцтва грамадзкага жыцьця ў Аргентыне). У. Другавец прыехаў у Нью Ёрк сам, бязь сям'і й спадзяваўся, што хутка прыедзе жонка й дзьве дачкі. На жаль, ён хутка захварэў і прабыў у шпіталі больш за два гады. Трагічнаю сьмерцю закончылася яго жыцьцё 7 лютага 1961 году.

У міжчасе пераехалі ў Амэрыку дзьве сям'і Бычкоўскіх, тры сям'і Дземідзенкаў, дзьве сям'і Губартоў, Дубоўскія, Зарэцкія, Оныська, дзьве сям'і Саўчыцаў, Каленік, пратаярэй Васіль Вячорка з сям'ёю ды іншыя.

Згуртаваньне Беларусаў у Аргентыне па некалькіх гадох існаваньня зьліквідавала сваю канцылярыю ды перанесла адрас на прыватную кватэру М. Ланкевіча. Інж. Фока Фамін і М. Ланкевіч зь іншымі сябрамі прадаўжалі дзейнасьць ды рэпрэзынтацыю беларускае калёніі ў Аргентыне больш за дзесятак гадоў. У міжчасе адзін па аднаму пачалі пакідаць гэты сьвет А. Літвінскі, Д.Кулік, С. Камар, інж. Ф. Фамін, М. Ланкевіч, А. Кулак і Гэйхорх ды іньшя.

У шасьцідзесятыя й сямідзесятыя гады, час ад часу пра беларусаў у Аргентыне пісаў у беларускую прэсу Эміль Цяўлоўскі, па прафэсыі журналіст. Цяўлоўскі быў вывезены на Сібір у 1940 годзе. Там ён трапіў у польскую армію генэрала Андэрса й праз Блізкі Ўсход, Італію, Англію прыехаў у Аргентыну. Будучы каталіком, далучыўся да польскае арганізацыі. Да Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне ён не належаў.

Выязджаючы з Аргентыны, Кастусь паабяцаў за пару год вярнуцца назад. Нажаль, ён змог зьдзейсьніць задуму толькі пасьля 32-х гадоў. У травені 1986 годзе Кастусь і Ганна наведалі Буэнос Айррэс і правялі там два тыдні. У гатэлі «Панамэрыкано» 25 травеня Кастусь і Ганна наладзілі прыняцьцё, на якое прыбылі сем'і й адзіночкі: Ланкевіч, Фамін, Другавец, Паўлоўскі, Кейзік, Карповіч, Грынкевіч, Гімпель, Гейхрох і Цяўлоўскі. Палова зь іх складала малодшае пакаленьне й ужывалі гішпанскую мову.

Калі Кастусь з сваімі сябрамі прыехалі ў Аргентыну ў 1947-1948 гадох і пабачылі як іхнія папярэднікі жывуць, думалі й казалі, што яны будуць жыць шмат ляпей. Аднак, пасьля 32-х гадоў, Кастусь зьменаў не заўважыў —хаты з бляхі й саману на Вільля Жардзін як стаялі тады, так і працягвалі стаяць. Прыгадалася, як сьв. памяці інжынер Фока Фамін пісаў Кастусю ў Амэрыку:«... я ў сваім жыцьці зрабіў толькі адну памылку —выбраў неадпаведную краіну на пасяленьне».

Але й усе іншыя ня выбіралі — іх лёс туды завёў.

# Падарожжа ў Амэрыку

Параплаў «Альфэрат» належыў да лініі Голанд-Інтэрамэрыка. Ягоны маршрут быў Нью Ёрк—Буэнос Айрэс-Нью Ёрк. Падарожжа зь Нью Ёрку да Буэнос Айрэс або назад трывала адзін месяц. Па дарозе на поўдзень параплаў разладоўваў у Бразіліі, Уругваю й Аргентыне груз, а вяртаючыся назад ладаваў тавары, прызначаныя для Злучаных Штатаў Амэрыкі. «Альфэрат» быў тыпу «Лібэрты», пабудаваны ў вайну амэрыканцамі для транспарту ўсялякага грузу, з кабінамі для 22 пасажыраў. У адной з кабінаў Кастусь, Ганна й малы Юлік разьмясьціліся на доўгае падарожжа.

Капітан параплаву, ван Вівэльт Гудрыян, быў зь сям'і, якая была ўласьнікам параплаўнай кампаніі, дзе працаваў Кастусь у Буэнос Айрэс. Разам зь ім была жонка, з паходжаньня расейка, з дому Лапаціна. Першым афіцэрам быў галандэц Карс Карсэн, які застаўся прыяцелем Мерлякоў на доўгія гады.

Калі прыбылі ў Монтэвідэо, сталіцу Уругваю, Кастусь, маючы час, наведаў кампанію, зь якою меў дачыненьні па працы. Па дарозе затрымаліся ў Рыё Граднэ, а праз два дні прыбылі ў Сантос,

порт каля гораду Сао Паўлё, дзе затрымаліся на 4 дні.

У Сантос спаткалі іх Люба Басік, дачка дзядзькі Кастуся, Юрыя Мерляка, з сваім мужам Ігнатам Басікам. Дзядзька Кастуся выэміграваў у Бразылію ў 1932 годзе з усёй сям'ёю. Люба, яго дачка, выйшла замуж за Ігната Басіка, які прыбыў у Бразылію з Англіі, Басік паходзіў з Палесься, быў вывезены на Сібір у 1940 годзе, дзе папаў у польскую армію генэрала Андэрса, а па заканчэньні вайны, як усе іншыя, выехаў у Бразылію. У іх сям'я Мерлякоў гасьціла два дні, у часе якіх Кастусь даведаўся пра эпапэю сям'і Любы ад выезду яе ў 1932 году да 1954 году.

У пачатку 1954 году Кастусь навязаў лучнасьць зь Віктарам Спалічам (Аморам), які пражываў у Рыё дэ Жанэйро. Ён часта наведваў Сао Паўлё, дзе прабываў па некалькі дзён. Перад выездам Кастусь з Віктарам дамовіліся спаткацца ў Сао Паўлё. Калі параплаў прыбыў у Сантос, то Віктар ужо чакаў на Кастуся.

Кастусь з Спалічам правёў некалькі доўгіх гутарак. Спаліч расказаў сваю гісторыю жыцьця, асабліва з часоў пабыту ў Нямеччыне й Лёндане, растлумачыў, як і чаму ў 1953 годзе прыбыў ён у Бразылію.Кастусь разказаў аб дзейнасьці й жыцьці ў Аргентыне ды разам разглядзелі магчымасьці сарганізаваньня беларускае арганізацыі ў Бразыліі, з галоўнай сядзібаю ў Сао Паўлё, дзе знаходзілася значная колькасьць беларусаў.

Разьвітваючыся зь Віктарам, дамовіліся трымаць сувязь ды ўзаемна абменьвацца дазнаньнямі ў грамадзкай працы. Карэспандэнцыя з Спалічам вялася больш за год. Віктар цікавіўся пра грамадзкае жыцьцё беларусаў у Амэрыцы ды інфармаваў пра сваю актыўнасьць, асабістае жыцьцё й прыгоды, якіх было нямала .У апошнім лісьце, напісаным у Паране 4 лістапада 1955 году, паведамляў, што ў Паране затрымаўся, накіроўваючыся з Мато-Гросо, дзе ён з сваёю выправаю вымывалі зь пяску ў рэчцы золата. Вяртаючыся да дому, у джунглях на іх напалі бандыты ды ўсё, што толькі было, забралі. Далей ён пісаў, што ўладзіўся на працу ў амэрыканскай кампаніі (Эбаска), якая будуе электрастанцыю на рэчцы Арыял. Гэта быў апошні ліст Віктара Спаліча, бо на два наступныя лісты Кастусь ніколі не атрымаў адказу.

У Рыё дэ Жанэйро параплаў затрымаўся на 3 дні. У першую чаргу Кастусь наведаў Чэрч Ворльд Сэрвіс Бюро. Згодна раней

установуленай даты тамспаткаўся з Вольтэрам Душнікам, які быў кіраўніком спэцыяльных праектаў на Бразылію. Мэтай спатканьня было бліжэй пазнаёміцца зь ім ды абгаварыць справу беларускае рэпрэзэнтацыі ў Бразыліі, якой там ня было. В. Душнік, амэрыканец украінскага паходжаньня, быўшы перакладчык у штабе генэрала Мак Артура ў Японіі, моцна цікавіўся беларускімі справамі на эміграцыі, сказаў, што добра было-б, каб беларусы нараўне з другімі паняволенымі народамі былі рэпрэзэнтаваны ў Бразыліі.

Пасьля наведваньня бюра параплаўнай кампаніі, зь якою Кастусь супрацоўнічаў, Мерлякі зьведалі славутую пляжу ў Рыё дэ Жанэйро й гару, на вяршыне якое стаіць вялізарная статуя Крысто Рэдэндор.

Заехаўшы на адзін дзень у порт Вікторыя, рушылі да Нью Ёрку. Падарожжа, якое трывала больш за два тыдні бязь ніякіх перашкодаў, было спакойна й даволі нуднавата. Толькі аднойчы яно было прэрвана сьвятам шуміхі, зладжанай капітанам у часе пераплыву праз экватор.

Кастусь з Ганнай і сынам пакінулі Аргентыну зімою, а прыехалі ў Нью Ёрк летам, 29 ліпеня 1954 году, у даволі гарачую сыботу.

Параплаў «Альфэрат» прыплыў у порт Бруклін пасьля абеду, дзе на яго чакаў др. Аляксандр Орса.

Спатканьне Кастуся з др. Орсам было моцна эмацыянальнае, бо прайшло аж 10 гадоў, калі бачыліся яны апошні раз на шашы перад горадам Лідай у чэрвені 1944 году. Пасьля палагоджаньня фармальнасьцей, заладавалі багаж на самаход ды паехалі з Брукліну ў Мангэтан на 33 Норфольк стрыт. Др. Орса сказаў: «Тут Вы затрымаецеся, пакуль ня знойдзеце сабе кватэру. А гэтая належыць да сп-ні Вержбаловіч і яе пляменьніцы Галіны Ганчарэнка. Яны выехалі ў Мюнхэн, бо Галіна атрымала працу на радыё «Вызваленьне» Заўтра я прыеду й разам паедзем да нас на абед, на які я зь сям'ёю вас ветліва запрашаем».

Пад вечар наведалі Мерлякоў сп-ва Паляневічы, якія жылі па суседству. Яны дапамаглі зрабіць першыя закупы ў Амэрыцы. Ганна Мерляк, распакоўваючы прадукты ды падрыхтоўваючы вячэру, адзначыла: «Тутака можна будзе жыць».



*Прэзыдыюм Рады й сакратарыят БНР, устаноўлены ў лістападзе 1956 г. на 8 сэсіі Рады БНР у Нью Ёрку.*
*Сядзяць зьл. напр.: М.Кунцэвіч—старшыня Гал. Управы БАЗА, А. Стагановіч—І заступнік старшыні, М. Абрамчык — старшыня, А.Адамовіч—ІІ заступнік старшыні, Н.Арсеньнева—сакратар, В. Тумаш—рэф-т беларуска-балцкіх дачыненьняў. Стаяць зьл. напр.: В. Кажан—сакратар скарбу, К. Мерляк-сакратар нутраных справаў, др. Янка Запруднік—рэф-т адміністрацыі БССР, ген.Ф. Кушаль—рэф-т вайсковых справаў, А. Шукелайц—сакратар інфармацыі, Б. Данілюк — рэф-т рэлігійных справаў, М. Тулейка—сакратар вонкавых дачыненьняў.*

# Частка другая

# Падзеі пасьля заканчэньня вайны

Падзеі вайны 1939-1945 гадоў моцна адбіліся на жыцьці беларусаў, якія апынуліся вонках Бацькаўшчыны. Залежна ад існуючых абставінаў на месцы іх пражываньня й у адпаведным часе, людзі змушаныя былі пакінуць свой родны кут, ехаць туды, куды іх вязьлі або самі ехалі, ня ведаючы, дзе спыніцца.

З днём заканчэньня другой сусьветнай вайны ў Эўропе 9 травеня 1945 году, мы знаходзім беларусаў апрача Сібіры й Далёкага Ўсходу ў Нямеччыне, Даніі, Бельгіі, Францыі, Італіі ды іншых краінах. Перамешчаных асобаў або ўцекачоў ад наступаючага расейскага камунізму называлі па-ангельску «Displaced persons» ці Д.П.

Беларусы Д.П. ў Нямеччыне, дзе іх было найбольш, па сацыяльнаму складу былі: ваеннапалонныя зь нямецка-польскай вайны 1939 году, ваеннапалонныя зь нямецка-савецкай вайны 1941-1945 гадоў, людзі, вывезеныя прымусова або добраахвотна на працу ў Нямеччыну, жаўнеры вайсковых адзінак БКА, розных вайсковых батальёнаеў, парадкавая паліцыя, мясцовая беларуская адміністрацыя на чале з апаратам Беларускае Народнае Самапомачы й Беларускай Цэнтральнай Рады. Лёс кожнага зь іх, асабіста або групова, вызначаўся ў залежнасьці ад агульных падзеяў у даным часе.

Нямеччына была падзеленая на 4 акупацыйныя зоны: амэрыканскую, ангельскую, французкую й савецкую, якую называлі «Ўсходняй Нямеччынай».

У трох зонах Заходняе Нямеччыны дзейнічала УНРРА, арганізацыя пры Аб'еднаных Нацыях, якая займалася справамі Д.П. У 1948 годзе УНРРА была пераіменавая на ІРО (Інтэрнацыянальная арганізацыя па справах уцекачоў), таксама падпарадкаваная арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў. У гэтых дзьвюх арганізацыях працаваў пэрсанал расейскага або польскага паходжаньня, які ставіўся ня надта прыхільна або нават варожа да Д.П. беларусаў.

Па загаду акупацыйных уладаў Д.П. павінны былі зарэгістравацца ў сваім аддзеле УНРРА. Іншыя нацыянальнасьці Д.П, за выняткам беларусаў, цяжкасьцей ня мелі. Амэрыканцы беларускага грамадзянства (дзяржаўнай беларускай прыналежнасьці) не прызнавалі. Беларусаў Заходняе Беларусі лічылі польскімі грамадзянамі, а

беларусаў БССР—савецкімі грамадзянамі, не бяручы пад увагу нацыянальнае прыналежнасьці.

Згодна дагавору трох вялікіх (ЗША, Англіі і СССР) на канфэрэнцыі ў Ялце 7-12 лютага 1945 году, людзі, якія ў выніку ваенных дзеяньняў апынуліся ў Нямеччыне або ў суседніх краінах, павінны былі вярнуцца на сваё месцы пражываньня пасьля заканчэньня вайны. У дагаворы было сказана добраахвотнае вяртаньне. Але каб дагадзіць Сталіну, сэр В. Чэрчыль паціху перканаў прэзыдэнта ЗША Ф.Рузвэльта, што пры помачы фізычнай сілы будзе шмат лягчэй «пераканаць» людзей вяртацца на радзіму. Гэтай устаноўкі ніхто адкрыта не апратэставаў за выняткам амэрыканскага генэрала Джорджа Паттона.

У выніку такой устаноўкі Савецкая рэпатрыяцыйная місыя й агенты КДБ зьявіліся ўва ўсіх лягерох, адкуль бязь ніякаіх перашкодаў з боку амэрыканскіх уладаў забіралі савецкіх грамадзянаў ды садзілі ў свае лягеры ва Ўсходняй Нямеччыне. Па сьледстве вывозілі ў Сібір або расстрэльвалі.

Факт прымусовай выдачы ангельцамі 12 000 казакаў, у тым ліку 2749 афіцэраў, 1 чэрвеня 1945 году ў Ліенцы, Аўстрыя, Савецкаму Саюзу пры помачы двух танкавых батальёнаў, 36-е брыгады, 11-ае ангельскай танкавай дывізіі, утрывожыў усіх савецкіх грамадзянаў, якія не жадалі вяртацца дадому. Каб пазьбегчы прымусовага павароту ў Савецкі Саюз, дзе чакала немінучая сьмерць або доўгае зьняволеньне, беларусы з БССР мусілі шукаць нейкага выхаду —запісваліся палякамі. Дзякуючы крывадушнай палітыцы Альянтаў,а ў асаблівасьці Англіі, шмат ваенапалонных прымусова выдавалі Савецкаму Саюзу, у тым ліку й беларусаў.

Толькі ў 1949 годзе ўсякага роду акцыя павароту людзей да СССР была спыненая. Амэрыканскае камандаваньне заявіла савецкай рэпатрыяцыйнай місыі пакінуць іхнюю зону разам з усімі агнетамі СМЭРШ і КДБ ды спыніць лоўлю тых, хто не жадае вяртацца.

У 1945 годзе Нюрынбэргскі трыбунал, створаны Альянтамі, уключаючы й Савецкі Саюз, распачаў судовы працэс, абвінавачаных у крымінальных злачынствах ваеннакамандуючых і міністраў Гітлераўскага ураду, які закончыўся ў 1946 годзе. Сэр Вінстон Чэрыль, ужо ня будудчы прэм'ер-міністрам, выступіў у горадзе Фультон, ЗША, з прамовай, у якой абвінавачваў Савецкі Саюз у стварэньні «жа-

лезнай занавесы», падзяляючы Эўропу на дзьве часьці: камуністычную й дэмакратычную.

Разыходжаньні пасьля вайны ў палітыцы ўладжаньня Ўсходняе Эўропы між Савецкім Саюзам і Альянтамі й прамовы Чэрчыля запачаткавалі «халодную вайну» між Усходам і Захадам, якая пратрывала больш за 50 гадоў.

Неспадзявана Савецкі Саюз у восень 1948 года зрабіў блякаду Заходняга Бэрліну, частка якога належала да Альянтаў, не прапускаючы наземнага транспарту, гэтым творачы праблему дастаўкі прадуктаў і гаручага. Гэтым разам Амэрыка й Англія ня струсілі, карыстаючыся правам на паветраны калідор, самалётамі дастаўлялі прадукты і ўсе патрэбнае да жыцьця на працягу 11 месяцаў, аж калі Саветы зьнялі блякаду.

Халодная вайна прадаўжалася. Камуністычная Паўночная Карэя, 25 чэрвеня 1950 году напала на Паўдзённую Карэю, якую хацела вызваліць з-пад капіталістычнага ярма, Аб'еднаныя Нацыі, а ў асноўным Амэрыка, гэтаму супрацівіліся й далі дапамогу Паўдзённай Карэі бараніцца ад напрасьнікаў. Зараз-жа Кітай пачаў памагаць Паўночнай Карэі й вайна разгарэлася не на жарты. У студзені 1953 году ад Прэзыдэнта Гары Трумана абняў абавязкі Прэзыдэнта ЗША генэрал Двайт Д. Айзэнгаўэр, які спыніў вайну ў чэрвені, творачы дэмакрацыйную лінію ўздоўж 38-е паралелі паміж Паўночнай і Падзённай Карэяй

## Беларусы выяўляюцца

Беларусы , дзе жылі, пачалі зарэгістроўвацца па ўсёй Нямеччыне, а ўрадаўцы УНРРА прыдзялялі іх у найбліжэйшыя лягеры, якія ў самым пачатку былі па свайму характару міжнацыянальныя.

Зь бегам часу УНРРА пераняла ўсе нямецкія лягеры ваеннапалонных, рабочых на прымусовых працах, нямецкія вайсковыя казармы й баракі, і пачала ладзіць лягеры паводля нацыянальнага прынцыпу. Так як беларусаў як нацыю не прызнавалі, іх пасялілі па дзяржаўнай прыналежнасьці з палякамі або з украінцамі ды іншымі народамі. Беларусы, апынуўшыся ў чужым асяродзьдзі, пачалі гуртавацца й

тварыць беларускія дапамогавыя камітэты або нават камітэты польскіх грамадзян.

Камітэты, скамунікаваўшыся між собку, зарганізавалі пад канец 1945 году Беларускі нацыянальны камітэт з падзагалоўкам: «Цэнтральнае прадстаўніцтва беларускае эміграцыі на Нямеччыну», з сядзібай у Рэгэнсбургу. Прадстаўнікі беларускага нацыянальнага Камітэту, рабілі захады перад акупацыйнымі ўладамі амэрыканскае зоны, каб тыя прызналі беларусаў за народ бяз дзяржаўнай прыналежнасьці, незалежна пад якой дзяржаўнай адміністрацыяй ён жыў: польскай, савецкай летувіскай, латвійскай або іншай. Зь вялікімі клопатамі, шматлікімі дамаршамі захады закончыліся посьпехам і беларусаў прызналі за нацыю. Пасьля гэтага пайшлі пэтыцыі-просьбы да УНРРА, а пазьней да ІРО, каб беларусаў выдзялілі зь іншанацыянальных лягероў, ды каб прызналі ім асобныя лягеры.

Такім чынам, там, дзе была большая колькасьць беларусаў, былі створаныя беларускія лягеры , а дзе была меншая колькасьць былі створаныя беларускія групы ў лягерох другой нацыянальнасьці. Беларускія лягеры й групы знаходзіліся ў наступных мясцовасьцях: Рэгэнсбург, Міхэльсдорф, Розэнгайм, Остэргофэн ,Ватэнштэт, Шляйзгайм, Міттэвальд, Віндзішбэргэрдорф, Эрэнбург, Ольдэнбург, Госьцяр, Кіцінгэн ды ў іншых мясцовасьцях. Таксама нямала беларусаў пражывалі паза лягерамі на індывідуальных кватэрах.

Беларусы яшчэ ня пасьпелі разам сабрацца, як зьявіліся рознага характару разыходжаньні, а яшчэ горш, ня пасьпелі сысьціся, як пачалі разьдзяляцца.

Нямала клопатаў і цяжкасьцей зрабіў назоў Беларусь з прычыны канцоўкі «Русь», якую пачуўшы, асабліва амэрыканцы, ўяўлялі сабе беларусаў за расейцаў. Дык вось прыйшло ў галаву такім вучоным, як др. Янка Станкевіч і Антон Адамовіч зьмяніць назоў Беларусь на Крывію. Яны даказвалі, што назоў Крывія найлепш адпавядае, бо назоў Беларусь быў накінуты нам Масквою. Прапанова аб зьмене нацыянальнага назову была шырока распаўсюджана сярод беларусаў у Нямеччыне. Праводзіліся лекцыі й даклады пра гістарычнае паходжаньне народу, які пражываў на сёньняшняй тэроторыі Беларусі, якая называлася й павінна называцца Крывія. Дыскусыйная валынка прадаўжалася больш за два гады й вынікам было тое, што вытварыліся два лягеры: прыхільнікаў Крывіі й прыхільнікаў Беларусі. Падчас

дыскусыі выявілася, што да прыхільнікаў Крывіі належалі пераважна каталікі, жыхары Заходняе Беларусі, а да прыхільнікаў Беларусі пераважна жыхары праваслаўнае Ўсходняе Беларусі. Аднак гэта ня быў стойкі падзел усюды былі адныя й другія, некаторыя мянялі савю прыхільнасьць у залежнасьці ад абставінаў й грамадзка-палітычнага жыцьця. Ад гэтага часу прыхільнікі назову «Беларусь» пачалі называць сваіх праціўнікаў, крывічамі, мянушка якая пазьней увайшла ў жыцьцё, а гэтым самым і ў гісторыю. Гэта была адна з першых прычынаў прышлага падзелу беларусаў на эміграцыі.

# Фарміраваньне палітычнае думкі

Беларуская Цэнтральная Рада, мясцовая адміністрацыя, палітычна, грамадзкія й культурныя працаўнікі пакінулі сваю Бацькаўшчыну перад паўторным наступам бальшавікоў, апынуліся ў Нямеччыне ў цяжкіх і складаных абставінах, якія ставарыліся ў Нямеччыне пасьля заканчэньня вайны.

СССР, пад кіраўніцтвам Камуністычнае партыі на чале з Сталіным, сыстэматычна вынішчаў пад лозунгам «клясавага змаганьня з ворагамі рэвалюцыі» ды русыфікаваў увесь беларускі народ на працягу 20-ці гадоў ва Ўсходняй і 18 месяцаў у Заходняй Беларусі. Савецкі Саюз, нягледзячы на тое, што памагаў эканамічна Нямеччыне ў вайне з Францыяй і Англіяй, раптам стаў змагацца супраць Нямеччыны, якая была пад кіраўніцтвам Нацыянал-сацыялістычнай партыі на чале з Адольфам Гітлерам, якую папулярна называлі нацы.

Палітычная атмасфэра была вельмі нездаровая для беларусаў ,каб прадаўжаць нацыянальнае змаганьне за вызваленьне Бацькаўшчыны пад сьцягам II Беларускага Кангрэсу й пад кіраўніцтвам Беларускае Цэнтральнае Рады, будучы, хоць-бы намінальна «саюзьнікам», а што далей ператварылі ў «калябарацыю» з нацыстаўскай Нямеччынай,

Гэта было галоўнай прычынай, што Прэзыдэнт Беларускае Цэнтральнае Рады прафэсар Р.Астроўскі распусьціў Раду ды частку дзяржаўнага скарбу перадаў Беларускаму нацыянальнаму камітэту ў Рэгэнсбургу, а рэшту падзяліў між сябрамі Рады.

У гэты, здавалася-б безнадзейны й бязвыхадны мамэнт, паяўляецца ў беларускім друку «Маніфэст Рады Беларускае Народнае Рэспублікі

(БНР) 25 сакавіка 1948 году, з нагоды 30-х угодкаў абвяшчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі. У Маніфэсьце гаворыцца, што сьцяг БНР і ідэя 25 Сакавіка верна былі несеныя Прэзыдэнтам П.Крэчэўскім, Прэзыдэнтам В.Захаркам, а цяпер іх нясе далей інжынер Мікола Абрамчык.

Выхад зь некарыснага палітычнага становішча быў надзвычайны. Дзяржаўна думаючыя беларускія патрыёты моцна папрацавалі, каб у лягерных абставінах зарганізаваць Раду й Урад БНР.

На працу Беларускага нацыянальнага камітэту й Рады БНР зьвярнулі ўвагу прыяцелі й няпрыяцелі Беларусі, а таксама канкурэнты й прэтэндэнты на кіраўніцтва палітычнай дзейнасьці беларускае эміграцыі.

Неабходна адзначыць два мамэнты зь дзейнасьці рады БНР. Яна моцна крытыкавалася й была пад атакай з боку антывуніяцкіх праціўнікаў і прыхільнікаў Беларускага япіскапату, які ўвайшоў у склад Расейскае Зарубежнае Праваслаўнае Царквы, за навязаньне кантактаў з Ватыканам ды здабыцьцё больш 40 стыпэндыяў для беларускіх студэнтаў у каталіцкім унівэрсытэце ў Лювэне, Бельгія. А таксама за тое, што бээнэраўскія кіраўнічыя дзейнікі ўважалі вунію 1569 году як беларускую нацыянальную рэлігію. Далей іх моцна трывожыла падрыхтоўка да аднаўленьня япіскапату Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на месьца адыйшоўшага да расейцаў.

Праціўнікі БНР, каб супрацьставіцца крывіцкай дзейнасьці, не адважваючыся яшчэ выцягваць БЦР, пачалі арганізоўваць свае арганізацыі. Міжлягерную раду пераіменавалі на Беларускае цэнтральнае прадстаўніцтва ў Нямеччыне, ад імя якога пісаліся асьветчаньні й лісты, у якіх высьвятлялі й пратэставалі супраць усякае дзейнасьці крывічоў або Рады БНР у залежнасьці ад абставінаў з подпісамі: інжынер А.Русак, др. М. Шчорс і П .Сабалеўскі.

Заклік бээнэраўцаў (крывічоў) «да кансалідацыі», апублікаваны ў прэсе, і першае пасьля вайны публічнае высупленьне прафэсара Р.Астроўскага як Прэзыдэнта БЦР, 24 сакавіка 1948 году ў Ватэнштэце, запачаткавалі палітычны падзел беларускае эміграцыі.

# Рэлігійныя падзеі

## 1945-1950 гг.

5 чэрвеня 1946 году ў Рэгэнсбургу было падана да ведама беларускага праваслаўнага грамадзтва, што Сынод Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (адноўлены саборам ў Менску 30 жніўня - 2 верасьня 1942 году) увайшоў у склад Сыноду Расейскай Праваслаўнай Царквы за Рубяжом.

Перад гэтым ужо праз нейкі час хадзілі весткі ў беларускіх асяродках-лягерох, што беларускі япіскапат пачынае вясьці перамову з Сынодам Расейскае Зарубежнае Царквы аб злучэньні дзьвюх цэркваў.

Беларускае Праваслаўнае Аб'еднаньне, якое было арганізаванае раней, даведаўшыся аб сакрэтных перагаворах япіскапату зь япіскапатам расейскай царквы, на агульным зьездзе 5 травеня 1946 году прынялі пастанову, каб беларускі япіскапат, які знаходзіўся ў Тысгайме (Баварыя), захаваў чыстым дагматычна-кананічны бок Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, уваходзячы ў малітоўныя суадносіны зь іншымі царквамі як незалежная Беларуская царква.

Вестка аб уваходзе беларускіх япіскапаў у расейскую царкву абурыла беларускае грамадзтва й кіраўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацыяў у трох акупацыяйных зонах Нямеччыны.

Беларускі нацыянальны камітэт у Рэгэнсбургу выслаў дэлегацыю з трох асобаў: др. А.Орсу, Ю.Стукаліча й Т.Шыбута да япіскапату з просьбай не ліквідаваць Сыноду Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Мітр.Панцелейман ня прыняў дэлегацыі. Дэлегацыя ўручыла пратэст-мэмарандум арх. Бэнэдыкту.

Беларускае Праваслаўнае Аб'еднаньне ў Рэгенсбургу 5 чэрвеня 1947 году падала да ведама беларускага грамадзтва пратэст супраць самавольнага далучэньня Беларускай ерархіі да Расейскай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы, адначасна асуджаючы іхні паступак «здрадай беларускаму народу».

На працягу двух наступных гадоў адбывалася ажыўленая, хвалюючая, а часамі гвалтоўная дыскусыя за й супраць самога паступку беларускіх япіскапаў, а самое галоўнае, як на прышласьць афармляць рэлігійнае жыцьцё праваслаўных беларусаў на эміграцыі. У выніку

дзейнасьці грамадзкіх і палітычных дзейнікаў бээнэрэўскага напрамку, быў скліканы сабор 5 чэрвеня 1948 году ў Кастанцы, на якім была прынята пастанова з 5-ці пунктаў, у асноўным пастаноўлена прадоўжываць дзейнасьць БАПЦ на чужыне ды аднавіць беларускі япіскапат.

Прыхільнікі мітр. Панцелеймона арганізуюць Беларускі праваслаўны камітэт (ягоны пэрсанальны склад дакладна няведамы) ды ад 15 ліпеня 1948 году выдаюць зварот да ўсіх беларускіх вернікаў у якім апраўдваецца дзейнасьць беларускага япіскапата тым, што гэтага вымагае сучасны паваенны стан і патрэба лучнасьці з праваслаўнай царквою на тэрыторыі пражываньня, Таксама ўказваецца, што БАПЦ, адноўленая ў 1942 годзе ў Менску, ня была фармальна аформлена. Аргумэнтацыя выглядала даволі дзіўна, асабліва, што БАПЦ ня была фармальна аформлена, бо мітрапаліту Панцелеймону, было ў свой час даручана пераслаць пратаколы Сабору й ліст да Канстантынопальскага патрыярха на апрабату й благаславеньне, але гэтага мітрапаліт Панцелейман не зрабіў.

На просьбу беларусаў япіскап Сергій (Охотенко) Украінскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ўзначаліў новы беларускі япіскапат. 18 сьнежня 1949 году ў Розэнгайме ў сан япіскапа быў хіратанізаваны Уладзімір Тамашчык зь імем Васіль. Хіратонію выканалі япіскапы УАПЦ Платон і Вячаслаў, з удзелам япіскапа Сергія БАПЦ' Такім чынам, ўтварыўся сабор япіскапаў БАПЦ. Архіярэй Сергій—галава Сабору япіскапаў БАПЦ і япіскап Васіль—сакратар Сабору япіскапаў БАПЦ на чужыне.

Беларускія арганізацыі, стоячы на плятформе Беларускай Цэнтральнай Рады, выслалі ліст мітрапаліту Палікарпу УАПЦ, пратэстуючы ўмешваньне архіяпіскапа Сергія ў царкоўнае праваслаўнае жыцьцё беларускага народу. Пазьней быў высланы яшчэ адзін пратэст да Сыноду УАПЦ за ўмешваньне ў нутраныя справы Беларускае Царквы. Пратэст падпісалі: архіяпіскап Бэнэдыкт, архіяпіскап Філафей, япіскап Апанас і пратаярэй М.Лапіцкі.

У гэтым пратэсьце яны казалі: «Праз часовае далучэньне да іэрархаў Расейскае Зарубежнае Царквы за граніцаю, Беларуская іэрархія не страціла тых правоў, якія яна мела на Беларусі». Далей япіскапы й пратаярэй Лапіцкі прадаўжалі, што : «беларуская іэрархія й духавества ў сваёй дзейнасьці праводзяць нацыянальныя беларускія ідэі, маючы на мэце адраджэньне нашай Бацькаўшчыны Беларусі».

Цікава хто іх заставіў, бо яны самі не адважыліся-б так маніць!

Два гады пазьней прэзыдыюм пленуму БЦР у сваім асьветчаньні ў верасьні 1950 году сьцьвяржаў, што іэрархія БАПЦ самачынна зьліквідавалася, ўваходзячы ў склад Сыноду Расейскай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы, каторая служыць расейскім імпэрыялістычным інтарэсам і варожа ставіцца да пытаньня беларускай дзяржаўнасьці. Мала гэтага, яны перайшлі да актыўнага наступу на беларускі рух, у прэсе, у якой у недапушчальны ў культурным сьвеце спосаб абражалі пачуцьці нашага народу.

З гэтага выглядае, што Прэзыдэнт БЦР з сваімі супрацоўнікамі зразумелі, куды яны заехалі сваёй дзейнасьцю. Яны пастанавілі ратаваць сваю скампратаваную палітыку, высылаючы просьбу да Экзарха Канстантынопальскага патрыярха, каб узяў беларусаў пад сваю апеку. Архіяпіскап Міхаіл, Экзарх Канстантынопальскай Патрыярхіі на Паўночную й Паўдзённую Амэрыку, прыхільна аднёсься да просьбы, бяручы пад сваю духовую апеку беларускія праваслаўныя прыходы ў Амэрыцы.

Вынікам гэтых падзеяў, паўстаў падзел праваслаўных беларусаў у Нямеччыне, які быў перанесены ўва ўсе краіны пасяленьня выэміграваных вернікаў.

Тых беларусаў, якія пайшлі разам зь беларускімі япіскапамі ў расейскую царкву, уключаючы аднавіцеляў Беларускае Цэнтральнае Рады й яе прыхільнікаў, празвалі «зарубежнікамі», а тых хто асталіся пры БАПЦ разам з бээнэраўцамі прадаўжалі называць «крывічамі»

Ніводзін гісторык ня зможа абмінуць гэтых дзьвюх мянушкаў, пішучы гісторыю беларускае эміграцыі.

# Сапраўдная сутнасьць падзелу

Беларуская эміграцыя ў Нямеччыне, якая апынулася ў цэнтры «халоднае вайны» сталася інструмэнтам, які быў неабходны контранэнтам для пасьпяховага змаганьня.

У першай палове пяцьдзесятых гадоў праяўлялася вялікая антыкамуністычная актыўнасьць, у якую былі ўцягнутыя або добраахвотна нацыянальна сьведамыя людзі Савецкага Саюзу, якія бралі ўдзел у змаганьні супраць расейскага камунізму за вызваленьне сваіх краінаў.

Пачынаючы з 1949 году, беларускія Д.П пачалі масава эміграваць за акіян: у Аўсталію, ЗША, Канаду й краіны Паўдзённае Амэрыкі.

Нямала пасяліліся іх ў краінах Эўропы. Але галоўныя дзейнікі Рады БНР і БЦР заставаліся надалей у Нямеччыне, каб быць бліжэй да «фронту» халоднай вайны й цэнтру кіраўніцтва гэтым змаганьнем, адачасна прадаўжаючы сваё кіраўніцтва й палітычны ўплыў на выэміграваных беларусаў. У кожнай краіне, дзе пасяляліся беларусы, пачало арганізоўвацца грамадзка-палітычнае жыцьцё: паўставалі арганізацыі, інстытуцыі й прыходы, паводля свае прыналежнасьці да Рады БНР (крывічоў) або да БЦР (зарубежнікаў).

Ад заканчэньня вайны беларусы ў Нямеччыне, а пазьней у краінах іхняга пасяленьня, на працягу двух дзесяткаў гадоў былі аб'ектам зацікаўленьня, з аднаго боку ўрадавых чыньнікаў ( ўрадавых установаў адкрытага й закрытага дзеяньня Амэрыкі й Англіі), а таксама Расейскае Зарубежнае Праваслаўнае Царквы), а з другога боку СССР.

М.Абрамчык, жывучы каля Парыжа, навязаў лучнасьць з францускімі ўрадавымі дзейнікамі, а праз іх з амэрыканскімі.

Прэзыдэнт Абрамчык, як і рада БНР, ня меў нічога супольнага зь нямецкай акупацыйнай адміністрацыяй, дзеля гэтага было лягічным выкарыстаньне гэтага фактару прэзыдэнтам Абрамчыкам для беларускае нацыянальнае справы, зараз-жа па заканчэньні вайны.

Таксама было зразумелым, што амэрыканскія дзейнікі, у данным выпадку Бюро палітычнай каардынацыі[ (Office of Policy Coordination OPC) пад кіраўніцтвам Фрэнка Візнэра, палічылі патрэбным супрацоўнічаць з М.Абрамчыкам у арганізаваньні антыбальшавіцкага змаганьня й стварэньня «арміі Вызваленьня» з-пад савецкіх уцекачоў на выпадак, калі-б «халодная» вайна перайшла ў «гарачую».

Ангельскія чыньнікі праз сваю сакрэтную службу (аддзел (Secret Intelligence Service -Sectioin 9, SIS), шэфам якое быў Гарольд (Кім) А.П.Фільбі , рэалізуючы з Амэрыканскім бюро палітычнай каардынацыі ў арганізаваньні антыбальшавіцкай акцыі, маючы пад рукою прафэсара Р.Астроўскага ў сваёй акупацыйнай зоне, пераканалі яго зь імі супрацоўнічаць.

Галоўным аргумэнтам Р.Астроўскага было тое, што халодная вайна пяройдзе хутка ў гарачую, і армія Альянтаў з арміяй ангельскай, будуць вызваляць паняволеныя краіны. А калі Беларусь будзе ачышаная ад бальшавікоў, то Р.Астроўскі будзе больш афэктыўным у арганізаваньні часовага ўраду, а перадусім у арганізаваньні Беларускае арміі, бо яго й БЦР помняць з часоў нямецкае акупацыі й яго лепш ведае беларускае насельніцтва, чымся М. Абрамчыка з ягонаю Радаю БНР. А.Фільбі і Р.Астроўскі пачалі супрацоўнічаць і прэзыдэнт БНР распачаў сваю палітычную акцыю адкрыта.

Да ўтварэньня такой суполкі, моцна спрычыніўся шэф 9-га аддзелу Ангельскага СІС Кім Фільбі, бо ён адначасна быў савецкім агентам ад 1933 году разам з Дональд Маклін і Гай Бурджэс, функцыянэрамі Міністэрства замежных справаў Англіі. Гэтым адкрывалася яму першародная нагода ўсё ведаць, што і як робіцца,каб перадаваць інфармацыі савецкаму ГРУ ды перашкаджаць сваім супернікам амэрыканцам. Р.Астроўскаму прадстаўлялася магчымасьць рабіць тое самае свайму праціўніку М.Абрамчыку.

Расейскія імпэрыялістычныя дзейнікі ня спалі й праз беларускіх іэрархаў БАПЦ пачалі разьежджаць па лягерох ды даказваць беларусам, што іхні пераход да Расейскай Зарубежаній Праваслаўнай Царквы быў зроблены вымогаю часу гісторыі й нацыянальных інтарэсаў беларускага народу. Яны пераканалі пратаярэя М.Лапіцкага, што дзякуючы яго памылковаму становішчу адносна «зьяднаньня цэркваў» ён апынуўся ў лягеры крывічоў. Пратаярэй М.Лапіцкі не прызнаў адноўленае іэрархіі БАПЦ, бо іэрархі былі некананічныя, ды закідалі,што аднаўленьне было зробленае правуніяцкімі крывічамі. Ва ўзнагароду зьнялі зь яго раней наложаную эпітэмію ды дазволілі яму служыць у царкве й выконваць сьвятарскія абавязкі. Гэтым закончыўся працэс падзелу беларускае эміграцыі на дзьве варожыя групы, якія па сутнасьці мелі аднолькавую нацыянальную мэту—вольную й незалежную Беларусь.

Вызваленьне й аднаўленьне беларускае дзяржаўнасьці можа быць асягнута толькі моцна стоячы на прынцыпах I Усебеларускага Кангрэсу 1917 году, цьвердзілі бээнэраўцы. Бэцээраўцы сцьвярджалі, што толькі стоячы на прынцыпах I і II Ўсебеларускага Кангрэсу пад кіраўніцтвам БЦР. Калі-б толькі гэта было прычынай падзелу, то ён не існаваў бы ў эміграцыйных масах нават і аднаго месяца. Аднак факты паказваюць, што прычыны былі зусім іншыя, аб чым у той час напэўна абодвы Прэзыдэнты ня ведалі, што за гэтым усім стаіць Савецкі Саюз, менавіта Фільбі, які разумеў, што падзеленыя беларусы не дасягнуць свае мэты. Але калі злачынная дзейнасьць шэфа ангельскай сакрэтнай службы Кіма Фільбі была раскрытая ў 1955 годзе, абодвы прэзыдэнты Астроўскі й Абрамчык не стараліся для дабра беларускага народу ліквідаваць падзел беларусаў, а наадварот падзел пашыралі й распальвалі варожасьць між людзьмі, абвінавачваючы адзін аднаго ў недарэчных справах. Варожасьць, выкліканая падзелам, працягвалася ў дзеяньні й контрадзеяньні ўва ўсіх галінах грамадзкага жыцьця на працягу 3-х дзесяткаў гадоў і нанесла грамадную шкоду беларускай нацыянальнай справе, і ў асаблівасьці беларускаму грамадзству на чужыне, спрычыняючы асабістыя шкоды некаторым беларускім патрыётамі.

## Амэрыканскі камітэт вызваленьня

Расея, пад кіраўніцтвам КПСС, ажыцьцяўлючы расейскую імпэрыялістычную палітыку, паступова замацоўвала сваё панаваньне ў краінах Цэнтральнае Эўропы, нахальна ламаючы ўсе дагаворы, зробленыя падчас вайны ды пашырала свае ўплывы дывэрсыйнай дзейнасьці ў краінах Азіі й Афрыкі.

Заходні сьвет на чале з Амэрыкай, бачучы загрозу камуністычнай Расеі, пачаў супрацьставіцца й контрадзеіць наступу Масквы, паціху актывізаваць халодную вайну. На існуючую палітычную канцэпцыю «вызваленьня з-пад камунізму» была высунутая амэрыканскім палітыкам Джэймс Бэрнгам канцэпцыя стрыманьня»камунізму там, дзе ён знаходзіцца. Палітыку «вызваленьня» падтрымоўвала эміграцыя паняволеных народаў савецкай Расеяй, а палітыку «устрыманьня» падтрымоўвала расейская эміграцыя й правага напрамку амэрыканцы.

Але дасёляшняе ўсякае дзеяньне не давала пазэтыўных вынікаў, асабліва падрыхтоўка ў арганізацыі «Арміі вызваленьня», якая складалася-б з ахвотнікаў на эміграцыі. Першая фаза падрыхтыўкі пачалася шкаленьнем адпаведных кадраў для зьбіраньня вестак унутры Савецкага Саюзу. Пачынаючы з 1949 году, былі засыланыя людзі на тэрыторыю БССР й УССР для разьведкі й дывэрсыі, якіх кожны раз КГБ хутка арыштоўвала й ліквідавала. Амэрыканцы, ня ведаючы чаму церпяць такую няўдачу, спынілі засылку людзей у Савецкі Саюз у 1952 г. і ўстрымаліся з арганізацыяй «Арміі вызваленьня».

Такія абставіны патрабавалі каардынацыйнага палітычнага й практычнага кіраўніцтва для змаганьня за вызваленьне паняволеных народаў. Стэйт Дэпартмэнт ЗША ў 1951 годзе стварыў Камітэт вызваленьня народаў Расеі, як прыватную каарпарацыю зарэгістраваную ў штаце Длявер, каб аддзяліць ад афіцыяльнае палітыкі ўраду ЗША.

Першым прэзыдэнтам Камітэту быў Юджэн Ляёнс—русафіл паводля свайго пераканьня. Заданьнем гэтага камітэту, у першую чаргу было стварыць адзіны каардыацыйны цэнтр змаганьня з расейцаў і народаў Савецкага Саюзу.

Прадстаўнікі Амэрыканскага камітэту пачалі кансультацыі з прадстаўнікамі эміграцыі, прапануючы плятформу, загадзя выпрацаваную пры помачы расейскіх дарадцаў, якая ў аснаўным была такога зьместу:

а.Інтэрнацыянальны камунізм панявольвае народы, у тым ліку й расейскі народ,

б.Расейскі народ ад 1917 г. не прызнае й не нясе адказнасьці за ўсе бальшавіцкія акты.

в.Пасьля вызваленьня, усерасейскім плебісцытам будзе вырашаная дзяржаўная форма кожнага народу Савецкага Саюзу.

Гэтую плятформу народы Савецкага Саюзу адразу адкінулі й назвалі яе «непрадрашэнскай», таму што, расейцы не прызнавалі здабытых правоў на самастойнасьць нерасейскімі народамі пасьля 1917 году.

Згодна статуту Рады БНР, прэзыдэнт М.Абрамчык склікаў на 28 кастрычніка 1951 году сэсію Рады Беларускай Народнай Рэспублікі для разгляду й апрабаты палітычнай плятформы, апрацаванай Камітэтам з 5-цю расейскімі партыямі ў справе стварэрньня Каардынацыйнага цэнтру антыбальшавіцкага фронту. УІ сэсыя Рады БНР

зрабіла пастанову й у другім яе пункце сказана, што ўсімі народамі, уваходзячымі ў гэты блёк, прызнаецца права беларускага народу на дзяржаўную незалежнасьць ў сувэрэнітэце ў этнаграфічных граніцах Беларусі, адноўленую абвешчаньнем Акта 25 Сакавіка 1918 г.

Каб не траціць лучнасьці з Амэрыканскім камітатам, прэзыдэнт М.Абрамчык са сваімі бліжэйшымі супрацоўнікамі ў Нямеччыне стварылі асобную арганізацыю Беларускі антыбальшавіцкі фронт на чале з сп. Янкам Жыткам для праводжаньня перагавораў. Першым актам дзейнасьці прэзыдэнта БЦР Р.Астроўскага ў канцы 1950 году быў заклік да беларускіх вайскоўцаў, каб дабраахвотна запісваліся на вайну ў Карэю. Наступным актам Прэзыдэнта БЦР было стварэньне Беларускага вызволенчага руху з шэфам галоўнага штабу падпалкоўнікам Л.А.Зарэчным. Вызвольным рухам быў апрацаваны мэмарыял да Амэрыканскага камітэту й стэйтаваму дэпартмэнту ў Вашынгтоне, які быў апрабаваны 13 пленумам БЦР і падпісаны прэзыдэнтам Р.Астроўскім і Л.А. Зарэчным.

У мэмарыяле было сказана, што не Рада БНР зь яе прэзыдэнтам М.Абрамчыкам, а толькі БЦР з прэзыдэнтам Р.Астроўскім зьяўляецца прававым прадстаўніком, беларускага народу, і што БЦР гатова супрацоўнічаць з Амэрыканскім камітэтам згодна прапанавай плятформы.

Амэрыканскі камітэт апынуўся ў аналягічнай сытуацыі з расейцамі, украінцамі й каўказкімі групамі, ад якіх паявіліся па некалькі заяваў ад арганізацыяў, маючых права на рэпрэзынтацыю свайго народу, у тым ліку ад казакаў і крымскіх татараў, якія да гэтага часу ігнараваліся. Напрацягу амаль двух гадоў Амэрыканскі камітэт намагаўся знайсьці нейкі кампраміс на плятформу расейцаў з народамі Савецкага Саюзу.

У гэтым часе зьмяніліся два прэзыдэнты камітэту— Ляёнса заступіў адмірал Кэрк, а яго ў сваю чаргу замяніў адмірал Стывэс. Назоў таксама быў зьменены. Замест вызваленьня народаў Расеі—на вызваленьне ад бальшавізму.

«Союз Освобождения Народов России» (СОНР) разваліўся й быў створаны КЦАБ, які падзяліўся на КЦАБ-1 і КЦАБ-2 з Керанскім (уласаўцы), а разам зь імі Беларускае Дэмакратычнае Аб'еднаньне былі

Амэрыканскім камітэтам не прызнаныя, а таксама БЦР, зь беларускім вызвольным рухам.

Нерасейскія народы Савецкага Саюзу ставарылі ў Парыжы 14 сакавіка 1953 году Міжнацыянальны антыбальшавіцкі каардынацыйны Цэнтр (МАКЦ), які папулярына называлі «Парыскі блёк», На прэзыдэнта МАКЦ быў выбраны інж. Мікола Абрамчык, старшыня Рады БНР.

Парыжскі блок складаўся з прадстаўнікоў наступных народаў:

Арменія —Дэлегацыя Армянскай рэспублікі

Азэрбайджан —Азэрбайджанскі нацыянальны цэнтр

Беларусь —Рада Беларускай Народнай Рэспублікі

Казакія —Галоўнае Казацкае Прадстаўніцтва

Крым —Нацыянальны Цэнтр Крымскіх туркаў

Грузія—Грузінскі нацыянальны Камітэт

Ідэл-Урал—Ідэлуральскі нацыянальны цэнтр

Паўночны Каўказ—Паўночнакаўказкі нацыянальны цэнтр

Туркестан —Туркестанскі нацыянальны цэнтр.

Украіна —Выканаўчы ворган Украінскай Нацыянальнай Рады.

Радаю Парыскага блёку апрацаваны й высланы 14 чэрвеня 1953 году мэмарыял да Амэрыканскага камітэту й Стэйт дэпартмэнту ў Вашынгтоне, які разам з мэмарыялам КЦАБ-2 сталіся базай для ства-рэньня адзінага Каардынацыйнага цэнтру вызваленьня ад бальшавізму.

Трэба адзначыць, што арыгінальная плятформа была змадэфікава-ная, але аснаўныя пункты засталіся бяз зьмены. Яна асталася «непрэдрашэнскай». Прадстаўнікі Амэрыканскага камітэту заявілі, што плятформы адпавядаюць сучаснай палітыцы Амэрыкі й ,калі ласка, супрацоўнічайце, а калі не, то не. У такім выпадку ўсе разам пачалі змагацца за вызваленьне ад «інтэрнацыянальнага камунізму».

7 і 8 лістапада 1953 году была скліканая УІІ сэсія Рады БНР ў Нью Ёрку. Яна закончылася 4 красавіка 1954 году прыняцьцём агульнае дэклярацыі. Андак агульная дэклярацыя не выяўляла правалу, які быў выкліканы парушэньнем пастановы УІ сэсіі рады БНР аб умовах супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам ды парушэньнем нутранага парадку ў сувязі з выдавецтвам газэты «Беларус» воргану Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Амэрыкі (БАЗА).

Дзеля таго, што вялікая колькасьць радных не брала ўдзелу ў сэсыях, бо пераважна пражывала вонках ЗША,на прапанову др. Я Станкевіча была вынесеная пастанова, каб правесьці рэфэрэндум ва

ўсіх сэктарах Рады БНР, каб такім чынам рэзалюцыі УІІ сэсіі былі прынятыя сапраўднай бальшынёй радных. Для правядзеньня рэфэрэндуму была выбраная камісія ў складзе: М.Гарошкі,М.Дарашэвіча й Л.Савёнка.

Вынікам такога заканчэньня УІІ сэсіі Рады БНР, прэзыдыюм Рады быў выбраны й ня быў створаны Ўрад БНР, прэм'ерам якога быў А.Махноўскі ў заступстве А.Каханоўскага, злажыўшага раней сваю рэзыгнацыю. Прэзыдэнт М.Абрамчык зараз-жа ад'ехаў у Эўропу. Камісія не правяла рэфэрэндуму, і ўсё засталося да УІІІ сэсіі Рады БНР.

Інстытут для дасьледваньня гісторыі й культуры СССР распачаў сваю працу ў 1953 годзе. У навуковую раду ад беларусаў увайшоў др. Станіслаў Станкевіч, а ў сябры Інстытуту былі дэлегаваныя: М. Абрымчык, А.Адамовіч, С.Кабыш, а.Ч.Сіповіч.

Першая беларуская перадача праз радыё «Вызваленьне» ў Мюнхэне была 20 травеня 1954 г. На кіраўніка беларускае сэкцыі быў пакліканы др. В.Жук-Грышкевіч.

У пачатку 1954 году ў лягеры БЦР вытварылася непаразуменьне між прээзыдэнтам Р.Астроўскім і галоўным шэфам штабу БВР падпалкоўнікам Зарэчным, якое давяло да таго, што Прэзыдэнт БЦР звольніў 8 лютага 1954 г. Зарэчнага з становішча шэфа штабу. Аднак Зарэчны не падпардкаваўся загаду Прэзыдэнта БЦР і прадаўжаў сваю дзейнасьць. Тут распачалася небывалая спрэчка, у якой адзін аднаго абвінавачваў нават у неймаверных справах. Гэтая справа закончылася тым, што пастановай 27 кастрычніка 1954 году пленум і калегія БЦР зьліквідавала Беларускі Вызвольны Рух. Тады-ж быў арганізаваны Беларускі Вызвольны Фронт. На начальніка галоўнага штабу Вызвольнага Фронту быў пакліканы маёр Д.Касмовіч.

Не зважаючы на ўсё гэта, Беларускі Вызвольнуы Рух дзеяў і меў некалькі гадоў сваю кватэру ў Англіі. У сваім Маніфэсьце, паданым да ведама ў Манчэстэры, Англія, 1960 год і падпісаны «Галоўная Ўправа БВР» падаецца, за што змагаецца Беларускі Вызвольны Рух, зь якога можа ганарыцца кожны сьведамы беларус.

# Новыя пачынаньні ў Амэрыцы

Кастусь Мерляк прыехаў у Нью Ёрк з жонкай Ганнай і сынам Юлікам якому было два з паловай гады . Яны прыехалі ўжо не як Д.П., а як людзі зь немалым багажом і канкрэтымі плянамі й намерамі ,што рабіць. Падрыхтоўка, якая трывала 6 месяцаў, была выкарыстана для наладжаньня жыцьця ў новых абставінах, жыцьця асабістага, прафэсыйнага й грамадзкага. Усё гэта спрычынілася да спраўнага й хуткага палагоджаньня розных справаў.

Кватэра была знойдзена на Саўт 3 вуліцы ў Брукліне, закупленая мэбель ды іншыя неабходныя рэчы для жыцьця. Палагоджаныя ўсе фармальнасьці, зьвязаныя з прыездам у ЗША на сталае жыцьцё.

На другі тыдзень пакінулі Норфольк вуліцу ў Мангэтане й пераехалі жыць у нанятую кватэру ў Брукліне, на дргуі бок мосту ў Вільямсбург. Кастусь з працай не сьпяшаў, але пасьля наведаньня некалькіх амэрыкансіх параплаўных кампаніяў, пастанавіў адведаць двух знаёмых яшчэ з Буэнос Айрэс, з дырэкцыі Голанд-Амэрыка Лайн, сп.Вэнтгольта, галандца й сп.Гэрджам, амэрыканца, каб перадаць прывітаньне ад іхніх прыяцеляў у Аргентыне.

Сп.Гердж прыняў Касуся як свайго калегу, падзякаваў за прывітаньне й весьці з Буэнос Айрэс. У гутарцы распытаў пра пляны на прышласьць ды запрапанаваў прадаўжаць працу ў Голанд -Амэрыка Лайн. Узяў лісток паперы й напісаў некалькі слоў, уклаў у канвэрт і сказаў: «Калі ласка, адведайце дырэктара фінансаў сп.Сторма на 3-м паверсе й аддайце яму гэты канвэрт».

Цэлы трэці паверх 29 Бродвэй, Нью Ёрк быў заняты пад фінансавы аддзел кампаніі. Сп.Гэрыт Стром быў вельмі сымпатычны, невялікага росту галандзец. У гутарцы выявілася, што Кастусь і ён маюць добрага прыяцеля ў Буэнос Айрэс, які працуе ў той самай кампаніі, дзе Кастусь працаваў перад ад’ездам у Амэрыку. Сп. Стром сказаў, што ён тутака толькі 4 гады, прыехаў з Ротэрдаму ды абняў гэтае становішча. «Прапаную вам гэтак сама зрабіць, але такое становішча тут толькі адно, — пажартаваў ён. Але мы маем вольнае месца ў транспартовым аддзеле-сэкцыя Паўдзёнай Амэрыкі й таму, што ведаеце гішпанскую мову прапаную прыняць маю прапанову». Паклікаў сакратарку й сказаў аформіць сп.Мерляка на працу. Гэта было ў

чацьвер, а на працу Кастусь пайшоў у панядзелак 18 жніўня 1954 году.

Наладзіўшы асабістыя справы, Кастусь быў заняты нейкі час палагоджаньнем справаў, якія пакінуў за сабою ў Аргентыне. Разьвілася вялікая перапіска асабістага й ґрамадзкага характару. Лісты ўдзячнасьці й падзякі афіцыяльным аргентынскім чыньнікам, прад-стаўніком нацыянальных арганізацыяў, а таксама супрацоўнікам па працы й грамадзкай дзейнасьці. У першую нядзелю па прыезьдзе Кастусь наведаў царкву, пазнаёміўся зь япіскапам Васілём, пратаярэям Хведарам Данілюком і беларусамі, прыхажанамі прыходу сьв. Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку

Кастусь, разглядаючыся па Нью Ёрку й яго ваколіцах, пачаў рабіць «інвэнтар» палітычнага, грамадзкага, рэлігійнага, сацыяльнага й гаспадарскага жыцьця беларусаў. Выявілася, што старая беларуская эміграцыя з часоў перад першай сусьветнай вайны загубілася між расейцамі й палякамі паводля рэлігійнай прыналежнасьці: праваслаўныя прылучыліся да расейцаў, а каталікі да палякаў. Існавала толькі адна арганізацыя й тая малаактыўная—Беларуская Нацыянальная Рада ў Чыкага, якая была закладзеная Я. Варонкам і Я.Чарапуком-Змагаром.

Новыя беларускія эмігранты пачалі прыяжджаць у Амэрыку зь Нямеччыны й Англіі ў 1949 годзе. Яны прыбывалі зь невялікім перабоямі на працягу наступных 4-х гадоў, так што некаторыя ўжо пражылі каля 5-ці гадоў, а іншыя меньш, у залежнасьці ў якім годзе ўступілі на зямлю Вашынгтона. Кастусь застаў арганізацыі, якія існавалі й працавалі ў 1954 годзе па лініі крывіцкага напрамку:

Сэктар Рады Беларускай Народнай Рэспублікі,

Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне Амэрыкі (БАЗА), старшыня Галоўнай Управы Міхась Тулейка

З аддзеламі: Нью Ёрк, Нью Брансьвік (штат Нью Джэрсі), Кліўленд (штат Агаё), Дэтройт (штат Мічыган), Спрынгфільд (штат Масачусэтс), Стамфорт (штат Канэктікут)

Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Амэрыцы,

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва,

Крывіцкае Навуковае Таварыства імя Ф.Скарыны,

Прыход сьв. Кірылы Тураўскага БАПЦ, япіскап Васіль—сакратар Сыноду БАПЦ.

Па лініі зарубежніцкага напрамку:

Беларускі Кангрэсавы Камітэт Амэрыкі, старшыня др. М.Шчорс,

Злучаны Беларуска—Амэрыканскі Дапамогавы Камітэт,

Саюз Беларускае Моладзі ў Амэрыцы,

Беларускі Вызвольны Фронт, Кліўленд (штат Агаё).

Прыход сьв.Еўфрасіньні Полацкай ў Саўт Рывэры— Беларуская Праваслаўная Царква — пад юрыздыкцыяй Усяленскага патрыярхату.

Па лініі бээнэраўцаў галоўным уплывовым дзейнікам у палітычна-грамадзкім жыцьці быў прэзыдыюм сэктару Рады БНР з сваімі пад-сэктарамі ў мясцовасьцях, дзе знаходзіліся беларускія арганізацыі.

Да 1949 года ўсе сябры БНР знаходзіліся ў Эўропе, а пераважна ў Нямеччыне. Эміграцыя зь Нямеччыны рассыпала радных па ўсім сьвеце. Дзеля гэтага прэзыдыюм Рады на сваім паседжаньні 1-га студзеня 1950 году падчас першага прыезду М.Абрамчыка ў ЗША, пастанавілі рэарганізаваць Раду БНР —творачы сэктары ў краінах, дзе знаходзяцца тры або больш сяброў Рады. На гэтым паседжаньні былі ўстаноленыя й прынятыя, згодна з пратаколамі й Статутам, наступныя галоўныя заданьні сэктараў:

«Сэктар Рады БНР ёсьць галоўным дзейньнікам ва ўсіх праявах грамадзкай, нацыянальнай і палітычнай працы беларускай эміграцыі на абшары краіны, дзе сэктар існуе. Сэктар Рады БНР, прытарноў-ваючыся да мясцовых патрэбаў і эміграцыйных магчымасьцей, павінен вызначаць людзей для сувязі, прадстаўніцтва й працы з рознымі на-цыянальнымі інстытуцыямі, а таксама з уладамі краіны, у якой сэктар прабывае.»

На старшыню сэктару ў ЗША быў выбраны др.Аляксандр Орса.

Практычна, уплыў на мясцох праводзіўся раднымі, якія займалі кіраўнічыя становішчы ў грамадзкіх ды іншых установах. Сэктары ў сваёй дзейнасьці кіраваліся пастановамі сэсыяў Рады БНР, прэзы-дыюму й ўраду БНР. Калі ў Радзе усе пагаджаліся з пастановамі, дык у сэктарах усе працавалі ўзгдозе, і праца прыносіла выдатныя вынікі. Нажаль, пасьля УІІ сэсіі Рады БНР у Нью Ёрку разыходжаньні ў Радзе давялі да таго, што ня было дзейнага прэзыдыюма. Выбраны др. В.Тумаш чакаў на вынік рэфэрэндуму ад усіх сэктараў,таксама ня было дзейнага ў Раду БНР. Бязумоўна, такі стан моцна адбіўся на дзейнасьці арганізацыяў, а перадусім на Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньні Амэрыкі, не залежна ад таго, што БАЗА была амэ-

рыканскай грамадзкай арганізацыяй і легальна не падлягала Радзе БНР. Аднак апазыцыя ў Радзе не падтымоўвала й не праяўляла актыўнасьці ў арганізацыях.

Прыход сьв.Кірылы Тураўскага БАПЦ свае царквы ня меў, Богаслужэньне адбываліся ў царкве Сьвятое Тройцы УАПЦ, 345 Іст 4-я вуліца ў Нью Ёрку.

Па лініі бэцээраўцаў, у гэты час ворганаў БЦР у Амэрыцы ня было Але незалежна ад гэтага, Беларускі Кангрэсавы камітэт, які быў арганізаваны й кіраваны др.М.Шчорсам, праяўляў актыўную дзейнасьць згодна бэцээраўскай палітычнай канцэпцыі, Беларускі Кангрэсовы Камітэт уважаўся за галоўны кіруючы ворган (шапку) беларускіх арганізацыяў у ЗША. Такая структура рэпрэзэнтацыі нацыянальных этнічных арганізацыяў была ў практыцы шырока ведамая й прынятая амэрыканскім грамадзтвам і афіцыяльнымі ўстановамі мясцовага й фэдэральнага ўзроўню. Нягледзячы на тое, што БАЗА была большай арганізацыяй, Кангрэсовы камітэт, у гэтым выпадку меў вялікую перавагу.

Прыход сьв.Еўфрасіньні Полацкай з настаяцелям пратаярэям М.Лапіцкім меў сваю собскую й уладжаную царкву ў Саўт Рывэры.

4 верасьня 1954 году адбыўся XIУ пленум Беларускай Цэнтральнай Рады, на якім з важнейшых пунктаў парадку дня былі выбары Прэзыдэнта БЦР і ўкамплектаваньне выканаўчых ворганаў БЦР. У пленуме, як было падана, прынялі ўдзел 94 дэлегаты, якія ў бальшыні былі рэпрэзэнтаваныя праз паўнамоцтвы. Ня прынялі ўдзелу ў XIУ пленуме Юры Сабалеўскі, інжынер Іван Касяк і др.Мікалай Шчорс.

На Прэзыдэнта БЦР быў завочна выбраны прафэсар Радаслаў Астроўскі, які ў той час знаходзіўся ў Англіі. На старшыню пленума — Н.Мядзейка, на старшыню выканаўчага воргану—інжынер А.Русак, на ўстаноўленыя дэлегатуры БЦР былі назначыныя: на Нямеччыну —Д Касмовіч, Англію—Б. Варава, Аўстралію — М.Зуй, Гішпанію маг. У.Рыжы-Рыскі, Аргентыну—П.Саўчыц.

На грамадзкія абвавязкі Кастусю ня прыйшлося доўга чакаць. На 3 кастрычніка 1954 году быў скліканы агульны сход аддзелу БАЗА акругі Нью Ёрку, які складаўся з трох пададдзелаў: Мангэтана, Брукліна й Маспэта. Уступаючы старшыня др. В.Тумаш зрабіў справаздачу за час свае дзейнасьці й прачытаў пратакол рэвізыйнае камісіі , бо зьейнага складу ніхто на сход не зьявіўся. У дыскусыі выявілася, што

арганізацыя ня мае свайго памешканьня, а яе афіцыйны адрас гэта прыватнае памешканьне старшыні. Па гэтай прычыне беларуская школа ня была арганізавана. Па гэтай-жа самай прычыне не адбываліся рэфэраты, зборкі й нарады. Па гэтаму сябры рэвізыйнай камісіі не прыйшлі на сход, бо баяліся, што на іх узложаць грамадзкі абавязак. Акруговая ўправа была выбраная ў складзе: К.Мерляк— старшыня, Н.Арсеньнева—сакратар, П.Бунчук — скарбнік, А.Адамовіч і М.Цэлеш—сябры.

Першым грамадзкім выступленьнем у Амэрыцы быў рэфэрат на акадэміі, прысьвечанай слуцкаму паўстаньню 28 лістапада 1954 году, у Нью Ёрку. Тут была нагода спаткацца з шырэйшым грамадзтвам і пазнаць вядучых прадстаўнікоў беларускага грамадзтва.

Агульны сход радных сэктару Рады БНР у ЗША быў склікань на 12 сьнежня 1954 году. Гэта быў першы такі сход ад часу заснаваньня сэктару 1 студзеня 1950 году. На парадку дня стаялі між іншымі тыяж галоўныя пункты: справаздача прэзыдыюму сэктару, выбары прэзыдыюму сэктару, брашура раднага Янкі Станкевіча. Др. А.Орса ў сваёй абшырнай справаздачы зрабіў дакладны агляд жыцьця й дзейнасьці сэктару й грамадзкага жыцьця ў Амэрыцы. Зьяврнуў увагу так сама на недахопы ў працы сэктару з прычыны паўстаньня групоўкі й парушэньне нутранога парадку Рады БНР, падаючы да ведама, што ён злажыў заяву ў суд БНР у справе групоўкі. Дыскусія над справаздачай цягнулася доўга. Былі прапановы адкінуць усю справаздачу або толькі заяву ў суд. Агульны сход бальшынёю галасоў прыняў прапанову Васіля Русака справаздачы старшыні сэктару не прыняць.

Новы прэзыдыюм сэктару быў выбраны ў наступным складзе: К.Мерляк—старшыня, А.Адамовіч і Я.Арцюх—сябры.

У 1952 годзе старшыня Рады БНР атрымаў грашовую дапамогу на беларускую газэту ў Амэрыцы ад аднае амэрыканскае ўстановы, пад умовай, што яна застанецца ананімнай. У Нью Ёрку ужо выходзіла газэта «Беларус», выдаваная праз БАЗА старшынёй Кушалем. У сувязі з гэтым Ф.Кушаль у паразуменьні з М.Абрамчыкам стварыў новую рэдакцыйную калегію «Беларуса» пад кіраўніцтвам Н.Арсеньневай. Да гэтага часу на чале рэдкалегіі стаяў мгр. Леанід Галяк.

Дзеля таго, што дапамога была дадзеная на агульную беларускую справу, старшыня сэктару Рады БНР мусіў мець нагляд, каб дапамога была належна выкарыстаная. Нажаль, старшыня сэктару др. А. Орса

й прэм'ер Ураду БНР А.Махноўскі ня былі аб дапамозе павядомленыя. Справа парушэньня нутранога парадку Рады БНР і нерацыянальнае расходваньне грошаў было адной з прычынаў разыходжаньня між раднымі на УІІ сэсіі Рады БНР.

Радны др. Янка Станкевіч, каб зрабіць уплыў на вынік рэфэрэндуму, выдаў брашуру «Да сяброў Рады БНР», у якой выяўляў стварэньне «патайнай групоўкі» й яе шкодную дзейнасьць, падаючы праўдзівыя й няпраўдзівыя факты, якіх не належалася выяўляць. Брашура, паводля аўтара, была разасланая толькі радным, але яна трапіла таксама ў рукі зарубежнікаў, якія яе перавыдалі й шырока распаўсюдзілі сярод беларускае эміграцыі. Бясспрэчна, др.Я. Станкевіч зрабіў вялікую шкоду, выяўляючы недахопы ў кіраўніцтве Рады БНР, а галоўнае, спрычыніўся да ўстрыманьня дапамогі на газэту «Беларус». На сходзе радных была вынесеная пастанова, каб прэзыдыюм Рады БНР пазбавіў др.Я.Станкевіча сяброўства ў Радзе за зламаньне прысягі.

Др.Я.Станкевіч, пералічваючы расходы сваёй брашуры, не далічыўся досыць паважнае сумы, зь якое, як ён даведаўся палова, была перададзена Беларускаму Інстытуту Навукі й Мастацтва — старшыні др. В.Тумашу. Гэта яго моцна пакрыўдзіла, бо ён уважаў, што Інстытут быў закладзены на шкоду Крывіцкага Навуковага Таварыства Ф.Скарыны, якое было поўнасьцю пад яго асабістай дамінацыяй, а самае галоўнае, што яму нічога не далі. Грамадзтва й радныя добра ведалі яго матэрыялістычны й эксцэнтрычны характар, які быў галоўным рухавіком. У яго жыцьці, не апраўдывалі, а наадварот асуджалі за выданьне брашуры. А тое, што другая частка зь нявылічанай сумы была перададзена япіскапу Васілю, ён, мусіць, ніколі не даведаўся. Др. А.Орса пэдагог, даўгалетні й заслужаны выхаваўца беларускае моладзі, а таксама грамадзкі дзеяч, бачучы, што створаная групоўка самавольна нарушае прынятыя законы, выступіў супраць яе дзейнасьці. Радныя яго разумелі й падтрымоўвалі, але зь меркаваньня толькі ведамых ім самім гэтага моцна не выяўлялі. На першы пагляд факт паўстаньня групоўкі выглядаў досыць нявінна, які быў выкліканы неабходнасьцю абставінаў. На жаль, аказалася зусім інакш. Арыгінальная групоўка ў складзе М.Абрамчыка, Ф.Кушаля, М.Гарошкі, др.В.Тумаша, япіскапа Васіля, П.Манькоўскага, А.Адамовіча зь бегам часу то пашыралася, то зьменшывалася, у залежнасьці ад палітычных абставінаў ды падзеяў у беларускім грамадзкім жыцьці.

# 1955

Новы 1955 год беларусы ў Нью Ёрку распачалі вялікім балем, які ладзіла акруговая ўправа БАЗА ў Ленокс Голе, дзе ўсе энтузыястычна й зь вялікімі надзеямі на прышласьць спатыкалі новы год.

37-я ўгодкі 25 сакавіка ў Нью Ёрку арганізавала й каардынавала падрыхотоўку акруговая ўправа БАЗА пад кіраўніцтвам К.Мерляка. З гэтай нагоды быў апрацаваны «прэс рэліз» — спэцыяльны камунікат для выкарыстаньня ў прэсе, які быў шырока разасланы з запрошаньнямі на сьвяткаваньне 25 Сакавіка. Тут трэба адзначыць, што такі спасоб «прапаганды» быў першы раз выкарыстаны для пашырэньня вестак аб дзейнасьці беларускіх арганізацыяў.

Праграма складалася з радыёперадачы па радыё Нью Ёрку, з прамовай старшыні й беларускіх песьняў, а таксама былі паданыя весткі з грамадзкага жыцьця. На другі дзень 27 сакавіка 1955 году адбылася ўрачыстая богаслужба й акадэмія ў залі тэкстыльнае школы.

Акадэмію адчыніў прывітаньнем гасьцей К.Мерляк, рэфэрат у ангельскай мове чытаў П.Бунчук, а ў беларускай др.А.Орса. Пасьля прывітаньняў прысутных гасьцей адбылася багатая мастацкая частка.

Парад Лаяльнасьці ў Нью Ёрку быў ладжаны амэрыканскімі вэтэранамі замежных войнаў 30 красавіка 1955 году з удзелам нацыянальных групаў. У гэтым парадзе ўзялі ўдзел беларускія арганізацыі пад камандай К.Мерляка. На трыбуне з прадстаўнікамі штату й гораду Нью Ёрку з прадстаўнікамі амэрыканскіх арганізацыяў прымалі парад архіяпіскап Васіль БАПЦ і генэрал Францішак Кушаль.

УІ кангрэс БАЗА адбыўся 28 і 29 травеня 1955 году ў Нью Ёрку, На кангрэсе ўзялі ўдзел 72 дэлегаты ад аддзелаў БАЗА ў Амэрыцы, З справаздачы старшыні М.Тулейкі прысутныя даведаліся аб дзейнасьці Галоўнае Ўправы й яе сэкцыяў: па сацыяльнай апецы й дапамозе беларусам у Нямеччыне, жаночай сэкцыі, камітэту набыцьця Беларускага Народнага Дому, рэдакцыйнай калегіі газэты «Беларус» ды паасобных аддзелаў БАЗА. Пасьля дыскусыі над справаздачамі, на прапанову рэвізыйнае камісіі быў удзелены абсалюторыюм з падзякаю ўступаючай Галоўнай Управе за добра правядзеную працу.

На кангрэсе была выбраная Галоўная Ўправа з 9 асобаў з старшынёю Міхасём Тулейкам.

Кангрэс прыняў рэзалюцыю ў справе «бальшавіцкай прапаганды. сярод эмігрантаў за зварот да айчынных краёў». К.Мерляку было даручана рэарганізаваць камітэт набыцьця БНД, каб прысьпяшыць яго куплю. Даручана Галоўнай Управе паклікаць камісію для перагавораў зь беларускім Кангрэсавым Камітэтам, каб супольна стварыць адзінае беларускае прадстаўніцтва ў Амэрыцы. Гэтага-ж дня ўдзельнікі кангрэсу й грамадзтва прыемна правялі вечар на балі, які ладзіла царкоўная рада. Князёўнай БАЗА была абраная Фаня Шабовіч з Дэтройту.

18 чэрвеня 1955 году адбыліся паховіны ў Нью Ёрку сьв. пам. сэнатара Васіля Рагулі. Разьвітальныя прамовы над магілай прамовілі Ўладыка Васіль, К.Мерляк—старшыня сэктару Рады БНР у ЗША, М. Тулейка—старшыня Галоўнай Управы БАЗА й др. Барыс Рагуля з Канады.

Агульны сход акруговага аддзелу БАЗА Нью Ёрку адбыўся 23 кастрычніка 1955 году. Уступаючы старшыня К.Мерляк зрабіў справаздачу зь якой высьвятлілася, што ўправа зладзіла сьвяткаваньне 25 Сакавіка, парад Лаяльнасьці, зараганізавала школу для дзяцей, курсы беларусазнаўства для моладзі, праведзеная рэарганізацыя пададдзелаў акругі, уладжана канцылярыя пры 33 Норфальк вуліцы ў Нью Ёрку ды пастаўлена на належны ўзровень адміністрацыя й фінансы. Пасьля дыскусыі й розных выказваньняў быў удзелены абсалюторыюм з падзякаю за праведзеную працу. Управа была перавыбраная ў поўным папярэднім складзе.

Кастусь, абняўшы старшынства сэктару Рады БНР у ЗША у сьнежні 1954 году, на першы плян працы паставіў за мэту зьліквідаваць або хаця зьменшыць разыходжаньні між раднымі. Яны вытварыліся на УІІ сэсіі Рады ў справе вонкавай палітыкі Рады БНР у суадносінах да супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам вызваленьня народаў СССР на плятформе «непрадрашэнства», справай парушэньня нутранога парадку Рады БНР, паўстаньнем групоўкі й выданьнем радным Я.Станкевічам брашуры да сяброў Рады БНР. Дзеля таго, што ажыўленая дыскусія вялася ня толькі ў беларускай прэсе, але ў прэсе ўсіх народаў Савецкага Саюзу адносна палітыкі вызваленьня зь некалькімі расейскімі партыямі плятформы Амэрыканскага камітэту. Гэтая дыскусыя хвалявала радных, якія дамагаліся хуткага скліканьня сэсіі Рады БНР. Яны свае прапановы скіравалі да сэктару ў Нью Ёрку,

бо ня маючы дзейнага прэзыдыюму й Ураду БНР па прычыне не праведзенага рэфэрэндуму, аставалася ім толькі зьвяртацца да старшыні Рады М.Абрамчыка,

Каб ажывіць дзейнасьць радных, быў выпрацаваны абмежнік №1 1955 годзе, у якім зьвярталася ўвага на дзейнасьць, лаяльнасьць і даручэньні, якія радныя павінны старацца ажыцьцяўляць.

На сходзе сэктару 26 чэрвеня 1955 году раднымі былі разгледжаныя розныя бягучыя справы ды прыняты да ведама праэкт супрацоўніцтва эміграцыі народаў СССР у змаганьні з бальшавізмам. Праэкт прапанаваў каардынацыйны камітэт з 3-х партнёраў: Парыскі блёк, Цэнтр расейскіх палітычных арганізацыяў і Амэрыканскі камітэт вызваленьня ад бальшавізму. Справа камісіі кангрэсмэна Чарльса Кэрстэна адносна бальшавіцка-камуністычных злачынстваў у Беларусі. Пасьля сходу быў выданы абмежнік № 2, у якім між іншым паведамлена аб справах, разгляданых на сходзе.

На сходзе сэктару 11 сьнежня 1955 году разгядаліся дзьве галоўныя справы: скліканьне наступнае сэсыі Рады БНР і праца радыё «Вызваленьне». Пастаноўлена запрапанаваць старшыні Рады БНР М.Абрамчыку, каб сэсыя Рады была скліканая ў сакавіку 1956 году ў Нью Ёрку. Пра працу радыё «Вызваленьне» зрабіў абшырны даклад радны Я. Ліманоўскі, які быў працаўніком радыё ад пачатку да верасьня 1955 году. На падставе рэфэрату Я.Ліманоўскага, уражаньняў А.Адамовіча з пабыту ў Мюнхене, аналізу перадачаў К. Мерляка й спасьцярог др. В.Тумаша, сход сьвердзіў, што кіраўніцтва беларускай сэкцыі радыё «Вызваленьня» не справілася з пастаўленым даручэньнем па арганізацыі сэкцыі ўнутры, ды не паведаміла Раду й грамадзтва аб абмежаваньнях, якія ставіў ад пачатку Амэрыканскі камітэт з асабістых меркаваньняў. Пастаноўлена выслаць дэлегацыю да Амэрыканскага камітэту зь інтэрвэнцыяй у справе стаўленых абмежаваньняў ды цэнзуры беларускіх скрыптаў у складзе др. В.Тумаша, К.Мерляка й А.Адамовіча.

У далейшай дыскусыі выявілася, што заіснаваў асабісты канфлікт між кіраўніцтвам др. В.Жук—Грышкевіч і рэжысерам Я.Ліманоўскім, У выніку Я.Ліманоўскі быў звольнены, а на месца Жук-Грышкевіча шукаўся новы кіраўнік. Некаторыя радныя ставілі пытаньне пакінуць радыё, калі Амэрыканскі камітэт ня спыніць цэнзуры скрыптаў, бо гэткая практыка больш шкодзіць, чымся прыносіць карысьці беларус-

каму народу. Радны К.Мерляк зьвярнуў увагу, што гэта ёсьць радыё ня Рады БНР, а калі так хто думае, то ён моцна памыляецца. Гэтае радыё ёсьць амэрыканскае зь беларускімі праграмамі, якія перадаюцца ў духу амэрыканскай палітыкі. «Мы не павінны гэтай нагоды адкідаць, а выкарыстсаць тое, што даюць». На гэтым дыскусія й закончылася.

У другой палове 1954 году амэрыканскім кангрэсам была створаная камісія пад старшынствам кангрэсмэна Чарльса Кэтстэна для разгляду камуністычнай агрэсіі. У гэтай справе праводзіліся завочныя сьведчаньні др. М. Шчорса, а М.Лапіцкага, В.Місюля й Я. Кіпеля 14 кастрычніка ў Нью Ёрку. Інжынер М.Абрамчык сваё сьведчаньне зрабіў у Мюнхене перад гэтай камісіяй, Галоўная Ўправа БАЗА падрыхтавала некалькі сьведкаў, але, на жаль, яны не былі дапушчаныя, каб зláжыць сьведчаньне.

Амэрыканскі кангрэс у 1955 годзе выдаў брашуру «Communist take over and occupation of Byelorussia-Special report #9». У гэтай брашуры былі памешчаныя матарыялы, пабудаваныя на вочных сьведчаньнях і пісьмовыя прысутных сьведкаў. Адным з галоўных матэрыялаў быў апрацаваны мгр. Леанідам Галяком. Як выявілася пазьней др. М.Шчорс, старшыня Беларускага Кангрэсовага Камітэту й праф. Л.Дабранскі, старшыня Украінскага Кангрэсовага Камітэту пастараліся, каб сьведкі ад БАЗА ня былі запрошаныя на вочнае сьведчаньне.

Кіраўнікі БАЗА, бачучы канкурэнцыю дзьвёх арганізацыяў, шкодную для беларускае нацыянальнае справы, на УІ кангрэсе БАЗА даручылі Галоўнай Управе БАЗА паклікаць камісію для перагавораў зь Беларускім Кангрэсавым Камітэтам у справе стварэньня адзінага воргану беларускай рэпрэзынтацыі ў Амэрыцы. У камісію былі пакліканыя М.Тулейка, К.Мерляк, др. В.Тумаш.

Кастусю 1955 год на гэтым ня скончыўся. Ён стаўся «арбітрам» у канфлікце, які паўстаў між сакратаром Галоўнай Управы БАЗА М.Манькоўскім і старшынёю М.Тулейкам. Сп.Манькоўскі закідваў М.Тулейку, што ён яго ад 5-ці гадоў уціскае, прыводзячы фантастычныя доказы. Сп. Тулейка на цьвердзіў, што гэтыя доказы выдуманыя нездаровай галавою. Справа засталася палагоджаная так: што адзін да аднаго ня будуць гаварыць, але ў грамадзкай працы Манькоўскі паабяцаў супрацоўніцтва зь Мерляком, а не з Тулейкам.

# 1956

Беларусы Нью Ёрку й ваколіц гучна спаткалі новы 1956 год на балі ў Ленокс Гол, які арганізвала акруговая ўправа БАЗА. На сустрэчы 1956 году была разыграная вялікая латэрэя, зь якое даход пайшоў у Фонд набыцьця БНД і царквы.

Па даручэньню УІ кангрэсу БАЗА, камітэт набыцьця БНД пачаў называцца камітэт набыцьця беларускага народнага дому й царквы. Патрэбы грамадзкага дому й патрэбы царквы былі непарыўнымі й зьбіраньне грошаў у фонд набыцьця царквы было больш папулярна. Новы камітэт складаўся: К.Мерляк—старшыня, Д.Клінцэвіч—скарбнік, М.Тулейка, У.Русак і В.Захаркевіч—сябры.

Падрыхтоўка ад адзначэньня 38 -х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР Актам 25 сакавіка праводзілася й была скаардынаваная акруговай управай БАЗА пад кіраўніцтвам старшыні К.Мерляка. 23 сакавіка дэлегацыя БАЗА зь сямі асобоў была прынята ў заступстве мэра Р.Вагнэра гораду Нью Ёрку праз П.Р. Патэрсона й ён урачыста ўручыў старшыні К.Мерляку праклямацыю, што дзень 25 сакавіка 1956 году зьяўляецца беларускім днём у горадзе Нью Ёрку. Сп. К. Мерляк з свайго боку ўручыў П.Р. Патэрсону кнігу «Спадчына» Янкі Купалы.

24 сакавіка была наладжаная радыёперадача, прысьвечаная 38-м угодкам абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

25 сакавіка ўрачыстая Богаслужба была адпраўленая архіяпіскапам Васілём БАПЦ і архіяпіскапам Багданам Украінскай праваслаўнай царквы, Усяленскага патрыярхату, у царкве пры Іст.4-я вуліцы Нью Ёрку. А гадзіне 2:30 па абедзе распачалася ўрачыстая акадэмія ў гатэлі Білтмор з удзелам шматлікіх гасьцей і беларускага грамадзтва, К.Мерляк адкрыў акадэмію й прачытаў рэфэрат ў ангельскай мове, Наступна выступіў кангрэсмэн Франьціш Э.Дорн, др. С.Вытвыцкі. Прэзыдэнт УНР і прысутныя прадстаўнікі нацыянальных арганізацыяў.

Сп-чня Г.Ганчарэнка прачытала праклямацыі аб абвяшчэньні Дня 25 сакавіка беларускім Днём незалежнасьці, губэрнатарам штату Нью Ёрку, пісьмовыя прывітаньні ад сэнатараў, кангрэсмэнаў, урадавых чыньнікаў, амэрыканскіх і нацыянальных арганізацыяў. Пасьля багатай мастацкай часткі беларускіх песьняў і танцаў адбыўся банкет у гэтым самым гэтэлі, у вельмі сяброўскім настроі з тостамі й прамовамі.




*Комішёнэр Рычард П.Патэрсон у заступстве мэра гораду Нью Ёрку, уручае дэлегацыі Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ЗША праклямацыю, абвяшчаючы 25 сакавіка Днём незалежнасьці Беларусі ў горадзе Нью Ёрк. Праклямацыя выдана мэрам Робэртам Ф.Вагнэрам 23 сакавіка 1956 году.*

*Зьлева направа: Н.Кушаль (Арсеньнева), Ю.Станкевіч, К.Мерляк, А.Шукелайц, Комішёнэр Патэрон, М.Тулейка, Г.Ганчарэнка й Б.Данілюк,*

*Гэта першая праклямацыя «Дня незалежансьці Беларусі » ў гісторыі гораду Нью Ёрк.*

Урачыстае адзначэньне 25 Сакавіка адбілася галосным рэхам у амэрыканскай і нацыянальнай прэсе, а ўпершыню рэха адбілася й ў Крамлі, які ў сваім часопісе «Новое время» заатакаваў мэра Р.Вагнэра, а гэтым самым пасрэдна й дзейнасьць беларускае эміграцыі.

22 красавіка Кастусь спаткаўся першы раз з др. Жук-Грышкевічам, кіраўніком беларускае сэкцыі радыё «Вызваленьне», які быў звольнены з становішча й вяртаўся дадому ў Канаду. На сходзе сэктару Рады БНР др. Жук-Грышкевіч зрэфэраваў структуру адміністрацыі, расказаў аб ідэалягічных абмяжаваньнях ды разыходжаньнях, якія стварыліся ў Сэкцыі й дырэкцыі радыё «Вызваленьне».

На прапанову др. В.Тумаша з згодай М.Абрамчыка, кіраўніцтва беларускае сэкцыі радыё «Вызваленьне» было даручана Ўладзімеру Гіцкаму (Дудзіцкі). Для Кастуся й некаторых радных гэта была вялікай неспадзеўкай. Многія ведалі яго зь Менску. У Нямеччыне ён далучыўся да ўласаўцаў. Па заканчэньні вайны Гіцкі апынуўся ў Аўстрыі ў лягеры для Д.П. каля Зальцбургу. Гэты лягер быў украінскім, але там разам памяшчалася група беларусаў з сваім Камітэтам, старшынёй якога быў У.Гіцкі. У часе вымены грошаў ён заплутаўся з грашыма людзей, якія яму даверылі іх вымяніць ды хуценька выехаў у Вінэзуэлю. У Вінэзуэлі належаў да расейскай арганізацыі. Нейкім чынам навязаў лучнасьць з старшынёй Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва з просьбай памагчы яму пераехаць у Амэрыку. Але замест Амэрыкі др. В.Тумаш памог яму выехаць у Нямеччыну. На жаль, у радыё «Вызваленьне» Гіцкі доўга не затрымаўся, ледзьве пару гадоў. Непаразуменьні з працаўнікамі, дырэкцыяй і нямецкай паліцыяй заставілі Амэрыканскі камітэт яго зволіць. Вярнуўся ў ЗША й пры дапамозе аднаго з сваіх сяброў, дастаў працу выкладчыка расейскай мовы ў дзяржаўнай школе ў штаце Індыяна. З прычыны нядобрых паводзінаў, яго звольнілі з працы пасьля двух гадоў. Гіцкі пакінуў сваю жонку з 5 дзяцьмі й паехаў назад у Вэнэзуэлю .У Вэнэзуэлі доўга не пабыў—вярнуўся на радзіму ў БССР. У 70-я гады пачалі прыезджаць новыя эмігранты з Савецкага Саюзу й адзін з прыезжых гаварыў, што ён бачыў ў лягеры палітычна-зьняволеных беларускага пісьменьніка Дудзіцкага. Пазьней дайшлі весткі, што Дудзіцкі загінуў у высылцы ў адным із лягероў.

Парад лаяльнасьці на 5-й Авеню ў Нью Ёрку адбыўся 28 красавіка 1956 году з камандай і з тымі самымі ўдзельнікамі папярэдняга году.

На прапанову Амэрыканскага камітэту вызваленьня Кастусь зрабіў «Агляд эміграцыі ў Аргентыне» у сувязі з масавым паваротам эміграцыі ў Савецкі Саюз, у мясьціны свайго паходжаньня, і злажыў на рукі М.Тэрпака ў Амэрыканскім камітэце 13 ліпеня 1956 году. Акрамя агляду была зробленая прапанова супраць дзеяньня савецкай прапаганды заахвочваньня на паварот ды залучаны каштарыс гадавое акцыі. Сп. Тэрпак сказаў, што ён гэта перашле ў Вашынгтон на разгляд і апрацоўку. На пытаньне, ці Кастусь згадзіўся-б паехаць ды ўзначаліць праект у Буэнос Айрэс, адказ быў, што пра гэта будзе думаць, калі праект будзе апрабаваны ў Вашынгтоне. Праект так і ня быў апрабаваны.

Другую Сустрэчу Беларусаў ЗША й Канады, што адбылася 1 і2 верасьня 1956 году ў горадзе Таронта, ладзілі Галоўная Ўправа БАЗА і ЗБК (Згуртаваньне Беларусаў у Канадзе). 2-я сустрэча была адна із важнейшых падзеяў у жыцьці беларускае эміграцыі да гэтага часу. У суботу 1 верасьня адбыўся баль, на якім грала беларуская аркестра «Палесьсе» з Кліўленду. Назаўтра, з самага раньня, на абтоку возера Антарыё адбылася Богаслужба, якую адправіў а.Міхаіл БАПЦ. Падчас абеду старшыня Рады БНР інжынер М.Абрамчык, які прыехаў у Амэрыку правесьці 8-ю сэсію Рады БНР, праінфармаваў пра палітычныя падзеі й жыцьцё беларусаў у Эўропе. Вечарам адбывалася акадэмія пад кіраўніцтвам К.Акулы. У афіцыйнай частцы прамаўлялі: прадстаўнікі гораду Таронта, інжынер М.Абрамчык, М.Тулейка, К.Мерляк. Рэфэрат чытаў др.Жук-Грышкевіч аб бальшавіцкай акцыі «За вяртаньне на радзіму». У гэтай справе была прынятая рэзалюцыя. Пасьля афіцыяльнае часткі адбыўся канцэрт.

У гэтым часе была таксама адбывалася 1-я Сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі ў Таронта, ладжаная прыхільнікамі БЦР зарубежнікамі, Беларускім Амэрыканскім Дапамогавым Камітэтам і прыходам сьв.Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры (ЗША); Беларускім Нацыянальным Аб'еднаньнем і Саюзам Беларускіх журналістаў (Канада). Праграма сустрэчы складалася зь вечарынкі, Богаслужбы й акадэміі з канцэртам. На канфэрэнцыі была прынятая рэзалюцыя аб неаб-ходнасьці працы ўсіх беларускіх арганізацыяў з паясьненьнем, што гэта толькі першы крок да супольнага фронту.

Тут трэба затрымацца на падзеях ў Канадзе, каб зразумець, чаму там, у той самы час, была ладжаная другая Сустрэча Беларусаў

Паўночнай Амэрыкі. У 1949 годзе беларуская эміграцыя ў Канадзе заснавала Згуртаваньне Беларусў у Канадзе й пачала выдаваць газэту: «Беларускі эмігрант»—А.Гынцук, Сяргей Зіняк (Хмара), К.Акула, М.Ганько й іншыя. З прыездам др. В.Жука-Грышкевіча ў Таронта ў ЗБВК паўсталі разыходжаньні, якія скончыліся тым што частка беларусаў выйшла з ЗБК, залажыла БНА і пачала выдаваць газэту «Беларускі Голас» (Зіняк, Пашкевіч, Беразоўскі, Складоўскі й другія). Гэта быў пачатак «трэцяе сілы» беларускае эміграцыі, якую маніўся стварыць С.Хмара з сваімі супрацоўнікамі ў форме дэмакратычнай рэпрэзэнтацыі беларускай эміграцыі на чужыне, бяз прэзыдэнтаў БНР і БЦР. Каб распачаць дзейнасьць ён злучыўся часова з зарубежнікамі, а пасьля пачаў выступаць на бачынках газэты БГ супраць БНР і БЦР.

УІІІ сэсія Рады БНР была адкрытая 23 верасьня 1956 году у Нью Ёрку. Першае паседжаньне распачалося малебнам за беларускі народ і супольным абедам. Афіцыйнае адкрыцьцё сэсіі Рады БНР у ЗША зрабіў К.Мерляк, старшыня сэктару, перадаючы голас старшыні Рады БНР М.Абрамчыку, які зрабіў даклад аб міжнародным становішчы й ролі беларускае эміграцыі. Першае паседжаньне на гэтым было закончанае.

З нагоды прыездку старшыні Рады БНР і старшыні Парыскага блёку інжынера М.Абрамчыка, старшыня сэктару К.Мерляк наладзіў прэсавую канфэрэнцыю 27 верасьня ў гатэлі «Комодор», каб прадставіць дастойнага госьця амэрыканскай і іншанацыянальнай прэсе, прадстаўнікам грамадзтва й кіраўнікам нацыянальных цэнтраў у Амэрыцы. К.Мерляк прывітаў прысутных ды прадставіў М.Абрамчыка, які зрабіў агляд сучаснай палітыкі Крамля, зьвяртаючы ўвагу на яе памылковае тлумачэньне заходнімі палітыкамі. Далей прадставіў становішча Рады БНР і Парыскага блёку адносна супрацьдзеяньня новай савецкай палітыцы ды вызваленьня паняволеных народаў з-пад бальшавізму М.Абрамчык гаварыў па-беларуску, а перакладаў на ангельскую мову П.Манькоўскі.

Пасьля паўстаньня ў Пазнані 28 чэрвеня супраць камуністычнае сыстэмы эксплуатацыі працоўных, выбухла паўстаньне ў Вугоршчыне. Супроць савецкага імпэрыялізму й паняволеньня Вугоршчыны быў арганізаваны мітынг кантактнай камісіяй Парыскага блёку ў Нью Ёрку.

Як скарбнік гэтай камісіі, Кастусь прыклаў нямала працы з В.К.Бабаянам ў арганізаваньні й правядзеньні гэтага мітынгу ў

"Комодор" гатэль. Акрамя кангрэсмэна А.Сантангэлё й М.Абрамчыка выступалі асабістыя прадстаўнікі ад грамадзкіх арганізацыяў. На мітынгу была прынятая рэзалюцыя з заклікам да ўрадаў заходняга сьвету дапамагчы Вугоршыне ў змаганьні супраць расейска-камуністычнай агрэсіі.

У кастрычніку прыбыў зь Італіі ў Нью Ёрк слаўны беларускі сьпявак, бас Пётра Конюх, прыяцель Кастуся з часоў побыту ў Рыме й зямляк з Наваградчыны. Затрымаўся на кароткі час ў Кастуся. 2 сьнежня, стараньнямі К.Мерляка, старшыні акруговае Ўправы БАЗА быў наладжаны адмысловы публічны канцэрт Пётры Конюха ў залі сьвятовай славы Карнэгі гол у Нью Ёрку. На акампаніятара быў запрошаны адзін і з найлепшых піяністаў прафэсар І. Базылеўскі, які свайго часу акампаняваў славутаму Шаляпіну. Удала падабраны міжнародны рэпэртур для баса й яго выкананьне выклікала вялікае захапленьне прысутных, якія ў голас параўновалі Пётра да Шаляпіна.

УІІІ сэсія Рады БНР мела 6 паседжаньняў і прадаўжалася да 16 лістапада 1956 году. На парадку дня было 9 найважнейшых пунктаў на разгляд. На другім фармальным паседжаньні 7 кастрычніка быў выбраны прэзыдюм сэсіі. А.Адамовіч—старшыня, К.Мерляк і А. Шукелайц—сакратары. Пасьля прыняцьця парадку дня й дакладу М.Абрамчыка адбылася дыскусыя, у якой выявілася, што большай заганай справаздачнага часу была бязьдзейнасьць Прэзыдыюму Рады БНР па поваду бяздарнага заканчэньня УІІ сэсіі Рады БНР.

Сэсія праводзіла працу пільна й дакладна, у выніку былі прынятыя наступныя пастановы :

У галіне рэарганізацыі Рады БНР пастаноўлена, што:

1. Прэзыдыюм Рады БНР будзе знаходзіцца ў ЗША.

2. Прэзыдыюм будзе складацца з 4-х асобаў: сталы старшыня Рады БНР —інжынер М.Абрамчык, 2-х заступнікаў і сакратар.

3. Замест Ураду БНР ўстанаўляецца сакратарыят Рады БНР з 5-ці сакратароў як выканаўчы орган рады БНР.

4. Прыняцьце й выключэньне сяброў Рады БНР будзе адбывацца паводля новага рэгляменту.

5. Рада БНР—гэта асаблівы парлямэнт, які з прычыны акупацыі працягвае вызваленьне Беларусі па-за яе межамі. Таму грамадзянства краіны пражываньня, а тым больш ЗША ня можа быць перашкодай у ягоным статусе сябры Рады БНР, а наадварот, у шмат якіх выпадках,

стварае для яго лепшыя магчымасьці дзейнасьці дзеля вызваленьня Бацькаўшчыны.

У галіне вонкавае палітыкі пастаноўлена, што:

1. Сувязі з прадстаўнікамі паняволеных бальшавікамі народаў патрэбныя й карысныя. А з суседзямі трэба заўсёды гаварыць.

2. Супрацоўніцтва з Амэрыкнаскім камітэтм вызваленьня, з Інстытутам вывучэньня СССР і радыё «Вызваленьне» ў сваёй аснове карыснае нашай справе. Аднак УІІІ сэсія ўважае, што Інстытут мае вывучаць шырока й глыбока гісторыю й змаганьне за вызваленьне Беларусі не абмяжоўваючыся толькі да 1917 году. У радыё «Вызваленьне» неабходна пашырыць зьмест у нацыянальным духу ды яго засяг.

3. У галіне нутранай палітыкі пастаноўлена, што ёсьць неабходным зьвярнуць большую ўвагу на нутраную кансалідацыю нашых грамадзкіх і палітычных арганізацыяў вакол Рады. БНР.

На сэсіі, у выніку тайнага галасаваньня, у прэзыдыюм Рады БНР на пасаду заступнікаў старшыні Рады М.Абрамчыка былі выбраны: А.Стагановіч і А.Адамовіч.

На сакратара нутраных справаў быў выбраны—К.Мерляк,

На сакратара вонкавых справаў—М.Тулейка.

На сакратара інфармацыі—А.Шукелойц.

На скарбніка Рады БНР—В. Кажан.

На сакратара Рады БНР—Н, Арсеньнева (Кушаль).

У дапамогу сакратарыяту ўстаноўлены наступныя рэфэрэнты: Рэфэрэнтура вайсковых справаў—генэрал Ф.Кушаль, царкоўных справаў Б.Данілюк, народнай гаспадаркі—С.Кабыш, адміністрацыі БССР—Я. Запруднік, беларуска-польскіх дачыненьняў—В.Кендыш, беларуска-балцкіх дачыненьняў—др. В.Тумаш, дачыненьні зь іншымі народамі—П.Манькоўскі.

Перад заканчэньнем сэсіі Рады БНР была разгледжана справа раднага Янкі Станкевіча, якога радныя асуджалі за выданьне бра-шуры й змаланьне прысягі. Др. Я. Станкевіч стараўся апраўдацца й зрабіў асьветчаньне, якое было надрукаванае ў газэце «Беларус». А заяву Ліманоўскага аб выступленьні з Рады прысутныя прынялі да ведама.

Па заканчэньні УІІІ сэсіі Рады БНР адбыліся 3 супольныя паседжаньні прэзыдыюму й сакратарыяту ў поўным складзе з удзелам прэзыдэнта М.Абрамчыка. На паседжаньнях былі ўстаноўленыя

даручэньні й засяг дзейнасьці паасобных сакратарыятаў і рэфэрэнтаў ды найбліжэйшы плян дзеяньня.

У сакратарыяце нутраных справаў устаноўлена, што старшыні сэктараў Рады БНР данай краіны падначасна будуць выконваць функцыі прадстаўніка сакратарыяту Рады БНР. Найважнейшая справа, якую трэба як найхутчэй правесьці—улік беларускае эміграцыі ў сьвеце, бо бяз гэтага цяжка наагул пачынаць працу. Прэзыдэнт М.Абрамчык праінфармаваў пра сваю дзейнасьць у часе між паседжаньнямі Рады , аб спатканьні й размовах з новым прэзыдэнтам Амэрыканскага камітэту вызваленьня сп. Гоўленд Сэрджантам. Аб паездцы ў Вашынгтон, дзе яго запэўнілі, што хутка «Голас Амэрыкі» будзе перадаваць на беларускай мове.

Гэта была, як аказалася пазьней, адна з выдатнейшых сэсыяў Рады БНР на эміграцыі, нават нягледзячы на тое, што выйшлі з Рады, а між імі паважныя дзеячы: А.Каханоўскі, Л. Галяк, А.Махноўскі, М.Рагуля, Л.Савёнак, М.Панькоў, Я.Ліманоўскі, М.Цэлеш, А.Савёнак і Навіцкі ў Канадзе.

## 1957

На сустрэчы новага 1957 году старшыня акруговае ўправы БАЗА К.Мерляк прывітаў гасьцей: старшыню Рады БМР М.Абрамчыка й маэстра П.Конюха й усіх прысутных, жадаючы шчасьлівага 1957 году.

Захадамі К.Мерляка й кангрэсмэна Ф.Е. Дорна 39-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР рапачаліся 21 сакавіка ў Амэрыканскім Кангрэсе, паседжаньне якога адкрыў малітваю архіяпіскап Васіль БАПЦ па запрашэньню прамоўцы Палаты рэпрэзэнтантаў СэмРэйбурн. З гэтай нагоды кангрэсмэн Дорн запрасіў Уладыку Васіля й К.Мерляка на абед, падчас якога беларускія госьці мелі нагоду пазнаёміць з праблемамі беларускае эміграцыі кангрэсмэнаў Д.Форд, М.А.Фэйган, Т.М.Махровіч, А. Э.Сантангэлё, Ф.Дж. Адонісіё і ф.Зеленко.

Гэтага-ж дня была прынятая дэлегацыя БАЗА на чале з М.Тулейкам праз мэра гораду Нью Ёрк, які ўручыў праклямацыю, што Дзень 25 сакавіка 1957 году зьяўляецца «Беларускім днём у Нью Ёрку».

23 сакавіка была наладжаня радыёперадача, пад час якое прамаўляў старшыня й арганізатар сёлетніх угодкаў.



*На здымках: архіяпіскап Васіль БАПЦ, кангрэсмэн Францішк Е.Дон (справа) і Кастусь Мерляк (зьлева) старшыня Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў ЗША,на сходах амэрыканскага кангрэсу ў Вашынгтоне, пасьля малітвы Ўладыкі 21 сакавіка 1957 году ў Палаце Рэпрэзэнтантаў з нагоды абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.*

Урачыстая акадэмія адбылася ў гатэлі «Білтмор» 24 сакавіка, падчас якое пасьля адкрыцьця ў ангельскай мове К.Мерляком выступілі амбасадар Кітаю Т.Ф.Тсянг, кангрэсмен Францішк Дорн, сэнатар Штату Нью Ёрк Дж. П. Мрысей, Прэзыдэнт гарадзкой управы Нью Ёрку А.Старк і судзьдзя А.А.Ротман.

На акадэміі былі прачытаны праклямацыі аб абвяшчэньні 25 сакавіка беларускім днём гораду Нью Ёрку , штату Нью Ёрк і штату Нью Джэрсі, а таксама былі прачытаныя пісьмовыя прывітаньні ад сэнатараў, кангрэсмэнаў, урадавых установаў і ад беларускіх арганізацыяў на чужыне. Пасьля мастацкай часткі адбылося прыняцьцё для гасьей.

Парад лаяльнасьці прыпадаў на 27 красавіка 1957 году, у Нью Ёрку, пра які пісаў карэспадэнт газэты «Бацькаўшчыны». Трэба шчыра сказаць, што як і летась нашая беларуская калёнія прадстаўлялася даволі эфэктоўна. На чале яе, у вайсковай уніформе, бадзёра крочыў маршал сп. К.Мерляк, за ім сьцягі, беларускі й амэрыканскі, вэтэраны із сваім прыгожым, старым прывезеным зь Нямеччыны, сьцягам, моладзь, жаночая група ў беларускай народнай вопратцы, а нарэшце —шарэнгі беларусаў Нью Ёрку ды ваколіцаў, нясучы шмат добра прадуманых і выкананых плякатаў, патрыятычнага зьместу...»




*На здымку: Парад лаяльнасьці на 5-й авэню ў Нью Ёрку, 27 красавіка 1957 году.*

УІІ кангрэс БАЗА адбыўся 1 чэрвеня 1957 году ў Нью Ёрку. На гэтым кангрэсе Кастусь зрабіў справаздачу з дзейнасьці акруговае ўправы БАЗА й камітэту набыцьця БНД і царквы. Пры ўдзяленьні абсалюторыюм Галоўнай Управе БАЗА была вынесеная падзяка К.Мерляку за ягоную актыўнасьць у грамадзкай працы.

На старшыню Галоўнае Ўправы БАЗА быў выбраны мгр.Мікола Кунцэвіч і ўправа з 6 асобаў.

23 чэрвеня адбыўся чарговы гадавы сход сяброў аддзелу БАЗА Нью Ёрку. Справаздача ўступаючага старшыні К.Мерляка абыймала наступныя дзялянкі жыцьця:арганізацыйныя справы, імпрэзы, культурна-асьветная праца, вонаквыя дачыненьні ,сацыяльная апека й фінансавая справаздача. Із справаздачы выявілася, што акруговая ўправа зладзіла 8 агульных масавых імпрэзаў і 8 культурна-асьветніх зборак. Асаблівую ўвагу заслугоўваюць ладжаныя ўрачыстасьці з нагоды 39-х угодкаў незалежнасьці БНР.

Увосені прыехаў у ЗША адведаць сваіх суродзічаў а.Чэслаў Сіповіч. Рэктар беларускае каталіцкае місыі ў Англіі. Для Кастуся гэта была прыемая сустрэча з а.Чэславам пасьля 10 гадовае разлукі ў Рыме перад ад'едам у Аргентыну ў 1947 годзе.

28 верасьня а.др.Сіповіч зрабіў даклад на тэму «Беларусы ў Эўропе», дзе дакладна прааналізаваў жыцьцё й дзейнасьць амаль што ў кожнай краіне Эўропы. У часе дыскусіі й пытаньняў Кастусь зьвярнуў увагу на рэлігійныя выданьні на эміграцыі, асабліва ў Амэрыцы. Прадстаўляючы па аднаму экзэмпляру а.Чэславу «Беларуская царква» Чыкага, рад. В.Пануцэвіча, «Божым шляхам» Парыж, рад. а.Леў Гарошка, «Зьніч»—Рым, рад. а.др.П. Татарыновіч, «Сіла веры» ЗША, рад. А.Асіповіч, «Сяўбіт»—Нью Ёрк, а.Францішак Чарняўскі, да гэтага трэба дадаць «Бюлетэні», выдаваныя спарадычна некаторымыі прыхажанамі ў Амэрыцы. Разам 5 публікацыяў, тады калі тут выходзіць толькі адна грамадзкая газэта «Беларус» і 4 разы ў год. 3 гэтага выглядае, што беларусы на эміграцыі больш патрабуюць рэлігійнага ўсьведамленьня чымся нацыянальнага, што ў даным выпадку ёсьць адваротнай справай. Ніхто гэтаму не запярэчыў.

У справе беларускай мовы ў перадачы «Голос Амэрыкі» Кастусь наведаў 7 лютага Вашынгтон і злажыў візыту ў Дырэкцыю УСІА Амэрыканскую агенцыю інфармацыі й быў прыняты праз Гэнры Люміс, дырэктара інфармацыі. Падчас інтэрвью стала ясна, што беларуская

мова ў перадачы ня будзе хутка ўведзена, нягледзячы на цьвержаньні М.Абрамчыка. Дзеля гэтага трэба было паводля сугэстыі Люміса, яшчэ раз рабіць дамаганьні масавага характару. У верасьні сакратар нутраных справаў К.Мерляк выдае абежнік да прадстаўнікоў Рады БНР і беларускіх арганізацыяў на чужыне з заклікам пісаць мэмарыялы-просьбы зь інструкцыяй як і каму іх пісаць. Вынікам гэтае акцыі было выслана 34 мэмарыялы ад 37 беларускіх арганізцыяў і ўстановаў. На заканчэньне гэтае акцыі К. Мерляк і Я.Запруднік наведалі 7 студзеня 1958 году Вашынгтон і ўручылі копію мэмарандуму, які быў высланы Прэзыдэнту ЗША, асыстэнту дырэктара УСІА Вільяму Л.Клярку. У гутарцы бралі ўдзел сп. Рыд і сп.Рывэй. Яны пацьвердзілі ранейшыя прычыны або апраўданьні, што беларусы разумець расейскую й польскую мовы, а да гэтага на беларускую сэкцыю няма бюджэту. Паабяцалі рабіць усё магчымае із свайго боку, каб беларусы слухалі перадачы ў сваёй роднай мове. Але гэтага беларусы не дачакаліся.

У пачатку ліпеня сакратар нутраных справаў Рады БНР К.Мерляк наведаў Кліўленд, дзе спаткаўся з а.М.Макарэвічам. Спатканьне было надзвычайнае пасьля даўгое разлукі з часоў побыту ў Буэнос Айрэс. Пасьля Кліўленда наведаў Дэтройт, Чыкага, ў Канадзе Таронта й Лондан. Мэтай паездкі было запазнацца з асяродкамі ды ўпарадкаваць падсэктары Рады БНР. Пры гэтай нагодзе парушаліся розныя грамадзкія справы.

У верасьні таго-ж году быў высланы абежнік прадстаўнікам Рады БНР і беларускім арганізацыям на чужыне ў справе адзначэньня 40-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР Актам 25 сакавіка. У абежніку было пададзена, як 40-я ўгодкі павінны быць арганізваныя. Наш кліч: «Кожны беларус на чужыне павінен нешта ўнесьці або зрабіці, для належнага адзначэньня 40-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі».

Пасьля правалу Жэнэўскай канфэрэнцыі на вяршынах у 1955 годзе (Айзэгаўэр, Хрушчоў, Далес, Ідэн і Форэ). Прэзыдэнт ЗША паклікаў да жыцьця праграму «Народ да народу», бо на яго думку звычайныя грамадзяне хутчэй дагаворацца, чымся дыпляматы або афіцыйныя дзейнікі. Пры гэтай арганізацыі існаваў аддзел нацыянальнасьцей пад кіраўніцтвам падпалкоўніка Слезак і судзьдзі Маркізіё. На 1 верасьня была склікана канфэрэнцыя прадстаўнікоў нацыянальных арганізацыяў з мэтай наладзіць банкет, каб сабраць грошы на праграму. Палкоўнікам

Слёзкам была ўнесена прапанова запрасіць амбасадараў кожнага народу. Прадстаўнікі паняволеных народаў супрацівіліся. К.Мерляк запрапанаваў на месца абмасадараў камуністычных краінаў, запрасіць прадстаўнікоў экзульных урадаў або прадстаўнікоў цэнтральных арганізацыяў у Амэрыцы. Палкоўнік Слёзак сказаў, што ён павінен узгодніць з Дзяржаўным дэпартамэнтам. Так банкет і не адбыўся. Кастусь уважаў, што створаная на эміграцыі Рада Беларускай Народнай Рэспублікі—гэта парлямэнт на чужыне для рэпрэзэнтрацыі беларусаў і абароны беларускіх інтарэсаў перад афіцыяльнымі чыньнікамі (урадамі) краінаў вольнага сьвету. Для беларусаў, гэтая моцная арганізаваная ўстанова, дзейная й дысцыплінаваная, будзе здольная кіраваць змаганьнем за вызваленьне Бацькаўшчыне. Дзеля гэтага, каб закончыць рэарганізацыю Рады БНР, сакратаром унутраных справаў К.Мерляком у лістападзе 1957 году была выдадзеная канфідэнцыяльная інструкцыя № 101 адносна арганізацыйнай структуры, плянаў дзейнасьці ды іхнія пяршэнства акцыі ў палітычных пытаньнях, адносна фінансаў і камунікацыі. Першай важнай справай гэта ўлік сяброў Рады БНР, грамадзкіх арганізацыяў ды ўсіх беларусаў у кожнай краіне.

Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады Р.Астроўскі прыехаў у ЗША з Англіі 1 ліпеня й падаўся да дымісыі 30 лістапада гэтага году.

На 30 лістапада й 1 сьнежня была скліканая сэсыя 15-га пленуму БЦР у Саўт Рывэры. Прысуптны А.Арэхва зьвярнуўся да Р.Астроўскага з просьбай, каб ён адклікаў сваю рэзыгнацыю, на што Р.Астроўскі згадзіўся. Такім чынам, пункт «выбары прэзыдэнта» быў зьняты з парадку дня. На пленуму былі прынятыя пастановы: выканаўчы орган БЦР перанесьці ў Англію са старшынёю мінсістараў Кастусём Глінскім. У прэзыдыюм ды ва ўсе органы Рады БЦР выбралі тых асобаў, якія яшчэ не зьяўляюцца грамадзянамі ЗША. Утварыць для сяброў грамадзянаў Амэрыкі арганізацыю «Амэрыканскія прыхільнікі БЦР». Пленум БЦР даручыў Р.Астроўскаму асабіста ўвайсьці ў беспасрэдныя зносіны з архіяпіскапамі Філафеям і Апанасам, просячы іх выйсьці з Расейскае Зарубежнае Царквы й узначаліць БАПЦ з тым, што архіяпіскап Апанас прыедзе ў ЗША.

У гэтым-жа годзе на бачынках беларускіх газэтаў «Бацькаўшчына», «Беларускае слова» й «Беларус» зьявіліся артыкулы пад рознымі загалоўкамі, якія закончылі палеміку, распачатую яшчэ ў 1956 годзе,

у справе, хто прадаў беларускую праваслаўную царкву ў Рэгэнсбуру ў Нямеччне—мітрапаліт Панцелейман ці протапрасьвіцер Мікалай Лапіцкі.

Камісія, пакліканая на падставе пастановы УІ кангрэсу БАЗА ў 1956 годзе ў складзе др. В.Тумаша, К.Мерляка, М.Тулейкі для перамоваў зь Беларускім Кангрэсовым Камітэтам Амэрыкі, каб стварыць адзінае палітычнае прадстаўніцтва беларусаў у Амэрыцы, БАЗА пачала дзеяць. Сябры камісіі ад БАЗА і ад БККА-старшыня др. Мікалай Шчорс з некалькімі сябрамі, якія мяняліся, спатыкаліся й абгаварывалі ўсебакова пытаньні, якія лучаць, а асабліва, якія дзеляць беларускае грамадзтва.

Праект стутуту быў апрацаваны з прапановай назваць арганізацыю Беларуская Кангрэсовая Рада Амэрыкі (БКРА) й перадааны др.Шчорсу 5 чэрвнея 1956 году для разгляду праз БККА. Галоўная Ўправа БАЗА, у сваю чаргу, з паясьняючым лістом разаслала сваім аддзелам і афіляваным арганізацыям на разгляд і апрабата статуту. Пасьля трох з паловаю месяцаў др. Шчорс перадаўна рукі камісіі свой контрпраект статута, які мала ў чым разыходзіўся, з далучаным тэкстам прапанаваў дадатковыя ўмовы, якія мусілі-б падпісаць БАЗА БККА перад прыступленьнем да стварэньня адзінага цэнтральнага прадстаўніцтва.

Камісія БАЗА зрабіла свае засьцярогі да пагадненьня й 17 студзеня 1957 году перадала свае засцьярогі да паўторнага разгляду й апрабаты. Пасьля гэтага камісія ад др. Шчорса нічога не атрымала. Калі праводзіліся гутаркі й падрыхтоўка да стварэньня БКРА, адбываліся дыскусыі ў крывіцкім і зарубежніцкім лягерах, Управа й сябры арганізацыі БАЗА ў вялікай бальшыні падтрымоўвалі й добра разумелі патрэбу аднаго цэнтру для разьвіцьця беларускага грамадзтва ў ЗША. Аднак М.Абрамчык і некаторыя сябры Прэзыдыюму Рады БНР гэтаму супраціўляліся.

У Беларускім Кангрэсовым Камітэце адбывалася штосьці падобнае, але толькі ў кіраўніцтве БЦР і БККА, іхняе шырэйшае грамадзтва ня брала ўдзелу ў дыскусыі, бо камітэт у сваім складзе ня меў масавае грамадзкае арганізацыі, за выняткам Беларуска—Амэрыканскага Камітэту Дапамогі ў Саўт Рывэры, так што дзейнікі БЦР не дапусьцілі да стварэньня супольнага цэнтру. Гэта пацьвярждае артыкул «Дарэмныя намаганьні» за подпісам А.Аркей (псэўданім) у газэце «Беларускае

Слова» №2 (3) за кастрычнік 1956 году, у якім сказана «...што др.Шчорсу ня менш чым нам добра ведама, што ўвесь «крывіцкі рух» зьяўляецца зьявішчам не беларускім, а чужою агентураю» У такім выпадку «зарубежнікам» не выпадала пакінуць сваё «зарубежжа» ды яднацца з не беларусамі. У гэтым артыкуле нямала давялося др.М.Шчорсу, вялікаму дзеячу й палітыку, а перадусім беларускаму патрыёту, за тое, што ён палічыў крывічоў за беларусаў. Др. Шчорс моцна зьнеахвоціўся, выехаў зь Нью Ёрку й ніколі не вярнуўся да актыўнае грамадзкае дзейнасьці. На яго месца выбралі старшыню БККА інжынера Івана Касяка, які заставаўся на гэтым становішчы да канца свайго жыцьця.

Яшчэ адно супольнае паседжаньне прадстаўнікоў БАЗА з прадстаўнікамі БККА адбылося 1-га лістапада 1959 году, якое прайшло бязвынікова.

17 травеня 1960 году быў высланы ліст старшыні БККА І. Касяку наступнага зьместу: «Гэтым ветліва паведамляю, што Ваш ліст з 1 травеня атрымаў, за які дзякуючы, мы із свайго боку таксама ўжо змаглі сабраць апінію ад бальшыні сваіх арганізацыяў у справе каардынацыі дзейнасьці беларуска-амэрыканскіх арганізацыяў у ЗША. У сувязі з вышэй сказаным будзем вітаць Вашыя прапановы.

З пашанаю да вас, К.Мерляк, старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА».

## Справа набыцьця БНД і царквы

У Нью Ёрку заіснаваў прыход сьв.Кірылы Тураўскага ад 1950 г. і беларусы маліліся ў хатцы ў Брукліне, дзе таксама памяшчалася канцылярыя БАЗА. Па прыезьдзе япіскапа Васіля ў Нью Ёрк маліліся ў царкве Сьвятой Тройцы пры 345 Іст 4-я вуліца, якая належала да Украінскае Праваслаўнае Царквы.

Кастусь хутка зарыентаваўся, што акрамя нацыянальнае сьвядомасьці, патрыятызму й царквы (прыходу) у Амэрыцы, грамадзкаарганізацыйнае жыцьцё трымаюць яшчэ фінансава-гаспадарчыя саюзы. Аднымі зь іх, з шырокім удзелам людзей, былі страхавыя таварыствы, якія існавалі ў ЗША на правох фінансавых інстытуцыяў, пад якія таксама падлягалі ашчадна-крэдытовыя касы, як, напрыклад Украінскі Роботнічы Союз і Звёнзэк Сынув Польскіх.

Важнасьць фінансава-гаспадарчай арганізацыі хутка падгледзелі зарубежнікі й з дапамогай украінцаў ставарылі беларускі аддзел—старшыня Ул. Пелеса пры Украінскім Роботнічым Союзе —старшыня Батюк. Так, што крывічом было не па сілах арганізаваць сваё страхавое таварыства, а прылучыцца ня было да каго. Праўда, інжынер М.Гарошка ў 1957 годзе намагаўся сарганізаваць ашчадна-крэдытовую касу, але яго здольнасцы ды недавер да яго сталі на перашкодзе. Недавер да М.Гарошкі быў выкліканы тым, што ён залажыў будаўляную суполку «Нёман» з 12 сябрамі. Супалка «Нёман» змагла збудаваць толькі некалькі дамоў, дзякуючы М.Гарошку, яна збанкрутавала. Усе 12 сяброў укладчыкаў патрацілі свой уложаны капітал.

На УІ кангрэсе БАЗА камітэт набыцьця Беларускага народнага дому быў падпарадкаваны Галоўнай Управе БАЗА й даручана К.Мерляку рэарганізацаь Камітэт, які да гэтага часу існаваў і дзеяў незалежна, бязь ніякага нагляду. К.Мерляк паклікаў камітэт у складзе: духоўны апякун—Уладыка Васіль, старшыня—К. Мерляк, сакратар—М.Тулейка, скарбнік Д.Клінцэвіч, сябры Ул.Русак і В.Захаркевіч. Камітэт зараз-жа распачаў інтэнсыўную зборку грошаў і пошукі адпаведнага аб'екту.

Царква сьв.Тройцы пры 4-й вуліцы ў Нью Ёрку была пастаўлена на продаж. Царкоўная рада (старшыня М.Гарошка) пастанавілі гэтую царкву купіць. Уладыка Васіль зрабіў заклік да беларусаў, каб дапамаглі грашыма купіць так неабходную царкву. На жаль, дзякуючы недалужнасьці старшыні й усяе царкоўнае рады гэтую царкву купіў Сынод Расейскай Зарубежнае Праваслаўнае царквы. Па гэтаму поваду ў зарубежніцкай газэце «Беларускае слова» за чэрвень 1957 году зьявілася сатырычная зацемка азаглаўленая «Дзіўная Зьява», з зьместам, што япіскап Васіль зьбірае грошы на царкву, якая ужо праданая.

Камітэтам набыцьця БНД, царкоўнай радай і Галоўнай Управай БАЗА быў скліканы агульны сход, хто ўплаціў на куплю БНД і ўсіх зацікаўленых беларусаў Нью Ёрку. На гэтым сходзе камітэт пераіменавалі на камітэт набыцьця БНД і царквы ў Нью Ёрку. Да існуючага складу дадалі Б.Данілюка, В.Юрцэвіча й М.Рагулю.

У прыходзе сьв. Кірылы Тураўскага ставарылася жахлівае становішча — ня было месца, дзе адпраўляць Богаслужбы. Царкоўная рада прыходу знайшла залю ў Лейбор Тэмпэль (масонская ложа) на

14 вуліцы ў Нью Ёрку. Кожную нядзелю трэба было ўносіць усе прылады, а пасьля службы выносіць. Такая абстаноўка не заахвочвала вернікаў. Кастусь, бачучы, што людзі пачалі наведваць іншыя цэрквы пачаў дзейнічаць. Сталі шукаць аб'ектаў, каб задаволіць рэлігійныя й грамадзкія парэбы. Ён прапанаваў знайсьці аб'ект дзе-б памяшчалася царквка, была заля з пакоямі на грамадзкія патрэбы ды з камэрцыйнымі й жыльлёвымі кватэрамі, якія-б давалі даход на ўтрыманьне будынку й інышя патрэбы. Другім, асабліва Тулейку, гэта выглядала немагчымым, бо як яны казалі, аб'ект будзе задарагі, завялікі і г.д.

Кастусь, будучы ў Вашынгтоне, наведаў кангрэсмэна Ф.Дорна, зь якім ужо быў запрыязьнены, і ў гутарцы выявіў, што беларусам неабходна хутка набыць царкву. Кангрэсмэн Дорн паабяцаў у гэтай справе дапамагчы. Прайшло пару месяцаў канргрэсмэн Дорн і яго супрацоўнік адвакат Шміт паведамілі, што яны маюць аб'ект на продаж, які можа задаволіць патрэбы. Перш Кастусь, а потым у цэлым складзе камітэт агледзелі Прэзбітэр'янскую царкву пры Атлянтык Авэню ў Брукліне. Гэта быў двухпавярховы будынак, нанізу заля, а на першым паверсе царква, два пакоі й нявыканчаны падвал. Цана 25, 000 даляраў. На паседжаньні камітэт пастанавіў купіць царкву, згадзіўся на цану й даручыў Кастусю зрэаэалізавцаць куплю.

15 кастрычніка 1957 году будынкак быў куплены. Гатоўкаю заплацілі 11 000 дал. і гіпатэчнай пазыкай 14 000. Дакумэнты на крэдыт падпісаў К.Мерляк. Урачыстыя ўходзіны былі 3 лістапада 1957 году.

Пры афармленьні куплі будынку выявілася, што чартар прыходу сьв. Кірылы Тураўскага зарэгістраваны пад артыкулам Украінскае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ,з чаго выглядала, што купленая маёмасьць згодна закону належыць да УАПЦ, а не да БАПЦ. Нягледзячы на гэта камітэт апрабававаў афармляць куплю на існуючы чартар да часу перарэгістрацыі. На сходзе ўкладчыкаў 8 сьнежня пастаноўлена назваць камітэт БНД—камітэт грамадзка-рэлігійнага цэнтру. Быў выбраны новы камітэт—старшыня Янка Ніхаёнак. Новаму камітэту даручана праводзіць направы ды ўпарадкаваць царкву й залю паводля прынятага разьмеркаваньня. Пастаноўлена даручыць царкоўнай радзе, каб апрацавала новы чартар прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ды правесьці новую рэгістрацыю, каб не падлягаць УАПЦ.



*Першая Божая служба й агульны царкоўны сход
у купленым грамадзкім будынку пры 401 Атлянтык Авэню, Бруклін, Нью Ёрк,
3 лістапада 1957 году.*

На гэтым сходзе Д.Клінцэвіч запрапанаваў выказаць падзяку кангрэсмэну за яго дапамогу. Кастусь праінфармаваў, што, паводля існуючага звычаю, за услугі куплі-прадажы маёмасьці абавязак плаціць узнагароду ляжыць на прадаўцу, а не пакупніку. Да гэтага ён ужо гутарыў прыватна з кангрэсмэнам Дорнам у гэтай справе й ён сказаў, што яго ўзнагарода ў вышыні 5 000 даляраў была ўключана ў прадажную царквы. М. Тулейка заявіў, што гэта Дорну было заплачана на паслугу зашмат грошай. «Каб мы пра гэта ведалі, пашлі-б да яго й прасілі-б, каб ён прынамсі зьменшыў напалову».

Тут Кастусь зазначыў, што цана была апрабаваная камітэтам, у тым ліку й самім Тулейкам. Дык якая розьніца каму пайшлі грошы? Зварочвацца да кангрэсмэна Ф.Дорна, каб ён зьменшыў ганарар, было-б паніжэньнем і асьмяшылі-б самыя сябе ў вачох дастойнага амэрыканскага палітыка. Тут паўстаў шум на залі. Кастусь пакінуў сход. Так і не пачуў ён нават дзякуй ні ад архіяпіскапа Васіля, ні ад прыхажанаў прыходу сьв. Кірылы Тураўскага за тое, што вывеў з дому масонаў ды ўвёў у дом беларускі, за які асабіста загварантаваў сплату пазыкі.

# 1958

Сустрэча Новага 1958 году, Калядныя сьвяты й ялінка для дзяцей прайшлі добра й прыемна. Гэтыя імпрэзы для агулу беларусаў сталіся нармальнай зьявай, бо акруговая ўправа заўсёды бязь ніякіх клопатаў, так думалі многія людзі, добра спраўлялася з сваім даручэньнем. Аднак, хтосьці мусіў усё прадбачыць, падрыхтаваць і выканаць.

У першай палове студзеня выйшла брашура «Byelorussians Independence day, March 25, 1918» (Беларускі дзень незалежнасьці, 25 сакавака 1918) Брашура ў асноўным была апрацаваная К.Мерляком у супрацоўніцтве з др. В.Тумашам і Ю.Станкевічам і была выдадзена ад імя Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Амэрыкі.

У першую чаргу брашура была разасланая ў большай колькасьці ў беларускія асяродкі ў сьвеце для распаўсюджаньня на мясцох у пляне падрыхтоўкі да 40-х угодкаў 25 сакавіка. На працягу студзеня, лютага й сакавіка брашура была разасланая У.Русаком і Г.Орсай у 12 краінаў сьвету.

У Амэрыцы выслана ўсім рэпрэзэнтантам кангрэсу й урадным установам, якія мелі вонкавыя дачыненьні ды падтрымоўвалі вызваленьне паняволеных народаў з-пад савецкага панаваньня. Індывідуальна брашура разыйшлася разам з запрошаньнем на акадэмію, прысьвечаную Дню незалежнасьці Беларусі.

2 лютага Прэзыдэнт Рады БНР М.Абрамчык прыбыў з Эўропы ў Нью Ёрк. На 8 лютага была скліканая нарада прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР. Першым пунктам нарады была інфармацыя М.Абрамчыка пра

дзейнасьць у Эўропе. Спачатку ён выразіў падзяку сакратарыяту Рады БНР за прадпрынятую акцыю падрыхтоўкі радыёперадачаў праз радыё Мадрыт у Гішпаніі, а ў асаблівасьці за абежнік у справе «Беларускай радыёперадачы з Гішпаніі», выдадзены сакратаром нутраных справаў К.Мерляком 2 студзеня 1958 году да прадстаўнікоў БНР і беларускіх арганізацыяў у вольным сьвеце.

Дзякуючы даўгім захадам М.Абрамчыка, Я.Сурвілы і В.Сянкевіча, міністэрства інфармацыі Гішпаніі прадставіла тэхнічную магчымасьць і прызнала пэўную суму грошаў на канцылярыйныя расходы, а на ўтрыманьне пэрсаналу (3 асобы) ўзяла на сябе Рада БНР. У абежніку быў заклік да беларускага грамадзтва дапамагаць грашова й дадзеныя, каму й куды пасылаць грошы. Згодна пастановы, фінансаваньне радыё Мадрыт будзе каардынаваць сакратарыят фінансаў Рады БНР В.Кажан.

Наступна прэзыдэнт паінфармаваў пра дзейнасьць у Эўропе, а ў асаблівасьці пра Парыскі блёк і дачыненьні з Амэрыканскім камітэтам вызваленьня. Тут выявіліся разыходжньні зь сябрамі блёку й Амэрыканскім камітэтам па поваду абмежаваньняў, у праграмах радыё «Вызваленьне».

Акрамя розных менш істотных справаў быў прыняты плян адзначэньня 40-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР, які прадставіў К.Мерляк, падаючы важнейшыя моманты сьвяткаваньня.

1. Ужо выйшла брашура «Беларускі Дзень Незалежнасьці, 25 сакавіка 1918».

2. 25 сакавіка малітву за Беларусь чытае Ўл. Васіль у сэнаце ЗША.

3. 31 сакавіка малітва за Беларусь —чытае а.Ф.Чарняўскі ў Палаце рэпрэзэнтантаў ЗША.

4. 29 сакавіка Богаслужба ў катэдры сьв.Патрыка—служыць А.Чарняўскі.

5. 30 сакавіка Богаслужба ў катэдры сьв.Кірылы Тураўскага —служыць архіяпіскап Васіль БАПЦ.

30 сакавіка ўрачыстая акадэмія ў гатэлі Білтмор з мастацкай часткай і прыняцём для гасьцей.

На прапанову прэзыдэнта пастаноўлена выдаць Маніфэст з нагоды 40-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР ад Ураду БНР, які будзе падпісаны ўсімі сябрамі прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР. Маніфэст быў выдадзены, але М.Абрамчык зьмяніў думку й Маніфэст падпісаў сам адзін.

На наступным паседжаньні 23 лютага 1958 г.разглядалася пастанова сяброўства ў Радзе БНР, згодна дапаўненьняў УІІ сэсіі Рады БНР. К.Мерляк выказаўся за пашырэньне рады для ўзмацьненьня грамадзка-палітычнай дзейнасьці ў краінах пасяленьня беларусаў. М.Абрамчык з гэтым не пагаджаўся, бо яму хадзіла не пра колькасьць, а пра якасьць, зазначаючы, што меншая колькасьць робіць менш памылак. Дзіўная аргумэнтацыя: паводля статуту, у сябры Рады БНР прымае сэктар Рады ў краіне пражываньня, а зацьвярджае прэзыдыюм Рады. Тут Абрамчык зрабіў засьцярогу, што новых сяброў заапрабуе старшыня Рады. К.Мерляк зьвярнуў увагу , што калі пастановы ня толькі сяброўства, але ўсе іншыя справы павінны быць апрабваны старшынёй Рады БНР, дык гэтая працэдура пярэчыць статуту Рады БНР і будзе паралізаваць усякую дзейнасьць сакратарыяту й сэктараў Рады, чакаючы на апрабату старшыні.

Па-другое, што Рада мусіць рабіць у выпадку неатрыманьня апрабаты ў належны час? Абрамчык, карыстаючыся рознымі прыкладамі, ня даў канкрэтнага адказу, але ўсім было зразумела, што ў сутнасьці ён меў на ўвазе дыктатуру. Была разгледжаная рэзыгнацыя Тулейкі ў выконваньні функцыі сакратара вонкавых дачыненьняў, адносна якое было пастаноўлена адлажыць на наступнае паседжаньне.

Падрыхтоўка адзначэньня 40-х угодкаў незалежнасьці Беларусі распачалася яшчэ ў восень 1957 году й праводзілася інтэнсыўна на працягу 3 месяцаў. У гэтым часе Кастусь каардынаваў падрыхтоўку із сваёй канцыляры пісьмова й тэлефанічна праз асабістыя канфэрэнцыі ў Вашынгтоне й Нью Ёрку. Дакладная, своечасовая падрыхтоўка прынесла належныя вынікі.

З датай 15 сакавіка 1958 году старшыня БАЗА Нью Ёрку К.Мерляк атрымаў прывітаньне ад Прэзыдэнта ЗША Двайт Д.Айзэнгаўэра.

The White House
Washington
The assistant to The President

March 15, 1958,
148/58

Dear Mr.Mierlak:
The President has asked me to convey to you and to the members and friends

of the Byelorussian-American Associatian his greetings and good wishes for the success of your convocation.

The enterpricing spirit and many skills of your citizens of Byelorussian origin have made a substancial contribution to the greatness of our country.

Although celebration this year is being held in a period of peace, it is necessary to be ever on guard to the dangers that threaten the peace in today's anxious world. In the effort to keep our country strong and prepares, we know our citizens of Byelorussian origin are doing their characteristically loyal share.

Sincerely,
Shairman Adams

Mr. Konstanty Mlerlak, President
Byelorussian -American Association, Inc.
33 Norfolk sreet
New York 2, New York.

Зь бегам часу былі атрыманыя праклямацыі, у якіх дзень 25 сакавіка адвяшчаўся «Днём беларускае незалежнасьсці» ў штатах Нью Ёрк, Нью Джэрсі, Родэ Айленд, Мэрылянд, Агаё, Мічыган і Ільліноіс.

24 сакавіка 1958 году беларуская дэлегацыя складзе архіяпіскапа Васіля БАПЦ і старшыні БАЗА Нью Ёрку К. Мерляка была прынятая віцэ Прэзыдэнтам ЗША Рычардам Ніксанам на адмысловай аўдыеныці. Аўдыецыя адбылася ў кабінэце віцэ-прэзыдэнта ЗША ў Вашынгтоне. У гэты дзень Уладыка Васіль прачытаў малітву ў сэнаце перад адкрыцьцём паседжаньня.

Гэтага-ж дня мэр гораду Нью Ёрку Робэрт Ф.Вагнэр прыняў дэлегацыю БАЗА, узначаленую старшынёй магістрам М.Кунцэвічам, якому уручыў праклямацыю Дня 25 сакавіка—«Дня беларускае незалежнасьці ў горадзе Нью Ёрку».

Так як і плянавалася, 29 сакавіка адбылася Богаслужба ў катэдры сьв. Патрыка, а 30 сакавіка ў катэдры сьв.Кірылы Тураўскага. Урачыстая акадэмія распачалася а гадзіне 3-й папоўдні ў Білтмор гатэлі. Яе адкрыў старшыня БАЗА Нью Ёрку К.Мерляк кароткаю прамоваю ды чытаньнем прывітаньняў прэзыдэнта ЗША Д. Айзэнгаўэра. Наступна прадставіў прысутным прэзыдэнта БНР на чужыне М.Абрамчыка, які выступіў з прамоваю. Пасьля выступалі зь пераплётам мастацкіх выступленьняў: кангрэсмэн Францішк Е.Дорн, кангрэсмэн Я.Даллей, др. Кэннэт Кольгроў прафэсар унівэрсытэту ў Ільліноіс, судзьдзя Ждозэф А.Кокс і старшыня Канфэдэрацыі вызваленьня кангрэсмэн О.К.Армстронг.



*Віцэ-прэзыдэнт Задзіночаных Штатаў Амэрыкі Рычар Ніксан прымае беларускую дэлегацыю ў сваім кабінэце ў Капітолі 24 сакавіка 1958 г. у Вашынгтоне. Зьлева направа: сп. Канстанцін Мерляк, яго Прэасьвяшчэнства архіяпіскап БАПЦ Васіль, яго Эксцэленцыя віцэ-прэззыдэнт ЗША Рычард Ніксан, сэнатар ад Нью Ёрку Ірвінг М.Айвс і пастар сэнату др. Фэдэрык Браўн Гаррыс.*



*Старшыня Галоўнае Ўправы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў ЗША адкрывае акадэмію з нагоды 40-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі 30 сакавіка 1958 г. ў гатэлі Білтмор, Нью Ёрк.*



*Прысутныя на акадэміі з нагоды 40-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі 30 сакавіка 1958 г. у гатэлі Білтмор, Нью Ёрк.*

Пасьля прачытаньня праклямацыяў К.Мерляк прадставіў прысутным удзельнікаў I Усебеларускага Кангрэсу й доўгалетніх беларускіх дзячоў: Я.Гладкага, генэрала Ф.Кушаля, др.Я. Станкевіча, М.Міцкевіча й а.Ф.Данілюка. Акадэмія была ўшанаваная сваею прысутнасьцю 6-мі япіскапамі й 44-мя прадстаўнікамі амэрыканскіх афіцыйных установаў і прастаўнікамі нацыянальных арганізацыяў Амэрыкі. Пісьмовыя прывітаньні былі атрыманыя ад палітычных дзеячоў, амэрыканскага грамадзтва, урадаваых установаў, замежных амбасадаў, прыватных асобаў больш за сотню. Ад беларускіх арганізацыяў атрымана 22 прывітаньні з 9 краінаў.

Пасьля заканчэньня акадэміі адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну госьці былі запрошаныя на прыняцьцё.

31 сакавіка а.Ф.Чарняўскі прачытаў у палаце рэпрэзэнтантаў малітву з нагоды 40-х угодкаў незалежнасьці Беларусі беларускую дэлегацыю а.Чарняўскага й В.Станкевіча (старшыню ЗБМА), прыняў у Вашынгтоне кангрэсмэн Ф.Дорн.

40-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР былі шырока адзначаныя ў Амэрыканскім кангрэсе, дзе падчас паседжаньняў прамаўлялі 18 сэнатараў і кангрэсмэнаў.

З нагоды 40-х угодкаў незалежнасьці Беларусі былі памешчаныя шырэйшыя зацемкі й артыкулы ў розных газэтах:

«Народна Воля» №14, 3 квітня 1958 , Скрентон, П.А .«Роковіны 40-річя Білоруськой Суверенности».

«Россия», №6310 13 марта, 1958. Нью Ёрк. «К сорокалетию «Независимости» Белоруссии».

«Свобода», 19 квітня 1958 «Синьока сестра Украіни».

"Jednota Organ Pravej Katolickej Slovenskej Jednoty, 26 Marca 1958, Middletown PA. "Jubileum Bratov Bielorusov".

"New York Times" March 31, 1958, "Free Byelorussia of 1918 cited here"

"World Telegram & Sun, New York, March 28, 1958, "Byelorussian Unit to celebrate."

"Nowy Swiat", 29 Marca 1958, "Bialoruskie Swiento Niepodleglosci".

"Swoboda" Ukrainian Weekly, * 65, April 5, 1958 " Professor hopes for independence of Ukraine and Byelorussia".

"Swoboda" Ukrainian weekly, No 60, March 29, 1958 "40 -th Anniversary or Declaration of Independence of Byelorussian Republic".

Пра 40-я ўгодкі БНР у Нью Ёрку газэта «Бацькаўшчына № 402-403 за 2-красавіка 1958 году пісала : «Трэба сказаць, што вельмі шмат да ўдачаў сакавіковых урачыстасьцяў прычыніла (і будзе яшчэ прычыняцца) выданая нядаўна Беларуска—Амэрыканскім Задзіночаньнем кніга дакумэнтаў «Незалежнасьць Беларусі 25 сакавіка, 1918 г.», а таксама энэргічная падрыхтоўка сьвяткаваньня з боку старшыні акруговае ўправы БАЗА ў Нью Ёрку К.Мерляка ды іншых сяброў БАЗА».

А вось «Голас Царквы» №7 за красавік 1958 году пісаў: «..і мы запраўды шчасьлівыя, бо толькі ў апошні час мы самі пераджылі два такія цуды, як праяўленьне ласкі й любові Божае да нас. Першым зь іх было прыдбаньне нашага слаўнага кафэдранальнага сабору, аб якім мы маглі толькі марыць, другім—нашая малітва ў сэнаце Злучаных Штатаў Амэрыкі. Гэты апошні цуд праявіўся ў тым, што мы маліліся за нашую любую пакутніцу Маці—Беларусь у Амэрыканскім сэнаце».

На паседжньні прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР прэзыдэнт Абрамчык інфармаваў пра сваю дзейнасьць па лініі Парыскага блёку й пра сытуацыі ў беларускіх асяродках, якія ён наведаў у Амэрыцы й Канадзе. Абмяркоўваючы справу «рэха Сакавіка» забіралі голас А.Шукелайц, А.Адамовіч, В.Кажан, Н.Арсеньнева й М.Абрамчык, які зацеміў: «.. што да вялікае ўдачы сёлетняга сьвяткаваньня Сакавіковага Дню спрычынілася бясспрэчна вельмі добрая тэхніка арганізаваньня, выданьне брашуры, Маніфэста, а таксама ў вялікай мэры праца, укладзеная ў ладжаньне сьвята сп.Мерляком. Сьвяткаваньне 40-х угодкаў сакавіковага Акту мела вялікае рэха ўва ўсім сьвеце».

А.Стагановіч пытаўся, чаму адносіны да др. Я.Станкевіча, які надалей праводзіць разбуральную справу сярод беларускага грамадзтва не такія самыя, як і да іншых менш шкодных сяброў Рады БНР. Адказ А.Адамовіча й М.Абрамчыка не задаволіў Стагановіча й справу пусьцілі на самацёк.

На паседжаньні 1 травеня прэзыдэнт Абрамчык інфармаваў пра дэмаршы ў Вашынгтоне, якія рабілі разам з прэзыдэнтам УНР Лівіцкім

у справе супрацоўніцтва з амэрыканскім камітэтам, дзе выявіліся розныя погляды й разыходжаньні як у дзяржаўным дэпартаменце, так і ў амэрыканскім камітэце. М.Абрамчык таксама паведаміў аб яго захадах адносна беларускай мовы ў перадачах «Голас Амэрыкі»ды запэўніў ужо другі раз, што перадачы хутка распачнуцца ў беларускай мове. Тутака нават накінулі лісту магчымых кандыдатаў на працу ў «Голасе Амэрыкі».

Сакратар унутраных справаў К.Мерляк зрабіў справаздачу з праведзенай рэарганізацыі Рады БНР, зь якой выявілася, што сэктары або прадстаўніцтвы Рады БНР аформленыя й пры добрай волі, могуць праводзіць грамадзка-палітычную дзейнасьць. Сэктары ёсьць у Англіі, Аўстраліі, Аргентыне, Бельгіі й Канадзе. Прадстаўніцтвы ў Італіі, Гішпаніі й Бразыліі. Заарганізаваныя падсэктары ў Дэтройце, Кліўлендзе, Нью Брансьвіку. Падсэктар у Чыкага вымагае палітычнага накіраваньня, каб мог вясьці пазытыўную працу. У асноўным, сэктары ЗША знаходзяцца на ўзроўні свайго заданьня. Сэктар у Францыі патрабуе дапамогі ў арганізацыі, а сэктар у Нямеччыне з пункту гледжаньня арганізацыйнага не існуе. Нягледзячы на тое, што ў Нямеччыне бальшыня радных працуе, дзякуючы Радзе БНР, нідзе й ніхто сяброўскіх складак ня плаціць. Да гэтага яны ня лічацца з прэзыдыюмам і сакратарыятам Рады БНР. Яны нават не зарганізвалі адзначэньня 25 Сакавіка ў ніякай форме. На просьбу К.Мерляка разьведаць справу адшкадаваньня, якое мае выплачваць урад Нямеччыны пацярпеўшым у часе вайны на прымусовых працах, нічога не зрабілі й нават не адказалі. А.Адамовіч дадаў, што ў Мюнхэне вытварылася нейкая «мяшчанская» атмасфэра, якую трэба скалыхнуць, а гэта можа зрабіць толькі прэзыдэнт Абрамчык

Падчас разгляду пляну працы на прышлаць К.Мерляк зазначыў, што прэзыдэнт не пакідае «мэмо» аб сваіх «кантактах» і праведзеных канфэрэнцыях, аб тым, якія ды зь кім парушаліся справы. Падчас адсутнасьці прэзыдэнта, будзе немагчыма працягваць працу надалей, зазначаючы, што ён такія «мэмо» піша для сучаснага выкарыстаньня й для архіву. Абрамчык сказаў, што яго «кантакты» застаюцца за ім. Таксама была парушуна справа фонду на фінансаваньне сталага прадстаўніцтва БНР у Вашынгтоне, якое ўзначаліць прэзыдэнт М.Абрамчык.

Прэзыдэнт М.Абрамчык выехаў у Эўропу 21 травеня 1958 году. Гадавы сход БАЗА акругі Нью Ёрку адбыўся 15 чэрвеня. Абшырную й

дакладную справаздачу зрабіў уступаючы старшыня К.Мерляк, у якой прааналізаваў сацыяльны стан і актыўнасьць сяброў арганізацыі, дэманструючы статыстычныя дадзеныя. У новую ўправу акругі Нью Ёрку былі выбраныя на старшыню Я.Пазьняк, М.Тулейка, Ю.Станкевіч. Д.Клінцевіч і А.Міцкевіч.

Канфэрэнцыя канфэдэрацыі этнічных групаў Амэрыкі адбылася 30 чэрвеня й 1 ліпеня ў Вашынгтоне з удзелам Беларуска—Амэрыканскага Задзіночаньня Амэрыкі, якое прадстаўляў К.Мерляк.

Канфэдэрацыя паўстала ў 1956 годзе з мэтай аб'яднаць усе арганізацыі нацыянальных эміграцыяў, каб стварыць моцны палітычны блёк, які-б рабіў уплыў на нутраную палітыку ЗША, а ў асаблівасьці на палітыку вызваленьня народаў з-пад савецкага панаваньня. У канфэрэнцыі ўзялі ўдзел 37 арганізацыяў і больш за 50 прадстаўнікоў, ня лічачы гасьцей. На канфэрэцыі выступалі прадстаўнікі Рэспубліканскай і Дэмакратычнай партыяў ЗША, кангрэсу й адміністрацыі. На канфэрэнцыі браў голас К.Мерляк у справе палітыкі вызваленьня, беларускай мовы ў «Голос Амэрыкі» і ў справе тэлеграмы Прэзыдэнту ЗША Д.Айзэнгаўэру. Старшынёю надалей застаўся судзьдзя Блеір Гунтэр, а дырэктарам Пауль Дэк. Рада канфэдэрацыі складалася са старшыняў кожнае арганізацыі з адным голасам ад кожнае нацыянальнае групы.

На паседжаньні прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР 21 чэрвеня між іншымі рознымі справамі разглядалася справа «фундацыі імя Пётры Крэчэўскага». Для афармленьян фундацыі пастаноўлена паклікаць камісію для афіцыяльнага афармленьня ў складзе: др.В.Тумаш-старшыня й сябры: А.Адамовіч, Н.Арсеньнева, В.Кажан, К.Мерляк і Я.Запруднік з даручэньнем зрэалізаваць гэтую справу.

III Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі адбылася 30-31 жніўня й 1 верасьня 1958 году ў Нью Ёрку. Сустрэчу ладзіла Беларуска—Амэрыканскае Задзіночаньне Амэрыкі—старышня М.Кунцэвіч і Згуртаваньне Беларусаў Канадаы — старшыня А.Маркевіч.

Сустрэча прайшла паводля раней устаноўленай праграмы 30 жніўня. Быў таксама вялікі баль з конкурсам беларускае нацыянальнае вопраткі. 31 жніўня адбылася ўрачыстая літургія з высьвячэньнем катэдральнага сабору сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне й супольны абед у залі Беларускага грамадзкага цэнтру. Пасьля абеду адбыўся агульны сход з канцэртам. Старшыня сходу прывітаў прысутных ды

прачытаў прывітаньні ад губэрнатара штату Нью Ёрк А.Гарімана й мэра г.Нью Ёрк Р.Вагнэра й ад сэнатара Кэнэр Б.Кітынг. Рэфэрат на тэму «БССР—фікцыя Масквы» прачытаў прафэсар А.Адамовіч. Пасьля прадстаўленьня прысутных гасьцей, беларускіх дзеячоў і старшыняў беларускіх арганізацыяў былі прынятыя «Зварот да беларусаў на Бацькаўшчыне» й рэзалюцыя-пратэст супраць гэнацыду беларускага народу, русыфікацыі й каляніяльнай палітыкі, праводжанай расейскімі камуністамі ў «сувэрэннай» Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы. Пасьля гэтага адбыўся ўдалы вялікі канцэрт. 1 верасьня адбылася нарада прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў ды разьвітаньне да наступнае сустрэчы.

У гэтым самым часе адбывалася II Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Саўт Рывэры, арганізаваная Беларуска-Амэрыканскім Дапамогавым Камітэтам і Беларуска-Нацыянальным Аб'еднаньнем у Канадзе. На нарадах падчас сустрэчы ў Саўт Рывэры былі прынятыя 2 рэзалюцыі: дэкларацыя, асьведчаньне, пасланьне да Прэзыдэнта ЗША й два паведамленьні.

На ўвагу заслуговаюць наступныя мамэнты, якія выглядалі важныя з пункту гледжаньня беларускай нацыянальнай справы: паведамленьне аб утварэньні каардынацыйнай камісіі беларускіх арганізацыяў ЗША й Канады дзеля ўзгадненьня супольных выступаў у беларускіх справах перад вольным сьветам і аб утварэньні Царкоўнае Рады Беларускай Праваслаўнай Царквы ў складзе а.архімандрыта У.Фінкоўскага, а.пратаярэя М.Лапіцкага й а.В.Сагайдакіўскага. У дэкляраціі заклікалася да ўтварэньня супольнага воргану для абароны беларускай справы. Гэтую дэклярацыю падпісалі аж 13 арганізацыяў. Асьведчаньне адносна падзелу Беларусі акупантамі й пасланьне да Прэзыдэнта ЗША падпісалі 15 арганізацыяў.

Калі-б хто-небудзь прачытаў у газэце «Беларускі Голас», выдаванай у Таронта, № 49 за верасень і № 50 за кастрычнік 1958 г., у якой быў надрукаваны матэрыял з прабегу сустрэчы й прынятыя пастановы, то ня ведаючы сапраўднага стану беларускай эміграцыі, напэўна падумаў-бы, што гэта адна з найбольшых і дзейных эміграцыяў у ЗША й Канадзе. Той, хто мала ведаў пра беларусаў у Амэрыцы, напэўна падумаў-бы: хай крывічы з сваёю Радаю БНР схаваюцца перад такою сілалю зарубежнікаў, на чале якое стаіць БЦР. Але гэта былі-б толькі думкі, якія, як аказалася пазней, і засталіся думкамі.

11 верасьня ў Нью Ёрку адбыўся сход камісіі Лігі вызваленьня народаў СССР (Парыскі блёк). На парадку дня сходу была справаздача, перавыбары й розныя справы. Агульную справаздачу зрабіў др.К. Панькіўскій, фінансавую—К.Мерляк, а сакратарыяту Г.Гаратуньян. У новую ўправу былі выбраныя Г.Гаратуньян—старшыня, М.Воскобійнік—заступнік старшыні, К.Мерляк—сакратар і В.Глазкоў—скарбнік. У дыскусіі выявілася, што з цэнтраляй Лігі няма ніякай лучнасьці й нічога няведама, што робіцца ў Эўропе. Пастаноўлена гэтую справу выясьніць.

На нарадзе 31 кастрычніка разглядалі лісты, атрыманыя ад старшыні Лігі М.Абрамчыка й ад сакратара Лігі Таўмасьяна. З гэтых лістоў даведаліся, што камісія можа рабіць ўсё тое, што будзе карыснае для вызваленьня народаў Савецкага Саюзу. Толькі абавязкова наперад узгодніць справы з прэзыдыюмам Лігі ў Францыі. Такая ўстаноўка практычна пазбаўляла й перашкаджала ў дзейнасьці із-за часу патрэбнага на апрабаваньне праекту, а нават магчымым было, што апрабаваньня ня будзе па поваду разыходжаньняў між сябрамі прэзыдыюму Лігі, што вельмі часта здаралася. На гэтым паседжаньні была ўстанолена канкрэтная працэдура лучнасьці й дзеяньня, а таксама ўстаноўлена, што нарады будуць адбывацца ў апошнюю пятніцу кожнага месяца.

На паседжаньні прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР 14 верасьня спачатку заслухалі інфармацыі А.Адамовіча зь яго ўдзелу ў канфэрэнцыі ў Інстытуце па вывучэньні СССР, пра дзейнасьць Парыскага блёку й пра беларусаў у Нямеччыне. Адамовіч падаў склад рэдкалегіі газэты «Бацькаўшчына». Адказны рэдактар др.Ст.Станкевіч, А.Марговіч У.Цьвірка й П.Урбан—сябры рэдакцыйнай калегіі. У справе прадстаўніцтва ў Вашынгтоне К.Мерляк праінфармаваў, што кангрэсмэн Дорн залагодзіў справу візы для М.Абрамчыка на сталы прыезд ў ЗША без патрэбы прыватнай пастановы Амэрыканскага кангрэсу. У.Русак, старшыня камісіі па збору грошаў на фонд прадстаўніцтва, паведаміў, што сабрана й задэкляравана нямалая сума грошаў. На гэтым паседжаньні разглядалі царкоўныя справы з удзелам Уладыкі Васіля й рэфэрэнта рэлігійных справаў Б. Данілюка: становішча Ўладыкі Сергія ў Аўстраліі й пераход а.Лапіцкага да БАПЦ, (бо пасьля сьмерці экзарха Міхаіла, Саўтрывэрскаму прыходу прыдзецца плаціць ў Грэцкую епархію). Уладыка Васіль парушыў справу перакладу Бібліі

на беларускую мову, (пераклад меўся рабіць др.Я.Станкевіч па заказу др.Гітліна, цьвердзячы, што перклад будзе недарэчны.) Заяву др.Я.Станкевіча аб выхадзе яго з Рады БНР прынялі да ведама.

Агульны сход сяброў сэктару Рады БНР ў Амэрыцы адбыўся 19 кастрычніка 1958 году. Гэта быў адзін із найцікавейшых сходаў палітычнае эміграцыі. Выступленьні радных сьведчылі аб іхніх поглядах у розных дзялянках грамадзкага жыцьця ды зацікаўленасьці ў палітычнай актыўнасьці. Старшыня сэктару зазначыў, што справаздача абыймае 4-х гадовы перыяд дзейнасьці. З незалежных прычынаў пасьля перашага пэрыяду агульны сход не адбыўся ў восень 1956 году. Справаздача падразьдзялялася на пэрыяды спэцыяльнага характару дзеяньня: 1955 год быў годам рэарганізацыі, 1956 — прайшоў пад знакам УІІІ сэсіі Рады БНР, 1957 — год, у якім быў куплены Беларускі грамадзкі цэнтр і царква, 1958 год быў годам 40-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР.

У дыскусіі былі выказаныя думкі й заўвагі featureнага характару. Вось некаторыя зь іх.

Я.Запруднік: «З справаздачы старшыні выглядае, як быццам-бы толькі ён (Мерляк) выконваў усе працы, і што ён сам змог паставіць сэктар на вышыню свайго даручэньня».

М.Тулейка: «Да прыняцьця кіраўніцтва Мерляком сэктар Рады БНР стаяў на высокім узроўні, аб чым сьведчыць папярэдні стан касы».

М. Міцкевіч: «Я ня бачу паважных дасягненьняў у параўнаньні з другімі нацянальнасцьямі.

Я. Ніхаёнак: «Я не бачу асобаў, што працавалі ў Радзе й паза Радай»

У. Русак: «Каб параўнаць дзейнасьць сэктару Рады ў ЗША з мінулага часу да цяперашняга, прапаную прачытаць пратакол і справаздачу з апошняга сходу. Справаздача К.Мерляка менш кажа аб ягонай дзейнасьці, чымся яна была ў рэчаіснасьці.

А.Шукелайц: «Сп. Мерляк, дзякуючы яго прыватным магчымасьцям, сваёй ініцыятывай і энэргіяй змог паставіць на высокі ўзровень, папераджаючы нават многа другіх нацыянальнасьцей».

Прэзыдыюм сэктару быў выбраны ў наступным складзе: К.Мерляк —старшыня, Ф.Родзька—заступнік старшыні, У. Русак—сакратар і А.Протас—скарбнік.

Былі яшчэ парушаныя справы сталага прадстаўніцтва Рады БНР у Вашынгтоне, разыходжаньні ў падсэктары ў Нью Брансьвіку, Бела-

рускім грамадзкім цэнтры й царкве. Новаму прэзыдыюму было даручана усё палагодзіць. Набліжаўся 1959 год.

## 1959

К канцу 1958 году ў Нью Ёрку была заснаваная новая арганізацыя з назовам Беларуска-Амэрыканскі Зьвяз. У камунікаце Зьвязу сказана: «На арганізацыйнай зборцы беларускага актыву розных палітычных напрамкаў створана новая арганізацыя дзеля злучэньня ўсіх беларусаў. Урад Зьвязу складаецца з др.М.Шчорса, як старшыні, др.Я.Станкевіча, як віцэ-старшыні, мгр. Л.Галяка як сакратара й Л. Брылеўскай, як сябры ўраду. Абшырная дэклярацыя Зьвязу пачыналася:

«Груповае разьбіцьцё беларускага грамадзтва на эміграцыі, міжгруповыя сваркі, арганізацыйны партыкулярызм улучна з непатрэбным дубляваньнем арганізацыяў і дзейнасьці, пасунутая да хваравітых памераў, неталеранцыя да інакшдумаючых ды антыдэмакратызм у нутраных дачыненьнях бяз сумніву прынясьлі й далей прыносяць аграмадныя шкоды беларускай справе ды паважна аслабілі беларускі нацыянальны патэнцыял у Амэрыцы й іншых краінах пасяленьня беларускай эміграцыі.

А дзеля гэтага паклікаецца да жыцьця агульная, сапраўды дэмакратычная беларуская арганізацыя з галоўнай мэтаю вызваленьня Беларусі».

У актыве розных палітычных напрамкаў у Зьвязе ня было больш людзей паза яго ўрадам. У даным выпадку палітычнага напрамку ніхто не рэпрэзэнтаваў, хіба толькі свайго асабістага палітычнага погляду, зь якім ніхто не лічыўся, бо яны ў сапраўднасьці былі эгаістычныя індывідуалістычныя, не рэальныя, а перадусім не зразумелыя. І вось гэтыя людзі сабіраліся аб'яднаць, пашыраць супрацоўніцтва, увесьці дэмакратызм, талеранцыю ўнутры беларускага грамадзтва ў вольным сьвеце, і хто-б падумаў, што ў людзей на погляд разумных магла быць такая фантазія.

У газэце «Беларускі Голас» было пададзена паведамленьне наступнага зьместу.

«Высьвячэньне япіскапа Беларускай Аўтакефальнай Царквы.

1-га лютага г.г. ў г. Чыкаго ў ЗША быў хіратанізаваны на Япіскапа

Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы архімандрыт Уладзімер Фінкоўскі—былы адміністратар Беларусаке Праваслаўнае царквы з 1942 году.

Хіратанізацыю выканаў архіяпіскап Украінскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы Грыгоры й япіскап Вініпэгскі й Канадзкі Мікалай.

Пасьля хіратоніі адбылося прыняцьцё, ладжанае царкоўным Камітэтам Праваслаўнай Беларускай Парафіі сьв.Юрыя ў Чыкага й Беларуска-Амэрыканскай Нацыянальнай Радай».

З высьвячэньнем на япіскапа архімандрыта У.Фінкоўскага утварылася дзьве Аўтакефальныя Беларускія Праваслаўныя Царквы, адна, узначаленая япіскапам Фінкоўскім, які прыняў тытул япіскапа Менскага й ўсяе Беларусі, а другая, узначаленая украінцам архіяпіскапам Сергіем (Охонко) й архіяпіскапам Віленскім — (В.Тамашчыкам).

Цікава, хто стаяў за гэтай царкоўнай зьдзелкай? Бо, як ведама, Царкоўная Рада Беларускай Праваслаўнай царквы, утвораная ў Саўт Рывэры ў верасьні 1957 году была супраць хіратанізацыі ў сан япіскапа архімандрыта Ўладзіміра (Фінкоўскага), а тым больш БАПЦ. Хіба ўкраінскія япіскапы бяз дапамогі беларусаў Чыкага самі гэтага не зрабілі-б? Як аказалася пазьней, беларусы Чыкага не кіраваліся патрэбамі беларускае нацыянальнае справы й, як выглядае , не здавалі сабе справы, што з гэтага можа выйсьці. Але-ж нехта добра ведаў, каму гэта будзе на карысць.

Сустрэча новага 1959 году ўпершыню адбылася ўзалі беларускага грамадзага цэнтру пры Атлянтык авэню ў Брукліне. На гэтай сустрэчы беларусы віталі дастойнага госьця зь Бельгіі айца Робэрта ван Каўэлярта дэ Ўільс. Айцец Робэрт апякун беларускіх студэнтаў у Лювэнскім унівэрсытэце ў Бельгіі. Перад гэтым ён змог наведаць беларускія асяродкі ў Кліўлендзе, Дэтройце, Чыкага й Таронта ў Канадзе. На гэтым вечары ён меў нагоду шырэй запазнацца зь беларускім грамадзтвам у Нью Ёрку.

41 угодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі былі арганізаваныя акруговай управай БАЗА—старшыня Я.Пазьняк. У нядзелю 22 сакавіка сьвяткаваньне распачалося паўгадзіннай радыёперадачай, прысьвечанай 25 Сакавіку. Літургію й малебен адправілі Ўладыка Васіль ў саслужэньні саборнага духавества ў катэдральным саборы сьв.Кірылы Тураўскага. Гэтага-ж дня папалудні ў залі «Стайвэсант гай Скуль» у Мангэтане адбыўся ўрачысты сход з канцэртам. У

гэтым годзе малітву за Беларусь у Амэрыканскім кангрэсе прачытаў а.др.Ул.Тарасевіч, настаяцель вуніяцкай царквы Спаса ў Чыкага.

Губэрнатары штатаў Нью Ёрку й Нью Джэрзі праклямавалі дзень 25 сакавіка «Беларускім днём незалежнасьці» ў сваіх штатах. 41-я ўгодкі беларускай незалежнасьці шырока былі адзначаныя выступленьнямі сэнатараў і кангрэсмэнаў у Амэрыканскім кангрэсе ў Вашынгтоне.

УІІІ кангрэс Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня адбыўся 30—31 травеня 1959 году ў Нью Ёрку пад кіраўніцтвам прэздыюму: А.Адамовіч—старшыня, М.Тулейка—заступнік старшыні, А.Шукелайц і К. Мерляк—сакратары. Дыскутаваліся справаздачы зь дзейнасьці ўступаючай Галоўнай Управы БАЗА. Шырока разглядаліся справы беларускага школьніцтва, справа рэгулярнага прэсавага воргану (ў 1959 годзе выйшла толькі два нумары газэты «Беларус») ды іншыя справы рознага характару.

Прабег кангрэсу быў належна схарактэрызаваны ў «Прэсавым камунікаце»

«Прадстаўнікі Беларуска—Амэрыканскага Задзіночаньня, якія рэпрэзэнтавалі аддзелы БАЗА ў Нью Ёрку, Джэрсі Сіты, Саўт-Рывэр, Нью Брансвік, Стэнфорд, Спрынгфілд, Кліўленд, Дэтройт, Лёс Анджэлес, сабраліся 30-31 травеня ў залі беларускага грамадзкага цэнтру на УІІІ кангрэс БАЗА. Адначасна былі адзначаныя дзесятыя ўгодкі існаваньня гэтай арганізацыі. Галоўным пунктам кангрэсу было абмеркаваньне цяперашняга палітычнага палажэньня й справы вызваленьня паняволеных народаў з-пад савецкага панаваньня. У выніку абмеркаваньня была прыянта рэзалюцыя, у якой зьвяртаецца ўвага на практыку народазабойства, праводжаную расейскімі камуністамі ў Беларусі. Рэзалюцыя дамагалася таксама ад Задзіночаных Штатаў і цэлага вольнага сьвету пазытыўнай палітыкі вызваленьня паняволеных народаў.

Дэлегаты кангрэсу выслалі прывітальныя тэлеграмы прэзыдэнту Айзэнгаўэру, віцэ-прэзыдэнту Ніксану, губэрнатару штату Нью Ёрк і бургамістру гораду Нью Ёрк».

Справаздача за двухгадовы пэрыяд арганізаацыі была зробленая дасюлешнім старшынёй Галоўнай Управы БАЗА Міколам Кунцэвічам і ягонымі супрацоўнікамі. Былой Галоўнай Управе быў вынесены абсалюторыюм з падзякай праз аклямацыю. Галоўная Ўправа на нас-

тупную кадэнцыю была выбраная ў наступным складзе: сп.К.Мерляк —страшыня, Ф.Бартуль—першы заступнік старшыні, В.Пляскач, —другі заступнік старшыні, Натальля Кушэль —сакратар, П.Ганэцкі—скарбнік, В.Шчэцька—рэфэрэнт культурных справаў, Ніна Стома—рэфэрэнт сацыяльных справаў.



*Галоўная Ўправа Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў ЗША, кадэнцыя 1959—1961*

*Зьлева направа: Васіль Шчэцька, Франьціш Бартуль, Кастусь Мерляк, Натальля Кушэль (Арсеньнева), Ніна Стома й Пётр Ганэцкі, адсутны Васіль Пляскач.*

У нядзелю 14 верасьня ў залі Карнэгі гол ў Нью Ёрку адбылася вялікая антыкамуністычная маніфэстацыя, у якой узялі ўдзел групы 18 нацыянальных арганізацыяў Цэнтральна-Усходняй Эўропы, у тым ліку й беларусы з актыўным удзелам Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня. У ганаровы прэзыдыюм былі запрошаныя архіяпіскап Васіль БАПЦ, К. Мерляк—старшыня БАЗА, сп-ні Н.Кушэль і В.Баруль—ад Беларускіх Жанок і Г.Орса ад Згуртаваньня Беларускай Моладзі.

21 чэрвеня 1959 году адбылося царкоўнае сьвята Сёмуха й высьвячэньне купленай зямлі пад магільнік у Нью Брансвіку, Нью Джэрсі. Пасьля літругіі й вячэрні Ўладыка Васіль, мітрафорныя пратаярэі Сьцяпан і Хведар ды ўсе прысутныя паехалі на высьвячэньне Беларускага нацыянальнага магільніка Адтуль ўсе прысутныя паехалі на супольны абед, які распачаўся благаславенставам Уладыкі Васіля. У часе абеду прамаўлялі: сп.П.Кажура—старшыня царкоўнае рады. сп. К. Мерляк— старшыня Галоўнае Управы БАЗА, др. В.Войтэнка, адвакат Аляксандр, і ў канцы прамовіў Уладыка Васіль, пашыраючы думку сп.К.Мерляка аб вялікім значэньні магільніка для беларусаў і аб нацыянальна-грамадзкіх дасягненьнях.

## Тыдзень Паняволеных народаў

22 чэрвеня 1959 году Амэрыканскі кангрэс прыняў рэзалюцыю, у якой упаўнаважвалі прэздыдэнта ЗША абвесьціць трэці тыдзень ліпеня 1959 году «Тыднем Паняволеных народаў» ды заклікаць народ Злучаных Штатаў Амэрыкі адзначыць гэты тыдзень адпаведнымі ўрачыстасьцямі й дзейнасьцю.

Адначасна Прэзыдэнт упанаважваўся выдаваць падобную праклямацыю кожны год, да таго часу, пакуль для ўсіх паняволеных народаў сьвету ня будзе здабытая свабода й незалежнасьць.

У гэтай рэзалюцыі Беларусь лічылася паняволенай краінай разам з 21-й краінай, якія знаходзіліся пад панаваньнем камуністычнае Расеі. Тут трэба зьвярнуць увагу, што паняволеныя не Савецкім Саюзам, а камуністычнай Расеяй, ня ўключаючы расейскі народ у лік паняволеных. На падставе гэтай рэзалюцыіі й ў яе духу Прэзыдэнт ЗША Д.Д. Айзэнгаўэр праклямананаваў 17 ліпеня 1959 году, што 19 ліпеня пачынаецца «Тыдзень паняволеных народаў» у Злучаных Штатах Амэрыкі».

Рэзалюцыя й праклямацыя ўзварушыла эміграцыю ўсіх паняволеных народаў, заахвочваючы да актыўнай дзейнасьці ды ўзьнікла надзея на хутчэйшае вызваленьня кожнага паняволенага народу. З гэтай нагоды Ліга вызваленьня народаў СССР (Парыскі блёк) выдала ў Парыжы 30 ліпеня адпаведную дэклярацыю. Таксама адпаведны Маніфэст выдала Асамблея паняволены эўрапэйскіх народаў (паза СССР

Ад гэтага часу кожны год Прэзыдэнт ЗША выдаваў праклямацыі, абвяшчаючы трэці тыдзень ліпеня «Тыднем Паняволеных народаў», які адзначаўся адпаведнымі ўрачыстасьцямі й дэманстрацыямі,у якіх заўсёды бралі ўдзел беларусы ня толькі ў Амэрыцы, але ўсюды, дзе існавалі камітэты Тыдня Паняволеных народаў, якія кардынавалі падрыхтоўку сьвяткаваньня.

На паседжаньні прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР 27-га чэрвеня 1959 году была зробленая справаздача зь дзейнасьці сакратара нутраных справаў К.Мерляка, у якой зроблены агляд дзейнасьці сэктараў і прадстаўніцтваў за першае паўгодзьдзе 1959 году. Далей былі зробленыя справаздачы сакратара фінансаў і інфармацыі. Наступна перайшлі да разгляду розных актуальных справаў. К. Мерляк запрапанаваў, каб А.Адамовіч, будучы ў Эўропе, дакладна высьветліў справу пераезду ў ЗША М.Абрамчыка, бо шмат хто з радных сумняваўся ў здзейсьненьні праекту, а таму ня ўносілі грошы ў фонд прадстаўніцтва. У справе фонду імя П.Крэчэўскага К.Мерляк праінфарамаваў, што фонд цалком аформлены. Тут даручана Н.Арсеньневай закласьці асобнае справаводзтва фонду. Далей разглядалася справа радыё «Мадрыд» і выданьне брашуры ў ангельскай мове з нагоды 10-годзьдзя БАЗА. А.Шукелайц зазначыў, што беларусаў мала, каб распыльвацца. Жменька беларускіх эмігранцкіх культурных працаўнікоў з Амэрыкі не патрапяць несьці на сваіх плячах ўвесь цяжар грамадзкае працы, фінансуючы ўсе пачынаньні. Тут К.Мерляк дадаў, што найважней за ўсё сёньня —будаваць і мацаваць беларускую справу ў Амэрыцы. »Грошаў мы ня маем і кожны цэнт патрэбны нам тут. Трэба, прыкладам, выдаваць газэту, трэба яшчэ шмат чаго зрабіць, бо наш лёс будзе вырашацца, найпраўдападобней, у ЗША. Таму мы мусім тут рабіць усё, што можа заважыць на нашай будучыні».

Пераходзячы да іншых справаў, у сувязі з плянаваньнем працы прэзыдыюму й сакратарыяту на будучыню, прысутныя заўважылі, што ў 1960 годзе павінна адбыцца сэсія Рады БНР. Для азнаямленьня із справамі Парыскага блёку сп-ня Арсеньнева прачытала тры пратаколы паседжаньняў Парыскага блёку. Сп. А. Адамовіч даў у сувязі з прачытанымі пратаколамі, некаторыя тлумачэньні. Сп.К.Мерляк ўнёс прапанову дамагацца, каб цэнтраля Парыскага блёку была перанесена ў ЗША. У іншым выпадку прэзыдыюм і сакратарыят Рады БНР лічаць, што прэзыдэнт Абрамчык павінен сёлета адмовіцца ад старшынства

ў Парыскім блёку. К.Мерляк таксама запрапанаваў, каб прадстаўнікі Парыскага блёку ні ў якім выпадку не былі працаўнікамі радыё «Вызваленьня» ці Мюнхэнскага інстытуту або іншых амэрыканскіх установаў, каб не былі забавязанымі ў сваёй працы й выказваньнях. Прапановы гэтыя аднагодна былі прынятыя сябрамі прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР. Аднак старшынёю Рады БНР М.Абрамчыкам былі ігнараваныя.

3 жніўня 1959 году дэлегацыя камісіі Парыскага блёку ў складзе К. Мерляка, др. С.Вытвыцкага й В.Глазкова была прынятая асыстэнтам Дзяржаўнага сакратара сп. Барбур ў Вашынгтоне. Дэлегацыя выказала ўдзячнасьць Прэзыдэнту ЗША Айзэнгаўэру й Дзяржаўнаму сакратару Гэртэру за выдатную праклямацыю. Сп. Барбур запэўніў, што ён гэта перадасьць Прэзэдэнту й Дзяржаўнаму сакратару ЗША. Пры гэтай нагодзе былі абгавораныя й іншыя справы паняволеных бальшавізмам народаў. Сп. Мерляк спаткаўся з сэнатарам К. Кітынгам і кангрэсмэнам Ф. Дорнам, а таксама меў гутарку ў справе перадачаў у беларускай мове радыё «Голас Амэрыкі».

4-5 ліпеня увечары адбылася сяброўская вечарына ў Саўт Рывэры, на якой была выбраная «Міс беларускага спорту 1959» сп-чня Ганна Зыбайла зь Нью Ёрку.

Спартовая сустрэча беларускае моладзі Амэрыкі закончылася ў нядзелю вечарам на ўрачыстым банкеце ўручэньнем кубкаў і прызнаў, Старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА сп. К.Мерляк перадаў Кліўлендзкай «Пагоні» кубак за перамогу ў футболе, а сп. К.Вайцяхоўскі, ад імя Злучанага Беларускага-Амэрыканскага Дапамаговага Камітэту, уручыў кубак «Нёману» за перамогу ў валейболе.

На чарговым паседжаньні Парыскага блёку, якое адбылося 8 жніўня 1959 году была выбраная новая ўправа Камісіі ў наступным скалдзе: К.Мерляк—старшыня, В.Г.Глазкоў—заступнік старшыні др. Файзі—скарбнік і В.Кулій—сакратар. На гэтым паседжаньні было ўстаноўлена выслаць пратэст старшыні Амэрыканскага камітэту Вызваленьня народаў СССР у сувязі з тым, што радыё «Свабода» (пераіменованае з «Вызваленьня») не перадала поўнага зьместу рэзалюцыі Амэрыканскага кангрэсу й праклямацыі Прэзыдэнта ЗША «Тыдня Паняволеных народаў». Адказ на пратэст быў атрыманы 2 кастрычніка 1959 году й падпісаны Б.Е.Кунгігольмам, дырэктарам палітычнага аддзелу Амэрыканскага камітэту.

23 жніўня 1959 году адбылося кардынацыйнае паседжаньне прадстаўнікоў беларускіх рэлігійных культурных і грамадзкіх арганізацыяў, прысьвечанае справе каардынацыі дзейнасьці на будучыню дзеля лепшых вынікаў у працы. Паседжаньне адчыніў старшыня Галоўнае Управы БАЗА сп.К.Мерляк. Прывітаўшы прысутных, ён у кароткіх словах паведаміў аб мэце скліканьня сходу. Пасьля дыскусыі на розныя тэмы быў укладзены плян дзейнасьці й каляндар бліжэйшых грамадзкіх імпрэзаў. З важнейшых справаў разглядаўся прыезд Н.С. Хрушчова ў Нью Ёрку ды намеры контрадзеяньня й пратэсту супраць яго народагубнай палітыкі ў Беларусі.

19 верасьня сябры БАЗА бралі ўдзел у антыхрушчоўскіх і антыкамуністыных дэманстрацыях, ладжаных паняволенымі народамі Сярэдняе й Усходняе Эўропы супольна з амэрыканскімі антыкамунсістычнымі арганізацыямі.

Перад гатэлям «Валдорф—Асторыя» ў Нью Ёрку, дзе спраўляўся банкет, ладжаны для Хрушчова Эканамічным клюбам Нью Ёрку, адбылася дэманстрацыя, на якую беларусы прыйшлі з плякатамі: «Хрушчоў, куды ты падзеў 5 мільёнаў беларусаў?» «Хрушчоў, нашто ты парабіў зь беларускіх цэркваў клюбы?» ды іншыя.

10 верасьня пры паవароце А.Адамовіча зь Мюнхэну, дзе адбывалася канфэрэнцыя Інстытуту па вывучэньні СССР, адбылося паседжаньне прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР на якім сп. Адамовіч праінфармаваў аб прабегу канфэрэнцыі й пра сваё ўражаньне з паездкі ў Эўропу. На паседжаньні была разгяданая справа канфлікту, які паўстаў між Амэрыканскім Камітэтам і Парыскім блёкам адносна кангрэсовай рэзалюцыі «Тыдня Паняволеных народаў» і закулісьнай палітыкі прэм'ера УНРады М.Левіцкага.

22 лістапад 1959 году К. Мерляк выслаў телеграму М.Абрамчыку наступанга зьместу: «Сёньня УНРада парвала з Амком. Паседжаньне Прэзыдыюму Рады БНР 28 лістапада, а камісіі Лігі 30 лістапада. Тэлеграфуйце Вашае становішча—Мерляк.» Адказ на тэлеграму атрыманы гэтага самага дня: «Не гарачыцеся высылаю ліст —Абрамчык»

Ліст ад Абрамчыка быў атрыманы 27 лістапада, напісаны таго самага дня, што й тэлеграма. Абрамчык высьвятляў, што непаразуменьне паўстала дзеля нарушэньня дагавору Амэрыканскага камітэту з Парыскім блёкам адносна супрацоўніцтва на прынцыпе роўных партнёраў і што УНРада парвала супрацоўніцтва з Амэрыканскім

камітэтам, каб палагодзіць свае нутраныя непаладкі, якія паўсталі з прычыны пэўных субсыдыяў пэўнай групе ўкраінцаў. Паседжаньне прэздыюму й сакратарыяту Рады БНР не адбылося.

Паседжаньне камісіі Парыскага блёку ў Нью Ёрку адбылося 30 лістапада 1959 году пад старшынставам К.Мерляка. Др. Прыходзька зрэфэраваў становішча УНРады й вытлумачыў, чаму ўкраінцы парвалі супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам. Была прынятая прапазыцыя падтрымаць УНРаду, але без ніякага энтузыязму. Кожны сябра лігі меў свае собскія меркаваньні, якія адкрыта ніхто не выказваў, К.Мерляк ужо меў дакладныя інфармацыі аб праўдзівых прычынах, чаму УНРада так паступіла, але аб гэтым др. Прыходзька прамаўчаў у сваёй інфармацыі.

Па поваду прыезду Н.С.Хрушчова ў Нью Ёрк на генэральную Асамблею Аб'еднаных Нацыяў ў верасьні 1960 году камітэт антыамэрыканскай дзейнасьці, які быў створаны амэрыканскім кангрэсам, праводзіў расьледаваньні праступстваў Хрушчова «The crimes of Khrushchev» Старшыня камітэту Франьціс Е.Больтэр, зьвярнуўся да К.Мерляка-старшыні Галоўнае Ўправы БАЗА з прапановай, каб прадстаўнікі беларускага грамадзтва склалі свае сьведчаньні аб крымінальнай палітыцы й дзейнасьці ў Беларусі. Ад беларусаў у Амэрыцы сьведчылі перад кангрэсовай камісіяй 17 сьнежня 1959 году К.Мерляк, др В.Тумаш і А.Шукелайц. Іх сьведчаньні былі апублікаваныя ў 1960 годзе. (The crimes of Khrushchev part 6, Committee on Un-American Activities in the House of Representatives-Eighty Sixth Congress-First Session, Washington - 1960

13 сьнежня 1959 году адбылося паседжаньне Галоўнае Ўправы БАЗА, на якім між іншымі пастановамі было прынята наступнае:

## Асьветчаньне

«У сувязі з тым, што апошнім часам ў «Бацькаўшчыне» ( № 477, 478, 479-480) зьявіліся артыкулы ў справе «Тыдня Паняволеных народаў» і становішча, занятага ў гэтай справе Амэрыканскім камітэтам вызваленьня й радыё «Свабода» Галоўная Ўправа Беларуска—Амэрыканскага Задзіночаньня ў ЗША, пазнаёміўшыся з усімі даступнымі ёй у згаданай справе матэр'яламі, на сваім паседжаньні 13-га сьнежня 1959 году, сцьвердзіла:

а. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне ў ЗША ёсьць незалежнай арганізацыяй амэрыканскіх грамадзян беларускага паходжаньня й беларускіх эмігрантаў у Амэрыцы й можа наладжваць усе патрэбныя ёй кантакты ці супрацоўнічаць з усімі дэмакратычнымі амэрыканскімі ды эміграцыйнымі арганізацыямі, якія дзеяць на дабро Амэрыкі й Беларусі.

б. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне падтрымоўвае й будзе падтрымоўваць кожную акцыю, як амэрыканскіх гэтак і беларускіх арганізацыяў ці ўрадаў, што дзеяць на карысьць Амэрыкі й Беларусі. У выпадку-ж, калі згаданыя арганізацыі (пасрэдна або непасрэдна) дзейнічаюць на шкоду Амэрыкі й Беларусі, яны губляюць у выніку падтрыманьне Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня».

## 1960

1960 год у жыцьці Кастуся й Ганны Мерляк распачаўся шчасьлівымі падзеямі. 12 сьнежня 1959 году ў іх радзіўся другі сын. Хрысьцілі малога Данілу—Канстанціна 6-га лютага ў саборы сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне. Хрысьціў Данілу Ўладыка Васіль, а кумамі былі спчня Поля Груцько й др. Уладзімір Набагез. Пасьля хросту адбылося прыняцьцё ў грамадзкім цэнтры з удзелам беларускае аркестры «Бярозка» Уладзіміра Бычкоўскага.

На працы ў Голанд-Амэрыка Лайн ад 1955 да 1960 году ў фінансавым аддзеле Кастусь кантраляваў дзейнасьць Голанд-Інтэрамэрыка Лайн, параплавы, якія курсавалі Нью Ёрк—Буэнос Айрэс да 1959 году. У гэтым годзе Фідэль Кастро са сваімі партызанамі скінуў з улады «дыктатара» Фульджэнці Батысту й устанавіў камуністычную ўладу з сваёю уласнаю дыктатураю.Голанд-Інтэрамэрыка Лайн была зьліквідавана ў выніку зьмяншэньня абмену таварамі між Паўдзённай і Паўночнай Амэрыкай.

З пачаткам 1960 году закончыўся дзесяцігадовы пэрыяд грамадзкага жыцьця беларускае эміграцыі ў Амэрыцы. У пачатковых гадах пасьля прыезду ў Амэрыку, нягледзячы на вялікія затраты часу на ўладжаньне асабістага й сямейнага жыцьця, беларусы знаходзілі час на ўсякія зборкі й грамадзка-рэлігійную дзейнасьць, не шкадуючы часам апошняга цэнта на арганізацыйныя патрэбы. За кароткі час змаглі

ўладзіць кватэры, мелі сталыя працы, а дзеці пайшлі ў школы. З часам некаторыя больш прадпрымальныя пачалі разглядацца за купляй дамоў ды пачалі набываць самаходы.

Гэтае зьявішча падглядзелі некаторыя патрыёты-дзеячы, паднялі ў прэсе дыскусыю. Яшчэ ў 1951 годзе зьявіўся артыкул пад загалоўкам «Тараканы ў саладусе». Затым паявіўся артыкул «Дык дзе-ж той корань зла», далей «Беларуская эміграцыя ў ЗША» й іншыя. У дыскусыі выявілася, што беларуская эміграцыя ня ёсьць тараканы, што топяцца ў саладусе, але пытаньне стаць: эміграцыі не распакоўвацца, што азначала хуткае вяртаньне на Бацькаўшчыну, а распакоўвацца гэта значыла забыцца пра паварот, а заняцца будаваньнем свайго жыцьця ў Амэрыцы.

Але былі й другія пагляды, да якіх належаў Кастусь. Час павароту на Бацькаўшчыну няведамы, а дзеля гэтага неабходна будаваць жыцьцё ў Амэрыцы, браць грамадзянства, браць актыўны ўдзел ў амэрыканскай мясцовай, штатнай і фэдэральнай палітыцы й адміністрацыі, належаць да Рэспубліканскай або Дэмакратычнай партыі ЗША, а перадусім здабыць «багацьце». Стаўшыся беларускім амэрыканцамі, будучы патрыётам свае Бацькаўшчыны, такая асоба будзе мець магчамсьць зрабіць у 10 разоў больш для вызваленьня Беларусі, чымся той нераспакаваны эмігрант, які стаўся ахвярай патрабуючы спагады, а не змагаром у поўным значэньні.

Такім чынам, вытварыліся два напрамкі думаньня й дзеяньня: адны не «распакоўвацца», другія «распакоўвацца». Разыходжаньні ў поглядах займалі шмат часу ў дыскусыях і забіралі нямала энэргіі, каб пераканаць, што яго погляд, а на другі павінен брацца пад увагу.

Гэта выявілася ў часе збору грошаў на куплю зямлі пад магільнік у Нью Брансьвіку. На чале праціўнікаў куплі стаялі А.Стагановіч, Ул.Кабушка. У выніку перамог другі бок. Зямлю пад магільнік купілі й 21 чэрвеня 1959 году ўрачыста яго пасьвяцілі. А.Стагановіч стаўся асабістым ворагам Кастуся за тое, што ён у прыватным лісьце да П.Кажуры выказаў падтрымку, даказваючы, што купля зямлі будзе вельмі карыснай справай. Кажура, каб падмацаваць сваю пазыцыю, гэты ліст прачытаў на сходзе. А.Стагановіч гэтага ня мог забыцца да самае сьмерці. Ул.Кабушка памёр якраз месяц пасьля высьвячэньня магільніку й быў першым на ім пахаваны. Што за іронія чалавечага лёсу!

Артыкул пад загалоўкам «Беларуская ці грашовая інтэлігенцыя» Я.Запрудніка ў «Бацькаўшчыне» за 15 верасьня 1957 году закончыў дыскусыю, паказваючы, што тараканы ёсьць ня толькі ў Амэрыцы, але й у другіх краінах, дзе пасяліліся беларускія эмігранты.

Дыскусыя пра назоў «Беларусь» ці «Крывія» даўно заціхла. Але яна зь іншымі прычынамі надалей прадаўжала дзяліць беларускую эміграцыю на прыхільнікаў БНР або БЦР. Але гэта было меней важным, а нават сьмешныя спадчыны, напрыклад «Whiteruthenian (Byelorussian) Congress Committee of America" або «Беларуска-Амэрыканскі Злучаны Дапамогавы Камітэт у Кліўлендзе». Доўгія назвы з падвойным імем, былі вялікім мінусам ды сьмешным у вачох амэрыканца. А таму што слова «спадар» было ўведзенае ў слоўнік др.Я.Станкевічам — крывічом, зарубежнікі яго адкінулі й заманялілі словам «гаспадар».

Грамадзкае жыцьцё ішло сваёй дарогаю, перамагаючы перашкоды ды разьвіваючы сваю дзейнасьць. Патрэбы грамадзкія й палітычныя пачалі расьці. Грошы патрэбныя на прэсу, палітычныя выданьні, на радыё ў Нью Ёрку, на радыё «Мадрыд» на сталага прадстаўніка ў Вашынгтоне, на утрыманьне царквы й школаў, на патрэбы, зьвязаныя з захаваньнем свае культуры й традыцыяў. А тут, паводля слоў А.Шукелайца, выказаныя на паседжаньні 27 верасьня 1959 году нас мала, каб распыльвацца.

Трэба было шукаць выхаду з становішча, але дзе яго знайсьці?

Калі ў 1952 годзе быў выбраны на Прэзыдэнта ЗША Двайт Д.Айзнгаўэр, бюро палітыйнай каардынацыі было ператворанае ў Дырэктарат плянаваньня, шэфам якога быў назначаны Фрэнк, Ф.Візнэр, атрымаўшы большы аўтарытэт ды пашыраны засяг дзейнасьці, праводзіў падрыхтоўку «спэцыяльных адзінак» дзеля дывэрсыйнага змаганьня на тэрыторыі камуністычнага панаваньня.

Пасьля раскрыцьця афэры Кім Фільбі, прэзыдэнт БЦР праф. Р.Астроўскі зь Беларускім вызвольным фронтам пачаў супрацоўнічаць з Дырэктрам плянаваньня. Супрацоўніцтва з амэрыканцамі падмацавала аўтарытэт прэзыдэнта БЦР і прадставіла новыя пэрспэктывы на далейшую дзейнасьць. Яму была дана магчымасьць прыехаць у 1957 годзе ў Амэрыку для далейшага вэрбаваньня ахвотнікаў у спэцыяльныя аддзелы, якія гэтым разам падрыхтоўваліся не ў Нямеччыне, а ў ЗША. У гэтым часе, некалькі беларусаў Амэрыкі прайшлі падрыхтоўчы курс з абодвух бакоў як БНР, так і з БЦР.

У 1960 годзе наступіла зьмена ў вонкавай палітыцы ЗША й зьмяніўся погляд на дывэрсыйную акцыю. На зьмену палітыкі ўплылі два фактары : другі прыезд Хрушчова ў Амэрыку ды канфлікт у Вьетнаме. Дырэктарат плянаваньня да гэтага часу быў падпарадкаваны Радзе Бясьпекі, быў рэарганізаваны й далучаны да Цэнтральнай Агенцыі Разьведваньня з мэтай паўстрымаваньня камуністычна-расейскага імпэрыялізму ў цэлым сьвеце, не абмяжоўваючыся толькі да тэрыторыі Савецкага Саюзу.

«Спэцыяльныя аддзелы» былі падмененыя «Зялёнымі бэрэтамі» ды іх падрыхтоўвалі да закрытай і адкрытай акцыі на выпадак патрэбы ў любой частцы сьвету.

Дзякуючы геапалітычнаму палажэньню Беларусі, амэрыканцы зьвярнулі асаблівую ўвагу на беларускіх уцекачоў з Чырвонае Арміі. Зразжа па заканчэньню вайны, у Бюро палітычнай каардынацыі пачалі дапамагаць арганізоўваць беларускія лягеры, каб яны не паддаліся розным паляўнічым на беларускія душы. Шэф БПК Фрэнк Візнэр адчуваў, што яго місія ў жыцьці—гэта зрэалізаваць пляны генэрала Патона, прадаўжаць змаганьне супраць камунізму. Ён падгатаўляў вайсковыя групы з уцекачоў данай краіны для змаганьня за вызваленьне іхняй Бацькаўшчыны.

І калі быў прыняты «Эміграцыйны акт» ў 1948 годзе БПК, амэрыканцы, а ў асаблівасьці Фрэнк Візнэр, садзейнічалі й дапамагалі беларусам эміграваць у Амэрыку зь Нямеччыны ў большай колькасьці. Беларусы Амэрыкі павінны запамятаць і з пашанай успамінаць імя Фрэнка Візнэра, бо кожны зь іх ведае, як цяжка было перш арганізавацца, а потым эміграваць у Амэрыку.

Амэрыканскі камітэт вызваленьня народаў Расеі з арыгінальнай плятформы «непрадрашаць», каб супрацоўнічаць зь не расейскімі народамі Савецкага Саюзу, мусіў перайсьці эвалюцыю, якая заняла нямала часу й грошаў. Ад пачатку й да 1953 году прадстаўнікамі камітэту вяліся перагаворы ды featureзнага палітычнага характару махінацыі, каб прыцягнуць да супрацоўніцтва нерасейскія народы. У выніку ўсяго, была ўзгоднена формула, што Амэрыканскі камітэт і Парыскі блёк будуць супрацоўнічаць на правах роўных партнёраў.

Каб стварыць каардынацыйны цэнтр, Камітэт мусіў паяднаць некалькі расейскіх групаў або партыяў, гэтак творачы адзінае прадстаўніцтва расейскае эмграцыі. Зьвесьці да адзінага цэнтральнага

прадстаўніцтва эміграцыі дзесяць нацыянальнасьцей Савецкага Саюзу Амэрыканскаму камітэту не ўдалося поўнасьцю асягнуць на працягу больш дзесяці гадоў. Кіраўніцтва Амэрыканскага камітэту паціху, але station ўча налягала, каб радыё «Свабода», Інстытут па вывучэньню СССР і часопіс «Праблемы народаў СССР» дзеялі згодна ідэялягічна ўстаноўленай палітыцы непрадрашэнства. У 1959 годзе, калі была прынятая Амэрыканскім кангрэсам рэзалюцыя й праклямацыі ў Прэзыдэнта ЗША Амэрыканскі камітэт устрымаў перадачу рэзалюцыі й праклямацыі ў Савецкі Саюз без паразуменьня з Парыскім блёкам. Гэтым камітэт нарушыў дагавор супрацоўніцтва зь нерасейскімі народамі на правах роўных партнёраў.

Кастусь, займаючы адказныя становішчы ў падкамісіі Парыскага блёку ў Нью Ёрку, і наогул маючы шырокія сувязі з прадстаўнікамі й з палітыкамі, меў магчымасьць сабраць пераконаваючыя доказы адносна субсыдыяў, прапанаваных камітэтам у працэсе яднаньня групаў, такім чынам, дасягаючы фармаваньня адзінага прадстаўніцтва тое ці іншае нацыянальнасці, якія-б супрацоўнічалі з кардынацыйным цэнтрам у змаганьні за вызваленьне з-пад савецкага панаваньня. Субсыдыі былі выдаваныя ў сотнях тысячаў даляраў арганізацыям або партыям на эміграцыі, якія былі ў апазыцыі да свайго цэнтру за супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам. Каб іх далучыць або ўціхамірыць, даваліся субсыдыі аднаразова або пэрыядычна, іх атрымоўвалі расейцы, дзьве партыі ўкраінцаў, казакі, а таксама й некаторыя зь «цюрскіх» народаў.

Кастусь, прааналізаваўшы ўсебакова сучаснае становішча беларускае эміграцыі, супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам зь яго палітыкай непрадрашэнства ды, зрабіўшы прагноз, у якім напрамку пойдзе «халодная вайна», пастанавіў у 1960 годзе сфармаваць і прадставіць старшыні Рады БНР Абрамчыку прапановы новай палітыкі й нормаў дзеяньня на эміграцыі.

1960 год пачаўся выяўленьнем актыўнасьці беларускіх арганізацыяў у Нью Ёрку. Сустрэча новага 1960 году, ялінка для дзяцей, ялінка для моладзі, вечарына царкоўнай рады, паседжаньне беларускага актыву й баль Галоўнае Ўправы БАЗА.

5 студзеня Амэрыканскі камітэт вызваленьня ладзіў прыняцьцё ў сувязі з выездам у Эўропу сп.Кэльлі, эўрапэйскага прадстаўніка ка-

мітэту. На гэтым прыняцьці быў прысутны старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА К.Мерляк.

7 студзеня К. Мерляк наведаў Вашынгтон дзеля палагоджаньня розных грамадзка-палітычных справаў.

15 студзеня адбылося паседжаньне прадстаўнікоў падкамісіі Парыскага блёку пад старшынствам К.Мерляка. На паседжаньні абмяркоўваліся розныя справы, між іншым, і адказ Амэрыканскаму камітэту на ліст, які быў высланы раней у справе ўстрыманьня перадачы рэзалюцыі адносна Тыдня Паняволеных народаў.

У лютым з нагоды 42-х угодкаў незалежнасьці Беларусі выйшла брашура ў ангельскай мове пад загалоўкам «За свабоду й незалежнасьць Беларусі», выдадзеная Галоўнаю Ўправаю БАЗА. Апрача шматлікіх выступленьняў амэрыканскіх сэнатараў і кангрэсмэнаў у брашуры памешчаныя праклямацыі губэрнатараў і мэраў, выдаваных у дні 25 Сакавіка, а таксама зьмешчаны інфармацыйны артыкул аб Беларусі. Распаўсюджаньнем гэтае брашуры распачалася падрыхтоўка да адзначэньня 42-х угодкаў незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

8-га сакавіка прыбыў з Эўропы ў Нью Ёрк М.Абрамчык, які хацеў палагодзіць непаразуменьне Парыскага блёку з Амэрыканскім камітэтам ды правесьці IX сэсію Рады БНР, якая склікалася кожныя тры гады.

На пашыраным паседжаньні Галоўнай Управы БАЗА й прадстаўнікоў арганізацыяў 12 сакавіка разглядаліся наступныя справы:

1. Сьвяткаваньне 42-х угодкаў 25 Сакавіка.

2. Парад Лаяльнасьці.

3. Канфэрэнцыя нерасейскіх народаў СССР у ЗША, куды Галоўная Ўправа БАЗА прынятая як сябра, а К.Мерляк выбраны ў кіраўніцтва як генэральны сакратар.

У нядзелю 13 сакавіка адбылося першае супольнае паседжаньне із М.Абрамчыкам прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР. На паседжаньні былі вызначаныя галоўныя пытаньні, што маюць быць пастаўленыя на амберкаваньне IX сэсіі Рады БНР і накінуты плян парадку дня сэсіі, якая неўзабаве распачалася.

42-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі адначаліся 27 сакавіка. Яго падрыхтоўку рабіла й каардынавала дзейнасьць Галоўная Ўправа БАЗА пад кіраўніцтвам К. Мерляка, з дапамогай колькіх

сяброў збоку, пры грашовым удзеле акруговае ўправы БАЗА. Плянавая й своечасовая падрыхтоўка ды вонкавыя дачыненьні К.Мерляка спрычыніліся да пасьпяховага сьвяткаваньня дня незалежнасьці Беларусі.

Сьвяткаваньне пачалося раніцою. Літургія з маленьнем за Беларусь, адпраўляў архіяпіскап БАПЦ Васіль у саслужэньні з айцамі Хведарам і Раманам. Акадэмія адбылася ў гатэлі «Білтмор» у Нью Ёрку. Яе адчыніў і вёў старшыня Галоўнай Управы БАЗА К.Мерляк. Ён паказаў прысутным партрэт Прэзыдэнта ЗША Д.Айзэнгаўэра зь ягоным собскімі подпісам, прысланы зь Белага Дому з нагоды 42-х угодак незалежнасьці Беларусі для Беларускага грамадзкага цэнтру. Пасьля, у сваёй прамове, прысьвечанай дзьвюм тэмам: Тыдню Паняволеных народаў і злачыствам Хрушчова ў Беларусі сп. Мерляк прадставіў прысутным Прэзыдэнта БНР Абрамчыка. Той у сваёй прамове схарактарызаваў ідэю 25 Сакавіка. Яе моц не змаглі пераламаць бальшавікі да гэтага часу й ніколі не перамогуць. Асабістыя выступленьні прадстаўніка мэра горада Нью Ёрку Джона В.Бэрна, кангрэсмэна Ф.Дорна, Прэзыдэнта УНРады др.С.Вітвіцкага, прафэсараў Калюмбійскага ўнівэрсытэту Клярэрнса Манінга, прадстаўніка польскае грамадзкасьці прафэсара Г.Лівача, перапляталіся мастацкімі выступленьнямі дзяцей і дарослых у нацыянальнай вопратцы.

Пасьля прадстаўленьня К.Мерляком прысутных гасьцей, якіх было звыш 30-ці, акадэмія закончылася прыняцьцём рэзалюцыі й адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну. Затым госьці перайшлі ў другую залю на пачастунак.

Падсумаваньні вынікаў сьвяткаваньня 42-х угодкаў незалежнасьці Беларусі былі наступнымі:

Партрэт Прэзыдэнта Айзэнгаўэра з аўтографам — падарунак беларусам.

Абвешчаньне Дня беларускае незалежнасьці ў штаце Нью Ёрк.

Абвешчаньне Дня беларускае незалежнасьці ў месьце Нью Ёрк.

Абвешчаньне Дня беларускае незалежнасьці ў Брукліне.

Прывітаньні ад кіраўнікоў Рэспубліканскае й Дэмакратычнае партыяў ЗША.

Прывітаньні ад міністра працы сп.Джэймса Мічэла.

Прывітаньні ад міністэрства земляробства.

Прывітаньні й лісты ад 23-х замежных пасольстваў у Вашынгтоне.

Прывітаньні ад губэрнатараў 8 амэрыканскіх штатаў.

Прывітаньні ад 22-х сэнатараў, 37 кангрэсмэнаў і 17 амэрыканскіх арганізацыяў.

Рэзалюцыя з дамаганьнем да амэрыканскага ўраду ўлучыць вызваленьне Беларусі ў праграму замежнае палітыкі ЗША й да амэрыканскае дэлегацыі ў Задзіночных Нацыях, паставіць на парадак дня Генэральнай асамблеі разгляд бальшавіцкага генацыду ў Беларусі.

Рэзалюцыя, прынятая на акадэміі, прамова К.Мерляка былі надрукаваныя ў Кангрэсовым рэкордзе з прамоваю сэнатара Кеннэт В.Кітынг 31 сакавіка 1960 году.

19 сэнатараў і кангрэсмэнаў адзначылі сваімі выступленьнямі 42 ўгодкі незалежнасьці Беларусі ў сэнаце й у палаце рэпрэзэнтантаў 86-га кангрэсу ЗША. Гэтыя выступленьні былі сабраныя й перавыдадзеныя Галоўнай Управай БАЗА асобным памфлетам, які быў на працягу цэлага году разасланы ў бібліятэкі, выдавецтвы газэтаў, установы й амэрыканскаму ўплывоваму грамадзтву.

20-га красавіка адбылося паседжаньне падкамісіі Парыскага блёку у Нью Ёрку з удзелам М.Абрамчыка й Левіцкага. М.Абрамчык інфармафаў аб дзейнасьці блёку, а Левіцкі высьвятляў становішча УНРады да Парыскага блёку й да Амэрыканскага камітэту. Але, нажаль, на паседжаньні нічога не вырашылі, і з чым прыйшлі амаль з тым і пайшлі.

З нагоды канфэрэнцыі на вяршыні чатырох вялікіх дзяржаваў, якая мела адбыцца 16 травеня ў Парыжы, Галоўная Ўправа БАЗА выслала на рукі Дзяржаўнага сакратара ЗША Хрыстыяна Гэртэра мэмарыял у справе вызваленьня Беларусі. У ім Галоўная Ўправа зьвяртала ўвагу на генацыд беларускага народу, на злачынствы Хрушчова, на адводныя аргументы разбраеньня, на беспадстаўнасьць словаў аб маналітнасьці савецкае дзяржавы ды рэкамэндавала неісьці на ўступкі Хрушчову, не адступаць ад прынцыпаў, якія робяць Амэрыку вялікай краінай.

Традыцыйны парад Лаяльнасьці адбыўся 30 красавіка з асабістым шырокім удзелам беларусаў усіх бакоў Нью Ёрку й яго ваколіцаў.







*Парад Лаяльнасьці на 5-й Авеню ў Нью Ёрку, 30 красавіка 1960 году.*

15 травеня адбылося паседжаньне Галоўнае Ўправы БАЗА, на якім разглядалася справа ІУ Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Кліўлендзе, вечарына 28 травеня ды іншыя справы.

18 травеня вечарам адбылася канфэрэнцыя падкамісіі Парыскага блёку пад кіраўніцтвам К.Мерляка з шырокім удзелам прадстаўнікоў або сяброў блёку. Пастаноўлена, што чарговая канфэрэнцыя Парыскага блёку павінна адбыцца перад прэзыдэнцкімі выбарамі ў Нью Ёрку. Аднак канфэрэнцыя адбылася ў Мюнхэне, а не ў Нью Ёрку.

21 травеня адбылося пашыранае паседжаньне прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР, на якім разглядалася справа каардынацыі дзейнасьці й выступленьняў беларускіх палітычных і царкоўных чыньнікаў. Адным із важнейшых пытаньняў было вызначэньне Папам Янам XXIII біскупа для беларусаў каталікоў а.др. Часлава Сіповіча. Тут разьвязалася моцная дыскусыя за й супроць вызначэньня біскупа ўсходняга абраду (вуніята) для беларусаў. Др. В.Тумаш, абгрунтаваўшы палітычную шкоднасьць, якую прынясе высьвячэньне вуніяцкага біскупа, прапанаваў зрабіць захады, каб Ватыкан высьвяціў рыма-каталіцкага біскупа для беларусаў каталікоў як на эміграцыі, так і на Бацькаўшчыне. Гэтую прапанову падтрымаў К.Мерляк, дадаючы, што факт высьвячэньня каталіцкага біскупа ўстрымаў-бы варожае настаўленьне й зласьлівыя закіды праваслаўных, асабліва сьвятароў, што Рада БНР і БАПЦ ёсьць ня толькі правуніяцкая, але выслугоўваецца перад Ватыканам, пашыраючы вуніяцтва на эміграцыі й г.д. Супраць прапановы др. Тумаша акрамя другіх наймацьней выступіў Васіль Кендыш, даказваючы, якую карысьць прынясе вуніяцкі біскуп. Ён прапанаваў пакінуць гэтую справу, ня робячы ніякіх перашкадаў. М. Абрамчык, бачучы вялікія разыходжаньні, запрапанаваў, каб усе згадзіліся на тое, што ён пры вароце ў Эўропу пастараецца палагодзіць гэтае пытаньне. Трэба сказаць, што М.Абрамчык ў гэтай справе абсалютна нічога не зрабіў. 4 жніўня 1960 году у Мюнхэне, у касьцёле сьв.Анны адбылася кансакрацыя Яго Эксэлецныі др. Часлава Сіповіча—біскупа ўсходняга абраду для беларусаў.

22 травеня ў Нью Ёрку была ўрачыста адчынена ІХ сэсія Рады БНР. Пасьля літургіі ў залі Беларускага грамадзкага цэнтру М.Абрамчык зрабіў даклад для агульнага грамадзтва й радных аб агульным палітычным становішчы ў сьвеце ды на Бацькаўшчыне, аб дзейнасьці органаў Рады БНР і нашых плянах на будучыню. Пасьля дакладу

Абрамчык даваў адказы на шматлікія пытаньні, якія аднак не заўсёды задавальнялі прысутных.

28 травеня раніцою адбылася нарада прадстаўнікоў Галоўнае Управы БАЗА, аддзелу БАЗА ў Кліўлендзе й Згуртаваньня Беларусаў Канады, прысьвечанае IУ Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі. На нарадзе была ўстаноўленая праграма сустрэчы ды разьмеркаваньне абавязкаў у яе падрыхтоўцы. На нарадзе пастаноўлена запрасіць усе беларускія арганізацыі ЗША й Канады.

28-29 травеня адбыўся Першы епархіяльны зьезд БАПЦарквы ў Нью Ёрку. На зьездзе былі прысутныя прадстаўнікі беларускіх палітычных, грамадзкіх і культурных арганізацыяў. Вечарам дэлегаты й госьці ўшанавалі сваёю прысутнасьцю вечарыну, якую ладзіла Галоўная Ўправа БАЗА.

IX сэсія Рады БНР прадаўжала сваю працу 12,19, 26 чэрвеня. 12 чэрвеня былі выслуханыя справаздачы: прэзыдэнта Абрамчыка аб дзейнасьці прэзыдыюма Рады, К.Мерляка—зь дзейнасьці сакратарыяту нутраных справаў, В.Кажана—аб стане скарбу, А. Шукелайца—зь дзейнасьці сакратарыяту інфармацыі, В.Кендыша—аб беларуска-польскіх дачыненьнях, др. В.Тумаша—аб беларуска-балцкіх дачыненьнях, Н.Арсеньневай (Кушаль)—аб сакратарскай працы. Із справаздачаў было відаць укладзеную працу й дасягненьні між дзьвюмя сэсіямі Рады БНР.

19 чэрвеня паседжаньне было прысьвечанае дыскусыям. Была апрабаваная дасёлешняя дзейнасьць Прэзыдэнта Рады БНР Абрамчыка, прэзыдыюму й сакратарыяту.

На паседжаньні 26 чэрвеня была абмеркавана пастанова IX сэсіі Рады БНР, у якой шырока гаварылася пра шмат якія справы, асабліва пра імпэрыялістычную палітыку Савецкага Саюзу ды эксплуатацыю беларускага народу, пра дзейнасьць Амэрыканскага камітэту, пра кансалідацыю беларускае эміграцыі й г.д. У выніку праведзеных перавыбараў, прэзыдыюм і сакратарыят Рады БНР засталіся ў тым самым складзе з дапаўненьнем В.Кендыша ў сакратарыят скарбу й Я.Запрудніка ў сакратарыят інфармацыі.

Пастанова IX сэсіі Рады БНР была надрукаваная у газэце «Бацькаўшчына» за 24 ліпеня 1960 году з некалькімі прапушчанымі сказамі, якія былі нязгодныя з паліткай непрадрашэнства й маглі-б не падабацца Амэрыканскаму камітэту.

Прэзыдэнт Рады БНР М.Абрамчык адляцеў назад у Эўропу 11 ліпеня. Пару дзён перад ад'ездам Кастусь меў зь ім даўгую гутарку, падчас якое зрабіў прапанову незвычайнай вагі, зь якою ўжо вазіўся ад даўжэйшага часу, чакаючы нагоды, каб спаткацца ўдваіх без ніякіх сьведкаў.

Выказваньні й прапановы К.Мерляка старшыні Рады БНР М.Абрамчыку: «Супрацоўніцтва Рады БНР з Амэрыканскім камітэтам вызваленьня на плятформе непрадрашэнства, што да гэтага часу прыкрывалася, выйшла апошнім часам на паверхню, зьяўляецца для нас шкоднай. Яно (супрацоўніцтва) стаіць на перашкодзе да шырэйшае нацыянальна-палітычнай дзейнасьці ў ЗША й да разьвіцьця грамадзкага жыцьця Беларуска—Амэрыканскага Задзіночаньня ды на перашкодзе для росту палітычнага ўплыву беларусаў у Амэрыцы.

Рэдакцыя газэты «Бацькаўшчына», якая бяз сумніву знаходзіцца пад Вашым уплывам і кіруецца Вашымі ўказаньнямі беспадстаўна крытычнымі артыкуламі грамадзка-палітычнай дзейнасьці БАЗА, выклікала канфлікт. Гэты канфлікт змусіў Галоўную Ўправу заявіць, што БАЗА зьяўляецца Беларуска-Амэрыканскай арганізацыяй, якая дзеіць, кіруючыся ідэямі беларускага вызвольнага руху, а пагэтаму ня будзе падтрымоўваць дзейнасьці, якая гэтай лініі пярэчыць.

Такое становішча зьнеахвочвае людзей да грамадзкай працы й ахвярнасьці ды вядзе да недаверу кіраўніцтву. Больш сьведамыя адзінкі грамадзства й радныя сталі адыходзіць і праводзіць дзейнасьць вонкі бээнэраўскага напрамку.

Дзякуючы дачыненьням пад Вашым кіраўніцтвам з Амэрыканскім камітэтам, беларусы сталіся неабходным складнікам для далейшай антыкамуністычнай дзейнасьці ў часе халоднае вайны, якая ад даўжэйшага часу існуе між ЗША й Савецкім Саюзам.

Дзеля гэтага прапануецца вам, прэзыдэнт, «падзяліць функцыі» у нашай палітычнай дзейнасьці. Гэта значыць, што сябры прэзыдыюму й сакратарыяту, якія працуюць ў установах Амэрыканскага камітэту, зложаць афіцыяльна свае рэзыгнацыі , астаючыся надалей працаваць у камітэце. Вынікам чаго , у Радзе БНР паўстане апазыцыя, якая разам з БАЗА пачне выступаць супраць палітыкі непрадрашэнства Амэрыканскага камітэту. Вы, прэзыдэнт, станецеся пасярэднікам між апазыцыяй і камітэтам у ліквідацыі паўсталага канфлікту. У перамовах з Амэрыканскім камітэтам апазыцыя Рады й БАЗА выставіць свае

патрабаваньні, за якія перастане выступаць супраць і спыніць варожую крытыку.

Бяручы пад увагу абставіны, у якіх сёньня знаходзіцца камітэт, ён напэўна згодзіцца й задаволіць нашыя патрабаваньні. Яны гэта рабілі, адпускаючы вялікія грашовыя субсыдыі ў сотнях тысяч даляраў расейцам, казакам, украінцам і цюрскім народам за выняткам беларусаў, якім калісьці кінулі крышачку падмогі на газэту «Беларус», чым замест карысьці прынесьлі шкоду. Атрыманыя субсыдыі дапамогуць разьвіваць нацыянальную працу на эміграцыі: набыцьцё цэнтраў, утрыманьне беларускіх школаў, выдавецтваў, навязаньне палітычных кантактаў ды прыняцьцё актыўнага ўдзелу ў амэрыканскіх палітычных арганізацыях. Гэта збалансуе шкоду, нанесенаю палітыкай Амэрыканскага камітэту,а нам, лаяльным амэрыканцам беларускага паходжаньня, ня будзе патрэбы афіцыяльна крытыкаваць урад і яго палітыку».

Каб падмацаваць свае аргумэнты, Кастусь прадаўжаў: «Ідэя не распакоўвацца, падтрыманая некаторымі раней і прапагаваная нашым грамадзкім дзеячом, і думка, што халодная вайна хутка можа перайсьці ў гарачую з нясумніўным вынікам вызваленьня Беларусі й ліквідацыі камунізму, а часовы ўрад будзе складацца зь лідэраў Рады БНР на эміграцыі да ўстанаўленьня дэмакратычнага ладу— сёньня не зьяўляецца рэальнай.

Гэткія меркаваньні напэўна суліліся дырэкторыяй плянаваньня Прэзыдэнту БЦР, аб чым Вы добра ведаеце, а таксама ведаеце, што зьліквідавалася і зь ёю «Армія вызваленьня». Да гэтага напэўна й Вы заўважылі, што палітыка ЗША зьмянілася з «вызваленьня» на «паўстрыманьне», а цяпер пераходзіць на палітыку «суіснаваньня». Гэта пацьвярджаюць два факты: канфэрэнцыі на вяршынях і другі прыезд Хрушчова ў Амэрыку.

З гэтага выглядае, што мы асуджаныя на доўгае жыцьцё на эміграцыі й доўгае змаганьне за вызваленьне Беларусі. А гэта будзе патрабаваць вялікіх сродкаў, якія мы павінны здабыць».

М.Абрамчык ніякіх камэнтарыяў не зрабіў, бо на гэта ня было часу, але зазначыў, што ён заўсёды цікавіўся, чым Кастусь кіруецца ў сваёй дзейнасьці, а цяпер ака даведаўся. Разьвітваючыся, сказаў, што ён над гэтым падумае й дасьць знаць з Эўропы. Нажаль, Кастусь ад М.Абрамчыка ў гэтай справе ніколі нічога не пачуў.

Тыдзень Паняволеных народаў, прадэклямаваны Прэзыдэнтам ЗША Д.Айзэнгаўэрам, быў адзначаны ў Нью Ёрку вельмі ўрачыста. Для належнага адзначэньня быў створаны 29 чэрвеня адмысловы камітэт із старшынёю Ю.Мак Карты, у які ўваходзіў К.Мерляк, старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА.

17 ліпеня пасьля Божае службы ў катэдры сьв.Патрыка, яго Эмінэнцыя Кардыанал Ф.Спэльман прыняў на аўдыенцыі прадстанікоў нацыянальных арганізацыяў. На аўдыенцыі былі прынятыя кардыналам Спэльманам старшыня К.Мерляк і заступнік старшыні Ф.Бартуль.

24 ліпеня ў цэнтры Мангэтан адбыўся вялікі мітынг з удзелам беларускага грамадзтва й з мастацкімі выступленьнямі беларускае моладзі зь Нью Ёрку й Саўт Рывэру.

У канцы ліпеня Галоўная Ўправа БАЗА выдала камунікат наступнага зьместу: «Прадстаўнікі БАЗА і ЗБК кіраваліся прынцыпам, што Сустрэча Беларуса ў Паўночнае Амэрыкі—гэта сустрэча ўсіх беларусаў, што жывуць у ЗША й Канадзе, ахопленых і неахопленых беларускім арганізацыйным жыцьцём, а ня сустрэча арганізацыяў ЗША й Канады. Кіруючыся гэтым прынцыпам, ня былі запрошаныя арганізацыі, якія зьяўляюцца аднаасабовыя або сямейныя, ня маючы мінімальнай колькасьці зарагaнізаваных вакол сябе сяброў. Да гэткіх належаць: Беларускі—Амэрыканскі Зьвяз (М.Шчорс, Я. Станкевіч), Камітэт Вызваленьня Беларусі (Л.Галяк), Беларускае Нацыянальнае Аб'еднаньне ў ЗША (Міхалюк), Фэдэрацыя Вольных Журналістаў (Хмара), Саюз былых удзельнікаў збройнай барацьбы за вызваленьне Бацькаўшчыны (Дзямідаў), беларускі дасьледчы інстытут імя К.Каліноўскага (Панькоў), інстытут імя сьв. Еўфрасіньні (Рыжы), літаратурная сустрань «Баявая ўскалось» (Хмара), Арганізацыя Беларускіх Нацдэмаў (Каханоўскі).»

ІУ Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі адбылася ў Кліўлендзе 3, 4 і 5 верасьня 1960 году. Ладзілі сустрэчу Галоўная Ўправа БАЗА й Згуртаваньне Беларусаў Канады з удзелам аддзелу БАЗА Кліўленда. Да вялікае ўдачы гэтае сустэчы спрычыніўся цэлы рад беларускіх грамдзкіх, палітычных і культурных дзеячоў: К.Мерляк, М.Белямук, М.Гумен, В.Сьпічонак, А.Стрэчынь, Ю Гасьцеяў. Ул.Дунец, К.Кіслы, М.Куліковіч, К.Чэрнік.

ІУ Сустрэча была ўпершыню арганізаваная на ўзор амэрыканскіх канвэнцыяў і з гледзішча палітычнага была на найвышэйшым ўзроўні

з ўсіх папярэдніх. Арганізатарам удалося зацікавіць сустрэчаю многіх выдатных амэрыканскіх дзейнікаў. Гэтаксама й канцэрт, зладжаны пасьля акадэміі, быў на вельмі высокім мастацкім узроўні. Гэтая сустрэча была, бадай, найлепшая з усіх папярэдніх. Зьехаліся на яе суродзічы зь вельмі далёкіх асяродкаў беларускае эміграцыі ў ЗША й Канады, што ня бачыліся із сабою шмат гадоў.

У сыботу, 3 верасьня, ад раніцы пачаўся зьезд удзельнікаў, пасьля адбыўся зьезд Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў Амэрыцы, а ў вечары баль у залі гатэлю «Мэнтэр», дзе мелі месца ўсе імпрэзы сустрэчы.

У нядзелю адбылося ўрачыстае высьвячэньне новае Кліўлендзкае Царквы Жыровіцкае Божае Маці БАПЦ архіяпіскапам Васілём з духавенстам. У гатэлі «Мэнтэр» адбыўся банкет, якім кіраваў др.В.Войтэнка. Адразу й пасьля банкету госьці перайшлі ў залю, дзе адбылася найважнейшая частка сустрэчы—урачыстая акадэмія. Акадэмія, якую адкрыў старшыня аддзелу БАЗА Кліўленд Юрка Гасьцеяў, пачалася амэрыканскім гімнам. Прывітаўшы гасьцей, Гасьцееў перадаў кіраўніцтва акадэміяй другому заступніку старшыні мгр. В.Плескачу з Дэтройту. В.Пляскач насьветліў у кароткай прамове мэты й даручэньні сустрэчаў ды іхні ўплыў на жыцьцё беларускае эміграцыі ў ЗША й Канадзе. Пасьля з прамовамі выступілі:кангрэсмэн Міхаэль А.Фэйган, генэральны пракурор штату Агаё Марк Мак Эльрой, рэдактар «Бацькаўшчына» др.Ст.Станкевіч, старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА К.Мерляк. Сэнатар Фрэнк Лоўш скончыў сваю глыбокую прамову словамі: «Жыве Беларусь!». Наступна аднагалосна былі прынятыя рэзалюцыя й зварот да беларусаў на Бацькаўшчыне. Урачыстая частка акадэміі скончылася адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну. Багатым канцэртам і вясёлым балем закончылася IУ Сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі.

У гэтых дня адбылася ячшэ адна Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Таронце, Канада, якую ладзілі прыхільнікі БЦР —Беларускі Кангрэсовы Камітэт і Беларускае Нацыянальнае Аб’яднаньне разам з усімі іншымі аднасямейнымі арганізацыямі.

На нарадзе падчас сустрэчы бралі ўдзел прадстаўнікі ад беларускіх грамадзкіх арганізацыяў і беларускіх цэркваў рознае юрысдыкцыі: апостальскі візытатар для беларусаў каталікаў —ксёндз др.Ул. Рыжы-Рымскі, ад Беларускай Праваслаўнай Кананічнай Царквы—про-

топросьвіцер а.М.Лапіцкі, ад БАПЦ ( другой) —архіяпіскап Менскі й ўсея Беларусі Ўладзімір (Фінкоўскі) удзелу ня браў, але выда ў адмысловае пасланьне з нагоды сустрэчы, зьвяртаючыся: «Дарагія мае, о, Госпадзі, суродзічы». Таксама было выдадзенае пастырскае пасланьне апостальскага візытатара ксяндзом Уладыславам, у якім ён сьцвярджаў: «Наша царква для беларусаў-каталікоў асноўваем на факту, што яны былі насільлем навернены ад Літоўскае ядноты ў Рымакаталіцызм Папскай ізуіцкай Контррэформай».

На нарадзе былі прынятыя асьветчаньні ў справе стварэньня адзінага фронту беларусаў Паўночнай Амэрыкі, выражала сваё становішча супроць палітыкі непрадрашэнства, праводжнай Амэрыканскім камітэтам. На нарадзе Яўхім Кіпель запрапанаваў стварыць Каардынацыйны Камітэт для супольнай грамадзка-палітычнай дзейнасьці з арганізацыяў абодвух бакоў БЦР і БНР. Супраць гэтай прапановы востра выступіў І.Касяк, даказваючы , што гадавыя зьезды арганізацыяў БЦР гэтую патрэбу задавальняюць.

Найважнейшай падзеяй гэтай сустрэчы было выступленьне праф. Р.Астроўскага, у якім акрамя агляду міжнароднай палітыкі сказаў: «Цэнтральная Рада бязьдзейная, бо беларусы , як грамадзяне Амэрыкі, адмовіліся быць раднымі й міністрамі, што урухаменьне БЦР патрабуе сродкі, якія павінны даць арганізацыі «Прыхільнікаў БЦР», але ня жаль яны не надта ахвотныя». Дакладчык паведаміў, што ад 11 месяцаў ён ўжо ня Прэзыдэнт БЦР, а толькі часова выконвае абавякі й што ў хуткім часе скліча пленум БЦР». Камэнтуючы заклік да «каардынацыі дзейнасьці», сказаў, што гэта ня зьдзейсьніцца бо беларуская эміграцыя дзеліцца на адукаваных і цёмных, чэсных і жулікаў, нармальных і ненармальных і г.д. Калі дакладчык думаў пра прыхільнікаў свае групоўкі, то ён мала ў чым памыляўся.

У прамове Р.Астроўскі заявіў, што ён адмаўляецца ад прэзыдэнства БЦР на чарговым Пленуме БЦР, што мае адбыцца ў восень 1960 году. Атакі на яго запрызнаньне, што высьвячэньне біскупа Ч.Сіповіча ёсьць карысным для беларускай нацыянальнай працы, былі падставай да абвінавачаньня Астроўскага, што ён падтрымоўвае вуніяцтва й іхнюю дзейнасьць на эміграцыі.

Выглядала, што Р. Астроўскі пакідае актыўную палітычную дзейнасьць, а гэтым самым зьнікне галоўная перашкода да аб'еднаньня й каардынаваньня дзейнасьці беларускае эміграцыі Аднак сталася

іначай, інтарэсы бецэзраўскай зарубежніцкай групоўкі былі пастаўленыя вышэй інтарэсаў беларускага народу

Аналізуючы выступленьне праф.Р.Астроўскага, выглядае, што ён зразумеў, што яго дзейнасьць на эміграцыі, запачаткаваная ў 1946 годзе, пры дапамозе аддзела СІС 9, заканчваецца. Да гэтага часу яна стаяла на перашкодзе ліквідацыі падзелу беларускае эміграцыі. З ростам і развоем грамадзкага жыцьця пачалі тварыцца групоўкі «асабістых інтарэсаў». Паказьнікам гэтага быў супраціў І. Касяка да стварэньня каардынацыйнага камітэту для супольнай дзейнасьці ў Паўночнай Амэрыцы. Падобнае зьявішча ўжо выяўляецца ў лягеры БНР, але пачакаем што будучыня прынясе.

ХУІ пленум Беларускай Цэнтральнай Рады адбыўся 22 кастрычніка 1960 году ў Саўт Рывэры. На просьбу ўсіх сяброў—удзельнікаў пленуму Р.Астроўскі даў сваю згоду ячшэ на адну кадэнцыю (1960-1965) быць Прэзыдэнтам БЦР. Адначасна сябры беларускага вызвольнага фронту (шэф штабу палкоўнік Д.Касмовіч) прыракалі прэзыдэнту поўнае сваё падтрыманьне ва ўсіх пачынаньнях.

Прэзыдыюм пленуму перавыбраны ў папярэднім складзе: старшыня—др.Арэхва, віцэ-прэзыдэнт—Карповіч і сакратар І. Шчорс. Выканаўчы ворган: старшныя А. Сянкевіч, сябры А.Евец і П.Саўчыц

У сувязі з прыездам у ЗША на Асамблею Задзіночаных Нацыяў Хрушчова й сакратара КПБеларусі М.Мазурава ды лідэраў камуністычных краінаў, быў створаны «Камітэт амэрыканскае акцыі», у які ўвайшло Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, для каардынацыі пратэсту супраць прысутнасьці няпрошаных гасьцей. Паседжаньні гэтага камітэту адбываліся штодня на працягу цэлага тыдня. На кожным зь іх быў прысутны старшыня Галоўнае Ўправы К.Мерляк. У сыботу, 17 верасьня 1960 году адбыўся пратэстацыйны мітынг, а ў нядзелю 18 верасьня камітэт ладзіў вялікую масавую дэмастрацыю, у якой ўзялі ўдзел беларусы. Дэманстранты, прайшоўшы із сьцягамі й плякатамі па Пятым авеню, меліся зьвярнуцца на Парк авэню й затрымацца перад будынкам савецкай місыі. Паліцыя аднак накіравала яе іншым шляхам й загадала неўзабаве разыйсьціся. Аднак старшыня Галоўнае Ўправы К.Мерляк, на сваю адказнасьць павёў беларускіх дэманстрантаў на Парк авэню, а за ім да будынку савецкае місыі накіравалася ўся маса дэманстрантаў, якія пачалі штурмаваць місыю, але прысланая дадатковая конная паліцыя да гэтага

не дапусьціла. У дэманстрацыйным паходзе беларусы несьлі плякаты ў ангельскай мове «Кат Беларусі, ты нас не пахаваеш», «Суіснаваньне з савецкімі злачынцамі—ніколі», «Хрушчоў забойца», «Божа, вызвалі Беларусь» ды іншыя.

19 верасьня камітэт рэспубліканскае партыі правёў у Вашынгтоне канфэрэнцыю прадстаўнікоў нацыянальных арганізацыяў ЗША. На канфэрэныцю гэтую прыбылі прадстаўнікі з усяе прасторы дзяржавы, што рэпрэзэнтавалі 42 нацыянальнасьці. Беларусаў на канфэрэнцыі рэпрэзэнтаваў старшыня Галоўнай Управы БАЗА сп.К.Мерляк. Кіраўнікамі канфэрэнцыі былі: губэрнатар штату Мэрылэнд, які ў 1956 годзе праклямаваў Дзень 25 сакавіка «Беларускім днём ў Мэрылэндзе», А. Гэрман з Вашынгтону й Джон Рычардсон зь Нью Ёрку. Галоўным прамоўцам быў віцэ-прэзыдэнт ЗША Рычард М.Ніксан, а таксама сакратар працы Джэймс Мітчэл. Віцэ-прэзыдынэт вельмі цікавіўся справамі паасобных нацыянальных арганізацыяў і шмат гутарыў з нацыянальнымі прадстаўнікамі. У гутарцы з сп. Мерляком ён успомніў аб сваім першым спатканьні з Уладыкам Васілём у Вашынгтоне два гады таму й прасіў перадаць Уладыку й усім сябрам БАЗА прывітаньне, даручаючы сп.Мерляку сваю фатаграфію з адмысловай дэдыкацыяй. Каля поўдня ўсе дэлегаты канфэрэнцыі былі прынятыя ў Белым Доме прэзыдэнтам Айзэнгаўэрам, які прывітаў іх сардэчнаю прамоваю.

Перад будынкам місыі савецкай Беларусі пры ААН (адрас—6 Іст 67 вуліца, Нью Ёрк), дзе знаходзіўся сакратар КП Беларусі, 22 верасьня беларусы наладзілі масавае пікетаваньне.

У сыботу, 15 кастрычніка вечарам, быў зладжаны прадвыбарчы інфармацыйны вечар. Праграму вечара складалі выступленьне запрошаных прадстаўнікоў з дэмакратычнае партыі сп.Фурта й рэспубліканскай партыі сп.Фалько. Сп.Фурт прадставіў плятформу дэмакратычнае партыі й гаварыў, чаму беларусы павінны галасаваць за Дж.Кэнэды , сп.Фалько шырока й вельмі жыва пераконваў беларусаў галасавць за Р.Ніксана. К.Мерляк гаварыў аб палітыцы абедзьвюх партыяў, з гледзішча інтарэса амэрыканцаў беларускага паходжаньня. Пасьля выясьненьня прадстаўнікоў абоіх партыяў адбылася жывая дыскусія. Вечар закончыўся пачастункам.

8 лістапада ў ЗША адбыліся выбары прэзыдэнта, віцэ-прэзыдэнта й цэлага шэрагу сэнатараў ды кангрэсмэнаў, якія мелі кіраваць

амэрыканскім народам на працягу бліжэйшых 4-х год. Зацікаўленьне гэтымі выбарамі было незвычайна вялікім. Узялі ў іх вельмі актыўны ўдзел і беларусы , што ўжо мелі амэрыкансае грамадзянства. Новым Прэзыдэнтам ЗША быў выбраны Джон Ф. Кэнэды, а віцэ-прэзыдэнтам —Ліндон Б.Джонсан абодва кандыдаты ад дэмакратычнае партыі.

Галоўная Управа БАЗА выслала зараз-жа новаабранаму Прэзыдэнту ЗША тэлеграму гэткага зьместу.

«Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне ў ЗША віншуе Вас з выбарам на найвышэйшае становішча—Прэзыдэнта Задзіночаных Штатаў Амэрыкі. Мы запэўніваем Вам нашую лаяльнасьць і поўнае падтрыманьне ў Вашых будучых намаганьнях забяспечыць сьвету мір, а ўсім людзям і народам—свабоду. Старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА ў ЗША К.Мерляк».

У нядзелю 20 верасьня адбылося сьвяткаваньне 65-х угодкаў нарадзінаў генэрала Франьцішка Кушаля, зладжане ўпрваваю Ньюёркскага аддзелу Згуртаваньня Беларускіх Вэтэранаў на чужыне зь вялікай колькасьцю прысутных і з асабістымі прамовамі

Адзначэньне 40-х угодкаў Слуцкага збройнага чыну 4 сьнежня закончыўся надзвычай актыўны 1960 год

# Ненапісаная кніга

Пачынаючы з 1956 году, на працягу некалькі гадоў савецкая прэса друкавала «дакумэнтальныя аповесьці» пра дывэрсантаў, шпіёнаў і арганізатараў-партызанаў, якія былі скіданыя на амэрыканскіх парашутах на тэрыторыю Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

«Комсамольская правда», пачынаючы з 19 сьнежня 1956 г.(№296 (9702) да 30 сьнежня (№306 (9712)) друкавала дакумэнтальную аповесьць «Квадрат Б-52». На карце Беларусі квадрат Б-52 займае тэрыторыю Налібоцкае пушчы, Івенца, Валожына, Ліды й Наваградку. Падзеі аднак расьцягнуліся далей граніцаў квадрату 52 і ўлучалі Баранавічы.Час ад часу паяўляліся артыкулы падобнага зьместу або скарачэньні аповесьцей у газэтах «Звязда», «Колхозная правда» ды іншых. У 1956 годзе Дзяржаўным выдавецтвам БССР была выдадзена кніжыца «Па воўчых сьцежках» М.Пасьлядовіча. У гэтых артыкулах і аповесьцях аўтары апісвалі як добрасумленна працаўнікі дзярж-

бясьпекі на чале з генэралам Бубановым і генэралам Проніным выконвалі абавязкі савецкіх грамадзянаў, вылаўліваючы групы бандаў, засланых амэрыканцамі на тэрыторыю БССР у супрацоўніцтве з Радай БНР і з такімі асобамі як М.Абрамчык, Б.Рагуля, П.Сыч і В.Амор. У аповясьцях падрабязна апісваліся вялікія акцыі выкрыцьця дывэрсантаў і бандаў, арышты й допыты ды пра шырокае супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва ў аблаве на ворагаў «савецкае ўлады».

Вынікам шумнае й вялікае акцыі двух генэралаў з Масквы зь незьлічонай колькасьцю прафэсыйных супрацоўнікаў МВД, было пададзена, што злоўлены й асуджаны на кару сьмерці А.Касьцюк, М.Вострыкаў і Філістовіч. М.Арцюшэўскі, які зьявіўся да МВД і сваімі інфармацыямі дапамог палавіць парашутыстаў, вучыцца ў інстытуце, а «Джоў» (амэрыканская мянушка, прозьвішча не падавалася) застаўся забітым падчас нападу на лягер партызанаў.

Няма сумніву, што дывэрсантамі былі арганізованыя зь мясцовага насельніцтва антысавецкія партызаны. Таксама друкаваліся адозвы й лятучкі, якія пашыраліся сярод грамадзтва, заклікаючы да змаганьня за вызваленьне свае Бацькаўшчыны.

Посьпехі МУС з калярова апісанымі дэталямі аб геройстве, аддадасьці й патрыятызме мясцовага насельніцтва, як было пададзена й апісана ў прэсе, не адпавядалі праўдзе.

Аб дзейнасьці беларускіх дывэрсантаў, падрыхтоўвалася да публікацыі кніга, у якой, калі-б яна была выдадзена, апісваліся посьпехі й геройскія ўчынкі, а таксама й няўдачы ды раскрывалася савецкая хлусьня адносна дзейнасьці «Арміі вызваленьня», аб чым сьведчыць правераны адзін эпізод, а такіх было нямала.

Аўген (Геня) Касьцюк зь вёскі каля Наваградка, пэўны час дзеіў у Наваградчыне. Яго распазнала адна жанчына ў вайсковым мундзіры з рангам маёра, аб чым яна сьведчыла пад прысягай. Другі сьведка, гаспадар дому, у каго быў на кватэры ў Наваградку вайсковы доктар хірург. Ён падслухаў гутарку хірурга із сваім госьцем палкоўнікам наступнага зьместу: у 1953 годзе, у пачатку чэрвеня, распачаліся вялікія манэўры па лініі Ліда—Наваградак—Гарадзішча—Баранавічы, якімі камандаваў намесьнік беларускае ваеннае акругі маршал С.Цімашэнка. Падчас манэўраў Цімашэнка быў ранены й прывезены ў Наваградак, а ён, хірург, зрабіў яму апэрацыю. Палкоўнік свайму сябру дапоўніў, што з праведзенага сьледзтва аказалася, што афіцэр у ранзе

маёра хацеў забіць маршала, дзеля гэтага ўсе маёры былі арыштаваныя, аднак віноўнага маёра не выкрылі, думаюць што гэта быў амэрыканскі дывэрсант.

Восеньню 1954 году між афіцэрамі корпусу, які стаяў у кашарах пабудаваны палякамі ў Скрыдлеве, у 4 кіламэтрах ад Наваградка, хадзіла вестка, што мноства жаўнераў і афіцэраў было атручаных. Праведзенае сьледзтва паказала, што атрута была замежная, бо такую ў Савецкім Саюзе не прадукуюць.

Вясною 1955 году Касьцюк наведаў сваю вёску. Прабыўшы толькі два дні, ён паціху, як прышоў, так і пакінуў яе назаўсёды.

На паказовым рацэсе ў Баранавічах Касьцюка абвінавачвалі ў вышэй апісанай антысавецкай дзейнасьці. Касьцюк на працэсе трымаўся мужна й па-геройску. Яго апошні кліч: «Сьмерць бальшавізму» й «Жыве Беларусь!» гучыць у душы беларускага народу.

## Спроба заманіць Мерляка на «Радзіму»

Для абмену прэсы й кніжак з БССР і Польшчы быў улажаны адмысловы пункт, з незалежным й асобным адрасам ад беларускіх арганізацыяў у Нью Ёрку. У канцы 1958 году гэтую ўстанову пад кіраўніцтвам сп. А.Шукелайца ўлякавалі ў магазыне В. Яшчука пры 10-й вуліцы ў Нью Ёрку. Адрас пункту быў пададзены да ведама ў беларускай прэсе.

У студзені 1959 году у магазын Яшчука прыйшоў чалавек і зацікавіўся беларускімі кніжкамі, распытваючы пра іх. Сп.Яшчук сказаў, што ён ня ў стане даць інфармацыяў, але можа пазнаёміць з чалавекам, які займаецца абменам беларускіх публікацыяў. На просьбу зацікаўленага Яшчук даў яму нумар тэлефону А.Шукелайца. А.Шукелайц хутка спаткаўся з гэтым чалавекам, які прадставіўся Сашай. Саша аказаўся гутарлівым чалавекам (размаўляў па-расейску). Ён выявіў зацікаўленьне ў гісторыі Беларусі й сказаў, што хацеў-бы пазнаёміцца з кім-небудзь зь беларускіх гісторыкаў ды, наогул, зь дзейнымі беларусамі. З кароткай гутаркі Шукелайц ня змог зразумець, куды Саша загінае й заклясыфікаваў яго «як падазорнага».

На наступнае спатканьне з Сашай Шукелайц запрасіў Кастуся Мерляка, каб той быў зь ім у таварыстве падчас сустрэчы. Яна адбы-

лася 26 студзеня 1959 году ў магазіне пры 10-й вуліцы ў Нью Ёрку. А.Шукелайц прадставіў Кастуся, зазначыўшы, што ён, хаця, і не гісторык, але абазнаны зь беларускай эміграцыяй і зьяўляецца старшынёй мясцовае беларускае арганізацыі. Саша зараз-жа прадставіўся, як Аляксандр Раманавіч Сітнікаў, другі сакратар місыі БССР пры Аб'еднаных Нацыях у Нью Ёрку. Ветлівая, дыпляматычная гутарка на розныя сучасныя й агульныя тэмы ды падзеі ў сьвеце трывала больш за гадзіну. Пры разьвітаньні Кастусь даў Сашы свой нумар тэлефону з працы, і той паабяцаў яму пазваніць, каб спаткацца й выпіць па чарцы.

Прайшло каля трох месяцаў, а тэлефону ад Сашы Кастусь не дачакаўся. А.Шукелайц таксама ў гэтым часе ніякага кантакту зь ім ня меў ды наогул больш зь ім ніколі не спатыкаўся.

Кастусь не дзівіўся, чаму Саша ня звоніць, бо падобны выпадак здараўся ня першы раз. Шмат разоў Кастусь даваў свой тэлефон з працы працаўніком Беларускае савецкае місыі. Калі савецкая місія атрымоўвала тавары, асабліва водку, прывезеныя параплавамі Голанд—Амэрыка Лайн, Кастуся заўсёды клікалі выконваць функцыю перакладчыка. Бязумоўна, пры гэтай нагодзе з працаўнікамі беларускай місіі заводзілася гутарка й, урэшце, паступалі прапановы, каб дзенебудзь спаткацца пасьля службы. На жаль, ніколі ніводнае спатканьне так і не адбылося. Паступова Кастусь прыйшоў да высновы, што працаўнікі місыі, зрабіўшы праверку, хто такі ёсьць Мерляк, даносілі інфармацыю агентам МВД, а тыя не дазвалялі ніякія спатканьні.

У «Нью Ёрк Таймс» з 11 верасьня 1959 году Кастусь прачытаў, што Робэрт Довнінг, прэзыдэнт гарадзкое фінансавае карпарацыі запрасіў на 12 верасьня прафэсара Орвіда, дырэктара Вялікага тэатру СССР, разам з балетам у складзе 130 асобаў, наведаць «гняздо капіталістычных акулаў» (Ньюёркскую біржу), а пасьля разам адабедаць. Кастусь, працуючы недалёка ад Вол Стрыт, выкарыстаў нагоду, каб пабачыць балярынаў з Вялікага тэатру СССР. Нечакана пры ўваходзе ў Нью Ёрк Сток Эксчэндж, у тэатральным натоўпе заўважыў Аляксандра Раманавіча Сітнікава. Саша папрасіў прабачэньня, што з недахопу часу ня мог пазваніць, ды запрапанаваў спаткацца ў кнігарне «4 Кантынэнт», дзе прадаваліся савецкія газэты й кнігі. Кастусь падумаў, што яму выглядае нязручным спатыкацца з афіцыйнай асобай з Савецкага Саюзу, прычым нямалай рангі. Гэтага-ж дня ён павядоміў сваіх прыяцеляў у Вашынгтоне аб спатканьні.

Першае спатканьне прайшло ў гутарцы, якая ў асноўным зводзілася да пазнаньня адзін аднаго. Аляксандр сказаў, што яму 32 гады, што ён жанаты й мае двое дзяцей школьнага ўзросту. Яго праўдзівае прозьвішча Сітнік. Яго бацькі былі беларусамі, якія загінулі падчас вайны. Ён і яго брат былі забраныя савецкай уладай у глыб Расеі ў сірацінец. Там ён гадаваўся й атрымаў пачатковую асьвету, а дзеля гэтага не гаворыць па-беларуску. Цяпер працуе ў місыі й піша працу на тэму «Беларусь на міжнароднай арэне».

Кастусь, каб не заставацца ў даўгу, расказаў пра сябе. Гэта была раней прыгатаваная аўтабіяграфія, аб тым, што яго бацька па прафэсыі настаўнік і царскі афіцэр, што беларускае мовы ён навучыўся ў школах беларускіх арганізацяў, якіх было некалькі ў Аргентыне. Там-жа ён ажаніўся й выехаў у Амэрыку для лепшага жыцьця. На адыходзе Аляксандр сказаў Кастусю, каб той ніколі не званіў яму й папярэдзіў, што толькі ён будзе паведамляць аб наступных спатканьнях.

Наступная сустрэча, як і ўсе іншыя, адбываліся ў новым месцы. Пераважна, гэта былі піўнушкі або рэстараны. Аляксандр расказваў пра зьмены ў Беларусі, казаў, што цяперака жыцьцё палепшылася. Ён радзіў Кастусю ды іншым беларусам паехаць на «радзіму» й навочна пераканацца ў гэтым. Кастусь гаварыў, што гэта немагчыма пры сучаснай палітыцы Масквы, русыфікацыі народу, запачаткаванай Сталіным, якая праводзіцца далей, яшчэ з большай жорсткасьцю. Аляксандр пазьбягаў камэнтарыяў пра палітыку Сталіна, але сучасную палітыку моцна апраўдываў.

Кастусь спаткаўся з двума прыяцелямі з Вашынгтона. Разам прааналізавалі асобу «Сашы», узяўшы пад увагу дакумэнты й інфармацыю пра яго самога й ягонага брата Васіля Сітнікава, які зьяўляўся палкоўнікам МУС і знаходзіўся ў Вене, у якасьці шэфа англа-амэрыканскай разьведачнай групы. Яны прыйшлі да высnову, што Саша, зьяўляецца агентам МВД і мае на мэце нагаварыць Кастуся або каго другога вярнуцца на Радзіму.

На працягу некалькі спатканьняў павольна й дэлікатна праводзілася гутарка, з аднаго боку пра жыцьцё і палітыку ў Беларусі з пазытыўнымі пераканаўньнямі, каб заахвоціць на радзіму, а з другога Кастусь гаварыў тое самае пра Амэрыку, заахвочваючы Аляксандра застацца ў Амэрыцы.

У часе спатканьняў Саша, пры частай падліўцы ў чарку, раскрываў душу, расказваў пра сваё жыцьцё. Выглядала, што ён на ўсё згаджаўся, некалькі разоў казаў, што аб «гэтым» падумае. Характэрным аказаўся той факт, што пры наступным спатканьні Саша аказваўся абсалютна другім чалавекам, пачынаў тую самую гутарку, якая зводзілася да ўжо знаёмага выніку. У часе гэтых спатканьняў выявілася, што Саша перад прыездам у Амэрыку пабываў у Навагрудку, у месцы, адкуль паходзіў Кастусь, што ён чытае ўсю беларускую прэсу, што «Бацькаўшчына» яму не падабаецца, а «Беларус», разам з «Беларускім Голасам» наадварот. Ён сказаў , што ведае Кастусёвую праўдзівую біяграфію й нават тое, што той ёсьць сябрам Ураду БНР на чужыне.

Кастусь і яго прыяцелі прыйшлі да пераканаńньня, што гэтыя спатканьні трэба закончыць. Апошняя сустрэча Кастуся з Аляксандрам Раманавічам Сітнікавым адбылася ў восені 1960 году, на якой той распачаў знаёмую гаворку. Кастусь яго прыпыніў і сказаў, што ніколі не задумоваўся над паваротам на Радзіму, але гэта можа здарыцца толькі ў выпадку, калі Хрушчоў прыедзе ў Амэрыку й застанецца тут да яго павароту як гарантыя, каб не сталася тое самае што із Бэрыяй. «Але ты, Саша, на гэта не зьвяртай увагі, заставайся тут», — сказаў Кастусь ды зноў паўтарыў яму ўсе пэрспэктывы й гарантыі, на што той можа спадзявацца ў будучыні. Аляксандр паважна паглядзеў на Кастуся й сказаў, што ён над гэтым яшчэ раз падумае й пазвоніць, але Кастусь так больш званка ад Сашы ніколі не атрымаў.

Дзесьці ў пачатку сакавіка 1961 году прайшоў на працу да Кастуся агент ФБІ і запрасіў яго на асабістую гутарку. Агнет ФБІ паведаміў, што Аляксандр Раманавіч Сітнікаў вярнуўся назаўсёды ў Савецкі Саюз па заканчэньні 3-х гадовага турнэ за мяжою. Наступна выняў фатаграфію мужчыны, прапануючы яе добра праглядзець, бо: «Гэты чалавек, паводля інфармацыі, сочыць за Вамі. Мы ў гэтым выпадку нічога зрабіць ня можам, але рэкамэндуем быць пільным». Тут ён даў Кастусю інструкцыі як заховацца, каб яго здэмаскаваць, падаў нумар тэлефону, па якім трэба было званіць у выпадку патрэбы.

Аднак Кастусь ніколі не заўважыў, каб за ім хто-небудзь сачыў.

# 1961

Новы 1961 год беларускае грамадзтва як заўсёды спаткала на балі, ладжаным акруговаю ўправаю БАЗА ў грамадзкім цэнтры.

7 студзеня Нью Ёркскі аддзел Згуртаваньня Беларускае Моладзі ў ЗША ладзіў сваю ялінку. У праграме быў Дзед Мароз з падарункамі й мастацкі мантаж Н.Арсеньневай «Беларускія Калядкі», пасьля былі сяброўскі пачастунак і танцы.

8 студзеня жаночая сэкцыя БАЗА—старшыня Ксеня Тумаш—падрыхтавала калядную ялінку для дзяцей з самадзейным выступленьнем дзяцей беларускае школы.

У гэтым месяцы адбылося паседжаньне Галоўнае Ўправы БАЗА, на якім разглядаліся розныя арганізацыйныя справы й дачыненьні, што заіснавалі між управаю й рэдакцыяй газэты «Бацькаўшчына». Таксама адбылося паседжаньне прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР, на якім былі амбяркованы плян працы й некаторыя тэрміновыя пытаньні, пераважна нутранога парадку.

Былі адзначаны 40-я ўгодкі сьвятарскае й грамадзкае працы а.Ф.Чарняўскага ды арганізаваны вечар, прысьвечаны ўспамінам а.Язэпа Германовіча, які адпакутаваў 12 гадоў у Савецкіх турмах і лягерох. Айцец Германовіч у сваіх успамінах выявіў тайніцы й мэтады бальшавіцкіх сьледстваў, турэмныя ўмовы да жыцьця вязьняў у камуністычным раі.

У сувязі з асьветчаньнем і пратэстам Галоўнае Ўправы БАЗА, прынятым на паседжаньні 2 студзеня 1961 году, у справе зацемкаў ад рэдакцыі «Бацькаўшчына», якія абніжаюць аўтарытэт старшны БАЗА, а гэтым самым і аўтарытэт арганізацыі. К.Мерляк у сваім камунікаце «Справядлівасьць рэдакцыі «Бацькаўшчына» дакладна выясьняе ў чым справа:

«Рэдакцыя Газэты «Бацькаўшчына» ў зацемцы «Ад рэдакцыі» зьмешчанай у № 46-47 (530-531) за 27 лістапада 1960 г. перад артыкулам «Пытаньні парушаньня сп.К.Мерляком» падала пачатак і канец ліста да старшыні Рады БНР, у якім зьвярталася ўвага на праводжаную Рэдакцыяй цэнзуру й на не зьмяшчэньне ў газэце матэрыялаў, прысыланых да друку старшынёй Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня.

У гэтай-жа зацемцы «Ад рэдакцыі» намагаюцца давесьці, што ніякай цэнзуры не праводзіцца, але ня друкуюць толькі «некаторых пісанінаў сп.Мерляка» й як довад зьмясьцілі вышэй упамянутыя выняткі з наўмыснымі тэхнічнымі памылкамі пры перапісваньні тэксту з лацінкі на кірыліцу.

Бязумоўна, аўтар не залічвае сябе да моваведаў ці стылістаў, бо палітычная каньюкткура ў Заходняй Беларусі, як і ў БССР, ня кожнаму давала магчымасьці вучыцца й канчаць беларускія школы, як тым, што сёньня ведамі беларускімі добра падзарабляюць.

Аб праводжанай рэдакцыяй «Бацькаўшчына» цэнзуры добра ведама беларускім журналістам і дапішчыкам, якія толькі таму больш і не супрацоўнічаюць. Гэта й ёсьць адной з прычынаў, чаму «Бацькаўшчына» сталася бясстварнай і нецікавай беларусам газэтай.

Матар'ялы, якія рэдакцыя «Бацькаўшчыны» называе «пісанінай», не зьмяшчаліся толькі таму, што ў іх крытыкавалася палітыка, якую праводзяць рэдактары газэты з сваймі апякунамі. У довад вышэйсказанага дапаўняецца ліст да старшыні Рады БНР і прыводзяцца факты, якія сьведчаць аб «справядлівасьці» рэдакцыі «Бацькаўшчыны».

1. Рэдакцыя «Бацькаўшчыны» адмовілася надрукаваць мэмарыял, зложаны Дзяржаўнаму сакратару ЗША ў справе канфэрэнцыі на найвышэйшым узроўні, які быў надрукаваны ў «Конгрэссінал Рэкорд».

2. Прамова старшыні Галоўнае Ўправы БАЗА на ІУ Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Кліўленьдзе, на падставе якой былі прынятыя рэзалюцыі, рэдакцыя «Бацькаўшчыны» не надрукавала.

3. Матар'ялы з дыскусіі на прадвыбарчым вечары, на якім прысутнічалі прадстаўнікі Дэмакратычнай і Рэспубліканскай партыяў ЗША. Рэдакцыя «Бацькаўшчына» таксама не надрукавала.

«Ня трэба дадумоўвацца, што гэтыя матар'ялы ня былі надрукаваныя з тае прычыны, што ў іх пасрэдна або беспасрэдна зьвярталася ўвага на прарасейскую палітыку Амэрыканскага камітэту або дзейнасьць некаторых асобаў, зьвязаных інтарэсамі асабістага характару.

Адкіданьне матэр'ялаў Беларуска—Амэрыканскага Задзіночаньня й праводжаная рэдакцыяй «Бацькаўшчына» цэнзура зьяўляецца не дэмакратычным актам, але перадусім актам шкодным беларускаму вызвольнаму руху.»

Рэдакцыя «Бацькаўшчыны» ў сваім лісьце ад 5 ліпеня 1960 г. не надрукавала мэмарандум БАЗА Дзяржаўнаму сакратару ЗША ў спра-

ве канфэренцыі на найвышэйшым узроўні, бо ўважала, што ня меў, ён і мецьь ня мог ніякай палітычнай вагі». Чаму не пададзена, на якой аснове рэдакцыя зрабіла гэтакі выснаў.

Аднак кангрэсмэн Віктар Л.Анфусо меў іншыя погляды й у прамове на паседжаньні Кангрэсу сказаў: «Ліст сп.Мерляка мае вельмі здаровыя парады напярэдадні канфэрэнцыі на вершаліне Вялікіх Чатырох, што адбудзецца ў гэтым месяцы. Я ўпэўнены, што Дзяржаўны сакратар і яго дарадцы ў дэпартамэньце штата возьмуць пад увагу погляды, выказаныя ў гэтым лісьце».

(Конгрэсіянал Рэкорд за 4 травеня 1960, бач, А31819)

Рэдактар др.С.Станкевіч пры ад'езьдзе з Амэрыкі ў Эўропу, прыабяцаў, што прамову старшыні БАЗА на ІУ Сустрэчы Беларусаў у Кліўленьдзе надрукуе, але напэўна пазьней атрымаў загад старшыні Рады БНР падобны да таго, які атрымаў адносна атрыкулыа«Дык у чым справа». Але гэтую прамову чулі ўсе прысутныя на імпрэзах ІУ сустрэчы і далі ёй належную ацэнку.

За надрукаванае дыскусыйнага матар'ялу з прадвыбарчага вечару складаю тутака рэдакцыі падзяку. Такім чынам, хоць і з прымусу, рэдакцыя «Бацькаўшчына» апраўдала, час ад часу друкуемыя, радкі: «Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам або ініцыяламі аўтара, не заўсёды выражаюць пагляды рэдакцыі».

Паданыя вытрымкі зь ліста далёка ня вычэрпываюць яго зьместу. Таксама тут не закранаюцца справы незьмяшчэньня атрыкулаў і дапісак, якія падпісваліся псэўданімамі.

На запытаньне, чаму рэдакцыя «Бацькаўшчыны» не надрукавала прамовы старшыні Галоўнай Управы БАЗА, прачытанай на акадэміі 25 Сакавіка У Нью Ёрку, рэдакцыя адказала:

«Прамова старшыні Галоўнае Ўправы БАЗА на акадэміі 25 Сакавіка была зьмешчаная ў «Конгрэсіянал Рэкорд», а прамова Прэзыдэнта Рады БНР М.Абрамчыка, сказаная на тым-жа сьвяткаваньні, у «К.Р» чамусьці зьмешчаная ня была. Таму рэдакцыя «Бацькаўшчыны» эвентуальнае надрукаваньне прамовы старшыні БАЗА уважае за нетакт пры незьмяшчэньні ў ім прамовы прэзыдэнта Рады БНР, абніжаючы аўтарытэт Прэзыдэнта Рады БНР».

(Ліст рэдакцыі «Б» ад 5 ліпеня 1960 г.)

З зьместам згаданае прамовы бальшыня беларускага грамадзтва мела нагоду азнаёміцца пазьней з «Выняткаў з Запісаў Амэрыканскага

Кангрэсу», выданых у Вашынгтоне й пашыраных Галоўнай Управай БАЗА ў жніўні 1960 году.

Пададзенае вышэй яскрава сьведчыць аб тым, што рэдакцыя «Бацькаўшчыны» не друкавала іх не таму, што яны былі «пісанінай».

Рэдакцыя «Бацькаўшчыны» ў зацемцы цьвердзіць, што «становішча Галоўнае Ўправы БАЗА адносна IУ Сустрэчы Паўночнай Амэрыкі» надрукаванае ў № 28 за 17 ліпеня 1960 году, «было асабістым становішчам сп.Мерляка, бо Галоўная Ўправа БАЗА да часу яго надрукаваньня зусім аб ім ня ведала». Аднак гэтае становішча было занятае на паседжаньні Галоўнае Ўправы БАЗА 15 травеня 1960 году, а пазьней на супольным паседжаньні прадстаўнікоў Галоўнай Управы БАЗА й ўправы БАЗА ў Кліўленьдзе 29 травеня 1960 году ў Нью Ёрку. Сябра Галоўнае Ўправы, які сказаў, што аб гэтым становішчы ня ведаў, на жаль, на паседжаньні 28 травеня ня прысутнічаў.

Старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА палічыў мэтазгодным у абставінах, якія зпажыліся падчас падрыхтоўкі сустрэчы, падаць да ведама аб тым, што ўдзельнічаць запрашаюцца ўсе беларускія масавыя арганізацыі, а не аднаасабовыя ці сямейныя.

Дапусьцім, што гэта было «вылучнае становішча сп.Мерляка». Аднак і яно не пазьбегла цэнзуры рэдакцыіі «Бацькаўшчыны», бо «Крывіцкае Навуковае Таварыства» было выкрэслена рэдакцыяй зь ліку сямейных арганізацыяў, і гэта, хіба дзеля таго толькі што сябрамі гэтае арганізацыі зьяўляецца радня рэдактара «Бацькаўшчыны».

Цынізм рэдакцыі «Бацькаўшчыны» ня быў-бы такім нахабным, каб у гэтым-жа нумары яна ня выкінула з дапіскі «Гадавы сход Беларуска-Амэрыканскае Дапамогі (БАД)», якая нават была ўзгоднена з упраўаю БАД, наступны абзац:

«У дыскусыі была зьвернутая ўвага на патрэбы пашырэньня дзейнасьці дапамогі й арганізацыю прадстаўніцтваў БАД у Францыі ды рэарганізацыю існуючай рэпрэзэнтацыі ў Нямеччыне. Некаторыя прысутныя, а ў асаблівасьці др. Янка Станкевіч дамагаўся неадкладна парваць дачыненьні з Беларускім Нацыянальным Камітэтам, і для аргумэнтацыі прачытаў свой артыкул, надрукаваны свайго часу ў«Сейбіце», на які рэдакцыя газэты «Бацькаўшчына», адмовілася зьмясьціць. Хоць былі такія, што падзялялі пагляд др.Я.Станкевіча адносна бязьдзейнасьці Беларускага Нацыянальнага Камітэту й цэнзуры рэдакцыі «Бацькаўшчыны», аднак ягоныя закіды пад адрасам

сацыяльнага рэфэрэнта Беларускага Нацыянальнага Камітэту былі адкінутыя».

(Ліст БАД да Рэдакцыі «Бацькаўшчына» ад 8 лістапада 1960)

На аснове вышэйпададзенага, кароткага, некамплектнага матар'ялу беларускае грамадзтва агулам, а сябры БАЗА ў асаблівасьці, маюць нагоду перапаканацца, чаму рэдакцыя «Бацькаўшчыны» не друкавала пасыланых ей матэр'ялаў ды заняць адпаведнае становішча адносна яе намаганьня абнізіць аўтарытэт Беларуска.-Амэрыканскага Задзіночаньня, нягледзячы на тое, што бальшыня яе чытачоў у Амэрыцы зьяўляюцца сябрамі гэтае арганізацыі.

К.Мерляк.
Старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА
Нью Ёрк,
17 студзеня 1960 г.

Камунікат «Справядлівасьць» рэдакцыі «Бацькаўшчына» быў поўнасьцю зьмешчаны ў наступных часопісах:

«Незалежная Беларусь» год III, № 4, сакавік 1961 г. Англія.

«Барацьба» № 40 сакавік, 1961 г. Нямеччына.

«Сяўбіт» № 9, сакавік-красавік 1961 г. Амстэрдам, Нью Ёрк.

«Беларускі Голас», № 78 люты 1961 г. Таронта, Канада, з наступным камэнтарыям:

«У канцы К.Мерляк загразіў, што, калі далей «Бацькаўшчына» ня будзе друкаваць поўнасьцю матэрыялы БАЗА, дык гэтыя матэрыялы «будуць надрукаваныя ў дасупных беларускіх і небеларускіх газэтах. А таксама Галоўная Ўправа БАЗА змушаная будзе заняць адпаведнае становішча й падаць яго да ведама беларускаму грамадзтву ў вольным сьвеце, а перадусім у Амэрыцы». Пагроза ўжыцьця балонак «Беларускага Голасу» ўправай БАЗА для сваіх антытаталістычных і антынепрадрашэнскіх асьветчаньняў (бо адзіная-ж паза «Бацькаўшчынай» пэрыядычная беларуская газэта «Беларускі Голас») гэтак напалохала Абрамчыка, што той даў загад надрукаваць у «Бацькаўшчыне» не падабаючыся непрадрашэскім цэнзарам матэрыялы БАЗА».

«Сьвет», № 20, 1961, Дэтройт, Мічыган, камэнтаваў: «Ведамая газэта «Бацькаўшчына» зьмясьціла была няпрыгожую зацемку «Ад

Рэдакцыі» да пытаньня ў парушаных сп. К.Мерляком, якая выклікала нясмак у сяброў БАЗА».

«Беларуская Думка», № 2, чэрвень 1961 году ў артыкуле «Правакацыі й «Бацькаўшчына» заўважвае: «Пан Абрамчык пазвоніць з Парыжа, да Стася, што падкусіў Мерляка, пра тое, што мяне праклалі маці, жонка й інш. меней істотнае».

З гэтае нагоды Кастусь Мерляк атрымаў нямалую колькасьць спагадлівых лістоў. У адказе на ліст, атрыманы ад сп. А.Вініцкага зь Лёс Анджэлес, у якім той выясьняў становішча газэты «Бацькаўшчына», Кастусь пісаў: «Рэдакцыя «Бацькаўшчына» мусіла спадзявацца рэакцыі на несправядлівую аргумэнтацыю па цэнзуры, бо каб яна падала праўду да ведама, то справа інакш выглядала-б.

Ведаючы, адкуль «Бацькаўшчына» дастае грошы на выдавецтва й ведаючы,чаму іх дастае, а таксама ведаючы ў імя чаго «Бацькаўшчына» наводзіць цэнзуру й не дапушчае да друку антыімпэрыялістычных матэрыялаў, кожны сумленны беларус павінен быў-бы запрэтаставаць, так як Мерляк гэта зрабіў. «Бацькаўшчына» без патрэбы пачала пісаць бязглузьдзіцу, ня хочучы нават выясьніць справу прыватнаю дарогаю.

Фінансаваньне «Бацькаўшчыны» ня мае нічога супольнага з прычынамі, дзеля якіх не друкуе матэрыялу, а наадварот даюцца грошы для ўзмацьненьня беларускага вызвольнага руху. Рэдактары «Бацькаўшчына»,якія на службе Амэрыканскага камітэту, які праводзіць палітыку апраўдываньня расейскага імпэрыялізму, аслабляе гэты рух. Дзеля гэтага беларуская эміграцыя не стварыла матарыяльнае базы, і калі так пойдзе, ніколі яе ня створыць, а нават тое, што зроблена разваліцца. Дзеля гэтага лепш позна, чымся ніколі, хаця-б нават некалькі асобаў страцілі добра платныя калябаранцкія жалаваньні».

Галоўная Управа БАЗА 7 лютага 1961 году паведаміла беларускае грамадзтва, што ў Нью Ёрку памёр сябра БАЗА, сьв. пам.Уладзімір Другавец, асіраціўшы жонку й двое дзяцей. Паховіны сьв. пам. Ул.Другаўца адбыліся 11 лютага на беларускіх могілках Жыровіцкае Божае Маці ў Нью Брансьвіку. Над магілаю ў Нью Брансьвіку прамаўлялі сп.Ал.Стагановіч ад Рады БНР й сп.К.Мерляк ад Галоўнае Управы БАЗА.

У першых днях лютага Галоўная Управа БАЗА выслала ліст да новага Прэзыдэнта ЗША Кэнэды ў справе беларускае мовы ў «Голасе

Амэрыкі», шырока аргумэнтуючы яе неабходнасьць у беларускіх і амэрыканскіх інтарэсах. Тэкст гэтага ліста, на прапанову сэнатара Кэнэта Кітынга, быў зьмешчаны ў «Запісах» Амэрыканскага кангрэсу 6 лютага 1961 году.

4 сакавіка адбылося чарговае паседжаньне Галоўнае Управы БАЗА, на якім былі разгледжаныя справы: 43-я ўгодкі Акту 25 Сакавіка, прынятая інструкцыя для аддзелаў БАЗА ў сувязі з надыходзячым IX кангрэсам БАЗА. Палагоджаныя іншыя розныя справы.

З нагоды 43-х угодкаў незалежнасьці БНР Галоўная Ўправа БАЗА атрымала 18 сакавіка прывітаньне й падарунак ад Прэзыдэнта ЗША Джона Ф.Кэнэды. Гэта прыгожы партрэт Прэзыдэнта зь ягонай собскай дэдыкацыяй: «Беларуска—Амэрыканскаму Задзіночаньню з найлепшымі пажаданьнямі. Джон Ф.Кэнэды».

22 сакавіка беларуская дэлегацыя ў складзе старшыні Галоўнае Ўправы К.Мерляка й архіяпіскапа БАПЦ Васіля наведалі Вашынгтон, дзе яны злажылі візыту сэнатару Якубу Джавіцу, які прадставіў беларускую дэлегацыю віцэ-прэзыдэнту Ліндану Б.Джансану. Віцэ-прэзыдэнт Джансан ветліва сустрэў беларускіх прадстаўнікоў Уладыку Васіля й сп. К.Мерляка ў сваім кабінэце ў Капітолі. Ён прывітаў іх, як сваіх старых знаёмых, бо сустракаўся ўжо зь імі, будучы сэнатарам. Таму й далейшая гутарка была сардэчная.Віцэ-прэзыдэнт цікавіўся беларускімі справамі й пажадаў нашым прадстаўнікам хутчэйшага вызваленьня Беларусі з бальшавіцкае няволі .У знак гэтага зычэньня сустрэча была замацаваная на клішы, зробленым пакліканым ў кабінэт фатографам.

Абвяшчаючы пачатак сэсыі сэнату, віцэ-прэзыдэнт Джансан абвесьціў, што сэсыя сэнату лічыцца адкрытаю й дадаў: «А цяпер прачытае нам малітву архіяпіскап Васіль ад Беларускае Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы ў Нью Ёрку». Уладыка Васіль прачытаў малітву за Амэрыку й Беларусь.

43-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР пачаліся 26 сакавіка Божымі службамі: праваслаўную адправіў у саборы сьв.Кірылы Тураўскі архіяпіскап Васіль, а каталіцкую—а. Я. Германовіч у капліцы сьв. Марыі ў Брукліне. Папаўдні адбылася ўрачыстая акадэмія, прысьвечаная сакавіковым угодкам у залі гатэлю «Білтмор» ў Нью Ёрку.

Акадэмію адкрыў старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА К. Мерляк, які прывітаў гасьцей і сказаў пры гэтым уступнае слова. Галоўнымі



*Віцэ-прэзыдэнт ЗША Ліндан Б.Джонсан вітае беларускую дэлегацыю 22 сакавіка 1961 г. у Вашынгтоне з нагоды 43-х угодкаў абвешчаньня незалежансьці Беларускай Народнай Рэспублікі.*

*Зьлева направа: сэнатар Аляксанадр Вілей, сэнатар Якуб К.Джавіц, капэлян сенату др.Феэрык Браўн Гарыс, архіяпіскап Васіль БАПЦ, віцэ-прэзыдэнт ЗША Ліндон Б.Джонсан, сэнатар Кэнэт Б.Кітыні і старшыня Галоўнае Управы БАЗА Кастусь Мерляк.*

прамоўцамі на акадэміі былі кангрэсмэн Самуэль С.Стратон ад штату Нью Ёрк, амбасадар Ф.Фэльпс. Таксама на акадэміі прысутнічалі старшыня інтэрнацыянальнага дапамогавага камітэту Джон Рычардсон, генэральны дараднік Карэйскае місыі пры Задзіночаных Нацыях Ченг-ган-Кім і прадстаўнік мэра гораду Нью Ёрку Джон Бэрн, які уручыў К.Мерляку праклямацыю мэра Вагнэра, што 25 сакавіка абвешчаны Днём беларускае незалежнасьці ў г.Нью Ёрку. Пасьля выступалі шматлікія прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцей ды паняволеных бальшавікамі народаў, а менавіта: з Украіны, Грузіі, Польшчы, Альбаніі, Славакіі й Ідэль-Уралу. Усіх на залі было прадстаўнікоў 41 асоба.

Пасьля прывітаньняў былі прачытаныя Галінай Ганчарэнка праклямацыі незалежнасьці Беларусі губэрнатарамі штатаў Нью Ёрк, Нью Джэрсі й Агаё, 9 тэлеграмаў ад сэнатараў і кангрэсмэнаў, прывітаньні ад міністра працы ЗША —Гольдбэрга, міністра камэрцыі ЗША—Лютэра, міністра юстыцыі ЗША—Робэрта Кэнэды, дырэктара ФБІ Гувэра й дырэктара агенцыі амэрыканскае інфармацыі Зд.Муроў. Было пералічана звыш 20 прывітаньняў ад губэрнатараў розных штатаў, ад 13 сэнатараў, 45 кангрэсмэнаў, 23 прадстаўнікоў гораду й штату Нью Ёрк і 24 прывітаньні ад беларускіх арганізацыяў. У канцы афіцыйнае часткі акадэміі была прынятая рэзалюцыя. Пасьля мастацкае часткі з выступленьнем хору БАЗА пад кіраўніцтвам А.Каптуровіча й маладых дэкляматараў, акадэмія закончылася адсьпяваньнем Беларускага нацыянальнага гімну.

У часе ад 21 сакавіка да 10 красавіка ў №№49-59 Кангрэсавага дзёньніка былі зьмешчаныя 22 выступленьні сэнатараў й кангрэсмэнаў ЗША, прысьвечаныя Дню незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі—25 Сакавіка.

1 красавіка адбылося паседжаньне арганізацыі «Амэрыканская канфэрэнцыя нерасейскіх народаў Савецкага Саюзу», сябрам якое была БАЗА. На паседжаньні была абмеркаваная справа рэзалюцыі за падтрыманьне мэмарандуму кангрэсмэна Флюда, які дамагаўся стварэньню адмысловае камісіі пры кангрэсе ЗША для справаў паняволеных Масквою народаў.

Парад Лаяльнасьці, ладжаны амэрыканскай арганізацыяй вэтэранаў замежных войнаў, пачаўся а гадзіне 9:30 сьнеданьнем у гатэлі «Барбізон Пляца» ў Мангэтане. На сьнеданьні былі прысутныя выдатнейшыя

амэрыканскія асобы, прадстаўнікі вайсковых фармацыяў ды прадстаўнікі нацыянальных арганізацыяў, што бралі ўдзел у парадзе. Ад беларусаў прадстаўнікамі на снеданьні былі генэрал Ф.Кушаль і сп.К.Мерляк. У часе сьнеданьня было сказана колькі патрыятычных ды антыкамуністычных прамоваў, якіх не сустрэнеш у амэрыканскай прэсе.

Парад Лаяльнасьці быў адчынены Яго Эмінэнцыяй кардыналам Спэльмэнам, губэрнатарам Ракфэлерам і мэрам Нью Ёрку Вагнэрам.

30 красавіка адбылося апошняе перад IX кангрэсам паседжаньне Галоўнае Ўправы БАЗА. Асноўным пытаньнем, якое стаяла на парадку дня была справа падрыхтаваньня кангрэсу.

Падтрыхтоўку да IX кангрэсу БАЗА вяла ня толькі Галоўная Ўправа, але таксама рэдакцыя газэты «Бацькаўшчына», якая ў артыкуле «Напярэдадні Гадавога зьезду БАЗА», надрукаванага ў № 16 (551) 16 красавіка 1961 году, між іншымі рэчамі пісала:

«...Неўзабаве мае адбыцца гадавы зьезд Беларуска—Амэрыканскага Задзіночаньня ў Амэрыцы. Паколькі апошнімі часамі паміж рэдакцыяй «Бацькаўшчына» й дасёлешнім старшынём Галоўнае Ўправы БАЗА' сп.К.Мерляком, было колькі прынцыповых разыходжаньняў. БАЗА —арганізацыя грамадзкая, апалітычная. Бясспрэчна, што сябры й кіраўнікі БАЗА маюць і павінны мець свае ідэялягічныя перакананьні й палітычныя пагляды. Ніхто ня можа забараніць ім, як паасобным адзінкам або сябром палітычных партыяў ці радным БНР выказваць свае перакананьні й пагляды ды праводзць іх у жыцьцё».

Разыходжаньні з БАЗА былі выкліканыя самой рэдакцыяй «Бацькаўшчыны», а не К.Мерляком, якому рэдакцыя «Бацькаўшчыны» сьвядома старалася прыпісаць віну.

Беларуска—Амэрыканскае Задзіночаньне ёсьць амэрыканскай грамадзкай арганізацыяй, але не «апалітычнай» у дачыненьні ЗША й да Рады БНР. Галоўная Ўправа БАЗА праводзіла грамадзкую й палітычную дзейнасьць згодна пастановаў кангрэсу й Галоўнае Ўправы, а старшыня К.Мерляк ніколі самавольна не праяўляў ніякае актыўнасьці, а толькі іх выконаваў. У довад гэтага ніводзін сябра ўправы ня выявіў свае «нязгоды» й не зрэзыгнаваў са свайго становішча ў Галоўнай Упра612ве.

Далей газэта «Бацькаўшчына» пісала: «Апошнім часам сталася, аднак , што старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА сп.К. Мерляк, чалавек,

бяспрэчна, дынамічны й энэргічны, з вышыні займанага становішча ўздумаў кіраваць ня толькі справы свае арганізацыі, але й вонкаваю палітыкаю цэлае Рады БНР».

Вось факты.

«У травені-чэрвені 1960 г. IX сэсія Рады БНР у Нью Ёрку, у якой браў удзел і радны сп. Мерляк між іншых пытаньняў вонкавае палітыкі разгледзела была й справу супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам. Пасьля дыскусіяў было прызнана й зафіксавана ў пастанове сэсіі, што ў вагульным супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам, не зважаючы на некаторыя нястачы й некаторыя прынцыповыя разыходжаньні, было дасёль фактам пазытыўным і карысным».

Рэдакцыя «Бацькаўшчыны» кажа, што К.Мерляк з «вышыні свайго становішча» уздумаў кіраваць ня толькі арганізацыяй БАЗА, але кіраваць вонкаваю палітыкуаю Рады БНР. Рэдакцыя «ўважае, што Мерляк не павінен забіраць голас у палітыцы Рады БНР. На жаль, ягонае становішча як старшыні Амэрыканскага сэктару Рады БНР, найбольшага на эміграцыі, як сакратара нутраных справаў ураду БРН на чужыне, як старшыні кантактнай камісіі Парыскага блёку й генэральнага сакратара канфэрэнцыі нерасейскіх народаў СССР ў Нью Ёрку, змушала выказвацца й забіраць голас у абароне беларускае нацыянальнае справы. А працаўнікі Амэрыканскага камітэту безасьцярожна ажыцьцяўлялі прынцыпы непрадрашэнскай палітыкі Амэрыканскага камітэту на радыё «Свабоды» й у Інстытуце па вывучэньню СССР. Гэтыя-ж працаўнікі ўласна тварылі рэдакцыю газэты «Бацькаўшчына» на чале з др.Станіславам Станкевічам.

Рэдакцыя «Бацькаўшчыны» прызнае, што не зважаючы на некаторыя нястачы, супрацоўніцтва было «дасюль фактам пазытыўным». Так, «дасюль», але адсюль у рэзалюцыі IX сэсіі Рады БНР было сказана: «Рада БНР у сваіх дачыненьнях да Амэрыканскага камітэту будзе старацца ажыцьцявіць усе пастановы IX сэсыі Рады БНР. У выпадку калі-б гэта аказалася немагчымым Рада БНР узалежніць свае далейшыя дачыненьні».

Але далей рэдакцыя «Бацькаўшчыны» прадаўжала ў іншым напрамку.

«...Базаўская рэзалюцыя, праведзеная на сёлетнім сакавіковым сьвяткаваньні ў Нью Ёрку, прачытаўшы гэтую рэзалюцыю, нельга не заўважыць, што ў ёй дэманстрацыйна прапушчаныя такія рэчы як «Беларуская Народная Рэспубліка», «Рада БНР», «экзыльны ўрад БНР»

і нават «беларусы Амэрыкі». Месцы іх занялі ўжо «амэрыканцы беларускага паходжаньня».

Прынятая рэзалюцыя на сакавіковым сьвяткаваньні ў Нью Ёрку чыталася па-ангельску, таму што былі прысутныя прадстаўнікі амэрыканскага грамадзтва, а рэзалюцыя была скіраваная да афіцыйных дзейнікаў ЗША, а не да сяброў Рады БНР і рэдакцыі «Бацькаўшчына», у якой было сказана:

—Мы асуджаем усякую палітыку дыскрымінацыі народаў, як прыкладам, палітыку, што падтрымлівае вызвольныя рухі ў Афрыцы, але адначасна адмаўляе права на свабоду народам, паняволеным Расеяй:

—Ігнараваньне й байкатаваньне рэзалюцыі Амэрыканскага кангрэсу (закон 86-90) некаторымі афіцыйнымі ўстановамі й прыватнымі камітэтамі:

—Дыскрымінацыйнае стаўленьне амэрыканскага ўрадавага агенцтва ў дачыненьні да беларускае мовы, выключнае з радыёвых праграмаў «Голасу Амэрыкі»...

Дык ці-ж гэта была антыбээнэраўская рэзалюцыя й наогул, прычым тут БНР? Артыкул быў закончаны: «...Над усім гэтым варта задумацца Кангрэсу БАЗА». А ці толькі яму?

IX кангрэс БАЗА адбыўся 27 і 28 травеня ў Беларускім грамадзкім цэнтры ў Нью Ёрку. Кангрэс адкрыў уступаючы старшыня Галоўнае Ўправы К.Мерляк, а Ўладыка Васіль багаславіў кангрэс.

Была выбраная мандатная камісія ў складзе: Я. Запрудніка, Ул. Дунца й Я.Мельяновіча. Прэзыдыюм кангрэсу быў выбраны ў складзе:

Старшыня— др. Язэп Сажыч, намесьнік старшыні— Антон Шукелайц, сакратары—Янка Ніхаёнак і Вячаслаў Станкевіч. Пасьля прыняцьця парадку дня была выбраная рэзалюцыйная камісія ў складзе: В.Пляскача, М.Кунцэвіча, Я.Запрудніка. Далей ішлі прывітаньні ад прысутных гасьцей і прадстаўнікоў беларускіх грамадзкіх арганізацыяў і прачытаньне пратаколу з папярэдняга VIII кангрэсу, які быў прыняты зь невялікімі папраўкамі. Мандатная камісія закончыла рэгістрацыю дэлегатаў, падала вынік і сьцвердзіла, што дэлэгаты,прысутныя на залі, маюць 83 правамоцныя галасы.

Старшыня К.Мерляк зрабіў грунтоўную справаздачу (12 бачынаў друку) зь дзейнасьці Галоўнае Ўправы БАЗА, у якой выявілася наступнае:

Пры БАЗА працуюць жаночыя сэкцыі й тры афільяваныя арганізацыі: Згуртаваньне Беларускае Моладзі ў Амэрыцы (ЗБМА), Беларуска-Амэрыканскае акадэмічнае таварыства й Згуртаваньне Беларускіх вэтэранаў у ЗША.

БАЗА належыць да 5-ці міжнацыянальных і амэрыканскіх арганізацыяў: Амэрыканскай канфэрэнцыі за вызваленьне нерасейскіх народаў Савецкага Саюзу ў Нью Ёрку.

Нацыянальнай канфэрэнцыі амэрыканскіх этнічных групаў, Вашынгтон, Д.С.

Камітэту Тыдня Паняволеных народаў штату Нью Ёрк, г.Нью Ёрк.

Амэрыканскага музэя эміграцыі ў Нью Ёрку.

Alliance of Americans of Foreign Origin, Wichita, Kansas.

Сакратарыят БАЗА на працягу мінулае кадэнцыі выслаў звыш 6000 лістоў. На працягу 2 год адбылося 14 паседжаньняў Галоўнае Ўправы

Былі зладжаныя тры вялікія імпрэзы: сьвяткаваньне 42-х і 45-х угодкаў абвяшчэньня незалежнасьці БНР (супольна з акругаю БАЗА), й 4-я Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі (супольна з аддзелам БАЗА Кліўленд і Згрутаваньня Беларусаў Канады).

Галоўная Ўправа БАЗА ўзяла ўдзел у 8 міжнацыянальных дэманстрацыях і мітынгах ды ўдзельнічала ў 10 міжнацыянальных канфэрэнцыях. Старшыня Галоўнае Ўправы наведаў 6 раз Вашынгтон дзеля заладжаньня розных беларускіх грамадзкіх і палітычных справаў.

Галоўнаю Ўправаю былі зложаныя 6 мэмарандумаў у розных справах. Тры зь іх былі надрукаваныя ў Кангрэсовым рэкордзе. Былі выдадзеныя й шырока разасланыя 6 прэсавых камунікатаў з нагоды паважных падзеяў у беларускім жыцьці ў ЗША. Быліпрынятыя 5 рэзалюцыяў, некаторыя зь іх гэтаксама былі надрукаваныя ў Кангрэсовых рэкордах.Таксама Галоўнаю Ўправаю былі выдадзеныя за апошнюю кадэнцыю 23 нумары месячнага бюлетэню БАЗА й нямала лятучак з розных нарадаў. Скончыўшы справаздачу зь дзейнасьці Галоўнае Ўправы БАЗА, старшыня К.Мерляк праінфармаваў дэлегатаў аб перамовах у справе стварэньня адзінага беларускага рэпрэзэнтацыйнага цэнтру ў Амэрыцы ды тых цяжкасьцях і перашкодах, што ў часе іх выявіліся. Кангрэс вырашыў перамовы працягваць.

Пасьля справаздачы старшыні здаваў лічбы з стану фінансаў Галоўнае Ўправы ейны скарбнік П.Ганэцкі, сацыяльны рэфэрэнт Ніна Стома й кіраўнічка жаночае сэкцыі Марыя Станкевіч.

Адказаўшы на запытаньні дэлегатаў у розных справах, зьвязаных із справаздачамі, старшыня перадаў голас старшыням аддзелаў БАЗА.

Пасьля заканчэньня ўсіх справаздачаў адбылася вельмі жывая дыскусыя над імі, у якой узяла вялікая колькасьць дэлегатаў. У выніку яе перад заканчэньнем 1-га дня нарадаў кангрэсу, уступаючай Галоўнай Управе аднагалосна быў удзелены абсалютoрыюм з падзякай. Першы працоўны дзень IX кангрэсу БАЗА скончыўся вячэрай у шчырым сяброўскім настроі.

Другі дзень нарадаў кангрэсу БАЗА, пачаўся Божаю службаю ў саборы сьв. Кірылы Тураўскага, у якой ўзялі ўдзел ўсе дэлегаты кангрэсу. На парадку другога дня працы кангрэсу было прыняцьце прывітальных тэлеграмаў Прэзыдэнту ЗША Джону Ф.Кэнэды, віцэ-прэзыдыэнту Ліндану Джансану, старшыні Рады БНР М.Абрамчыку, губэрнатару штату Нью Ёрк Ракфэлеру, мэру горада Нью Ёрк Вагнеру ды сябрам Кангрэсавае камісіі ў справе рэзалюцыі 211 аб стварэньні адмысловага камітэту для паняволеных Саветамі народаў пры амэрыканскім кангрэсе. Далей былі рэзалюцыі падрыхтаваныя рэзалюцыйнай камісіяй.

У выніку тайнага галасаваньня вялікаю бальшынёю галасоў, старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА быў перавыбраны на другую кадэнцыю. Папярэдняя Галоўная Ўправа таксама была перавыбраная з дадаткам яшчэ дзвюх асобаў для ўзмацьненьня дзейнасьці. Такім чынам у Галоўную Ўправу ўвайшлі: старшыня—К. Мерляк, першы заступнік—Ф.Бартуль, другі заступнік—В.Пляскач, сакратар—В.Шчэцька, скарабнік— П.Ганэцкі, культурны рэфэрэнт—Н.Арсеньнева, сацыяльны рэфэрэнт—Н.Стома, сябры ўправы—Г.Орса й А. Несьцяровіч.

Пасьля абмеркаваньня вольных прапановаў, кангрэс закончыўся адсьпяваньнем нацыянальнага гімну. На кангрэсе была прынятая між іншымі рэзалюцыя «Нацыянальна-ідэялягічнае становішча БАЗА»

Дзевяты кангрэс Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня сьвярджаў:

1.Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, як у мінулым гэтак і ў будучым, будзе праводзіць нацыянальна-грамадзкую дзейнасьць, верна падтрымоўваючы ідэялы Беларускае Народнае Рэспублікі й прынцыпы Рады БНР.

2.Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, як незалежная арганізацыя амэрыканскіх грамадзянаў беларускага паходжаньня й

беларусаў-эмігрантаў у ЗША, пакідае за сабой права наладжваць усе патрэбныя яму сувязі й супрацоўнічаць з усімі дэмакратычнымі іншанацыянальнымі арганізацыямі, што дзеюць на дабро Амэрыкі й Беларусі.

Рэдакцыя газэты «Бацькаўшчына», якая складалася з працаўнікаў Амэрыканскага камітэту, зь яе галоўным рэдактарам др.Ст.Станкевічам, не зразумела, што рэзалюцыя IX кангрэсу БАЗА нічога ня мае супольнага з непрадрашэнскай плятформай Амэрыканскага камітэту, якая наогул ня прызнае ня толькі ідэялёгіі й прынцыпаў Рады БНР, але нават абвешчаньня незалежнасьці БНР. Аднак гэта добра зразумела газэта «Беларускі Голас», якая ў № 82 за чэрвень 1961 г. пісала: «Прыхільнікамі плыні Абрамчыка была створана ў ЗША беларуская арганізацыя Беларуска—Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА), статуса нібы арганізацыя беларусаў-амэрыканцаў, а фактычна выконвала загады пазаамэрыканскага дзейніка. У выніку БАЗА ня мела ня толькі да апошніх год якога колечы ўплыву на амэрыканскую палітыку ў дачыненьнях да Беларусі, але й ніякае ўвагі з боку амэрыканскіх урадавых і палітычных чыньнікаў. Аднак жыцьцё змушала лепшыя адзінкі БАЗА зьмяніць свае погляды й дастасоўвацца да новых абставінаў, у выніку гэтай устаноўкі, мы бачым за пару апошніх год небывалыя поступы ў працы БАЗА сярод амэрыканскіх урадавых і палітычных дзейнікаў. Перастаноўка на новыя рэйкі рэальнае рэчаіснасьці не праходзіць без хваравлівае нагонкі непрадрашэнскае групоўкі. Даволі прачытаць апошнія атакі абрамчыкавай «Бацькаўшчыны» супраць старшыні БАЗА Мерляка, з закідамі «здрады» і г.п., каб зразумець якая барацьба вядзецца ўнутры гэтае арганізацыі».

Галоўная Ўправа БАЗА часу не траціла й адразу-ж пасьля кангрэсу распачала сваю новую кадэнцыю паседжаньнем 10 чэрвеня, на якім быў абмяркаваны плян працы й упершыню ўстаноўленыя сталыя гадзіны ўрадаваньня. Яны вызначаліся двойчы на тыдзень: у сераду й сыботу.

25 чэрвеня адбыўся сход акругі Нью Ёрк, які аказаўся людным і жывым пасьля кангрэсу. Абраная ўправа з старшынём Д.Клінцэвічам кіраўніком школы М.Тулейкам і кіраўніком драматычнага гуртка Натальляй Орсай.

На прыняцьці з нагоды стварэньня мусульманскае лігі ў ЗША 27 чэрвеня былі прысутныя беларускія прадстаўнікі В.Тумаш і К.Мерляк.

На аэрадроме ў Нью Ёрку 28 чэрвеня прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў віталі дастойных гасьцей: япіскапа Чaслава Сіповіча й пралата Пётра Татарыновіча. Госьці, затрымаўшыся некалькі дзён у Нью Ёрку, адʼехалі ў Чыкага на «Тыдзень культурна-рэлігійных студыяў», які адбыўся у днях 1-5 ліпеня 1961 году.

6 ліпеня наведаў Галоўную Ўправу БАЗА Язэп Арцюх, старшыня аддзелу БАЗА ў Лёс Анджэлес, штат Каліфорнія. Ён меў даўжэйшую гутарку із старшынёю К.Мерляком, прысьвечаную каардынацыі грамадзка-палітычнай дзейнасьці.

Тыдзень Паняволеных народаў прыйшоўся на 16-22 ліпеня. Так праклямавалі Прэзыдэнт ЗША Джон Ф.Кэнэды, губэрнатар штату Нью Ёрк Нэльсон Рокфэлер мэр гораду Нью Ёрку Робэрт Вагнэр. З гэтай нагоды адбыліся два мітынгі ў Нью Ёрк гатэлі й на пляцы перад гарадзкой управай зь асабістым удзелам беларусаў з старшынёю К.Мерляком.

На пачатку верасьня (Лейбор Дэй) адбылася ў Чыкага чарговая Сустрэча Беларусаў Амэрыкі й Канады бэцээраўскага напрамку. Сустрэча распачалася вечарынай у сыботу. Назаўтра, у нядзелю адбылася Богаслубжа ў царкве сьв Юрыя. Служыў мітратворны пратаярэй М.Лапіцкі, а.Васіль Вячорка (а. Васіль прыехаў з Аргентыны), а.Міхась Мігай і дыякан Кузьміцкі.

На абедзе ў царкоўнай залі адбыўся сход сустрэчы, які адчыніў К.Новік, старшыня Беларускай Нацыянальнай Рады. Ганаровае месца ў прэзыдыюме заняў Макар Аблаэй, закладчык БНР у Чыкага, якой споўнілася 20 гадоў існаваньня. В.Пунтыс гаварыў пра грамадзкае жыцьцё ў Чыкага, пра рэлігійныя закалоты вуніятаў ды аб непаладках з архіяпіскапам Менскім і ўсяе Беларусі Ўладзімірам (Фінкоўскім). Быў прачытаны рэфэрат Р.Астроўскага на тэму «Сучасная палітычная сытуацыя, бо сам прэзыдэнт ня быў прысутны на сустрэчы. Пасьля выступленьня Я.Кіпеля й Касяка адбылася шумная дыскусія, якая вярцелася вакол Прэзыдэнта БЦР і архіяпіскапа Ўладзіміра, не забываючыся пра япіскапа Сіповіча.

На заканчэньне сход прыняў рэзалюцыю й лісты да ўрадаў ЗША й Канады. У дыскусыі на сходзе выявіліся разыходжаньні ўнутры бэцээраўскага лягеру: з аднаго боку астроўшчыкі, а з другога праваслаўныя дзеячы. Адзіным дасягненьнем у Чыкага была ліквідацыя другое БАПЦ на чале з архіяпіскапам Менскім і ўсяе Беларусі

Ўладзімірам (Фінкоўскі), які быў змушаны пакінуць Чыкаго й вярнуцца ў Парыж, адкуль ён і прыехаў. За гэтае «дасягненьне» належыцца падзяка а.М.Лапіцкаму. Яму даволі лёгка ўдалося дасягнуць сваёй мэты, пра якую ён моцна марыў: нікога ня мець над сабою. Такім чынам саўтрыверская групоўка замацавалася не на жарты.

Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва 16 верасьня адчыніў восеньскі-зімовы сэзон навуковым рэфэратам прафэсара А.Адамовіча, зроблены ім на апошняй канфэрэнцыі Мюнхэнскага інстытуту вывучэньня СССР, прысьвечаны праблеме расейска-камуністычнага каланіялізму ў дачыненьні да паняволеных Масквою народаў.

Асноўная тэза Адамовіча была тая, што вынікам каланіяльнай палітыкі Крамля расейскі народ эксплятуецца нараўні з усімі рэспублікамі Савецкага Саюза. Яна выклікала дыскусыю, у якой узялі лічаныя асобы, у тым ліку й К.Мерляк, даказваючы Адамовічу, што ён моцна памыляецца й ня меўшы ніякага дачыненьня з эканоміяй, ня быў кваліфікаваным рэфэрэнтам, хіба толькі каб апраўдываць палітыку непрадрашэнства Амэрыканскага камітэту. Эксплуатацыя нерасейскіх народаў прыносіць вялікія багацьці маскоўскаму рэжыму, які іх выкарыстовае для ажыцьцяўленьня імпэрыялістычнай палітыкі дамінацыі над народамі сьвету ды для свае роднае камуністычнае партыі. Бязумоўна, пры такой сыстэме ня ўсім было даступным карыстацца дабрадзействамі каляніяльнае палітыкі, але цьвердзіць, што ўвесь расейскі народ церпіць нараўне зь іншымі народамі, гэта было проста нахабствам прафэсара Антона Адамовіча.

Галоўная Ўправа БАЗА 25 верасьня 1961 году зладжыла мэмарандум шэфам дэлегацыяў на 16 Асамблею Задзіночаных Нацыяў, у якім яна прапанавала асамблеі абмяркаваць гэткія пытаньні:

1.Правесьці досьледы камуністычнае агрэсыі ў Беларусі ды іншых паняволеных камуністамі краінах.

2.Дамагацца свабодных выбараў пад кантролем Задзіночаных Нацыяў у Беларусі.

3.Запрапанаваць прыняць рэзалюцыі аб адыходзе савецкага войска й палітычнае паліцыі зь Беларусі ды аб звароце зьняволеных і дэпартаваных камуністамі беларусаў у Беларусь.

30 верасьня адбылося пашыранае паседжаньне Галоўнае Ўправы БАЗА, старшыняў аддзелаў Нью Ёрку, Нью Брансьвіку й журналістаў. На паседжаньні былі дакладна абмяркованыя рэальныя магчымасьці

выданьня сталае беларускае газэты ў ЗША. У выніку дыскусыі, пастаноўлена аднавіць у бліжэйшым часе ворган БАЗА газэту «Беларус». Была выбраная новая рэдакцыйная калегія газэты «Беларус» у складзе: Н.Арсеньнева, В.Шчэцька, др. В.Тумаш, А.Шукелайц, др. В.Кіпель, Ю.Станкевіч, М.Панькоў із ураду старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА К.Мерляк. З выхадам газэты «Беларус» спынілася выданьне «Бюлетэню БАЗА», якога выдалі 52 нумары.

Падкамісія Парыскага блёку ў Нью Ёрку выслала мэмарандум з подпісам старшыні К.Мерляка да прэзыдэнта генэральнай Асамблеі Аб'еднаных нацыяў Монгі Слім і да шэфаў дэлегацыяў ўсіх дзяржаваў сябраў ААН. У мэмарандуме сябры Парыскага блёку апэлявалі да генэральнай асамблеі ААН паставіць на парадак дня пытаньне расейскага каланіялізму ў нерасейскіх рэспубліках, сілаю ўлучаных у СССР.

Нягледзячы на тое, што на гэты мемарандум былі атрыманыя многія дадатнія водгукі, некаторыя сябры прэзыдыюму Парыскага блёку, у тым ліку й старшыня Рады БНР М. Абрамчык, выказалі незадавалененьне, чаму не яны ў Эўропе, а падкамісія ў Нью Ёрку зладжыла мэмарандум. Сябры падкамісіі ў Нью Ёрку добра ведалі, што прэзыдюм Парыскага блёку ў Эўропе не атрымае згоды ад Амэрыканскага камітэту на такога зьместу мэмарандум.

У лістападзе выйшаў пасьля доўгага перапынку 71 нумар газэты «Беларус».

«З новым паваротам»

Гэтым нумарам Галоўная Ўправа Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня аднаўляе выдаваньне часапісу «Беларус», як месячніка. Часапіс, неабходнасьць якога вельмі востра адчуваецца, мае быць адбіткам жыцьця, грамадзкіх патрэбаў і палітычнага становішча амэрыканскіх беларусаў. Рэгулярны выхад і разьвіцьцё часапісу будзе залежыць ад маральнага й матэрыяльнага падтрыманьня чытачоў, на што выдавецтва й лічыць».

У № 72 за сьнежань 1961 год памешчаны артыкул «Ці-ж гэтакімі словамі» без паданьня аўтара з зацемкай «Гэты артыкул, дарма што некаторыя ў ім справы ўжо спозьненыя, зьмяшчаецца дзеля таго, што ягоная тэма актуальная й на сёньня Галоўная управа БАЗА». Далей падана багатая хроніка з грамадзкага жыцьця: пра 40-я угодкі Слуцкага паўстаньня, пра прыняцьцё ў Альбанскім прадстаўніцтве, пра парахвяльны сход, пра паседжаньне акруговае ўправы БАЗА і г.д.

Адмыслова створаны камітэт, у які ўвайшлі прадстаўнікі ад 8-мі арганізацыяў Нью Ёрку, паставанілі адзначыць 40 ўгодкі літаратурнай і грамадзкай дзейнасьці паэткі Натальлі Арсеневай (Кушаль). 17 сьнежня быў зладжаны банкет у гонар юбіляркі ў залі Беларускага грамадзкага цэнтру.

Урачыстасьць была адчыненая старшынём К.Мерляком, пасьля яго Ўладыка сказаў малітву ды прывітаў юбілярку зь днём ейнага сьвята. Малыя дэкляматары вершаў Н.Арсеньневай: А.Бартуль. Ю.Мерляк, Л.Рагуля й Ю. Курыла даручылі паэтцы прыгожыя букеты чырвона-белых ружаў ад арганізацыяў і грамадзтва. Першы прамоўца К.Мерляк прыгадаў грамадзкія заслугі юбіляркі, зь якой яму давялося працаваць апошнія колькі год ды запрапанаваў тост за ейнае здароўе й памыснасьць у далейшай працы. Рэфэрат аб жыцьці й творчым шляху Н.Арсеньневай прачытаў др. В.Тумаш. Наступна выступалі др.В.Жук-Грышкевіч, які спэцыяльна прыехаў з Канадый прадстаўнікі беларускіх арганізацыяў: А.Стагановіч, А.Адамовіч, Я.Запруднік, У.Курыла, Ч.Ханяўка, Д.Клінцэвіч, Я.Казьлякоўскі, Ф.Бартуль, В.Русак і А.Шукелайц. У мастацкай частцы праграмы высупалі Пётра Конюх, Л.Маркоўская, Э.Зубковіч ды малодшыя дэкляматары.

Пры канцы банкету тостамастар К.Мерляк прачытаў выняткі із шматлікіх пісьмовых прывітаньняў, прысланых на адрас камітэту. На заканчэньне высупіла сама паэтка, якая прадэклямавала два свае вершы «Варта жыць» і «Тваё імя», прынятыя бурнымі воплескамі.

На 2-га сьнежня 1961 году быў скліканы агульны сход сэктару Рады БНР у Амэрыцы, які не адбыўся па поваду недахопу кворуму. Але час быў выкарыстаны прысутнымі для ўстанаўленьня парадку дня на разгляд наступнага сходу.

# 1962

«Новы 1962 год у Беларускім цэнтры быў гэткі-ж новы, як і мінулыя гады, адно што шчыльнейшым, бо нават яблыку, як кажуць, ня было дзе ўпасьці, ды лепш арганізаваны й «смачнейшы», дзякуючы нашым жанчынам». Гэтак апісаў аўтар у артыкуле «Пераступаючы парог новага году» ў газэце «Беларус» за студзень 1962 году.

10 студзеня 1962 году ў Нью Ёрку на параплаве «Юнайтэд Стэйтс» прыбыў старшыня Рады БНР інж. М.Абрамчык. Прэзыдэнт пры першым-жа шырэйшым спатканьні з раднымі паведаміў пра свае пляны наведаць у першую чаргу ўсе беларускія асяродкі ў ЗША й Канадзе ды правесьці чарговую сэсыю Рады БНР у Нью Ёрку.

Студзень і люты былі багатыя актыўнасьцю грамадзтва. Адзначым толькі важнейшыя мерапрыемствы, у якіх актыўны ўдзел браў К.Мерляк. Так, 21 студзеня адбылося супольнае паседжаньне Галоўнае й акруговае Ўправаў БАЗА. Былі прынятыя пастановы ў справах 44 угодкаў 25 Сакавіка, арганізацыі цэнтру аховы здароўя БАЗА, газэты «Беларус» і чарговае Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі.

Паводля раней распрацаванага пляну, які яшчэ ў студзені пачаўся ажыцьцяўляцца К.Мерляком, ўжо ў лютым газэта «Беларус» падала да ведама, што кангрэсмэн Самуэль С.Стратэн ад штату Нью Ёрк будзе адзін із галоўных прамоўцаў на акадэміі, прысьвечанай 44 угодкам 25 Сакавіка ў гатэлі «Білтмор».

Адзначэньне 44-х угодкаў незалежнасьці Беларусі распачалося 20 сакавіка ў Нью Ёрку, прыняцьцём беларускае дэлегацыі ў гарадзкой упраўе гораду Нью Ёрк заступнікам мэра Дэймсам О' Брайн. На гэтай аўдыенцыі беларускай дэлегацыі й была ўрачыста даручаная праклямацыя мэра Робэрта Ф.Вагнэра, у якой той заклікаў жыхарства гораду Нью Ёрк належна ўшанаваць дзень 25 сакавіка, як Дзень незалежнасьці Беларусі.

22 сакавіка беларуская дэлегацыя ў складзе архіяпіскапа Васіля БАПЦ і старшыні Галоўнае Ўправы БАЗА была прынята ў Вашынгтоне на аўдыенцыі праз віцэ-прэзыдэнта ЗША Лінданам Б. Джансон. Беларускую дэлегацыю спаткаў сэнацкі сьвятар Фрыдэрык Браўн-Гарыс і разам з сэнатарам Томас Т.Кукель, правялі дэлегацыю ў кабінет і прадставілі віцэ-прэзыдыэнту Джансану. Віцэ-прэзыдэнт выказаў задавальненьне, што ён ужо другі раз спатыкаецца з



*На аўдыенцыі ў віцэ-прэзыдэнта ЗША 23 сакавіка 1962 г. у Вашынгтоне з нагоды 44-х угодкаў незалежнасьці Беларусі.*

*Зьлева направа: старшыня БАЗА Кастусь Мерляк, сэнатар Томас Ф.Кукель, архіяпіскап Васіль, віцэ-прэзыдэнт ЗША Ліндан Б.Джонсан і пастыр сэнату Фрэдэрык Браўн Гарыс.*



*Дыскусія з сэнатарам Томасам Ф.Кукелям 23 сакавіка 1962 г. ў Амэрыканскім сэнаце ў Вашынтоне.*

Гэтага дня беларуская дэлегацыя ў складзе Уладыкі Васіля й К.Мерляка была прынятая дырэрктарам «Голасу Амэрыкі» Гэнры Люмісам і дырэктарам аддзелу плянаваньня Алексам Кліфордсам. Уважліва выслухалі довады беларускіх дэлегатаў аб неабходнасьці ўвядзеньня беларускіх перадачаў у праграму «Голас Амэрыкі» Люміс і Кліфордс зазначылі, што ня вылучана магчымасьць увядзеньня ў праграму «Голасу Амэрыкі» беларускіх перадачаў ужо ў недалёкай будучыні.

Карыстаючы з нагоды побыту ў Вашынгтоне, Уладыка Васіль і К.Мерляк наведалі гасподу Рэспубліканскае партыі ЗША. Беларускія прадстаўнікі былі прынятыя заступнікам старшыні камітэту А.Гэрманам ды дырэктарам палітычных справаў гасподы. Гутарка была шчырая, асабліва таму ,што А.Гэрман ужо быў знаёмы з сп К.Мерляком, які закрануў справу беларускіх перадачаў у «Голасе Амэрыкі», а таксама й справу адмысловага «Кангрэсовага камітэту для паняволеных народаў». А.Гэрман адказаў, што абавязкова паставіць пытаньне беларускіх перадачаў у «Голасе Амэрыкі» на абмеркаваньне паседжаньня Рэспубліканскага камітэту ў кангрэсе, каб зрабіць ўсе патрэбныя крокі дзеля ажыцяўленьня гэтае важнае для нас справы . Але, нажаль, і гэтым разам гэта засталося толькі абяцанкай.

Акадэмія ў гонар 44-х угодкаў адбылася 25 сакавіка ў гатэлі «Балтмор» ў Нью Ёрку. Акадэмія, згодна традыцыі, была пачатая амэрыканскім гімнам, малітваю Уладыкі Васіля й прамоваю старшыні акруговае ўправы БАЗА Д.Клінцэвічам, які запрасіў старшынію К.Мерляка кіраваць прабегам урачыстасьці.

К.Мерляк у сваёй прамове падкрэсьліў факт, што беларускі народ 44 гады выказваў сваё цьвёрдае жаданьне жыць у сваёй незалежнай і на дэмакратчыных асновах збудаванай дзяржаве й змагацца за гэты ідэал ніколі не пакіне Нягледзячы на тое, што апошнім часам даецца заўважыць шпаркі рост зразуменьня міжнароднае палітычнае вагі, справы вызваленьня народаў Азіі й Афрыкі, паняволеныя народы Савецкай Расеяй паказваюць неразуменьне важнасьці свабоды народам СССР праз бальшыню афіцыяльных і неафіцыяльных дзейнікаў ЗША.

Наступна К.Мерляк прадставіў двух галоўных прамоўцаў: кангрэсмэна Самуэля С.Стратэна й кангрэсмэна Гюз Л.Кэры (пазьнейшы губэрнатар штату Нью Ёрк). Кангрэсмэны віталі ў сваіх прамовах беларускі народ ды зычылі яму хуткага вызваленьня з расейска-

губэрнатар штату Нью Ёрк). Кангрэсмэны віталі ў сваіх прамовах беларускі народ ды зычылі яму хуткага вызваленьня з расейска-камуністычнае няволі, прыракалі ад сябе памагаць у яго змаганьні за свабоду ўсіх народаў, а перадусім беларускага, першай ахвяры сталінскага тэрору. Пасьля выступіў з прамовай прадстаўнік мэра гораду Нью Ёрк Джэймс І.О' Браян, які вітаў беларускае грамадзтва ад імя ўправы. Ён прачытаў праклямацыю мэра Вагнэра аб абвешчаньні 25 Сакавіка 1962 году «Днём беларускае незалежнасьці» ў горадзе Нью Ёрку.

В.Станкевіч прачытаў гэткія-ж праклямацыі ад губэрнатара штату Нью Ёрк Нельсана Ракфэлера, губэрнатара штату Нью Джэрсі й мэра гораду Нью Брансьвік, у якіх дзень 25 Сакавіка таксама абвяшчаўся Днём незалежнасьці.

Акадэмію віталі прадстаўнікі Украіны—Стэфан Ярэма, Альбаніі — Валіс Гэрмэні, Грузіі—Г.Накашыдзе, Польшчы—Гэнэрк Лівач Валейніцкі. Далей старшыня акадэміі прадставіў прысутным 24-х дастойных гасьцей і пералічыў 60 прывітаньняў, атрыманых ад урадавых і грамадзкіх прадстаўнікоў Злучаных Штатаў Амэрыкі й ад 19 беларускіх арганізацыяў на чужыне.

Пасьля прыняцьця рэзалюцыі, прысутных вітаў др. Аўген Вярбіцкі, які прыехаў на навуковую канфэрэнцыю з штату Айова. Мастацкай часткай і адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну акадэмія закончылася. Вітаньні й выказваньні з нагоды незалежнасьці Беларусі 20 сэнатараў і кангрэсмэнаў у амэрыканскім кангрэсе ды шырокае рэха адзначэньня Дня 25 сакавіка ў амэрыканскай і іншанацыянальнай прэсе, гэта праца ня толькі Галоўнае Ўправы БАЗА, але ае ўсіх аддзелаў, ды іншых дзейных беларускіх арганізацыяў у Амэрыцы.

24 студзеня 1962 году было паседжаньне прадстаўнікоў падкамісіі Парыскага блёку з удзелам прэзыдэнтаў УНР др.С.Вытвіцкім і М.Абрамчыкам Рады БНР. На паседжаньні былі выслуханыя справаздачы абодвух прэзыдэнтаў з дзейнасьці Парыскага блёку ў Эўропе ды супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам вызваленьня ад бальшавізму.

З справаздачаў выявілася, што Амэрыканскі камітэт нарушыў догавар супрацоўніцтва на правах парытэту, тым што зьмяніў назоў радыё «Вызваленьне» на радыё «Свабода», заблякаваў кангрэсовую рэзалюцыю ў справе Тыдня Паняволеных народаў і ўстрымаў

фінансаваньне канфэрэнцыі Лігі вызваленьня народаў СССР (Парыскі блёк). Суадносіны да Амэрыканскага камітэту й становішча казакаў стаялі на перашкодзе да лепшага сурпацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам. Высьветлілася, што Амэрыканскі камітэт ня ёсьць дзяржаўным дэпартмэнтам, і мы не забавязаныя зь ім супрацоўнічаць у апраўдываньні расейска-камуністычнага імпэрыялізму. У канцы пастаноўлена прадаўжаць дыскусію на наступным паседжаньні, якое мела адбыцца 31 студзеня 1962 году.

На паседжаньні падкамісіі Парыскага блёку 31 студзеня, пасьля дыскусіі, прадстаўнікі выказалі свае погляды: др.Вытвіцкі, Прэзыдэнт УНР, выказаў незадавальненьне адносна дзейнасьці Парыскага блёку й Амэрыканскага камітэту. Др.Накашыдзе, прадстаўнік грузінскага ўраду на чыжыне, сказаў, што ізаляваная актыўнасьць Парыскага блёку зьвядзецца да нічога. Др.Рашыд, прадстаўнік Ідэл-Уралу, падкрэсліў, што інтарэсы пэрсанальнага характару некаторых сяброў П.Б. не пазваляюць парваць з Амэрыканскім камітэтам. В.Глазкоў, прадстаўнік казакаў, заўважыў, што Парыскі блёк павінен арыентавацца на Амэрыку, а не на Эўропу й супрацоўнічаць з другімі амэрыканскімі арганізацыямі, а не толькі з Амэрыканскім камітэтам. К.Мерляк, старшыня падкаміісіі Парыскага блёку сказаў, што Амэрыканскі камітэт не падзяляе палітыкі бальшыні амэрыканскага грамадзтва, але толькі клікі, якая сымпатызуе з расейскімі нацыяналістамі. Да гэтага асабістыя інтарэсы партнёраў перашкаджаюць выканаўчаму камітэту Парыскага блёку быць эфэктоўным і рашучым у сваёй дзейнасьці. М.Абрамчык, старшыня Рады БНР, выказаўся, што існаваньне Парыскага блёку ёсьць неабходным у сучаснасьці, і ён павінен знаходзіцца ў Эўропе. Усёю палітычнаю дзейнасьцю павінен кіраваць толькі выканаўчы камітэт, а супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам павінна ў далейшым каардынавацца зь яго аддзелам культуры. Гэта было штосьці новае, але зразумелае для сяброў падкамісіі Парыскага блёку ў Нью Ёрку. Яшчэ кожны штосьці дадаў да свайго высказваньня й на гэтым усе разыйшліся.

На наступным паседжаньні ў травені 1962 годзе К.Мерляк заявіў падкамісіі Парыскага блёку, што ён адмовіўся рэпрэзэнтаваць Раду БНР, аб чым ён ужо павядоміў Прэзыдэнта Рады БНР, а гэтым самым рэзыгнаваў са становішча старшыні падкамісіі Парыскага блёку. На

беларускія асяродкі ў Амэрыцы правёў некалькі гутарак з сваімі бліжэйшымі супрацоўнікамі: А.Адамовічам, др. В.Тумашам, генэралам Ф.Кушалем, Я.Запруднікам і М.Гарошкам адносна прышлай структуры Рады БНР. Затым М.Абрамчык наведаў Нью Брансьвік, Кліўленд, Дэтройт, Чыкага й Таронта ў Канадзе.

Дзеля таго, што сход сэктару Рады БНР у Амэрыцы, які быў скліканы на 2 сьнежня 1961 году не адбыўся, старшыня сэктару К.Мерляк разаслаў паведамленьні, што сход мае адбыцца 8 красавіка 1962 годзе.

Старашыня Рады БНР М.Абрамчык вярнуўшыся з паездкі, ад свайго імя наперакор старшыні сэктару ў ЗША, склікаў на 1 красавіка 1962 году сход Рады БНР Ньюёркскага сэктару, якога да гэтага часу ня было, лістом наступнага зьместу:

«Да Сяброў Рады Ньюёркскага сэктару.

На 1-га красавіка 1962 г. прызначаны сход сэктару Рады БНР ЗША, што адбудзецца ў Беларускім Грамадзкім Доме а 1-й гадзіне папаўдні.

Таму, што з цэлага шэрагу прычынаў, не залежных ад мяне, не магла сёлета быць скліканая сэсія Рады, і дзеля абмеркаваньня шмат якіх вельмі актуальных і вельмі важных справаў мы можам склікаць толькі адну сходку сэктару.

Просіцца Вас зрабіць усе магчымыя высілкі із свайго боку, каб абавязкава быць на гэтым сходзе».

На сходзе былі пастаўленыя толькі два пункты парадку дня:

1. Інфармацыя старшыні Рады БНР М.Абрамчыка

2. Выбары прэзыдыюму сэктару.

М.Абрамчык праінфармаваў пра сваю паездку па беларускіх асяродках і падаў да ведама прысутных што:

1. X сэсія Рады БНР не адбудзецца з незаленых ад яго прычынаў.

2. Сэктар Рады БНР ў Амэрыцы ад сёньняшняга дня ліквідуецца. На месца Амэрыканскага сэктару Рады БНР, прэзыдэнтам сарганізаваныя сэктары Рады БНР у Нью Ёрку, Нью Брансьвіку, Кліўленьдзе й Чыкага.

3. Прэзыдыюм Рады БНР застаецца той самы, г.зн. старшыня

М.Абрамчык, першы заступнік А.Стагановіч, другі заступнік А.Адамовіч.

4. Сакратарыят Рады БНР ад сёньняшняга дня перастае існаваць.

5. Паклікаю генэрала Ф.Кушаля стварыць Урад БНР і прадставіць мне на зацьверджаньне.

У прэзыдыюм Ньюёркскага сэктару былі выбраныя: Ул. Набагез—старшыня, Я.Запруднік—сакратар і А.Шукелайц—скарбнік. К.Мерляк адмовіўся быць кандыдатам на любое становішча ў прэзыдыюме.

У бюлетэні Рады БНР за ліпень 1962 году было пададзенае: «Прэзыдэнт датаю 30 красавіка зацьвердзіў урад БНР у наступным складзе: генэрал Кушаль Франьцішак—старшыня, Кендыш Васіль віцэ-старшыня і сакратар фінансаў, Запруднік Янка — сакратар інфармацыі, Кажан Віталь— дзяржаўны скарбінік».

М.Абрамчык напярэдані прыезду ў Нью Ёрк, на паседжаньні сэктару Рады БНР у Мюнхэне, які складаўся ў бальшыні з працаўнікоў Амэрыканскага камітэту на чале з др. Ст.Станкевічам, улажылі плян дзеяньня ў Амэрыцы. Гэты плян М.Абрамчык узгадніў у Нью Ёрку із сваёю групіроўкаю перад выездам у беларускія асяродкі. Гэта рабілася для таго, каб не склікаць сэсіі Рады БНР і абмінуць разгляду такіх справаў як :

1. Далейшае супрацоўніцтва з Амэрыканскім камітэтам.

2. Разгляд палітычнай метазгоднасьці ўдзелу ў органах Рады БНР тых радных, якія працуюць у Амэрыканскім камітэце. Гэта быў-бы адзін із найважнейшых пунктаў, бо была прынятая пастанова прэздыюму й сакратарыяту Рады БНР і падкамісіі Парыскага блёку, што працаўнікі амэрыканскага камітэту не павінны займаць урадавых становішчаў у рэпрэзэнтацыйных органах.

3. Прапанова К.Мерляк зьмяніць стратэгію дзеяньня Рады БНР, каб гэтым здабыць фонды на грамадзка-палітычную працу.

4. Разгляд фонду сталага прадстаўніцтва ў Вашынгтоне. Чаму М.Абрамчык зьмяніў намеры пераехаць настала ў ЗША й на што прызначыць сабраныя грошы?

М.Абрамчык, фактычна рэарганізуючы Раду БНР, меў на ўвеце паказаць Амэрыканскаму камітэту, што ён кіруе грамадзка-палітычным жыцьцём беларускае эміграцыі . Гэта было самым важным для яго й яго групоўкі, каб, па-першае, захавць за сабою становішча займанае, ў радыё «Свабода« й інстытуце па вывучэньню СССР, па-другое, каб надалей захаваць старшынства ў Парыскім блёку, у якім як раз паўсталі вялікія разыходжаньні й непаразуменьні паміж сябрамі.

старшынства ў Парыскім блёку, у якім як раз паўсталі вялікія разыходжаньні й непаразуменьні паміж сябрамі.

К.Мерляк ніколі не пярэчыў патрэбе мець як найбольш сваіх працаўнікоў, ня толькі ў беларускіх аддзелах, але ўва ўсей сыстэме Амэрыканскага камітэту. Баронячы сваю стратэгію дзеяньня Рады БНР, Мерляк заўсёды паўтараў свае аргумэнты, прыводзячы канкрэтныя доказы, што беларусы на займаных становішчах будуць надалей працаваць у Амэрыканскім камітэце, незалежна ад таго ці яны будуць адначасна займаць кіраўнічыя становішчы ў Радзе БНР, ці не.

Старшынства ў Парыскім блёку М.Абрамчыка на даным этапе стаяла на перашкодзе й аслабляла пазыцыю Радзе БНР весьці беспасрэдныя й не залежныя ад нікога перамовы, на якіх умовах Рада БНР будзе ў далейшым супрацоўнічаць з Амэрыканскім камітэтам. Бо калі другія нацыянальнасьці, сябры Парыскага блёку гэта зрабілі, то чаму не магла зрабіць Рада БНР? Адказ на гэта быў такі:

М.Абрамчык са сваімі «дарадцамі» не ўзялі пад увагу зьмены, якія зайшлі ў апошнія два гады ў палітыцы наогул, а ў Амэрыцы ў асаблівасьці. Рэзалюцыя Амэрыканскага кангрэсу ў справе Тыдня Паняволеных народаў і праклямацыі двух прэзыдэнтаў ды прапанова стварыць кангрэсовую камісію для справаў паняволеных народаў, моцна ажывіла палітычную антыкамуністычную дзейнасьць эмігрантаў Сярэдняе й Усходняе Эўропы. Асамблея Эўропы, сарганізаваная ў АСЭН праявіла агрэсыўную дзейнасьць ня толькі ў Амэрыцы, але й ўва ўсім вольным сьвеце.

Стварылася Амэрыканская канфэрэнцыя нерасейскіх народаў СССР. Паявіліся ў большых гарадах Амэрыкі камітэты «Тыдня Паняволеных народаў». Дзеля гэтага аснаўная дзейнасьць за вызваленьне народаў з-пад расейска-камуністычнага панаваньня перакінулася з Эўропы ў Амэрыку.

Вайна ў Вьетнаме, правал высадкі «Арміі Вызваленьня Кубы» у Сьвіскім заліве (Bay of Pigs) пабудова Бэрлінскай сьцяны ў 1961 годзе, дзелячы горад Бэрлін на дзьве часткі «Гэта пераканала палітычныя дзейнікі Амэрыкі, што палітыка «паўстрыманьня» ня ёсьць дастатковай паўстрымаць пашырэньне Маскоўскага імпэрыялізму, пачалі ажыцьцяўляць актыўнае контрадзеяньне.

Такая зьмена палітычнага кірунку ў ЗША ішла наперакор палітыцы непрадрашэнства ды апраўдываньня расейскага нацыяналізму. Такое

нязручнае становішча прымусіла апраўдывацца Прэзыдэнта Амэрыканскага камітэту Гоўленда Саржэнтра зрабіць заяву 6 сакавіка 1962 году, якая была пазьней памешчана ў «Конгрэшёнал Рэкорд» ад 5 чэрвеня 1962 наступнага зьместу:

"...Radio Liberty is not the official spoksman for any government, nor does it look at the world predominantly through American eyes. It tries to be a powerful choice of freedom speaking as a fellow Russian, who has lived under the Soviet system and now knows freedom, to a fellow Russian still in the homeland".

(...Радыё «Свабода» ня ёсьць афіцыяльнай урадавай установай, а толькі голасам пазнаўшага свабоду расейца, які гаворыць да свайго земляка ў Савецкім Саюзе»).

Так апрадываўся Прэзыдэнт Амэрыканскага камітэту, а Прэзыдэнт Рады БНР са сваёю групоўкаю, перасталі цьвердзіць беларускаму грамадзтву, што палітыка Амэрыканскага камітэту ёсьць урадавая палітыка ЗША.

Крызыс, выкліканы савецкімі ракетамі на Кубе ў кастрычніку 1962 годзе, быў яшчэ адным доказам правалу палітыкі «паўстрымањня».

М.Абрамчык, зрываючы 10-ю сэсію Рады БНР ды зьменай яе структуры, зрабіў вялікую шкоду беларускаму вызвольнаму руху, а гэтым самым і беларускай эміграцыі. Ён пазбавіў галоўнага цэнтру думаньня, плянаваньня, натхненьня, нацыянальнага гонару, а галоўнае пазбавіў адданага кіраўніцтва беларусаў на чужыне. Урад БНР Ф.Кушаля ня быў здольны выканаць узятага на сябе абавязку. Уся дзейнасьць абмежавалася да выданьня 20 чэрвеня 1962 году заклiку, каб радныя плацілі складкі.

Ньюёркскі сэктар Рады БНР перастаў існаваць як арганізацыйная адзінка.

Нацыянальна-грамадзкае жыцьцё пайшло сваім шляхам, а гісторыя вынясе адпаведную ацэнку за далейшую дзейнасьць «групоўкі» пад назовам БНР.

Галоўная Ўправа БАЗА прадаўжала сваю дзейнасьць. Узяла ўдзел у 15 парадзе Лаяльнасьці 28 красавіка 1952 году ў Нью Ёрку, які прайшоў падобным парадкам, як і папярэднія гады. 13 верасьня адбылося прыстольнае сьвята прыходу сьв.Кірылы Тураўскага. Пасьля даўгіх маленьняў, у залі грамадзкага цэнтру адбыўся абед з шматлікімі даўгімі прамовамі, уключна й К.Мерляка. 9 чэрвеня ад-

«Беларус», цяжар якое поўнасьцю паў вылучна на Галоўную Ўправу й справа арганізацыі пятай Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі й Канады.

Згодна прынятай Кангрэсам рэзалюцi ад 1959 году, і ў гэтым годзе Прызэдыэнт Джон Ф.Кэнэды 13 жніўня 1962 году абвесьціў Тыдзень Паняволеных народаў. У гэты дзень адбыліся ў галоўных цэрквах Богаслужбы, а пасьля парад на Пятай Авэню ў Цэнтральным парку, дзе адбыўся мітынг з удзелам беларусаў і хору з Саўт Рывэру. 17 жніўня мэр гораду Р.Вагнэр, з гэтай нагоды выдаў праклямацыю й уручыў яе на ўрачыстасьці ў Сіты гол з удзелам дастойных прадстаўнікоў гораду ды прадстаўнікоў паняволеных Масквою народаў. Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне рэпрэзэнтаваў яе старшыня К.Мерляк.

2 жніўня 1952 году рымскі Папа Пій XII абвесьціў папскую булу "Exsul Familia". Папа Пій XII гэта зрабіў па поваду таго, што пасьля вайны ў вольным сьвеце апынулася больш за 50 мільёнаў людзей з розных краінаў бязбожнага камуністычнага панаваньня. Папа Ян XIII запрасіў да сябе ў Рым прадстаўнікоў усіх гэтых расьцярушаных групаў на адзначэньне 10-х угодкаў абвешчаньня Булы. "Exsul Familia" Галоўная Ўправа БАЗА на сваім паседжаньні вынесла падобную пастанову як із нагоды Тыдня культурна-рэлігійных студыяў, што адбыліся 1-5 ліпеня 1961 году у Чыкага —падзякавала за запарашэньне на сьвяткаваньне 10-х угодкаў "Exsul Familia" у Рыме ды адмовілася ўзяць афіцычны ўдзел, матывуючы тым, што Беларуска—Амэрыканскае Задзіночаньне ў большасьці складаецца зь беларусаў праваслаўных, а ў меншасьці зь беларусаў рыма-католікаў. У той час калі Ватыкан адмаўляе дапамогі ў арганізаваньні беларускіх рыма-каталіцкіх прыходаў у мясцовасьцях, дзе ёсьць на гэта дастатковая колькасьць вернікаў, але адначасова падтрымовае каталікоў усходняга абраду (вуніятаў), якіх мала як на Бацькаўшчыне, так і на эміграцыі. (Дарэчы кажучы ў БАЗА быў толькі адзін вуніят).

У гэтай ўрачыстасьці ўзялі удзел беларусы з Англіі й Нямеччыны. Беларусаў каталікоў праводзіў старэнькі апостальскі адміністратар біскуп Магілеўскі й Менскі Балесаў Слосканс, які быў па нацыянальнасьці латыш, пражываў у Бельгіі й абсалютна не цікавіўся беларусамі рыма-каталікамі на эміграцыі. Апостальскі візытатар біскуп Чэслаў Сіповіч праводзіў беларусаў усходняга абраду.

Нягледзячы на тое, што за абедзьве пастановы (прынятыя аднагалосна) галасавалі й два сябры ўправы: Арсеньнева й Ф.Бартуль (абодва рыма-каталікі), на К.Мерляка аднаго звалілася ўся віна: чаму БАЗА не падтрымоўвае палітыкі Ватыкану сярод беларускае эміграцыі. Палітка Ватыкану ў сутнасьці, уносіла непатрэбны разлад у рэлігійным жыцьці, а гэтым самым шкодзіла беларускаму нацыянальнаму разьвіцьцю ў змаганьні за вызваленьне Беларусі.

Пятая Сустрэча Беларусаў Паўночнае Амэрыкі адбылася 1-2 верасьня 1962 году ў Таронта. Яе арганізвалі Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне Амэрыкі (БАЗА)—старшыня К.Мерляк і Згуртаваньне Беларусаў Канады—старшыня В.Касьцюкевіч. Старшынёй арганізацыйнага камітэту быў К.Акула й ён-жа кіраваў урачыстым сходам. Праграма сустрэчы складалася зь вечарыны, Богаслужбы, урачыстага сходу, банкету й канцэрта. На ўрачыстым сходзе даклад на тему «Сучасны расейскі каляніялізм на Беларусі» чытаў др.Ст.Станкевіч, якога падставілі ў апошні дзень на месца др. Барыса Рагулі. Пасьля дакладу была прынятая рэзалюцыя. Сустрэча прайшла памысна й сымпатычна, нажаль, вонкава-палітычна ніякага разгалосу не прынесла, бо ня было ні аднаго прамоўцы й ні аднаго прывітаньня ад канадзкіх і амэрыканскіх палітычных дзеячоў. Канадзкія арганізатары мала прыкладалі стараньняў, хіба толькі здабыцьцём на трыбуну др. Станкевіча. К.Мерляк, будучы на сустрэчы ,выкарыстаў нагоду, каб спаткацца зь Сяргеям Хмарам (Зіняк) рэдактарам газэты «Беларускі Голас», з мэтай асабістага запазнаньня й супольнга абмеркаваньня пытаньняў палітычнага парадку, якія трывожаць беларускую эміграцыю, а таксама мамэнты, якія паглыбляюць падзел беларускае эміграцыі ў ЗША і Канадзе.

7 кастрычніка адбылося паседжаньне кіраўніцтва сэктару Рады БНР Амэрыкі—старшыня К.Мерляк, і новага сэктару Рады БНР Нью Ёрку—старшыня др.Ул.Набагез, на якім К.Мерляк перадаў справаводства Ул. Набагезу. Так закончыўся 1962 год дзейнасьці.

# 1963

1963 год пачаўся, як заўсёды, агульным спатканьнем ў залі грамадзкага цэнтру, а пазьней ялінкай для дзяцей і вечарынай моладзі. На адным із супольных паседжаньняў акруговае й Галоўнае Ўправаў БАЗА пастаноўлена зьвярнуцца да Беларускага Кангрэсавага Камітэту Амэрыкі (БККА) у справе супольнага сьвяткаваньня 25 Сакавіка.

Супольнае паседжаньне БАЗА і БККА адбылося 19 студзеня 1963 году з мэтай дамовіцца аб супольным сьвяткаваньні 45-х угодкаў незалежнасьці Беларусі. На паседжаньні былі прысутныя: І. Касяк, К.Мерляк, М.Сенька, Ул.Пелеса, В.Шчэцька, Б.Шчорс, Л.Брылеўская, Д.Клінцэвіч і М.Бахар. Першае слова ўзяў І.Касяк і прадставіў пытаньні на разгляд з боку БККА, а другое слова ўзяў К.Мерляк — прадставіў пытаньні з боку БАЗА. Разгарнулася вельмі цікавая дыскусыя ў справах II Усебеларускага Кангрэсу, прывітаньня Прэзыдэнтаў БНР і БЦР, палітыкі «непрадрашэнства» і чытаньня малітваў. Узгоднілі, што першы і другі Ўсебеларускія Кангрэсы разглядаць як гістарычныя падзеі й яны павінны ўспамінацца ў тым самым пэрымэтры. Прывітаньні чытаць ад абодвух прэзыдэнтаў або ад таго, хто прышле. Высьветлена, што БАЗА палітыкі «непрадрэшэнства» не падтрымоўвае. Адносна малітваў прынята, што Ўладыка Васіль адкрывае, а а.Лапіцкі закрывае акадэмію. Пастаноўлена супольна сьвяткаваць 45 угодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі ў дзень 24 сакавіка ў гатэлі «Білтмор» ў Нью Ёрку. У сьвяткавальны камітэт увайшлі ад БАЗА: К.Мерляк, Д. Клінцэвіч і В.Шчэцька. Ад БКА: І. Касяк, Л.Брылеўская й М.Бахар. Камітэт назвалі Аб'еднаны Беларуска-Амэрыканскі Камітэт 1963.

17 сакавіка 1963 году адбылося другое паседжаньне сьвяткавальнага камітэту, на якім былі абгавораныя ўсе падрабязнасьці ўсіх аспэктаў, зьвязаных з адзначэньнем 45-х угодкаў незалежнасьці Беларусі.

Сьвяткаваньне атрымалася ўрачыста, як ніколі раней, дзякуючы таму, што 45 угодкі незалежнасьці Беларусі былі ладжаныя ўпершыню беларускімі грамадзкімі арганізацыямі ў Амэрыцы БАЗА і БККА.

У гэты дзень раніцою адбыліся Божыя службы ў царкве сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне (БАПЦ) і ў царкве сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры (Усяленскі патрыярхат). Па абедзе ў залі гатэля «Біл-

тмор» пачалася акадэмія. У выкананьні саўтрывэрскага хору прагучалі амэрыканскі й беларускі гімны. Архіяпіскап Васіль прачытаў малітву. Старшыня акадэміі М.Бахар прачытаў III Устаўноўчую грамату 25 Сакавіка 1918 году. Тут-жа былі зачытаны праклямацыі аб Беларускім дні незалежнасьці, выдадзеныя губэрнатарамі штатаў Нью Ёрк, Нью Джэрсі, Агаё, мэрам гораду Нью Ёрк ды інышя .Даклады на тэму дня прачыталі па-беларуску К.Мерляк (БАЗА) і па-ангельску Р.Завістовіч (БККА).

Прамова К.Мерляка, старшыні Галоўнай Управы БАЗА на акадэміі, ладжанай 24 сакавіка 1963 г. ў Нью Ёрку

«Паважаныя спадарыні і спадары!

Заўтра 25 Сакавіка споўніцца 45 гадоў, як Рада Беларускай Народнай Рэспублікі Трэцяй Устаноўчай граматай абвясьціла Беларусь вольнай і незалежнай дзяржавай, назваўшы яе Беларускай Народнай Рэспублікай. У Акце абвешчаньня незалежнасьці сярод іншага гаворыцца: «Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца вольнай і незалежнай дзяржавай. Самі народы Беларусі, у асобе свайго ўстаноўначага сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных сувязях Беларусі».

Далей гаворыцца аб тэрыторыі Беларусі: «БНР павінна абняць усе землі, дзе жывей мае лічбовую перавагу беларускі народ».І ў канцы: «Абвяшчаючы аб незалежнасьці БНР, Рада ўскладае свае надзеі на тое, што ўсе любячыя волю народы памогуць беларускаму народу ў поўнай меры зьдзейсьніць яго палітычна-дзяржаўныя ідэалы».

Гэты Акт абвясьціла Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, выбраная на Першым Усебеларускім Кангрэсе ў сьнежні 1917 году, на якім узялі ўдзел 1872 дэлегатаў з усіх куткоў беларускае зямлі.

Такім чынам, беларускі народ выявіў сваю волю самым дэмакратычным чынам. Трэба падзіўляцца, што нашы палітычныя дзеячы таго часу ў цяжкіх абставінах ваеннае стыхіі ўсё-ж знайшлі дарогу да вырашэньня народнае волі.

Дарма, што зацятыя ворагі беларускае дзяржаўнасьці, асабліва расейскія імпэрыялісты розных колераў, намагаюцца як Кангрэс, гэтак і Акт абвешчаньня незалежнасьці прыпісаць палітычным «сделкам» Нямеччыны, часам Польшчый хто ведае яшчэ каму, каб толькі абнізіць, выкрывіць ды сфальшаваць веліч Акту 25 Сакавіка перад

тымі, што мала ведаюць гісторыю Беларусі й яе слаўнае мінулае, падсоўваючы адначасна розныя спосабы разьвязкі так званай праблемы «захаваньня цэласьці расейскае імпэрыі». На сёньня самым такім-жа, вельмі актуальным трыкам, зьяўляецца й палітыка непрадрашэнства, якая праводзіцца расейцамі на эміграцыі й якую падтрымлівае невялікая колькасьць амэрыканскіх «аматараў» расейскага стылю й культуры.

Увесь фальш інтэрпрэтацыі Акта 25 Сакавіка ня вытрымоўвае ніякае крытыкі. Для параўнаньня возьмем хоць-бы абвешчаньні незалежнасьці новапаўсталых дзяржаваў пасьля другое сусьветнае вайны, дзе кангрэсы адбываліся ня перад абвешчаньнем незалежнасьці, а пасьля яго. Вось-жа, ня можа быць сумніву аб дэмакратычнасьці Акту 25 Сакавіка. Воля беларускага народу была выказана праз ягоных дэлегатаў, і абвешчаньне Беларусі незалежнай Народнай Рэспублікай адбылося ў сугучнасьці з міжнародным правам, з усімі вымогамі дэмакратычных правілаў.

Вялікі Акт 25 Сакавіка завяршыўшы сабою пэрыяд палітычна-вызвольнага змаганьня Беларускага народу, які бярэ свой пачатак ужо ў 1863 г. ў форме ўсенароднага паўстаньня, пад правадырствам Кастуся Каліноўскага, супраць акупанта—царскае Расеі.

І тутака будзе на часе прыпомніць, што 22 сакавіка 1864 г., 99 гадоў назад, у Вільні на Лукішскім пляцы было спынена маладое жыцьцё Кастуся Каліноўскага. З-пад шыбеніцы Каліноўскі ў сваім тэстаменце пераказаў народу: «Бо я гавару Табе з-пад шыбеніцы, народзе, што тады толькі будзеш жыць шчасьліва, калі над Табою ўжо маскаля й пана ня будзе.»І як-жа актуальнымі зьяўляюцца сёньня гэтыя словы!

Хай помняць тыя, што хаваюць гістарычную праўду, што зьмяншаюць нанесеныя крыўды беларускаму народу, тыя, што апраўдваюць расейскі імпэрыялізм.

Не! Шчасьлівы беларускі народ будзе толькі тады, калі ён раз і назаўсёды пазбавіцца маскаля-расейца, як праўдзіва гэта разумеў Каліноўскі.

Колькі зьдзеку, гора, духова й фізычна, перанёс ад часу абвешчаньня свае незалежнасьці беларускі народ! Мы ня будзем аналізаваць гэта, пакінем гэта сумленным беларускім гісторыкам ды навукоўцам. Зазначым толькі, што беларускі народ у ніякім выпадку ня спыніць свайго змаганьня аж да поўнае перамогі. Хай ведаюць гэта тыя, што

зачыняюць яму рот сёньня. Мы ў вольным сьвеце данясём ягоны голас да ўсіх палітычных установаў і людзей добрае волі, каб яны пачулі й зразумелі ягоныя дамаганьні.

Не аналізуючы тагачасныя падзеі, у якіх даканаўся чын абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, глянем у сёньняшнія палітычныя абставіны й параўнаем некаторыя характэрныя кампанэнты. Вось-жа, калі народы Азіі й Афрыкі болей, як на пакаленьне пазьней сакавіковага Акта, адзін па адным абвяшчаюць сваю незалежнасьць, а вольны сьвет настаўлены на самавызначэньне народаў, для беларускага народу справа вызваленьня скамплікавалася. Чамусьці да Беларусі й ёй падобных народаў вольны сьвет знайшоў іншыя формы падыходу. Возьмем і нашых некаторых амэрыканцаў: ёсьць і такія, што ўважаюць Беларусь за гістарычную тэрыторыю Расеі. Ды яшчэ горш: некаторыя беларускія палітыкі ўважаюць, што справа дзяржаўнасьці й незалежнасьці не павінна загадзя вырашацца, ці «предрешаться», як кажуць расейцы.

І гэта пасьля 45-ці гадоў ад часу Сакавіковага Акту! Тады трэба толькі ўявіць сабе веліч тых людзей, іх цьвёрдасьць, патрыятызм, іх ахвярнасьць, якія Актам 25 Сакавіка абвесьцілі Беларусь незалежнай. Яны дакладна ўсьведамлялі сабе, што значыць будаваць дзяржаву. Творцы Акту 25 Сакавіка былі гатовыя на ўсё: непасільную працу, пакуты й, калі трэба, страту жыцьця. І яны прайшлі праз ўсё: не пакутніцтва дзеля пакутніцтва, але дзеля выкананьня місыі свайго народу. Яны апраўдалі гонар тагачаснага беларускага пакаленьня, ідэал, за які варта жыць, працаваць, змагацца, а пры патрэбе аддаць жыцьцё.

Вярнуўшыся да пэрыяду, які пачаўся пасьля абвешчаньня незалежнасьці Беларусі, мы сканстатуем рэчы, зь якімі дажылі да сёньня. Гэты другі пэрыяд зьяўляецца пэрыядам ажыцьцяўленьня Акту 25 Сакавіка, пэрыядам змаганьня за ўвекавечаньне незалежнасьці Беларусі.

Калі беларускі народ абвесьціў усяму сьвету сваю волю стацца свабодным народам, пачаўся моцны наступ, гэтым разам з боку чырвонае Расеі ды нашага заходняга суседа. Вонкавае падтрымкі ня было, дарма, што Масква ўвіхаецца падсунуць сюды вечныя «сделки». Не хапала й сілаў арганізацыйных, у радох яшчэ неакрэпшых беларускіх змагароў, дзякуючы вайне й усяму вынікаючаму адгэтуль. Беларуская незалежнасьць сталася кароткай. Не памагло й Слуцкае паўстаньне

ды іншыя паўстаньні меньшага засягу. Лёс беларускага народу вызначыў Рыскі трактат 18 сакавіка 1921 г. Беларусь падзялілі на дзьве часткі. Трактат гэты быў чужым палітычным «бізнесам». На нашу некарысьць, на ўсход ад Рыскае мяжы беларусы так пацярпелі, як рэдка хто ў гісторыі так пацярпеў: амаль да аднаго вымардавалі беларускую інтэлігенцыю, тысячы й тысячы беларускага насельніцтва закончылі сваё жыцьцё ў далёкіх ссылках.

Спробы будаваньня беларускага жыцьця на захадзе ад гэтае мяжы ня скончыліся так трагічна, не пацягнулі так шмат людзкіх ахвяраў, тым ня меньш, духова наш народ пацярпеў шмат.

Нягледзячы на ўсё, беларускі народ не прапусьціў ані воднае нагоды, каб ня выкарыстаць для адбудовы свае дзяржаўнасьці, пачынаючы ад Напалеона й канчаючы другой сусьветнай вайной. Ён змагаецца цяпер і будзе змагацца й дамагацца сваіх правоў, аж покуль іх не здабудзе.

Магчыма, наймацьнейшы нацыянальны ўзрост духа й ахвярнасьці, а таксама рашучасьці ў змаганьні й абароне сваіх правоў, выказаў беларускі народ падчас другое сусьветнае вайны. За кароткі час, бо толькі за тры гады, нацыянальная сьведамасьць беларускага народу дайшла да найвышэйшага ўзроўню. Нягледзячы на цяжкія абставіны нямецкае акупацыі ды жахлівыя вынішчальныя рэпрэсіі расейскіх бандытаў (інакш і іх назваць няможна), беларусы змаглі ў межах тагачасных абставінаў зарганізаваць асьвету, стварыць свае арганізацыі, адміністрацыйныя ворганы, Беларускую Краёвую Абарону, аднавіць Беларускую Аўтакефальную Царкву, цывільнае судоўніцтва ды чыніліся намаганьні ўсё гэта ўняць ў пэўныя легальныя дзяржаўнага характару рамкі, што й прывяло да другога Ўсебеларускага Кангрэсу. Гэты факт зьяўляецца ўжо фактам гістарычным, і ў ніякім выпадку мы ня павінны яго абмінаць у гісторыі беларускага вызвольнага змаганьня.

У гэты пэрыяд пралілося шмат беларускае крыві, у выніку чаго на сёньня мы маем меньш выдатных вайскавікоў, меньш дасьведчаных палітыкаў, меньш выдатных настаўнікаў, меньш духовых апякуноў, а перад усім меньш шчырых беларускіх патрыётаў, бо яны загінулі зь верай, што іхныя ахвяры ня пойдуць намарна.

Мы, хто застаўся, мусім запэўніць іх, што будзем працягваць аж да сьмерці тую барацьбу, якую распачаў Каліноўскі.

Пасьля канца другое сусьветнае вайны Беларусь ізноў апынулася пад расейска-камуністычнай акупацыяй, надалей зносіць жахі расейскае каляніяльнае палітыкі ды біялягічанга вынішчэньня народу. Паводля дадзеных Андрэя Багровіча ў кнізе «Жыхарства Беларускае ССР», у пэрыяд ад 1926 да 1959 году этнаграфічная Беларусь недалічвае 12. 759. 000 жыхароў. Гэта роўна палова сучаснага беларускага народу, што знаходзіцца ў Савецкім Саюзе.

Паважаныя спадарыні й спадары! Уявіце сабе, на колькі больш Беларусь была-б мацьнейшай, на колькі больш Беларусь была-б знанай у сьвеце й колькі больш лічыліся-б зь ёй іншыя народы, каб гэтая колькасьць людзей (12.759.000) была наяўная на сёньня. А чаму гэтага няма? Бо Масква, адвечны вораг Беларусі, аб гэтым паклапацілася. І нам трэба быць гатовым, што яна будзе й надалей клапаціцца. Гэта наяўна паказваюць бачыны газэты «Голас Радзімы» ды іншыя цэнтральныя газэты, дзе яны адна за адной выкрываюць і «разоблачают», г. зв. «беларускіх буржуазных нацыяналістаў», дамагаючыся над імі савецкага правасудзьдзя за выдуманыя праступкі. На лаве пасудных за гэнасыдную палітыку савецкае Расеі ў адносінах да беларускага народу павінны сядзець усе крамлёўскія заправілы на чале з самым Хрушчовым, у таварыстве некаторых беларускіх і маскоўскіх калябарантаў.

Адзначаючы 45-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі, мы, беларусы на эміграцыі, заявім, што ідэал, выяўлены ў Акце 25 Сакавіка, не зьяўляецца й ніколі ня будзе зьяўляцца аб'ектам гандлю, уступак ці якога-небудзь кампрамісу, што воля беларускага народу не падлягае ніякім інтэрпрэтацыям у сьвятле непрадрашэнства, што мы на эміграцыі будзем старацца дапамагаць, пакладаючы ўсе нашыя сілы, каб наш народ на Бацькаўшчыне змог вызваліцца, як найхутчэй зь няволі.

Дзеля гэтага, дазвольце, дарагія суродзічы, мне сказаць, што мы ўсе прыракаем, што адкінем ўсё, што нас дзеліць, а возьмем усё, што нас лучыць, каб ставарыць адзіны моцны палітычны рух на эміграцыі, які-б апраўдаў нашае эміграцыйнае існаваньне ды стаўся фактарам у ажыцьцяўленьні волялюбных імкненьняў нашага народу ў адбудаваньні ягонае дзяржаўнасьці, што гэта споўніцца мы моцна верым. Час разрахунку прыбліжаецца хуткім крокам. Набліжаецца час, калі справядлівасьць пераможа гвалт, калі праўда пераможа

хлусню, а нашае дамаганьне праўдзівае, дык, маючы сёньня самых сябе, бальшыню выдатных саюзьнікаў вольналюбных народаў, можам сьмела сказаць, што наша праца стаіць на добрай дарозе.

Дык з надзеяй на лепшую будучыню, верма, што Беларусь будзе вольнай і незалежнай дзяржавай. Яна займе роўнае месца сярод ўсіх народаў, будзе будаваць сваё нацыянальнае жыцьцё ды ўнясе свой уклад у здабыткі ўсіх народаў на карысьць усяго чалавецтва».

З прывітаньнямі выступілі прадстаўнікі амэрыканскіх і іншанацыянальных арганізацыяў і прэсы. Атрымалі прывітальныя лісты й тэлеграмы ад шмат кангрэсмэнаў з Вашынгтону ды ад розных арганізацяў і ўстановаў. На акадэміі былі прынятыя і пасланыя два адмысловыя лісты кангрэсмэнам Д.Флюду й Э.Дэрвінксаму, выказваючы падтрымку рэзалюцыі аб патрэбе Кангрэсавага камітэту па справе народаў паняволеных у СССР, а таксама дырэктару Агенцыі інфармацыі дзяржаўнага дэпартмэнту аб уключэньні беларускай мовы ў праграму радыё «Голас Амэрыкі».

Пасьля адбылася вельмі багатая мастацкая частка з выступленьнямі мастацкіх сілаў Саўт Рэвэру й Нью Ёрку. Старшыня М. Бахар закрыў акадэмію з падзякай усім прысутным і арганізатарам сёлетняшняе акадэміі, якая была без малітвы, бо а.М.Лапіцкі ня быў прысутны зь невядомых прычынаў.

Малітва ў Амэрыканскім сэнаце была прачытаная архіяпіскапам Васілём БАПЦ 26 сакавіка 1963 году. Гэта здарылася таму, што ў вызначаны дзень 22 сакавіка на аўдыенцыю ў віцэ-прэздыэнта ЗША і на чытаньне малітвы ў сэнаце не адбывалася сэсія сэнату, дзеля гэтага дата была перанесена на 26 сакавіка.

Перад малітваю ў сэнаце віцэ-прэзыдэнт Ліндам Б.Джансон у асысьце сэнатара Дырксэна й сэнацкага пастыра Ф.Браўн-Гарыс прыняў беларускую дэлегацыю ў складзе архіяпіскапа Васіля й М.Казьлякоўскага, старшыні ЗБМА.

У артыкулах і зацемках нямала пісала чужая прэса, а яшчэ больш беларуская. Для паказу зацытуем з газэты «Бацькаўшчына» бэнэраўскага напрамку № 605 з 15 травеня 1963: « ... сюды зышліся гэтым разам усе, а сярод іх і такія старыя знаёмыя, што жывучы ў Нью Ёрку і каля яго па 10-12 гадоў, ні разу дасюль не спаткаліся. А цяпер сустрэліся і рукі адзін аднаму падалі, і нехта казаў, сёй-той заплакаў ад прачуленьня».

«Беларуская Думка» бэцээраўскага напрамку ў № 5 1963 году пісала: «...позна ўвечары пакідалі ўдзельнікі сьвяткаваньня залю, нясучы ў сэрцах задавальненьне й надзеі на будучыню... Але толькі час пакажа ці гэтыя надзеі на будучыню збудуцца».

7 красавіка адбылося яшчэ адно паседжаньне сьвяткавальнага камітэту 45 угодкаў 25 Сакавіка, на якім быў зроблены аналіз і падсумаваньні камэнтатараў, якія былі вельмі задавальняючымі. На паседжаньні пастанавілі выдаць асобным памфлетам выступленьні ў Амэрыканскім кангрэсе сэнатараў і кангрэсмэнаў з нагоды беларускага Дня незалежнасьці. Таксама былі абмяркаваныя дзьве справы: супольны парад Лаяльнасьці й мастацкае выступленьне беларусаў на сусьветнай выстаўцы 1964 году ў Нью Ёрку. Дамовіліся, што парад Лаяльнасьці зладзіцца супольна, а на маршала запрасілі капітана Д.Клінцэвіча. Адносна фэстывалю народнага мастацтва пастанавілі стварыць супольны камітэт для гэтай справы.

Посьпех супольнага сьвяткаваньня незалежансьці Беларусі ў гэтым годзе падказаў прысутным разгледзець справу супольнага звароту да беларуска-амэрыканскіх арганізацыяў і да ўсяго беларускага грамадзтва ў ЗША, каб аб'яднаць нашыя грамадзкія сілы для мацьнейшай нацыянальнай дзейнасьці на эміграцыі. Зварот быў апрацаваны, яго падпісалі старшыня БАЗА К.Мерляк і старшыня БККА І. Касяк 5 травеня 1963 году. Ён быў шырока распаўсюджаны.

| | |
|---|---|
| Беларускі<br>Кангрэсовы Камітэт<br>Амэрыкі | Беларускае<br>Амэрыканскае Задзіночаньне<br>Галоўная Ўправа |

## Зварот

### да беларуска-амэрыканскіх арганізацыяў і да ўсяго беларускага грамадзянства ў ЗШАмэрыкі

Сёньня ў ЗШАмэрыкі пражывае вялікая колькасьць беларусоў ды існуе значная лічба беларускіх арганізацыяў, якія гуртуюць беларусаў і служаць беларускім патрэбам. Вялікая бальшыня беларуса ў Амэрыкі пасялілася тут на стала, прыняла амэрыканскае грамадзянства й уносіць свой уклад у жыцьцё сваёй новай Бацькаўшчыны ЗШАмэрыкі. Адначасна гэтыя беларусы робяць пасільныя захады, дапамагаючы беларускаму народу ў яго імкненьнях вызваліцца з-пад

акупацыі савецкай Расеі ды адбудаваць вольную і незалежную беларускую дзяржаву.

Адмоўным зьявішчам для дзейнасьці беларусаў Амэрыкі зьяўляецца падзел на дзьве асноўныя групы, які перашкаджае адзінству беларускай акцыі пры абароне беларускай праблемы перад вонкавым сьветам. Карані гэтага падзелу сягаюць пэрыяду неакрэсленай каньюктуры падчас прабываньня беларускай эміграцыі ў Нямеччыне па 2-й сусьветнай вайне. Глыбейшыя перадумовы гэтага падзелу сягаюць глыбока ў мінулае беларускага народу. Калі Беларусь трапіла пад акупацыю, дык акупанты ў іхніх інтарэсах праводзілі падзел сярод беларусаў сваімі культурнымі, рэлігійнымі, сацыяльнымі ды палітычнымі ўплывамі. Чымсь падобным зьяўляецца умешваньне ў сучаснае беларускае жыцьцё міжнародных дзейнікаў, якія сіляцца праводзіць беларускімі рукамі палітыку адносна Беларусі ў сваіх, а не беларускіх інтарэсах, чым спраўляюць дадатковую цяжкасьць для беларускай справы.

Для самых беларусаў ясна, што:

1. Поўнавартасную беларускую працу могуць праводзіць толькі самі беларусы.

2. Залог посьпеху гэтай працы ляжыць ў арганізаванасьці, аб'еднаньні ды сіле беларускай грамады.

3. Ідэйныя асновы беларускай нацыянальнай справы дае ўся гісторыя беларускага народу, пачынаючы ад часу беларускіх ўдзельных княстваў, праз Вялікае княства Літоўскае, праз паўстаньні супроць пазьнейшых акупантаў Беларусі праз вялікія нацыянальна-вызвольныя ўздымы беларускага народу падчас 1-й і 2-й сусветных войнаў, працягваючы змаганьне ў сучасьнсьці супроць расейскае акупацыі.

Таму сярод вялікай бальшыні беларусаў Амэрыкі зараз перамагае імкненьне да аб'еднаньня беларусаў усіх напрамкаў на незалежніцкай базе пры выступленьнях навонкі. Гэта імкненьне выражаецца ў ладжаньні супольных акадэміяў 25 Сакавіка, выступленьняў адной беларускай групай на агульна-амэрыканскіх маніфэстацыях, як і на выступленьнях у міжнацыянальных арганізацыях Амэрыкі.

Гэтае імкненьне да задзіночаньня беларускіх сілаў Амэрыкі стаўляе на парадак дня справу ягонага арганізацыйнага ўняцьцьця— стварэньня аднаго воргану, выбранага праз усе існуючыя беларуска-амэрыканскія арганізацыі ды ўстановы, для рэпрэзэнтацыі на-

вонкі ды абароны інтарэсаў ЗШАмэрыкі ды й дапамогі беларускаму народу на паняволенай Беларусі.

Зразумела, што стварэньне такой адзінай у Амэрыцы агульнай беларускай рэпрэзэнтацыі ня спыніць нутраных разыходжаньняў, існуючых паміж рознымі ідэёлягічнымі напрамкамі, як і ня спыніць імкненьняў паасобных напрамкаў да дамінацыі. Аднак, гэтае змаганьне павінна адбывацца шляхам дэмакратычнага працэсу на ўнутраным сэктары беларускага жыцьця. Навонкі беларусы ЗШАмэрыкі, праз супольны аб'еднаўваючы ворган, маюць выступаць адзіным фронтам паводля ўзгодненай праграмы.

Арганізацыя агульнай беларуска-амэрыканскай рэпрэзэнтацыі, як і ейнае функцыянаваньне, крыюць у сабе шмат цяжкасьцей. Аднак у сучаснасьці мы бачым адзіную даступню нам магчымасьць для ўздыму на вышэйшы ўзровень беларускай нацыянальна-вызвольнай справы ў Амэрыцы як раз праз перамогу наяўных цяжкасьцей і задзіночаньне высілкаў усей беларуска-амэрыканскай грамады ў вадным рэпрэзэнтацыйным органе ды праводжаньне дзейнасьці навонкі адным аб'ядналым беларускім фронтам. Таму мы заклікаем усе беларуска-амэрыканскія арганізацыі ў далейшым праводзіць на мясцох выступленьні навонкі разам, паводля ўзгодненай праграмы.

Адначасна мы просім усе беларуска-амэрыканскія арганізацыі ды ўстановы, як і ўсіх беларусаў Амэрыкі, неадкладна выказацца па справе арганізацыйнага аб'еднаньня й стварэньня адзінай беларуска-амэрыканскай рэпрэзэнтацыі па вонкавых справах у ЗШАмэрыкі, высылаючы ў сваю цэнтралю: Беларускі Кангрэсавы Камітэт Амэрыкі, Галоўную Ўправу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня свае пагляды й канкрэтныя прапановы.

І.Касяк
Старшыня
Беларускага Кангрэсовага
камітэту Амэрыкі

К.Мерляк
Старшыня
Галоўнай Управы Беларуска-
Амэрыканскага Задзіночаньня

Нью Ёрк, 5 травеня 1963 г.

На паседжаньні Галоўнае Ўправы БАЗА 30 сакавіка была ўстаноўленая дата кангрэсу БАЗА (1 і 2 чэрвеня 1963 г.) і была прынятая інструкцыя старшыні і дэлегатам аб падрыхтоўцы справаздачаў і аб выбарах дэлегатаў на X кангрэс Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Амэрыкі.

X кангрэс БАЗА адбыўся ў вызначаным часе ў Беларускім грамадзкім цэнтры ў Брукліне. У кангрэсе прынялі ўдзел дэлегаты ад аддзелаў БАЗА Нью Ёрку, Нью Брансьвіку, Кліўленду, Дэтройту, Лёс Анджэлесу, Стэмфорду й Спрыінфільду, а таксама дэлегатаў ад Джэрзі Сіты й Бікан. Апрача адмыслова выбраных дэлегатаў, прынялі ўдзел у кангрэсе й карысталіся правам голасу сябры Галоўнай Управы, Рады дырэктараў і рэвізыйнай камісіі БАЗА. Тыя дэлегаты, што не маглі асабіста прыняць удзелу ў кангрэсе перадалі свае галасы іншым дэлегатам.

Пасьля адкрыцьця кангрэсу старшынёй уступаючай Галоўнай Управы БАЗА К.Мерляком і багаслаўленьня архіяпіскапам Васілём, быў выбраны прэзыдыюм кангрэсу ў наступным складзе: старшыня—Антон Адамовіч, віцэ-старшыня др. Станіслаў Станкевіч, сакратары—др. Язэп Сажыч і Браніслаў Даніловіч. Была выбраная мандатная камісія ў складзе: Ч.Ханяўкі, Я.Бруцкага й П.Кажуры, рэзалюцыйная камісія складалася: др.В.Тумаш, Н.Арсеньнева й А.Шукелайц. Хвілінай цішы была ўшанавая памяць сямі сяброў, што адышлі ў вечны супачынак у часе між IX і X кангрэсам БАЗА. Наступным пунктам парадку дня было чытаньне, дыскутаваньне й прыняцьцё новага статуту БАЗА.

Пры ўстанаўленьні кворуму выявілася, што аддзел БАЗА Кліўленду сходу для выбару дэлгатаў не рабіў. Прыехала 5 асобаў, прысланых старшынёю др.Грынкевічам. В.Семянчук запрапанаваў прызнаць прыехаўшых 5 дэлегатаў ды дадатковых яшчэ 7, каб 12 дэлегатаў рэпрэзэнтавалі поўнасьцю аддзел. Уступаючы старшыня К.Мерляк запратэставаў, што гэта будзе супраць статуту БАЗА й будзе парушэньнем правоў паасобных сяброў. Аднак старшыня кангрэсу А.Адамовіч адказаў на пратэст, маўляў: «Кангрэс найвышэйшая інстанцыя арганізацыі можа ўсё пастанавіць». Ён паставіў гэтую прапанову на галасаваньне й яна прайшла (бальшынёю толькі адным голасам).

Далей адбыліся справаздачы старшыні Галоўнай Управы БАЗА К.Мерляка, якая мела 15 бачынкаў друку й абыймала наступныя дзялянкі грамадзкага жыцьця:

Галоўная Ўправа й стан сябраў па аддзелах БАЗА.

Афільяваныя арганізацыі.

Міжнацыянальныя арганізацыі, да якіх належыць БАЗА;

Арганізацыйная дзейнасьць і канцылярыя.

Грамадзка-палітычная дзейнасьць.

Удзел у міжнацыянальных і беларускіх імпрэзах.

Мэмарыялы й занятыя становішчы ў актуальных палітычных падзеях.

Выдавецкая й культурная дзейнасьць.

Сацыяльная дапамога.

Перашкоды й цяжкасьці.

У заканчэньні свае справаздачы М.Мерляк сказаў: «Галоўная Ўправа, здаючы сёньня свае абавязкі, выказвае шчырую падзяку сябрам рэдакцыйнае калегіі «Беларуса», каторая ня была складоваю часткаю ўправы, за іхняе шчырае й адданае супрацоўніцтва, а таксама ўсім тым сябрам і нясябрам БАЗА, што дапамаглі ёй у працы. Галоўная Ўправа складае падзяку за духовую апеку архіяпіскапу Васілю й а.Ф.Чарняўскаму. Таксама складаецца падзяка радзе прыходу сьв.Кірылы Тураўскага, кіраўніцтву моладзі, жаночай сэкцыі БАЗА, Інстытуту Навукі й Мастацтва й Згуртаваньню вэтэранаў за супрацоўнітва ў ладжаньні агульных імпрэзаў. Ад сябе дзякую ўсім сябрам Галоўнае Ўправы за шчырае супрацоўніцтва на працягу двух гадоў, а Вам, паважаныя дэлегаты й сябры, за цярплівае слуханьне справаздачы».

Далей ішлі справаздачы: скарбніка П.Ганэцкага, старшыняў аддзелаў БАЗА й рэвізыйнае камісіі, з прапановаю «прызнаць абсалютрыюм уступаючай управе з падзякаю».

Пасьля справаздачаў адбылася даволі бурная дыскусыя, у якой выказваліся больш за 25 дэлегатаў. Адны апрабавалі дзейнасьць, другія ганьбілі, а трэція балбаталі бяз толку. Падчас выказваньняў зьявіліся яшчэ дзьве прапановы: удзяліць абсалютрыюм без падзякі Ўправе, а другая—вынесьці падзяку Ўправе, але без старшыні. Старшыня кангрэсу праф.А.Адамовіч, чымся паставіць прапановы на галасаваньне, ўзяў апошняе слова. Ён сыпаў рэплікі для ўступаючага старшыні К.Мерляка, паказваючы веліч свае эрудыцыі, зласьлівымі прыметнікамі й цынізмам старшыня кангрэсу пералічыў усе Мерляковыя недахопы ў дзейнасьці: не субардынацыя Радзе БНР, крытыка яе палітыкі й дзейнасьці прэзыдыюму Рады БНР, спробы адарваць

БАЗА ад БНР, антыбээнэраўская прамова на акадэміі 45-х угодкаў 25 Сакавіка, спроба аб'яднацца з БЦР і г.д., ды закончыў словамі: «Ніякае падзякі таварышу Мерляку». Тут Мерляк не ўцярпеў і запратэставаў: «Таварыш, адносіцца да вас, прафэсар Адамовіч. Я выйшаў не з тае самае школы». У выніку галасаваньня прайшла абсалютнай бальшынёю прапанова рэвізыйнае камісіі.

Другі дзень пачаўся выбарамі Галоўнае Ўправы. Яна, паводля новага статуту, называлася Радай дырэктароў. На старшыню Рады дырэктароў былі пададзеныя дзьве кандыдатуры: К.Мерляк і др. Ст. Станкевіч. У выніку тайнага галасаваньня за старшыню быў выбраны др.Ст.Станкевіч, які перамог парай галасоў. Далей былі выбраныя яшчэ шэсьць асобаў, якія ўкамплектавалі Раду дырэктараў БАЗА. У рэвізыйную камісію былі выбраныя: Н.Ганэцкі—старшыня, М.Мерляк і Ф.Кушаль. Правёўшы выбары, старшыня кангрэсу А.Адамовіч перадаў кіраўніцтва свайму заступніку ды пакінуў залю. Далей яго больш нічога не цікавіла.

Пасьля прыняцьця пляну працы на прапанову рэзалюцыйнае камісіі былі прынятыя прывітальныя тэлеграмы Прэзыдэнту й віцэпрэздыдэнту ЗША, Прэзыдэнту Рады БНР, губэрнатару штату Нью Ёрк і мэру гораду Нью Ёрк. Адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну кангрэс закончыўся позьнім вечарам 2 чэрвеня 1963 году.

Тут неабходна зьвярнуць увагу на некаторыя факты, якія папярэдзілі X кангрэс БАЗА. Др.С.Станкевіч прыехаў зь Мюнхэну на сталае жыцьцё ў Нью Ёрк вясною 1963 году ў выніку скарачэньня пэрсаналу ў Інстытуце па вывучэньню СССР (установа Амэрыканскага камітэту).

Др.Станкевіч паціху праводзіў падрыхтоўку, каб К.Мерляка не выбралі на наступную кадэнцыю старшынёй новае ўправы. Ён зьвязаўся з сваім калегам др. С.Грынкевічам ў Кліўлендзе, каб бяз сходу вызначыў дэлегатаў на кангрэс. Пры дапамозе А.Адамовіча яны здабылі 12 галасоў сваіх прыхільнікаў. Падчас кангрэсу яшчэ адзін др. Я.Сажыч з Дэтройту, таксама калега др.С.Грынкевіча, актыўна падгаварваў каго мог, каб галасавалі за Станкевіча.

Старшыня ўступаючай управы К.Мерляк і сакратар В.Шчэцька перадалі ўсе акты БАЗА 16 чэрвеня 1963 году старшыні новае Рады дырэктараў др.Ст.Станкевічу й заступніку М.Тулейку. П.Ганэцкі, уступаючы скрабнік БАЗА, перадаў новаму скарбніку А.Міцкевічу грошы

ў суме 2, 230. 63 даляраў і ўсе фінансавыя дакумэнты, зьвязаныя зь дзейнасьцю скарбніка.

З прычыны няправільнага правядзеньня кангрэсу, К.Мерляк склаў пратэст і падаў да ведама беларускага грамадзтва ў Амэрыцы й ўсёй эміграцыі ў вольным сьвеце, закончыўшы яго наступнымі словамі: «Дзеля гэтага я, як старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА да X кангрэсу,.. які прылажыў з усёю ўправаю шмат стараньняў у арганізацыі кангрэсу й прыгатаваў кангрэс з найбольшаю дакладнасьцю, улічваючы статут і арганізацыйныя правілы культурнага грамадзтва, складаю пратэст супраць тых, хто паганьбіў беларуска-амэрыканскую арганізацыю. Я апэлюю да ўсяго беларускага грамадзтва ў ЗША выказаць свой погляд на гэтае дзіўнае зьявішча.»

Зараз-жа пасьля Кангрэсу шматлікія паважаныя асобы й грамадзкія дзеячы радзілі К.Мерляку не перадаваць нававыбранай управе БАЗА становішча старшыні, справаў і касу, каб гэтым змусіць яе стаць на судовую дарогу, каб прызнаць X кангрэс няправільным. У гэтай справе К.Мерляк атрымаў ліст ад мгр. Леаніда Галяка, сябры БАЗА стэмфордзкага аддзелу БАЗА, які пісаў:

«Стэмфорд, 22чэрвеня 1963 г.

Паважаны Спадар Мерляк!

Атрымаў Ваш пратэст з дня 12 чэрвеня с.г. у спрве падзеяў на X кангрэсе БАЗА і перасылаю Вам некалькі сваіх заўвагаў у гэтай справе, як прыватнай асобе.

Нельга не згадзіцца з Вамі, што на X кангрэсе БАЗА, які абыўся 1-2 чэрвеня былі вельмі паважныя парушэньні агульна прынятых звычаяў, якія, паводля сутнасьці справы, робяць нязважнымі ўсе пастановы кангрэсу. Даволі толькі ўспомніць той факт, што ў справе дапушчэньня на кангрэс дэлегатаў з Кліўленду вырашылі па сутнасьці, галасамі дэлегатаў з Кліўленду, хаця ў такім выпадку дэлегаты з Кліўленду не маглі прыймаць удзелу ў галасаваньні аб дапушчэньні іх, яны мелі толькі права прадставіць сваё стаовішча й чакаць на пастанову кангрэсу у гэтай справе.

Ужо адзін такі факт павінен быў-бы выклікаць уневажненьне ўсіх пастановаў кангрэсу, калі-б надта гэтага ўняважненьня дамагаўся праўным шляхам.

У вас быў вельмі моцны козыр у руках, а менавіта: вы не павінны былі перадаваць нававыбранаму ўраду становішча й справаў, і праз

гэта або змусілі-б novавыбраны ўрад стаць на судовую дарогу і дамагацца перадачы БАЗА, і тады самім сабой справа важнасьці пастановаў кангрэсу сталася-б прадметам судовага вырашэньня, або змусіла-б новы ўрад шукаць іншага вырашэньня: шляхам новых выбараў ці нечага падобнага.

Цяпер справа стаіць трохі горш, бо цяпер новы ўрад мае БАЗА у рукох, а незадаволеныя сябры БАЗА могуць дамагацца ўнеуваженьня Кангрэсу з увагі на паважныя парушэньні, прычым цяжар поваду, што парушэньне былі ляжыць на гэтых сяброх БАЗА.

У абодвух аднак выпадках, гэтая справа належыць да выключна кампэтэнцыі сяброў БАЗА, бо ніякай іншай арганізацыі,якая мела-б наглядчыя правы над БАЗА, няма. Наагул, трэба сказаць, што якія сябры, такая й арганізацыя, іншым арганізацыям ці асобам публічна гэтай справай займацца няма як. Цьверджаньне, што якія сябры, такая й арганізацыя можна з'ілюстраваць наступна: у ўсіх нашых арганізацыях ня прынята, напрыклад, даваць абсалютoрыюм асобе, якая ня вылічылася з грамадзкіх грошаў—у належным часе й месцы аднак, у БАЗА такі выпадкак быў заіснаваўшы. Усё залежыць ад грамадзка-этычных пoглядаў большасьці сяброў.

Ня ведаю, якія ў Вас далейшыя пляны ў гэтай справе. Калі ўсе мы абмяжуемся толькі пратэстам дык магчыма, ня варта было й пратэставаць, бо «Васька слушает да ест». Ці маеце намер рабіць нешта, апрача пратэсту, дык у такім выпадку, як мне здаецца, трэба было-б паміма ўжываньня фармальных закідаў парушэньняў у правядзеньні Кангрэсу, трэба перавесьці ўсю справу, на аснову прынцыпова-палітычную: прэдрашэнстава ці непрэдрашэнства. Гэтай магчымасьці Вы ня выкарысталі на кангрэсе. Ёсьць яшчэ й іншыя праблемы, але на гэты раз хопіць.

З пашанаю Л.Галяк».

На сходзе апазыцыі сяброў БАЗА да X кангрэсу, які адбыўся у Кліўлендзе, у верасьні 1963 году, зьвярнуліся да др.Станкевіча з патрэбаваньнем паўторнага X кангрэсу Беларускага-Амэрыканскага Задзіночаньня Амэрыкі. Др. Станкевіч адказаў: «Прыеду ў Нью Ёрк, адразу склічу сяброў Рады дырэктароў і зрэзыгную са становішча старшыні». Нажаль, ён нічога ў гэтай справе не зрабіў (Паводля «Уздыму» № 1, кастрычнік 1963 году г.Кліўленд).

Мерляк, правёўшы аналіз падзеяў, прыйшоў да высновы, што людзі, каторыя давалі парады, ня мелі ўяўленьня ў чым справа. Вытлумачыць і даказаць ім ды іншым было ў данным часе абсалютна немагчыма, шмат каму справа здавалася незразумелай. Групоўка, якая дзеяла ўнутры Рады БНР, ад даўжэйшага часу закідала Мерляку, што ягоная дзейнасьць шкодная для Рады БНР, шкодзіць беларускай нацыянальнай справе й вызвольнаму руху, што ў сутнасьці было наадварот.

Тады БНР для групоўкі Абрамчыка была шыльдай, за якую яны хавалі сваю антынацыянальную дзейнасьць за мізэрныя датацыі й становішчы ў Амэрыканскім камітэце, ажыцяўляючы палітыку непрадрашэнства. У іх інтарэсе было спыніць усякае кантрадзеяньне, таму і абвінавачвалі ў сьмяротных грэхах К.Мерляка. Групоўка ніколі не згадзілася-б на ануляваньне X кангрэсу БАЗА.Тым больш Мерляк ўважаў, што йсьці зь беларускаю справаў ў амэрыканскі суд было-б з боку практычнага неразыменым, а з боку патрыятычнага —паніжаючым для беларуса-нацыяналіста. Ён пастанавіў ў форме пратэсту зьявярнуць увагу беларускага грамадзянства, што на X кангрэсе БАЗА былі пагвалчаныя правы сяброў Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Амэрыкі.

Рэсорт Бэлэр-Менск у адлегласьці 110 міляў ад Нью Ёрку быў урачыста адкрыты 4-7 ліпеня 1963 год. Дзеля куплі летняга месца адпачынку для беларусаў, што жывуць у горадзе Нью Ёрку й ваколіцах, была створаная карпарацыя амэрыканскага тыпу й выпушчаныя акцыі (шэры) цэною 100.00 даляраў адна. Кожны беларус бяз ніякіх выняткаў або абмяжаваньняў мог набыць шэры. Дзякуючы ініцыятарам групы, да якое належылі В. Юрцэвіч, Ю. Станкевіч, др.П.Маркоўскі, В.Пелеса, др.В.Кіпель, К.Мерляк і М.Касьцюк, якія на працягу двух гадоў прадавалі шэры ды шукалі аб'ект, — купля адпачынковага асяродку была зрэалізавана. Асяродак займаў 64 акры (акр прыблізна раўняецца 0,5 гэктара) сямнаццаць будынкаў, купальны басэйн і палову берага возеры ўздож асяродка. Гэта была адна з небывалых падзеяў гаспадарскага характару ў беларускім грамадзтве, у якой бралі ўдзел людзі незалежна, да якое групоўкі яны належалі. Дык нядзіва, што на адкрыцьцё зьехалася мноства народу.

На чатырохдзённую праграму злажылася купальле й вечарына-баль. Грала акрестра Лявона Рудзінскага. У сыботу архіяпіскап

Васіль з прысутнымі сьвятарамі адслужылі малебен, азараз-жа пад гукі амэрыканскага й беларускага гімнаў дзеці Міхась Юрцэвіч і Алеся Кіпель перарэзалі сымбалічную стужку, адчыняючы гэтым самым афіцыяльна беларускі адпачынковы цэнтр Менск. Старшыня карпарацыі В.Юрцэвіч коратка прамовіў да прысутных і перадаў К.Мерляку далей кіраваць праграмай. Пасьля прывітаньня архіяпіскапа Васіля др.В.Кіпель здаў справаздачу зь дзейнасьці кіраўніцтва й пляну на будучыню. К.Мерляк прадставіў прысутным сяброў дырэкцыі карпарацыі Менск і пэрсанал асяродку ў ліку 10 асобаў з загадчыкам Ю. Станкевічам. Прамаўлялі Б.Шчорс, заступнік старшыні Кангрэсовага Камітэту. Выступіў новы старшыня БАЗА др.Ст.Станкевіч, які ў сваёй прамове асьведчыў, што палітыка будзе, маўляў, палітыкай, якую праводзіў К.Мерляк, а ніякай іншай. Гэта былі словы, каб супакоіць ўзбураных сяброў БАЗА. Яшчэ было некалькі прывітаньняў ад беларускіх арганізацыяў. Кароткаю прамоваю К.Мерляк закончыў праграму. Вечарам адбылася вечарына, падчас якое была выбраная князёўна асяродку Менск Элізабэта Дубовік. Урачыстасьці адкрыцьця асяродку Менск закончыліся назаўтра Богаслужбаю й агледзінамі рэсорту прыехаўшымі гасьцямі.

Наступнай падзеяй пасьля летняга сэзону быў парафіяльны сход у Брукліне, у якім К.Мерляк быў у якасьці заступніка старшыні сходу. Адбыліся справаздачы старшыні Я.Казьлякоўскага й скарбніка Янкі Ніхаёнка, які здаў лічбы з фінансавай гаспадаркі прыходу й адміністрацыі беларускага грамадзкага цэнтру. Пасьля дыскусыі ўдзелена абсалюторыюм з падзякаю.

У новую раду былі выбраныя Я.Казьлякоўскі—старшыня й Б.Данілюк, Міцкевіч, В.Захаркевіч, В.Шчэцька, М.Тулейка, і В.Юрцэвіч —сябры. На сходзе былі выбраныя дэлегаты К.Мерляк і Л. Леўковіч на эпархіяльны сабор, які меўся адбыцца 30 лістапада 1963 году ў Нью Ёрку.

Дзень 22 лістапада 1963 году у які быў забіты Прэзыдэнт ЗША Джон Ф.Кэнэды узварушыў Амэрыку й пражываючых у ЗША беларусаў.

30 лістапада адбыўся у Нью Ёрку эпархіяльны зьезд БАПЦ, у якім актыўны ўдзел узяў К.Мерляк як сакратар рэзалюцыйнае камісіі. Зьезд прайшоў вельмі добра. У эпархіяльную раду ўвайшлі ўсе сьвятары й др.В.Васілеўскі (Войтэнка) як скарбнік. Усе яны былі выбраныя на кадэнцыю трох гадоў.

# 1964

Вярнуўшыся дадому з сустрэчы новага 1964 году Кастусь падумаў сам сабе, што дзякуючы дапамозе людзей, каторыя бачылі ў ім пагрозу сваёй палітычнай кар'еры, пазбыўся некалькі адказных становішчаў у Радзе БНР. Тыя, хто дапамагалі яму пазбыцца старшынства ў БАЗА, магчыма, хацелі здабыць ласку ў др.Ст.Станкевіча. Мажліва, выйшла ўсё да лепшага, бо ўжо ніхто не скажа, што ён ўцякаў, як іншыя, ад грамадзкага абавязку.

Надыходзілі 10 угодкі прыезду Кастуся зь сям'ёй ў Амэрыку. Прафэсыйная праца давала вялікія магчымасьці працаваць на грамадзкай ніве. Вол-стрыт, як месца працы, параплаўная кампанія, канцылярыя, тэлефон, прылады, а галоўнае наяўнасьць часу на грамадзкія патрэбы. Не як той, што працаваў пры печы сухарыкаў, пры станку або чысьціў канцылярыі—яму не было-б лёгка справіцца або й немагчыма справіцца з даручэньнямі. Такі стан выклікаў пэўную зайздрасьць з боку аднаго, другога земляка, якія не маглі мець падобнае працы.

Ужо прайшло чатыры гады (з 1959) ад прыезду з Аргентыны бацькоў Ганны—Антона й Аляксандры Губэрт— брата Адольфа зь сям'ёй і сястры Марыі Завалока зь сям'ёю. Усе яны пры помачы Кастуся й спагадлівых суседзяў беларусаў уладзілі сваё жыцьцё на новым месцы. У чэрвені Кастусь з сваім шваграм Адольфам заклалі суполку «Слуцк Рэальты Ко.» ды купілі пяціпавярховы дом, у якім было 35 памешканьняў па 3, 4, 6 пакояў. Гэтае прадпрыемства патрабавала кіраўніцтва й дагляду. Дык паміма ўсяго выглядала, што наступаючы год меўся быць актыўным

9 лютага ў залі грамадзкага цэнтру адбыўся гадавы сход карпарацыі адпачынковага цэнтру Бэлэр-Менск. Пасьля справаздачаў кіраўніцтва й рэвізыйнае камісіі сход выказаў прызнаньне дырэкцыі з падзякай старшыні В.Юрцэвічу. Нававыбраная дырэкцыя выбрала кіраўніцтва ў складзе: старшыня—В.Юрцэвіч, віцэ-старшыня К.Мерляк, сакратар —Ю.Станкевіч і скарбнік Ул.Пелеса. На сходзе пастанавілі будаваць новую залю, як толькі здабудзецца адпаведная сума грошаў.

У нядзелю 23 лютага адбыўся гадавы перавыбарчы сход аддзелу Згуртаваньня Беларускіх Вэтэранаў у Нью Ёрку. Уступаючы старшыня Курыла зрабіў справаздачу, а пасьля яго ўзяў слова скарбнік. Дыску-

сыі амаль ня было, бо вялікай вэтэранскай актыўнасьці таксама не было, а грошаў у касе яшчэ менш, але абсалютораым удзялілі з падзякаю.

Выбары прайшлі спраўна. У камандаваньне вэтэранамі былі выбраныя: старшыня—К.Мерляк і сябры П.Каралевіч, В.Шчэцька, Клінцэвіч і В.Мельяновіч. Наступным пунктам парадку дня была справа адзначэньня 20-х угодкаў мабілізацыі ў Беларускую Краёвую Абарону.

Сход аднагалосна пастанавіў гэтае сьвяткаваньне зладзіць даручыўшы яго правядзеньне новаму старшыні К.Мерляку.

У лютым на паседжаньні прадстаўнікоў акруговае ўправы БАЗА й БККА для адзначэньня 46-х угодкаў незалежнасьці Беларусі быў створаны сьвяткавальны камітэт. Ад БАЗА ўвайшлі Д.Клінцэвіч, К.Мерляк і А.Несьцяровіч. Ад БККА ўвайшлі А.Плескачэўскі, Л.Брылеўская й Ул.Пелеса.

Пасьля паседжаньня зараз-ж пачалася дакладная падтрыхтоўка да сьвяткаваньня. Быў выдадзены мэмарандум адносна становішча ў Беларусі й шырока разасланы прадстаўнікам амэрыканскага грамадзтва. Акадэмію ўгодкаў, якая адбылася 22 сакавіка 1964 году, у залі гатэля «Астор», ў Нью Ёрку распачаў малітваю а.М.Лапіцкі, настаяцель прыходу сьв. Еўфрасіньні Полацкай ў Саўт Рывэры. Наступна прывітаў гасьцей ад сьвяткавальнага камітэту К.Мерляк ды запрасіў гасьцей ушанаваць памяць нядаўна забітага прэзыдэнта, нашае новае Бацькаўшчыны Злучаных Штатаў Амэрыкі Джона Ф.Кэнэды. З дакладам выступіў С.Коўш па-беларуску, а В.Мельяновіч па-ангельску. Гарадзкі комішёнэр Джэйм О' Браен прывітаў сабраных ад імя мэра горада Нью Ёрку Р.Вагнэра і перадаў К.Мерляку праклямацыю, у якой абвесьціў дзень 25 сакавіка «Беларускім днём незалежнасьці».

М.Бахар прачытаў атрыманыя праклямацыі «Дзень 25 сакавіка» ад пяці губэрнатараў штатаў Амэрыкі, азнаёміў прысутных з шматлікімі прысланымі прывітаньнямі ад паслоў, сэнатараў і арганізацыяў. Пасьля прывітаньняў прысутных прадстаўнікоў была прынятая рэзалюцыя.

Праграма мастацкай часткі склалася з выступленьняў Саўтрывэрскага хору ды салістаў песьні й музыкі. Старшыня К.Мерляк падзякаваў прысутных за ўдзел у акадэміі, запрасіў архіяпіскапа Васіля БАПЦ на трыбуну, які малітваю багаславіў сабраных. На заканчэньне сьвята выступіў хор, які выканаў «Існолаэты дэспота».

26 сакавіка 1964 году архіяпіскап Васіль прачытаў малітву ў Амэрыканскім сэнаце, а пратаярэй М.Лапіцкі гэтага-ж дня прачытаў у Палаце рэпрэзантантаў з нагоды 46 угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

«Нью Ёрк Таймс», якая неахвотна падавала весткі пра Беларусь, 23 сакавіка памясьціў на 8 бачыне наступную навіну.

500 Recall Independence of Byelorussian Republic

"More than 500 persons gathered in the Astor Hotel yesterday to mark the 46th anniversary of the declaration of independence of the Byelorussian Democratic Republic.

Many of those attending wore traditional costumes embroidered red and white. A resolution was adopted calling on the Voice of America to establish broadcasting programs in Byelorussian.

The resolution said that the Voice or America had engaged in " unjustified discrimination against the Byelorussian language for the last 12 years". Speakers urged Americans of Byelorussian descent to continue a campaign to seek freedom for nations under Communist domination."

У Амэрыканскім кангрэсе выступілі з нагоды 46-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі 28 сэнатараў і кангрэсмэнаў з прамовамі, пажаданьнямі беларускаму народу хуткага вызваленьня з-пад расейскага камуністычнага панаваньня. Асобнаю брашураю былі выдадзеныя ўсе выступленьні ўлучна з малітвамі й рэзалюцыяй, прынятай на акадэміі 22 сакавіка 1964 году. Акрамя гэтага 46-я угодкі незалежнасьці Беларусі шырока камэнтаваліся ў прэсе Нью Ёрку.

Каб мець належнае ўяўленьне неабходна адзначыць прыкрыя зьявішчы, якія падчас і пасьля сьвяткаваньня здарыліся ў беларускім грамадзтве. Галоўная Ўправа БАЗА, якая складалася з людзей прэтэндуючых у прышласьці на кіраваньне Беларускай дзяржавай, на чале з др. Ст.Станкевічам і праф. А.Адамовічам, байкатавалі акадэмію, прысьвечаную 46 угодкам 25 Сакавіка, таму што акруговая ўправа БАЗА ладзіла бязь іх згоды з Беларускім Кангрэсовым Камітэтам, таксама старшыня гэтага камітэту І.Касяк ня быў прысутным. Мала таго: з подпісам прат. М.Лапіцкага й старасты Ф.Высоцкага, Злучаны Беларуска-Амэрыканскі сьвяткавальны камітэт атрымаў пратэст наступнага зьместу: «...у 1963 годзе БККА і БАЗА дамовіліся супольна сьвяткаваць Дзень 25 сакавіка. За падставу было прынята раўнапраўнае трактаваньне абодвух бакоў, як у галіне грамадзка-

палітычнай, так і царкоўнай. У 1963 годзе малітву чытаў архіяпіскап Васіль Тамашчык і ў канцы акадэміі ня было ніякіх «малітоўных дадаткаў». У гэтым годзе малітву на акадэміі чытаў пратаярэй М.Лапіцкі й згодна дамоўленасьці ў праграме сьвяткаваньня не прадбачвалася, што ў канцы акадэміі будуць «малітоўныя дадаткі». арх. Васіля Тамашчыка. Просім павядоміць нас, чаму дазволена сп.К.Мерляку на акадэміі ў праграму ўносіць адсябячыну»

Дамоўленасьць была такая. У 1963 годзе архіяпіскап Васіль адчыняў акадэмію, а пратаярэй М.Лапіцкі зачыняў. А ў 1964 годзе мусіла адбыцца наадварот. Гэты дагавор парушыў ніхто іншы, як сам пратаярэй М.Лапіцкі, які не прыйшоў на акадэмію ў 1963 годзе.

Агульны гадавы сход сяброў Ньюёркскае акругі БАЗА адбыўся 14 чэрвеня 1964 году ў залі грамадзкага цэнтру, 401 Атлянтык Авэ. у Брукліне. Ён быў склікани згодна статуту й паводля ўсіх арганізацыйных правілаў і традыцыяў БАЗА. На сход прыйшлі 53 асобы. Уступаючы старшыня Д.Клінцэвіч адкрыў сход, прапануючы выбраць прэзыдыюм сходу. З трох паданых кандыдатаў быў выбраны абсалютнай бальшынёй на старшыню К.Мерляк, на заступніка старшыні —А.Шукелайц і на сакратара В.Шчэцька. Старшыня сходу К.Мерляк прачытаў сьпісак прыстуных і сьцвердзіў, што на залі кожная асоба, паза адной сп-ні Крыванос, зьяўляюцца сябрамі. З справаздачамі выступілі старшыні Д.Клінцэвіч, скарбнік Р.Гарошка, Зіна Станкевіч, М. Тулейка з культурна-асьветнай дзейнасьці. Пасьля дыскусыі ўдзелены абсалюторыюм уступаючай управе за выняткам Р.Гарошкі, якому абсалюторыюм устрымана да часу ўпарадкаваньня касы.

Перад выбарамі новае ўправы БАЗА старшыня Галоўнае Ўправы др. Ст.Станкевіч злажыў прапанову адкласьці сход, бо ня ўсе сябры плацілі складкі. Праверыўшы сьпісак, выявілася, што залягаюць на паўгода толькі 9 сяброў, 4 звольненыя, бо не працуюць і 22 сябры, якіх складкі ня высьветленыя.

Перад выбарамі адбылася дыскусыя, у якой ўзялі ўдзел 24 асобы, Дыскусыя сталася гарачай, калі дваіх інтэлігэнтаў абразілі сабраных «цемнатою», неразумеючых справы. Тут трэба зазначыць, што да гэтага часу ніколі аплаты складак не праверaлі, усе былі задаволеныя, што людзі прыйшлі на сход. За прапанову адлажыць сход галасавала пяць асобаў, за працяг сходу —25. Рэшта ўстрымалася. Такім чанам, сход прыступіў да далейшай працы. Але старшыня Галоўнае Ўправы

й другія пакінулі сход. Сход выбраў новую ўправу ў складзе: К.Мерляк—старшыня, Д.Клінцэвіч—першы заступнік старшыні й скарбнік, В.Захаркевіч—другі заступнік, В.Шчэцька—сакратар, А.Несьцер—культурна-асьветны рэфэрэнт, Юрка Станкевіч і Л.Леўковіч—сябры. У рэвізыйную камісію выбраныя: др.Янка Станкевіч, П.Мельяновіч і В.Юрцэвіч.

У нядзелю 21 чэрвеня 1964 году адбыўся беларускі фэстываль на сусьветнай выстаўцы ў Нью Ёрку. Фэстываль быў зарганізаваны супольнымі мастацкімі сіламі БАЗА і БККА Фэстываль адбыўся на высокім узроўні.

Царкоўная рада прыходу сьв.Кірылы Тураўскага 24 чэрвеня на паседжаньні пастанавіла не аддаваць на сход залі тым людзям, што пакінулі сход 14 чэрвеня акруговага аддзелу БАЗА.

Другі сход аддзела БАЗА адбыўся 27 чэрвеня у памешканьні А.Міцкевіча, на якім выбралі новую управу ў складзе: Др. Набагез-старшыня, А.Шукелайц—заступнік, Ольга Запруднік—сакратар, Р.Гарошка—скарбнік, Зіна Станкевіч—культурна-асьветны рэфэрэнт, др.Янка Станкевіч—яе заступнік. Такім чынам, акруговы аддзел БАЗА Нью Ёрку разьбіўся на дзьве варожыя арганізацыі, якія пачалі змаганьне за «беларускую справу» да апошняга слова.

Першым выстрэлам у бок К.Мерляка стала пазбаўленьне яго сяброўства ў БАЗА, быццам-бы за парушэньне ейнага статуту. Гэтыя акты падпісалі 27 ліпеня Ул.Набагез—старшыня й Ольга Запруднік—сакратар. Вось якія разумныя людзі: пакінулі сход, залажылі другі аддзел БАЗА й пазбавілі сяброўства Мерляка, які да гэтае зьдзелкі зусім не належаў.

І пачалася нечуваная ў грамадзкім жыцьці нагонка цывілізаваных людзей на Мерляка, якога абвінавачвалі ўва ўсіх нячуваных, а перадусім няістотных, непраўдзівых і надуманых злачынствах у яго грамадзкай працы. Выходзіла, што толькі ён перашкаджае праводзіць карысную грамадзкую працу, а яго дзейнасьць ёсьць шкодная нацыянальнай справе. Мэтай гэтай нагонкі было, каб К.Мерляка адсунуць ад грамадзтва. Знайшлі ў ім адзінага віноўніка ў няўдачах дзеяньнях існуючай групоўкі, бо бяз яго яны лёгка-б расправіліся з «масамі» або «паляшукамі».

Але ня ўсе людзі былі неінтэлігентныя. Пабачыўшы, што ня Мерляк, а якраз яны дзеляць, клясыфікуюць, фальшуюць факты, выступілі

ў абароне праўды, пішучы артыкулы: «Праўда—такое інтэлігенцыі ў нас не было», «Адказ сп. інтэлігэнту на закід «цемры», «Два агульныя сходы ў Нью Ёрку», асьведчаньне Згуртаваньня Беларуска-Амэрыканскіх Вэтэранаў імя ген. К.Езавітава ў Кліўлендзе. Цікавы ліст др. Я.Станкевіча зьмешчаны ў газэце «Беларус» № 90, верасьня 1964 году.

«14 чэрвеня сёлета, у Нью Ёрку мяне абралі за сябру рэвізыйнае камісіі ў гуртку, каторым кіруе сп.К.Мерляк. З гэтага выглядае, што быццам я належу туды, які не ўважаю цяпер за аддзел БАЗА. Гэтая самая групоўка мела з др. Янкам Станкевічам нямала клопату ў радзе БНР, да якое ад даўжэйшага часу не належаў, але каб людзі не сумніваліся ў тым, што ён належыць да «інтэлігенцыі» палічыў патрэбным напісаць у рэдакцыю «Беларуса», каб ўсе аб гэтым ведалі.»

Рэдактар «Беларуса» др.Ст.Станкевіч, яго пляменьнік, ахвотна памясьціў, каб гэтым замацаваць за сабою перабежчыка.

23 лютага 1964 году на прапанову генэрала Ф.Кушаля, на агульным сходзе Згуртаваньня Беларускіх Вэтэранаў у Нью Ёрку, была прынятая пастанова адзначыць 20 годзьдзе Беларускай Краёвай Абароны супольна з вэтэранамі беларускага Кангрэсовага Камітэту Амэрыкі. Старшыня ЗБВ К.Мерляк склікаў прадстаўнікоў ЗБВ і БКА 17 травеня на паседжаньне ў справе арганізацыі 20-х угодкаў мабілізацыі ў БКА. Тут трэба адзначыць, што бэцээраўскі бок ня меў вэтэранскае арганізацыі, дзеля гэтага былі запрошаныя прадстаўнікі Кангрэсовага камітэту.

Пасьля адсьвяткаваньня 20 угодкаў БКА была заарганізаваная арганізацыя Вэтэранаў у Нью Джэрсі з сядзібай ў Пасэіку). На паседжаньні ўзялі ўдзел ген.Ф.Кушаль, К.Мерляк, Д.Клінцэвіч, Ул.Пелеса, А.Занковіч, В.Шчэцька, М.Казьлякоўскі, Падлазьнік і Булгай. Пастанавілі адзначыць 20 угодкі БКА 4 ліпеня 1964 году у Беларускім цэнтры адпачынку Бэлэр —Менск у Глен Спэй, Нью Ёрк.

Для правядзеньня сьвяткаваньня й падрыхтоўкі быў выбраны Беларуска-Амэрыканскі Камітэт Вэтэранаў у складзе: К.Мерляк— старшыня, А. Занковіч—заступнік, Д.Клінцэвіч—сакратар і Ул.Пелеса—скарбнік.

На гэтым паседжаньні была прынятая пастанова, што ўгодкі БКА азначаюцца, як «Дзень беларускага жаўнера» дзеля таго, каб гэтым злучыць вайскавікоў, якія ў часе другое сусьветнае вайны змагаліся за беларускую нацыянальную справу ў радох Беларускае

Самааховы, службы бясьпекі, у асобных батальёнах, як ахова чыгункі, ахова лясоў і ахова насельніцтва. А таксама, каб улічыць і тых вэтэранаў, што з тых ці іншых прычынаў змагаліся ў замежных арміях улучна й у амэрыканскай, каб гэтым самым прыслужыцца вызваленьню Беларусі. Ад гэтага часу кожны год у гонар угодкаў БКА й у памяць палеглых за незалежную Беларусь, дзень 4 ліпеня адзначаецца як Дзень беларускіх герояў.

Падрыхтоўка да адзначэньня была вельмі цяжкая, таму што шмат людзей перашкаджалі. Адны не хацелі, каб гэтыя ўгодкі наогул сьвяткаваліся, другія хацелі зрабіць, каб адзначэньне было чыста бэцээраўскае, трэція не хацелі, каб гэтыя ўгодкі адзначаліся разам. Усе гэтыя цяжкасьці камітэт перамог і гэты дзень быў адзначаны вельмі ўрачыста з удзелам больш чатырохсот удзельнікаў. Перад распачацьцём сьвяткаваньня адбылася нарада: праф. Р.Астроўскі, маёр др.Я.Сажыч у заступстве Ф.Кушаля, які па сямейных прычынах (урадзіны сына) на сьвяткаваньне ня прыбыў, і старшыня камітэту К.Мерляк. На нарадзе быў устаноўлены парадак і працэдура прабегу ўрачыстасьці. Р.Астроўскі, як прэзыдэнт БЦР, падвысіў рангу з капітана на маёра др. Сажычу.

4 ліпеня а гадзіне 10-й пачалася зборка былых жаўнераў, якую правёў і камандаваў парадам капітан Д.Клінцэвіч. Сфармаваўшы вэтэранаў каля машту, ён злажыў рапарт маёру Я. Сажычу, які ў сваю чаргу далажыў Прэзыдэнту БЦР Р.Астроўскаму, што вэтэраны гатовыя да падняцьцья сьцягоў. Пад мэлёдыю амэрыканскага гімну (выканы на акардыёнах Ю.Мерляком і В.Басікам) і малітву «Беларусь, наша маці Краіна» былі паднятыя амэрыканскі й беларускі сьцягі.

Пасьля гэтага распачаўся палявы малебен, які адслужылі а.М.Лапіцкі, а.Кузьміцкі й дыякан Коўш. Адною хвілінаю цішы й адсьпяваньнем «Вечная памяць» была ўшанаваная памяць палеглых жаўнераў у змаганьні падчас другое сусьветнае вайны за волю беларускага народу. Зараз-жа адбыўся парад. Яго прымалі Прэзыдэнт БЦР, маёр Сажыч, генэрал Дзямідаў і генэрал Падлязьнік.

А 12-й гадзіне распачалася акадэмія. Адкрыў і кіраваў ёю старшыня камітэту К.Мерляк. Ён прадставіў старшыню Згуртаваньня беларускіх вэтэранаў імя К.Езавітава ў Кліўлендзе Ю.Гасьцеява, які прачытаў мабілізацыйны загад БКА. З прывітаньнем ад галоўнакамандуючага БКА генерала Ф.Кушаля выступіў маёр Сажыч, які пра-

чытаў заклік да былых вайскоўцаў, выданы генэралам Кушалям з гэтае нагоды. К. Мерляк прачытаў даволі даўгі рэфэрат аб падрыхтоўцы, правядзеньні мабілізацыі й змаганьні БКА, падрыхтаваны генэралам Кушалем. Пасьля рэфэрату выступіў Прэзыдэнт БЦР прафэсар Р.Астроўскі. Ён прааналізаваў палітычныя й вайсковыя падзеі ў часе якіх арганізавалася БКА. Зьмест прысягі жаўнераў БКА прачытаў Н.Мядзейка. Пералічэньнем прысланых прывітаньняў з гэтае нагоды й праспяваньнем беларускага нацыянальнага гімну скончылася акадэмія. Па заканчэньні ўсе прысутныя перайшлі ў другі будынак, дзе ўжо быў прыгатаваны банкет. На банкеце з прынагоднымі прамовамі выступілі генерал Дзямідаў, Я.Кіпель, Н. Мядзейка, прат. М. Лапіцкі, маёр Сажыч, на заканчэньне—старшыня камітэту К.Мерляк. Банкет прайшоў у вельмі сяброўскай атмасфэры. У часе яго гучалі беларускія вайсковыя песьні.

14 жніўня 1964 году К.Мерляк атрымаў з Вашынгтону, з Галоўнай кватэры камітэту Рэспубліканскае партыі Амэрыкі, ліст, што ён пакліканы старшынёю Дын Бурч на старшыню Беларуска-Амэрыканскага аддзелу рэспубліканскае партыі на Амэрыку. К.Мерляк даў згоду выконваць абавязкі старшыні беларускага аддзелу рэспубліканскай партыі й прыступіў да арганізацыі камітэтаў у штатах, дзе пражывалі беларускія грамадзяне ЗША для актыўнае выбарчае кампаніі на Прэзыдэнта ЗША сэнатара Бэры Гольдвотэра.

На рэкамэндацыю К. Мерляка былі назначыная старшыні штатных камітэтаў Рэспубліканскае партыі Злучаных Штатаў Амэрыкі ў наступных штатах:

К.Мерляк —адначасна застаецца старшынёю камітэту на штат Нью Ёрк, Мануіл Ясюк —на Нью Джэрсі, Канстанцін Ворт (Вайцяхоўскі)—на Пэнсыльвэнію, Аляксандар Шастак—на Дэлявэр, Іван Канарчук—на Мэрыленд, Аўген Протас—на Канэктыкут, Аўгень Вярбіцкі—на Масачусэтс. Канстантын Калоша—на Агаё, Міхась Качура—на Іліноіс, Язэп Арцюх—на Каліфорнію, Ф.Дубоўскі—на Нэбраска, М.Лазоўскі—на Калярадо, Васіль Пляскач—заступнік старшыні К.Мерляка й старшыня камітэту на штат Мічыган.

У верасьні й кастрычніку праводзілася выбарчая дзейнасьць, якая шырока разгарнулася, ня толькі каб Бэры Гольдвотэр быў выбраны на Прэзыдэнта ЗША, але каб таксама вывесьці на палітычную арэну беларускае пытаньне на раўні з другімі нацыянальнасьцямі. Мерляк




*Старшыня сьвяткавальнага камітэту Кастусь Мерляк чытае рэфэрат на акадэміі, прысьвечанай 20-м угодкам стварэньня Беларускае Краёвае Абароны ў рэсорце Бэлэр-Менск.*

хацеў, каб гэтае пытаньне было ўнесена ў палітычную плятформу рэспубліканскай партыі. Акрамя некалькі прэсавых камунікатаў, якія былі шырока распаўсюджаныя сярод беларускага грамадзтва, К.Мерляк, зьвяртаўся праз радыё да выбаршчыкаў беларускага паходжаньня з наступнымі словамі па-беларуску: «Тут пры мікрафоне Кастусь Мерляк, галоўны старшыня беларускае сэкцыі ў Рэспубліканскае партыі Амэрыкі. Сёньня я маю гонар прадставіць нам прышлага прэзыдэнта Злучаных Штатаў Амэрыкі—сэнатара Бэры Гольдвотэра. Плятформа рэспубліканскае партыі прадбачвае вызваленьне народаў, што ўваходзяць у склад Савецкага Саюзу, у тым ліку й Беларусі. Сэнатар Бэр Гольдвотэр моцна стаіць за тое, каб усе народы былі вольныя й незалежныя. Ён стойка абараняе людзкія правы ня толькі сваіх грамадзянаў, але й усіх людзей на сьвеце.

CLASS OF SERVICE
This is a fast message unless its deferred character is indicated by the proper symbol

WESTERN UNION
TELEGRAM
W. P. MARSHALL, PRESIDENT

SF-1201 (4-60)

SYMBOLS
DL = Day Letter
NL = Night Letter
LT = International Letter Telegram

The filing time shown in the date line on domestic telegrams is LOCAL TIME at point of origin. Time of receipt is LOCAL TIME at point of destination

LL280 614P EST OCT 25 64 SYA783
SY WA135 DL PD FAX WASHINGTON DC 25 551P EDT
CONSTANT MIERLAK
197 ROEBLING ST BROOKLYN NY

AS WE ENTER LIBERTY WEEK, OCTOBER 25-31, I WANT YOU-AS A LEADER IN THE BYELORUSSIAN-AMERICAN COMMUNITY-TO KNOW THAT I FULLY SUPPORT THE REPUBLICAN PARTY PLATFORM OF 1964 ON THE LIBERATION OF ALL CAPTIVE NATIONS. AS PRESIDENT I WOULD SEE THAT THE ISSUES OF BYELORUSSIA INDEPENDENCE AND SELF-DETERMINATION WILL BE RAISED IN THE UNITED NATIONS. I WOULD URGE THE ESTABLISHMENT OF A BYELORUSSIAN DESK IN THE VOICE OF AMERICA AS A STEP TOWARD THE ESTABLISHMENT OF A MORE GENUINE REPRESENTATION OF BYELORUSSIA IN THE U. N. I SHALL USE EVERY PEACEFUL MEANS-ECONOMIC, DIPLOMATIC, PERSUASIVE, MORAL-TO ADVANCE THE FREEDOM OF THE PEOPLE OF BYELORUSSIA. WE, WHO ARE COMMITTED TO LIBERTY ABROAD AS WELL AS AT HOME, MUST WORK TOGETHER TO ACHIEVE OUR COMMON OBJECTIVES. WE CAN BEGIN NOW DURING OUR OBSERVANCES OF LIBERTY WEEK AND, GOD WILLING, CONTINUE FOLLOWING THE NOVEMBER ELECTIONS UNTIL ALL PEOPLES ONCE AGAIN ARE FREE

BARRY GOLDWATER

(10).

# REPUBLICAN NATIONAL COMMITTEE

1625 EYE STREET NORTHWEST • WASHINGTON, D. C. 20006 • NAtional 8-6800

*Nationalities Division*

CONGRESSMAN EDWARD J. DERWINSKI
CHAIRMAN

DR. LEV E. DOBRIANSKY
VICE CHAIRMAN

CONSTANT MIERLAK
NATIONAL CHAIRMAN BYELORUSSIAN-AMERICAN SECTION
197 ROEBLING STREET
BROOKLYN, NEW YORK

DEAN BURCH
CHAIRMAN

Кастрычнік 1964

Паважаная Спадарыня й
Паважаны Спадару:

Дзень гістарычных выбараў у Злучаных Штатах Амэрыкі, у нашай новай Бацькаўшчыне, хутка набліжаецца.

Выбары ў гэтым годзе важныя тым, што амэрыканскія грамадзяне, у тым ліку й мы з паходжаньня Беларусы, маем выбраць ня толькі Прэзыдэнта й яго заступніка, але адначасна задэцыдаваць аб грамадзка-палітычным кірунку, у які бок мае ісьці Амэрыка.

Магчыма Вы ўжо выбралі за каго пэрсанальна аддаць свой голас, а гэтым самым Вы апрабавалі рэспубліканскі або дэмакратычны ідэалягічны напрамак.

Аднвк, калі Вы яшчэ ня ўпэўненыя, або маеце хаця невялікі сумніў, за каго галасаваць, дык пры дэцызыі, пастаўце сабе пытаньне:

Ці я хачу, каб Амэрыка была магутнай і шанаванай дзяржавай у цэлым сьвеце; ці я хачу, каб Амэрыка і ўсе народы мелі мір, свабоду й незалежнасьць, у тым ліку й наш Беларускі народ; ці я хачу, каб мае грамадзянскія правы й правы маіх дзяцей былі належна ахоўваныя; ці я хачу пражыць свае жыцьцё згодна закону жыцьця, але ня быць перадчасна пахаваны Хрушчовым?

- Ваш адказ, бязумоўна, будзе Т А К ! Тады бяз ніякага сумніву Вы будзеце галасаваць за Гольдвотэра-Міллера, бо толькі ЯНЫ й Рэспубліканская партыя могуць Вам гэта загварантаваць. Тады-ж ажыцьцёвяцца й пастаўленыя мэты рэспубліканскае плятформы.

Будзьце ўпэўненыя й пераконаныя, што Гольдвотэр стаіць на правільным шляху.

Кастусь Мерляк, старшыня
Беларускае Сэкцыі

Перадача была закончана словамі: «Паважныя амэрыканцы беларускага паходжаньня. Мы моцна верым, што прэзыдэнт Гольдвотэр выканае сваю праграму й Амэрыка будзе магутнай дзяржавай на сьвеце. Мы, амэрыканцы, будзем жыць спакойным й шчасьлівым жыцьцём, а нашы суродзічы на Бацькаўшчыне ў сваёй вольнай і незалежнай дзяржаве. Бывайце здаровы. Кастусь Мерляк, старшыня Беларуска-Амэрыканскай сэкцыі рэспубліканскае партыі».

Беларускае грамадзтва прыхільна адгукнулася да арганізацыі беларускага аддзелу рэспубліканскае партыі. Пастыр др. Ян Пятроўскі, рэдактар і выдавец «Сьвятача Хрыстовае навукі» пісаў Мерляку: «... што да Вашае працы ў рэспубліканскім нацыянальным камітэце, то ў мяне ствараецца ўражаньне, што гэта, зь беларускага пункту гледжаньня, пазытыўная праца, якая дае нагоду вывесьці беларускае пытаньне на парадак дня ўсюды, дзе гэта толькі можна зрабіць».

Сэнатар Бэры Гольдвотэр атрымаў у выбарах на Прэзыдэнта ЗША вялікую падтрымку ад амэрыканцаў беларускага паходжаньня, але каб такую падтрымку ён атрымаў ад усіх, то быў-бы, напэўна, выбраны на Прэзыдэнта ЗША. 3 кастрычніка 1964 году на Прэзыдэнта ЗША быў выбраны Ліндан Б.Джансон, дэмакрат, быўшы заступнік прэзыдэнта Кэнэды, а на віцэ-прэзыдэнта быў выбраны сэнатар Губэрт Г.Гумфры, таксама дэмакрат.

Да важнейшых падзеяў у палітыцы Амэрыкі й у сьвеце, якія уплывалі на беларускія справы, трэба адзначыць сьцверджаньне Дзяржаўнага сакратара ЗША Дына Раска адносна зьмены палітыкі Амэрыкі ў адносінах да камуністычнага сьвету. Ён сказаў у студзені 1964 годзе, што амэрыканская палітыка накіравана дасягнуць наступныя мэты: устрымаць пашырэньне камуністычнага панаваньня ды ставіць перашкоды, каб ім гэтае пашырэньне не аплачвалася рабіць. Адным словам, паварот да палітыкі суіснаваньня.

Амэрыканскі камітэт пасьля ўнутранага крызысу ў 1962 годзе зараз-жа пачаў прытарноўваць сваю палітыку й дзейнасьць, згодна дактрыны Дзяржаўнага сакратара Д.Раска. Пагэтаму Амэрыканскі камітэт зьмяніў свой назоў на камітэт радыё «Свабода». Старшыня Гл. Сарджэнт пры гэтым асьведчыў, што зьмена назову не азначае паменшэньня дзейнасьці й мэтаў камітэту, але гэта было толькі пацешыць палітыкаў Парыскага блеку, бо мэты вызваленьня народаў СССР ніколі ня было.

Ліга Вызваленьня народаў СССР Парыскі блёк на канфэрэнцыі ў Парыжы пастанавіла зкажыць пратэст, чаму амэрыканскі камітэт вядзе аднабаковую дзейнасьць, ня бяручы пад увагу імкненьні паняволеных народаў, сяброў Лігі. На пратэст Амэрыканскі камітэт не зьвярнуў ніякае ўвагі. Пачаў паступова звужаць сваю дзейнасьць і ліквідаваць ўсякія прыбудоўкі, якія былі прычэпленыя да радыё «Свабода»

У красавіку 1964 году Савецкі Саюз парваў добрасуседзкія й дыпляматычныя суадносіны з камуністычным Кітаем па дзьвёх лініях: па дзяржаўнай і партыйнай. Прычыны парваньня сувязяў былі розныя, але найважнейшай прычынай было ідэялягічнае пяршынства ў камуністычным сьвеце.

15 кастрычніка 1964 году ў Маскве было пададзена да ведама, што Мікіта С.Хрушчоў зьняты з становішча прэм'ера ўраду СССР і Першага сакратара КПСС, а на яго месца пастаўлены Леанід Брэжнеў.

Так закончыўся 1964 год.

# 1965

1965 год пачаўся як і заўсёды традыцыйнай сустрэчай, якую ладзіла ўправа аддзелу БАЗА ў залі грамадзкага цэнтру супольна з арганізацыяй моладзі. Багата людзей з другога аддзелу прыйшлі на вечарыну, але вярхушка «групоўкі», баючыся страціць свой аўтарытэт, адзначыла сустрэчу Новага году на прыватнай кватэры.

Пасьля калядных сьвятаў адбываліся тры баковыя паседжаньні й перагаворы (два аддзелы БАЗА, Галоўная Ўправа БАЗА й Кангрэсовы Камітэт), каб разам адзначыць 47-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі, матывуючы тым, што толькі БАЗА бароніць прынцыпы 25 Сакавіка (што за цынізм непрадрашэнца), а пагэтаму, каб не кампрамітавацца, БАЗА не патрабуе ні з кім яднацца.

Таму на пашыраным паседжаньні двух аддзелаў БАЗА: Нью Ёрк і Стэмфорд, і Кангрэсовы Камітэт пастанавілі супольна ладзіць сяткаваньне 25 Сакавіка. Для належнай падрыхтоўкі й каардынацыі быў створаны сьвяткавальны камітэт, які зараз-жа ўзяўся за працу. Для належнай падрыхтоўкі й каардынацыі быў створаны сьвяткавальны

камітэт, які зараз-жа ўзяўся за працу. Важным мамэнтам у адзначэньні 47 угодкаў 25 Сакавіка быў адмысловы мэмарандум, апрацаваны сьвяткавальным камітэтм ды разасланы прадстаўнікам Аб'еднаных Нацыяў, кангрэсмэнам і сэнатарам Амэрыканскага кангрэсу, і прэсавы камунікат, у якім паведамлялася аб урачыстай акадэміі ў «Астор» гатэль, на якой будуць кангрэсмэн Самуэл Гальпэрн і прадстаўнік гораду Нью Ёрк Джон Бэрн.

Урачыстая акадэмія, прысьвечаная 47 угодкам незалежнасьці БНР, адбылася 21 сакавіка 1965 году ў гатэлі «Астор». Акадэмію адчыніў старшыня сьвяткавальнага камітэту К.Мерляк. Ён прывітаў гасьцей і прадставіў кангрэсмэна Гальпэрна, які надзвычай грунтоўна прадставіў сучаснае становішча ў Беларусі, пэрспэкты вы вызваленьня й адбудовы беларускае дзяржаўнасьці. Кіраўнік акадэміі М.Бахар прадставіў двух маладых інжынераў, якія прачыталі свае даклады: К.Вайцяхоўскі па-ангельску, а Ю. Станкевіч па-беларуску.

Наступна выступіў прадстаўнік гораду Нью Ёрк Бэрні штату Нью Джэрсі Г.Отлоўскі. Былі прачытаныя праклямацыі губэрнатараў, аб тым што Дзень 25 сакавіка зьяўляецца Днём незалежнасьці Беларусі. Пасьля прыняцьця рэзалюцыі адбылася мастацкая частка, у якой выступалі два хоры з Саўт Рывэру: жаночы хор «Каліна» й мужчынскі хор «Вэтэранаў».

Гэтага самага дня таксама адбылася акадэмія, прысьвечаная 47 угодкам незалежнасьці Беларусі, ладжаная Галоўнай Управай БАЗА і аддзелам Нью Брансьвік у гатэлі «Білтмор» у Нью Ёрку.

З нагоды 47 угодкаў 25 Сакавіка архіяпіскап Васіль БАПЦ 15 сакавіка 1965 году прачытаў малітву ў амэрыканскім сэнаце, перад распачацьцем сэсіі. Пратаярэй М.Лапіцкі, юрысдыкцыі Ўсяленскага партрыярхату, 25 сакавіка прачытаў малітву ў Палаце рэпрэзэнтантаў, пасьля якое распачалася сэсыя.

У гэтым, як і ў папярэднія гады, былі шматлікія выступленьні ў Амэрыканскім кангрэсе, у якіх выяўлялася салідарнасьць і падтрымка ў змаганьні беларускага народу за волю й незалежнасьць.

Пачынаючы ад чэрвеня 1964 году, у Нью Ёрку дзейнічалі афіцыяльна два аддзелы БАЗА. Стары , які надалей называўся акруговай управай БАЗА й аддзел БАЗА. Галоўная Ўправа зараз-жа пачала навадзіць новыя «парадкі» ў арганізацыі. Выдала новую інструкцыю адносна сяброўства й іх правоў, а таксама новыя правілы суадносінаў

аддзелаў да Галоўнае Управы. Быў апрабаваны новы статут перад кангрэсам БАЗА, які меўся адбыцца ў травені 1965 году. Пэрсанальная нагонка на Мерляка прадаўжалася ў газэце «Беларус», у бюлетэнях БАЗА, а таксама ў прыватнай карэспандэнцыі, закідаючы Мерляку, што ён дзеіць на шкоду беларускай справе, і што ён нават у сваёй шкоднай дзейнасьці перасьцігнуў самога Астроўскага.

Управа аддзелу БАЗА пад старшынствам К.Мерляка правяла шэсьць пашыраных паседжаньняў і два агульныя сходы, на якіх заўсёды ставілася пытаньне ліквідацыі падзелу. У дыскусыях бралі ўдзел вялікая колькасьцьь зацікаўленых і паважных дзеячоў грамадзтва як: Л.Галяк, Я.Юхнавец, М.Панькоў, Язэп Гуткоўскі, Л.Савёнак, В.Шчэцька, айцец Юры Абрэмскі, А. Протас, П. Ганэцкі, А, Нэстар, Д.Клінцэніч, М.Заморскі, М.Казьлякоўскі, Ю.Станкевіч, Я.Муха, А.Каптуровіч. Я.Крэсла, Я. Дубовік ды іншыя. Ніякія аргумэнты не памаглі пераканаць людзей зьліквідаваць падзел праз падпарадкаваньне Галоўнай Управе БАЗА, якая кіравалася непрадрашэнскай групоўкай.

На 6 чэрвеня 1966 году ўправа аддзелу БАЗА склікала агульны сход сяброў, на якім была выбраная новая ўправа ў папярэднім складзе. На гэтым сходзе пастанавілі ўзяць удзел у XI кангрэсе БАЗА, што мае адбыцца ў верасьні 1965 году. Таксама вынесеная пастанова, што калі Галоўная Ўправа не дапусьціць дэлегатаў да ўдзелу ў кангрэсе—зьмяніць назоў арганізацыі на Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне ў Нью Ёрку па-ангельску "Byelorussian-American Union of New York".

Згодна пастановы сходу й інструкцыі БАЗА быў высланы сьпісак сяброў і дэлегатаў БАЗА, а таксма чэк на ўплату 30% ад сяброўскіх складак на Галоўную Ўправу БАЗА.

На гэты ліст быў атрыманы адказ наступнага зьместу: «Галоўная Ўправа БАЗА на сваім паседжаньні пастанавіла Ваш ліст, сьпіскі сяброў і чэк зьвярнуць вам назад і высьветліць, што згодна амэрыканскіх законаў у Нью Ёрку можа існаваць адзін акруговы аддзел БАЗА й што ўправай гэтага аддзелу ёсьць управа вызнаваньня Галоўнай Управай і ачоленыя др. Уладзімірам Набагезам, як ейным старшынём.

Старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА др. Ст.Станкевіч.»

Нягледзячы на гэты ліст, дэлегаты Нью Ёрку прыбылі на кангрэс БАЗА, які адбыўся 18 і 19 верасьня 1965 году, каб на кангрэсе яшчэ

раз папрабаваць зьліквідаваць разыходжаньне, але, нажаль, аказалася, што там ня было з кім гаварыць. Справа была так пастаўлена, што дэлегаты Нью Ёрку й Стэмфорду пакінулі кангрэс і вярнуліся дадому.

XI кангрэс БАЗА, які адбыўся паводля газэты «Беларус» № 103 за кастрычнік 1965 году «на грамадзкім узроўні», шырока распісвалася пра яго прабег, падчас якога ўсе справы зьвяліся да двух пунктаў—выяўленьня шкоднай працы К.Мерляка й вялікіх дасягненьняў уступаючага старшыні др.Ст.Станкевіча.

Вынікам двух дзён нарадаў была прынятая адзіная пастанова наступнага зьместу: «Забараніць групе людзей, якія сёньня ачоленыя сп.К.Мерляком або будуць у будучыні ачоленыя кім-небудзь іншым, называць сваю афармаваную арганізацыю акругай або аддзелам БАЗА».

Гэтая пастанова была смешнай і непатрэбнай, бо назоў быў зьменены 6 чэрвеня 1965 году. На старшыню Галоўнай Управы БАЗА на кангрэсе быў выбраны М.Гарошка, а на старшыню рэдакцыйнае калегіі газэты «Беларус» і рэфэрэнтам вонкавых дачыненьняў др.Ст.Станкевіч.

14 лістапада 1965 году прыход сабору сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне правёў двухгадовы перавыбарчы сход. У прэзыдыюм увайшлі А.Протас—старшыня, Ул.Русак, М.Казьлякоўскі—сакратары. Ганаровымі сябрамі былі запрошаныя Ўладыка Васіль і а.Абрамскі. Гэтым разам сход быў вельмі людны, што вельмі рэдка здаралася.

Уступаючая царкоўная рада атрымала абсалюторыюм з падзякай, хаця ня ўсе сябры на гэта заслугоўвалі. У новую царкоўную раду абсалютнай бальшынёй галасоў былі выбраныя: Я.Казьлякоўскі—старшыня, К.Мерляк—заступнік старшыні, В.Шчэцька—сакратар, Д.Клінцэвіч—скарбнік, В.Захаркевіч—царкоўны стараста, В.Місюль, П.Мельяновіч, В.Юрцэвіч і М.Брэзоўскі—сябры рады.

4 сьнежня адбылося пашыранае паседжаньне Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня, на якім было пастаўленае пытаньне патрэбы гэтае арганізацыі. У дыскусіі ўсе прысутныя выказаліся за тое, каб арганізацыю ўтрымаць, бо яна цяперака як ніколі вельмі патрэбная. Пасьля XI кангрэсу людзі ня ідуць назад да БАЗА, а без свае арганізацыі яны застануцца вонках беларускага грамадзкага жыцьця. Што сапраўды будзе вялікай шкодай для беларускай нацыянальнай справы. Дзеля гэтага пастаноўлена ўтрымаць Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне й надалей праводзіць грамадзка-палітычную працу.

На гэтым паседжаньні пастаноўлена, што Аб'яднаньне й людзі з аддзелу БАЗА Стэмфорд, які быў разьвязаны праз Галоўную Ўправу БАЗА, разам з Беларускім Кангрэсовым Камітэтам будуць адзначаць 48 угодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР. З гэтае нагоды быў выдадзены заклік да беларускага грамадзтва Нью Ёрку, які заканчваўся словамі:

«Акт 25 Сакавіка не належыць да нейкае аднае выбранае ці самавольнай групоўкі, якая гэты акт называе «нашым» або «сваім», а належыць да ўсяго беларускага народу. І абавязкам кожнага сьведамага беларуса ёсьць бараніць гэты Акт ад захопнікаў, прысабечвальнікаў і перакручвальнікаў ягонага зьместу ды належна яго ўгодкі адзначыць, як найшырэй і наглыбей з удзелам усіх беларусаў, а ня ў вузка-сямейным таварыстве дзеля ўзаемнага выхвальваньня лідэрскіх здольнасьцей. Дык усе разам на акадэмію 20 сакавіка ў гатэлі «Астор», Нью Ёрк».

1965 год у палавіне дзесяцігодзьдзя славутых шасьцідзесятых гадоў быў пачаткам новых ідэяў і здарэньняў, якія пазьней моцна адбіліся на жыцьці сям'і К.Мерляка, беларускага грамадзтва на эміграцыі, ды пачаткам новых палітычных, грамадзкіх і сацыяльных ідэяў і змаганьне за іхняе ажыцьцяўленьне ў Злучаных Штатах Амэрыкі. У Амэрыцы распачалася новая эра адміністрацыі Прэзыдэнта Ліндана Б.Джонсана, які гучна запачаткаваў будову "Great Society" або «Вялікага Грамадзтва».

На міжнароднай арэне моцна завастрыўся канфлікт у Вьетнаме, які поўнасьцю ўцягнуў Амэрыку й Паўдзённы Вьетнам у вайну з Паўночным Вьетнамам, якому дапамогу аказваў камуністычны Кітай.

У Савецкім Саюзе Леанід Брэжнеў расправіўся з Хрушчовым і палажыў канец «дэсталінізацыі», надалей прадаўжаў «халодную вайну». Пашырыў шпіёнскую й дывэрсыйную дзейнасьць, пранікаючы ў лібэральныя кругі й на ўнівэрсытэты вольнага сьвету, асабліва ў Амэрыцы, дзе пры помачы мясцовых лібэралаў пачалі арганізоўваць дэманстрацыі супраць вайны ў Вьетнаме ды арганізоўваць студэнства да цывільнага супраціву, дамагацца лібэралізацыі нормаў грамадзкага жыцьця.

Супраць вайсковай інтэрвэнцыі ў Вьетнаме адбыліся ў сарака гарадох Амэрыкі дэманстрацыі, падчас якіх адбываліся сутычкі з паліцыяй, рабаўніцтвы й пажары.

Восеньню гэтага году быў выбраны на мэра гораду Нью Ёрк 43 гадовы кангрэсмэн Джон Ліндсэй, лібэральны рэспубліканец, які зрабіў дагавор з лібэраламі супольна адміністраваць горадам Нью Ёрк. У першым сваім выступленьні заявіў, што ён студэнтаў і падлеткаў на вуліцы арыштоўваць ня будзе, а тым больш ў іх страляць. Вынікам такое пастаноўкі мэра частка Нью Ёрку, якую называлі Бронкс, незадоўга была спалена й поўнасьцю зруйнаваная.

Нягледзячы на тое, што ідэялягічна-дэвэрсыйны наступ камуністычнага сьвету ў Азіі й Паўдзённай Амэрыцы, з аднаго боку, ды завастрэньне вьетнамскага канфлікту з другога, Амэрыканскі камітэт радыё «Свабода» надалей звужаў сваю дзейнасьць, а гэтым самым антыкамуністычная дзейнсьць Парыскага блёку й групоўкі ў Радзе БНР адыходзіла ў забыцьцё. Затое антыэміграцыйная нагонка, праводжаная камітэтам сувязі з суайчыньнікамі, пашыралася й вылілася ў гвалтоўныя напады на «бебуранцаў», г. зн. на беларускіх нацыяналістаў.

У прыватным, сям'я К.Мерляка пацярпела сямейную страту. Бацька Ганны Мерляк, Антон Губэрт, памер 19-га чэрвеня 1965 году, пражыўшы 75 гадоў. У лістападзе К.Мерляк зь сям'ёй пераехаў жыць у свой новы дом на прадмесьце Нью Ёрку ў Квінс.

## 1966

Зімовы сэзон пачаўся падрыхтоўкаю да Калядных сьвятаў. Праходзілі вельмі спраўна сустрэча Новага году, калядная ялінка, сьвяточныя службы ў царкве, сьвяткаваньне ў грамадзкім цэнтры, ладжаныя ўправай аб'еднаньня моладзі й кіраўніцтвам беларускае школы.

Згодна пастановы Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня, у сьнежні 1965 году быў створаны аб'еднаны сьвяткавальны камітэт для адзначэньня 48 угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, да якога загадзя пачалася падрыхтоўка. З гэтае нагоды сьвяткавальны камітэт падрыхтаваў ліст-мэмарандум, у якім паказваліся статыстычныя дадзеныя эканамічнай эксплуатацыі беларускага насельніцтва, русыфікацыя, палітычны й рэлігійны прысьлед у БССР. Гэты ліст-мэмарандум быў шырока разасланы ува ўсе місіі Аб'еднаных Нацыяў, амбасадарам, сябрам Амэрыканскага кангрэсу й уплывовым адзінкам Амэрыканскага ўраду.

48 угодкі незалежнасьці Беларусі былі адзначаныя 29 сакавіка 1966 году ў гатэлі «Астар» у Нью Ёрку. Акадэмію папярэдзілі Богаслужбы ў саборы сьв.Кірылы Тураўскага й у царкве сьв.Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры. Акадэмія распачалася амэрыканскім і беларускім гім-намі ў выкананьні жаночага хору з Саўт Рывэру. Кіраваў акадэміяй К.Мерляк, старшыня сьвяткавальнага камітэту. Рэфэрат у ангельскай мове прачытаў Аўген Дубовік, па-беларуску А.Даніловіч.

Цікавым выступленьнем й прамовай кангрэсмэна Сэймур Гальпэрн дакладна прадставіў прысутным змаганьне беларускага народу за вызваленьне й сваю незалежнасьць, творачы супраціў, які турбуе маскоўскіх камуністаў. Пасьля віталі прысутныя прадстаўнікі амэрыканскіх і нацыянальных арганізацыяў. Былі прачытаныя праклямацыі абвешчаньня 25 Сакавіка «Днём беларускае незалежнасьці» губэрнатарамі штатаў Нью Ёрк, Пэнсыльвэнія, Нью Джэрсі й мэрамі гораду Нью Ёрк і Пасэік, прысланыя прывітальныя тэлеграмы й лісты ад амэрыканскіх урадавых дзейнікаў і беларускіх арганізацыяў.

На заканчэньні была прынятая рэзалюцыя, якая была памешчана ў Кангрэсовым рэкордзе 31 сакавіка 1966 годзе.

Акадэмія была закончана багатымі выступленьнямі хору «Каліна» й народнымі танцамі беларускай моладзі.

Гэтага-ж дня адбылася другая акадэмія ў гонар 25 сакавіка, якую ладзіла Беларуска—Амэрыканскае Задзіночаньне. Акадэмію адкрыў старшыня М.Гарошка зь вялікім спазьненьнем з невядомых прычынаў, што дало магчымасьць кангрэсмэну С.Гальпэрн нядоўга чакаць, каб прачытаць той самы рэфэрат.

13 сакавіка 1966 году Я.Запруднік, як сакратар фундацыі імя П.Крэчэўскага перадаў ліст К.Мерляку наступнага зьместу: «Гэтым паведамляем, што рада дырэктароў фундацыі імя П.Крэчэўскага на сваім паседжаньні 5 сакавіка 1966 году пастанавіла ад сёньняшняга дня не ўважаць вас за сябру фундацыі імя П.Крэчэўскага. Я.Запруднік, сакратар».

На гэта К.Мерляк 18 студзеня 1966 году адпісаў: «За подпісам сп.Я.Запрудніка, сакратара, я атрымаў паведамленьне, што рада дырэктароў ад 5 сакавіка не ўважае мяне за сябру фундацыі імя П.Крэчэўскага, у сувязі з гэтым я прасіў-бы Вас высьвятліць мне, што азначае: «не ўважаць вас за сябру». Ці гэта зьяўляецца раўна-

значным пазбаўленьня сяброўства ў фундацыі? Калі-ж так, то прашу вас падаць:

а.Прычыну пазбаўленьня сяброўства.

б.На падставе якога права арбітральна пазбаўляеце мяне сяброўства ў фундацыі

в.Ці за мною ёсьць права апэляцыі ў гэтай справе?

Спадзяюся атрымаць неўзабаве адказ на гэты ліст.

К.Мерляк, сябра закладчык фундацыі імя П. Крэчэўскага».

2 красавіка К.Мерляк атрымаў ліст з фундацыі, у якім высьвятлялася прычына пазбаўленьня сяброўства гэткімі словамі: «Ваша дзейнасьць апошні год, скіраваная на разьбіваньне ў Нью Ёрку беларускага нацыянальнага грамадзкага культурнага высілку, мацаваньне якога ляжыць ў васновах зданьняў фундацыі імя П.Крэчэўскага.

Далей сказана: «У справе гэтае пастановы вы маеце права апэляцыі. Калі-б жадалі зь яго скарыстаць паведаміце раду дырэктароў, якая вызначыць час праслухоўваньня вашае справы.

К. Мерляк скарыстаў з права апэляцыі й разгляд яго сяброўства быў вызначаны на 29 чэрвеня 1966 году. (Пра сяброўства К.Мерляка й як праводзілася мацаваньне беларускага нацыянальнага грамадзянскага культурнага высілку можна чытаць у разьдзеле «Незакончаная гісторыя фундацыі імя Крэчэўскага»).

Царкоўная рада прыходу катэдральнага саборы сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, якая была выбраная на агульным сходзе 14 лістапада 1965 году, ня была апрабаваная архіяпіскапам Васілем, старшынёй эпархіяльнай рады Амэрыкі БАПЦ. Да гэтага часу, ад заснаваньня БАПЦ, ніколі ніякім япіскапам не апрабоўваліся новавыбраныя рады, бо ўсе былі шчасьлівыя, што людзі не адмаўляліся быць раднымі.

Аднае нядзелі пасьля літургіі Уладыка Васіль паведаміў прысутным аб яго незацьверджаньні выбранае рады, і што, як правячы япіскап, ён вызначае царкоўную раду ў складзе: М.Тулейкі, А. Міцкевіча, Б.Данілюка й скарбніка Я.Ніхаёнка.

Такім чынам, у прыходзе прадаўжалі дзейнічаць дзьве варожа настаўленыя царкоўныя рады. Дзеля гэтага на паседжаньні выбранае рады 24 сакавіка пастаноўлена выслаць Ул. Васілю тэлеграму наступнага зьместу:«Царкоўная рада прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне зьвяртаецца з прапановаю ўстрымаць другі збор грошаў у царкве, каб захаваць належную пашану да надыходзячага сьветлага

Хрыстовага ўваскрэсеньня». Таксама на гэтым паседжаньні пастаноўлена склікаць на 8 травеня надзвычайны сход прыхажанаў, з мэтай ліквідацыі непаладкаў у прыходзе.

(Пра прабег гэтага сходу й далейшыя падзеі можна чытаць у разьдзеле «Гісторыя дзейнасьці БАПЦ у Амэрыцы»).

21 ліпеня 1966 году адбылося паседжаньне ўправы Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня, на якім пастаноўлена ўзяць удзел у Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, ладжанай Кангрэсовым Камітэтам Амэрыкі й Беларускім Нацыянальным Аб'еднаньнем Канады, якая маецца адбывацца на рэсорце Бэлэр-Менск у Глен Спэй, Нью Ёрк, 3 і 4 верасьня 1966 году. Таксама пастаноўлена ўзяць удзел у адзначэньні Тыдня Паняволеных народаў 24 ліпеня 1966 году, якое было арганізаванае арганізацыяй Амэрыцы за вызваленьне паняволеных народаў (Americans to Free Captive Nations)

Прадстаўнікі Аб'еднаньня ўзялі актыўны ўдзел у вялікім мітынгу каля статуі Свабода. Гэта была першая дэманстрацыя каля статуі Свабода паняволеных народаў з удзелам прадстаўнікоў нацыянальных арганізацыяў і амэрыканскага палітычнага сьвету.На Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі 3 і 4 верасьня 1966 годзе. На Белэр-Менск рэфэраты чыталі: К.Мерляк, які зрабіў агляд сучаснага палітычнага становішча беларускае эміграцыі ў Амэрыцы — якія заданьні яна мае выканаць і патрэбу аб'еднаньня эміграцыі, каб гэта зрэалізаваць. С.Коўш зрабіў агляд агульнага палітычнага становішча ды акрэсьліў нашую ролю ў гэтым і вагу эміграцыі ў адбудове беларускае дзяржаўнасьці. Я.Пітушка даў агляд арганізацыйнага жыцьця ў Канадзе ды выказаўся за патрэбу шырокага аб'яднаньня.

Пасьля дыскусіі была прынята рэзалюцыя, у якой зьвернута ўвага на стварэньне адзінага беларускага фронту ня эміграцыі.

У гэтым самым часе адбывалася 7-я Сустрэча Беларусаў Паўночнай Амэрыкі, якую ладзіла Беларуска -Амэрыканскае Задзіночаньне Амэрыкі й Згуртаваньне Беларусаў у Канадзе, на якой таксама была прынятая рэзалюцыя.

Рэзалюцыя, прынятая ў Кліўлендзе, не зьвяртала ўвагі й ня бачыла патрэбы на аб'еднаньне беларускага грамадзтва. Кіруючая кліка БАЗА і ЗБК лічылі, што толькі яны прадстаўляюць беларусаў і ім ніякага аб'еднаньня не патрэба, і што яны самі вызваляць Беларусь і адбудуюць Беларускую Народную Рэспубліку.

Нягледзячы на тое, што рэзалюцыя, прынятая на Бэлэр-Менск, выказвалася за неабходнае аб'еднаньне, аднак кіруючая кліка Беларускага Кангрэсовага Камітэту, старымі аргумэнтамі падмацоўвалі свой пэсымізм і ўсім было відавочна, што яны ня мелі на ўвеце гэтае рэзалюцыі ажыцьцяўляць.

Усім было ясна, што на амэрыканскім кантынэнце ніякае аб'еднаньне беларускага грамадзтва не адбудзецца. Існуючыя вузкія групоўкі будуць пакладаць усе сілы, каб захаваць дамінацыю й абараняць спэцыфічныя інтарэсы свае групоўкі. Гэта была апошняя сустрэча беларусаў Паўночнае Амэрыкі , арганізаваная беларускім Кангрэсовым Камітэтам Амэрыкі й Нацыянальным Аб'еднаньнем Канады, але сустрэчы, ладжаныя Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньнем й Згуртаваньнем Беларусаў у Канадзе ладзіліся надалей кожныя два годы.

У 1965 годзе ў Нью Ёрку была зарганізаваная новая міжнацыянальная арганізацыя: «Амэрыканцы за вызваленьне паняволеных народаў», у якую ўвайшлі арганізацыі, прадстаўляючы 32 нацыянальнасьці, што знаходзіліся ў арбіце расейска-камуністычнага панаваньня. Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне ў Нью Ёрку ўзяло ў яе арганізацыі актыўны ўдзел, і К.Мерляк ўвайшоў у кіраўніцтва як дырэктар нацыянальнасьцей. Функцыі старшыні выконваў Альфрэд Корн, ён-жа быў ініцыятарам і арганізатарам гэтае арганізацыі.

На вялікім мітынгу, які адбыўся 27 лістапада 1965 году ў Нью Ёрку, была прынятая ідэялягічная дэклярацыя, мэта й прынцыпы дзеяньня амэрыканцаў паходжаньня з краінаў, якія знаходзяцца пад савецкай акупацыяй або ўплывам, каб арганізавана браць удзел у фармаваньні палітыкі ЗША вызваленьня паняволеных народаў.

Дэпартмэнт нацыянальнасьцей пад кіраўніцтвам К.Мерляка апрацаваў праект стварэньня «аддзелу нацыянальнасьцей» у выбарчай кампаніі губэрнатара штату Нью Ёрк Нэльсана А.Рокфэлера ў 1966 годзе.

У сваёй праклямацыі «Тыдня Паняволеных народаў» у 1966 году губэрнатар Рокфэлер сказаў: «Мы амэрыканцы ганарымся, што многа ўцекачоў з паняволеных краінаў знайшлі прытулак і свабоду ў нас. Іхні прыезд прынёс шмат чаго нам карыснага. Яны сталіся вельмі добрымі суседзямі: адданымі й працавітымі грамадзянамі нашага штату й краіны».

CLASS OF SERVICE

This is a fast message unless its deferred character is indicated by the proper symbol.

# WESTERN UNION

W. P. MARSHALL
CHAIRMAN OF THE BOARD

## TELEGRAM

R. W. McFALL
PRESIDENT

SYMBOLS

DL = Day Letter

NL = Night Letter

LT = International Letter Telegram

The filing time shown in the date line on domestic telegrams is LOCAL TIME at point of origin. Time of receipt is LOCAL TIME at point of destination

N368D75 8K NL PD NEWYORK NY OCT 18 1966

CONSTANT MIERLAK

197 ROEBLING ST BROOKLYN NY

YOU ARE CORDIALLY INVITED TO ATTEND A RECEPTION AND COCKTAIL PARTY OF FOREIGN PRESS, RADIO AND NATIONALITY REPRESENTATIVES TO MEET WITH GOVERNOR NELSON A. ROCKEFELLER AT THE METROPOLITAN CLUB, 1 EAST 60 STREET, NEW YORK CITY, ON MONDAY, OCTOBER 24TH, 1966, AT 5 P.M.

R.S.V.P TEL 957-5090.

SPYROS SKOURAS CHAIRMAN

1159P

WU1201(R2-65) THE COMPANY WILL APPRECIATE SUGGESTIONS FROM ITS PATRONS CONCERNING ITS SERVICE

Нягледзячы на тое, што Мікіта Хрушчоў у Варшаве ў сваёй прамове ў 1955 годзе сказаў: «Мы мусім уявіць сабе, што суіснаваць бесканечна мы ня можам. Адзін з нас павінен пайсьці ў гроб. Яны (амэрыканцы) гэтага ня хочуць. Што мы маем зрабіць? Мы мусім іх туды сапхнуць —палітыка суіснаваньня перасьцярагалася й дакладна праводзілася, бо вайна ў Вьетнаме адцягвала ўвагу ад палітыкі вызваленьня».

Амэрыканскія дзейнікі, якія былі за актыўны супраціў імпэрыялістычнай палітыкі Савецкага Саюзу, змушаны былі пакінуць практычную падрыхтоўку закрытага й адкрытага контрадзеяньня. Паняволеныя краіны, а ў першую чаргу Беларусь, перасталі быць аб'ектам стратэгічнага зацікаўленьня. Яны паступова пачалі ўстрымоўваць грашовую дапамогу паасобным палітычным арганізацыям. Першай ахвярай была газэта «Бацькаўшчына», якая пасьля 20-ці гадовага існаваньня перастала выходзіць. Зарубежнікі ўвесь час упікалі крывічам, што газэта «Бацькаўшчына» фінансуецца Ватыканам за правуніяцкую палітыку Рады БНР.

Гэтае палажэньне прадбачыў камітэт сувязяў з суайчыньнікамі, які быў створаны й кантраляваны праз КДБ. Ён пачаў узмоцненую нагонку ў прэсе як унутры , так і навонкі, пра беларускую эміграцыю й яе дзейнасьць у вольным сьвеце, асабліва ў Амэрыцы. (Пра гэтую акцыю з камітэту «завяртанцаў» можна прачытаць у разьдзеле «Хто каго мае судзіць?»)

Беларускія «палітыкі», а ў сутнасьці групоўкі ў Радах БНР і БЦР, зразумелі, што паваенная бачная падтрымка перастала існаваць. Яны скіравалі сваю ўвагу на грамадзкія й рэлігійныя арганізацыі, пачалі замацоўваць свой уплыў у займаных імі становішчах.

Гэтую зьяву трапна падгледзеў аўтар фэльетону «Разьбітыя Крывічы»: «...У вадным із сваіх выданьняў з далейшымі нападкамі на беларускае аселішча Бэлэр-Менск у Глен Спэй, у штаце Нью Ёрк, падае што «крывічы» як група ўжо не існуе, бо іх разьбіў сам Абрамчык. Мерляк, як біблійны «Аўсалом Давідзёнак», што ўкраў сэрца Ізраэ-ля, украў сэрца людзей шчырых, і што гэтыя «мерлякоўцы» апанавалі аселішча, бо яны яго куплялі, маючы найбольш шэраў. З Станкевічавага выданьня даведаемся, што Шукелайц, нягледзячы на тое, што абяцаў дзеіць у кірунку разьбіцьця аселішча, скарыстаўшы сваё сяброўства ў рэвізыйнай камісіі, змушаны быў на зьезьдзе прызнаць

правільдловым грашовую справаздачу кіраўніка аселішча. Далей Я.Станкевіч скардзіцца, што частка падпарадкаваных непрадрашэнскай кліцы Ст.Станкевіча, наагул не прыняла ўдзелу ў зьезьдзе. Галасы, якія былі перададзеныя В.Кіпелю, кінутыя былі гэтым апошнім на Мерлякоўскія кандыдатуры. Найвялікшая непрыемнасьць пасьцігла др. Янку Станкевіча, што, як ён піша, ягоныя спадзеўкі аб захопе кіраўніцтва аселішча касякоўцамі (гэтак ён называе былых астроўшчыкаў) таксама не зьдзейсьнілася, бо ўрады дырэктароў прайшло іх толькі двох: інж. Ясюк і Сенька, а ў бальшыні ў кіраўніцтве засталіся «мерлякоўцы» г.з. незалежнікі» (Пра аселішча можна прачытаць у разьдзеле пра «Рэсорт Бэлэр-Менск»).

У наступных разьдзелах прачытаем, як жылі й працавалі на эміграцыі ў Амэрыцы беларускія дзеячы, у тым ліку й Кастусь Мерляк, на працягу далейшых 25 гадоў.



## Кастусь Мерляк сам пра сябе

Народзіны сына 8 красавіка 1966 году, якога назвалі Вінцэнт Рой, і сабор амэрыканскае епархіі БАПЦ ў Таронта, які адбыўся 27 лістапада 1966 году, зь ягонымі вынікамі, заставілі мяне моцна задумацца над жыцьцём мае сям'і, якая ўжо складалася з шасьці асобаў (маці жонкі, Аляксандра, жыла з намі ўжо даўжэйшы час).

Да гэтага часу, па меры магчымасьці, прыстасоўваў патрэбы да грамадзкага жыцьця на першы плян, а асабіста сямейныя, па меры магчымасьці, прыстасоўваў да грамадзкіх. 11-ці гадовая інтэнсыўная й адданая праца на грамадзка-палітычнай ніве не дала задавальняючых вынікаў не з мае прычыны, так як я іх разумею, чаго не хацелі зразумець некаторыя ўдзельнікі ў гэтай дзейнасьці, а незадавальняючыя вынікі ў сямейным жыцьці залежалі выключна ад мяне самога.

Прааналізаваўшы сучаснае становішча ў Амэрыцы й цэлым сьвеце ды іхні ўплыў на палітыку СССР, а гэтым самым і на Беларусь, я прыйшоў да высновы, што неабходна на далей ставіць на першы плян асабіста сямейныя патрэбы, а грамадзкія на другі.

Многія беларусы ад іхняга прыезду ў ЗША стараліся стаяць як найдалей ад удзелу ў грамадзкай працы, а многія зь бегам часу нясумленна апраўдвалі свой пастулак тым, што не згаджаліся з напрамкам дзеяньня або з поглядамі на тую ці іншую справу, адыходзілі ад агулу. Некаторыя нават рабілі перашкоды тым, хто стараўся нешта рабіць. Я лічыў і сёньня лічу, што абавязкам кожнага беларуса ёсьць працаваць сумленна на карысьць свайго народу. Людзі, якія згубілі гэтае пачуцьцё, перасталі жыць для свайго народу й бацькаўшчыны.

Не пакідаючы грамадзкай дзейнасьці, я зьвярнуў увагу на працу ў Галяндзкай параплаўнай кампаніі, з зарплаты якое трэба было ўтрымаць належны ўзровень жыцьця. Ад пачатку 1963 і да канца 1967 году я займаў становішча асыстэнта кіраўніка кантролю пасажырскага аддзелу. Ад 1968 да 1971 году працаваў на становішчы кіраўніка кантролю гэтага-ж самага аддзелу. Праца была цікавая, а галоўнае, што была сталая й давала шырокія магчымасьці для мае грамадзкае працы.

25 сьнежня 1969 году мне споўнілася 50 гадоў ад нараджэньня й 25 гадоў ад актыўнай нацыянальнай беларускай працы.



маёра хацеў забіць маршала, дзеля гэтага ўсе маёры былі арыштаваныя, аднак віноўнага маёра не выкрылі, думаюць што гэта быў амэрыканскі дывэрсант.

Восеньню 1954 году між афіцэрамі корпусу, які стаяў у кашарах пабудаваны палякамі, у Скрыдлеве, у 4 кілямэтрах ад Наваградка, хадзіла вестка, што мноства жаўнераў і афіцэраў было атручаных. Праведзенае сьледзтва паказала, што атрута была замежная, бо такую ў Савецкім Саюзе не прадукуюць.

Вясною 1955 году Касьцюк наведаў сваю вёску. Прабыўшы толькі два дні, ён паціху, як прышоў, так і пакінуў яе назаўсёды.

На паказовым працэсе ў Баранавічах Касьцюка абвінавачвалі ў вышэй апісанай антысавецкай дзейнасьці. Касьцюк на працэсе трымаўся мужна й па-геройску. Яго апошні кліч: «Сьмерць бальшавізму» й «Жыве Беларусь!» гучыць у душы беларускага народу.

## Спроба заманіць Мерляка на «Радзіму»

Для абмену прэсы й кніжак з БССР і Польшчы быў уладжаны адмысловы пункт, з незалежным й асобным адрасам ад беларускіх арганізацыяў у Нью Ёрку. У канцы 1958 году гэтую ўстанову пад кіраўніцтвам сп. А.Шукелайца улякавалі ў магазыне В. Яшчука пры 10-й вуліцы ў Нью Ёрку. Адрас пункту быў пададзены да ведама ў беларускай прэсе.

У студзені 1959 году ў магазын Яшчука прыйшоў чалавек і зацікавіўся беларускімі кніжкамі, распытваючы пра іх. Сп.Яшчук сказаў, што ён ня ў стане даць інфармацыяў, але можа пазнаёміць з чалавекам, які займаецца абменам беларускіх публікацыяў. На просьбу зацікаўленага Яшчук даў яму нумар тэлефону А.Шукелайца. А.Шукелайц хутка спаткаўся з гэтым чалавекам, які прадставіўся Сашай. Саша аказаўся гутарлівым чалавекам (размаўляў па-расейску). Ён выявіў зацікаўленьне ў гісторыі Беларусі й сказаў, што хацеў-бы пазнаёміцца з кім-небудзь зь беларускіх гісторыкаў ды, наогул, зь дзейнымі беларусамі. З кароткай гутаркі Шукелайц ня змог зразумець, куды Саша загінае й заклясыфікаваў яго «як падазорнага».

На наступнае спатканьне з Сашай Шукелайц запрасіў Кастуся Мерляка, каб той быў зь ім у таварыстве падчас сустрэчы. Яна адбы-



*Падчас прамовы на адным з банкетаў кампаніі ў травені 1968 году. Сядзяць зьлева: Джон Г.Рэўрс, прэзыдэнт Голянд—Амэрыка Лайн і А.Валянтын, кіраўнік Таварнага дэпартмэнту.*

З гэтай нагоды сябры Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня й прыхажане прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмон Гіл зладзілі 28 сьнежня вельмі прыгожае прыняцьцё, якое было папярэджанае малебнам за здароўе ўсяе мае сям'і. Падчас банкету прысутныя госьці віталі й віншавалі з угодкамі. Васіль Шчэцька прачытаў коратка біяграфію, атрыманыя пісьмовыя прывітаньні й пажаданьні ўсяго найлепшага на будучыню.



*50-я ўгодкі ад нараджэньня й 25-я ўгодкі грамадзкай працы. Зьлева направа: Ян Казьлякоўскі, Кастусь Мерляк, малы Вінцусь, Ганна Мерляк, а.Сьвятаслаў Коўш, матушка Вера Коўш і Васіль Шчэцька.*

Я трымаў сталую лучнасьць, часамі зь немалымі перабоямі, з роднымі на Бацькаўшчыне. Бацька Ільля жыў зь сястрою Аленаю ў Дзетамлі, там-жа жыў брат Іван з сваёю сястрою. Мой бацька Ільля памёр 1 сакавіка 1971 году й пахаваны на мясцовым магільніку ў Дзетамлі. Летам 1968 году маіх сваякоў наведала Каця Мазура з Дэтройту. Яна завезла весткі пра нашае жыцьцё й прывезла адтуль у Амэрыку многа вестак пра іхняе жыцьцё ў Беларусі.

Ад часу, калі быў куплены рэсорт Бэлэр-Менск, два месяцы летняга сэзону дзеці праводзілі ў гэтым асяродку сярод сваіх людзей пад наглядам бацькоў жонкі. Калі памёр цесьць, то дзеці былі пад

наглядам цёшчы аж да 1976 году. На працягу 12 гадоў мы займалі кватэру на Бэлеры-Менск (З прычыны пераезду ў Маямі, штат Флёрыда, яе зьліквідавалі). Першыя гады мы праводзілі на Бэлэры свае вакацыі разам, а калі яныканчаліся, прыязджалі на Бэлэр у канцы кожнага працоўнага тыдня. (Ад Нью Ёрку да Бэлэру 110 міляў). Пачынаючы ад 1969 году, мы сталі выязджаць на вакацыі на параплавах кампаніі ў Цэнтральную й Паўдзённую Амэрыку, а таксама на Бэрмуду.

У 1970 годзе старэйшы сын Юліян закончыў Рычмондгільскую сярэднюю школу й атрымаў сярэднюю асьвету. Далей ён паступіў у Бруклін каледж, які закончыў у чэрвені 1974 году з ступеньню бакалаўра ў дакладных навуках. 27 ліпеня 1974 году Юлік узяў шлюб з Барбарай Бальдо, зь якою разам вучыўся у школе. У гэтым годзе ён быў прыняты ў Ньюёркскі ўнівэрсытэт, мэдыцынскі факультэт.

У студзені 1972 году мяне назначылі кіраўніком (менеджэрам) аддзелу бухгалтэрыі кампаніі. На гэтым становішчы я працаваў да 1976 году. У травені 1972 году я паехаў у Ротэрдам, Галяндыя, у галоўную кватэру Голянд-Амэрыка Лайн з даручэньнем падрыхтаваць перавод ўсяе адміністрацыі Голянд-Амэрыка Крузэс (кампанія зьмяніла назоў) з Ротэрдаму ў Нью Ёрк. Па дарозе я затрымаўся ў Лёндане на два дні.



*На Каляды 1968 году ў сваім доме ў Кю Гардэнс Квінс, прадмесьце Нью Ёрку. Ганна, Вінцусь, Даніла, Юліян, Кастусь Мерлякі.*



*З усёй сям'ёю на вакацыях, пасьля заканчэньня Юлікам сярэдняе школы ў ліпені 1970 году.*

*На параплаве с/с Ротэрдам падчас падарожжа вакол Караібскіх абтокаў: Сан Хуан, Сан Мартын, Сан Томас Мартынік і Санта Люцыя.*

У Лёндане адведаў свайго сябру з часоў пабыту ў Рыме Аляксандра Лашука. У сыботу разам зь ім наведалі важнейшыя а'бекты гораду Лёндану, а ў нядзелю бібліятэку-музэй імя Ф.Скарыны й Дом Марыянаў. Пасьля Божае службы, у мой гонар быў зладжаны абед, дзе біскуп Чэслаў Сіповіч прадставіў мяне прысутным, а я расказаў пра грамадзкае жыцьцё ў Амэрыцы.

Зь Лёндану адляцеў у Ротэрдам, дзе прабыў два тыдні, вывучаючы паасобныя дзялянкі апэрацыі кампаніі. У вольны час, у таварыстве дырэктара фінансаў др.Шольтэ, зьведаў гарады Ротэрдам, Амстэрдам, сталіцу Галяндыі Гагу.

У 1975 годзе мяне назначылі кантралёрам на прадпрыемстве будовы стальных цыстэрнаў (General Steel Tank) ў Грандборо. Галоўным маім даручэньнем было пераняць і ўпарадкаваць адміністрацыю ды зьліквідаваць прадпрыемства па поваду банкроцтва, ня выканаўшы кантракту пабудовы баржаў для Голянд-Амэрыка Крузэс. На працягу паўгоду я даязджаў самалётам зь Нью Ёрк ў Грандсборо, Паўночная Караліна.

У пачатку 1976 году кампанія, у якой я працаваў, пастанавіла пераняць Монарк Круз Лайн (Monarch Cruise Line), якая знаходзілася ў Маямі, штат Флёрыда, і прапанавала мне абняць яе фінансавае кіраўніцтва з тытулам асыстэнта прэзыдэнта кампаніі. Прэзыдэнт сп.Ван Тол быў прэзыдэнтам Голянд-Амэрыка Крузэс і пражываў у Нью Ёрку ды ня зьбіраўся пераязджаць у Маямі, дык гэта становішча было вельмі важнае й адказнае побач генэральнага кіраўніка сп.Яна Бурэн.

Ганна, мая жонка, спачатку не згаджалася перасяляцца на сталае жыцьцё ў Маямі, бо рызыка была немалая. Трэба было ўсё зьліквідаваць у Нью Ёрку й распачынаць новае жыцьцё ў Маямі. На банкеце Ганна даведалася, што мае два супрацоўнікі моцна стараюцца быць назначанымі на гэтае становішча, да гэтага ўласьнік кампаніі Ван Дэр Ворм з Ротэрдаму й Ван Тол за сталом ўгаварылі Ганну, і яна дала згоду на пераезд у Маямі. Зараз-жа пачаліся перагаворы адносна мае працы й адказнасьці ды ўмовы пераезду. Установлена, што сям'я пераедзе ў палове 1977 году, пасьля заканчэньня гай скул Данілам. У гэтым часе я буду пражываць у Маямі ды прыязджаць кожныя два тыдні ў Нью Ёрк адведаць сям'ю. Падарожжы й пераезд ,аплаціць кампанія.



*Прамова на банкеце кампаніі ў чэрвені 1976 году ў Нью Ёрку перад ад'ездам у Маямі.*

У Маямі я наняў кватэру, а кампанія купіла самаход, які мне належаўся згодна майго становішча. На працягу году быў прададзены дом у Брукліне, а суполка "Слуцк Рыальты Ко" была зьліквідаваная. Таксама быў прададзены дом у Кю Гардэнс і куплены дом з басейнам у Кэндал, на прадмесьці Маямі.

У чэрвені 1977 году сын Даніла закончыў Рычмондгільскую сярэднюю школу й быў прыняты ва ўнівэрсытэт у Маямі. У пачатку ліпеня гэтага-ж году ўся сям'я разам з маці Ганны пераехала жыць у Маямі.

У першую чаргу мне было неабходна рэарганізаваць кампанію, што вымагала камп'ютарызацыі. Яна была даведзеная на працягу шасьці месяцаў. Да існуючых у Амэрыцы дзьвюх сыстэмаў камп'ютэрызаванай адміністрацыі параплаўных кампаніяў у "Пэрл Шыпінг Ко" ў Лёс Анджэлес і ў Норвэгіян Круз Лайн у Маямі, была ўведзеная трэцяя сыстэма ў Монарк Круз Лайн, распрацаваная мною.

Другой важнай падзеяй ў маёй працы была рэпрэзэнтацыя мною дзьвюх кампаніяў: Голянд-Амэрыка Крузэс і Монарк Круз Лайн на сусьветнай канфэрэнцыі параплаўных кампаніяў, якая адбылася ў травені 1977 году ў Сан Хуан, Порта-Рыка.

Грамадзкая дзейнасьць абмежавалася да спробы стварэньня беларускае арганізацыі ў Флёрыдзе. Мой кароткі побыт ды разыходжаньні між арганізатарамі: У.Брылеўскім, др.Л.Трусэвічам, др.М.Мінкевічам і Я.Пазьняком перашкодзілі ажыцьцяўленьню гэтай ідэі.

У міжчасе зьмяніўся прэзыдэнт кампаніі ў Нью Ёрку, нанова прастудыяваўшы становішча кампаніі, запрапанаваў Монарк Круз Лайн прылучыць да Голянд-Амэрыка Крузэс ды зьліквідаваць адміністрацыю ў Маямі, а гэтым самым зьменшыць выдаткі ды пабольшыць даходы.

Якраз на Дзень удзячнасьці прыляцеў зь Нью Ёрку віцэ-прэзыдэнт фінансаў Томас Гілі й паведаміў, што Монарк Круз Лайн ліквідуецца й запрапанаваў мне адпаведнае становішча ў Нью Ёрку з пакрыцьцём коштаў пераезду.

Мне асабіста жыцьцё ў Маямі падабалася й я задумоўваўся ці часам не адмовіцца ад прапановы й застацца ў Маямі, але Ганна й уся сям'я абвесьцілі ў адзін голас—вяртацца ў Нью Ёрк. Быў прададзены дом у Маямі й куплены ў Флашынг на прадмесьце Нью Ёрку. 7 ліпеня 1978 году мы ўсе пераехалі назад.



*Навагодні банкет на параплаве с/с Ротэрдам 20 сьнежня 1978 году. Зьлева направа: капітан Ротэрдам, місыс Джон Бэры й яе муж Джон Бэры—прэзыдэнт кампаніі Голянд-Амэрыка Крузэс, Кастусь і Ганна Мерляк.*

1чэрвеня я й Ганна прыляцелі ў Нью Ёрк на ўрачыстасьць заканчэньня мэдыцыны ва ўнівэрсытэце й уручэньня ў Лінкольн цэнтар у Нью Ёрку дыплёма доктара (М.Д.) сыну Юліяну. А 2 ліпеня Ганна й я сталіся бабуляй і дзедам — у Юліяна й Барбары нарадзілася дачка, якую назвалі Дэна.

Даніла пастуціў у Бруклінскі каледж, а Вінцусь, закончыўшы пачатковую школу ў Маямі пайшоў у сярэднюю школу імя Эдварда Блікер у Флашынгу.

На новым становішчы ў Голянд-Амэрыкан Крузэс я быў поўнасьцю адказны за фінансы кампаніі, г.зн. мне трэба было кантраляваць грашовыя абароты ў Амэрыцы, у Эўропе ды рабіць кароткатэрміновыя

інвэстыцыі на працэнты, якія часта дасягалі да двух мільёнаў даляраў у дзень.




*Параплаў «Волендам»-круіз на Бэрмуду. Ліпень 1980 г.*

Непрыкметна прайшлі тры гады ў нашым сямейным жыцьці. У 1981 годзе сын Даніла закончыў Бруклінскі каледж і паступіў у штатны Ньюёркскі ўнівэрсытэт—навуковы цэнтар здароўя ў Брукліне. А самы меншы Вінцусь быў прыняты ў Стувэйсантскую сярэднюю школу ў Нью Ёрку.

Да гэтых дзьвюх падзеяў дайшла трэцяя—прыезд мае сястры Алены с сынам Данілам. Для мяне гэта была найбольшая падзея ў жыцьці пасьля 37-гадовай разлукі.

Сястра прыехала ў верасьні 1981 году. Яна падрабязна расказвала пра жыцьцё майго бацькі, сваёй сям'і, пра брата й усіх далейшых сваякоў, прыяцеляў і знаёмых. Яна падрабязна расказала пра беды, хваляваньні, палітычны недавер ды наогул пра гаротнае жыцьцё сваіх радных у камуністычным пекле. Сястра мяне вылечыла ад тугі па Бацькаўшчыне й жаданьні калі-небудзь вярнуцца. Ад гэтага часу пакінула мяне туга й мары, якія мяне прасьледавалі ўва сьне. Я пачуўся вольным чалавекам.

8 студзеня 1982 году зайшоў у маю канцылярыю віцэ-прэзыдэнт кампаніі з заявай, што ён ні ў чым мне не вінаваты і г.д. Я яго перабіў, сказаў, што гэта непатрэбны ўступ, бо я ведаю ў чым справа.

—Калі так, —сказаў той,—то пяройдзем да справы. Вашая праца ў Голянд-Амэрыка Крузэс канчаецца днём 15 студзеня.

Тут-жа падаў прапановы разьліку й заканчэньня працы. Сказаў: «Шчасьліва»,—і выйшаў.

У лісьце было сказана, што кампанія рэарганізуецца, дзеля гэтага скарачаецца вышэйшы й сярэдні кіруючы пэрсанал у колькасьці 40 асобаў. Таму што я меў 62 гады й мог пайсьці на пэнсію, то павінен згадзіцца з гэтай пастановай. Мне прадастаўлялася тры варыянты разьліку з кампаніяй. Разглядзеўшы іх, я заявіў кампаніі, што пайду на пэнсію па сканчэньні 65 гадовага ўзросту й згаджаюся на выплату за выслугі 27 гадоў працы ў вышыні сучаснай заработнай платы наступных 15 месяцаў.

Не прайшло й тыдня як я дастаў па тэлефоне запрошаньне на спатканьне ў справе працы.

Падчас спатканьня віцэ-прэзыдэнт параплаўнай кампаніі «Чандрыс» В.Капэтанакос запрапанаваў становішча кантралёра ў фільяле «Фаназы Крузэс».

Так, 8 лютага 1982 годзе я перайшоў на новую пасаду.

Гэтага году Юліян закончыў лекарскую практыку й дастаў ліцэнзію на лячэньне людзей. У канцы ліпеня ў іх нарадзілася другая дачка, якой далі імя Вікторыя. Др.Юліян Мерляк купіў сабе дом на Лёнг Айленд, якія 40 міляў ад Нью Ёрку й распачаў прыватную практыку.

Фінансавая група Д.Ф.Д.С. Нарвэгіі й Даніі зь сядзібай у Капэнгагэн, запрапанавалі мне перайсьці да іх працаваць у параплаўную кампанію Скандынавіян Ворлд Кузэс з канцылярыяй у Маямі, якая плянавала адкрыць бюро ў Нью Ёрку. Так як кампанія была шмат большай, становішча паважнейшае, а самае галоўнае вышэйшая плата, я мусіў зрабіць перамовы з сваімі гаспадарамі з мэтай уладкаваць мой пераход у другую кампанію.

Так як я ўвёў камп'ютар з маёю сыстэмаю адміністрацыі, да гэтага я згадзіўся надалей працаваць па некалькі гадзінаў у дзень, каб падрыхтаваць наступніка, давесьці справы да канца году й зрабіць фінансавы баланс не пазьней 15 лютага 1983 году. На гэта яны згадзіліся.

Так, ад 8 жніўня 1982 году да 15 лютага 1983 году я працаваў паралельна ў дзьвюх параплаўных кампаніях.

24 сакавіка памерла маці Ганны Аляксандра Губэрт, пражыўшы 82 гады.

Летам 1983 году я й Ганна паехалі на новым параплаве с/с «Скандынавія» на даўжэйшы адпачынак на абтоках Караібскага мора.

Кіраўніцтва фінансавае групы ў Капэнгаген хутка зарыентавалася, што адміністрацыя ў Маямі й Нью Ёрку ня прыносіць фінансавае карысьці, а наадварот пабольшваюць выдаткі, і пастанавіла зьмяніць параплаўныя маршруты й зьліквідаваць Ньюёркскае бюро.

Гэта быў другі выпадак у маім жыцьці, калі кампанія, у якой я працаваў, ліквідавалася, і я мусіў дэцыдавацца, што рабіць далей. Шукаць працу ці даць згоду заняць прапанованае становішча ў Маямі ды другі раз перасяляцца з Нью Ёрку.

Такім чынам, я зьліквідаваў бюро Скандынавіян Ворлд Кузэс у Нью Ёрку, зачыніў дзьверы й 23 сьнежня 1983 году, перадаўшы ключы адміністрацыі будынку пры 17 Батэры Парк, Мангэтан, падзякаваўшы за добры бонус.



*Параплаў«Скандынавія» Круіз на Багамас. Ліпень 1983 году.*

У маім жыцьці я ніколі не шукаў працы, яна шукала мяне. Не прайшлі калядныя сьвяты, як я атрымаў тэлефон ад прэзыдэнта Сан Лайн кампаніі сп.Джорджа Сотыра з прапановай абняць становішча кантралёра кампаніі. Параплавы Сан Лайн плавалі пад грэцкім сьцягам, а ўласьнікамі былі грэцкія сем'і М.П.Кэсэоглю й Марыёт Корпорашэн (Амэрыканская кампанія гатэляў у вялікіх гарадах Амэрыкі й у вольным сьвеце з галоўнай кватэрай у Вашынгтоне).

Згодна дагавору я павінен быў працаваць прынамсі два гады (за год я мог ісьці на поўную пэнсію). Але я ў гэтай кампаніі адпрацаваў ня толькі два гады, а яшчэ тры гады дадаткова.

15 лютага 1984 году я пачаў сваю працу. Кампанія, якая была ў параўнаньні з папярэднімі адсталай і патрабавала мадэрнай тэхнікі ў вядзеньні бізьнесу й адміністрацыі. Я хутка наведаў Вашынгтон і прадставіў плян дзеяньня кіраўніцтву Марыёт, які быў апрабаваны.

Наймалодшы сын Вінцусь закончыў Стуйвэсантскую сярэднюю школу ў чэрвені 1984 году й быў прыняты на Станфорд унівэрсытэт у Палё Альто ў Каліфорніі. Вінцусь паехаў у верасьні, а я адведаў яго ў лістападзе ды адначасна пазнаёміўся бліжэй з гэтай вялікай славы інстытуцыяй.

Зіма прайшла спакойна, але вельмі актыўная пад кожным узглядам. Але прыйшоў і да нас адпачынак. У травені 1985 году Ганна й я выбраліся на месячную вандроўку па трох кантынэнтах сьвету: Эўропе, Афрыцы й Азіі. Перш затрымаліся ў Атэнах. Я—па справах сваe працы, а Ганна па справах агляду магазынаў. Вольны час выкарысталі на наведаньне старажытнага гораду Атэны, яго помнікаў, музэяў, цэркваў. На параплаве «Стэля Солярыс» наведалі некалькі абтокаў Агейскага мора, гарады Егіпту Аляксандрыю, Каір й ваколіцы зь іхнымі помнікамі фараонскіх часоў. Наступна пераехалі ў Ізраэль, дзе зьведалі Тэль-Авіў, Ерусалім, Бэтлеем і ўсе сьвятыя месцы, а перадусім месца нараджэньня й укрыжаваньня Хрыста. Па дарозе наведалі гарады Эфэзорс і Пэргамум у Турцыі ды вярнуліся назад у Атэны, адкуль адляцелі ў Рым, дзе затрымаліся некалькі дзён. Маім жаданьнем было наведаць італьянскіх прыяцеляў, а Ганне пабачыць сучасны й старадаўні Рым і Ватыкан. У Рыме заапекаваўся намі Янка Мойсік, працаўнік беларускае сэкцыі Радыё Ватыкана.Пад яго кіраўніцтвам мы зьведалі Ватыкан і важнейшыя помнікі старажытнага Рыму. Для мяне кожнае месца прыгадвала хваляваньні з 1946-1947 гадоў.



*Капітан Стэла Соляріос і Гостэс вітаюць Ганю й Кастуся Мерляка на банкеце падчас падарожжа на Срэдзіземным моры—травень 1985 году.*



*Каля Сфінкса пад Каіро ў Егіпце. Травень 1985 год.*

З маіх асабістых прыяцеляў я мог спаткацца толькі з адной асобай, іншыя ў часе 38 гадоў паўміралі або павыязджалі з Рыму. У апошні дзень пабылі на агульнай аўдыенцыі з папам Паўлам Янам II й вярнуліся дамоў у Нью Ёрк. 1986 год быў годам без асаблівых падзеяў як на працы, так і дома. Кожны з нас быў заняты свамі справамі. Я й Ганя застаўшыся удваіх займаліся гаспадарчымі справамі дому. Юліян займаўся сваёй практыкай, Даніла рабіў свае досьледы, а Вінцусь вучыўся ў Каліфорніі й толькі прыязджаў адведаць нас на сьвяты й канікулы.

Каб выканаць нашае слова, данае беларусам перад выездам з Аргентыны, што мы вернемся, пастанавілі іх адведаць пасьля 30-ці гадовае разлукі ў траўні 1986 году. На прыняцьці ў гатэлі Панамэрыкан сабраліся амаль ўсе нашыя знаёмыя беларусы. Тут выявілася, што некаторыя зь іх ня бачыліся 10-15 гадоў. Выглядала, што наш прыезд іх сабраў у адно месца. Бальшыню зь іх мы адведалі прыватна, а таксама зьведалі некаторыя мясцовасьці дарагія сэрцу з далёкага

мінулага. Эканамічнае становішча ў Аргентыне было жахлівае, мала што палепшылася, а некаторыя дзялянкі жыцьця пагоршыліся. Вяртаючыся дадому, мы думалі, як добра зрабілі, што выехалі ў Амэрыку.

Дні ляцелі хутка. Зіма, вясна, лета й зноў надыходзіла восень. Даніла здабыў ступень доктара філязофіі (Ph. D.) у галіне біялягічных навукаў 11 верасьня 1987 году. У Ньюёркскім штатным унівэрсытэце—навуковым цэнтры здароўя. Ён абараніў сваю тэму, "Modulation and Desensitization of the GABA Receptor", што значыць: «Узьдзеяньне наркотыкаў валій і лібрый на электрычныя ўласьцівасьці клетак сьпіннога мозгу». Даніла пастанавіў прадаўжаць навуку, каб здабыць ступэнь доктара мэдыцыны (M.D). У лістападзе я наведаў Атэны па справах кампаніі й прыняў на сябе абавязак дырэктара фінансаў кампаніі.

1988 годзе я й Ганна ізноў наведалі Атэны, некалькі грэцкіх гарадоў, Турцыю й, самае галоўнае, горад Істамбул (Канстантынопаль) — калыску праваслаўя. Сабор.сьв.Сафіі й помнікі Бізантыйскай імпэрыі, а таксама помнікі атаманскай імпэрыі, музэі й помнікі культуры.

У гэтым-жа годзе Вінцусь закончыў Стэнфардзкі ўнівэрсытэт у Палё Альто й дастаў дыплём бакалаўра у ангельскай мове. Вінцусь затрымаўся ў Каліфорніі працаваць на тэлевізыйнай станцыі Стэнфордзкага ўнівэрсытэту на паўтара гады.



*У дзень заканчэньня студыяў Данілам разам з усей сям'ёй. 18 травеня 1989 г.*

25 сьнежня 1988 году мне споўнілася 69 гадоў, а з гэтым прышоў час на адпачынак, на пэнсію. 15 лютага 1989 году я разьвітаўся з сваёю кампаніяй Сан Лайн Крузэс і з усімі калегамі па працы, падзякаваўшы ім за прыняцьцё, падарункі ды шчырае супрацоўніцтва. Пажадаўшы ім посьпехаў у працы й прыватным жыцьці я выйшаў на пляц Рокафэлера, разглянуўся вакол і сказаў сам сабе: «Ну й штож. Я вольны?!»

Даніла ў травені 1989 году здабыў ступень доктара мэдыцыны, уладзіўся ў Карнэльскім мэдычным цэнтры ў Нью Ёрку, каб адбыць лекарскую практыку, спэцыялізуючыся ў псыхіятрыі, і адначасна займацца навуковымі досьледамі.

У хаце др.Юльяна А.Мерляка 25 сьнежня 1990 году сабраліся др.Даніла, К. Мерляк, Вінцусь і жонка Юліка Барбара з дочкамі Дэна й Вікторыя, каб адзначыць мае 71 ўгодкі ад нараджэньня, а таксама супольна спаткаць новы 1991 год. З пажаданьнямі ўсяго найлепшага ў жыцьці ў наступаючым новым годзе й у будучыні, кожны з нас вярнуўся да свайго кутка, да свайго асабістага жыцьця з найлепшай думкаю й надзеяй на прышласьць.



*Апошні дзень на працы ў сваім кабінэце. 15 лютага 1989 году.*

# Рэспубліканская дзейнасьць у Амэрыцы

З рэспубліканскім рухам у Амэрыцы К.Мерляк запазнаўся ўпершыню на канфэрэнцыі этнічных групаў у Амэрыцы ў чэрвені 1958 году (National Confederation of American Ethnic Groups). У гэтай канфэрэнцыі К.Мерляк узяў удзел як старшыня Галоўнае Ўправы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня Амэрыкі, якое, дзякуючы яго захадам, было прынятае ў сябры канфэдэрацыі. Галоўнае кіраўніцтва канфэдэрацыі арганізавала нацыянальныя групы для актыўнай выбарчай кампаніі ў 1960 годзе на прэзыдэнта й віцэ-прэзыдэнта Ніксон—Лодж. У гэтай кампаніі К.Мерляк як старшыня БАЗА ўзяў актыўны ўдзел. На адным прадвыбарчым сходзе ў грамадзкім цэнтры, на якім былі прысутныя прадстаўнікі рэспубліканскае й дэмакратычнае партыяў браў удзел у дыскусіі.

Каб паінфармаваць беларускае грамадзтва напісаў артыкул у газэту «Бацькаўшчына», пад загалоўкам «Пытаньні, парушаныя сп. К.Мерляком на прадвыбарчым сходзе». Газэта «Бацькаўшчына» гэты артыкул памясьціла зь вялікім спазьненьнем у № 530-531 за 27 лістапада 1960 году зь вельмі непрыгожай і зласьцівай зацемкай « Ад Рэдакцыі», якая выклікала канфлікт між К.Мерляком і др. Ст.Станкевічам, рэдактарам газэты.

Выбары прайшлі зь няўдачай для Ніксана—вельмі малою перамогаю галасоў. На Прэзыдэнта Злучаных Штатаў Амэрыкі быў выбраны Джон Ф.Кэнэды.

У дзейнасьці канфэдэрацыі К.Мерляк браў удзел да чэрвеня 1963 году, калі на X кангрэсе БАЗА на старшыню быў выбраны др.Ст.Станкевіч.

Перад наступаючымі выбарамі Прэзыдэнта й віцэ-прэзыдэнта ЗША ў 1964 годзе нацыянальны камітэт рэспубліканскай партыі арганізаваў аддзел нацыянальнасьцей, які складаўся з сэкцыяў кожнай нацыянальнасьці ў тым ліку й беларускай. Старшыня рэспубліканскага камітэту паклікаў Кастуся Мерляка на старшыню беларускае сэкцыі нацыянальнасцьей рэспубліканскае партыі 8 жніўня 1964 году.

Кандыдатам на Прэзыдэнта ЗША быў сэнатар Бэры Гольдвотэр і выбарчая кампанія была вельмі актыўная, якую сярод беларусаў праводзілі штатныя аддзелы Беларуска-Амэрыканскае сэкцыі. Нажаль, Гольдвотэр не прайшоў, і на Прэзыдэнта ЗША быў выбраны Лындан Б.Джонсан.

OFFICE OF THE VICE PRESIDENT
WASHINGTON

January 13, 1961

Dear Mr. Mierlak:

Now that my office staff has been able to dig its way out from under the mass of mail that has come to us in the days since November 8, I want to take this opportunity to tell you how much I appreciated all that you did on our behalf during the campaign, and particularly your outstanding work as a member of the Nationalities Advisory Committee for Nixon-Lodge.

Losing the election was naturally a keen personal disappointment to Pat and to me. We often talk of the things we could have done or mistakes we might have avoided which could have changed the result. As the months and years go by, these factors will fade into the background. But we shall never forget the devoted and selfless efforts of those who worked so hard for our cause during the campaign. We only wish that we, ourselves, could have done more so that we could have won the victory which you worked so hard to achieve.

I have been encouraged by the fact that in the great amount of mail that I have received since the election I have found very little evidence of discouragement or defeatism among those who supported us in the campaign. On the contrary, I sense a renewed determination to continue to fight for the principles for which we stood. I want to assure you that, to the extent my own time will permit, I intend to do everything that I can in working for those principles in the years ahead.

I hope that before too long Pat and I will be able to thank you personally for all that you did. In the meantime, she joins me in sending our best wishes.

Sincerely,

Dick Nixon

Richard Nixon

Mr. Constant Mierlak
197 Roebling Street
Brooklyn 11, New York

Republican National Committee
1625 EYE STREET, NORTHWEST WASHINGTON 6, D.C. NAtional 8-6800

NEWS

FOR RELEASE

FRIDAY AM'S
August 28, 1964

*Nationalities Division*
CONGRESSMAN EDWARD J. DERWINSKI
CHAIRMAN

DR. LEV E. DOBRIANSKY
VICE CHAIRMAN

## CONSTANT MIERLAK NAMED CHAIRMAN OF BYELORUSSIAN SECTION OF THE REPUBLICAN NATIONAL COMMITTEE'S NATIONALITIES DIVISION

WASHINGTON, D.C., Aug. 28 -- Constant Mierlak, of Brooklyn, N.Y., has been appointed chairman of the Byelorussian Section of the Nationalities Division of the Republican National Committee, National Committee Chairman Dean Burch announced today.

Chairman Burch said that Mr. Mierlak will be responsible for selecting state chairmen and for developing a nationwide organization of Byelorussian-Americans for the Republican ticket. He will work closely with Congressman Edward J. Derwinski, of Illinois, Chairman, and Dr. Lev E. Dobriansky, Vice-Chairman, of the Republican National Committee's Nationalities Division, Chairman Burch said.

At the time of his appointment, Mr. Mierlak named Bazyl Pleskacz, of Detroit, Mich., as national vice chairman of the Byelorussian Section, and announced the following state chairmen for the Section:

- more -

Emanuel Jasiuk, of Passaic, for New Jersey; M.Hrebien, of Phoenixville, for Pennsylvania; A.Szostak, of Wilmington, for Delaware; I.Kanarchuk, of Baltimore,for Maryland; Eugene Protas, of Stamford, for Connecticut; Eugene Wierbicki, of Framingham, for Massachusetts, Constant Kalosha of Cleveland, for Ohio, Bazyl Pleskacz of Detroit, for Michigan, M.Kuczura, of Chicago,for Illinois; Joseph Arciuch, of Gardena, for California, V.Dubrowski, of Lincoln, for Nebraska, and Lazowski, of Denver, for Colorado. Mr. Mierlak will serve as chairman for New York as well as National chairman for the Section.

Mr. Mierlak is former President of the Byelorussian -American Association and former Chairman of the New York Commission of the League for the Liberation of the Peoples of the USSR. He came to the United States in 1954 and is now Assistant Manager, Passenger Division, Holland-American Line.

Mr.Mierlak was born in Nowogrodok Byelorussia, formerly the Eastern part of Poland which was taken over by the USSR. Mr. Mierlak studied Soviet banking and served for a time as Deputy Director of the Gosbank. From 1942 to 1944 he fought against Communists as a Lieutenant in the Byelorussian Liberation Army. He moved to Rome in 1945, to Argentina in 1947 and to the United States in1954.

У 1965 годзе паўстаў нацыянальны камітэт Паняволеных народаў ((National Captive Nations Commitee) для арганізаваньня масавага адзначэньня Тыдня Паняволеных народаў. Таксама ў гэтым годзе паўстала арганізацыя «Амэрыканцы за вызваленьне паняволеных народаў у Нью Ёрку (Americans to Free Captive Nations) на чале з старшынёй Альфрэдам Корн.

На першай арганізацыйнай маніфэстацыі, што адбылася 27 лістапада 1965 году была прынятая ідэялягічная рэзалюцыя, якую падпісалі ад беларусаў К.Мерляк і А.Плескачэўскі.

Старшыня штатнага камітэту нацыянальнасьцей Альфрэд Корн стаў арганізоўваць нацыянальныя клюбы ў штаце Нью Ёрку, каб ажывіць дзейнасьць ды ўзяць актыўны ўдзел у надыходзячых выбарах Прэзыдэнта ЗША у 1968 годзе й губэрнатара штату Нью Ёрк у 1969 годзе.

К. Мерляк зарганізаваў амэрыканска-беларускі клюб у Нью Ёрку (Byelorussian-American Republican Club) з наступнай управай: Кастусь Мерляк—старшыня, Васіль Шчэцька—заступнік старшыні, Ганна Зыбайла—сакратар і Крыстына Юрцэвіч-скарбнік.

**STATE CAMPAIGN HEADQUARTERS**

# FRIENDS OF THE ROCKEFELLER TEAM

**575 MADISON AVENUE, NEW YORK, N.Y. 10022 (212) 486-9100**

R. BURDELL BIXBY, CAMPAIGN DIRECTOR

JACOB K. JAVITS, CAMPAIGN CHAIRMAN

1969

*Ethnic Executive Committee*
SPYROS P. SKOURAS, Chairman
GUS EYSELL, Co-Chairman

*Afro-American Division*
JACKIE ROBINSON, Chairman
*Albanian Division*
HAMZA DRINI, Chairman
*Armenian Division*
GEORGE POSTIAN, Chairman
*Byelorussian Division*
CONSTANT MIERLAK, Chairman
*Chinese Division*
LOUIS HONG, Chairman
MAJOR EDWARD HONG, Co-Chairman
*Cossak Division*
WASILI GLASKOW, Chairman
*Croatian Division*
MIRO GAL, Chairman
*Czech Division*
DR. ZBISLAV PETERS, Chairman
*Estonian Division*
PAUL SAAR, Chairman
*German Division*
HANS OSTERMAN, Chairman
ERWIN SINGLE, Co-Chairman
HON. ALBERT HAUSBECK, Co-Chairman
FRANK X. SCHWAB, Co-Chairman
*Greek Division*
NICHOLAS MAKRIS, Chairman
*Hungarian Division*
DR. TIBOR ECKHARDT, Chairman
*Italian Division*
HON. JOHN LOMENZO, Chairman
*Latvian Division*
KARLIS V. BALODIS, Chairman
*Lithuanian Division*
STANLEY J. GUDAS, Chairman
*Polish Division*
FRANK WAZETER, Chairman
*Puerto Rican Division*
ROBERTO RUIZ, Chairman
*Russian Division*
CAPT. BORIS SERGIEVSKY
*Scandinavian Division*
LENNART GRAN, Chairman
*Slovak Division*
METHOD BALCO, Chairman
JOHN KULHAN, Co-Chairman
*Syrian-Lebanese Division*
EDWARD A. ZRAICK, Chairman
*Ukranian Division*
MICHAEL PIZNACK, Chairman

*Captive Nations Organization*
*Bulgarian Committee*
DR. IVAN DOCHEFF, Chairman
IVAN BOUREV, Co-Chairman
*Byelorussian Committee*
J. KOSIAK, Chairman
*Croatian Committee*
ANTHONY NOSIC, Chairman
*Caucasian Committee*
CAPT. ARSLAN BEK
*Cossak Committee*
LT. COL. NICHOLAS NAZARENKO, Chairman
*Cuban Committee*
MARIO AGUILERA, Chairman
*Estonian Committee*
ELMAR LIPPING, Chairman
*Hungarian Committee*
CHARLES ANDREANSKY, Chairman
*Romanian Committee*
ARISTEDE NICOLAIE, Chairman

Dear Constant:

This is a very short letter which can be easily understood in any language.

It is a letter about my Governor and your Governor -- Nelson A. Rockefeller of New York State.

He carries a name which means "service to mankind" throughout the world. The brightest gems on the skyline of New York from Rockefeller Center to Lincoln Center are shining proofs of the Rockefeller guiding principles -- the pursuit of excellence for the happiness and welfare of their fellow man.

Governor Rockefeller's father, John D. Rockefeller, Jr., stated best their family motto for America: "I believe that every right implies a responsibility; every opportunity implies an obligation; every possession implies a duty." Nelson Rockefeller has lived by that creed - "responsibility, obligation, duty."

He has served the nation under five presidents. He has concentrated all his experience now in the service of the people of New York State.

More than anybody else, those of us with recent roots in Europe, Africa, Asia, and South America, understand and appreciate how much Nelson A. Rockefeller exemplifies the meaning of America.

That is why we must, and we will work for his re-election now, in so doing we are working for ourselves.

If you believe in the future of America, if you want a greater future for your children, please give now of your time and energy.

We must re-elect Nelson A. Rockefeller for another four years.

Sincerely,

Spyros P. Skouras
Chairman

150

Ад Беларуска—Амэрыканскага Аб'еднаньня К.Мерляк у супрацоўніцтве з сэкцыяй нацыянальнасьцей штату Нью Ёрк узяў актыўны ўдзел у прэзыдэнцкіх выбарах 1968 году. На прэзыдэнта ЗША быў выбраны Рышард М.Ніксан і на віцэ-прэзыдэнта Спіро Т.Агню.

Як толькі кончылася выбарчая кампанія на Прэзыдэнта ЗША, распачалася падрыхтоўка да выбараў губэрнатара штату Нью Ёрк Нэльсана А.Ракафэлера. Дзеля гэтага была створана асобная арганізацыя ў рамках рэспубліканскае партыі «Прыяцелі Ракафэлера» (Friends of the Rockefeller Team). На старшыню беларускага аддзелу гэтай арганізацыі быў пакліканы К.Мерляк. Кампанія прайшла добра й Ракафэлер быў ізноў выбраны на губэрнатара.

З выбарам на Прэзыдэнта ЗША Р.Ніксана рэспубліканская партыя заактывізавалася й зьвярнула ўвагу на этнічныя групы, якія значна дапамаглі ў выбарах. На 29-31 кастрычніка 1968 году была скліканая ў Вашынгтоне канфэрэнцыя нацыянальных арганізацыяў, на якой пастаноўлена стварыць у рамках рэспублiканскае партыі рэспубліканскі савет нацыянальнасьцей (National Republican Heritage Groups-Nationalities Council).

У гэты савет увайшла канфэдэрацыя этнічных групаў, адначасна ствараючы «Гэрытыж фундацыю», для вывучэньня этнічных групаў Амэрыкі, у якую ўвайшоў др.Вітаўт Кіпель ад Беларускага Кангрэсовага Камітэту Амэрыкі.

Абавязкам К. Мерляка, як старшыні беларускіх грамадзкіх арганізацыяў на працягу больш 10-ці гадоў, было бараніць беларускія інтарэсы перад амэрыканскімі ўрадавымі, палітычнымі й грамадзкімі чыньнікамі, а таксама перад нацыянальнымі арганізацыямі паняволеных народаў у Амэрыцы. Выконваючы свае «дыпляматычныя» абавязкі, заўважылася, што абедзьве партыі зьвярталі ўвагу на групы толькі падчас прэзыдэнцкіх выбараў кожныя чатыры гады. Партыйныя палітыкі й кандыдаты заўсёды абяцалі даць падтрымку нацыянальным арганізацыям у змаганьні за вызваленьне з-пад камуністычнага панаваньня. Але пасьля выбараў усе хутка забываліся пра абяцаньні. Палітыку праводзілі па-ранейшаму.

Разважаючы над такою палітычнаю зьяваю, Мерляк прыйшоў да высновы, што неабходна ўвайсьці ў сыстэму, каб мець нейкі уплыў, прынамсі ў засягу мясцовае адміністрацыі. Каб запазнаць, якія існуюць магчымасьці, К.Мерляк пастанавіў у гэтым пераканацца.

NELSON A. ROCKEFELLER

November 13, 1970

Dear Mr. Mierlak:

Now that the results of the election are confirmed, I want to thank you very much for your help as a member of the Byelorussian Division of Friends of the Rockefeller Team. I am delighted and gratified, as I am sure you are, by the success of our campaign effort.

With much appreciation of your effective assistance, and with best wishes,

Sincerely,

Nelson A. Rockefeller

Mr. C. Mierlak
85-30 Lefferts Boulevard
Kew Gardens, New York 11415

У пачатку 1971 году Мерляк быў прыняты ў сябры ў Рычмонд Гільскі рэпубліканскі клюб, які быў важным палітычным дзейнікам у раёне (county) Квінс. Старшыня клюбу Вільфэрэд Дальтон зьвярнуў увагу на грамадзкае дасьведчаньне й ініцыятыву ў дзейнасьці й запрапанаваў К.Мерляку быць кандыдатам на сябру ўправы рэспубліканскага камітэту раёну Квінс. Кіраўніцтва, як і дэлегаты на канвэнцыі партыяў, выбіраліся на «пярвічных выбарах», якія адбываліся перад выбарамі кандыдатаў на прэзыдэнта, губэрнатара, штатных дэпутатаў ды сяброў гарадзкіх радаў.

На кадэнцыю 2 гадоў К.Мерляк быў выбраны сябрам камітэту Рэспубліканскай партыі на раён Квінс у красавіку 1972 году. Другі раз быў перавыбраным на кадэнцыю 1974-1976 годы.

Чатырохгадовае сяброўства ў камітэце рэспубліканскае партыі дало нагоду прыглядзецца як унутры партыйнай сыстэмы выстаўляюцца кандыдаты на становішчы ў самой партыі, у гарадзкія рады, у штатны сэнат або асамблею ці на кангрэсмэна ў Вашынгтоне. У камітэце К.Мерляк быў адказным за парадак на паседжаньнях і сходах (Captain d'Arms). Каб быць выдвінутым у кандыдаты на якоенебудзь выбарчае становішча было вельмі цяжка. Кандыдат мусіў мець моцную надзею, што ён будзе выбраны. Каб надзею здабыць, трэба быць папулярным, а каб быць папулярным, трэба ўсюды бываць: на паседжаньнях, на мітынгах, на дэманстрацыях, браць дзе толькі магчыма ўдзел і ўсюды быць шчодрым—даваць грошы на цэрквы, клюбы, арганізацыі, асабліва на партыйныя праекты. Каб гэта ўсё рабіць, патрэбна шмат часу, а яшчэ больш грошаў. Да гэтага трэба ўсякімі спосабамі, а найбольш грашыма, перамагчы ўнутры партыйную канкурэнцыю. Новапрыбыўшаму амэрыканцу практычна гэта не было дасягальным.

Зь пераездам у Маямі «партыйная» дзейнасьць К.Мерляка спынілася да павароту назад у Нью Ёрк у 1978 годзе.

Пачынаючы яшчэ ў 1969 годзе, кіраўніцтва рэспубліканскай партыі ўзялося за арганізацыю этнічных групаў. Каб у выбарах людзі галасавалі за рэспубліканскіх кандыдатаў была створана раней рада рэспубліканскіх нацыянальных групаў, якая актыўна праводзіла арганізацыйную дзейнасьць. Да гэтай Рады належалі 38 групаў, уключаючы Беларуска-Амэрыканскую Рэспубліканскую Фэдэрацыю, якая аб'ядноўвала 10 беларускіх рэспубліканскіх клюбаў у розных штатах Амэрыкі.

CANISIUS COLLEGE
BUFFALO 8, N. Y.

December 29, 1961

1/2/62

Mr. Constant Mierlak
President
197 Roebling Street
Brooklyn 11, New York

Dear Mr. Mierlak:

I am in receipt of a copy of the fine letter which you sent to all Heads of Missions to the United Nations, calling for a full scale investigation of the Russian Communist aggression against the non-Russian nations of the U.S.S.R. and requesting free elections under United Nations supervision in all those Russian occupied countries. You are to be congratulated for this timely and realistic effort to save the United Nations from collapse, which it will do if it continues along the present road of blind unrealities in dealing with the Russians.

I urge you to send copies of this letter to all the leading members of the House of Representatives of the United States, with a short covering letter explaining that you do so in the hope that they will assit this effort by supporting the proposal of Congressman Daniel Flood to establish a Committee on the Captive Nations in Congress. Such a Committee is necessary to expose the truth about Colonialism and Imperialism under the Russian communista, because the record shows the United Nations has been unable or reluctant to do it. A reading of the new Khrushchev, so-called "Workers Manifesto", underscores the importance of the United States taking the initiative to expose and condemn the last remaining colonial empire on earth - The Russian Communist Empire.

Again my congratulations for the initiative you have taken for the Captive Nations and to save the United Nations from pending disaster.

Best wishes for the New Year.

Sincerely,

Edward M. O'Connor

Edward M. O'Connor

# New York Committee to Re-elect the President, Inc.

The Hotel Roosevelt, Madison Avenue at Forty Fifth Street, New York, N.Y. 10017 212-725-7000

**Cornelia A. Netter,**
Director, Nationalities and Older Americans Division

November 4, 1972

Mr. Constant Mierlak
85-30 Lefferts Boulevard
Kew Gardens, NY 11415

Dear Mr. Mierlak:

During these last hectic days of the campaign. I want to take a moment to express my appreciation to you for your help and assistance on behalf of the President's candidacy. The large measure of support for the President among the ethnic community of New York State is due in no small measure to your efforts.

After the polls close, please join us in the Grand Ballroom of the Hotel Roosevelt to wait for the election returns. I look forward to seeing you then.

With warmest best wishes,

Sincerely,

Cornelia Ann Netter

CAN:MYM
ENCLOSURES

THE
NATIONAL
REPUBLICAN
CONGRESSIONAL
COMMITTEE

by unanimous vote hereby awards the

# *1983 Certificate of Recognition*

**Mr. Constant Mierlak**
**of**
**Queens, New York**

in grateful appreciation
for your invaluable support
in electing Republicans to the United States Congress.

Congressman Robert Michel
Republican Leader
U.S. House of Representatives

Congressman Guy Vander Jagt
Chairman, National Republican
Congressional Committee

Арганізатарам Беларускіх рэспубліканскіх клюбаў ад самага пачатку быў др.Вітаўт Кіпель, які займаў становішча старшыні фэдэрацыі да верасьня 1982 году. На яго месца быў выбраны інж. Васіль Мельяновіч.

К.Мерляк, прыехаўшы з Маямі, рэарганізаваў раней зарганізаваны Беларускі рэспубліканскі клюб на район Квінс, Нью Ёрк, ўлучыў яго ў фэдэрацыю.

Асноўная дзейнасьць у клюбах праяўлялася кожныя 4 гады падчас прэзыдэнцкіх выбараў, а ў міжчасе актыўнасьць была абмежавана да палагоджаньняў розных беларускіх справа ў перад уладамі. На працягу 70-х і 80-х гадоў беларусы праз сваю фэдэрацыю ў рэспубліканскай радзе нацыянальнасьцей мелі доступ да ўрадавых чыньнікаў, а галоўнае да Белага Дому.

Беларускія рэспубліканскія клюбы праявілі асаблівую актыўнасьць у выбарах на Прэзыдэнта ЗША Рональда Рэйгана й віцэ-прэзыдэнта Джорджа Буша у 1980 годзе.

Да перавыбараў Рэйгана й Буша ў 1984 годзе рэспубліканцы пачалі загадзя выбарчую падрыхтоўку. У травені 1984 году ў Вашынгтоне адбыўся зьезд рады рэспубліканскіх нацыянальных групаў, у якім актыўны ўдзел узяла Беларуска-Амэрыканская Рэспубліканская Фэдэрацыя.

Дэлегатамі на гэты зьезд былі: Я.Раковіч, К. Мерляк, В.Мельяновіч, а заступнікамі Р.Станкевіч, Д.Мельяновіч. Зьезд адбыўся 18, 19, 20 травеня ў гатэлі «Марыёт», Вашынгтон, зь вялікай праграмай, якая складалася з прэсавай канфэрэнцыі, балю свабоды й прыняцьцём у Белым Доме 20 травеня. Беларускую фэдэрацыю ў Белым Доме рэпрэзэнтаваў К.Мерляк, дзе ён меў нагоду, пасьля прыняцьця, спаткацца з Прэзыдэнтам Злучаных Штатаў Амэрыкі Р. Рэйганам і спадарыняй Н. Рэйган.

У перавыбарчай кампаніі Рэйгана—Буша К.Мерляк ўзяў удзел у арганізацыі беларускага актыву ў выбарах. Ён здоліў зарэгістраваць у рэспубліканскай выбарчай кватэры ў Вашынгтоне больш за 600 беларускіх актыўных рэспубліканцаў.

У выбарах на Прэзыдэнта ЗША Джоржа Буша й віцэ-прэзыдэнта К.Куэйла ў 1988 годзе К.Мерляк належаў да Дарадчае рады нацыянальнасьцей, якая была паклікана галоўнай выбарчай кватэрай у Вашынгтоне.

# — REPUBLICANS —

**VOTE PRIMARY - ELECTION DAY**

**TUESDAY, APRIL 6th, POLLS OPEN 6 AM - 9PM**

VOTE FOR

**Wilfred Dalton — State Committeeman**

**Mary G. Ryan — State Committeewoman**

Anthony J. Lenti — County Committee 82 E.D.

Constant Mierlak — County Committee 82 E.D

YOU VOTE AT

**Library - Lefferts Boulevard & Hillside Avenue**

ABOVE ENDORSED BY

**RICHMOND HILL REPUBLICAN CLUB**

**QUEENS CONSERVATIVE REPUBLICAN ASSOCIATION**

YOU CAN TAKE THIS CARD INTO THE VOTING BOOTH

---

NATIONAL REPUBLICAN CONGRESSIONAL COMMITTEE

# *Official Republican Certificate of Appreciation*

WHEREAS, the National Republican Congressional Committee's GOP Victory Fund is the official Party organization charged with the election of Republicans to the U.S. House of Representatives;

WHEREAS, the votes cast by Republican members of the House have played a key role in the success achieved by President Reagan in rebuilding our economy and our national defenses;

WHEREAS, the recipient below named of this Certificate has made a financial commitment to the GOP Victory Fund;

THEREFORE, BE IT KNOWN BY THESE PRESENTS THAT

## MR. CONSTANT MIERLAK

is officially recognized with this Certificate as a Contributor to the GOP Victory Fund.

Certified this 7th day of July
Nineteen hundred and eighty-six

Ronald Reagan
President Reagan
President of the United States

Guy Vander Jagt
Rep. Guy Vander Jagt
Chairman, NRCC




*Травень 1984 году, прамова К. Мерляка ў Белым Доме*

# NANCY REAGAN

November 16, 1987

Mr. Constant Mierlak
14624 27th Avenue
Queens, NY 11354

Dear Mr. Mierlak:

As the season nears when we reflect on all for which we have to be thankful, my thoughts turn to you and the special friendship you have shown Ronnie and me.

On an even more personal note, words cannot fully express my heartfelt gratitude for your prayers and good wishes during my recent hospital stay. I will always remember the many expressions of kindness which have been such a great comfort.

The President and I also deeply appreciate the generous help you continue to give to Chairman Fahrenkopf and the Republican National Committee. Knowing we have the support of dedicated friends like you helped us to weather some difficult times this past year, and has strengthened my husband's resolve to carry out the programs which will ensure a secure future for all Americans.

I hope this coming season of hope and renewal finds you and your loved ones enjoying the blessings of peace and prosperity we all cherish. May God bless you and your loved ones in the days ahead.

Sincerely,

Nancy Reagan

Nancy Reagan

Ronald Reagan

President of the United States

hereby presents this

Certificate of Appreciation

to

**MR. CONSTANT MIERLAK**

in recognition of the

generous support given to the

Republican National Committee

and the

1988 Presidential Campaign

this 23rd day of June, 1988.

Ronald Reagan

Ronald Reagan

President of the United States

GEORGE BUSH

September 1, 1988

Mr. Constant Mierlak
146-24 27th Avenue
Flushing, New York 11354

Dear Constant,

I am honored and delighted that you have accepted my invitation to serve as a Byelorussian American leader of the Bush-Quayle '88 Coalition of American Nationalities. It means a great deal to Barbara and me to have your active support in my bid for the Presidency.

The pride we all have in our heritage is indeed the strength of the American character. It makes us rejoice in the diversity of our country's roots and celebrate the great things that America and her people stand for. Our dedication to the values of freedom, faith and family is the great contribution to our national fabric that comes from those roots and traditions.

With the support and commitment of leaders of your caliber, I am confident I will reach America's voters this fall with my message. Together, we will reaffirm for the future the values we all hold so precious.

Sincerely,

George Bush

George Bush

733 15TH STREET N.W. SUITE 800 WASHINGTON, D.C. 20005 (202) 842-1988
PAID FOR BY GEORGE BUSH FOR PRESIDENT

GEORGE BUSH

March 23, 1989

Dear Mr. Mierlak:

Barbara and I will always remember this past January 20th as a day to treasure in our hearts.

As we participated in the Inaugural ceremonies at the Capitol and greeted the thousands of men, women and children lining our way to the White House, some of our fondest thoughts were of you and the many other friends who helped us throughout this long and eventful journey.

My days of work in this great office have begun in earnest. However, before any more time passes, I especially wanted you to know how thankful I am for your friendship and support.

In the days ahead, as the challenges grow, I hope I may continue to count on you to work with us for that greatest of all goals: good government for all Americans.

Again, you have my deepest thanks for all you have done for us.

With best wishes,

Mr. Constant Mierlak
14624 27th Avenue
Queens, NY 11354

# Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне ў Нью Ерку

Акруговая ўправа Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Амэрыцы, адзін з найбольшых аддзелаў, дзеяў да агульнага сходу, які адбыўся 14 чэрвеня 1964 году. Др.Ст.Станкевіч, старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА, бачучы, што ягоная групоўка знаходзіцца ў меншыні, забраў сваіх прыхільнікаў і пакінуў сход. На 27 чэрвеня яны склікалі свой сход і стварылі другі аддзел БАЗА ў Нью Ёрку. Такім чынам, у Нью Ёрку да 18 верасьня 1965 году дзеялі два аддзелы БАЗА. Ад гэтае даты арыгінальны аддзел БАЗА мусіў зьмяніць назоў на Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне ў Нью Ёрку, а гэтым самым поўнасьцю адсэпаравацца ад БАЗА.

Першыя тры гады Аб'еднаньне знаходзілася ў царкоўным будынку БАПЦ у Брукліне. Галоўная Ўправа й аддзел БАЗА зрабілі сваю сядзібу ў фундацыі імя Крэчэўскага ў Квінсе.

У кастрычніку 1968 году Аб'еднаньне з прыходам сьв.Кірылы Тураўскага пакінула царкву, залю й канцылярыю пры 401 Атлянтык Авэню ў Брукліне. Ад гэтага часу дзейнасьць Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня спалучалася з рэлігійнаю дзейнасьцю прыходу сьв. Кірылы Тураўскага пры 104-29 Атлянтык Авэню, Рычмонд Гіл, Нью Ёрк.

Аб'еднаньне разам з прыходам праводзіла штодзённую грамадзка-нацыянальную працу на працягу 25 гадоў.

Да гэтага часу палітычная дзейнасьць у Амэрыцы праводзілася такімі грамадзкімі арганізацыямі як: Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, пад уплывам і практычным кіраўніцтвам групоўкі ў Радзе БНР, і Беларускім Кангрэсавым камітэтам, таксама БАПЦ, якая была пад уплывам крывічоў, а рада Беларускай Праваслаўнай Царквы пад апекаю Экзарха Канстантынопальскага Патрыярха пад уплывам зарубежнікаў.

Пры зьмене палітыкі ў Амэрыцы і ў Эўропе з «вызваленьня» на «суіснаваньне» вольнага сьвету з савецка-камуністычным блёкам стала зразумелым беларускім прафэсыянальным і хадэцкім дзеячам, што няма хуткага павароту на Бацькаўшчыну. Яны пачалі прыстасоўвацца да жыцьця, пераносячы свае ўплывы й кіраўніцтва грамадзкіх арганізацыяў і на праваслаўныя прыходы (каталіцкіх не было).

Старшыня Аб'еднаньня К.Мерляк і старшыня прыходу Я.Казьлякоўскі са сваімі сябрамі абедзьвюх управаў, бачачы зьмены ў палітыцы, пастанавілі не прэтэндаваць на вонкавую палітычную рэпрэзэнтацыю беларускага грамадзтва, пакідаючы гэта дзьвюм вялікім БАЗА і БККА, а заняцца нацыянальна-грамадзкай дзейнасьцю ў сваім асяродку. Пры гэтым старацца ўплываць ды дапамагаць знайсьці агульны шлях, на якім канкурэнцыйныя два бакі пачалі-б супрацоўнічаць і будаваць беларуска-нацыянальнае жыцьцё ў Амэрыцы, а гэтым самым устрымаць хуткую асыміляцыю маладога пакаленьня. Моладзь, гледзячы на грызьню сваіх бацькоў, адыходзіла ад старэйшага грамадзтва ў чужое асяродзьдзе, дзе забывала пра сваю мову й свае традыцыі. Лёс чалавека й народу ёсьць непрадбачаны й пераважна капрызны.

49-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Актам 25 Сакавіка былі адзначаныя Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньнем 18 сакавіка 1967 году у гатэлі «Білтмор» у Нью Ёрку. Беларускі Кангрэсавы Камітэт супольна зь Беларуска-Амэрыканскім Аб'еднаньнем адзначылі 49-я ўгодкі незалежнасьці Беларусі 2 красавіка 1967 году ў гэтым-жа самым гатэлі.

Малітву ў Амэрыканскім сэнаце чытаў Уладыка Васіль 23 сакавіка. Айцец М.Лапіцкі ад Праваслаўнай Царквы чытаў малітву ў Палаце рэпрэзэнтантаў. Вось гэта адзін з прыкладаў капрызнасьці лёсу—падвойная затрата энэргіі, грошаў і часу ды падвойнае паніжэньне годнасьці й пашаны да беларусаў.

WHITHERUTHENIAN (BYELORUSSIAN) CONGRESS COMMITTEE OF AMERICA
250 EAST 4th STREET, NEW YORK, N. Y. 10009

BYELORUSSIAN-AMERICAN UNION OF NEW YORK
401 ATLANTIC AVE., B'KLYN, N. Y. 11217

HAVE THE HONOR TO REQUEST YOUR PRESENCE AT A COMMEMORATIVE PROGRAM
OBSERVING THE

48th ANNIVERSARY OF BYELORUSSIAN INDEPENDENCE DAY

TO BE HELD AT THE
HOTEL ASTOR (Trianon Room)
TIMES SQUARE, NEW YORK, N. Y. 10036

SUNDAY MARCH 20th 1966 – 2:00 P. M.

Preceeding the program services will be held at 10:00 A. M. at the
BYELORUSSIAN ORTHODOX CHURCH, 187 Whitehead Avenue, South River, N. J.
BYELORUSSIAN AUTOCEPHALIC ORTHODOX CHURCH, 401 Atlantic Avenue, Brooklyn, N. Y.

UNITED BYELORUSSIAN-AMERICAN
COMMEMORATIVE COMMITTEE

*Запросіны на сьвяткаваньне 49-х угодкаў 25 Сакавіка.*

WESTERN UNION

TELEGRAM

W. P. MARSHALL

1966 MAR 18 PM 5 50

SIB125 (46)(44)CTB375

WG246 WW BXA110 GOVT PD BX WASHINGTON DC 18 532P EST

UNITED BYELORUSSIAN AMERICAN COMMEMORATIVE COMMITTEE

CARE ASTOR HOTEL TIMES SQUARE NYK

MY COMMENDATION TO YOUR ORGANIZATION FOR ITS PERSISTENT STRUGGLE ON BEHALF OF THE PEOPLE OF BYELORUSSIA. MAY YOUR EFFORTS BE REWARDED WITH THE DEVELOPMENT OF A FREE AND INDEPENDENT BYELORUSSIA SO THAT IT MAY TAKE ITS RIGHTFUL PLACE AMONG THE FAMILY OF NATIONS.

EDWARDS J DERWISNKI MEMBER OF CONGRESS

(38).

Залатую гадавіну, 50 ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці БНР былі ўрачыста адзначаныя ў залі Грэцкага катэдральнага сабору ў Нью Ёрку.

Сьвяткаваньне ладзілі супольна Беларускі Кангрэсовы Камітэт і Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне.

BYELORUSSIAN CONGRESS
COMMITTEE OF AMERICA
85-26 125TH STREET
QUEENS, N. Y. 11415

BYELORUSSIAN-AMERICAN
UNION OF NEW YORK
401 ATLANTIC AVENUE
BROOKLYN, N. Y. 11217

HAVE THE HONOR TO REQUEST YOUR PRESENCE AT A COMMEMORATIVE PROGRAM
OBSERVING THE

**50th ANNIVERSARY OF BYELORUSSIAN INDEPENDENCE DAY**

TO BE HELD AT THE
GREEK CATHEDRAL HALL
319 EAST 74TH STREET, NEW YORK CITY

**SUNDAY, MARCH 24th, 1968 — 3:00 P. M.**

PRECEEDING THE PROGRAM, SERVICES WILL BE HELD AT 2:00 P. M.
at the GREEK CATHEDRAL OF NEW YORK, 319 EAST 74th STREET

UNITED BYELORUSSIAN-AMERICAN
COMMEMORATIVE COMMITTEE



*Прысутныя на акадэміі 50-х угодкаў абвешаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі Актам 25 Сакавіка, ладжанай 24 сакавіка 1968 г. у залі Грэцкага катэдральнага сабору ў Нью Ёрку.*

Урачыстую акадэмію адкрыў А.Плескачэўскі, рэфэраты чыталі К.Мерляк па-ангельску, а а.С.Коўш па-беларуску. Наступна былі прывітаньні прысутных прадстаўнікоў нацыянальных арганізацыяў і амэрыканскага грамадзтва.

Напярэдадні 50-х угодкаў сьвяткавальным камітэтам быў прыгатаваны мэмарандум да ўрадавых чыньнікаў Амэрыкі, які на прапанову кангрэсмэна Гэльстоскі быў надрукаваны ў «Конгрэшёнал Рэкорд» 25 сакавіка.

51 і 52 угодкі незалежнасьці Беларусі былі арганізаваныя сьвяткавальным камітэтам у залі Грэцкага катэдральнага сабору ў Нью Ёрку 30 сакавіка 1970 году. З гэтай нагоды быў адслужаны малебен за Беларусь у новаарганізаваным прыходзе сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл у Нью Ёрку ў 51 угодкі 25 Сакавіка 1969 году.

Прабег абедзьвюх акадэміяў прайшоў паводля традыцыйнага парадку: першай кіраваў М. Бахар, а другою К.Мерляк. Рэфэраты ў ангельскай мове чыталі М.Палюховіч і Ганна Зыбайла, па-беларуску — К.Мерляк і А.Даніловіч. Пасьля былі прывітаньні й чытаньне праклямацыяў. У мастацкай частцы выступаў хор «Каліна» з Саўт Рывэру. Акадэмія скончылася благаславенствам мітрапаліта Германоса й беларускім нацыянальным гімнам.

Аб'еднаньне й прыход сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл першы раз узялі ўдзел у працах зьезду Беларускага Кангрэсовага Камітэту Амэрыкі 29 лістапада 1969 году ў Саўт Рывэры. На зьездзе зрабіў справаздачу зь дзейнасьці старшыня І.Касяк. Ягоная прамова была прынятая воплескамі.

Выбраны новы камітэт: на старшыню перавыбраны І.Касяк і тры заступнікі, адзін зь іх быў К.Мерляк (4 кадэнцыя).

25-годзьдзе Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, які адбыўся 27 чэрвеня 1944 году ў Менску, было адзначанае 31 жніўня 1969 году ў рэсорце Бэлэр-Менск у Глен Спэй, штат Нью Ёрк.

Арганізатарамі адзначэньня дваццаць пятых ўгодкаў Другога Ўсебеларускага Кангрэсу былі Беларускі Кангрэсовы Камітэт і Беларускае Нацыянальнае А'беднаньне ў Канадзе. Праграма складалася з Богаслужбы, агульнага паседжаньня, супольнага абеду й канцэрту.



*Прэзыдыюм сходу з нагоды 25-годзьдзя Другога Ўсебеларускага Кангрэсу, 31 жніўня 1968 году. Глен Спэй, Нью Ёрк.*

*Зьлева направа: Леанід Галяк, Іван Ярмачэнка, Вітаўт Кіпель, Іван Касяк, Кастусь Мерляк.*

У нядзелю, 22 лістапада 1970 году Згуртаваньне Беларуска - Амэрыканскіх Вэтэранаў, аддзел Нью Ёрк, урачыста адзначылі 50-ўгодкі Слуцкага паўстаньня. Сьвяткаваньне пачалося сумнай, але ўрачыстай паніхідай за палеглых у змаганьні за незалежнасьць Беларусі. Зараз-жа пасьля паніхіды ў парафіяльнай залі адбылася акадэмія, якую вёў К.Мерляк. Др.Вітаўт Кіпель прачытаў даклад аб Слуцкім паўстаньні. У.Пелеса й В.Юрцэвіч зрабілі пераклічку палеглых. Сястрыцтва прыходу зладзіла пачастунак вэтэранам і ўсім прысутным.



*50 угодкі Слуцкага паўстаньня, 22 лістапада 1970 году ў Нью Ёрку.*

Сьвяткаваньне 53 і 54 угодкаў 25 сакавіка былі арганізаваныя сьвяткавальным камітэтам і Беларуска-Амэрыканскім Аб'еднаньнем 28 сакавіка 1971 году й 19 сакавіка 1972 году.

Угодкі распачыналіся Богаслужбамі ў абедзьвюх цэрквах, а пасьля адбываліся ўрачыстыя акадэміі ў залі Грэцкага катэдральнага сабору ў Нью Ёрку з рэфэратамі, прывітаньнямі й канцэртам.

Адзначэньне 55 угодкаў Дня незалежнасьці Беларусі было апошняй імпрэзай, ладжанай супольна сьвяткавальным камітэтам БККА і Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня. Наступныя ўгодкі былі адзначаныя асобна. Кангрэсовы Камітэт адзначаў іх у новай залі Беларускага грамадзкага цэнтру ў Саўт Рывэры, штат Нью Джэрсі.

55 угодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі былі ладжаныя 1 красавіка 1973 году ў залі Беларускага грамадзкага цэнтру ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк праз Беларуска-Амэрыканскае Аб' еднаньне Нью Ёрку.

Сьвяткаваньне 55 угодкаў незалежнасьці Беларусі распачалося 22 сакавіка 1973 году малітваю а. Сьвятаслава Каўша, настаяцеля прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, у Амэрыканскім кангрэсе ў Вашынгтоне.



*Беларуская дэлегацыя ў Капітолі—Вашынгтон.*

*Справа налева: кангрэсмэн Джозэф П.Аддаббо, а.Сьвятаслаў Коўш, а.Эдуард Т.Латч, капэлян Кангрэсу ЗША і сп. Кастусь Мерляк, старшыня Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня.*

Гэта былі першыя ўгодкі, адсьвяткаваныя ў сваёй царкве сьв. Кірылы Тураўскага й у сваёй залі Беларускага грамадзкага цэнтру. На сьвяткаваньні ўпершыню быў прысутны рэдактар газэты «Беларус» др. Станіслаў Станкевіч, які спыніў байкот дзейнасьці Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня, памяшчаючы сваю карэспандэнцыю з прабегу ўрачыстасьцей, якую поўнасьцю падаём з газэты «Беларус» № 192, красавік 1973 году.

«Сакавіковыя ўгодкі ў Беларуска-Амэрыканскім Аб'еднаньні.

Беларусы, згуртаваныя ў Беларуска-Амэрыканскім Аб'еднаньні ў Нью Ёрку ўрачыста адзначалі 55-я ўгодкі абвешчаньня дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі ў нядзелю 1-га красавіка. Нараніцы адбылася ў новазбудаванай праваслаўнай царкве сьв.Кірылы Тураўскага пры 104-29 Атлянтык Авэню на Рычмонд Гіл ў Нью Ёрку ўрачыстая Божая слубжа й малебен за беларускі народ, якія адправіў пратапрасьвіцер а.М.Лапіцкі ў суслужэньні настаяцеля гэтае царквы а.С.Каўша й пратадыякана А.Махнюка. Глыбока патрыятычную казань сказаў а.С. Коўш.

Да Богаслужбаў прыгожа пяяў царкоўны хор пад кіраўніцтвам С.Жамойды . Адразу пасьля Богаслужбаў у залі пад царквой адбыўся ўрачыста сьвяткавальны сход, спалучаны зь бяседай за багата застаўленымі сталамі. Хор беларускіх вэтэранаў у Саўт Рывэры пад кіраўніцтвам Ю.Рымка прапяяў амэрыканскі гімн, а а.С.Коўш сказаў малітву, якую 22 сакавіка меў ён у Палаце рэпэзэнтантаў Кангрэсу ЗША ў Вашынгтоне.

Афіцыйны сход адчыніў кароткім уступным словам старшыня Беларуска—Амэрыканскага Аб'еднаньня ў Нью Ёрку Канстанцін Мерляк і, прывітаўшы ўдзельнікаў сьвяткаваньня й гасьцей, прачытаў прывітальны ліст сэнатара зь Нью Джэрсі Г.А. Вільямса ды ўрыўкі зь некаторых прамоваў у кангрэсе сэнатараў і кангрэсмэнаў з нагоды беларускага нацыянальнага сьвята.

Гістарычны даклад на тэму дня прачытаў сп. Васіль Шчэцька. Пасьля гэтага выступілі з прывітальнымі прамовамі ў ангельскай мове рэдактар Вільям Плюм і старшыня амэрыканскіх прыяцеляў АБН Др. Дочэў. У гарачых словах вітаў прысутных старшыня Вярхоўнага Казацкага Прадстаўніцтва др.В.Глазкоў, старшыня Беларускага Кангрэсавага Камітэту І.Касяк, а так-жа прысутны на сьвяткаваньні

др.Ст.Станкевіч. Далей старшыня сьвяткаваньня К.Мерляк прачытаў пісьмовыя прывітаньні й праклямацыю губэрнатара штату Нью Ёрк Н.Ракфэлера пра абвешчаньне Дня 25 сакавіка 1973 году Беларускім днём.

Наапошку згаданы вэтэранскі хор прапяяў колькі беларускіх жаўнерскіх і народных песьняў, а малады Даніла Мерляк бойка прадэклямаваў верш Я.Купалы «На Сход!» Урачыстасьць закончылася беларускім нацыянальным гімнам.



*У час акадэміі ў гонар 55-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР, 1 красавіка 1973 году, Рычмонд, Гіл, Нью Ёрк.*

*На пачатку стала зьлева: др.В.Глазкоў, др.Станіслаў Станкевіч.*

*Справа: інжынер Эмануэль Янюк і інжынер Іван Касяк.*

2 сьнежня 1973 году адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 53-х угодкаў Слуцкага паўстаньня ў Беларускім грамадзкім цэнтры ў Рычмонд Гіл, ладжанае Нью Ёркскім аддзелам Беларуска-Амэрыканскіх Вэтэранаў. Пасьля сьв. літургіі й паніхіды, адбылася акадэмія й жаўнерскі пачастунак.



*Ганаровая варта са сьцягамі падчас паніхіды за палеглых за волю Беларусі ў царкве сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, 2 сьнежня 1973 году.*

Беларуска-Амэрыканскае Аб'яднаньне ў Нью Ёрку з прыходам сьв.Кірылы Тураўскага й Згуртаваньнем Беларуска-Амэрыканскіх Вэтэранаў праводзіла супольную сталую грамадзкую працу. Кожны год адзначаліся ўгодкі 25 Сакавіка й Слуцкага паўстаньня, але калі старшыня Аб'еднаньня пражываў у Маямі адзначэньне ўгодкаў Дня незалежнасьці Беларусі й Слуцкага паўстаньня (1977 і 1978) пасьпяхова арганізаваў сакратар Аб'еднаньня Васіль Шчэцька. Управа Аб'еднаньня таксама арганізавала іншыя імпрэзы: спатканьне Новага году, рэфэраты й прынагодныя сустрэчы.

З нагоды 58-х угодкаў 25 Сакавіка Аб'еднаньне выслала прывітаньне для ўсіх беларускіх арганізацыяў і для некаторых асобаў наступнага зьместу:

Byelorussian-American Union
25 Сакавіка 1976 г.
Дарагія Суродзічы!

«Ад імя Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня Нью Ёрку вітаем Вас з 59-м годам слаўнага юбілею абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі й жадаем вытрымаласьці ды далейшых посьпехаў у працы для зьдзяйсьненьня Беларускага дзяржаўнага ідэалу.

Адзначаючы ў гэтым годзе адначасна 200-годзьдзе Амэрыканскае дзяржаўнасьці, мы, сябры Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня Нью Ёрку, лічым неабходным з нагоды падвойнага юбілею зьвярнуцца з заклікам да беларускіх грамадзка-рэлігійных арганізацыяў і ўстановаў, а таксама й да паасобных грамадзянаў з заклікам—пачаць працаваць у кірунку аб'еднаньня ўсіх беларускіх сілаў на эміграцыі, каб змабілізаваць духовыя й матарыяльныя беларускія рэсурсы для забесьпячэньня, прынамсі яшчэ на адно пакаленьне разьвіцьця беларускае культуры й ідэі вызваленьня Беларусі ў вольным сьвеце, што моцна падмацавала-б іх і падтрымала-б незалежніцкі рух на Бацькаўшчыне.

Мы ўважаем, што на парозе адыходу ад нас сьведамае беларускае эміграцыі з часоў другое сусьветнае вайны, усе вывезеныя імі,старыя неактуальныя ідэалёгіі, мэтады дзеяньня, памылковыя арыентацыі на чужыя дапамогі, прэтэнзіі на рэпрэзэнтацыю беларусаў дзяржаўнасьці на эміграцыі й міжгруповыя змаганьні пара адкінуць на бок ды стаць на шлях пашаны беларуса беларусам, каб гэтай дарогай дайсьці да Аб'еднаньня ў імя інтарэсаў усяго беларускага народу, а не адной якой-небудзь групоўкі або партыі.

30-ці гадовая дзейнасьць беларускае эміграцыі прынесла нямалыя дасягненьні, хаця яны маглі-б быць шмат большымі, якія павінны быць захаваныя на будучыню, але гэта ня станецца, калі адыходзячае пакаленьне гэтага не забясьпечыць. Існаваньне нашае нацыі вымагае працаваць у кірунку ўпарадкаваньня арганізацыйных і грамадзка-палітычных справаў так, каб нашыя спадкаёмцы змаглі справіцца з

узложанай на іх місіяй ня толькі забясьпечыць здабытыя дасягненьні, каб яны не папалі ў рукі ворагаў Беларусі, але каб яны мелі магчымасьці іх пашыраць у краінах іхняга пражываньня.

Мы верым, што беларускі народ, аб'яднаўшы ўсе свае сілы, будзе вытрывала змагацца аж да поўнага вызваленьня з-пад акупацыі Савецкае Расеі й прыложыць усе сілы да адбудовы вольнае й незалежнае Беларускае Дзяржавы.

Жыве Беларусь!»

В.Шчэцька — К.Мерляк
Сакратар — Старшыня

21 красавіка 1976 году К.Мерляк, старшыня Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня ў Нью Ёрку, выслаў ліст да старшыні УІІІ кангрэсу Беларусаў Амэрыкі з прапановай разгледзіць рад важных і актуальных пытаньняў грамадзкага жыцьця ў Амэрыцы:

Byelorussian-American Union

21 красавіка 1976 г.

Старшыні Восьмага кангрэсу Беларусоў Амэрыкі
ў Саўт Рывэры, Н.Дж.

Вельмі паважаны спадар старшыня:

Ветліва Вас прашу прывітаць ад мяне прысутных на кангрэсе й прачытаць мае заўвагі дэлегатам кангрэсу, 2 травеня 1976 г., так як мне асабіста не выпадае ўзяць удзел з паважных прычынаў сямейнага характару.

Кіраўніцтвам Камітэту скліканы Восьмы кангрэс на 2-га травеня ў нядзелю, а 1-ай гадзіне дня, што закрывае магчымасьць прыезду дэлегатаў, каб асабіста ўзяць удзел у нарадах, з далейшых асяродкаў як Кліўленд, Чыкага й Таронта, а таксама й другіх бліжэйшых.

Праграма з 10-ці пунктаў да разгляду на парадку дня ні ў якім выпадку ня можа быць належна разгледжана ў паабедным часе ў нядзелю перад працоўным днём на заўтра.

Восьмы кангрэс Беларусаў Амэрыкі павінен на гэты раз глыбока прааналізаваць мінулую дзейнасьць, зрабіць зь яе адпаведныя вывады, прыняць плян дзеяньня на прышласьць ды прыняць адпаведныя рэзалюцыі із сучаснага грамадзка-палітычнага стану нашае эміграцыі, а менавіта:

1. Узяць пад увагу, што нацыянальна сьведамы беларускі актыў зьменшыўся і паступова зьменшываецца далей, пакідаючы за сабою паважныя дасягненьні із палітычнай, рэлігійнай і культурнай дзейнасьці, што зьяўляецца вынікам 30-ці гадовай працы пасьля апошняе вайны.

2. У сувязі з гэтым дэлегаты павінны прыняць такія дзеяньні, каб у часе наступных 4-х гадоў, упарадкаваць грамадзка-палітычныя справы так, каб нашыя спадчынцы змаглі справіцца з узложанай на іх місіяй,—ня толькі забясьпечыць здабытыя дасягненьні, каб яны не папалі ў небеларускія рукі, але каб яны мелі магчымасьць іх пашыраць далей.

Дасягнуць гэтай вялікае мэты адна арганізацыя, адна палітычная група ў адной мясцовасьці ня зможа, калі й надалей асыміляцыя малодшага пакаленьня будзе прадаўжацца ў такім самым тэмпе, як і адыход старэйшага пакаленьня. А дзеля гэтага ёсьць пякучая патрэба шукаць аб'еднаньня існуючых грамадзкіх, рэлігійных, палітычных арганізацыяў і ўстановаў.

а.Пагэтаму новы Кангрэсовы Камітэт, кіруючыся прынятымі рэзалюцыямі (калі гэта будзе зроблена), павінен вясьці вялікую працу, якая будзе вясьці да аб'еднаньня ды давесьці справу да стварэньня агульнага грамадзка-палітычнага беларускага прадстаўніцтва на эміграцыі. У гэтай працы напэўна дапамогуць прыхільнікі й прэтэндэнты на дзяржаўную рэпрэзэнтацыю ў форме Рады БНР і ў форме БЦР, пакідаючы гэтыя ўстановы й іхнія заслугі для гісторыі Беларусі. Толькі актыўная дзейнасьць на эміграцыі беларусаў зможа аказаць помач беларускаму народу вызваліцца з-пад расейскага панаваньня ды аказаць помач у скліканьні Трэцяга Ўсебеларускага Кангрэсу.

б.Новы Кангрэсовы Камітэт павінен моцна працаваць із настаяцелямі й управамі беларускіх праваслаўных прыходаў над стварэньнем Беларускага праваслаўнага япіскапату, які-б узначаліў Беларускую Праваслаўную Царкву на эміграцыі, а гэтым самым было-б заданьнем япіскапату забясьпечыць беларускім сьвятарствам беларускія прыходы на будучыню, ды замацаваць юрыдычна царкоўную маёмасьць за беларускім грамадзтвам.

в.Новы Кангрэсовы Камітэт павінен быць актыўным, трымаць арганізацыйную сувязь з усімі асяродкамі ды выконваць усе бягучыя

справы, каб яны не цягнуліся па 10-15 гадоў, як выданьне па-ангельску «Гісторыі Беларусі».

Дзеля гэтага пажадана, каб у Кангрэсовы Камітэт былі выбраныя людзі, якія разумеюць і бачаць эвалюцыю эміграцыі, разумеюць і бачаць яе грамадзка-палітычныя патрэбы агульна-нацыянальнага значэньня ды здольныя працаваць з усім грамадзтвам.

Жадаю плённай працы й посьпехаў!

Кастусь Мерляк, старшыня

Беларуска-Амэрыканскага Аб'яднаньня ў Нью Ёрку».

На пратэст Аб'яднаньня ды іншых арганізацыяў, кангрэс быў адложаны на 20-га чэрвеня 1976 году.

Безумоўна, кангрэс адбыўся, І.Касяк быў перавыбраны на старшыню з малымі зьменамі сяброў камітэту.

Канфэрэнцыя вольных беларусаў—старшыня др.Барыс Рагуля —разам з прадстаўнікамі сусьветных арганізацыяў: Эстоніі, Летувы, Украіны й Латвіі—злажылі ў 1977 годзе рэзалюцыю з дакумэнтамі генэральнай асамблеі Аб'яднаных Нацыяў адносна дэкалянізацыі Савецкага Саюзу. З гэтай нагоды адбылася ў Нью Ёрку 26 лістапада 1978 году дэманстрацыя й мітынг, прысьвечаны дэкалянізацыі Савецкага Саюзу й абароны людзкіх і нацыянальных правоў у СССР. Для пашырэньня дзейнасьці канфэрэнцыі вольных беларусаў на эміграцыі адбылося ў Нью Ёрку 25 лістапада 1979 году паседжаньне прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў.

## Пратакол

Паседжаньня прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў, якое паклікаў др.Б.Рагуля, старшыня канфэрэнцыі вольных беларусаў на дзень 25 лістапада 1979 году ў Нью Ёрку.

Прысутныя: др. Б.Рагуля, др. В.Кіпель, сп.К.Мерляк, др. Я.Сажыч, сп.А Шукелайц.

Былі рэпрэзэнтаваныя наступныя арганізацыі:

1. Згуртаваньне Беларусаў у Канадзе
2. Беларускі Кангрэсовы Камітэт Амэрыкі
3. Беларуска-Амэрыканскае Аб'яднаньне Нью Ёрку

4. Беларуска-Нацыянальнае Аб'еднаньне ў Канадзе.

5. Задзіночаньне Беларуска-Амэрыканскіх Вэтэранаў.

На парадку дня было адно пытаньне—арганізацыя канфэрэнцыі вольных беларусаў і пашырэньне яе дзейнасьці.

Др.Б.Рагуля коратка зрэфэраваў, як і чаму паўстала канфэрэнцыя вольных беларусаў, што да гэтага часу было зроблена. Гэтая арганізацыя была неабходная, каб беларусы сталі нароўні із сваімі суседзямі, творачы адзін блёк дэкалянізацыі Савецкага Саюзу.

У блёк дэкалянізацыі Савецкага Саюзу ўваходзіць:

The Conference of Free Byelorussians

The Estonian World Council

The Lithuanian World Community

The World Congress of free Ukrainians

The World Federation of Free Latvianas.

1.Пастаноўлена, што з пэўных палітычных меркаваньняў старшыня канфэрэнцыі павінен знаходзіцца ў Канадзе, а выканаўчы заступнік старшыні ў Злучаных Штатах Амэрыкі, ды ўстанавілі два афіцыяльныя адрасы.

2. Дзеячая ўправа канфэрэнцыі вольных беларусаў:

Др.Б.Рагуля—старшыня,

Сп.П Пашкевіч—сакратар,

Др. В.Кіпель—выканаўчы заступнік старшыні,

Сп. А. Шукелайц—заступнік старшыні,

Др. Я.Сажыч—заступнік старшыні,

Сп. К.Мерляк—заступнік старшыні.

Кожная арганізацыя, якая уступіць у канфэрэнцыю мае права мець заступніка старшыні ў канфэрэнцыі.

3.Канфэрэнцыя складаецца зь беларускіх грамадзкіх, культурных, патрыятычных і рэлігійных арганізацыяў у вольным сьвеце, якія стаяць на прынцыпе: свабода чалавеку й дзяржаўная незалежнасьць Беларусі, Эстоніі, Летуве, Украіне й Латвіі.

4.Арганізацыя, жадаючая прылучыцца да канфэрэнцыі вольных беларусаў, павінна зложыць пісьмовую заяву й задэкляраваць гадавую складку ў вышыні свае магчымасьці.

5.Др. В.Кіпель прыгатуе як найхутчэй камунікат да беларускіх арганізацыяў і грамадзтва, падаючы да ведама аб тым, што зроблена й што пастаноўлена на гэтым паседжаньні.

6.Сп. К.Мерляк будзе каардынаваць міжарганізацыйную дзейнасьць. Паседжаньне адложана Sine Die.

К.Мерляк —дзеючы сакратар.

Ньюо Ёрк, ЗША.

25 лістапада 1979 году».

Камісіяй Гэльсінскае канфэрэнцыі Амэрыкі была склікана нарада прадстаўнікоў арганізацыяў у Нью Ёрку 13 травеня 1980 году, якая выпрацавала плян дзеяньня на канфэрэнцыі Эўрапейскай Бясьпекі й супрацоўніцтва (Гэльсінскае пагадненьне) ў Мадрыдзе, Гішпанія. Нарада адбылася пад старшынствам Макс М.Кампэльман, Амэрыканскі амбасадар на канфэрэнцыю ў Мадрыд. У працах гэтае канфэрэнцыі ўзяў удзел К. Мерляк як прадстаўнік Аб'еднаньня.

23 кастрычніка 1980 году адбылася канфэрэнцыя ў Нью Ёрку, скліканая камітэтам дзеля дэкалянізацыі савецка—расейскай імпэрыі з удзелам прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў, пасьля якое быў зложаны мэмарандум (другі раз) адносна дэкалянізацыі Савецкага Саюзу ўсім сябрам 35-е Асамблеі Аб'еднаных Нацыяў у Нью Ёрку.

Сябры Аб'еднаных нацыяў, пад ціскам Крамля, не ўзялі пад ўвагу рэзалюцыі й мэмарандуму й не падтрымалі патрабаваньняў 5-ці рэспублікаў, не жадаючы непрыемнасьцей, якія мог рабіць урад Савецкага Саюзу, і так памалу ўсё заціхла ў Аб'еднаных Нацыях, але не ў БССР. КГБ удзяліла нямала ўвагі гэтаму пытаньню й асобам, якія бралі ўдзел у гэтай справе.

Уступаючы ў дзесяцігодзьдзе 80-х гадоў, неабходна зьвярнуць увагу на падзеі, якія адбываліся ў Амэрыцы й у цэлым сьвеце, асабліва на суадносіны ЗША й Савецкага Саюзу й іхнія ўплывы на міжнародную палітыку.

Прэзыдэнт Злучаных Штатаў Амэрыкі Рычард Ніксан зрэзыгнаваў са становішча Прэзыдэнта ЗША 9 жнівеня 1974 году па поваду «Вотэргайт» скандалу, а яго заступіў, згодна Канстытуцыі, старшыня Палаты рэпрэзэнтантаў Джэральд Форд.

Падчас прэзыдэнцтва Форда Амэрыка ўзяла ўдзел у Гэльсінскай канфэрэнцыі 35-ці дзяржаваў Эўропы, Канады й ЗША. Афіцыяльна гэтую канфэрэнцыю назвалі: Канфэрэнцыя бясьпекі й супрацоўніцтва ў Эўропе. У сапраўднасьці гэта былі хаўтуры, бо падпісалі дакумэнт, які нікога не забавязываў да нічога. Аднак апрабавалі ўсе забраныя

гвалтам землі Саветамі пасьля другое сусьветнае вайны за тое, толькі, каб мець магчымасьці культурнага абмену ды дазвол савецкім грамадзянам на выезд за мяжу.



*Кастусь Мерляк і др. Барыс Рагуля на нарадзе ў Нью Ёрку, 25 лістапада 1979 году.*

Прэзыдэнт Форд пасьля наведаньня Польшчы заявіў, што Польшча зьяўляецца свабоднай дзяржавай. Гэтакае заяўленьне абурыла ня толькі палякаў, але людзей усяго сьвету. Гэта прэзыдэнту Форду дорага абыйшлося, бо ён прайграў выбары на прэзыдэнта, якія выйграў Джымі Картэр, кандыдат ад дэмакратычнай партыі.

Апошнія 4 гады 70-х гадоў пад прэзыдэнтурай Джымі Картэра й яго дэмакратычнай адміністрацыі былі найбольш няўдачныя ў паваеннай гісторыі. Напачатку спатканьне зь Леанідам Брэжневым у Вене й падпісаньне дагавару аб абмежаваньні ядзерных экспэрымэнтаў і моцны пацалунак на разьвітаньне з Прэзыдэнтам ЗША. Сваю шчодрасьць да Амэрыкі й Картэра Брэжнеў пацьвердзіў збройным захопам Афганістану. Картэр пасыўнай дыпляматыяй дапамог вярнуцца з Францыі Аяролу Хомэні ў Іран (адкуль Шах зь сям'ёю выехаў у Эгіпет), за што Хомэні падзякаваў, забіраючы ў залог усіх служачых амэрыканскае амбасады, якую адначасна закрыў. Дэмакратычная

адміністрацыя давяла гаспадарку да таго, што інфляцыя паднялася вышэй 6 працэнтаў, а працэнты з пазычаных грошаў дайшлі да 19 %.

У 1980 годзе Джымі Картэр прайграў выбары на Прэзыдэнта ЗША, а народ выбраў Рональда Рэйгана. У першую чаргу Рэйган дабіваецца звальненьня заложнікаў у Іране. Ён ажыўляе эканомію, спыняе інфляцыю, абніжае працэнты, а галоўнае называе Савецкі Саюз «імпэрыяй зла», што моцна напалохала Л.Брэжнева, які памёр 10-га лістапада 1982 году.

Леаніда Брэжнева заступіў Юры Андропаў, але яму не давялося нічога грандыёзнага збудаваць на славу камунізму й роднае партыі. У лютым 1984 годзе ён таксама памёр. Яго наступнік Канстанцін Чарненка за ніякую працу ня ўзяўся, каля году паблукаўся па калідорах Крамля і памёр 10- га сакавіка 1985 году. Якраз у палавіне 80-х гадоў лейцы ўраду Савецкага Саюзу ўзяў у рукі Міхаіл Гарбачоў і разам з Раісаю пачаў рабіць перастройку камунізму.

Дзейнасьць беларускага асяродка ў Рычмонд Гіл праводзілася памысна. Кожны год адзначаліся ўгодкі 25 Сакавіка й Слуцкага паўстаньня, пра прабег якіх дакладныя весткі (хто служыў у царкве, хто чытаў рэфэрат, хто прыслаў прывітаньні, хто быў гасьцём, як праходзілі сяброўскія абеды-спатканьні) апісваў Васіль Шчэцька.

5 травеня 1985 году беларусы мелі гонар спаткаць ангельскую пісьменьніцу Веру Рыч, якая гаварыла на тэму «Беларуская савецкая літаратура й голокост». Абедьзве тэмы былі на часе: жорсткая русыфікацыя ў Беларусі й угодкі заканчэньня вайны ў 1945 годзе. Гэта яна навязала да кніжкі Джона Лёфтуса, якая прадстаўляла нічога іншага як паклёп на беларускі народ.

70-я ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Беларусі Актам 25 Сакавіка, былі адзначаныя ўрачыста ў Нью Ёрку 20 сакавіка 1988 году. З гэтай нагоды Прэзыдэнт ЗША Рональд Рэйган прыслаў на адрас Аб'еднаньня прывітаньне ўсім беларусам у Амэрыцы. Пра прабег сьвяткаваньня В.Шчэцька пісаў у газэту «Беларус» (№ 346 за красавік 1988 г):

Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне ў Рычмонд Гіл (раён гор. Нью Ёрку) ладзіла сьвяткаваньне ў нядзелю 20 сакавіка ў царкве сьв.Кірылы Тураўскага. Урачыстасьць пачалася Богаслужбай, якую адслужыў а.Усевалад Шамяціла. Хорам кіраваў сп. С. Жамойда. Быў адслужаны таксама малебен за беларускі народ. У ганаровай варце са сьцягамі стаялі сп. П.Зыбайла й сп.К.Мерляк.

У падцаркоўнай залі адбылася акадэмія, якую вёў сп. К.Мерляк, старшыня БАА. Па выкананьні амэрыканскага гімну сп. Мерляк сказаў уступнае слова ды зачытаў 3-ю Устаноўную грамату Рады БНР, якой была абвешчаная незалежнасьць. Тэкст граматы прамоўцы дапоў - ніў вытрымкамі зь «Ліста з-пад шыбеніцы» Кастуся Каліноўскага ў сувязі зь сёлетнімі 150-мі ўгодкамі ад нараджэньня выдатнага рэвалюцыянера. Хвілінай цішы былі ўшанаваныя ўсе, хто загінуў у змаганьні за вольную Беларусь. Сп. Мерляк гаварыў таксама пра 1000-годзьдзе хрысьціянства на Беларусі.

Рэфэрат на тэму дня чытаў др.Вітаўт Кіпель.

—Дасягненьні беларускага руху за апошнія 80 год, —сказаў дакладчык,—даюць сёньняшнім удзельнікам гэтага руху чым ганарыцца. Ад выказанага Янкам Купалам жаданьня «людзьмі звацца», праз гэткія заклікі як Цьвікевічава: «Дзяржаўнасьці не даюць, яе трэба браць!»,— беларускае адраджэньне прыйшло нарэшце да Акту 25 сакавіка, якім Беларусь была замацаваная на палітычнай карце Эўропы.

—70-гадовы шлях дзяржаўнасьці, якім прайшоў беларускі народ,—сказаў др.Кіпель,— сёньня стаўся аб'ектам вывучэньня й крыніцаю натхненьня для новых пакаленьняў беларусаў. Дзякуючы пісьмовай спадчыне, якую пакінулі паваенныя дзяржаўныя дзеячы (Езавітаў,Захарка, Воронка ды іншыя), мы даведваемся праўду пра БНР, мы бачым, што імкненьне беларусаў да незалежнасьці не было ніякай «інтрыгай», як гэта цьвердзілі з аднаго боку расейцы, а з другога палякі, а было спантанічным рухам нашага народу да свае нацыянальнае дэмакратычнае дзяржаўнасьці. Сёньня гэтае змаганьне трывае далей, ужо на новай дарозе й на вышэйшым узроўні. Па рэфэраце сп. Тур прачытаў праклямацыі губэрнатараў штатаў Нью Ёрк і Нью Джэрсі, якімі дзень 25 Сакавіка абвяшчаўся Днём незалежнасьці Беларусі; сп. Мерляк прачытаў пісьмовыя прывітаньні: ад Беларускага Вызвольнага Фронту (сп.Д.Касмовіч), беларусаў Чыкага (В.Рамук), Кліўленду (Я.Раковіч), Аўстраліі (Алехнік), Лёс-Анджэлесу (Ч.Найдзюк). Вусна віталі спсп. М.Сенька ад Беларускага Кангрэсовага Камітэту Амэрыкі, А.Міцкевіч ад Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня.

Афіцыяльная частка закончылася адсьпяваньнем беларускага нацыянальнага гімну.

Адбыўся супольны абед, за які належыцца вялікі дзякуй нашым жанчынам.

THE WHITE HOUSE

WASHINGTON

March 24, 1988

Warm greetings to Byelorussian Americans and to everyone marking the 70th anniversary of Byelorussian Independence. This observance salutes the determination of the people of Byelorussia to live in freedom and independence. It also pays tribute to the proud and ancient heritage you do so much to perpetuate.

I join you in commemorating the heroism of Byelorussia in the face of war and oppression through the years. The Soviets continue to persecute those who speak in defense of their religion, language, history, culture, and God-given human rights.

Brave and eloquent voices still attest to Byelorussia's unconquerable spirit; I look with you to the day when the people of Byelorussia will again be free to realize their national aspirations.

God bless you, and God bless Byelorussia.

Ronald Reagan

27 ліпеня 1990 году Вярхоўны Савет Беларусі прыняў дэклярацыю «Аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларускай ССР». Таксама, дзень 27 ліпеня абвешчаны Днём незалежнасьці, які будзе штогод адзначацца як агульнанароднае сьвята Беларусі. Вось гэтая дэклярацыя, што дзень 27 ліпеня будзе агульнанародным сьвятам, насоўвае пэўныя сумнівы, ці ён будзе й як хутка ў сапраўднасьці станецца рэчаіснасьцю. Але калі гэты дзень застанецца падобным да дня кастрычніцкай рэвалюцыі, роднай партыі, чырвонай арміі й 26 красавіка 1986 году (Дзень чарнобыльскай трагедыі), дык ён будзе адзначацца толькі Маскоўскімі вялікадзяржаўніцкімі сіламі ды беларускімі прыстасаванцамі, а не беларускім народам. Калі-б ён стаўся сапраўдным Днём незалежнасьці, дык 27 ліпеня будзе патрабаваць вялікага патрыятызму, моцнай веры, вытрымаласьці, адданасьці й ахвяраў беларускіх сыноў і дачок, каб стацца нароўні з 25 Сакавіком.

Адкідаючы скэптыцызм многіх людзей і нават некаторых кіраўнікоў Беларускага Народнага Фронту, Дзень дэклярацыі Беларусі сувэрэннай дзяржавай становіцца ўсё-ж радыкальным паваротам у жыцьці й палітыцы беларускага народу, а самае галоўнае ў палітыцы беларускае эміграцыі.

Як заўсёды, ідучы з духам часу й гістарычнай рэальнасьцю, Беларуска-Амэрыканскае Аб'яднаньне ў Нью Ёрку выслала Прэзыдэнту Беларускага Вярхоўнага Савету прывітальную тэлеграму:

«Яго дастойнасьці Прэзыдэнту

Беларускага Вярхоўнага Савету

Менск, БССР

30 ліпеня 1990 г.

Беларуска-Амэрыканскае Аб'яднаньне ў Нью Ёрку вітае Вас і ўвесь беларускі народ з паўзятым становішчам, якое вядзе да адраджэньня роднае мовы, культуры, нацыянальнае годнасьці й беларускае дзяржаўнасьці. Мы жадаем вам і ўсяму Беларускаму Народу посьпехаў у асягненьні сувэрэнітэту й мірнага сужыцьця з вольнымі народамі сьвету. Мы ,беларускія амэрыканцы, будзем старацца ўсімі сіламі Вам дапамагчы.

Спары Божа.

Канстанцін Мерляк, Старшыня

Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня

104-29 Atlantic Avenue Richmond Hil, N.Y,.11418 U.S.A.»



*Сяброўскае спатканьне на 18 Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі ў Таронта, Канада, 4 верасьня 1988 году.*

*Зьлева направа: У.Набагез, К.Мерляк, Б.Рагуля, В.Пляскач, Таня Пляскач*

Прамова Кастуся Мерляка на 19 Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі 2 верасьня 1990 году ў Кліўлендзе, якая, нажаль, не была сказана, бо Мерляк ня быў дапушчаны да мікрафону тымі, што яшчэ кіруюцца прынцыпамі аджылай групоўкі, поўнасьцю адпавядае сучаснай рэчаіснасьці як у Беларусі, так і на эміграцыі.

«...Я ужо бачыўся й вітаўся з многімі ўдзельнікамі 4 Сустрэчы, якая адбылася 30 гадоў таму назад у Кліўлендзе, а дзеля гэтага дазволю сабе прыгадаць, што я тады сказаў: «Нашая сустрэча адбываецца ў часе ўняцьця пад кантроль атамнае энэргіі й пачатку заваяваньня міжплянэтных прастораў, у часе надзвычайнага разьвіцьця матарыяльнага дабрабыту, а ў ня меншай роўніцы духовых якасьцей чалавека ў вольным сьвеце, асабліва ў Амэрыцы. У гісторыі Беларусі гэта ў 43-ці год ад часу абвешчаньня незалежнасьці й столькі-ж гадоў жудаснай няволі, эканамічнай эксплятацыі, нацыянальнай дэградацыі й біялягічнага вынішчэньня, нанесеных нашаму народу

расейскімі каляністамі». А далей я гаварыў, што нашае пакаленьне зьяўляецца пакаленьнем мосту. Гэта значыць, што мы ў сучасны момант творым мост, які злучыць дзьве эпохі: адраджэньне, якое закончылася абвешчаньнем незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі, і эпохі змаганьня за вызваленьне, якое закончыцца адбудовай беларускае дзяржаўнасьці.

Але вось прыйшоў час, калі мост эпохаў злучае нас у адбудове беларускае нацыі, якую сатхнуў на бераг пропасьці «старшы брат» пад маскай сусьветнай рэвалюцыі, забіраючы ўсё, што нам было дарагое, найважнейшае, годнасьць чалавека-беларуса.

Дзякуючы невялікай колькасьці беларускіх патрыётаў, якія бачачы загубу свайго народу, натхнёныя слаўнай гісторыяй сваіх продкаў, з клічам Кастуся Каліноўскага й Францішка Багушэвіча выйшлі на сьмяротнае змаганьне за правы чалавека, за нацыянальную годнасьць, за Бацькаўшчыну, каб адабраць усё, што было забранае: мову, гісторыю й народнае багацьце. А самае галоўнае, закапаную глыбока савецкаю хлусьнёю праўду выцягнуць яе наверх, каб паказаць усяму сьвету жудасьці Маскоўскай крымінальнай улады й злачынства дакананыя над беларускім народам. Гэта ёсьць вялікае гістарычнае заданьне, якое стаіць перад сучасным пакаленьнем Беларусі.

На мосьце новага «адраджэньня» ячшэ шмат перашкодаў,зробленых нашымі адвечнымі ворагамі. Ды ня толькі ворагамі, але перашкоды, зробленыя самымі беларусамі—адмаўляючыся ад грамадзкае адказнасьці тым славутым «мая хата скраю» з аднаго боку, а з другога, выслужваючыся перад Масквою, ды нячуваным падхалімствам здабываюць сабе ласку й уладу, якую хочуць утрымаць і надалей.

Калі пераможам свае собскія перашкоды, дык варожыя паляцяць як пыл з ветрам у вялікую буру. Тады місыя сучаснага пакаленьня будзе выкананай.

Бацькаўшчына нас патрабуе сёньня як ніколі. Мы не павінны яе пакідаць, а тыя, што былі змушаныя яе пакінуць, павінны вярнуцца, каб усе разам вярнуць славу продкаў, каб жыць у згодзе із сваім братам беларусам, бяз клясавай варожасьці й без даносаў, каб жыць у згодзе з усімі народамі, каб быць гаспадаром свае хаты й дзяржавы.

Я й мы ўсе верым у перамогу—Беларусь будзе жыць, бо яе народ на гэта заслугоўвае.

Жыве Беларусь!»



*Спатканьне з Вольгай Корбут, верасень 1988 г., Нью Ёрк.*
*Зьлева направа: Леанід Барткевіч, К.Мерляк, Вольга Корбут, Марыя Мерляк з Канэктыкут і Ганна Мерляк*



*Спатканьне з Зінай Туронак з Варшавы, кастрычнік 1900 г. Зьлева: К.Мерляк, У.Пелеса, ЗінаТуронак, В.Шчэцька, С.Жамойда й госьць*



*69-я ўгодкі Слуцкага паўстаньня ў Рычмонд Гіл, 10 сьнежня 1989 г. Васіль Шчэцька чытае рэфэрат.*



*Валянтына Пархоменка ўручае падарунак «Статут Вялікага княства Літоўскага» старшыні БАА К.Мерляку 29 жнівеня 1990 г.*

# Гісторыя БАПЦ у Амэрыцы

Перад тым чым пачаць пісаць пра падзеі ў жыцьці БАПЦ, у якіх Кастусь быў актыўным удзельнікам, хачу сказаць пару слоў пра яго суадносіны з Уладыкам Васілём (Тамашчыкам).

Раней мы выказваліся аб вялікай важнасьці існаваньня свае нацыянальнае царквы на эміграцыі, якая ёсьць неабходная для нацыянальна-грамадзкай дзейнасьці ў чужым асяродзьдзі. Пра гэта ведаў ня толькі Кастусь, але й другія сьвядомыя палітыкі, грамадзкія й культурныя дзеячы.

Ул. Васіль таксама гэта добра разумеў і гэты фактар пры ўсякай нагодзе выкарыстоўваў для сваіх асабістых інтарэсаў.

Па прыезьдзе ў Амэрыку Кастусь запазнаўся з Ул.Васілём, і пасьля ўладжаньня сваіх асабістых справаў, як працы й кватэры, ён са згоды Ганны запрашаў Уладыку на вячэры да сябе дамоў некалькі разоў. Падчас гутарак, зар'ентаваўшыся, у якіх абставінах той жыве, запрашалі яго на вячэру раз у тыдзень кожную сераду. Ул. Васіль рэгулярна прыходзіў на вячэру на працягу двух гадоў. Вечарамі ня раз да поўначы праводзілі гутаркі на ўсякія тэмы, а пераважна на амэрыканскую й беларускую палітыку, пра грамадзкія патрэбы ды пляны на прышласьць. Асабліва былі цікавыя ўспаміны аб мінулым і падзеях апошняе вайны.

Аднаго разу Кастусь выказаўся, што яму ўдалося дастаць ад Амэрыканскага камітэту пэўную суму грошаў на пакрыцьцё коштаў прыезду М.Абрамчыка ў Амэрыку па справах Парыскага блёку і VIII сэсіі Рады БНР, якая мела распачацца 23 верасьня 1956 году. Тут Ул. Васіль паважна заявіў выплаціць яму палову гэтае сумы. Такое дамаганьне Кастуся моцна зьдзівіла, але ён запытаўся, чаму плаціць і каму?

Ул.Васіль паясьніў, што перад самым саборам у Канстанцы ў чэрвені 1948 году быў зроблены дагавор між ім і Радай БНР, што атрыманыя з вонку беларускага засягу дзеяньня Радай БНР фонды будуць падзеляны па роўнай часьці між ім і Радай БНР. Кастусь запытаў, роўная палавіна мае быць выплачаная асабіста Ўладыку ці епархіяльнай кансысторыі?

—Нікому іншаму, а толькі мне,—адказаў Уладыка.

Кастусь сказаў, што ён ня верыць, каб такі дагавор быў зроблены

людзьмі, думаючых па-дзяржаўнаму, і ў даным выпадку ён не прызначыць нікому грошы, атрыманыя на канкрэтную мэту. Грошы мусяць быць выдаткаваныя па прызначэньню.

Грошы былі выдадзеныя на аплату выдаткаў М.Абрамчыка, на арганізацыю VIII сэсіі Рады БНР, а рэшта ўручана Абрамчыку перад ад'ездам дадому ў Парыж.

ВЫСОКАДАСТОЙНЫ Й ДАРАГІ — Бруклін I, 26.12.1962.

Сп.К.МЕРЛЯК з СЯМЕЙКАЙ!

ХРЫСТОС РАДЖАЕЦЦА - ЯГО СЛАЎЦЕ!

Сардэчна дзякую за Вашыя мілыя мне Калядныя й Навагоднія прывітаньні й прыгожыя пажаданьні, і за падарунак.

І я ад душы вітаю Вас усіх з нашым Вялікім, Слаўным і Радасным Сьвятам:РАСТВОМ ХРЫСТОВЫМ і з НОВЫМ - 1963 - ГОДАМ!

Няхай сьвятло Зоркі Віфлеемскае зьзяе й у Вашых сэрцах, цешыць і радуе Вас! Няхай Ангелы сьвятыя абвяшчаюць і Вам вялікую радасьць усіх добрых людзей:ХРЫСТОС НАРАДЗІЎСЯ! Няхай яны пяюць і Вам свой гімн Нябесны:Слава на вышнях Богу, і на зямлі мір людзям добрае волі!

Няхай Нованароджаны Гасподзь наш Ісус Хрыстос, як Боскае Дзіцятка, прыйме й Вашыя дары:Вашую вернасьць і адданасьць Яму, Вашую любоў да Яго, і Вашую надзею на Яго, і багаславіць Вас усіх Ласкаю Сваёю:пашле Вам усім супакой, задаваленьне, радасьць, доўгі век у добрым здароўі, усякі посьпех у жыцьці й працы, і многа шчасьця ў Новым Годзе, і на многія лета!

І няхай Ён напоўніць сэрцы Вашыя непахіснаю надзеяй, што неўзабаве народзіцца да новага, вольнага й шчасьлівага жыцьця нашая шматпакутная, любая й слаўная Маці-Беларусь!

ХРЫСТОС НАРАДЗІЎСЯ! РАДУЙЦЕСЯ!

Нованароджаны Гасподзь Бог наш Ісус Хрыстос багаславіць Вас усіх і ахіне Сваей Любоўю, Ласкай і Міласэрдзем.

З глыбокаю пашанаю да Вас і любоўю ў Хрысьце Ісусе,

Ваш

+Архіепіскап Васілій

Аднак, як высьветлілася пазьней, дагавор у Канстанцы быў зроблены, аб чым сьведчыць ліст А.Стагановіча да архіяпіскапа Сергія, Першаерарха БАПЦ, які быў пададзены да ведама чытачоў у

«Бюлетэні» Царкоўнае Рады прыходу Жыровіцкае Божае Маці ў Кліўлендзе (№ 113-115 за сьнежань 1967 году).

У лісьце гаворыцца аб дагаворы адносна кандыдатаў у япіскапы БАПЦ, якія павінны быць апрабаваныя праз Раду БНР перад хіратоніяй. Без сумніву, гэты дагавор меў параграф адносна падзелу фондаў. Аднак з гэтага выглядае, што архіяпіскап Сергій пра дагавор ня ведаў.

Шматлікія факты з жыцьця прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне пераканалі Кастуся й сьцьвердзілі аб жаднасьці Ўладыкі Васіля на грошы, да гэтага той не адзначаўся працавітасьцю й ахайнасьцю.

Архіяпіскап Васіль, сакратар Сынода БАПЦ, напісаў ліст да Патрыярха Атэнагораса І, з датаю 1 чэрвеня 1967 году з просьбай, каб ён дапамог палагодзіць яго кананічнасьць. Ліст быў напісаны пабеларуску й перасланы праз а.Віталія Сагайдакіўскага. Але па дарозе да Патрыярхіі Экзарха Ўсяленскага архіяпіскапа Яковоса, праз пасрэдніцтва якога ліст павінен быў быць перасланы Патрыярху, айцец Сагайдакіўскі зайшоў да а.М.Лапіцкага, які зрабіў з гэтага ліста копію. Айцец Сагайдакіўскі ў сваёй кнізе «Правды не втопіті» піша, што ён дамовіўся з а.Лапіцкім пра гэтую справу маўчаць «да пэўнага часу». Але а.Лапіцкі «гэтага часу не дачакаўся», размножыў з копіі Ул. Васіля ліст і шырока яго распаўсюдзіў. За гэта Ул. Васіль нямала дастаў аплявухаў ад сваіх сяброў групоўкі. Аднак, не зважаючы на гэта, ён да групоўкі не адставаў і шчыра выконваў іхнія загады.

Нажаль, Ул Васіль ніякага адказу ад патрыярха Атэнагораса І не дачакаўся. Сваёю неабдуманай і няўдалаю просьбаю раз і назаўсёды зачыніў дзьверы да Патрыярхату.



# Працяг падзеяў

Надзвычайны сход катэдральнага сабору сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне 8 травеня 1966 году разглядаў непаладкі ў прыходзе, якія выклікаў сам архіяпіскап Васіль, аб'яўляючы 27 лютага 1966 году, што ён выбраную на сходзе 14 лістапада 1965 году царкоўную раду ня прызнае, адначасна падаючы склад ім назначанае другое царкоўнае рады.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі
5 кастрычніка 1967 году.
Яго Высока Прэасьвяшчэнству прэасьвяшчэньнейшаму
архіяпіскапу Сергію.

«Рада Беларускай Народнай Рэспублікі паведамлёная аб Вашым намеры правесьці хіратонію а.пратаярэя Аляксандра Крыта. На аснове дагавору ў Канстанцы з 5-га чэрвеня 1948 году Рада Беларускай Народнай Рэспублікі забавязалася паведаміць Вас, Высокапрэасьвяшчэнны Уладыка, аб парушэньні Вамі гэтага дагавору. Кандыдатура а. А.Крыта на япіскапа ня была Вамі ўзгоднена з Радаю БНР. Мы гэтым ветліва паведамляем Вас, Высокапрэасьвяшчэньнейшы Уладыка, што паводзіны а.прат.Аляксандра Крыта ў яго парафіі епархіі супярэчвае канонам праваслаўнае царквы й варожае беларускаму народу.

Таму Рада БНР ня можа пагадзіцца на а.прат.А.Крыта й змушаная разглядзець яго хіратонію як варожую дзейнасьць супроць беларускага народу ды дзеля гэтага пераглядзець свае адносіны да ўсіх тых, хто прыложыцца да яго хіратоніі.

Мы верым у Вашае, Высокапрэасьвяшчэньняйшы Уладыка, добрае жаданьне й упэўнены, што Вы ўстрымаеце назначаную Вамі хіратонію, а прат.А.Крыта да часу папраўкі ў яго захоўваньні й палепшаньня яго суадносін да грамадзтва ў якім ён жыве, аб чым паведамім вас своечасова.

Пакорна просім Вашых малітваў.

Першы заступнік прэзыдэнта БНР Аляксандр Стагановіч,

Старшыня Суду БНР Ф.Родзька».

(Родзька асьведчыў пісьмова, што не падпісваў, а таму прозьвішча яго было падпісана ананімна.)

Адказ Першаіерарха БАПЦ Высокапрэасьвяшчэньняейшага архіяпіскапа Сергія на пратэст раднага БНР сп.Стагановіча

«Высокапаважаныя члены БНР А.Стагановіч і Ф.Р.!

1. Такога дагавору ў Канстанцы я ня знаю.

2. Уладыка Васіль сам выставіў кандыдатуры 3-х. а.прат.А.Крыта, а.архім. Мікалая Мацукевіча і а.прат. Аўгена із Бэльгіі. Я яго кандыдатуру зьняў. Ён жанаты. А.Крыт і Уладыка Васіль маюць асабістыя парахункі, гэтыя іхнія парахункі не патрэбны для БАПЦ. А наша сьв.БАПЦ патрабуе дыяканаў, сьвятароў і япіскапаў.

3. Я не думаю, каб а.прат.А.Крыт гэтак дрэнна паступаў у царкве з народам. Тут штосьці ёсьць іншае? Вы спасылаецеся на каноны, укажыце іх.

4. БНР гэта палітыка, а БАПЦ гэта ёсьць апалітыка. Я не раблю япіскапаў для БНР, а для БАПЦарквы.

5. Я чакаю прыезду а.Крыта да мяне. Калі ён прыедзе, то будзе харанізаваны ў япіскапа. А было-б добра, каб а.прат. А.Крыт і архім.Мікалай прыехалі ў 2-х, бо яны для мяне ёсьць аднолькавы й дастойныя быць япіскапамі БАПЦ.

Архіяпіскап Сергій.Першаіерарх сьв.БАПЦ».

На гэтым сходзе скарбнік Д.Клінцэвіч падаў, што стан сябраў у прыходзе ёсьць 135, а прысутных на залі 90 з упаважненымі. Старшыня сходу аб'явіў сход правамоцным.

На сходзе адбылася доўгая дыскусыя, у якой забіралі голас каля 30-ці асабоў, некаторыя зь іх па некалькі разоў. У выніку 86 галасамі была прынятая рэзалюцыя. Рэзалюцыя гаворыць сама за сябе:

«У сувязі з тым, што Ўладыка Васіль, правячы япіскап БАПЦ у Амэрыцы:

1.Яўна падтрымоўвае й праводзіць палітыку аднае таталістычнае групоўкі, а ня займаецца рэлігійнымі й царкоўнымі справамі.

2.Уладыка выказаў недавер царкоўнай радзе, выбранай агульным сходам, не перадаючы ёй дакумэнтаў парафіі, (гэты дакумэнт сп.М.Тулейка, як былы заступнік старшыні ц.р. перадаў Уладыку

замест новай царкоўнай радзе).

3. 27 лютага з амбоны Ўладыка апаганіў царкоўную раду й аб'явіў, што ён яе разьвязвае. Гэтым Уладыка пасягнуў на правы прыхажана ў выбіраць і быць выбранымі.

4.Уладыка камісарычна назначыў «сваю» царкоўную раду з асобаў,якіх сход выбраў. 14. 11. 65 г.

5. Зарганізаваў нелегальны збор грошаў у царкве, які праводзілі парафіяне А.Міцкевіч і Я.Яновіч у неадпаведным мамэньце сьв. літургіі.

6. Уладыка стала нападае на а.Юрыя ў часе літургіі, каб скампраміттаваць яго перад вернікамі.

7. Лістоўна загадаў скарбніку царкоўнай рады сп-ру Д.Клінцэвічу перадаць прыхадзкія грошы, кнігі й дакумэнты сп.Я.Ніхаёнку.

Дзеля гэтага прыхажане, прысутныя на надзвычайным агульным сходзе 8 травеня 1966 годзе, пастанаўляюць:

1. Выказаць поўны давер сучаснай царкоўнай радзе за тое, што яна належна вядзе парафіяльныя справы, даглядае царкоўную маёмасьць ды абараняе нашую парафію ў асаблівасьці, Беларускую Аўтакефальную Праваслаўную Царкву агулам ад нападаў і не дапускае яе да ліквідацыі.

2. Царкоўная рада ня можа зрачыся свайго мандату, які быў наданы абсалютнай бальшынёю галасоў на агульным сходзе ў лістападзе 1965 году ды павінна далей кіраваць парафіяй да канца свае кадэнцыі.

3. Таму што прыход ад шасьці гадоў існуе без настаяцельства, сход уважае а.Юрага Абрэмскага за настаяцела прыходу катэдральнага сабору сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, Н.Ё.

4. Сход забараняе скарбніку ці царкоўнай радзе наогул перадаваць грошы, дакумэнты або парафіяльную маёмасьць асобам, якіх агульны сход не ўпаўнаважыў.А грошы, што другі бок нелегальна трымае, павінны быць зьвернутыя ў касу прыходу.

5. Сход дамагаецца, каб нашая парафія была вольнаю, як і ўсе іншыя парафіі епархіі. Іншыя парафіі вядуць сваё жыцьцё, тады калі ў нас Уладыка Васіль ўважае парафію за нейкую сваю ўласнасьць».

Пасьля гэтага Ўладыка Васіль спыніў другі талерачны збор, але яго прыхільнікі ў невялікай колькасьці плацілі сяброўскія складкі «свайму» скабніку.

Ад пачатку заснаваньня прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку настаяцелям прыходу быў Хведар Данілюк. Ён памёр 29 ліпеня 1960 году, яго абавязак настаяцеля выконваў сам Ул. Васіль.

У красавіку 1964 годзе зьявіўся да Уладыкі Васіля дыякан Юры Абрэмскі. Яго Уладыка Васіль прыняў у БАПЦ, а 12 жніўня 1964 году рукапалажыў у сьвятары, але а.Юры ня быў назначаны настаяцелям прыходу. Таму надзвычайны сход 8 травеня 1966 году пастанавіў уважаць а.Юрыя Абрэмскага настаяцелям прыходу.

Лета прайшло спакойна ў прыходзе, а з надыходам восені распачалася падрыхтоўка да III епархіяльнага сабору БАПЦ, які меў адбыцца 26 лістапада 1966 году ў Таронта, Канада. На вызначаны дзень зьехаліся дэлегаты ад прыходаў з Кліўленда, Таронта, Брукліну й Гайленд Парку ды сябры епархіяльнай управы.

Сабор пачаўся а 10-й гадзіне раніцы, 26 лістапада 1966 году малітваю й багаславенствам Ул. Васіля, які зараз-жа падаў да ведама прысутных, прэзыдыюма й рэзалюцыйнай камісіі сабору. Пры ўстанаўленьні кворуму разгарнулася спрэчка вакол назначаных дадатковых дэлегатаў, каб такім чынам забясьпечыць за сабою бальшыню галасоў.

Пра прыняцьцё парадку дня ў «Бюлетэні» №11013 царкоўнае рады Кліўлендзкага прыходу чытаем: «У зьвязку з разьбежнасьцю ў паглядах прыняцьцё парадку дня была пастаноўлена на галасаваньне, у выніку якога за прыняцьцё галасавала—23, а за ўнясеньне паправак — 21, бо, як заўважылі й сьцьвердзілі прысутныя, пры падлічэньні галасоў Раісаю Жук-Грышкевіч тры галасы былі ўтоены на некарысьць галасуючых за ўпіс паправак у парадак дня».

Пасьля прыняцьця парадку дня адбыліся справаздачы зь дзейнасьці прыходаў, пачалася дыскусія, якая круцілася вакол непаладкаў у Бруклінскім прыходзе. Дыскусія была даўгая й сварлівая, у якой абвінавачвалі К.Мерляка й другіх сяброў рады, што яны не падпарадкаваліся Ўладыку. Усё залежала, хто каго абвінавачваў, за што й чаму. З часам дыскусія зьмягчэла й выглядала, што зацікаўленыя згодныя да супрацоўніцтва. На запытаньне Ул.Васіля: «Ці будзеце мяне слухаць?» Старшыня Казьлякоўскі адказаў: «Так». Адказ быў прыняты гучнымі воплескамі.

Нажаль, сталася інначай. Замест выбараў епархіяльнай управы Ул. Васіль заявіў, што толькі ён будзе прапаноўваць кандыдатаў у

епархіяльную ўправу. Ён падаў да ведама імёны й іх абавязкі. Праслухаўшы гэта а.Аляксандр Крыт, настаяцель прыходу ў Кліўлендзе, моцна запратэставаў за парушэньне выбарчага працэсу. Ён устаў і пакінуў сабор. За ім выйшлі ўсе дэлегаты Кліўленду. Салідарызуючыся зь кліўлендцамі, пакінулі сабор а.Ю. Абрэмскі з дэлегатамі прыходу ў Брукліне. На радзе дэлегатаў двух прыходаў было прынятае асьведчаньне:

«Прэзыдыюму III епархіяльнага зьезду БАПЦ Паўночнай Амэрыкі, які адбываецца ў Таронта, Канада, 26 лістапада 1966 году.

Дэлегацыі Бруклінскага, Нью Ёрк, прыходу сьв.Кірылы Тураўскага й прыход Жыровіцкае Божае Маці, Кліўленд, Агаё ды тры сябры былое епархіяльнае ўправы сьведама пакінулі нараду зьезду з прычыны, што зьезд праводзіўся па-дыктатарскі архіяпіскапам Васілём, які таксама вызначыў і кандыдатаў у новую епархіяльную ўправу.

Мы, як дэлегаты ад нашых прыходаў, нясем адказнасьць перад нашымі прыхажанамі, жаданьнем якіх было, каб кандыдаты новае ўправы былі выбраныя зьездам, а не назначаныя Ул. Васілём. Гэта далоб людзям пачуць, што й яны ёсьць адным целам нашае сьвятое БАПЦ.

В.Шчэцька, а.А.Крыт, М.Гумен, П.Мельяновіч, В.Місюль, А.Протас, К.Мерляк, В.Юрцэвіч, М.Брэзоўскі,М.Пэнда, Д. Клінцэвіч, В.Валюкевіч, Я Раковіч, К.Кіслы Ул. Дунец, А.Кабяка, Я Казьлякоўскі, К.Каляда, М.Трэцьякоў, В.Радзюк, а. Юры Абрэмскі».

Прэзыдыюм сабору не ўдзяліў ніякае ўвагі на асьведчаньне дэлегатаў двух найбольшых прыходаў і бальшыні сапраўдных дэлетатаў і прадаўжаў працу.

На саборы была выбраная эпархіяльная управа на чале з архіяпіскапам Васілём з кіраўнікамі аддзелаў: а.С.Войтэнка, а.М.Мацукевічам, др.В.Васілеўскім—скарбнікам і М.Тулейкам— сакратаром, а таксама прынятая рэзалюцыя.

Ул. Васіль, закрываючы зьезд, выказаў наступнае: «Я, як япіскап, не магу належаць да ніякае палітычнае арганізацыі, як звычайны сябра яе. Япіскап можа быць толькі галавою ўсюды, як у царкве, так і ў дзяржаве. Практыка жыцьця паказвае, што япіскапы былі прэм'ерамі ўрадаў і прэзыдэнтамі. Напрыклад, архіяпіскап Макарыёс цяпер ёсьць Прэзыдэнтам Кіпра. Я вас запэўняю, што й далей буду цьвёрда стаяць за справу Божую й за нашую справу — справу беларускую, за нашую любую Бацькаўшчыну».

Каб гэта-ж была праўда!

Па павароце з Таронта ў прыходзе катэдральнага сабору сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне запанавала зацішша. Ул.Васіль і а.Юры служылі й маліліся ў згодзе, а царкоўная рада вяла адміністрацыю. Аднак назначаная рада Ўладыкам надалей зьбірала сяброўскія складкі. Выбраная царкоўная управа пагэтаму ўстрымалася плаціць Ул.Васілю месячную аплату, матывуючы тым, што кошт утрыманьня будынку патрабуе грошаў.

Надыходзіў час на гадавы сход. 25 верасьня царкоўная рада разаслала заклік да прыхажанаў, каб урэгулявалі сяброўскія складкі перад сходам, які меў адбыцца ў канцы кастрычніка 1967 году.

15 кастрычніка 1967 году царкоўная рада разаслала ўсім прыхажанам паведамленьне, што агульны сход сяброў прыходу адбудзецца 29 кастрычніка ў царкоўнай залі. Адначасна быў высланы ліст епархіяльнай управе, прапануючы прыслаць сьпісак сваіх прыхажанаў, якія аплацілі складкі, каб яны маглі ўзяць удзел у агульным сходзе. Нажаль, гэтага яны не зрабілі.

Уладыка Васіль з сваёю радаю таксама рыхтаваўся да гэтага сходу. 17 кастрычніка ён разаслаў прыхажанам паведамленьне, якое пачыналася: «Як многім з вас ужо вядома, дзеючая царкоўная рада вызначыла на 20 кастрычніка 1967 г. звычайны перавыбарчы агульны сход нашай парафіі. Гэта таксама датычыцца й да тых з вас, што аплацілі парафіяльныя складкі, мне й таму маюць права голасу на сходзе.»

Далей, каб забясьпечыць сябе поўную перамогу на сходзе, Уладыка Васіль 22 кастрычніка пасьля службы абвесьціў ў царкве, што ён адлучыў ад царквы К.Мерляка й В.Юрцэвіча ды забараніў ім прыходзіць у царкву, г.з. налажыў анафэму.

У нядзелю, 29 кастрычніка, пасьля Божае службы тыя прыхажане, што мелі аплочаныя складкі, зьбіраліся на сход. Ул.Васіль зыйшоў у залю й аб'явіў, што сход ён разьвязвае й вызначае камісію ў складзе: Б.Данілюка, П.Манькоўскага, А.Міцкевіча, М.Тулейкі, Я.Яновіча, якія выконваюць абавязкі царкоўнае рады да часу скліканьня агульнага сходу прыхажанаў. Сабраныя на сход не разыйшліся.

Агульны сход спраўна прайшоў паводля парадку дня, благаславіў яго а.Юры. На гэтым сходзе была выбраная царкоўная рада й прыняты бюджэт на наступны год дзейнасьці. Сход пастанавіў царкоўную раду

замяніць на царкоўную ўправу й гэтым ліквідаваць «Bord of Trustis», бо да гэтага часу былі два асобныя ворганы: выканаўчы й уставадаўчы. Склад новае царкоўнае ўправы быў наступны: старшыня—Янка Казьлякоўскі, заступнік старшыні—Кастусь Мерляк, сакратар—Васіль Шчэцька, скарбнік—Пятро Мельяновіч, стараста—Леанід Леўковіч, радныя—Васіль Юрцэвіч, Міхась Бразоўскі, Пётра Саўчыц, Васіль Захаркевіч. Рэвізыйная камісія: Леанід Галяк, Аўген Протас і Янка Юхнавец.

У наступную нядзелю 5 лістапада архіяпіскап Васіль з амбоны абвесьціў аб зьняцьці сьвятарскага сану з а.Юрыя Абрэмскага. А на сяброў управы налажыў кару, вылучаючы іх з прыходу й забараняючы ўваход у царкву, пакуль яны не пакаюцца ў сваіх правінах супраць правячага япіскапа. Ул. Васіль выдаў распараджэньне, што царква з 12 лістапада 1967 году будзе зачынена.

Царкоўная ўправа царкву адчыніла, і Божыя службы адбыліся ў нядзелі 12, 19 лістапада без Ул. Васіля, які ня мог служыць з а.Юрыям, якога ён сам пазбавіў сьвятарскага сану. Айцец Юры Абрэмскі, каб захаваць сан, дастаў ад украінскага япіскапа Палядзія дакумэнт з датаю 4 лістапада 1967 г., што ён часова прыняты ў яго юрысдыкцыю.

15 лістапада 1967 году Ул. Васіль падаў у Найвышэйшы штатны суд на царкоўную ўправу й а.Ю.Абрэмскага.

Акт абвінавачаньня, зложаны ў Найвышэйшы суд штат Нью Ёрк, акруга Квінс—індэкс 17212-1967, гучыць наступна:

«Высокадастойны Васіль Тамашчык гэтым злажыў прысягу, сьцьвярджае й кажа, што ён ёсьць архіяпіскап і духоўны адміністратар катэдральнага сабору сьв. Кірылы Тураўскага, Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ў Амэрыцы, Інк.

Што падсудзімыя, адлучаныя ад царквы (наложаная на іх анафэма). Што падсудзімыя яшчэ ўсё ўваходзяць у царкву, хоць яны й павядомленыя аб іхняй анафэме.

Дзеля гэтага, ніжэй падпісаны ветліва просіць, каб загад быў выданы й запісаны ў судзе: забараніць і ўстрымаць абвінавачаных ад уваходу ў царкву й далей загадаць Пятру Мельяновічу перадаць усе парафіяльныя фінансавыя кнігі, грошы й рахункі... і далей загадаць Васілю Шчэцьку перадаць усе парафіяльныя кнігі, пратаколы й за ўсё іншае зрабіць прысуд, калі гэты суд будзе лічыць за належнае й справядлівае.



Царква сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне.

Падпісаў: Высокадастойны Васіль Тамашчык.

Прысягнуў гэтага дня 15 лістапада 1967 году».

Архіяпіскап Васіль цьвердзіў у сваіх афідавітах і праз сьведкаў, што царкоўная ўправа (9 асобў), якая была выбраная на агульным сходзе прыхажанаў 29 кастрычніка 1967 году ня ёсьць важная, бо на гэтым сходзе былі прысутныя два сябры рады (К.Мерляк і В.Юрцэвіч), якія ня мелі права голасу быць выбраныя таму, што яны былі адлучаныя ад царквы тыдзень раней, што агульны сход няважны, бо ён (Ул. Васіль) не апрабаваў яго, дзеля гэтага нававыбраная рада таксама няважная. За тое, што яны прадаўжаюць дзеіць, ён іх адлучыў ад царквы, што паводля канонаў пазбаўляе іх права быць сябрамі прыходу ды забараняе ім уваход ў царкву.

Другім распараджэньнем з 18 лістапада Ул. Васіль паведаміў, што 19 лістапада службы ня будзе.

Р А С П А Р А Д Ж А Н Ь Н Е

У сувязі з закалотамі, што здарыліся ў Саборы Сьв.Кірылы Тураўскага Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы на Атлянтык Эвэню 401 ў Брукліне ў апошнія дзьве Нядзелі, Службы Божае ў Нядзелю 19-га лістапада 1967 году ў нашым Кафедральным Саборы ня будзе.

Пра наступную Службу Божую парафіяне будуць паведамленыя.

+Архіепіскап Васілій

Падпісаў:Архіепіскап Васілі

Адміністратар Сьв.Б.А.П.Царквы ў Амэрыцы.

18-га лістапада 1967 году.

---

P A S T O R A L  O R D E R

As a result of the sacrilegous events which had transpired in the Cathedral of St.Cyril of Turov in Brooklyn on last two Sundays, there will be no Church Service at our Cathedral this Sunday, November 19, 1967.

The parishiners will be notified when the next Church Service will be held.

+Archbishop Vasiliy

Signed: Archbishop Vasili

Administrator of all Byelorussian Autocephalic Orthodox Churches in America.

Dated: The eighteenth day of November 1967.

Але служба адбылася 19 і 26 лістапада (служыў а.Юры без Ул. Васіля).

Суд ня сьпяшаўся разглядаць справу. Ул.Васіль злажыў новую заяву з просьбаю, каб суд даў загад царкоўнай управе ўпусьціць яго ў царкву. Гэта было няпраўдай, зложанай пад прысягаю Ўладыкам, бо ў сапраўднасьці яму ніхто не забараняў йсьці ў царкву маліцца й адпраўляць літургію. Ён сам сябе выгнаў з царквы, накладаючы анафэму на царкоўную ўправу й а.Юрыя, зь якім, паводля канонаў, ён ня мог служыць.

1-га сьнежня судзьдзя ўказаў, што Ул.Васіль мае права служыць у царкве, а ўправа мае правы такія самыя, як і раней. У нядзелю, 3 сьнежня 1967 году, Ул.Васіль з паліцыяй і цэлым прыходам з Гайленд Парку ўвайшоў у царкву й пачаў служыць.

20 сьнежня адбылося фармальнае слуханьне справы ў судзе. Судзьдзя Фэйдэн адлажыў справу да 10 студзеня 1968 году ды пацьвердзіў папярэдні ўказ, каб службы адбываліся падчас Калядных сьвятаў. З гэтай нагоды паявіліся ў "Daily News" ад 25.XI.67. і ў «Law Journal» 27.XI.67. артыкулы, крытыкуючыя Ул. Васіля за яго япіскапскі няштодзённы й ненармальны пастунак.

JULIUS P. FISCHLER
469 MILLER AVE
BROOKLYN 7, N. Y.

JAN 3 1968

Dear Michael: Re: St Cyril's of Turov Cathedral... vs. Kosklakowski

I read the decision of Judge Feiden in the Law Journal and I thought you would be interested and therefore enclose the clipping which appeared in the Journal on December 27,1967.

You will note, as you probably know, that the "CASE IS SET DOWN FOR TRIAL on JAN. 10,1968"

The decision does not refer to the right of the archbishop to sue in the name of the corporarion. In my opinion, the archbishop cannot assume to act for the corporation. I see, from the decision that the judge did not think that the archbishop had the right to excommunicate the members as he claims under the church laws; at least, he had serious doubts.

Yours, etc.

JULIUS P. FISCHLER

(Бо ён ня меў права падаваць у суд ад імя карпарацыі ды накладаць анафэму на ўправу). Таму судзьдзя Фэйдэн пастанавіў, каб гэтая справа разглядалася ў Найвышэйшым штатным судзе.

Працэс Ул.Васіля супраць царкоўнае ўправы (9 асобаў і а.Юрыя Абрэмскага) распачаўся 10 студзеня й адбываўся на працягу 5 дзён да 17 студзеня 1968 году пад старшынствам судзьдзі Філіп М. Кляйфэльд у III аддзеле Найвышэйшага штатнага суду ў Нью Ёрку. (Індэкс № 17212-1967. Адвакаты Джэймс Ф.Граймс і аплікант Валянтын Гарошка прадстаўлялі Ул.Васіля, а. А.Керно прадстаўляў царкоўную ўправу.

Першы сьведка быў архімандрыт Мікалай з Таронта, як экспэрт кананічнага права, якога ён ня ведаў, у чым, пад ціскам адваката абароны, і прызнаўся. Дзеля гэтага адвакат Уладыкі запрапанаваў прыняць у акту суду кнігу «Збор Канонаў». Пасьля яго сьведчылі: П.Манькоўскі, А.Міцкевіч, Ул. Кірыла, др. В.Васілеўскі (Войтэнка). Б.Данілюк і іншыя. З боку царкоўнай управы К.Мерляк (яго сьведчаньне трывала цэлы дзень і частку другога) Васіль Шчэцька, Поля Клінцэвіч, К.Юрцэвіч ды іншыя.

Пратакол прабегу суда абыймае 333 бачынкі машынапісу. Зьмест сьведчаньняў абодвух бакоў вельмі цікавы й характэрны, які даводзіць з аднаго боку да сьмеху, а з другога да сьлёз.

Судзьдзя абʼявіў, што ён рэзэрвуе дэцызыю на прысуд, а пакуль што надалей зьяўляецца важным папярэдні ўказ у поўным яго значэньні. Абодвы бакі пачалі чакаць прысуду.

У міжчасе адбываліся падзеі, нязьвязаныя з судом. 10 сьнежня 1967 году Ул.Васіль рукапалажыў у сьвятарскі сан Васіля Кендыша. Гэта зьдзівіла нямала людзей, бо вельмі хутка В.Кендыш, які ў сваім жыцьці прапаведваў бязбожніцкія ідэі, перавярнуўся ў веруючага. Усе разумелі, што Ул. Васілю была патрэбная падтрымка з боку сябры групоўкі, да якое яны абодва належалі.

Айцец Аляксандар Крыт ад даўжэйшага часу марыў стацца япіскапам, але Ул.Васіль пад ціскам групоўкі не даваў на гэта згоды. Айцец Аляксандар на сабары ў Таронце ад 26 лістапада 1967 году пераканаўся, што яго ў япіскапы не дапусьцяць. Падчас пагвалчэньня выбарчай працэдуры Ул. Васілём на саборы, ён пакінуў сабор з сваімі дэлегатамі, што зрабілі й дэлегаты Бруклінскга прыходу для салідарнасьці.

Айцец Крыт, вярнуўшыся ў Кліўленд, не чакаючы на згоду Ул.Васіля, зьвярнуўся да першаерарха БАПЦ архіяпіскапа Сергія ў Аўстраліі, каб ён прыхільна аднесься да просьбы вернікаў Кліўленду й Брукліну ды хіратанізаваў яго ў япіскапы.

Арыяпіскап Сергій, не зважаючы на пратэсты Ул.Васіля й групоўкі ў Радзе БНР, 15 лютага 1968 году ў асысьце япіскапа Дзьмітрыя Сэрбскай Праваслаўнай царквы хіратанізавалі япіскапа Андрэя (Крыта). Гэта падзея моцна ўсхвалявала Ул.Васіля й пануючую групоўку ў Радзе БНР, бо Ул.Васіль заставаўся ў Сынодзе БАПЦ ў меншасьці— адзін супраць двух. Хутка змабілізавалі фонды, Ул.Васіль узяў з сабою архімандрыта Мікалая Мацукевіча з Таронта ў Аўстралію, якога архіяпіскап Сергій з грэцкім япіскапам Фотіосам хіратанізавалі 10 сакавіка 1968 году ў япіскапы. Гэта выглядала даволі абсурдна, бо на 6 прыходаў БАПЦ прыходзілася 4 япіскапы.

1 жніўня Кастусь Мерляк атрымаў завераную копію прысуда, які быў папярэджаны доўгім уступам такога зьместу:

«Загадана, прысуджана й указана, што выбары 29 кастрычніка 1967 году ёсьць важныя, падсудзімыя Ян Казьлякоўскі, Канстанцін Мерляк, Васіль Шчэцька, Васіль Юрцэвіч. Пётр Мельяновіч, Міхась Брэзоўскі, Леў Леўковіч і Васіль Захаркевіч твораць легальную царкоўную ўправу й ёсьць упаўнаважаныя апякавацца маёмасьцю, кнігамі й пратаколамі абвінавачаных, згодна рэлігійнага карпарацыйнага права, параграф 347.

Загадана, прысуджана й указана, што падсудзімыя ня ёсьць адлучаныя ад царквы й могуць браць удзел у рэлігійных службах і ў іншай царкоўнай дзейнасьці, але ня могуць рабіць нічога, каб перашкодзіць службе або дзейнасьці.

Загададна, прысуджана й указана, каб падсудзімыя адлікалі звальненьне архіяпіскапа Васіля Тамашчыка ды ўзнагародзілі яго за страту жалаваньня, вынікаючага з гэтага.

Загадана, прысуджана й указана, што ніводзін бок ня можа атрымаць звароту коштаў, вынікаючых з гэтага.

Прызнана 8 жніўня 1968 г. »

На падставе прысуду царкоўная ўправа паклікала а.Юрыя, каб абняў настяцельства прыходу. 18 жніўня 1968 году адбылася Божая служба. Ул.Васіль, пабачыўшы а.Юрыя, пакінуў царкву.

ORDERED, ADJUDGED and DECREED, that the election of October 29th, 1967 was [illegible] and defendants, JAN KOZ[illegible]KOWSKI, KONSTANT MIERLAK, VASY[illegible], VASYL JURCEVICH, PETER M[illegible]IANOVICH, [illegible], LEO LEWKOWICZ, and VASIL [illegible]ASHASKEVICZ constitute the legal Board of Trustees of plaintiff and are entitled to custody of plaintiff's property, books and records, as provided by [illegible] Law § 347 and it is further

ORDERED, ADJUDGED and DECREED, that defendants are not excommunicated and may attend religious services and other church activities, but may not do anything which might interfere with [illegible] and it is further

ORDERED, ADJUDGED and DECREED, that defendants revoke the discharge of ARCHBISHOP VASILI TOMASHEK and compensate him for any loss of salary resulting therefrom, and it is further

~~ORDERED, ADJUDGED and DECREED, that defendants [illegible] forever enjoined and restrained from interfering with the religious services and other activities of plaintiff church, and it is further~~

ORDERED, ADJUDGED and DECREED, that neither party shall recover costs herein.

GRANTED
[illegible] 8 1968
Anthony V. Cartafalsa
Dep. Co. CLERK

ENTER
J. S. C.

Anthony V. Cartafalsa
Deputy County Clerk

Ён ня мог служыць разам з а.Юрыям. Гэтае здарэньне царкоўная ўправа не лічыла перашкодай Уладыку Васілю служыць у царкве згодна прысуду.

Архіяпіскап Васіль 25 жніваня 1968 году падаў ізноў на царкоўную ўправу а.Ю.Абрамскага ў Найвышэйшы суд, дамагаючыся пакараньня абвінавачаных за зьнявагу суда й сьведамае невыкананьне прысуду. У заяве Ул.Васіль вінаваціў сяброў царкоўнае ўправы за небывалыя й няпраўдзівыя праступкі. К.Мерляк, ад імя ўправы, злажыў у суд (без адваката) запярэчаньне ў абвінавачаных праступствах і прадставіў свае патрабаваньні да Ул. Васіля й яго памочнікаў. Адным з патрабаваньняў было: «Каб рэвэрэнд Васіль Тамашчык адлікаў адлучэньне ад царквы ўсіх абвінавачаных, і такім чынам прычына закалоту будзе зьліквідавана».

У міжчасе дэлегацыя ад царкоўнае ўправы ў складзе: Л.Галяка, А.Протаса, Я.Казьлякоўскага, В.Шчэцькі й К.Мерляка наведалі Ул.Васіля з мэтай зьліквідаваць закалот у прыходзе. Нажаль, Ул.Васіль заявіў, што ён зьніме адлуку ад царквы тады, калі ўсе паклоняцца перад ім у царкве й прыракуць, што ніколі ня будуць пярэчыць яму ды будуць выконваць усё тое, што ён загадае.

Судзьдзя Фрэнк С.Шаманскі, ня бачучы патрэбы на фармальны суд, паклікаў на 3 кастрычніка 1968 году канфэрэнцыю, з прадстаўнікоў двух бакоў: з аднаго боку Ул. Васіля й П.Манькоўскага, а з другога К.Мерляка. На канфэрэнцыі выявілася, што адзіная перашкода ў тым, што Уладыка ня можа служыць з а.Абрэмскім. Судзьдзя Шаманскі паразумеўся з сакратаром суду сп.Когэн ды станоўча запрапанаваў гэтую перашкоду зьняць, бо ў праціўным выпадку справа будзе разглядацца ў судзе, які зойме нямала часу й прынясе нямалыя кошты. К.Мерляк, ня бачучы лепшай разьвязкі, згадзіўся й падпісаў пратакол.

На агульным надзвычайным сходзе прыхажанаў катэдральнага сабору сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне 12 кастрычніка 1968 году пастаноўлена выйсьці з-пад апекі архіяпіскапа Васіля й зьвярнуцца да япіскапа Андрэя ў Кліўлендзе, каб ён прыняў прыход пад сваю апеку. Просьба была выслана 14 кастрычніка. Уладыка Андрэй у лісьце ад 2 лістапада даў адмоўны адказ, адначасна радзячы пагадзіцца з Уладыкам Васілём.

10 лістапада 1968 году ў Рычмонд Гіл адбыўся сход, які быў скліканы царкоўнаю ўправаю прыходу сьв. Кірылы Тураўскага БАПЦ, 401 Атлянтык Авэ. Бруклін, Нью Ёрк.

На гэтым сходзе былі прынятыя наступныя пастановы:

1.Заарганізаваць прыход сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Квінс, Нью Ёрк.

2.Пабудаваць у Рычмонд Гіл новую царкву.

3.Зьвярнуцца да Экзарха Ўсяленскага Патрыярха з просьбай узяць часова пад сваю апеку Беларускі Праваслаўны Прыход у Рычмонд Гіл, Н.Ё.

Гэтак закончыўся трэці падзел беларусаў у Амэрыцы бээнэраўскага (крывіцкага) боку.

Першы падзел адбыўся ўнутры Рады БНР на эміграцыі, ціха, спакойна бязь ніякіх відавочных кансэквэнцыяў ды шкоды для агульнай грамадзкай справы. З хвілінай падмяненьня бээнэраўскай ідэялёгіі ідэялёгіяй непрадрашэнства, прарасейскага Амэрыканскага камітэту вызваленьня Рада БНР страціла сваю палітычную рацыю існаваньня. Шматлікія радныя махнулі рукою на гэтую камэдыю, другія выйшлі спакойна, а трэція прабавалі ўсё-ж паставіць Раду БНР на належны ўзровень, каб яна была здольнай рэпрэзэнтаваць беларускі нацыянальны вызвольны рух на чужыне. Гэта ішло ў разрэз із прынцыпам непрадрашэнства, бо ў іхняй палітыцы стаяла задача «ліквідаваць нацыянальныя палітычныя цэнтры». Дзеля гэтага старшыня Рады БНР Мікола Абрамчык узяўся за чыстку ў Радзе.

Другі падзел пачаўся ў Галоўнай Управе Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня. На X кангрэсе БАЗА, 1 і 2 чэрвеня 1963 году яны здолелі большасьцю трох галасоў правесці на старшыню др. Ст.Станкевіча. Гэтыя тры галасы яны здабылі ашуканствам, аб чым было пададзена ў свой час да агульнага ведама.

Усё гэта было непатрэбнае, нават гледзячы із становішча групоўкі «прэзыдэнта» або «сакратара сьвяшчэннага сабору». Яны й далей маглі марыць пра пасады ды высокія становішчы на Бацькаўшчыне, надалей маглі працаваць, што й сёньня робяць у Амэрыканскім камітэце, свабодна маглі прадаўжаць апраўдываць, навукова ці ў іншы спосаб, расейскі імпэрыялізм, расхвальвацца дадуманымі дасягненьнямі ды выкарыстоўваць грамадзкія грошы на свае асабістыя патрэбы.

У № 28 «Голасу Царквы» (Каляды 1968) у хроніцы пададзена: «Ул.Васіль, адносячыся да судовых падзеяў, сказаў: «Гэта быў апошні бунтарскі чын, за які яны мелі быць пакараныя судом. Каб пазьбечы гэтае кары, сябры царкоўнае рады на сваім сходзе пастанавілі выйсьці з нашае парафіі. Дзякуючы гэтаму, мы ўжо можам у спакоі, зь любоўю й радасьцю маліцца на славу Богу й на дабро нас і нашага народу».

Далейшыя падзеі паказалі, ці гэта было Слава Богу, і на чыё дабро.

«Беларускі Голас» № 184, чэрвень

Забаранілі маліцца

«Іерэй так званай БАПЦ Віктар Васілеўскі або др.Войтэнка, загадаў старшыні царкоўнай рады прыходу ў Нью Брансьвіку, Нью Джэрзі, паведаміць а.Сьвятаславу Каўшу настаяцелю прыходу сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, што ён не дазваляе яму й яго прыхажанам маліцца на правадную нядзелю над магіламі тых, што пахаваныя на магільніку ў Іст Брансьвік, якім адміняструе яго прыход.

Старшыня заявіў, што ў нас ёсьць сьвятар і, калі хто хоча маліцца, павінен браць только яго, г.з. Віктара Васілеўскага. Бо-ж у цэлай БАПЦ толькі ён адзін і ёсьць.

Калі-ж паставілі пытаньне др. Войтэнку, ці гэта праўда, дык В.Васілеўскі сказаў што так, гэта пастанова бальшыні ягоных прыхажанаў, і ён гэтаму ня можа пярэчыць.

Бязумоўна, які сьвятар, такія й вернікі. Няма ніякага сумніву, што беларусы Нью Брансьвіку здольныя на штосьці падобнае, бо-ж яны ўжо ня раз прымалі дзіўныя пастановы: як напрыклад, «закляйміць» таго ці другога або «пастанавіць, каб «Уладыка» не вянчаў дачкі Стагановіча, бо яна «Выходзіць замуж за ўкраінца», гэты-ж «Уладыка» і паслухаў, але дачка вышла замуж і ўзяла шлюб вуніяцкі. Яны-ж пастанаўлялі і прыезджалі ў Бруклін выганяць пры помачы ВВВ вернікаў із царквы пры 401 Атлянтык Ав., Бруклін. Наогул, яны ня раз праяўлялі нялюдзкі характар у суадносінах да сваіх людзей. Але гэта быў только др. Войтэнкі адказ, ён думаў, што гэтым змусіць людзей, якія-б жадалі памаліцца над магілкамі родных прызнаць, хочучы або не хочучы, яго за сьвятара. Бо-ж толькі ён адзіны, другі, які быў створаны пры помачы паліцыі В.Кендыш ёсьць хворым. Вось тутака выяўляецца сапраўдная мараль сьвятара, замест сказаць, няхай моляцца із сьвятаром, зь якім яны жадаюць, бо гэта-ж будзе выглядаць,

што я сам набіваюся, каб мяне, а не каго іншага, бралі як сьвятара, ведаючы, што ніхто яго за сьвятара не ўзнае.

І, напэўна, сьв.пам.др.А.Орса, Я. Дубяга й У.Кабушак перавярнуліся-б у сваіх дамавінах, пачуўшы голас Васілеўскага, моляшчагася за іхнія душы. Што за пародыя маралі!

Др. В.Войтэнка актыўна памагае выганяць вернікаў із царквы ў Брукліне, пасьвячаецца на сьвятара й адначасна арганізуе «збройныя сілы», разьдзяляе зямлю на Беларусі сваім прыхільнікам, а рэшту сабе, назначае ваяводаў, князёў ды іншых прыблудаў, што маюць панаваць у Беларусі.

Цікава, калі-б была магчымасьць вярнуцца на Бацькаўшчыну сёньня, у якім характары паехаў-бы др.Войтэнка?

Ці із прыладаю, якая своемая акушэру, ці з крыжом у расе сьвятара, ці на кані, як князь-ваявод.

У кожным выпадку, зь якою ён прыладаю не вярнуўся-б, карысьці ані людзям, ані Бацькаўшчыне не прынёс-бы, а наадварот, толькі шкоды.

Але гэтае небясьпекі няма, бо далей Ньюбрансьвіцкага магільніка ён нікуды не паедзе.

К.П.

«Беларускі Голас», № 162, ліпень 1963

Адкрыты ліст

інжынеру Васілю Русаку, сакратару царкоўнае рады прыходу Жыровіцкае Божае Маці.

БАПЦ

Гайлен Парк, Н. Дж.

«Вельмі паважаны спадар Русак:

Спроба перашкодзіць фізычнай сілай сп.Л.Леўковіч памаліцца над магілай матушкі Н.Неслухоўскай, маткі свае жонкі, у сыботу 15 чэрвеня 1968 году на беларускім магільніку ў Іст Брансьвік змусіла мяне напісаць Вам гэты ліст.

Старшыня царкоўнай рады сп.Віктар Дубяга заявіў на магільніку прысутным што ён і прысутныя зь ім парафіяне дзеюць на падставе пастановы царкоўнае рады парафіі, якая была прынятая на просьбу й за благаславенствам Уладыкі Васіля. Падобнага зьявішча наогул у

беларускай гісторыі не запісана, а ў асаблівасьці ў гісторыі Беларускае Праваслаўнае Царквы, каб царкоўная рада ўзяла на сябе абавязак кваліфікаваць, хто можа быць сьвятарам, указваць людзям, якога сьвятара яны могуць браць, каб памаліцца над магілай сваіх родных. Такая пастанова справы моцна парушае беларускую традыцыю талерантнасьці й парушае амэрыканскі закон аб правох чалавека, якога рэлігія й веравызнаньне ёсьць вылучна справай асабістай і непарушальнай. Гэта таксама зьневажае памяць адыйшоўшых ад нас на вечны супакой. На маю думку й думку усіх людзей, гэта вялікая ганьба беларусам Нью Брансьвіку, і, нажаль, вялікі сорам усім беларусам на сьвеце.

Вы можаце маліцца зь кім хочаце й да каго хочаце, але прымушаць вас гэта рабіць зьяўлялася-б пагвалчэньнем волі чалавека. Ніхто нiякімі поступамі й тэрорам не змусіць паважаць і шанаваць Уладыку, які выгнаў із царквы бальшыню сваіх вернікаў, закрыў царкву й падаў іх у суд за тое, што яны прыходзілі ў царкву, дзеля таго толькі, каб даказаць, што яго ўлада безьмяжоўная, нават, як сам гэта гаварыў, роўная Хрысту. Такая пыха й такія пастыпкі ня ёсьць годныя ня толькі пастыра, але нават хрысьціяніна наогул. Такое дзеяньне сьведчыць аб бязбожніцтве, якое засталося ў яго са школы таталітарных сыстэмаў, у якіх ён быў на службе. Убіваньне ў голаву людзям з амбоны, на залях і ў езуіцкай прэсе, што гэта ўсё робіцца на дабро БАПЦ і беларускай вызвольнай справы, толькі прыкрываньне запраўды шкодных намераў і плянаў ня толькі царкве, але й беларускаму вызвольнаму руху.Клясыфікаваньне, дзяленьне, выкіданьне й адлучэньне беларусаў на эміграцыі, дзе кожны чалавек, кожная душа ёсьць дарагая, бо тутака нас мала, напэўна-ж не на карысьць ані БАПЦ, ані БНР, ані вызвольнаму руху наогул, а толькі ворагам беларускага народу.

На няшчасьце, мой цесьць католік ёсьць пахаваны на магільніку, які знаходзіцца пад вашай адміністрацыяй і не спадзявайцеся, што я буду ўБЦРпытацца, якога сьвятара ўзяць з сабой, каб над магілай памаліцца, і я ня думаю, што царкоўная рада ў будучыні будзе перашкаджаць, бо акрамя маральных могуць паўстаць і легальны наступствы.

З пашанаю Кастусь Мерляк.

Нью Ёрк, 19 чэрвеня, 1968 году.»

# Дзейнасьць БАПЦ

Пададзена да ведаму, што 16 сакавіка 1968 году адбыўся агульны сход прыхажанаў парафіі сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне, які быў скліканы часоваю царкоўнаю радаю з благаславенства Ул. Васіля.

Новая ўжо «выбраная», а не назначаная царкоўная рада была ўзначаленая старшынём Мікалаем Гарошкам. Агульны сход прайшоў у высокім рэлігійным настроі.

Чацьвёрты епархіяльны сабор БАПЦ адбыўся ў Брукліне 30 жніўня. У ім узялі ўдзел тры япіскапы. Уладыку Андрэя прызначылі да сябе, і такім чынам япіскапскае непаразуменьне было зьліквідаванае. З важнейшых пастановаў была скліканьне ў 1969 годзе Ўсебеларускага праваслаўнага сабора. Епархіяльны зьезд быў праведзены, як і папярэдні, Ул.Васілём.

«Голас Царквы» № 32 за сьнежань 1970 году падае: «З волі Божае адыйшоў у вечнасьць архіяпіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы Ўладыка Васіль. Сьмерць спасьцігла нечакана. Памёр 6 чэрвеня 1970 году, пры вялікім зьезьдзе вернікаў быў праважаны 17 чэрвеня на месца супакаеньня на беларускім магільніку ў Іст Брансьвіку, у штаце Нью Джэрзі».

Імя архіяпіскапа Васіля было Ўладзімір Тамашчык. Нарадзіўся ён ў 1890 годзе ў в. Вялікія Азяраны, Горадзенскага павету. Тэрмін на працягу 11 дзён часу ад сьмерці да пахаваньня Ул. Васіля выклікаў розныя камэнтары аб прычыне сьмерці й паховінаў. Ліст да рэдакцыі газэты «Беларускі Голас», памешчаны ў № 187 за кастрычнік 1970 год падае:

Спраставаньне

«Епархіяльная ўправа Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на Амэрыку й Канаду на сваім пашыраным паседжаньні дня 5 верасьня 1970 году, азнаёміўшыся з неадказваючымі праўдзе фактамі, паданымі ў газэце «Беларускі Голас» за жнівень месяц № 185 у справе сьмерці й паховінаў сьв. пам. Уладыкі Васіля, у імя праўды асьвечвае:

1.Няпраўдаю ёсьць, што Ўладыка Васіль сам пакончыў сваё жыцьцё, бо прычынаю сьмерці быў атак сэрца, аб чым сьведчыць акт, сьпісаны

лекарскаю камісыяй пры гарадзкой управе й лекарскія доказы дактароў, у каторых Уладыка лячыўся.

2. Выдумкай й маною ёсьць, што паніхіда па сьв.пам. Уладыку Васілю адбывалася каля пустой труны, а цела было ў труну ўложана перад вывазам на магільнік, бо ў сапраўднасьці труна зь целам была прывезена пахароннаю ўстановаю ў кафэдральны сабор ў Брукліне ў панядзелак 15 чэрвеня, аб чым сьведчыць дырэкцыя пахароннага бюро, што выконвала бальзамаваньне цела. Дня 5 верасьня 1970 г.

М.Гумен

Сакратар епархіяльнае ўправы БАПЦ».

Кіраўніцтва Амэрыканскай епархіяй па назначэньню першаерарха БАПЦ архіяпіскапа Сергія абняў япіскап Андрэй. Першаерарх БАПЦ адначасна ўвёў а. Андрэя ў архіяпіскапскае дастоінства й назначыў сакратаром сабору япіскапаў ад 28 ліпеня 1970 году.

Не прайшло нават году ад паховінаў Ул.Васіля, як яго абаронцы на судзе супраць сваіх прыхажанаў у 1968 годзе й прыяцелі, уключаючы служакаў тыпу Манькоўскага й Тулейкі, падалі ў суд 16 сакавіка 1971 году на Міхася Тамашчыка (Томаса), каб ён вярнуў грошы, якія той атрымаў у спадчыну ад свайго брата Ўладыкі Васіля.

Заяву ў суд фармальна злажыў пад прысягай а.Васіль Кендыш, сакратар епархіяльнай рады БАПЦ у Амэрыцы. Яго адвакатам быў ніхто іншы, як сын Мікалая Гарошкі, Валентын Гарошка. Айцец В.Кендыш з адвакатам Гарошкам абвінавачвалі Міхася Тамашчыка й яго жонку, што тыя атрымалі ў спадчыну ад свайго брата маёмасьць, якую Ул. Васіль прыдбаў, будучы архіяпіскапам й адміністратарам Амэрыканскай епархіі БАПЦ.

Абвінавачаньне гучыць так: «Як сказана «Мост Рэвэрэнд» г.зн. япіскап Васіль (Тамашчык) быў упаўнаважаны, што ён рабіў да свае сьмерці, зьбіраць, перахоўваць, адміністраваць і рабіць інвэстыцыі ад свайго ўласнага імя ды ўсе іншыя грошы й маёмасьць, якая цяпер у пасяданьні пасудзімых, згодна артыкулу 18 права аб рэлігійных карпарацыях, пасьведчаньнях інкарпарацыі й Статуту БАПЦ й згодна зь дзеючай рэлігійнай Канстытуцыяй, канонаў, правілаў й царкоўных рэтгілямінаў, належаць да епархіяльнай рады БАПЦ.

Яны дамагаліся прысуду, каб брат Ул.Васіля вярнуў ім 51, 432, 13 даляры з працэнтамі й шкоды суду. Суд цягнуўся пару год. Адвакаты

SUPREME COURT OF THE STATE OF NEW YORK
COUNTY OF KINGS

| | | |
|---|---|---|
| St. Cyril's of Turov Cathedral of the Byelorussian Autocephalic Orthodox Church in America, Inc., and Reverend Vasil Kendysh, as Treasurer of the Diocesan Council of the Byelorussian Autocephalic Orthodox Church in America, Plaintiffs | x | Index no.__________ |
| against | x | Plaintiff designates KINGS COUNTY as the place of trial |
| Michael Tomas, as Administrator of the Goods, Chattels, and Credits of Vasili Tomashek, a/k/a Vasili Tomaszyk, deceased, and Michael Tomas, and Nina Tomas, Defendants | x | The basis of the venue is: PLAINTIFF'S RESIDENCE |
| | | SUMMONS |
| | | Plaintiff resides at 401 Atlantic Avenue Brooklyn, New York County of Kings |

To the above named Defendants:

YOU ARE HEREBY SUMMONED to answer the complaint in this action and to serve a copy of your answers, or, if the complaint is not served with this summons, to serve a notice of appearance, on the Plaintiffs' Attorney within 20 days after service of this summons, exclusive of the day of service (or within 30 days after the service is complete if this summons is not personally delivered to you within the State of New York; and in case of your failure to appear or answer, judgment will be taken against you by default for the relief demanded in the complaint.

Dated: March 16, 1971.

VALENTINE N. HOROSHKO, ESQ.
Attorney for Plaintiffs
Office and Post Office Address
475 Fifth Avenue
New York, New York 10017
TEL: LE-2-4991

Defendants' address:

87-04 63rd Drive
Rego Park, New York
County of Queens

Upon your failure to appear, judgment will be taken against Michael Tomas, as Administrator of the Goods, Chattels, and Credits of Vasili Tomashek, a/k/a Vasili Tomaszyk, deceased, for the sum of $51,422.13 with interest on $42,427.13 thereof from June 12, 1970, on $5,500.00 thereof from November 9, 1960, and on $3,500.00 thereof from January 3, 1966; and judgment will be taken against Michael Tomas, and Nina Tomas by default for the sum of $5,500.00 with interest from November 9, 1960, and for the sum of $3,500.00 with interest from January 3, 1966, plus costs and disbursements.

Фінкельштэйн і Робнсон абаранілі М.Тамашчыка. Сакратар епархіяльнае рады а.Кендыш і другія не атрымалі ні аднаго цэнта. Пра гэта нідзе не было пісана, ані слаўца ў прэсе, тады калі пра суд Ул.Васіля супраць царкоўнае рады гэтага-ж прыходу, асабліва К.Мерляка, на працягу некалькі гадоў абвінавачвалі ў неімаверных і выдуманых злачынствах. Сябры групоўкі строга трымаліся этыкі «пра свайго нельга дрэнна пісаць».

Архіяпіскап Сергій, першаерарх БАПЦ памёр у сыботу 2 кастрычніка 1971 году ў Аўстраліі. Ул. Сергій (Рыгор Ахотэнка) нарадзіўся 25 сакавіка 1890 году ў сяле Малыя Гарошкі, Жытомірскага павету, Украіна. У сьнежні 1949 году Ул. Сергій узначаліў БАПЦ, якая была адноўленая ў Канстанцы, Нямеччына 15 ліпеня 1948 году.

Другі Ўсебеларускі сабор БАПЦ адбыўся 27-29 травеня 1972 году ў царкве Жыровіцкае Божае Маці ў Гайленд Парку, Нью Джэрсі. На прапанову Ул. Мікалая на мітрапаліта аднагалосна быў выбраны архіяпіскап Андрэй. Таксама была выбраная рада кансысторыі, але ня ведама, сабору ці Амэрыканскай епархіі, у складзе: мітрапаліт Андрэй—старшыня, а.В.Кендыш —заступнік старшыні й сакратар, а.К.Стар, П.Манькоўскі, Васіль Русак і Аўген Лысюк—сябры.

Др. а.Віктар Васілеўскі (Войтэнка) памёр 25 кастрычніка 1972 году. Ён быў скарбнікам епархіяльнай рады. Сын прат. Сьцяпана Войтэнкі, закладчыка прыходу ў Нью Брансьвікі й удзельнік сабору ў Канстанцы. Расьціслаў Войтэнка, сын а. Віктара й ўнук а.Сьцяпана быў высьвячаны таксама на сьвятара. Айцец Расьціслаў па прычыне пазьнейшых закалотаў у Амэрыканскай епархіі пакінуў сьвятарства. Другі сын а.Сьцяпана Войтэнкі Мікалай пазьней стаўся скарбнікам епархіяльнай рады Ізяслава. Такім чынам, прэстыж і дынастыя Войтэнкаў у БАПЦ закончылася. У часе ад 1972 да 1979 году заўважваецца рост БАПЦ ня толькі ў Амэрыцы, але ў Англіі й Аўстраліі.

Паводля справаздачаў у епархіяльнае рады ад 20 травеня 1979 году у Гайленд Парку:

«На нарадзе абмяркоўваліся важнейшыя праблемы Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы. Агульную кароткую інфармацыю аб сучасным стане царквы зрабіў сакратар кансысторыі прат.Васіль Кендыш. Зроблены быў агляд дзейнасьці ўсіх 15 парафіяў, якія абслугоўваюць 13 духаўнікоў. Апошнім часам былі пасьвечаны ў сан ерэяў: а.др Расьціслаў Войтэнка з прызначэньнем да катэдральнага

сабору сьв.Кірылы Тураўскага ў Нью Ёрку, а.Аўген Сітнік для парафіі сьв. Апостала ў Пятра, Паўла ў Адэляйдзе, Аўстралія й інж. Ян Бруцкі ў сан дыякана. Шырэй абмяркоўвалася пытаньне набыцьця асяродку для мітраполіі БАПЦ.

Скарбнік кансысторыі сп. Мікалай Войтэнка зложыў фінансавую справаздачу, падкрэсьліўшы, што ў апошнія два гады паступленьні ахвяраў на кансысторыю й на будову цэнтру БАПЦ былі вельмі скупы».

Пасьвячэньне ў сан дыякана Яна Бруцкага заслугоўвае асаблівай ўвагі, бо ён быў пасьвечаны два разы. Першы раз Яна Бруцкага пасьвяціў мітрапаліт Андрэй у Кліўлендзе, а другі раз архіяпіскап Мікалай у Таронта. Бруцкаму палітыкі падказалі, што Ул.Андрэй ня ёсьць кананічны япіскап, а Ул.Мікалай ёсьць кананічны. Дыякану Бруцкаму моцна хадзіла, каб ён быў кананічны, каб у прышласьці яго не залічылі да «некананічных». Другое пасьвячэньне ў дыякана Бруцкага адбылося ў вялікім сакрэце. Але гэты сакрэт хутка выкрыўся й мітр.Андрэй аб гэтым даведаўся. Гэты факт яго моцна раззлаваў. Газэта «Беларускі час» № 21-22 за верасень 1979 году падае коратка аб пасьвячэньні Бруцкага ў сан сьвятара:

«У нядзелю, 26 жніўня 1979 году, у Іст Детройт, Мічыган, у царкве Сьвятога Духа адбылося ўрачыстае высьвячэньне інжынера а.дыякана Івана Бруцкага ў сан сьвяшчэньніка.

Абрад рукапалажэньня выканаў яго прэасьвяшчэнства архіяпіскап Мікалай з Таронта ў асысьце настаяцеля парафіі Сьвятога Духа а.Максіма й сьвятароў БАПЦ а.Аляксандра Яноўскага й а.Расьціслава Войтэнкі.

Падчас банкету голас забіралі др.Б.Рагуля, прадстаўнік Рады БНР, др.Р.Гарошка ад беларускай газэты «Беларускі Час», К.Калоша, старшыня парафіяльнай рады Кліўлендзкай парафіі БАПЦ».

У высьвячэньні ў сан сьвятара Івана (невядома чаму ня Яна) Бруцкага ня браў удзелу мітрапаліт Андрэй, які моцна пакрыўдзіўся за паніжэньне яго сьвятасьці Ул.Мікалаем праз перавысьвячэньне дыякана Бруцкага. Гэты непрыстойны акт у суадносінах да свайго «зьверхніка» быў моцна паніжаючым першаіерарха БАПЦ, які за гэта мсьціўся да свае сьмерці. Прачытаўшы карэспандэнцыю з прабегу ўрачыстага пасьвячэньня ў сьвятары Івана Бруцкага з удзелам духавества й міранаў, ня толькі мітрапаліт Андрэй, але кожны бачыў ігнарацыю мітрапаліта БАПЦ.

Нямала каму было ведама, што Ул.Андрэй ад даўжэйшага часу не згаджаўся з поглядамі Ул.Мікалая на ролю, якую мае выконваць БАПЦ. Ул.Андрэй ня быў кандыдатам групоўкі, якая прадаўжала надалей дзеіць у Радзе БНР, а Ул.Мікалай ёй поўнасьцю падпарадкаваўся, так як раней Ул.Васіль.

Тут трэба зазначыць, што парафія сьв.Духа ў Дэтройце ад 1974 году моцна заактывізавалася, дзякуючы фінансавай дапамозе, якую змог забясьпечыць Мікалай Арцюх, будучы віцэ-прэзыдэнтам банку. Айцец Максім Таўпека—настаяцель і др.Я Сажыч—старшыня праяўлялі актыўнасьць у царкоўных справах, якая выклікала непаразуменьні й канфлікты. Перад тым як перайсьці да хронікі прышлых падзеяў у БАПЦ, прачытаем пасланьне ад 20 травеня 1981 году: «Мы яшчэ не забыліся, калі рукапалажэньне Яна Бруцкага ў сьвятары, як асобы, назначанай на япіскапа БАПЦ, узрадавала ўсіх вернікаў і сьвятарства БАПЦ (сапраўды так ня было—К.М.) і суліла добрыя надзеі на будучыню нашае царквы. Прыемным было й тое, што Ян Бруцкі пераехаў з Дэтройту ў Гайленд Парк, Нью Джэрсі й паступіў на студыі, каб запасьціся багаслоўскімі ведамі».

Подпіс:«У Богу пакорны архіяпіскап Мікалай».

25 лютага 1980 году міт.Андрэй загадаў а.Аляксандру Яноўскаму, настаяцелю прыходу Жыровіцкае Божае Маці ў Гайленд Парку, каб ён пераехаў у Кліўленд. Адначасна назначыў а.Яна Бруцкага настаяцелям гэтага прыходу. 4 травеня 1980 году прыхажане з а.Яноўскім заблякавалі ўваход у царкву й ня ўпусьцілі а.Бруцкага маліцца. На сходзе гэтага дня прынялі рэзалюцыю прасіць архіяпіскапа Мікалая, каб ён узяў іхны прыход пад сваю апеку. Ул.Мікалай лістом з 9 травеня назначыў Яноўскага быць надалей настаяцелям.

Гэтым дзеяньнем а.Яноўскі не падпарадкаваўся свайму правячаму япіскапу мітр.Андрэю, хаця ён меў справядлівыя апраўданьні, каб надалей аставацца ў Гайленд Парку. Затое Ул. Мікалай, прымаючы прыход з Гайленд Парку пад сваю апеку, парушыў каноны й Статут БАПЦ, адначасна не падпарадкаваўся свайму першаіерарху, парушаючы хрысьціянскую мараль—пакоры.

Мітрапаліт Андрэй, прасьледаваны маніяй вялікасьці, ня ўзяў пад увагу людзкіх патрэбаў, ды што гэта Амэрыка, а не царская Расея, адным сказам, аднаго сьвятара перавёз, а другога прывёз, не зважаючы

на ніякія абставіны. Мала таго, мітр.Андрэй лістом з 13 жніўня 1980 году забараніў служыць й выкрэсьліў з сьпіску БАПЦ і верасьня а. А. Яноўскага.

Айцец Іван, ці Ян Бруцкі, у шапку ня спаў: узяў адваката Валянтына Гарошку, ужо дасьведчанага экспэрта ў царкоўных справах, ды падаў у суд на Ул.Мікаля а.Яноўскага ад імя кансысторыі з подпісам сакратара а.В.Кендыша, з просьбаю, каб суд ім загадаў вярнуць прыход мітр.Андрэю й не перашкаджаць а.Бруцкаму быць настаяцелям прыходу. Відаць, абвінаваўцы ня чыталі, што кажа апостал Павал пра сьвецкія суды: «На сорам вам кажу, няўжо няма паміж вамі ніводнага разумнага, хто мог-бы рассудзіць сярод сваіх» (І. Кар. 6:5)

Справа разглядалася ў Вярхоўным судзе штату Нью Джэрзі, 14-16 кастрычніка 1980 году. Судзьдзя Когэн у канцы працэсу падсумаваў:

The total picture is this, the finality of the governing Bishop's decisions is in some doubt.Efforts toward Appeal have been made. The stability of the hierarchy is under challenge. The second ranking ecclesiastical officer of BAOC has acted, in effect, to oust the Primate from office for inability to discharge his duties.It is impossible to say how the landscape will appear after the dust settles. In these circumstances, the plaintiffs' right to relief is far from clear.

"It is based on determinations that may or may not be final and may or may not represent continuing hierarchical authority"

У сутнасьці судзьдзя адмовіўся выдаць прысуд, і справа пакуль што засталася безвыніковай.

15 лістапада 1980 году адбылася нарада БАПЦ, якую праводзіў мітр.Андрэй. Ул.Мікалай у гэтай нарадзе ўдзелу ня ўзяў.

Мітр.Андрэй зрабіў справаздачу, пачынаючы ад Канстантынопальскага патрыярха, а канчаючы на Папе Рымскім. Сакратар кансысторыі зрабіў справаздачу з свае дзейнасьці, а скарбнік Мікалай Войтэнка зь фінансаў. Аказалася, што ў касе ёсьць сабраных грошаў на набыцьцё цэнтру БАПЦ на суму 22, 926,00 даляраў праз прыход у Дэтройце. «Так што на суды грошы ёсьць», —заявіў скарбнік. Апошнім пунктам парадку дня быў разгляд і зацьверджаньне кандыдатаў на япіскапа БАПЦ. Рада БАПЦ аднагалосна зацьвердзіла кандыдатуру а.Яна Бруцкага.

30 лістапада 1980 году мітрапаліт Андрэй і прат. Карп Стар падстрыглі а.Бруцкага ў манахі, а 7 сьнежня мітрапаліт Андрэй павысіў іераманаха Бруцкага ў сан архімандрыта.

У студзені 1981 годзе агульны сход прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне, прыняў пастанову аб зьмене епархіі й пераходзе да арх. Мікалая. Але гэты сход а.Кендыш і адвакат В.Гарошка папярэдзілі заяваю ў суд ад 23 студзеня, што адбудзецца спроба захопу прыходу. Судзьдзя даў адзін месяц часу старшыні А.Міцкевічу, каб прыгатаваць сваю абарону.

У нядзелю, 22 лютага 1981 году адбылася хіратонія архімандрыта Ізяслава Бруцкага на япіскапа Полацкага й вікарыя мітрапаліта БАПЦ. Хіратонію выканалі мітрапаліт Мсьціслаў УАПЦ, мітрапаліт Андрэй (не праверана) й архіяпіскап Орэст УАПЦ, а. Васіль Кедыш, а.Карп Стар ды некалькі сьвятароў Украінскае царквы. Хіратонія адбылася ў Саборы сьв.Андрэя УАПЦ у Бауд Брук, Нью Джэрзі.

7 сакавіка 1981 году адбыўся сабор япіскапаў БАПЦ, у якім бралі ўдзел мітрапаліт Андрэй, япіскап Ізяслаў, а.Кедныш, а.Р.Войтанка й адвакат Гарошка. Сабор пацьвердзіў тэрытарыяльны падзел на епархіі, а галоўнае, што мітр. Андрэй падтрабуе ад архіяпіскапа Мікалая пакаяньня й прызнаньня сваіх грахоў.

29 сакавіка мітрапаліт Андрэй адлучыў ад царквы (налажыў анафэму) на Ўладзіміра Русака й Аляксандра Міцкевіча за іхнюю рэвалюцыйную дзейнасьць супраць царквы.

16 травеня сабор двух япіскапаў БАПЦ у Брукліне мітрапаліт Андрэй і япіскап Ізяслаў з удзелам а.Расьціслава Войтэнкі й адваката Валянтына Гарошкі пастанавілі за парушэньне канонаў 32, 34, 35 і Статуту БАПЦ, арт.№ 12, 13.

а.Пазбавіць архіяпіскапа Мікалая пасады адміністратара епархіі.

б.Забараніць у служэньні літургіі й усіх абрадаў.

в.Пазбавіць япіскапства ў БАПЦ.

18 жнівеня 1991 году Вярхоўны суд штату Нью Ёрк прызнаў, што кіруючым япіскапам Амэрыканскай епрахіі БАПЦ ёсьць мітрапаліт Андрэй. Роўна пасьля 13 гадоў царква, набытая вернікамі прыходу, якіх архіяпіскап Васіль заставіў адысьці, была забраная ад прыходу й перададзеная ягоным вучням-спадкаемцам, яшчэ больш бедным духам.

У міжчасе рабіліся спробы, калі толькі пачаўся закалот у Гайленд Парку, асобамі, якія ў гэты час стаялі з боку гэтае валынкі. К.Мерляк даваў параду др.Я.Сажычу й другім сябрам Рады БНР старацца палагодзіць пасварыўшыхся між сабою двух Уладыкаў, каб пазьбегчы

далейшага скандалу. У выпадку калі-б усе людзі не памаглі, тады трэба прывесьці Ул. Мікалая да мітр.Андрэя, зачыніць абаіх у пакоі ды вытлумачыць, што беларуская нацыянальная справа вымагае, каб БАПЦ існавала, разьвівалася й дапамагала беларускаму вызвольнаму руху, што яна для гэтага створаная на эміграцыі.

А дзеля гэтага пэрсанальны антаганізм двух япіскапаў павінен быць зьліквідаваны. Япіскапам трэба было заявіць, што ня выйдуць з пакою, пакуль ня пагодзяцца й не пацалуюцца. Гэта быў-бы даволі радыкальны спосаб, але іншага выхаду ня было. Аднак др.Жук—Грышкевіч, католік і старшыня Рады БНР, адзін з важнейшых пэрсанажаў групоўкі, заявіў, што рэлігійныя справы да Рады БНР не належаць і ў споры між праваслаўнымі япіскапамі мяшацца ня будзе. Др. Жук-Грышкевіч ня быў здольны да ніякае дзейнасьці, хіба толькі лавіць рыбу. Ён любіў сядзець у першым радзе на грамадзкіх урачыстасьцях ды атрымоўваць прывітальныя тэлеграмы. Ён не ўяляў сабе, што ў «прэзыдэнта» могуць быць ня толькі прыемныя, але й складаныя функцыі, што часамі бывае неабходнасьць ужыць радыкальнага характару меры, каб бараніць інтарэсы свайго народу, а ў даным выпадку беларускага грамадзтва на эміграцыі.

Калі-ж А.Бруцкі й В.Гарошка распачалі суды, было ясным, што растрацяцца грамадзкія грошы на адвакатаў з абодвух бакоў і ня ведама, чым гэта скончыцца. Як другую альтэрнатыву выхаду з становішча, Мерляк запрапанаваў тым самым асобам ў радзе БНР, каб яны зрабілі ўплыў на архіяпіскапа Мікалая, каб ён перайшоў пад апеку Канстантынопальскага патрыярха, што дапаможа хутка раз і на заўсёды зьліквідаваць суды, якімі «незалежныя» япіскапы БАЦП стараюцца кіраваць беларускім рэлігійным жыцьцём. Гэтым-бы Ул. Мікалай адчыніў дзьверы да аб'яднаньня ўсіх прыходаў у адну Беларускую Праваслаўную Царкву ў Амэрыцы. Адказ на гэта быў: «Тады мы страцім аўтакефалію й незалежнасьць».

К.Мерляк стараўся пераканаць, што на эміграцыі, на чужой зямлі, хаця гасьціннай, ніякае незалежнасьці ня можа быць ды яе сёньня й ў БАПЦ няма. Усе справы вырашаюць сьвецкія суды, а чужыя судзьдзі, якія не разумеюць ані праваслаўнае веры, ані патрэбаў беларускага народу, вырашаюць нашыя жыцьцёвыя справы бяз нас.

Будучы пад апекай патрыярха, беларускія прыходы, уключаючы некананічныя, аб'ядналіся-б у адну Беларускую Праваслаўную Цар-

кву ў Амэрыцы. Цэрквы як украінская, румынская й сэрбская, што знаходзяцца ў юрысдыкцыі Канстантынопальскага патрыярха праводзяць сваю рэлігійную й нацыянальна-грамадзкую дзейнасьць без ніякіх перашкодаў. Яны знаходзяцца ў высокай пашане ўсіх цэркваў і амэрыканскага грамадзтва, тады калі БАПЦ разглядаецца як нейкі вырадак у праваслаўнай сям'і, ня ўмеючы сама сабою кіраваць. Такое нежыцьцёвае, нерэальнае й упорыстае становішча групоўкі, якая у даным выпадку магла зрабіць свой уплыў на ход падзеяў й вярнуць загублены аўтарытэт і пашану Радзе БНР.

30 красавіка 1982 году Ул. Мікалай й некаторыя сябры царкоўнае рады прыходу сьв. Кірылы Тураўскага ў Таронта атрымалі пакліканьне на суд, распачаты кансысторыяй (Ізяслаў і а. В.Кендыш), адвакатам групы Бэйкер й МакКенэі. У абвінавачаньні Ул.Мікалая называюць «Міхаіл Мацукевіч, раней ведамы як архіяпіскап Мікалай».

Датаю 1 травеня 1982 году архіяпіскап Мікалай выслаў ліст да мітрапаліта Андрэя, які пачынаўся з словаў: «Перадаю да Вашага ведама, што я адыходжу ад далейшага ўдзелу ў Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай царкве на адпачынак». Але арх.Мікалай 3 травеня лістом паведаміў, што ён адклікае свой адыход ад БАПЦ па просьбе прыходаў у Кліўлендзе, Дэтройце, Гайленд Парку й Таронта. Тут сталася так, што другое паведамленьне Ул. Мікалая некаторыя атрымалі раней чымся першае. Ул. Мікалай думаў, што адмоваю зрабіць добрае для царквы, але пад ціскам некаторых у групоўцы мусіў свой адыход адклікаць.

5, 6, й 18,19 травеня адбыўся паўторны Вярхоўны суд й Нью Брансьвіку, Нью Джэрсі пад старшынствам таго самага судзьдзі Рышарда С.Когэн. На гэтым судзе Ул. Мікалай як і ў 1968 годзе сьведчыў як экспэрт кананічнага права. Гэтым разам судзьдзя Когэн ня выдаў прысуду. Пагэтаму яп.Ізяслаў падаў 19 ліпеня 1982 году на апэляцыю ў апэляцыйны аддзел, Апэляцыйнага суду на Нью Джэрсі.

У лістападзе 1982 году кансысторыя БАПЦ, г.зн. Ул.Ізяслаў і а. Кендыш, падалі заяву Фэдэральнаму суду ў Кліўлендзе з просьбай загадаць царкоўнай радзе прыходу Жыровіцкае Божае Маці перадаць усю царкоўную маёмасьць Амэрыканскай епархіі, якую яны раней перадалі япіскапу Мікалаю ў Таронта, Канада.

13 травнея 1983 году а.В.Кендыш прадаў за 50,000.00 даляраў маёмасьць прыходу сьв.Тройцы ў Дороты, Нью Джэрсі міфічнай місіі

БАПЦ, з адрасам адваката В.Гарошкі. Месяц пасьля місія пад старшынствам В. Гарошкі падала ў суд а.Карпа Стара, настаяцеля прыходу, каб ён заплаціў місіі суму 106, 000.00 даляраў за карыстаньне маёмасьцю місіі. Няма сумніву, каму была патрэбная такая зьдзелка. На запатрабаваньне суда прадставіць дакумэнты аб заснаваньні місіі й сьпісу яе сяброў, Гарошка ня мог выканаць. Судзьдзя пераканаўся, што гэта фікцыя й справу выкінуў з суду.

Айцец Карп Стар перайшоў назад пад апеку Ул.Мікалая. Пасьля сьмерці свае жонкі, прыняў манашаства, а Ул.Мікалай узнагародзіў яго санам архімандрыта.

21 травеня 1983 году памёр мітрапаліт Андрэй. Пахаваны 23 травеня на беларускім царкоўны магільніку ў Іст Брансьвік, Нью Джэрсі.

28-29 травнея 1983 году ў Кліўлендзе, Агаё, адбыўся надзвычайны сабор БАПЦ, які быў склікана раней выбранай камісіяй. На саборы быў выбраны першаерарх БАПЦ Ул.Мікалай, бо другога ўжо ня было. На гэтым саборы пацьверджана, што а.Бруцкі напралом, бяз ведама вернікаў і ўсіх япіскапаў БАПЦ, быў хіратанізаваны супраць правілаў Праваслаўнае царквы, таму сабор ня лічыць яго япіскапам БАПЦ.

2 ліпеня 1983 году рада БАПЦ у саборы сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне адсьпявала «Вечная памяць» мітрапаліту Андрэю й адначасна «Многае лета» першаіерарху БАПЦ архіяпіскапу Ізяславу.

Ад 1979 да 1981 году інжынер Іван Бруцкі за няпоўныя два гады перайшоў ўсе ступэні праваслаўных герархаў: ад простага міраніна да япіскапа й першаіерарха БАПЦ. У сьвятым пісаньні сказана, што Дух Сьвятое Тройцы сыйшоў на апосталаў, які іх асьвяціў і зрабіў іхнымі прапаведнікамі хрысьціянства. Калі-б гэта сталася пасьля хіратоніі, то ня было-б ніякага сумніву, што яго асьвяціў Сьвяты Дух. Але ён быў ужо мудры раней. Дык які тады дух асьвяціў яго?

Суды, як той пажар, пачалі пашырацца бескантрольна. 30 верасьня 1988 году фэдэральны суд у Дэтройце адкінуў прапанову, зложанай радай прыходу Сьв.Духа , зьліквідаваць судовую расправу. Царкоўная рада ў Кліўлендзе распачала контракцыю ў судзе супраць а.В.Кендыша, каб «ён не садзіў носа ў не сваё проса».

26-27 травеня 1984 году адбыліся два Трэція саборы БАПЦ —адзін у Амэрыцы, а другі ў Англіі. Першы сабор адбыўся ў 1948 годзе ў Канстанцыі. На ім была адноўленая Аўтакефалія Беларускае Праваслаўнае Царквы. Другі праходзіў у 1972 г. ў Гайленд Парку, Нью Джэрсі

Трэці сабор БАПЦ. Адзін із іх адбыўся ў Гайленд Парку. На ім былі прадстаўленыя шэсьць прыходаў: чатыры ў Амэрыцы й па аднаму ў Англіі й Аўстраліі з 5 сьвятарамі. На саборы была выбраная рада БАПЦ зь першаіерархам арх. Мікалаем й айцамі Стар, Яноўскім, Раданковічам і Страпко ды 8 асобаў ад міранаў.

Трэці сабор БАПЦ. Другі зь іх адбыўся ў Манчэстэры ў Англіі. На ім былі прадстаўленыя ужо 11 (!) прыходаў: 4 ў Амэрыцы (тыя самыя прыходы, што й на саборы ў Гайленд Парку), 1 — у Англіі й 6 у Аўстраліі ды 6 сьвятароў.

Першае пытаньне было: выбары мітрапаліта. Усім ведама, што мітрапаліта выбіраюць япіскапы царквы, а каб існавала царква, патрабуецца прынамсі два япіскапы. За мітрапаліта Ізяслава галасавалі 3 сьвятары й міране, улючна з Уладзімірам Курылай. Была выбраная рада БАПЦ або, як яны называюць, кансысторыя: мітрапаліт Ізяслаў—старшыня, а.Кулакоўскі, а.Кедныш, а.Смаршчок, а.Абабурка, а.Пекарскі й а.Таўпека—сябры. Ня ўсе айцы былі прысутныя на саборы, але яны былі выбраныя завочна.

25 сьнежня 1985 году Ул.Мікалай выслаў ліст да Валентына Гарошкі, каб ён прылажыўся да зьліквідаваньня сьвецкіх судоў, матывуючы рознымі аргумэнтамі, як патрыятызм, хрысьціянскай маральлю, справядлівасьцью, любоўю да свае царквы, усё тое, што Гарошку ня цікавіла ды ён не разумеў значэньня гэтых словаў:

«Наша сьвятая БАПЦ траціць усе свае сілы на сьвецкія суды. Шэсьць гадоў сьвецкіх судоў у БАПЦ выразна паказала якую руіну яны прыносяць для яе.Выдадзена ўжо каля 150 тыс. амэрыканскіх даляраў ды растрачаны аўтарытэт і пашана. Гэта ёсьць наяўны доказ, што сьвецкімі судамі царквы ня збудуем, а толькі зьнішчым яе й растрацім вернікаў...Ужо трэці з чаргі судзьдзя ў Дэтройце, пасьля Нью Брансьвіку й Трэнтану, кажа нам, каб мы пагадзіліся. Таму яшчэ раз зьвяртаюся да Вас, сп.В.Гарошка, да тых людзей, што судзяць нас і якіх Вы прадстаўляеце ў сьвецкім судзе, як адвакат, і горача заклікаю да паразуменьня».

Гэты ліст застаўся голасам у пустыні, ніякага водкугу не пасьледавала.

Наступныя тры гады актыўнасьць у беларускіх царквах абмежаваліся да падрыхтоўкі дакумэнтаў і сьведчаньняў у судах ды абвінавачаваньні аднаго боку другім у прэсе, на пропаведзях, на зборках

і паседжаньнях грамадзкіх арганізацыяў, асабліва ў сем'ях, якія разьбіліся, наведваньнем аднае або другое царквы.

Стан судоў у пачатку 1990 году выглядаў прыблізна так: цэрквы ў Брукліне й Дэтройце былі прысуджаныя Ул.Ізяславу. Цэрквы ў Таронта у Дорорты — Ул.Мікалаю. Судовая справа з царквой у Кліўлендзе незакончаная, яна практычна належыць да Ул. Мікалая. Адносна царквы ў Гайленд Парку судзьдзя сказаў, што маёмасьць прыходу належыць да БАПЦ, але да каторае кансысторыі, разьбірайцеся самі. «А калі ня можаце пагадзіцца, то зьвярніцеся да каталіцкіх япіскапаў, можа яны вам памогуць»,—сказаў, судзьдзя й моцна стукнуў малатком па стале, каб і глухія пачулі. Такім чынам, царква й прыход засталіся ў епархіі Ул.Мікалая.

За восем гадоў япіскапы БАПЦ прычыніліся да фармальных і нефармальных (праслухоўваньне сьведкаў) 31 судовых распраў. Суды ў Амэрыцы вельмі дарагія, нягледзячы на тое, што яны дзяржаўныя. Адвакаты за прысутнасьць на судзе, за падрыхтоўку справы й розыскі патрабуюць неімаверныя сумы. У лісьце да В.Гарошкі Ул.Мікалай падае, што да 1986 году ўжо выдалі 150, 000.00 даляраў. Гэтая сума зьяўляецца сьціплай і нерэальнай, аб чым сцьвярджае адв.Гарошка ў зацемцы пад загалоўкам «У парафіі Сьв.Духа ў Дэтройце», зьмешчанай у «Беларускім часе» № 60 за лістапад 1988 г. «Апэляцыя найбольш зможа адцягнуць выкананьне судовай пастановы на нядоўгі час, і гэтае адцягваньне будзе каштаваць адшчапенцам больш за 10, 000.00 даляраў». Суды БАПЦ япіскапа Мікалая каштавалі ў суме больш-менш 250, 000.00 даляраў, а БАПЦ япіскапа Ізяслава каштавала няменш, толькі з той розьніцай, што адвакат Гарошка, прынамсі, на палову сумы яшчэ чакае нагоды, каб атрымаць. Ён свой рахунак ужо даўно прадставіў сакратару кансысторыі а.В.Кендышу.

Сьвецкія суды БАПЦ можна падзяліць на тры катэгорыі:

1.Не падпарадкаваньне сьвятара правячаму япіскапу.

2.Пасяг аднаго япіскапа на тэрыторыю другога.

3.Каму або да якое епархіі належыць маёмасьць БАПЦ.

У першай і другой катэгорыі, судзьдзі ня выносілі канкрэтных пастановаў. Але пасьля сьмерці мітрапаліта Андрэя й пасьля двух сабораў сытуацыя зьмянілася на карысьць мітрапаліта Ізяслава.

З хвілінаю сьмерці першаіерарха архіяпіскапа Мікалая, а ён старэйшы, юрыдычна перастае існаваць яго БАПЦ. Першаіерарх БАПЦ

архіяпіскап Ізяслаў пойдзе ў суд з заявай загадваць усім прыходам, якія належалі архіяпіскапу Мікалаю, перадаць усю маёмасьць правячаму першаерарху БАПЦ архіяпіскапу Ізяславу. Выносячы такую пастанову, судзьдзя будзе пакладацца на папярэднія рашэньні фэдэральнага суду, бо справа самапагадненьня адпала па волі лёсу. На гэта цярпліва чакаюць мітрапаліт Ізяслаў, а. В.Кендыш, а перадусім В.Гарошка, бо яму будзе нагода атрымаць рэшту ганарара за суды. Але Ўсявышні кіруе лёсам людзей, так што ўсё можа стацца наадварот.

Ад 1979 году й да сьнежня 1990 на змаганьне ўнутры БАПЦ была растрачана нямала грошаў, часу й энэргіі. Абвінавачваньні аднаго боку другім робяць шкоду БАПЦ , беларускаму народу, вызвольнаму руху. Але гэтага было мала: зласьліва, часта непраўдзіва, абвінавачвалі адзін другога ў здрадніцтве, безхрыбетнасьці, амаральнасьці й зайздрасьці. Ведама, што групоўка, якая дзеіла ў Радзе БНР, пэрсанальна зь бегам часу мянялася, але палітыка й дзейнасьць яе заставалася бяз зьменаў. Мітрапаліт Андрэй быў імі ігнараваны, а архіяпіскап Мікалай моцна фаварызаваны, чым у большай часьці спрычыніліся да закалоту й падзелу. Дзеючая групоўка была дамінаваная каталікамі й правуніятамі. Пад іхнім уплывам У.Васіль падаў у суд, каб адкінуць тых, што пайшлі ў апазыцыю палітыкі непрадрашэнства, што было спалучана ў адну «каўза» групоўкаю. Яны цьвердзілі, што яны бароняць аўтарытэт Ул.Васіля, а гэтым самым незалежную БАПЦ. Але яны не баранілі аўтарытэту мітрапаліта Андрэя, а наадварот стараліся яго абнізіць, а аўтарытэт Ул. Мікалая павысіць. Адначасна прапагандуючы, што беларуская царква мусіць быць незалежнай і толькі яна будзе такой, калі ёю будзе кіраваць Ул.Мікалай. Гэта быў езуіцкі трык, ім не расходзілася пра дабро БАПЦ, а расходзілася пра тое, каб вуніяцтва пашыралася, згодна палітыкі Ватыкану. Гэтым яны скампрамітавалі Праваслаўную Беларускую Царкву й паказалі, што беларускае грамадзтва няздольнае незалежна сабою кіраваць. Горш таго, на сорам усім беларусам, перад праваслаўнымі цэрквамі на цэлым сьвеце, яны зьвялі адзіных двох япіскапаў, каб вадзіліся як два казлы

К.Мерляк ніколі ня верыў, хаця яму цэлы час цьвердзілі «праваслаўнафілы», што ўсяму ёсьць вінаваты Ватыкан. У сутнасьці ён і сёньня сумневаецца, што Ватыкан беспасрэдна ў гэтым меў нейкія дачыненьні. На яго думку, гэта была работа тых, часта не каталікоў,

хто несьвядома ажыцьцяўляе езуіцкую палітыку Ватыкана. Няма патрэбы на іх пальцам паказваць, яны ўсім ведамыя.

Шуканьне віноўных прадаўжалася. У газэце «Беларускі час» № 30 за сакавік 1981 г. памешчаны артыкул «Падзеі паўтараюцца», ускладаецца віна на а.Юрыя Абрэмскага, таму што ён быў падасланы Масквою на разьбіцьцё БАПЦ. Тлумачэньні К.Мерляка ў артыкуле «У імя Праўды» рэдактар «Беларускага Часу» Р.Гарошка, брат адваката В.Гарошкі, адмовіўся надрукаваць у сваёй газэце.

У імя праўды

«У артыкуле «Падзеі паўтараюцца», які быў надрукаваны ў газэце «Беларускі час» № 30 за сакавік 1981 г. падана, што маскоўская Патрыярхія паслала дыякана Юрыя Абрэмскага, мэтаю якога было здабыць сабе прыхільнікаў у парафіі й прымусіць Ул. Васіля адыйсьці ад кіраўніцтва БАПЦ.

Якім чынам а.Юры мог-бы дасягнуць гэтага не сказана, але далей гаворыцца аб яго разбуральнай дзейнасьці ў прыходзе катэдральнага сабору сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне й аб тым, што ён астаўся верны маскоўскай Патрыярхіі й ад яе атрыма ў мітру. Ці яго Маскоўская Патрыярхія прыслала, ці не, то аўтар артыкула ня мае на гэта належных дадзеных і таму не зьбіраецца яго ў гэтым бараніць. Але тое, што Маскоўская Партыярхія дала ямі мітру, ёсьць няпраўдай.

Калі а. Юрыю забараніў Ул. Васіль служыць у БАПЦ, то ён зьвярнуўся да Ул. Паладзія УАПЦ з просьбаю, каб ён яго прыняў пад сваю апеку. Ул. Паладзій яго прыняў і ўзнагародзіў, надаючы яму чын мітрафорнага пратаярэя. А.Юры тады сам, за свае грошы прыдбаў мітру. Дакумэнты, дадзеныя а.Юрыю, паказваюць, што яны выдадзеныя на адзін тыдзень раней ад даты забароны.

А.Юры надалей выконваў абавязкі сьвятара для адыйшоўшых прыхажанаў. Між іншым а.Юры Абрэмскі й а.Ануфры Іванюк разам вянчалі дочку сп.Захаркевічаў у ліпені 1968 г., у Украінскай царкве, на адзінаццатай вуліцы ў Нью Ёрку. Гэтая царква сёньня пад апекай Ул.Андрэя, які належыць да Канстантынопальскага Патрыярхату. Айцец Іванюк быў пазьней хіратанізаваны ў япіскапы УАПЦ і атрымаў імя Орэст. Ён-жа браў удзел у хіратоніі япіскапа Ізяслава.

Дзейнасьць а.Юрыя, пераліčаная ў гэтым артыкуле, зьяўляецца сьмешнай, не паважнай, а перадусім не праўдзівай. Канфлікт у

прыходзе катэдральнага сабору сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне, які спрычыніўся да адыходу большае часткі прыхажанаў, быў выклікаты грамадзка-палітычнымі разыходжаньнямі, якія паўсталі ў той час (1966-1968) у беларускім грамадзтве ў Амэрыцы.

Апанэнты аднаго боку сьведама перанесьлі грамадзкі канфлікт на прыход і выкарысталі япіскапскі сан Ул.Васіля для расправы над сваімі ўяленымі «працаўнікамі» ў Амэрыканскім судзе, у газэце «Беларус» і ў прыватнай нагонцы.

Выглядае, што ананімны аўтар артыкула ня ведаў, у чым была справа, як ня ведаў і не разумеў гэтага й а.Юры Абрэмскі. Ён апынуўся на баку прыхажанаў, бо яны яго хацелі мець за настаяцеля, а Ул.Васіль адмовіўся яго назначыць на гэтае становішча.

Прыпісаныя «заслугі» а.Юрыю ў падзеле прыходу БАПЦ у Брукліне й пададзеныя непраўдзівыя факты, у ніякім выпадку ня можна залічыць да атакі на БАПЦ, а толькі можна залічыць аўтара да несаліднага, непаінфармаванага, неаб'ектыўнага чалавека.

Калі-ж «Падзеі паўтараюцца», то ў артыкуле ясна суліцца чытачом газэты «Беларускі Час», што й цяперашнія непаладкі ў БАПЦ, якія паданыя на разгляд у амэрыканскія суды, выкліканыя ня кім іншым, як толькі пасланцом Маскоўскае Патрыярхіі. Бо калі-ж тады гэтым пасланцом быў а. Юры Абрэмскі, то, скажыце, калі ласка, хто ім ёсьць цяперака?»

Кастусь Мерляк
30 травеня 1981 г.

«Голас Царквы« № 57, 1985-86 у артыкуле «Каб усе ведалі» пісаў:

«Прыгадваем, што сталася пры пакойным Уладыку Васілю ў 1968 г., калі «дзеяч» Мерляк, прайграўшы справу ў судзе, забраў з парафіі катэдральнага сабору сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне цёмных, як сам, паляшукоў і павёў іх «у грэкі», дзе папаў ува абдымкі Саўтрывэрскіх зарубежнікаў. За грошы тых-жа небаракаў-паляшчукоў пабудаваў ён у Квінсе царкоўку, якой тут захапляецца Акула, выхвалючы іх за пабудаваньне «помніка» нашаму народу, хоць і ведае добра, што ўсе яны адыйшлі ад свайго й ад свае царквы, а тая царкоўка належыць ня ім, а грэкам. Пабудавалі яны помнік не свайму народу, сваёй глупасьці й цемнаце, бо ўсе іхныя ахвяры пайшлі марна. »

Рада пад старшыствам мітрапаліта Ізяслава Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы выдае «Голас Царквы» рэлігійна-грамадзкі часапіс праваслаўных беларусаў. Гэтая-ж рада, як відаць, складаецца з мітрапалітаў, акадэмікаў, дактароў, адвакатаў ды ўсякага роду інтэлігэнтаў, а іх пакінулі цёмныя паляшукі з К.Мерляком і асьмеліліся пабудаваць сваю «царкоўку» у Квінсе. Цікава, як гэта магло стацца (цемнякі пабудавалі не «царкоўку», а прыгожую царкву, й пайшлі да «грэкаў», а не ў сьвецкія суды), што мітрапаліт Ізяслаў і ўсе яго акадэмічныя чады да сёньня моляцца ў саборы, які свайго часу купілі «цёмныя палешукі» з удзелам К.Мерляка.

Вось такога ўзроўню й калібру людзі маняцца кіраваць Беларускаю Аўтакефальнаю Праваслаўнаю Царквою.

# Прыход сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл

Беларусы, якія былі змушаныя адыйсьці ад прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Брукліне ў кастрычніку 1968 годзе, пачуліся моцна пакрыўджанымі, асірацелымі й асуджаныя на заняпад нікім іншым, як іхнім Уладыкам Васілём, якога яны кармілі, даглядалі, а перадусім паважалі. З неразумелых для бальшыні вернікаў прычынаў, яны былі пазбаўленыя свае царквы, без якое, як сказаў той-жа самы Уладыка, зь іх некаторыя пойдуць у чужыя праваслаўныя цэрквы, некаторыя з часам па аднаму вернуцца назад, а рэшта прападзе ў моры чужынцаў.

Да гэтага нельга было дапусьціць. Гэта была-б для ўсіх вялікая ганьба. Дзеля гэтага зараз-жа прыступілі да ажыцьцяўленьня пастановы 10 лістапада 1968 году—пабудаваць у Рычмонд Гіл сваю царкву. На гэтым самым сходзе Пятро Пецько першы ўнёс на будову 500.00 даляраў у камітэт будовы царквы, які складаўся з наступных асобаў: Міхася Брэзоўскага, Кастуся Мерляка, Пятра Мельяновіча, Пятра Зыбайлы й Васіля Юрцэвіч

21 чэрвеня 1970 году адбыўся ўрачысты малебен і ўмураваньне каменя пад царкву. У камень уложаны дакумэнт і сьпісак вернікаў і будаўнікоў царквы.

«Беларуская Праваслаўная Царква сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Квінс, Нью Ёрк, ЗША закладзена ў год ад стварэньня сьвету 7478 і ад нараджэньня Збавіцеля Сьвету Ісуса Хрыста 1970 году ў кадэнцыю Прэзыдэнта Злучаных Штатаў Амэрыкі Рышарда М.Ніксан і кіруючага архірэя Яковоса Экзарха Канстантынопальскага Патрыярха і пры настаяцельстве айца Сьвятаслава Коўша ды ўсіх вернікаў прыходу.

21 чэрвеня 1970 г.»

У міжчасе, 9 лютага 1969 году, быў рукапаложаны ў сьвятары дыякан Сьвятаслаў Коўш на настаяцеля прыходу. Першая Богаслужба адбылася ў Украінскай Праваслаўнай Царкве ў Амэрыцы 22 лютага 1969 году. Хорам кіраваў ад гэтага часу дырыгент Сымон Жамойда.

Да часу ўваходу ў сваю царкву службы адбываліся ў Прэзбітэрянскай і епіскапальнай цэрквах.



*Пабудова царквы сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл.*

Пабудова царквы ў асноўным была закончана ў 1975 годзе, хаця выканчэньне й абсталяваньне прадаўжалася яшчэ пару гадоў. На пабудову царквы ўнесьлі грошы пяць прыходаў, пяць грамадзкіх арганізацыяў, 237 асобаў у суме ад 5 да 4 тысяч даляраў. Разам сабрана на будоўлю 85,000.00 даляраў, пазычана 25,000.00 даляраў, пры будове працавала 41 асоба й уложана 20, 752 гадзіны бясплатнай працы на суму 114,000.00 даляраў. Калі дадаць закуплены й ахвяраваны інвэнтар і рэлігійныя прылады, то разам кошт царквы сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл будзе 250,000.00 даляраў. Вартасьць-жа яе ў сэрцах вернікаў неацанімая. Мастацкае выкананьне царквы належыць да сьв.пам. Міхася Брэзоўскага, народнага мастака, а ўся будова, за выняткам працы 3 кантрактараў, належыць да беларускіх рук.

Ад 22 лютага 1969 году да 5 травеня 1977 году настаяцелям быў а.Сьвятаслаў Коўш і пры яго настаяцельстве была пабудаваная царква сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл.



*Царква сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл.*



Іканастас царквы сьв.Кірылы Тураўскага, Рычмонд Гіл.



У часе літургіі: архіяпіскап Мікалай і прысутныя сьвятары (зьлева) архімандрыт Язэп, а.Грыгоры, а.Сьвятаслаў і а.Павал



*21 чэрвеня 1970 г. Урачысты Малебен, пасьвячэньне і ўмацаваньне каменя пад новую царкву сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл. Квінс, Нью Ёрк.*

Пасьля сьмерці а.Мікалая Лапіцкага, 8 жніверя 1976 году, а.Коўш абняў прыход сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры, Нью Джэрсі, а гэтым самым і становішча адмінстратара (да наступнага зьезду) Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Амэрыцы. На працягу 5 месяцаў служылі ў нас сьвятары госьці.

6 лістапада на сьвятара ў царкве сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл япіскапам Філатэосам быў высьвячаны Пятро Саўчыц. На гэтую ўрачыстасьць, столь важную ў жыцьці прыходу, К.Мерляк прыбыў з Маямі.

Прыход у Рычмонд Гіл пачаў сваё жыцьцё 1 кастрычніка 1968 году з 42.53 даляраў у касе скарбніка Мельяновіча. У 1969 годзе быў куплены пляц, апрабаваны й апрацаваны гарадзкой управай Нью Ёрку плян. Архітэктура апрацаваная архітэктарам Марыё Тучаронэ пры дапамозе інж. І.Касяка й Міхася Брэзоўскага. У гэтым-жа годзе было сабрана 11,702.73 даляры.

Легальны прыход быў аформлены 27 лютага 1969 году з назовам Амэрыканска—Беларуская Незалежная Праваслаўная Царква

Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква

КАНСЫСТОРЫЯ

No. 463/74

Very Rev. Vasil Kendysh
73 NARRAGANSETT STREET
SPRINGFIELD, MASS. 01107

29-га лістапада 1974г.

Його Прэпадобію
а.Сьвятаславу Каўшу
Настаяцелю Парафіі
й Парафіяльнай Радзе
Сьв.Кірылы Тураўскага
ў Рычмонд Гіл,Нью Ёрк.

Кансысторыя Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы пры гэтым перасылае Вам пастанову Высокапраасьвячэннага Мітрапаліта А н д р э я Першагэрарха БАПЦ аб зьняцьці анатэмы наложанай сьв. Архіепіскапам Васілём, аб чым паведаміце заінтэрэсаваных паводле выбранае Вамі формы.

Прат. Васіль Кендыш -
Ират.Васіль Кендыш
Сакратар

сьв.Кірылы Тураўскага. Пасьведчаньне інкарпарацыі 067708. Чартар падпісалі: Ян Казьлякоўскі, Кастусь Мерляк, Васіль Шчэцька, Пятро Мельяновіч, Васіль Захаркевіч, Леанід Леўковіч, Васіль Юрцэвіч, Міхась Брэзоўскі, Пятро Саўчыц.

Юрысдыкцыйнае афармленьне было палагоджане пасьпяхова. Архіяпіскап Яковос, Экзарх Канстантынопальскага Патрыярха, прыняў прыход сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл пад сваю апеку. Такім чынам, прыход прылучыўся да прыходаў, якія былі ад даўжэйшага часу пад апекай Усяленскага Патрыярхату. Яны разам стварылі беларускую епархію, адміністратарам якое быў пратапрасьвіцер Мікалай Лапіцкі.

**THE MOST REV. METROPOLITAN ANDREW**
**BYELORUSSIAN AUTOCEPHALIC ORTHODOX CHURCH**
**3517 West 25th Street, Cleveland, Ohio 44109**
**Telephone 741-8767**

Nr. 183 / 289 Date 25-га лістапада 1974

С-ву: Яну Казьлякоўскаму,
Канстанціну Мерляку, Васілю Шчэцьку,
Пётру Мельяновічу, Пётру Саучыцу,
Лявону Жуковічу, і Васілю Захаркевічу.

Сабор Эпіскапаў Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы на экзылю, на нарадзе дня 9-га лістапада 1974 года, разгледзеўшы справу адлучаных ад Царквы сьв. пам. Архіепіскапам Васілём у лістападзе 1967 года былых парафіянаў парафіі сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, 401-403 Атлянтык Авэ., пастанаву:

1. Узяць пад увагу просьбу й пакаяньне пакараных: Яна Казьлякоўскага, Канстанціна Мерляка, Васіля Шчэцька, Пётра Мельяновіча, Пётра Сачыца, Лявона Жуковіча і Васіля Захаркевіча, а таксама іхнюю ахвярную працу пры аднаўленьні Сабору на Атлянтык Авэ., ахвяры і працу на будову новае Царквы на Рычмонд Гілл, а таму пастаноўлена вымененых вышэй асоб ад наложанае Архіепіскапам Васілём кары адлучэньня ад Царквы - звольніць

2. А для адышоўшых ужо ў вечнасьць а. Юрыя Абрамскага, Васіля Круцэвіча й Міхася Брэзоўскага няхай сам Госпад Бог даруе й угрунтуе іх, каб былі яны бязьвіннымі. /І Кар. І-8/.

+ Мітрапаліт Андрэй

Клівлэнд,
Лета Божага 1974
м-ца Лістапада 25 дня.

Мітрапаліт Андрэй
Першаерарх БАПЦаркви на экзылю.

Айцец П.Саўчыц праслужыў у прыходзе сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл два гады й два месяцы й пакінуў прыход 7 студзеня 1980 году. Між А.Пятром і дырыгентам Сымонам Жамойдам паўсталі непаразуменьні, прычына якіх ніколі не была ўстаноўленая. А.Пятро зажадаў ад царкоўнае ўправы звальненьня са становішча дырыгэнта С.Жамойду, адначасна заяўляючы, што калі дырыгэнт ня будзе звольнены, дык ён пакіне прыход. Царкоўная ўправа дырыгента ня

звольніла, дык а.Пятро забраў антымінс і пакінуў прыход, не паведаміўшы ні адміністратара, ні свайго япіскапа. А.Пятро Саўчыц быў чалавекам зь вялікай дозаю цынізму, сьведамы беларус з моцнай падліўкай праваслаўнага русафільства. Цэлы час ён быў актывістам у бэцээраўскім лягеры, заядлым праціўнікам БАПЦ і вуніяцтва.

Ад 3 верасьня 1976 году П.Саўчыц займаў становішча старшыні выканаўчага воргану БЦР. Па нейкім часе ён быў прыняты ў Расейскую Зарубежную Царкву й ўзнагароджаны настаяцельствам у прыходзе ў Патэрсоне, Нью Джэрсі. Нарэшце, ён асягнуў таго, да чаго імкнуўся цэлае жыццьё, не зважаючы на тое, што сваім паступкам прынёс сорам сябрам БЦР ды зьняважыў выканаўчы ворган БЦР.

На настаяцеля прыходу прыехаў з Чыкага архімандрыт Язэп (Строк). Ён пакінуў прыход сьв.Кірылы Тураўскага 8 лістапада 1981 году і ўступіў у сьв. Ціханаўскі манастыр Амэрыканскай Праваслаўнай Царквы ў Пэнсыльваніі.

Наступным настаяцелям быў ераманах Рыгор (О'кіф). Амэрыканец, адпушчаны нам Украінскай Праваслаўнай Царквою. Айцец Рыгор праслужыў ад 14 сакавіка 1982 году да 30 верасьня 1984 году. Вярнуўся назад у сваю ерпахію, але, нажаль, абяцанага яму месца не прыдзялілі, і ён застаўся надалей запасовым сьвятаром у сваёй епархіі.

Ад верасьня 1984 і па 27 жніўеня 1989 году настаяцелям быў а.Усевалод Шэмяціла. На яго месца прыйшоў назад архімандрыт Рыгор, які ад 10 верасьня 1989 году з украінскай епархіі перайшоў настала ў Беларускую Праваслаўную Царкву.

Старшыня царкоўнае ўправы прыходу Ян Казьлякоўскі, які перавыбіраўся кожныя два гады, пераехаў жыць у паўдзённую частку Нью Джэрсі. На яго месца 14 лютага 1982 году быў выбраны К.Мерляк 14 лютага 1982 году, які перавыбіраецца ўжо некалькі разоў.

З важнейшых падзеяў у жыцьці прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, трэба адзначыць высьвячэньне царквы сьв.Кірылы Тураўскага, якое адбылося 30 кастрычніка 1983 году. З гэтай нагоды была выдадзена «Памятка высьвячэньня», у якой інфармавалася пра пабудову царквы й гісторыю прыходу. Яна была ўручана кожнаму прысутнаму на ўрачыстасьці.Чын высьвячэньня выканаў архіяпіскап Мікалай Амісоскі (Сміско), дэлегаваны экзархам Канстантынопальскага патрыярха архіяпіскапам Яковсом у акружэньні прысутных сьвятароў.

THE CITY OF NEW YORK
OFFICE OF THE MAYOR
NEW YORK, N.Y. 10007

October 30, 1983

To All in Attendance
Ceremonies Attendant to the
Consecration of St. Cyril
of Turov Byelorussian-
American Orthodox Church
Richmond Hill, New York

Greetings:

On behalf of more than seven and a half million New Yorkers of all faiths and of all national backgrounds, I salute the reverend clergy, the board of trustees and the many friends and members of this church on this historic occasion.

May the spirit of this great day remain with you, to be shared with us all for generations to come.

Sincerely,

Edward I. Koch
Mayor

На банкеце з прывітаньнямі й прамовамі выступалі: Уладыка Мікалай, сп.Майкал Сатырас (старшыня рады Рэспубліканскіх этнічных клюбаў), з асабістым прывітаньнем ад сябе й пісьмовым ад Прэзыдэнта ЗША Рональда Рэйгана кангрэсмэн зь Нью Ёрку Гэры Акэрман, сп. Джон Нікас, прадстаўнік ад губэрнатара Марыю Куомо. Даніла Мерляк прачытаў прывітаньне ад сэнатара Альфонса Д'яматой й мэра горада Нью Ёрк Эдварда Коча. Праф. Томас Бэрд вітаў ад япіскапа Бруклінскае Дыяцэзыі Франціска Мугавэры й ад сябе асабіста. Далей прамаўлялі а.Павал Вялікі, а. С.Коўш і а.Рыгор.

Кангрэсмэн Джозэф Адабо, які быў у царкве, але не здолеў застацца на банкеце, падарыў царкве амэрыканскі сьцяг, што быў вывешаны на Капітоліі ў Вашынгтоне.




*Кастусь Мерляк (зьлева) перад будынкам царквы дзякуе за амэрыканскі сьцяг кангрэсмэну Джозэфу Адабо.*

К.Мерляк у сваёй прамове гаварыў аб гісторыі заснаваньня прыходу й будаваньня царквы й дзякаваў усіх за ўдзел у будаўніцтве.

29 травеня 1984 году адбылася сустрэча К.Мерляка, прадстаўніка прыходу сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл і др.Янкі Запрудніка, рэдактара газэты« Беларус», з мітрапалітам Варшаўскім і ўсяе Польшчы архіяпіскапам Васілём, які знаходзіўся ў ЗША ў рэзыдэнцыі мітрапаліта Амэрыканскае Праваслаўнае Царквы Тэодосія ў Саясэт.

У канцы сяброўскай гутаркі й абмену інфармацыяў Уладыка падзякаваў і благаславіў беларусаў на чужыне за тое, што яны трымаюцца свае роднае мовы й веры бацькоў, ды паабяцаў, што беларуская мова будзе ўведзеная ў календар ПАПЦ, на наступны год, каб яе роля ў рэлігійным жыцьці беларусаў у Польшчы пашыралася.



*Мітрапаліт Варшаўскі й усяе Польшчы архіяпіскап Васіль у гутарцы з К.Мерляком падчас спатканьня 29 травеня 1984 г.,Саясэт, Нью Ёрк.*

PRAWOSŁAWNY METROPOLITA
WARSZAWSKI I CAŁEJ POLSKI
03-402 Warszawa
Al. Gen. K. Świerczewskiego 52
tel. 19-34-09
Nr

Warszawa, dnia Колядьі -Новы Год98 4/5

Христос Раждаецца! Слаўцк Яго!

Дараги и Вельмипаважаны Брат ва Хрысьце
Пане Кастусь Марляк!

Млю Вам ва Хрысьце Иисусе найлепшыя пабажання з аказы Калядь,Багаяулення и Новага Року.Млю Бога,каб дау лепшу долю ма им Братом и Сестрам-Беларусам,куды Их тольки не занес лос па ус му свету.Вам хачу выключна пажадаць дабра ад усяго серца:здарол и спауненння усих Вашых добрых замерау.

Дзякую Вам за Ваш падарак-партрэцик и ахвяру,якую я пе радау на пабудову царквы.Молимся за ахвярадауцау.Цяпер мы будуе 16 церквау у разных мясцах Польщи.

Хачу Вам падсказаць адну маю думку и пабажання.Вашай Св,Беларускай Царквы трэба уваисьци у ФЭДЭРАЦИЮ з Амэрыканскаи Аутокефальнаи Праваслаунаи Царквою-Митрапалита ФЕодосия.Там есьць,кроме других,албанцы,якия маюць святароу и сваю родную мову.Лондански Беларуская Царква Вам не спрыяе.Вл.Изяслау Вас ня любиць.

Прашу напишэце мне,што Вы аб гэтым думаеце?
Хай благаславиць ВасхХристос Бог!Ваш малитоўник

Дзякую за усе!

Митрапалит Васиь

1000-годзьдзе хрысьціянства на Беларусі прыход сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл адзначыў у нядзелю 31 травеня 1987 году. Урачыстасьць узначаліў архіяпіскап Мікалай (Сміско) першаерарх Карпато-Рускай Царквы ў Амэрыцы, як прадстаўнік архіяпіскапа Яковоса, Экзарха Канстантынопальскага Патрыярха.

У Багаслужбе ўзялі удзел: а. пратапр. Сьвятаслаў Коўш, а.Усевалод Шэмяціла—настаяцель нашае царквы, архімандрыт Язэп Строк, іераманах Рыгор( О'Кіф), а.пратапр. Павал Вялікі, а.Мячыслаў Брынкевіч, і падыякан С.Жамойда, дыякан Канстанцін і спадарожнік Ул.Мікалая сэмінарыст Рыгор Бэн. Хорам кіраваў С.Жамойда.

У царкоўнай залі падчас банкету праграму вёў К.Мерляк— старшыня царкоўнае ўправы. Праф.Томас Бэрд зрабіў даклад «Хрысьціянства ў Беларусі ад IX стагодзьдзя да 1944 году».

Удзельнікамі сьвяткаваньня прыслалі прывітаньні: Прэзыдэнт ЗША Рональд Рэйган, губэрнатар штату Нью Ёрк Марыё Куомо, мэр гораду Нью Ёрк Эдвард Коч, сэнатары Боб Доўл, Альфонс Д'Амато й Данель Мойніган. Прывітаньні прыслалі шматлікія беларускія арганізацыі з усяго сьвету ды цэлы рад прыватных асобаў.

Уладыка Мікалай у кароткай прамове выказаў сваё задавальненьне з удзелу ў сьвяткаваньні, падкрэсьліў важнасьць гэтай урачыстасьці, падзякаваў гаспадарам за гасьціннасьць.К.Мерляк прадставіў прысутным духоўных асобаў і выдатных гасьцей, якіх было больш за 20 асобаў.

Жанчыны прыходу сьпеклі з нагоды 1000-годзьдзя торт. Мерляк выказаў пажаданьне, каб хрысьціянства ў Беларусі разьвівалася яшчэ другія тысячу гадоў. На залю вынесьлі торт з запаленымі сьвечкамі. Айцы патушылі сьвечкі, а хор на мэлёдыю «Многае Лета» сьпяваў: «Тысячагодзьдзя, тысячагодзьдзя...»

Падчас пабыту ў Злучаных Штатах ад 2 да 29 ліпеня 1990 году Яго Блажэнства архіяпіскап Канстантынопальскі й Усяленскі Патрыярх Дымітрыёс прыняў беларускую дэлегацыю на аўдыенцыі ў Нью Ёрку.

Газэта «Беларус» № 372 за жнівень 1990 году пісала:

«Рада Беларускай Праваслаўнай Царквы Паўночнай Амэрыкі (епархія), якая ўваходзіць у юрысдыкцыю Ўсяленскага Канстантынопальскага Патрыярха, была ўдастоена спаткаць Патрыярха Дымітрыёса 14 ліпеня ў гатэлі Вальдорф—Асторыя ў Нью Ёрку. Спатканьне адбылося ў 11 гадзін раніцы. Беларускую дэлегацыю прадставіў Патрыярху архіяпіскап Якавас, апякун нашай епархі. Яго сьвятасьць вітаўся з кожным з дэлегацыі й благаславіў кожнага».

На гэтай аўдыенцыі Яго блажэнства Патрыярх Дымітрыёс прамовіў да нашай дэлегацыі й сказаў, у асноўным, наступнае:

—Я ведаю, што наш народ моцна пацярпеў у сваім гістарычным жыцьці, асабліва ў гэтым стагодзьдзі ад уціску за веру й дамаганьне волі ад бязбожнай чужой улады ...

—Я захоплены моцнай верай вашага народу на Бацькаўшчыне ды вашай верай і дзейнасьцю на эміграцыі. Ваша вера, захаваньне вашае мовы, культуры й традыцыяў сваіх продкаў сьведчаць, што з Божай дапамогаю ваш народ дасягне ўсяго таго, чаго ён, як і ўсе іншыя народы, дамагаецца».

Яго Блажэнству быў уручаны таксама мэмарандум, падпісаны адміністратарам беларускай епархіі а.протапрасьвіцерам Сьвятаславам Каўшоў, настаяцелям прыходаў і старшнымі царкоўных упраў. Апрача звароту ды іншых нагадваньняў у мэмарандуме ёсьць і такі параграф:

«У часе 2-й сусьветнай вайны нашы праваслаўныя айцы й міране беларускага народу сабраліся ў горадзе Менску ў 1942 годзе, каб абвесьціць вызваленьне Беларускае Праваслаўнае Царквы з путаў атэізму. Наша царква ў тым часе ўсім сэрцам жадала быць пад амафорам Усяленскага пасаду Канстантынопаля. Зь міласьці ўсемагутнага Бога, наша надзея споўнілася толькі на эміграцыі, за то мы вельмі ўдзячныя».



*Яго Блажэнства архіяпіскап Канстантынопальскі й Усяленскі патрыярх Дымітрыёс.*



*Яго Блажэнства архіяпіскап Канстантынапальскі і Ўсяленскі Патрыярх Дымітрыёс прымае дэлегацыю Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Паўночнай Амэрыцы, 14 ліпеня 1990 г, Нью Ёрк.*



*Абед з нагоды 18-х угодкаў першае службы (29.X.72) у царкве сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, 4 сьнежня 1990 г.*

*Зьлева направа: Ганна Бартуль, сьпявак Сяржук Сокалаў—Воюш, дырэктар хору Сымон Жамойда, брат Міке, а.Рыгор і К.Мерляк — старшыня царкоўнае ўправы.*

# Лёс архімандрыта Язэпа

Архімандрыт Язэп (Строк) ушанаваў сваёю прысутнасьцю ўрачыстае сьвяткаваньне 1000-годзьдзя хрысьціянства ў Беларусі, ладжанае прыходам сьв. Кірылы Тураўскага 31 травеня 1987 году.

Пры гэтай нагодзе К.Мерляк меў гутарку з архімандрытам Язэпам, і ён даў да зразуменьня, што пакідае Ціханаўскі манастыр і плянуе выехаць у Польшчу. У пачатку ліпеня 1988 году К.Мерляк атрымаў два кароткія лісты, адзін з Масквы, а другі з Варшавы, у якіх адным сказам архімандрыт Язэп прасіў прыслаць яму вызаў у Амэрыку, бо яго памылкова зарэгістравалі польскім «абывацелям».

20 ліпеня 1988 г.

Яго Дастойнасьці архімандрыту Язэпу, Варшава.

Дарагі Ойча:

«Вярнуўшыся з Грэцыі й Турцыі 19 ліпеня, зь вялікім зьдзіўленьнем пасярод немалай колькасьці лістоў я знайшоў вашыя два лісты, за якія, а таксама за памяць, шчыра дзякую.

Я й Аня выехалі па справах мае працы ў Грэцыю ды, карыстаючыся гэтай нагоды, правялі там нашыя вакацыі, што ўсё разам заняло тры тыдня. Вось дзеля гэтага мой адказ на вашы лісты спозьнены, за што моцна Вас перапрашаю.

Як выглядае, Вашыя два лісты пісаныя адзін з Варшавы, а другі з Масквы, і я не магу разабрацца, каторы зь іх быў пісаны першым. Я наогул не разумею Вашай прысутнасьці ў Польшчы ды адначасова ў СССР. Я ўсе думаў, што Вы знаходзіцеся ў Ціханаўскім манастары, а тут раптоўна такая вестка, супярэчная ўсякай лёгіцы.

Не ўваходзячы ў сутнасьць справы, чаму Вы фактычна апынуліся паза ЗША, ды не разумею, чаму так хутка жадаецае вярнуцца назад, пасьля спаленых мастоў за сабою.

Наперакор шчыраму жаданьню дамагчы Вам, нажаль, мы гэтага зрабіць ня маем магчымасьці, і я думаю, што Вы, знаючы Амэрыку й маё асабістае становішча, гэта зразумеце бязь ніякага ўпроку, хаця можа мой адказ на Вашыя лісты ня ёсьць актуальным, але на ўсякі выпадак я высылаю яго ў паданыя мне 2 адрасы. Жадаем Вам, Ойча, усяго найлепшага, а перадусім здароўя на многія лета. Просім маліцца за нас грэшных. Як заўсёды з любоўю, Кастусь і Ганна Мерляк».

# Епархія без беларускага япіскапа

Калі прыход сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл быў ужо афармлены,узяты пад апеку Экзархам Канстантынопальскага Патрыярхату, ён пабольшыў лік беларускіх прыходаў, якія вымагалі арганізацыйнага ўпарадкаваньня. Айцец Мікалай Лапіцкі, які выконваў абавязкі каардынатара між настаяцелямі й Экзархам архіяпіскапам Яковосам, склікаў царкоўны зьезд на 27-28 сакавіка 1970 году ў Саўт Рывэр, Нью Джэрсі.

На зьезде бралі ўдзел: а.Лапіцкі—ад прыходу сьв.Еўфрасіньні Полацкай ў Саўт Рывэры, а.С.Коўш—ад прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, а.А. Міраловіч—ад прыходу сьв.Юрыя ў Чыкага, а.архімандрыт Язэп Строк—ад прыходу сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Таронта, Канада й дэлегаты ад вернікаў. У прэзыдыюм зьезду былі выбраныя: а.М.Лапіцкі—старшыня, а. С.Коўш—заступнік старшыні, прысутныя сьвятары й дыякан А.Махнюк. Сакратарамі былі выбраныя К.Мерляк і М.Сенька.

Зьезд распачаў сваю працу прачытаньнем атрыманай тэлеграмы ад Экзарха архіяпіскапа Яковоса з благаславеньнем і пажаданьнем добрых вынікаў у працы зьезду. Пастаноўлена прыняць назоў: Царкоўная Рада Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Амэрыцы. Аднагалосна быў выбраны яе адміністратарам а.М.Лапіцкі. Аб патрэбе беларускага япіскапа разьвязалася жывая дыскусія: адныя былі за стварэньне беларускага япіскапату, а другія казалі, што з гэтым ня трэба сьпяшацца. У выніку ўсе згадзіліся, што беларускі япіскап ёсьць неабходнай патрэбай. Ян Казлоўскі падаў кандыдата на япіскапа архімандрыта Язэпа Строка. Тут усе зашумелі—адны за, а другія супраць яго кандыдатуры. Айцец Сьвятаслаў Коўш узяў голас і заявіў: «Калі архімандрыт Язэп будзе кандыдатам на япіскапа, я пакідаю прыход у Рычмонд Гіл». К.Мерляк, бачучы, што а.Коўш можа пакінуць прыход, а гэта раўнялася-б стрыманьню будовы царквы ды прынесла нямалыя клопаты здабыць сьвятара, правёў з а.Каўшом цэлую ноч, пераконваючы яго застацца й не адыходзіць ад прыходу.

Назаўтра інж. Касяк запрапанаваў адлажыць справу япіскапату да часу, пакуль ня будзе апрабаты ад Канстантынопальскага Патрыярха Атэнагораса І. Адначасна прапанаваў рэзалюцыю ў гэтай справе, якая была прынятая аднагалосна. Такім чынам, інцыдэнт выкліканы а.

GREEK ORTHODOX ARCHDIOCESE OF NORTH AND SOUTH AMERICA

ΕΛΛΗΝΙΚΗ ΟΡΘΟΔΟΞΟΣ ΑΡΧΙΕΠΙΣΚΟΠΗ ΒΟΡΕΙΟΥ ΚΑΙ ΝΟΤΙΟΥ ΑΜΕΡΙΚΗΣ

10 EAST 79th STREET, NEW YORK, N.Y. 10021 • TEL.:(212) 620-2500 • CABLE: ARCHGREEK, NEW YORK

June 18, 1971

The Rev. Father Nikolaj Lapitzki
Whiteruthenian Greek Orthodox Church of St. Euphrosynia
187 Whitehead Avenue
South River, New Jersey 08882

Dear Father Nikolaj:

As I conveyed to you on June 16 by telephone, His Eminence, Archbishop Iakovos, has directed me to advise you that His All Holiness, Ecumenical Patriarch Athenagoras I informed His Eminence, Protocol #424, dated May 6, 1971, that the Holy Synod has considered your request submitted to it in September 1970, for the nomination for a candidate for Bishop of the Byelorussian Parishes within the Western Hemisphere. The name of such a candidate, nominated by the Consistory of your Church, would be submitted to the Holy Synod of the Ecumenical Patriarchate for its consideration and election.

The Byelorussian Parishes in the Western Hemisphere would be under the spiritual jurisdiction of the Ecumenical Patriarchate, through its Exarch, Archbishop Iakovos.

Conveying to you and the clergy and faithful of the Byelorussian Parishes, the paternal blessings and good wishes of His Eminence, Archbishop Iakovos, I remain

Sincerely in Christ,

Very Rev. George J. Bacopulos
CHANCELLOR

Каўшом залагодзіўся. Таксама была выбрана камісія для выпрацаваньня Статуту Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Амэрыцы.

Ліст да яго сьвятасьці сусьветнаму Патрыярху Афінагору I пачынаўся так: «Прыпадаючы да стоп Вашай Сьветласьці мы, праваслаўнае беларускае духавенства й вернікі, пражываючыя ў ЗША Амэрыкі й Канадзе, прыбыўшыя на царкоўны зьезд, які адбыўся дня 27 і 28 сакавіка 1970 году ў Саўт Рывэры, Нью Джэрсі ў ЗШАмэрыкі, з пакораю просім прыняць пад ўвагу наступнае... Мы вельмі просім высьвяціць япіскапа беларуса для кіраўніцтва беларускімі прыходамі й апекі над рэлігійным жыцьцём праваслаўных беларусаў, расьцярушаных у розных краінах вольнага сьвету сярод розных народаў. У гэтым будзе вялікая дапамога беларусам, каб зьберагчы сваю праваслаўную веру й беларускую нацыянальную асобнасьць.

На заканчэньне, мы выражаем глыбокую ўдзячнасьць Вашай сьвятасьці й усім Экзархам Вашай Сьвятасьці, у юрысдыкцыю якіх беларускія прыходы маюць рэлігійную апеку й пастырскае кіраўніцтва.

Просім сьвятых малітваў Вашага Сьвяцейшаства»

Ліст падпісалі:

Протапрасьвіцер Мікалай Лапіцкі—старшыня зьезду.

Прасьвіцер Сьвятслаў Коўш—віцэ-старшыня.

Канстанцін Мерляк—сакратар.

Міхаіл Сенька—сакратар.

Гэты ліст-просьба была даручана экзарху архіяпіскапу Яковосу ў яго канцылярыі 9 ліпеня 1970 году дэлегацыяй у складзе:пратапр. Мікалая Лапіцкага, інж.Касяка й К.Мерляка.

З канцылярыі Экзарха архіяпіскапа Яковоса, а.М.Лапіцкі атрымаў паведамленьне ад 18 чэрвеня 1971 году, што Сьвяты Сынод узяў пад увагу просьбу. (Пратакол №424 з 6 травеня 1971 году). Гэта была добрая навіна для стварэньня беларускага япіскапату, толькі патрэба была прадставіць кандыдата на япіскапа.

У «Беларусе» № 169, травень 1971 г.пісалася: «Галоўнай тэмай нарадаў была справа аднаўленьня беларускага япіскапату ў вольным сьвеце. Як відаць з справаздачы й ліста, вернікі беларускіх парафіяў, што належаць да грэкаў, дамагаюцца свайго япіскапа. Тут яны паступаюць правільна, бо япіскап мог пазьбіраць гэтыя параскіданыя парахвіі (кожная пад іншым грэцкім япіскапам) у вадну цэласьць. Япіскап мог-бы стварыць прынамся дыцэзыю ў патрыяршай юрысдыкцыі.

У 1966 годзе у Буэнос Айрэс, Аргентына, выйшла кніга, напісаная архіяпіскапам Апанасам, які свайго часу ўлучыўся ў Расейскую Зарубежную Праваслаўную Царкву, пад загалоўкам «Беларусь в исторической, и государственной, и церковной жизни», з наступнай дэдыкацыяй: «Сей труд посвящаю родине, быть может навсегда потерянной для меня, как равно потерян и я для нее.» На кнігу моцна зарэагавалі расейскія манархісты, а ініцыятыўная група «Вялікай недзялімай Расеі» зрабілі пратэст у 1970 годзе ў Сынод і пераслалі на рукі мітрапаліту Філарэту. Апошні сказ гэтага пратэсту быў такі: «Мы задыхаемся в той атмосфере лжи, обмана и взаимной вражды, которую создал здесь архиепископ Афанасий, и терпеть это больше не можем. Пощадите нас, сьвятыя отцы, ведь жить становится тошно. Брисбен 1970 г.»

Газэта «Новое Русское Слово» за 14 студзеня 1971 году падае да ведама: «Архиепископ Афанасий, ранее ўправлявший Австралийской епархией, по-прежнему остается на покое». Гэтая-ж самая газэта з 12 жніўня 1971 г. падала да ведама, што Сынод Расейскай Зарубежнай Царквы забараніў сваім «чадам» чытаць кнігу «Беларусь», напісаную архіяпіскапам Апанасам.

Ініцыятыўная група прыходаў Саўт Рывер і Рычмонд Гіл пастанавіла зьвярнуцца да архіяпіскапа Апанаса, каб ён прыехаў у Амэрыку, заапякаваўся беларускімі прыходамі ды ачоліў Беларускую Праваслаўную Царкву ў краінах вольнага сьвету. Адначасна мелі выслаць яму грошы на прыезд з Аўстраліі. Яшчэ ня пасьпелі выслаць ліста й грошы, як сьвятары М.Лапіцкі й С.Коўш распачалі контрадзеяньне. Саўтрывэрскі актыў спалохаўся пагрозаў сьвятароў ды ня выслаў архіяпіскапу ні ліста, ні грошаў. Прыходу сьв.Кірылы Тураўскага зьвярнулі 400.00 даляраў, якія былі высланыя на білет архіяпіскапу Апанасу. Чуліся, між іншым, і такія галасы: «Вы ня маеце грошаў аплаціць належна сьвятара, а хочаце яшчэ япіскапа».

Наступны царкоўны зьезд адбыўся 21 травеня 1977 году ў Саўт Рывэры. На ім была зробленая справаздача часовага адміністратара а.Сьвятаслава Коўша. Пасьля дыскусіі выбралі а.Каўша на сталага адміністратара царкоўнае рады. К.Мерляк ня браў удзелу ў працы гэтага зьезду, бо ня мог прыехаць з Маямі.

Чацьвёрты зьезд Царкоўнае Рады Беларускай Праваслаўнай Царквы Амэрыкі, скліканы адміністратарам а. Сьвятаславам Каўшом, адбыўся

11 лістапада 1980 году ў Саўт Рывэры. Акрамя справаздачаў ды іншых справаў былі разгледжаныя два пытаньні: першага Статуту й япіскапату.

Першы параграф Статуту, прыняты зьездам, кажа: «Беларуская Царкоўная Рада ў Паўночнай Амэрыцы зьяўляецца аўтаномнай епархіяй у рамках Экзархату сусьветнага Канстантынопальскага Патрыярху ў Амэрыцы. Беларуская Царкоўная Рада ў Паўночнай Амэрыцы складаецца зь беларускіх праваслаўных прыходаў у Злучаных Штатах Амэрыкі й Канадзе, якія праз сваіх прадстаўнікоў ад духавенства й вернікаў выбіраць ўладу ў беларускай епархіі Паўночнай Амэрыкі».

Другім пытаньнем стаяла справа беларускага япіскапа епархіі. К.Мерляк, заступнік старшыні царкоўнае ўправы прыходу сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, прадставіў рэзалюцыю Прэзыдыюму зьезду, якая была прынятая агульным сходам прыхажанаў 11 лютага 1979 году. Ён прамовіў:

«Беларускія праваслаўныя прыходы, маючы прызнаньне і дазвол на свой япіскапат ад Канстантынопальскага патрыярха Атэнагораса, павінны былі да гэтага часу высьвеціць беларускага япіскапа ды аформіць Беларускую Праваслаўную Царкву на чужыне з незалежнай ад нікога адміністрацыяй.

Афіцыяльнае афармленьне Беларускае Праваслаўнае Царквы на чужыне ёсьць неабходнае для захаваньня беларускасьці ў прыходах на прышласьць ды забесьпячэньне прыхадзкое маёмасьці для наступнага пакаленьня.

Беларуская Праваслаўная Царква ёсьць неабходнай для аб'еднаньня беларускага грамадзтва, а гэтым самым узмацьненьне нацыянальнага руху ў змаганьні за вызваленьне Беларусі з-пад расейска-камуністычнай няволі ды павышэньнем беларускай рэпрэзэнтацыі ў вольным сьвеце як у справах рэлігійных, так і грамадзка-палітычных.

Усе неабходныя даныя ў нас ёсьць, каб зрабіць першы крок. Гэта значыць, высьвяціць беларускага япіскапа, бо далейшае адцягваньне будзе шкодным для Беларускай Праваслаўнай Царквы й для беларускае нацыянальнае справы. Дзеля гэтага прысутныя на сходзе прыходу сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, 11 лютага 1979 году пастанавілі зьвярнуцца з просьбаю да адміністратара Царкоўнай Рады да настаяцеляў прыходаў царкоўных управаў, да беларускіх палітычных і грамадзкіх арганізацыяў, да адасобленых людзей, каб неадкладна пачалі дзеяньне ў падрыхтоўцы кандыдата,хіратанізацыі

яго ў япіскапа ды афіцыяльнае афармленьне Беларускай Праваслаўнай Царквы на чужыне й запрапанаваў архімандрыта на кандыдата, каб яго апрабавалі ды распачалі стараньні, каб яго высьвяціць».

Супраць кандыдата архімандрыта Язэпа высупіў інж. Іван Касяк. Тады выказаліся ўсе сьвятары супраць архімандрыта, падаючы розныя аргумэнты, каб не сьпяшацца з высьвячэньнем япіскапа. Вынікам дыскусіі была прынятая прапанова інж.Касяка пакінуць справу да вырашэньня свайму духавенству. Гэта была ўжо даўно ведамая тактыка, каб спыніць дыскусію ў справе япіскапату на ўсіх грамадзкіх зборках і зьездах, калі міране выказваліся, каб рабіць націск на сьвятароў, адносна неабходнасьці япіскапа.

Пяты зьезд Царкоўнае Рады адбыўся 18 травеня 1985 году. На ім разам сьвятары: а.С. Коўш, Саўт Рывэр, А.Шэмяціла, Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, а.Сегень, Чыкага, а.Вялікі, Таронта, прызналі, што патрэба для епархіі мець свайго япіскапа. Пастанавілі шукаць кандыдата на япіскапа, а калі здабудуць, то каб нашыя прыходы яго матэрыяльна ўтрымалі.

Пратапрасьвіцер Сьвятаслаў Коўш па нейкім часе дастаў удар і пралежаў даўжэйшы час у шпіталі. Ён паправіўся й вярнуўся дадому, але ўжо больш ня мог служыць у царкве. Царкоўная рада прыходу сьв. Еўфрасіньні Полацкай запрапанавала высьвяціць на сьвятара Мячыслава Брынкевіча. Ён скончыў сэмінарыю ў Варшаве й пражываў у Саўт Рывэры, ажаніўся на амэрыканцы італьянскага паходжаньня, якая перайшла ў праваслаўную веру.

6 ліпеня 1986 году ўрачыста высьвяцілі на сьвятара Мячыслава Брынкевіча. На банкеце шмат хто яго вітаў, у тым ліку й старшыня прыходу сьв.Кірылы Тураўскага Кастусь Мерляк. Ён, між іншым, сказаў: «Чаму ў Саўт Рывэры, а ня ў Чыкага або Кліўлендзе — там таксама вялікая грамада беларусаў. І не дзеля гэтага, што Саўт Рывэр на карце Амэрыкі выглядае вёскай у параўнаньні з Чыкага й Кліўлендам, а дзеля таго, што Саўт Рывэру прызначана гісторыяй быць сталіцай дзеля ўсяе беларускай эміграцыі, быць рэзыдэнцыяй Сыноду Беларускае Праваслаўнае Царквы на чужыне. Мы доўга на гэта чакалі, але магчыма, даўжэй чакаць ня прыйдзецца, бо маладыя арлы лятаюць высока й бачаць далёка. І тут наша надзея, што айцец Мячыслаў будзе разглядаць патрэбы шырэй, шырока й далёка будзе даглядаць усе прыходы й дбаць, каб яны разьвіваліся. І як добры бацька ўпарадкуе

спадчыну, каб яна назаўсёды засталася на дабро верных дзяцей. Гэтая спадчына вялікая ды можна яе павялічыць прыходамі, якія сёньня блытаюцца ў прасторы ды ня ведаюць куды ісьці й дзе прыпыніцца. Але яны, як блудны сын, прыстануць да свае праваслаўнае царквы, якая была, ёсьць і будзе ў адной сям'і Ўсяленскае Праваслаўнае Царквы.

Патрэба беларускага япіскапа ёсьць самай важнай справай на пераломе жыцьця беларускае эміграцыі. І мы верым, што айцец Мячыслаў гэта зразумее й будзе старацца ажыцьцявіць мроі беларусаў ды супольна выканаць місію беларускае эміграцыі.

Я ня думаю, што айцец будзе баяцца, што хлеба ня хопіць яму й япіскапату ў Амэрыцы. Бо калі мы пабудавалі новыя цэрквы ды зьбіраемся будаваць новую царкву ў Чыкага, чын япіскапа будзе належна забясьпечаны. Таму Саўт Рывэр ня будзе вёскай, а будзе сталіцай рэлігійнага жыцьця ўсіх беларусаў, сталіцай беларускае культуры й грамадзка-палітычнай дзейнасьці. З Божай помачу мы верым, што Вы, Ойча, апраўдаеце давер беларусаў, прынясеце гонар і пашану беларускаму народу й славу Богу».

Гэтая надзея, нажаль, ня збылася.

Айцей Мячыслаў быў таго самага перакананьня, што й яго папярэднікі, што можна, маўляў, абыйсьціся й бязь япіскапа. Выявілася, што а. Мячыслава больш цікавілі справы матэрыяльнага характару, чымся патрэбы рэлігійнага жыцьця праваслаўных беларусаў, не гаворачы пра нейкага япіскапа, які-б стаяў вышэй за яго. Ён паважна ўзяўся за працу ў прыходзе й пачаў наводзіць свае парадкі, якія выклікалі непаразуменьні з Царкоўнай Радай. Аб гэтым хутка даведаўся інж.Касяк, які ад даўжэйшага часу пражываў у Чыкага. Ён, нарэшце, зразумеў, што сьвятары япіскапа не жадаюць, ім зручней самім кіраваць прыходамі.

1 лістапада 1987 году адбылося ўрачыстае адзначэньне 1000-годзьдзя хрысьцянства ў Беларусі ў прыходзе сьв.Юрыя ў Чыкага. Таму што прадстаўнікі былі са ўсіх прыходаў, адбылася канфэрэнцыя, на якой узгоднілі плян дзеяньня, раней падрыхтаваны І.Касяком і К.Мерляком.

На канфэрэнцыі ўсе згадзіліся запрасіць іераманаха Якуба Піруту зь Беластоку, зь якім інжынер Касяк ужо скамунікаваўся, каб ён прыехаў у Амэрыку з умовай, што ў прышласьці будзе хіратанізаваны

япіскапам. Меркавалася, што па прыезьдзе ён наведае ўсе прыходы, у кожным прыходзе прабудзе прынамсі адзін месяц, пазнае людзей, іхняе жыцьцё й іхні матэрыяльны патэнцыял. Калі ўсе пойдзе добра й ня будзе засьцярогаў з абодвух бакоў, склічацца епархіяльны зьезд, каб аформіць яго кандыдатару на япіскапа.

І вось летам 1988 году прыяжджае ў Амэрыку іераманах Якуб Пірута разам з а.Канстанцінам Бандаруком. Айцец Бандарук абняў настаяцельства ў прыходзе сьв.Юрыя, а іераманах Якуб павінен быў затрымацца няменей месяца ў Чыкага, каб азнаёміцца з прыходам, а потым ехаць у прыход сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл і далей, згодна пляну, у другія прыходы. Айцец Якуб, не пабыўшы двух тыдняў у Чыкага, пераехаў у Кліўленд служыць ў прыходзе Жыровіцкае Божае Маці, БАПЦ, бо яму там паабяцалі лепшыя матэрыяльныя ўмовы. І хто-бы мог падумаць, што манаху матэрыяльныя якасьці важнейшыя за духовыя.

Інж.Касяк памёр 13 сакавіка 1989 году ў Чыкага. Айцец Мячыслаў разаслаў паведамленьне, што 8 кастрычніка адбудзецца сабор Царкоўнае Рады з парадкам дня, у якім былі выбары сталага адміністратара Рады Беларускай Праваслаўнай Царквы ў Паўночнай Амэрыцы. Ён гэта зрабіў не з паразуменьня зь сябрамі епархіяльнай рады й бязь ведама а.Сьвятаслава Коўша, які зьяўляўся надалей адміністратарам, нягледзячы на стан свайго здароўя. А.Мячыслаў перакрэсьліў усе папярэднія зьезды, парушыў Статут і рэглямэнт адносна скліканьня зьезду епархіі ды бяз сходу свайго прыходу назначыў дэлегатаў. Пачуўшы незадавальненьне й пратэсты прыхажанаў за няправільнае скліканьне зьезду зь відавочнай мэтай забясьпечыць сабе перамогу ў выбары на адміністратара, адклікаў зьезд некалькі дзён перад ягоным пачаткам.

На сёньня, прыходы Беларускае Праваслаўнае Царквы ў Паўночнай Амэрыцы ня маюць ня толькі свайго япіскапа, але нават належна выбранага адміністратара. Беларусы сумелі арганізаваць прыходы й будаваць новыя цэрквы, але ня сумелі зрабіць галоўнага—здабыць япіскапа беларускай епархіі, так як гэта ёсьць ува ўсіх хрысьціянскіх народаў.

# Беларускі цэнтр адпачынку Бэлэр-Менск

Беларуская эміграцыя ў штаце Нью Ёрк і суседніх штатах (Канэктыкат, Нью Джэрсі, Пэснысльвенія, Масачусэтс і г.д.), пражыўшы прыблізна 10 гадоў у Амэрыцы ды цяжка працуючы, пачула патрэбу ў месьце для адпачынку, а самае галоўнае, месьце адпачынку для дзяцей, дзеб тыя праводзілі час летняга сэзону карысна для здароўя, далей ад гарадзкой, нездаровай фізычна й духова атмасфэры. Людзі, якія разумелі й бачылі гэтую патрэбу ды прадбачвалі карысьці, якія адпачынковы цэнтр мог прынесьці беларускаму грамадзтву, моцна зацікавілася й пачалі падрыхтоўчую працу ў зьбіраньні грошаў ды шуканьні адпаведнага аб'екту для набыцьця.

Для правядзеньня такога важнага й вялікага праекту ў чэрвені 1961 году быў створаны грамадзкі камітэт набыцьця цэнтру адпачынку ў складзе: В.Юрцэвіча, Ул.Пелеса, Ю. Станкевіча й др. П.Маркоўскага. У пачатку 1962 году ў камітэт дадаткова ўвайшлі: Л.Брылеўская, С.Жамойда, К.Мерляк, др.В.Кіпель. Распачаліся інтэнсыўныя пошукі адпаведнага аб'екту, вынікам чаго быў нагледжаны рэсорт Бэлэр ў Глен Спэй, штат Нью Ёрк. 7 красавіка 1962 году адбыўся сход сяброў і зацікаўленых асобаў, на якім сход пастанавіў: прыступіць да куплі рэсорт Бэлэр-Менск.

Пасьведчаньне інкарпарацыі падпісалі сябры камітэту, за выняткам др. П.Маркоўскага, 11 кастрычніка 1962 году. Чартар і Статут карпарацыі прадугледжваў прадажу акцыяў на 50,000.00 даляраў. Гэтая сума пазьней была паднесена да 100,000.00 даляраў, коштам 100.00 даляраў за адну акцыю.

Камітэт, палагодзіўшы фармальнасьці, прыступіў да прадажы акцыяў, што было вельмі складанай справай. Трэба было пераканаць людзей бээнэраўскага блёку з аднаго боку, такіх-жа самых бэцээраўцаў, з другога, а таксама аўтакефалістаў і кананічнікаў, што пастаўленыя мэты будуць строга перасьцярагацца й ніколі ня будзе дапушчана, каб цэнтр быў дамінаваны адным або другім бокам.

Уступ да Статуту кажа: «Рэсорт Бэлэр-Менск, куплены шырокімі беларускімі грамадзкімі сіламі, ёсьць беларускім цэнтрам

адпачынковым, культурым, сацыяльным і вітае ўсіх беларусаў, незалежна ад веравызнаньня або палітычнага погляду... Рэсорт мусіць стаяць на здаровай эканамічнай базе, каб выконваць свае культурныя й сацыяльныя заданьні, асабліва для маладога пакаленьня, не палягаючы на бясконцыя ахвяры, а наадварот, даючы добры прыклад іншым будучым грамадзкім прадпрыемствам».

20 лютага 1963 году быў куплены за 65,000.00 даляраў рэсорт Бэлэр—Менск ў Глен Спэй, Нью Ёрк, маёмасьць якога складалася з 75 акраў зямлі зь лесамі і доступам да возера ў прыгожай гарыстай мясцовасьці, 16 будынкаў, басэйн для плаваньня, спартовыя пляцы для тэнісу, валейболу й баскетболу, магчымасьцямі паляваньня й рыбацтва.

Першае выканаўчае кіраўніцтва складалася: старшыня—Васіль Юрцэвіч, заступнік старшыні—др. Вітаўт Кіпель, сакратар—Юрка Станкевіч, скарбнік—Уладзімер Пелеса. Афіцыяльна рэсорт Бэлэр—Менск быў адкрыты 4 ліпеня 1963 году, з асабістым удзелам беларускага грамадзтва, а самае важнае, што з прадстаўнікамі ўсіх беларускіх арганізацыяў і заслужаных беларускіх дзеячоў. Усе віталі вялікае дасягненьне й прадракалі ўсякую падтрымку й супрацоўніцтва.

Ад гэтага часу ў беларускі цэнтр адпачынку, так яго папулярна называлі, кожны год у летні сэзон прыязджалі на адпачынак беларусы з усяе Амэрыкі й нават з-за яе межаў. Адны на тыдзень, два або й тры, а бліжэйшыя зь дзецьмі займалі пакоі цэлае лета.

Кожнага году адбываліся й праводзіліся летнія лягеры для дзяцей, спартовыя заняткі й спаборніцтвы моладзі з усяе Амэрыкі, зьезды грамадзкіх арганізацыяў, сьвяткаваньні Дня беларускага жаўнера (4 ліпеня) канцэрты й розныя розыгрышы, нядзелямі адбываліся Багаслужбы, працавала бібліятэка ды іншыя культурна-народныя імпрэзы.

Нягледзячы на тое, што дырэкцыя пакладала ўсе сілы, каб адпачынкавы цэнтр прыносіў прыбытак із свае камэрцыйнае дзейнасьці, нажаль, гэтага немагчыма было дасягнуць—заўсёды выдаткі перавышалі прыбытак. Прытым трэба адзначыць, што беларусы ня мелі дасьведчаньня ў вядзеньні й адміністраваньні супольных прадпрыемстваў, а пагэтаму ня сумелі дасягнуць лепшых фінансавых вынікаў. Паміма абяцанай на адкрыцьці цэнтру падтрымкі й супрацоўніцтва, патрыёты сваіх груповак або напрамкаў ня мелі любові да

цэнтру, праяўлялі негатыўнію дзейнасьць, а часамі байкатавалі й не наведавалі свайго беларускага цэнтру.

Каб пазбегчы заняпаду цэнтру на 30 жніўеня 1970 году быў скліканы надзвычайны сход акцыянераў, на якім было пастаўлена пытаньне далейшага лёсу беларускага цэнтру адпачынку. На сходзе былі пастаўленыя дзьве прапановы: др.В.Кіпеля й інж.Касяка, якія былі спалучаныя ў адну прапанову: «Перадаць рэсорт Бэлер-Менск беларускім праваслаўным прыходам сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, сьв. Еўфрасіньні Полацкай ў Саўт Рывэры за адзін даляр за акцыю». Другая прапанова належала мгр.Леаніду Галяку:«Собскасьць супалкі рэсорт Бэлэр—Менск, што знаходзіцца ў Глен Спэй, перадаць у форме акту куплі-прадажы новастворанай грамадзкай арганізацыі пад назовам (які будзе прыняты)». У выніку галасаваньня была большасьцю галасоў (302) прынятая першая прапанова, за прапанову Галяка прагаласавала толькі 60 галасоў. К.Мерляк не пагаджаўся з зьместам абодвух прапановаў ды ня быў прысутным на гэтым сходзе.

У гэтай справе прыход сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл 5 кастрычніка 1970 году выслаў ліст радзе дырэктароў рэсорту Бэлэр -Менск наступнага зьместу:

«У адказ на ваш ліст з 15 верасьня 1970 году ў праве афармленьня прадажы-куплі рэсорту Бэлэр-Менск нашым прыходам і прыходам сьв.Еўфрасіньні Полацкай ў Саўт Рывэры. Н.Дж., гэтым ветліва паведамляем наступнае:

а.Агульны надзвычайны сход прыхажанаў Беларускай Незалежнай Праваслаўнай Царквы сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Н.Ё. адбыўся 4 кастрычніка 1970 г.

б. Пасьля дыскусі пастаноўлена адобрыць куплю рэсорту. Прычым зроблена засьцярога, што купля адабраецца толькі дзеля таго, каб маёмасьць рэсорту Бэлэр—Менск захаваць надалей у руках беларускага грамадзтва й каб гэтая маёмасьць надалей служыла агульнаму беларускаму грамадзтву ў Амэрыцы на карысьць агульнай беларускай справе. Рада прыходу спадзяецца, што пры добрай волі й супольнымі сіламі пастаўленая мэта будзе зьдзейсьненая.

Прыход сьв.Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры прыняў 15 лістапада 1970 году наступную пастанову:

«Разважыўшы прапанову, знаўцаў беларускага рэсорту Бэлэр-Менск аб прадажы шэраў названага рэсорту па 10 цэнтаў за шэру для

Беларускіх праваслаўных цэркваў у Саўт Рывэры, Рычмонд Гіл у Нью Ёрку пастанаўляецца набыць названы рэсорт, узалежніўшы гэты акт ад неабмяжаваньня фінансавага стану прыходу

Абедзьве цэрквы набываюць рэсорт на парытэтных асновах па палове, адмініструючы дэмакратычнымі мэтадамі, выбіраючы кіраўніцтва рэсорту ад кожнай царквы ў роўнай колькасьці, уключаючы настаяцеляў. Найвышэйшым органам, вырашаючым спорныя правы кіраўніцтва рэсорту, зьяўляецца супольны сход прыхажанаў абоіх цэркваў, вырашаючы справы звычай бальшынёй, пры наяўнасьці паловы сяброў, разам з перададзенымі галасамі. Пры другім тэрміне скліканы сход лічыцца правамоцным пры кожнай колькасьці.»

У студзені й лютым 1971 году прыходы Рычмонд Гіл і Саўт Рывэр, на сваіх агульных сходах выбралі першую раду дырэктароў цэнтру адпачынку па 10 асобаў ад кожнага прыходу з настаяцелям а.М.Лапіцкім, ад прыходу сьв.Еўфрасіньні Полацкай і настаяцелям а.С.Каўшом ад прыходу сьв.Кірылы Тураўскага. У кіраўнічы камітэт (экзэкутыва) былі выбраныя—Г.Арцюшэнка—старшыня, заступнік старшыні П.Зыбайла, сакратар—М.Сенька й скарбнік—С.Рагалевіч.

Дырэкцыя карпарацыі рэсорту Бэлэр—Менск вызначыла С.Рагалевіча й др. В.Кіпеля для перадачы рэсорту, што яны й выканалі, перадаючы вышэй паданай экзэкутыве: рэлігійна-грамадзкага адпачынкаваму цэнтру Бэлер—Менск назоў, які быў прыняты Радай абаіх прыходаў.

Сэзон 1971 году й усе наступныя былі адміністраваныя кіраўніцтвам рэлігійна-грамадзкага адпачынковага цэнтру Бэлер-Менск і ўся праца й дзейнасьць праводзілася як і раней без ніякіх зьменаў. Меры, пастаўленыя карпарацыяй рэсорту, былі поўнасьцю й дакладна ўведзены ў чартар, які быў зарэгістраваны ў чэрвені 1972 году пад назовам "Religious Recreation Center Belair Miensk"

Перадача маёмасьці карпарацыі Бэлэр—Менск рэлігійнага-грамадзкаму адпачынкаваму цэнтру Бэлэр—Менск ня ўсім спадабалася, асабліва тым, што галасавалі за прапанову Л.Галяка. Яны залажылі камітэт абароны Бэлэр. У камітэт увайшлі: др. П.Маркоўскі, Л.Галяк, У.Курыла, М.Ханяўка, М.Тулейка.

Камітэт абароны Бэлэр патрабаваў сплаты ў суме 100,000.00 даляраў і пісаў: «Справа фінансавая ёсьць, аднак, справай двугараднай. Найбольшая шкоднасьць бэлэраўскага скандалу палягае на тым, што супалка Бэлэр задуманая, як пазагрупавая, дзякуючы дзеяньням

дырэктароў супалкі, на чале зь яе старшынёю С.Рагалевічам, зрабілася супалкай толькі ў праўнымі разуменьні, а маёмасьць супалкі, адпачынкавыя дамы ў Глен Спэй ператварыліся ў вузка-груповы палітычна-рэлігійны цэнтр.

Большасьць сяброў супалкі, купляючы акцыі не спадзяваліся, што з гэтага будзе прыбытак, але дзеялі ў перакананьні, што існуе патрэба стварэньня агульнага беларускага цэнтру й зразумела, што дзеля гэтага многія сябры не пагодзяцца з тым, каб іхнія грошы ішлі на фінансаваньне дзейнасьці аднае групоўкі».

Камітэт абароны Бэлэра, не дачакаўшыся сплаты, упаважніў адвакатаў Граймс і В.Гарошку, «вядомага» беларускага юрыста, падаць у суд дырэкцыю карпарацыі й абодвы прыходы, каб яны сплацілі меншым акцыянерам, якія галасавалі супраць перадачы ў ліку 30, а дадатковымі яшчэ 5 акцыянерамі, суму 100,000.00 дал. і кошты судовых працэсаў. Акт абвінавачаньня й позыў на судовы працэс у Вярхоўны суд, штат Нью Ёрк у Монтысэле, абвінавачаныя атрымалі 23 чэрвеня 1972 году.

Справа цягнулася вельмі доўга. Суд ня ведаў што рабіць: адсылаў то адвакату пашкадаваных, то адвакату абвінавачаных з запросам дадатковых выясьненьняў або дакумэнтаў. Нарэшце, вызначылі справу на разгляд у судзе, без журы.

На суд зьявіліся адвакаты Граймс і Гарошка і Ул. Курыло ад камітэту абароны. Л.Гольдштэйн (адвакат), Г.Арцюшэнка, К.Мерляк, С.Рагалевіч, П.Забайла ад рэлігійна-грамадзкага адпачынковага цэнтру. Перад пачаткам судовае расправы кантрагенты пачалі між сабою перагаворы й у выніку іх дамовіліся палагодзіць справу, выплачваючы камітэту абароны Бэлэра суму ў вышыні 4,000.00 даляраў. Акт дабравольнага палагоджаньня справы падпісалі адвакаты двух бакоў і па аднаму прадстаўніку ад акцыянераў двух бакоў. Судзьдзя Вярхоўнага суда Люіс Б.Шэйнман апрабаваў дагавор. Грошы ў суме 4,000.00 былі зараз-жа высланыя на рукі адваката Я.Грамса для камітэту абароны Бэлера. Дырэкцыя рэлігійнага цэнтру адпачынку была задаволеная, што справа была добра палагоджаная.

Адвакаты Граймс і Гарошка выплацілі сабе ганарар за вядзеньне судовае справы ў памеры $ 4,000.00, а камітэту нічога не засталося.

На такое палагоджаньне старшыня камітэту абароны мгр. Леанід Галяк не згадзіўся. Ён узяў другіх адвакатаў і падаў 25 жніўня 1980

году на суд сваіх адвакатаў Граймса й Гарошку за слабую абарону іхных інтарэсаў. Адначасна дамагаўсяануляваць папярэднюю пастанову судзьдзі Люіса Б.Шэйнмана, каб ізноў пачаць справу спачатку.

Сакратар Вярхоўнага Суда М.Эглер лістом з 17 сьнежня 1980 году паведаміў усіх зацікаўленых, што абвінавачаньне Граймса й Гарошкі й ануляваньне пастановы аб палагоджаньні адхіленыя, як нямаючыя ніякае важнасьці. (Case has no merit).

Такая пастанова судзьдзі Вярхоўнага суда Робэрта Я.Вільямса моцна раззлавала др.П.Маркоўскага, і ён 14 снежня 1983 году падаў у суд, абвінавачваючы наступных асобаў:

1.К. Гольдштэйна, які вёў справу Л.Галяка, які згаварыўся з адвакатам рэлігійнага цэнтру Л.Гольдштэйнам, сваім сваяком, і разам замазалі разгляд абвінавачаньня.

2.Паўтарыў абвінавачаньне першых сваіх адвакатаў Грэймса й Гарошку за тое, што палагодзілі справу за малую суму й за высокі ганарар.

3.Судзьдзяў Люіса Б.Шэйнмана й Робэрта Я.Вільямса за тое, што першы аднёсься абыякава да справы, а другі ня бачыў патрэбы разглядаць справы, адкінуў яе з-за малае важнасьці.

У параграфе 8 др.П.Маркоўскіцьвердзіць: «Галоўным экспэртам хаваць ашуканства быў і ёсьць адвакат Гольдштэйн з Брукліну. Яму было магчыма гэта зрабіць таму, што адвакаты Граймс і Гарошка з Статэн Айленду й адвакат Гольдэйн з Монтэсэлё супрацоўнічалі зь ім, каб «фюрэры» засталіся такімі самымі, якімі яны ёсьць».

У параграфе 9-м др.П.Маркоўскі цьвердзіць: «Маё змаганьне супраць «фюрэрскіх прынцыпаў» нанесла на мяне асабіста атакі й паклёпы а.Каўша й ягонай Царкоўнай Рады ў «Царкоўным сьветачы».

Нават за кнігу «Беларускі Сакрэт», напісаную Джонам Лёфтусам, «фюрэры» абвінавачваюць мяне. Таксама мяне вінавацяць за напады на Саўтрывэрскую царкву, праз тэлевізыю СБС праграму «60 хвілін» (Залучнік Б).

Да гэтага акту абвінавачаньня Маркоўскі дадаў цэлы рад дакумэнтаў, у тым ліку й залучнікі Б., якія складаліся з артыкулу «Паклёп нацыі» па поваду кнігі Лёфтуса, зьмешчаны ў «Царкоўным сьветачы» №34 за 1983 год. Таксама бачыны 8 -10 з кнігі «Беларускі сакрэт», дзе Джон Лёфтус называе беларускую эміграцыю нямецкімі калябарантамі.Гэтыя справа разлгядалася ў Вярхоўным судзе,

спэцыяльным аддзелам у Монтысёлё, штат Нью Ёрк, 29 студзеня 1984 г. Прысуд быў вынесены такі: «Motion is denied as moot». «Пэтыцыя адкінута — не заслугоўвае ўвагі».

Дэнтыст Пётра Маркоўскі, каб навучыць амэрыканскіх судзьдзяў і адвакатаў, выкарыстаў паклёп Лёфтуса на беларускую эміграцыю, спадзяючыся гэтым падмацаваць сваю справу, паказаць сваё глупства перад амэрыканцамі й нікчэмнасьць перад беларусамі. Пасля гэтага ён цярпеў няўдачы адна за адной: жонка забрала дзяцей й пакінула яго, ён страціў дэнтыстычную практыку, ўсю маёмасьць за прафэсыйную недалужнасьць. Зараз ён недзе хаваецца, каб людзі яго ня бачылі.

Рэлігійны-грамадзкі адпачынковы цэнтр Бэлэр—Менск пад кіраўніцтвам камітэту двух прыходаў прадаўжае свею дзейнасьць і выконвае культурна-грамадзкую мэту, пастаўленую падчас яго набыцьця.

# Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне ў Амэрыцы

На славутым X кангрэсе БАЗА, што адбыўся 1 і 2 чэрвеня 1963 году, на старшыню Галоўнае Ўправы быў выбраны др. Ст.Станкевіч. На наступныя 2-гадовыя кадэнцыі былі выбіраныя старшыні:

На X кангрэсе 18 верасьня 1965 г.Мікалай Гарошка.

На XII кангрэсе 27 травеня 1967 г.Уладзімер Курыла.

На XIII кангрэсе 30 верасьня 1969 г.—Вячаслаў Станкевіч.

На XIУ кангрэсе 30 травеня 1971г.—Расьціслаў Гарошка.

На XУ кангрэсе 1 верасьня 1973 г.—Расьціслаў Гарошка.

Грамадзкая праца вялася так, як кожны старшыня мог яе выконваць, усе залежала ад здольнасьці старшыні арганізаваць грамадзкае жыцьцё. Але на XУI кангрэсе БАЗА 24 травеня 1975г. Р.Гарошка не атрымаў падзякі. У славутай групоўцы Рады БНР вытварыўся канфлікт між др.Ст.Станкевічам і М.Гарошкай, які апісвае сам Р.Гарошка ў газэце «Беларускі Час» № 49 і 50 за верасень 1985 г.

«Кангрэс справаздачы старшыні не прыняў і даў абсалютарыюм без падзякі. Група Станкевіча выканала сваё заданьне, яны перанялі БАЗА

й гэтым падзялілі былых сяброў БАЗА на варожыя групы, якія засталіся да сёньняшняга часу. Гэтая варожасьць была ўзмацавана у 1980-х гадох, калі дакладна гэтая самая група, што ў 1975 годзе перабрала БАЗА, пачала свае неслаўныя стараньні перабраць БАПЦ таксама пад сваю сьвецкую кантролю».

Антон Шукелайц, старшыня Галоўнае Ўправы БАЗА, выбраны 24 травеня 1975 году на ХУІ кангрэсе БАЗА, заявіў на Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі 6 верасьня 1976 году, што быўшы старшыня Р.Гарошка не перадаў новай управе БАЗА архіву, дакумэнтаў і пішучай машынкі. Ад 1975 году й да сёньня Антон Шукелайц бяз перапынку выбіраецца што 2 гады на старшыню Галоўнае Ўправы Беларуска—Амэрыканскага Задзіночаньня ў Амэрыцы.

У артыкуле «З нарады Ватыкану», змешчаным у газэце «Беларускі Голас» № 218 за сьнежань 1973 г., аглядчык піша:

«Тых, хто асьмельваўся пратэставаць проціў ачмурэлай вуніяцкай акты, тых хутка ліквідавалі. К.Мерляк, бяспрэчна, быў найвыдатнейшым дзеячом БАЗА, грамадзкай арганізацыі ў ЗША, створанай на аснове й па скрытаму загаду вуніяцкае акцыі, чым бальшыня сяброў і не падазравала. Але К.Мерляк асьмеліўся пісьмова, як старшыня БАЗА, запратэставаць перад Рымам проціў накідваньня вуніяцтва (ліст К.Мерляка як старшыні БАЗА з 14 чэрвеня 62 г. да Ватыкану з адмовай удзелу БАЗА ў Ватыканскім кангрэсе з нагоды ўгодкаў Энцыклікі «Эксуль Фамілія»), у якім сьцвярджаецца што: «...Апостальскі пасад накідае супраць волі беларусаў так званае вуніяцтва, якое абсалютна ня прыносіць ніякае карысьці, а напэўна прынясе шкоду беларускай дзяржаўнасьці ў будучыне..». Гэта быў канец ў БАЗА. Змоўцы, на чале з Стасем Станкевічам, змабілізавалі пры дапамозе грашовых сродкаў ачарняючую кампанію проціў Мерляка. Склікалі «кангрэс», дзе пры дапамозе звычайнага ашуканства й маны, разваліўшы арганізацыю, выбралі свой урад на чале з Станкевічам, кінуўшы нямала грошаў на суды з сябрамі БАЗА.

Каталіцкі студыйны тыдзень у Чыкага пры вуніяцкай царкве сьв.Спаса, быў як-бы зьездам на нарады й выпрацоўку пляну далейшай дзейнасьці ўсіх змоўнікаў іншых памагатараў. Там вырашаўся й лёс К. Мерляка й іншыя, больш патаемныя справы. В.Пляскач у сваім лісьце з 2 жніўня 1961 году піша: «...у некалькіх словах хацеў-бы паінфармаваць цябе аб дакладзе праф.Адамовіча ...у апошні дзень

зьезду ...вычуваўся няшчыры тон таго, аб чым ён гаварыў. Відаць было, што ён гаварыў аб тым, у чым сам асабіста ня быў пераканаyы, і ў што сам ня верыў; амаль увесь даклад быў прысьвечаны атацы на Мерляка, як на асобу, так і як старшыню БАЗА. Даклад быў праведзены ў тым кірунку, каб прысутныя асудзілі яго за адхіленьні ад галоўнай лініі...за сувязь з «Беларускім Голасам» і (Хмараю)... Прысутныя вынесьлі ўражаньне, што тут адбываецца суд...»

У абароне Мерляка выступіў тады кампазытар Куліковіч, які быў платным кіраўніком хору ў вуніяцкай царкве. У адным з сваіх лістоў Пануцэвіч паведамляе Грынкевіча, што Куліковіч з рэгэнства звольнены, бо ўпарты й г.д.

Пляскач ў тым-жа лісьце падае аб прысутнасьці на каталіцкіх студыях д-ра Рагулі, Сажыча й іншых афіцыяльна некаталіцкіх лювэнцаў. Др. Тумаша, хоць і каталіка, за цьверджаньне, што вуніяцкая акцыя шкодзіць утрыманьню эміграцыйных мас пры іхніх грамадзкіх арганізацыях і утрыманьня у сваё вобруці БАПЦ, зь яе праваслаўнымі вернікамі,выкінулі з рэдактарства «Беларуса» й паставілі Станкевіча.

## Рада Беларускай Народнай Рэспублікі

Пасьля сходу сэктара Рады БНР 1 красавіка 1962 году, на якім старшыня Рады БНР М.Абрамчык адклікаў X сэсію БНР, зьліквідаваў сакратарыят Рады БНР і рэарганізаваў сэктар Рады БНР у Амэрыцы, К.Мерляк напісаў асьведчаньне, выясьняючы сваё становішча да Рады БНР, але не падаў яго да агульнага ведама. Ён не пагаджаўся зь дзейнасьцю непрадрашэнскай групоўкі ў Радзе БНР, якая нелегальнымі спосабамі захапіла кіраўніцтва Рады, але ўважаў сябе за раднага Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, якая была носьбітам і сымбалем беларускай дзяржаўнасьці ў вольным сьвеце. Мерляк завесіў сваё сябрукоўства ў Радзе БНР, ня выступаючы зь яе.

Інж. Мікола Абрамчык, старшыня Рады БНР памёр 29 травеня 1970 году. Заступнік др.В.Жук-Грышкевіч склікаў XI сэсію Рады БНР 29 травеня 1971 году ў Нью Ёрку, на якой яго выбралі на старшыню Рады БНР, др. Б.Рагулю на заступніка страршыні, а др. Язэпу Сажычу надалі рангу генэрала.

BYELORUSSIAN DEMOCRATIC REPUBLIC
CENTRAL COUNCIL
PRESIDENT

Верасень 12-га,1974 г.

Яго Міласьці
Маёру Мерляку Канстанціну

Паважаны Грамадзянін,
У сваіх плянах на будучыню,мы хочам паставіць Вас ў адзін з Выканаўчых Органаў БЦР,і дзеля гэтага прашу Вас адказаць да 1-га Кастрычніка 1974г.,ці Вы згаджаецеся працаваць ў БЦР.

Так, я (не) згаджаюся працаваць ў БЦР.

..............................

(Ваш подпіс)

Той,хто згаджаецца працаваць,павінен у адказе закрэсьліць (не).

Р.Астроўскі
Прэзыдэнт

На ХУІІ сэсіі Рады БНР, якая абылася 27 лістапада 1982 году, на старшыню Рады БНР быў выбраны др.Язэп Сажыч.

Др.Сажыч як старшыня не паправіў бязьдзейнасьці свайго папярэдніка за выняткам таго, што выдаў некалькі «Камунікатаў Рады БНР».

Адна з важнейшых падзеяў падчас першае 6-гадовае кадэнцыі было адзначэньне 70-х угодкаў ад нараджэньня др.Язэпа Сажыча —старшыні Рады БНР. На юбілейным банкеце ў Гайленд Парку, 6 верасьня 1987 году сябра апазыцыі ў Радзе БНР К.Мерляк вітаў юбіляра.

На XIX сэсіі Рады БНР, якая адбылася 28 травеня 1988 году ў Нью Ёрку, др. Сажыча перавыбралі на наступную 6-гадовую кадэнцыю. Прэзыдыюм і сакратарыят складаўся: др. Язэп Сажыч—старшыня,

др.Б.Рагуля, Ул.Бортнік, М.Нікан—заступнікі старшыні, др.Я.Запруднік—сакратар, В.Кажан—скарбнік.

К.Мерляку, старшыні й сябру прэзыдыюму рады, ня раз прапаноўвалі абняць абавязкі сакратара вонкавых дачыненьняў, але ён не згаджаўся на ніякія функцыі ў прэзыдыюме Рады БНР.

## Беларуская Цэнтральная Рада

На ХУІ пленуме БЦР, які адбыўся 22 кастрычніка 1960 году ў Саўт Рывэры, праф.Р.Астроўскі на просьбу ўдзельнікаў пленуму згадзіўся быць прэзыдэнтам БЦР яшчэ на адну кадэнцыю 1960-1965 гг.

У 1962 годзе на рукі др.А.Арэхвы Р.Астроўскі злажыў рэзыгнацыю, але 17 жніўня 1974 году ў лісьце да Н.Мядзейкі-старшыні пленума БЦР піша: «Гэтым паведамляю Вас, што зь сёньняшнім днём я прыступіў да выконваньня абавязкаў Прэзыдэнта БЦРады.

Прашу вас на аснове Статуту БЦР, зацьверджанага 5 кастрычніка 1954 году, склікаць звычайную ХУІ сэсію пленуму БЦР на 26 кастрычніка 1974 году ў Саўт Рывэры, Нью Джэрсі...Калі што-небудзь будзе незразумелым для Вас, дык, калі ласка, зварочвайцеся да мяне. З пашанай Р.Астроўскі, Прэзыдэнт».

На гэтым пленуме ня ведама чаму, К.Мерялк атрымаў паведамленьне й прапанову згадзіцца прыняць функцыю ў выканаўчым воргане БЦР. Гэтай самай датай Р.Астроўскі аб'явіў, што сваім дэкрэтам намінаваў 16 генэралаў, 17 палкоўнікаў, а рэшта прыпала на маёраў, капітанаў, і лейтэнантаў, усяго 99 найменацыяў. У абежніку №1 Прэзыдэнт БЦР паясьняе, што прызначэньне дыплёмаў «За грамадзкую працу для Беларусі (1944-1974)» зьяўляецца ганароваю адзнакаю. Нажаль, намінацыі былі даныя й тым, хто ніколі не прылажыўся да беларускай вызвольнай працы.

Праз нейкі час сябры БЦР атрымалі Абежнік № 2, у якім паведамлялася, што ХУІІ пленум БЦР адбыўся 3-4 верасьня 1976 году у Чыкага, на якім праф.Р.Астроўскі зрабіў кароткую прамову й на яго прапанову, апрабаваў наступны склад прэзыдыюму: праф. Р.Астроўскі—старшыня, заступнікі старшыні Н.Мядзейка й М.Зуй, Пятро Саўчыц—старшыня выканаўчага воргану БЦР і Віталі Цярпіцкі—сакратар.

BYELORUSSIAN DEMOCRATIC REPUBLIC

CENTRAL COUNCIL

PRESIDENT

# А Б Е Ж Н І К № 1 - 1974 г.

У сувязі з наданьнем рангаў па лініі БКА, хачу паясьніць настуг назоў "Беларуская Краёвая Абарона", якую я, як Прэзыдэнт БЦР, пакл каў да жыцьця ў 1944 годзе, у крытычным перыадзе Беларускага зм ганьня за незалежнасьць, зьяўляецца роўназначным з назовамі:

1. "народное ополчэніе" ў былой Расеі,
2. "Pospolite Ruszenie (z bronią) i (bez broni)" у былой Польшчы.

Беларуская Краёвая Абарона мела:

1. Вайсковую частку, якая змагалася з аружжам ў руках і якая скс чыла сваё існаваньне ў 1945 годзе, а яе былыя сябры-жаўнеры БКА, сучасны мамэнт, зарганізаваныя ў " Byelorussian-American Veterans Association " і аўтоматычна перашлі ў цывільную частку БКА. - Б
2. Цывільная частка БКА - гэта ёсьць тыя Беларусы, якія змагаліс і цяпер змагаюцца за Беларусь на нацыянальна - грамадзкай ніве.

Абыдве часткі БКА (вайсковая і цывільная) маюць аднолькава-важн заслугі для Беларускага Вызвольнага Руху.

Прызнаньне дыплёмаў "за грамадзкую працу для Беларусі", зьяўляец ганароваю адзнакаю за працу ў змаганьні за незалежнасьць Белару Уважаю, што той, хто паклікаў да жыцьця БКА, перад сваёй сьмерцяй, мае права падзякаваць сябрам БКА "за грамадзкую працу для Белару (1944-1974)", а такжа усім тым, з якімі ён, супольна усё сваё жыць цё, змагаўся за незалежнасьць нашай Бацькаўшчыны.

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

Р. Астроўскі
Прэзыдэнт

Незадоўга пасьля пленуму, 17 кастрычніка 1976 году, праф.Р.Астроўскі, Прэзыдэнт Беларускае Цэнтральнае Рады памёр і быў пахаваны на магільніку сьв.Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры, Нью Джэрсі.

На ХУІІІ пленуме БЦР 4 ліпеня 1977 году ў рэсорце Бэлэр-Менск на Прэзыдэнта БЦР быў выбраны сп. Н. Мядзейка. Пасьля сьмерці Н.Мядзейкі 11 лістапада 1987 году на ХІХ пленуме 17 верасьня 1988 году ў рэсорце Бэлэр—Менск быў выбраны на Прэзыдэнта БЦР сп.Міхась Зуй, а на старшыню выканаўчага воргана сп.Віталі Цярпіцкі.

15 лістапада 1989 году К.Мерляк атрымаў ліст ад сп.Юрыя Попкі зь Нямеччыны, у якім той пісаў: «Як вы ведаеце, БЦР знаходзіцца ў крытычным стане. Цяперашні прэзыдэнт хварэе. Хто яго заступіць? Яму трэба адпачынак, прынамсі я гэтак чуў, каб даўжэй жыў. Я чуў, што вы згаджаецеся пераняць месца БЦР. Адно, што ўстрымоўвае Вас, гэта тое, што Вы належыце да Рады БНР, што за гэтага Вас адгаварваюць. Я той думкі, што трэба ратаваць БЦР, а сяборў Рады БНР хапае яшчэ. Таму лепш будзе, калі Вы зложыце афіцыяльна свой мандат як радны, і дарога Вам на становішча прэзыдэнта адкрытая. У цяперашнім становішчы нам няма патрэбы сварыцца з Радаю БНР, БЦР і БНР могуць па суседзтву разам працаваць».

К.Мерляк 4 сьнежня адпісаў сп.Ю. Попку: «Ваш ліст мяне зьдзівіў, а таскама пацешыў некалькімі пытаньнямі, на якія ёсьць тлумачэньні. Гэта ёсьць ня першая Вашая прапанова пераняць абавязкі Прэзыдэнта БЦР. Маё належаньне да Рады БНР не ўстрымоўвала на згоду, бо я, хоць і належу да Рады БНР, зьяўляюся цэлы час ў апазыцыі. Моцна мяне пацешылі Вашыя клопаты аб беларускай справе, бо, як выглядае, на сёньня ніхто на эміграцыі пра яе не клапоціцца. А падзеі на Бацькаўшчыне вымагаюць дзейнасьці як ніколі. Я вельмі Вам дзякую за прапанову згадзіцца на такое высокое становішча як прэзыдэнт , гэта нагода й прывілей паслужыць свайму народу, але на сёняшні дзень я не магу даць згоды прыняць абавязкі Прэзыдэнта БЦР. Паўстрымоўваюць мяне ад гэтага шмат розных прычынаў, якія пакуль што тутака ўстрымоўваюся вам пералічваць, не падаючы камэнтараў, якія ў даным выпадку неабходныя».

Першы раз др.Ст.Станкевіч прыйшоў на акадэмію 25 Сакавіка, ладжаную Беларуска-Амэрыканскім Аб'еднаньнем, 1 красавіка 1973 году. Ад гэтага часу паступова антаганізм між К.Мерляком і

Ст.Станкевічам пачаў ліквідавацца. Напярэдадні 30 угодкаў II Усебеларускага Кангрэсу К.Мерляк пераканаў яго, што трэба гэтую гістарычную падзею адзначыць на бачынках газэты «Беларус», што рэдактар і зрабіў у № 206 за чэрвень 1974 году. Ён закончыў свой артыкул гэткімі словамі:

«З прычыны гэткага недарэчнага й нечаканага заканчэньня вайны ўся паўгадовая дзейнасьць Беларускай Цэнтральнай Рады на Бацькаўшчыне, што знаходзілася яшчэ адно ў зародку, і пастановы II Усебеларускага Кангрэсу былі перакрэсленыя акупацыяй Беларусі Саветамі.

Гэтая дзейнасьць і пастановы сёньня належаць да гісторыі, як зьява агульнанацыянальнага ўздыму й як выяўленьне імкненьняў да вызваленьня й дзяржаўнае незалежнасьці Беларусі. У гэтым сэнсе дзейнасьць Беларускай Цэнтральнай Рады й скліканы ею Другі Ўсебеларускі Кангрэс у тагачаснай палітычнай і ваеннай сытуацыі трэба ўважаць палітычна правільнымі й карыснымі».

Людзі не маглі паверыць, што др.Ст.Станкевіч, заняты вораг БЦР і II Кангрэсу, мог так напісаць. Нажаль, др. Станкевіч гэта зразумеў позна. Зробленая ім вялікая палітычная шкода беларускаму нацыянальнаму й вызвольнаму руху ў цяжкі гістарычны час як для эміграцыі, так і для ўсяго беларускага народу й крыўда, прынесеная К.Мерляку, можа быць, за ягоную нямалую пазытыўную працу, дараваная, але не забытая.

Новая зьмена кіраўнікоў у БНР і БЦР, якія надалей стараліся ўтрымаць той самы антаганізм і практычна прадаўжалі тую самую палітыку групавых інтарэсаў, не дапускаючы да аб'еднаньня беларускага грамадзтва, не прынесла нічога новага. Зь бегам часу груповая рывалізацыя патроху пачала зьнікаць на грамадзкай лініі дзейнасьці, але на рэлігійнай лініі ліквідацыі падзелу ня было відаць канца, а наадварот—падзел надалей пашыраўся.

Рада БНР і БЦР з пачаткам 60-х гадоў перасталі быць палітычнымі дзейнікамі на эміграцыі, а перадусім у Амэрыцы. «Халодная» вайна пацяплела й яе замяніла палітыка суіснаваньня, якая моцна перасьцярагалася Амэрыкай дзеля вайны ў Вьетнаме. Афіцыяльна палітыка вызваленьня была спынена дзяржаўным дэпартмэнтам і на БНР і БЦР, як установы дзяржаўнага характару на выгнаньні, ніхто ніякае ўвагі не зьвяртаў.

Усякую антыкамуністычную дзейнасьць і змаганьне за вызваленьне сваіх краінаў ужо раней перанялі грамадзкія арганізацыі, сябрамі якіх былі ўжо не эмігранты, а амэрыканскія грамадзяне. Дзяржаўна думаючыя кіраўнікі беларускіх арганізацыяў (ня ўсе) даўно зразумелі, што ўплыў на афіцыяльную палітыку Амэрыкі могуць рабіць толькі амэрыканскія грамадзяне праз амэрыканска-беларускія арганізацыі, бяручы актыўны ўдзел у мясцовых, штатных і фэдэральных выбарах. Гэтыя беларусы разглядалі Рады БНР і БЦР на сучасным этапе як гістарычных носьбітаў беларускай дзяржаўнасьці, што ўзбуджалі нацыянальны гонар, а ідэя вольнае й незалежнае дзяржавы натхняла на змаганьне за яе ажыцьцяўленьне.

Ніхто ня выказваўся супраць існаваньня гэтых двух органаў, а наадварот, уважалі, што яны патрэбныя, як цэнтр думаньня, плянаваньня й каардынацыі палітычнае й грамадзкае дзейнасьці, устанаўленьня прыярытэтаў, мабілізацыі грамадзтва й матэрыяльных сродкаў для выкананьня беларускай незалежніцкай місіі на эміграцыі.

Нарэшце, гэта зразумеў др.Ст.Станкевіч. Яму ў гэтым дапамаглі сябры тае самае групоўкі, якую ён з Антонам Адамовічам і В.Тумашам разам моцна трымалі ў сваіх руках. Яны не дапусьцілі, каб ён пасьля сьмерці А.Абрамчыка абняў старшынства ў Радзе БНР, не дапусьцілі яго ў сябры фундацыі імя П.Крэчэўскага. Станкевіч не пагаджаўся зь бязьдзейнасьцю др.Жук-Грышкевіча, старшыні Рады БНР, і з М.Гарошкам старшынёй фундацыі, пра якую той зусім ня дбаў. Пачуўшы, што на вузка груповай і закуліснай дзейнасьці далёка не заедзе, пачаў наведваць грамадзкія асяродкі ды навязаваць лучнасьць з агульным грамадзтвам. На яго прапанову газэта «Беларус» з воргану «Беларусаў Амэрыкі» ператварылася у ворган «Беларусаў у вольным сьвеце». Ён скончыў байкот і пачаў памяшчаць у хроніку весткі зь дзейнасьці ўсіх арганізацыяў, а ня толькі кантраляваных групоўкаю.

# Незакончаная гісторыя фундацыя імя П.Крэчэўскага

Ідэя стварэньня фундацыі імя П.Крэчэўскага ня раз парушалася на паседжаньнях прэзыдыюму й сакратарыяту Рады БНР. Каб яе рэалізаваць у канцы 1959 году быў пакліканы камітэт у складзе др.В.Тумаша, А.Адамовіча, К.Мерляка, В.Кажана й Натальлі Кушаль. Яны падпісалі Чартар (рэгістрацыйны акт), і яны тварылі першую раду Дырэктароў.

У першым параграфе Статуту сказана, што мэтай фундацыі ёсьць: «Захаваньне й вывучэньне беларускае культуры праз арганізацыю бібліятэкі, архіву й музэю й выдаваньне часопісаў і кнігаў, якія абараняюць інтарэсы беларускага народу».

На гэтую мэту былі атрыманыя грошы, якія перадаў старшыня рады БНР М.Абрамчык 10 лютага 1962 году у суме 32, 548, 51 даляраў. На паседжаньні гэтага дня былі прынятыя новыя сябры: Янка Запруднік, А.Стагановіч, А.Шукелайц, В.Кендыш, М.Гарошка. Др.В. Тумаш запрасіў Гарошку на паседжаньне й запрапанаваў яго ў дырэкцыю фундацыі, нягледзячы на тое, што той ад 1954 году ніякага ўдзелу ў грамадзкай працы ня браў. На гэтым паседжаньні было ўстаноўлена, што фундацыя імя П.Крэчэўскага адказвае за сваю дзейнасьць перад Радай БНР. Было выбранае новае выканаўчае кіраўніцтва ў складзе: др.В.Тумаш—старшыня, А.Адамовіч і Н.Кушаль—заступнікі старшыні, В.Кажан-скарбнік і Я.Запруднік-сакратар.

20 сакавіка 1964 году адбыўся гадавы сход, на якім выбралі новае кіраўніцтва ў складзе: М.Гарошка—старшыня, др.В.Тумаш і Ф.Кушаль—заступнікі старшыні, В.Кажан—скарбнік і Я.Запруднік—сакратар. Гэтым разам абмяркоўвалася справа набыцьця будынку для фундацыі, яго вялічыня, разьмяшчэньне й месца ў вялікім Нью Ёрку.

На чарговым сходзе фундацыі 3 кастрычніка 1965 году былі прынятыя новыя сябры: Ул.Набагез, Ф.Бартуль, М.Тулейка й Я.Гладкі. Кандыдаты, запрапанаваныя К.Мерляком: А.Нестар, В.Шчэцька, др.В.Кіпель, Ул.Русак, Ф.Родзька й А.Протас—ня былі прынятымі. Рада дырэктароў была зьменшана да 6 асобаў, і яны адначасна тварылі выканаўчае кіраўніцтва, а рэшта сяброў аставалася

звычайнымі сябрамі фундацыі. В.Кажан адмовіўся быць скарбнікам і на яго месца выбралі Ф.Бартуля. Далей разглядалася справа купленых 4 дамоў (злучаныя па два дамы) на прадмесьце Нью Ёрку ў Квінсе.

Адносна набыцьця гэтых гэтых дамоў і дзейнасьці фундацыі да 1974 году газэта «Беларускі Голас» № 245 за верасень 1974 году ў артыкуле Мерляка «Беларускія бібліятэкі й архівы на эміграцыі» падавала да ведама:

«Фундацыя напачатку атрымала суму дал.32,548. 51. Гэтая сума вырасла на 14 сьнежня да дал.36, 502. 62 (дапісаныя працэнты). У гэты-ж дзень была падпісаная купля чатырох трохсямейных дамоў. За дамы заплачана 147 тысяч дал. Каб іх купіць, фундацыя пазычыла 180 тыс даляраў, гвaрантуючы займ (моргіч) на 5,5 працэнтаў. Паводля др.В.Тумаша, дамы павінны былі даць даходу прыблізна 10, 000:00 дал., у год, за якія грошы фундацыя ажыцьцяўляла-б пастаўленыя мэты.»

І толькі праз 10 гадоў фундацыя робіць заклік, каб людзі прысылалі кнігі й матэрыялы ў бібліятэку, значыць пачалі дзеіць! Згодна лікаў др. В.Тумаша, паданых на агульным сходзе 4 красавіка 1965 году, фундацыя пасьля дзесяці гадоў павінна ўжо мець каля 100,000.00 дал. А дзе гэтыя грошы?

Людзі, якія прывыклі ў сваім жыцьці расходваць, або прысабечваць грошы, якія былі атрыманыя на беларускую справу, як, напрыклад, фонд «Беларуса», фонд «Бацькаўшчыны», фонд стыпэндыяльны й другія, бачучы ў фондзе фундацыі матэрыяльныя карысьці, палічылі неабходным пазбавіць сяброўства фундацыі сп. К.Мерляка, бо яны добра ведалі, што сп.К.Мерляк ня будзе талераваць над ужываньнем матэрыяльных сродкаў як і грамадзкага даверу.

Гэта пацьвярджае факт, што фундацыя за 10 гадоў не падала абсалютна нічога да ведама грамадзтва.

Грошы ў фундацыю ймя П.Крэчэўсакга не зваліліся з неба. Яны былі запісаныя беларускімі патрыётамі, якія аддалі сваё жыцьцё за Беларусь, веруючы ў справу й кіраўнікоў, якія, нажаль, ім ганебна здрадзілі, а сёньня самавольна карыстаюцца грашыма, як быццам-бы сваімі собскімі.

Старшыня фундацыі М.Гарошка зараз-жа паклікаў на адміністратара П.Манькоўскага, але яны доўга не змаглі разам працаваць.

Манькоўскі ўважаў, што старшыня неналежна вядзе справы фундацыі, тое самае ўважаў наступны адміністратар М.Кунцэвіч, які па нейкім часе пакінуў працаваць у фундацыі.

Газэта «Беларус» № 140 за сьнежань 1968 год падае , што 26 кастрычніка адбыўся сход сяброў фундацыі. На ім выслухалі справаздачу старшыні, апрабавалі й пастанавілі летам 1969 году пачаць арганізоўваць бібліятэку й музэй.

У камунікаце фундацыі, памешчаным у «Беларусе» № 213 за студзень 1975 году, паведамлялася: «На XII сэсіі Рады БНР, што адбылася ў Нью Ёрку 30 лістапада 1974 году была выслуханая інфарамацыя рады дырэктароў фундацыі імя П.Крэчэўскага пра дасёлешнюю дзейнасьць ды ґрадыскутаваны далейшы характар і кірунак працы.

Фундацыя імя П.Крэчэўскага ёсьць і застаецца адным з галоўных цэнтраў у Амэрыцы для перахаваньня й вывучэньня гісторыі й культуры беларускага народу. Управа фундацыі зварочваецца да сваіх суродзічаў і ўсіх асобаў, зацікаўленых у захаваньні й навучэньні гісторыі й культуры беларусаў з просьбай аб дапамозе й супрацоўніцтве».

Цікава, ці адгукнуўся на гэты заклік хто-небудзь?

На ХУ юбілейнай сэсіі Рады БНР, 25 лістапада 1978 году быў прысутны К.Мерляк. На гэтай сэсіі М.Гарошка зрабіў справаздачу, на якую радныя чакалі некалькі гадоў, каб штосьці даведацца пра 14-гадовую дзейнасьць дырэкцыі фундацыі. Зацытуем з пратаколу ХУ сэсіі Рады БНР асноўныя моманты (бо рэшта балбатня) справаздачы Гарошкі.

«Частка аднаго будынку была адстаўлена на грамадзкія патрэбы, рэшта здаецца ў наймо кватэрантам.Не заўсёды ўсе кватэры здаюцца ў арэнду. Бывалі вялікія клопаты з кватэрантамі, якія не плацілі. Даходзіла да суду. На адміністраваньне й дагляд будынкаў старшыня дырэкцыі траціць у сярэднім 15 дзён у месяц. Знайсьці чалавека, які рабіў гэтую працу, цяжка, бо на гэта трэба быць кампэтэнтным адміністратарам й дбайлівым гаспадаром. Цяпер будынкі вымагаюць рамонту, на які йдзе ўвесь прыбытак. Улетку пуставала 5, цяпер 2 кватэры. Сытуацыя такая, што лепш было-б прадаць будынкі й купіць болей адпаведны аб'ект для грамадзкіх патрэбаў зь меншымі клопатамі».

Гарошку зь вялікім клопатам змусілі прыйсьці на сэсію ды зрабіць справаздачу. Усе былі зьдзіўленыя яго выступленьнем, у якім нічога не казалася пра фінансавы стан фундацыі, на што вельмі спадзяваліся радныя. Усе добра ведалі, што яго адміністрацыйныя здольнасьці вельмі абмежаваныя, а тым больш рабіць направы ў будынках. Таксама ўсім было ведама, што Гарошка ня мог траціць 15 дзён працы ў месяц пры будынках фундацыі, маючы свой «біз - нес» і адначасна будуючы свой уласны дом. Каб свабодна рабіць свае махінацыі ён пазбавіўся двух адміністратараў, а сам нічога не рабіў, запусьціў дагляд дамоў так, што кватэранты ўцякалі, а новыя не займалі апушчаных кватэраў у дамох з жахлівым выглядам навонкі.

Нягледзячы на гэта ўсе, радныя на сэсіі апрабавалі справаздачу М.Гарошкі. Ніхто не адважыўся нават запытаць у яго, чаго няма фінансавае справаздачы. Толькі К.Мерляк зрабіў заўвагу, што рэп- ліка, дадзеная яму др.В.Тумашам ў 1964 годзе: «І мы ўмеем лічыць грошы»,—спраўдзілася, бо лічыць не было чаго.

Па сьмерці М.Гарошкі (11 лютага 1979 г.) абняў старшыства фундацыі заступнік др.В.Тумаш і пад яго кіраўніцтвам пачалі шукаць купцоў на дамы.

У 1979 і 1980 гг. падчас адміністрацыі Прэзыздэнта ЗША Д.Картэра інфляцыя паднялася высока, а з гэтым працэнты за пазыку падняліся аж да 19 працэнтаў. Людзі ня былі ў стане плаціць такі высокі працэнт за пазыку, не куплялі хатаў. Таму цэны на іх пайшлі ўніз. Не зважаючы на гэта, фундацыя прадала тры дамы, адзін пакінулі для грамадзкіх патрэбаў. Прыйшоўшы да ўлады ў студзені 1981 го- ду, Прэзыдэнт ЗША Р.Рэйган зараз-жа спыніў інфляцыю, працэнты пайшлі ўніз, цэны на хаты—угору.

Пачакаўшы з паўтра году кіраўніцтва фундацыі, не таргуючыся, магло прадаць па 300,000.00 даляраў за кожны дом і такім чынам зрэалізавала-б 900,000.00 даляраў. Сто тысяч аддалі-б на сплату даўгоў, а рэшта была-б чысты заробак.

На чарговай сэсіі Рады БНР ад 28 травеня 1988 году са справаздачы старшыні фундацыі Ф.Бартуля даведаліся, што фундацыя мае на сёньня на тэрмінова ашчадным рахунку 123,000.00 даляраў і на чэкавым рахунку 2.000.00 даляраў. За апошнія 5 гадоў фундацыя дала дапамогу для Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва

17,700.00 даляраў, арганізацыі моладзі (для ансамбля «Васілёк») 400.00 даляраў.

К.Мерляк заўважыў, што фундацыя пасьпяшалася з прадажай дамоў, няведама зь якой прычыны. Бо-ж гэты факт без сумніву спрычыніўся чуць не да яе ліквідацыі. На гэта А.Шікелайц адказаў, што справа зьмяніць старшыню ня было магчымым дзеля таго, што М.Гарошка пагражаў падаць у суд за ўложаную працу на працягу 10 гадоў (15 дзён на месяц) без ніякае аплаты.

Вось гэта адзін із клясычных прыкладаў, а іх было нямала, вузка груповай дамінацыі й палітыкі непрадрашэнства М.Абрамчыка ў Радзе БНР, якая надалей сьціпла практыкавалася ў грамадзкіх і рэлігійных згуртаваньнях.

28 травеня 1988 году ўправа фундацыі імя П.Крэчэўскага складалася: Ф.Бартуль—старшыня, Я.Запруднік—сакратар, М.Заморскі—скарбнік, А.Шукелайц, др. В.Кіпель—сябры ўправы. Мікола Заморскі памёр 18 чэрвеня 1988 году, хто яго заступіў няведама.

Гісторыя фундацыі імя П.Крэчэўскага ячшэ не закончана.



*Спатканьне зь Пятром Краўчанка, міністрам замежных справаў Рэспублікі Беларусь. Нью Ёрк. 21 сакавіка 1992 г.*



*Спатканьне з др.А.Мальдзісам (зьлева) і Г. Бураўкіным, Нью Ёрк, 29 верасьня 1991 г.*

# Частка чацьвёртая

# Хто каго мае судзіць?

Васіль Раманоўскі, па прафэсыі «гісторык», у сваёй кнізе «Саўдзельнікі ў злачынствах» (выдавецтва «Беларусь», Менск 1964) на бачыне 17 цьвердзіць: «У выніку перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускі народ дабіўся свабоды й незалежнасьці, упершыню ў гісторыі стварыў сваю сувэрэнную дзяржаву—Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку. Пры падтрымцы й бескарыснай дапамозе вялікага расейскага народу».

Гэта ёсьць ня толькі цьверджаньне В. Раманоўскага, але й ураду ды Камуністычнай партыі Савецкага Саюзу, бо-ж цэнзура не дапусьціла-б нават інакш падумаць, а ня толькі пісаць. Тое, што Кастрычніцкая рэвалюцыя й бескарысная дапамога вялікага расейскага народу далі беларускаму народу свабоду й незалежнасьць абсалютна не адпавядае праўдзе.

У сваёй кнізе Раманоўскі выхваляе й выносіць пад нябёсы дабрату братняга й вялікага расейскага народу й мудрасьць Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, а беларускаму народу закідае за гэта няўдзячнасьць і абвінавачвае ў немаверных злачынствах падчас акупацыі немцамі Беларусі ў 1941-1944 гадах.

Цяперака пакажам хлусьню «гісторыка» Раманоўскага пра «дабрату» вялікага расейскага народу й «дапамогу» роднае камуністычнае партыі ў разьвіцьці шчасьлівага жыцьця ў Беларусі перад другой сусьветнай вайною (1939-1945) і пасьля, аж да 1990 году.

Незалежнасьць Беларускае Народнае Рэспублікі была абвешчана Актам 25 Сакавіка 1918 г. ў Менску Радай, выбранай на Ўсебеларускім Кангрэсе ў сьнежні 1917 году.

Бальшавіцкі зьезд у Смаленску 1 студзеня 1919 году прыняў пастанову стварыць Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку без удзелу беларусаў, а толькі пры невялічкай колькасьці беларускіх камуністаў.

18 сакавіка 1921 расейскія бальшавікі Рыжскім дагаворам аддалі палякам Заходнюю Беларусь без удзелу нават беларускага камуністычнага ўраду.

У 1933 годзе па загаду мудрае й добрае партыі ў Маскве зьмянілі беларускі правапіс, робячы гэтым беларускую мову падобнай да расейскае.

У 1935 г. ворганамі НКВД былі зьнішчаныя 1,778 назваў беларускіх кніжак, тыражом у 12 мільёнаў.

У гэтым часе «любімы бацька народаў» Сталін із сваімі азьвярэлымі чэкістамі задумаў ажыцьцявіць ленінскую ідэю—калектывізаць сельскую гаспадарку. Калектывізацыя праводзілася пад лёзунгам «клясавай барацьбы з кулацтвам».

Сталіну моцна імпанаваў фюрэр Нямеччыны Гітлер, бо яго ня толькі баяліся, але і паважалі у цэлым сьвеце, ад чаго Сталін быў вельмі зайдросны. Каб стацца, прынамсі, роўным, ён пачаў палытычна заігрываць і паддобрывацца Гітлеру, што давяло 23 жнівеня 1939 году да падпісаньня дагавару праз Рыбэнтропа й Молатава аб не агрэсыі, адначасна ўстанаўляючы зоны дамінацыі ўва Ўсходняй Эўропе.

За згодаю Савецкага Саюзу немцы напалі на Польшчу 1 верасьня 1939 году. Чырвоная армія 17 верасьня «вызваліла» Заходнюю Беларусь і далучыла да Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

15 чэрвнея 1940 году ўрад Савецкага Саюзу аддаў летувісам г.Вільню зь вялікім кавалкам беларускае тэрыторыі, нават ня пытаючыся ўраду БССР, падводля раманоўскай незалежнай БССР.

Не пасьпелі закончыць «вызваленьне» Беларусі, як сябры Сталіна, Бэрыі й Цанавы пачалі займаць кіруючыя становішчы ды рабаваць беларускае насельніцтва. За паўгода іх наехала ў Заходнюю Беларусь больш, чымся палякаў за 20 гадоў панаваньня.

Ад 1940 году да ўдару немцаў на СССР у сорак першым без перапынку ішлі ў Сібір, у лягеры сьмерці, эшалоны, набітыя біткам «шпіёнамі», «кантррэвалюцыянерамі», кулакамі ды сябрамі Камуністычнай партыі Заходняе Беларусі, якіх усіх разам асудзілі «ворагамі народу».

Вялікі расейскі народ пад кіраўніцтвам «міралюбных і мудрых» кіраўнікоў роднае камуністычнае партыі Савецкага Саюзу сваёй бескарысьлівай падтрымкай ад 1925 да 1941 году зьнішчылі беларускага насельніцтва больш за 3,600,000 чалавек. Зьнішчылі беларускую культуру, скасавалі яе мову, зруйнавалі помнікі беларускае мінуўшчыны, узнагародзілі беларускаю зямлёю РСФСР і другія суседнія рэспублікі, а самае галоўнае—адабралі годнасьць быць чалавекам і беларусам. Савецкая дабрата выяўлялася ў тым, што штодзённа кармілі беларускі народ прапагандаю, выхваляючы братні расейскі народ, «вялікадушнасьць сваіх правадыроў» і «мудрую» партыю бальшавікоў.

Дзякуючы ўсім ім беларускі народ мае сваю незалежнасьць, свабоду, шчасьлівае сацыялістычнае жыцьцё й забясьпечаную ахову ад капіталістычных захопнікаў доблеснай і непераможнай Чырвонай арміі, якая будзе біць ворагаў камунізму на іх собскай зямлі.

Усё аказалася пустою прапагандаю, калі Гітлер 22 чэрвеня 1941 году ўступіў у вайну з Савецкім Саюзам На другі дзень «доблесная й непераможная» Чырвоная армія, разам з прапагандыстамі, палітрукамі, энкэвэдыстамі, упаўнаважанымі й усякага роду ўпраўляючымі хутка ўцякалі на ўсход. Дарогі былі заваленыя вайскамі, танкамі й рознага калібру транспартам. Да гэтага «пільныя» чэкісты тысячамі гналі на ўсход «ворагаў народу», змучаных пры будове аэрадромаў у Заходняй Беларусі.

На пяты дзень вайны, 27 чэрвеня, нямецкія войскі занялі Менск, а па нейкім часе занялі ўсе землі Беларусі.

Любімы «бацька Сталін», «родная» партыя й ўся камуністычная зграя пакінулі «ашчасьліўлены» беларускі народ на ласку фашысцкаму акупанту.

Беларускі народ, перажыўшы жудасьці, нанесеныя Савецкім урадам ды народагубнаю палітыкаю Масквы, зразумеў, што няма ніякага выхаду, як бараніцца ад захопнікаў і панявольнікаў аднолькава, як ад чырвонага камунізму, так і ад чорнага фашызму.

Кастусь Мерляк шмат раней ацаніў становішча й зрабіў высноў, што ён за камунізм змагацца ня будзе, а тым больш за ўстанаўленьне палітыкі расейскага рэжыму з Масквы. Ён вярнуўся ў Наваградак і ўліўся ў агульнае жыцьцё беларускага грамадзтва.

Палажэньне ў акупаванай немцамі Беларусі было вельмі цяжкое. Нямецкая палітыка мянялася так хутка, як мянялася сытуацыя на фроньце. Немцы нішчылі ўсё, што стаяла перашкодай да перамогі. Не разьбіраючыся, хто вінаваты, а хто нявінны, забівалі й палілі аднолькава як людзей, так і маёмасьць. Гэтыя зьверскія мерапрыемствы немцаў супраць беларускага жыхарства былі выкарыстаныя з аднаго боку палякамі, а з другога савецкімі партызанамі.

Астаткі польскае адміністрацыі Заходняе Беларусі заварушыліся й пачалі прабівацца ў нямецкую цывільную адміністрацыю, робячы фальшывыя даносы на сьведамых і дзейных беларусаў, маўляў, яны зьяўляюцца камуністамі.

Для іх гэта была справа няновая. І раней яны абвінавачвалі беларускіх дзеячоу, у сувязях з камуністамі. А польскі ўрад садзіў іх у канцэнтрацыйны лягер у Бярозе Картузкай. Пазьней на тэрыторыі Заходняй Беларусі паявіліся польскія адзінкі А.К.А.(Армія Краёвай Абароны), якія атрымоўвалі зброю ад немцаў і праводзілі забойствы сьвядомых і дзейных беларусаў і тэрарызавалі агульна грамадзтва.

Астаткі разьбітае Чырвонае Арміі, якія прыхавалі беларускія сем'і, баючыся, што будуць захопленымі немцамі ў палон або на працу ў Нямеччыну, пайшлі пазьней у лес. Пачалі арганізоўвацца ў банды, заахвочваючы да сябе мясцовых лодыраў,крымінальнікаў. Замест каб праводзіць акцыі супраць немцаў, яны займаліся рабаваньнем беларускіх вёсак. Банды, якія сябе называлі партызанамі, праводзілі правакацыйныя акцыі, каб паказаць, што сяляне супрацоўнічаюць з «партызанамі», а не зь немцамі. Немцы, каб запабегчы «дастаўу партызанам», пачалі праводзіць крывавыя экспэдыцыі, не разьбіраючыся ў чым справа: палілі вёскі, працаздольных забіралі ў Нямеччыну на прымусовую працу, а рэшту: старых, жанчын і дзяцей — забівалі й палілі. Правакацыйная акцыя ўзмоцнілася, калі савецкае камандаваньне зарганізавала Беларускі партызанскі штаб на чале з Панамарэнкам. У 1943 годзе пачалі скідаць на парашутах камандзіраў, якія замест каб вясьці збройнае змаганьне зь немцамі, праводзілі чысткі ў вёсках, абвінавачваючы ні ў чым нявінных людзей за супрацоўніцтва зь немцамі. З партызанаў-бандытаў яны сталіся мсьціўцамі, а пазьней героямі Вялікай Айчыннай вайны за тое, што мсьціліся на нявінных беларусах.

Беларусы пад акупацыяй выкарыстоўвалі ўсякія магчымасьці, якія былі дазволеныя, а ў большасьці канспіратыўна праводзілі сваю дзейнасьць. Была зарганізавана паліцыя, якая ўтрымоўвала парадак, школы з пачатковай і сярэдняй асьветай ды ахова здароўя. А самае важнае, што беларуская адміністрацыя рабіла (ці ў многіх выпадках прабавала, інакш нельга было) абараняла людзей перад нямецкімі ўладамі. Гэта была цяжкая й небясьпечная праца. За нялюдзкія, а часта зьверскія загады, пастановы й мерапрыемствы, рабіліся дэмаршы й пратэсты ўва ўсе акупацыйныя ўстановы, пачынаючы ад ваенных камэндатураў, для камандзіраў ахоўных аддзелаў, а канчаючы на акруговых і раённых камісарыятах цывільнае адміністрацыі, жандармэрыі, палітычнае паліцыі (СД), будаўніцтва (ОТ) і гаспадарства

(ЦТГО). За пратэсты й дэмаршы нямала беларускіх патрыётаў заплацілі сваім жыцьцём або цяжкім зьняволеньнем у Нямеччыне.

Але гэтага было мала, трэба было бараніць вёскі, якія гарэлі днём і ноччу. Прэзыдэнтам Беларускае Цэнтральнае Рады праф.Р.Астроўскім была абʼяўленая 2 сакавіка 1944 году агульная мабілізацыя ў Беларускую Краёвую Абарону, каб збройна бараніцца ад злачынстваў, незалежна ад якога колеру й бяз розьніцы ад таго ці іншага акупанта Беларусі. Нажаль, было мала часу, каб зарганізаваць належную абарону. Ды ўжо асталося мала чаго бараніць — край быў зруйнаваны. Чырвоная армія прыбліжалася да Менску. Распачалася масавая эміграцыя на Захад.

Чырвоная армія заняла Менск 3 ліпеня 1944 году. Каты дзяржаўнай бясьпекі НКВД і СМЭРШ пачалі распраўляцца зь беларусамі, якія не змаглі выехаць. Адных расстрэльвалі, другіх высылалі ў лягеры сьмерці, а трэціх бралі ў армію й пасылалі на першую лінію фронту, адкуль вярнуліся дадому толькі адзінкі.

Другая сусьветная вайна закончылася для ўсіх народаў 9 травеня 1945 году, але распачалася дывэрсыйная вайна Савецкага Саюзу супраць беларускае эміграцыі. Яе дзейнасьць за вызваленьне Беларусі, за доказы й сьведчаньні жывых людзей у вольным сьвеце аб злачынствах і генацыдзе беларускага народу моцна ўстрывожыла крэмлёўскіх катаў.

Па загаду амэрыканцаў, шэф савецкай рэпатрыяцыйнае місіі генэрал Голікаў, выязджаючы з Заходняй Нямеччыны, пакінуў за сабою сотні агентаў па лягерох «перамешчаных асобаў» Нямеччыны, каб яны ўсякімі спосабамі заманьвалі беларусаў вярнуцца на «радзіму».

У савецкай зоне Бэрліну, у доме 11, пры Шадоўштрасэ закватэраваў «Камітэт за вяртаньне на Радзіму», на чале якога стаяў генэрал НКВД Міхайлаў. Камітэт выдаваў газэту «За вяртаньне на радзіму», у якой хлусьліваю прапагандаю пра шчасьлівае жыцьцё ў Беларусі заахвочваў вярнуцца дадому. Генэрал Міхайлаў кіраваў усею акцыяй вяртаньня, якую выконвалі агенты, каб толькі спыніць палітычную дзейнасьць беларускае эміграцыі.

Інтэнсыўная дывэрсыйная дзейнасьць савецкіх агентаў прадаўжалася аж да 1961 году. У гэтым годзе камітэт за вяртаньне на радзіму быў перанесены ў Менск, і да яго назову было дадзена: «І разьвіцьцё культурных сувязей з суайчыньнікамі». Свайго часу

становішча старшыні займаў Рыгор Шырма.

У выкананьні сваіх даручэньняў агенты стараліся, у першую чаргу, падарваць аўтарытэт ведамых беларускіх дзеячоў у вачох беларускае эміграцыі й у вачох грамадзтва краіны, у якой пражывалі, абвінавачваючы іх у ваенных злачынствах, у калябарацыі зь немцамі, у здрадніцтве Бацькаўшчыне, у нацыяналізме, у контррэвалюцыі, у шпіянажы, у паклёпах на савецкую уладу, і Бог ведае яшчэ ў чым. Распаўсюджвалі ўсякія фальшывыя весткі прыватнымі лістамі пад рознымі прозьвішчамі й псэўданімамі, каб гэтым выклікаць закалот унутры беларускіх арганізацыяў і выклікаць недавер да сваіх кіраўнікоў і палітычных дзеячоў. Вэрбавалі пераважна знаных на эміграцыі людзей вярнуцца ў БССР. Ім нават удалося заахвоціць двух эмігранатаў: Курагу-Скрагу ў Англіі й Тодара Мазуру ў Англіі— вярнуцца на радзіму, дзе яны памагалі ліць бруд на беларускую эміграцыю. Яны змаглі падшукаць або заангажаваць агентаў у беларускіх арганізацыях, якія ім перадавалі весткі з грамадзка-паліычнай дзейнасьці паасобных дзеячоў і дастаўлялі адрасы для высылкі ім свае прапаганды.

У шматлікіх выпадках, спэцыяльныя агенты КДБ прымянялі тэрарыстычныя меры й забойствы, ахвярай якога паў (быў забіты) ў Мюнхене 7 верасьня 1954 году Леанід Карась. А пісьменьнік Усевалод Краўчанка, удзельнік турыстычнай групы ва Францыі пакончыў з жыцьцём самгубствам, выпаўшы праз вакно свайго гатэлю 27 чэрвеня 1961 году. Француская паліцыя ў сваім сьледстве сьцьвердзіла, што за ім цэлы час сьледкавалі два агенты КДБ. У сваім тэстамэнце Краўчанка напісаў, што ён быў верны свайму народу.

Пад кіраўніцтвам КДБ СССР, Камітэт за вяртаньне на радзіму ў газэце «Голас Радзімы» ды іншых рэспубліканскіх і саюзных газэтах, а таксама ў масава выдаваных брашурах і кнігах, прадаўжаў да паловы 80-х гадоў абвінавачваньне беларускіх нацыянальных і грамадзкіх дзеячоў на эміграцыі ў розных злачынствах, даказваючы няпраўдзівымі й выдуманымі фактамі або падробленымі дакумэнтамі.

КДБ і беларускія прыстасаванцы, абвінавачваючы Кастуся Мерляка, стараліся апраўдаць злачыствы Маскоўшчыны ў Беларусі, а гэтым самым апраўдаць у гэтым свой уласны ўдзел.

В.Мацкевіч у «Голасе Радзімы» № 28(1137) 1969 г. піша:

«У 1939 годзе Заходнюю Беларусь вызваліла з-пад польскага ярма

Чырвоная армія. Беларусы шчыра віталі чырвонаармейцаў. Дваццацігадовы дзяцюк Канстанцін Мерляк стаяў у натоўпе і ляніва махаў рукою, нібы вітаючы савецкія танкі». Што беларусы віталі шчыра чырвонаармецаў, то ёсьць вялікі сумніў, але што Канстанцін Мерляк вітаў ляніва, то гэта праўда.

А.Будзейка ў «Галасе Радзіме» №39 (623) піша: «Потым Мерляка бачылі ў Карэліцкім раёне, там ён ужо быў інспэктарам па крэдыту і «нават зьбіраўся ўступіць у камсамол». Канстанцін Мерляк ня быў інспэктарам крэдыту, а быў старшым крэдытовым інспэктарам Дзяржбанку СССР і заступнікам упраўляючага Дзяржбанку, калі той адсутнічаў. Аднак абсалютна няпраўда, што Канстанцін Мерляк зьбіраўся ўступіць у нейкі там камсамол.

А. Будзейка піша далей: «Потым Рагуля, які тады камандаваў батальёнам БКА зрабіў Мерляка намесьнікам па забяспэчаньню сваіх жаўнераў. Стараючыся выслужыцца перад акупантамі, Мерляк абіраў мясцовых сялян і забясьпечаваў харчамі». Намесьнікам камандзіра Рагулі Мерляк ня мог быць, бо ён ня меў рэгулярнае вайсковае падрыхтоўкі, а быў толькі гаспадарчым афіцэрам. Што Мерляк абіраў мясцовых сялян, каб забясьпечыць жаўнераў, то абсалютная няпраўда.

Ч.Трухан «Голас Радзімы» № 86(670) 1962 піша: «У Мерляка былі сувязі зь нямецкімі базамі забяспячэньня ў Наваградку, Наваельні адкуль ён атрымаў адзеньне, зброю, боепрыпасы, харчаваньне. Рагуляўцы знаходзіліся на поўным нямецкім утрыманьні». Дык, таварыш Будзейка, вашая мана вылезла наверх.

Ч.Трухан у гэтым самым нумары пісаў: «Не сустрэўшы партызанаў, Рагуля распраўляўся з мірным насельніцтвам. Людзі абвінавачваліся й за гэта жорстка караліся».

Эскадрон кавалерыі, пазьней папоўніўшы змабілізаванымі жаўнерамі, ператварыўся ў батальён БКА, камандзірам якога быў капітан Барыс Рагуля. Гэты батальён меў за заданьне бараніць беларускае жыхарства ад бандаў і «мсьціўцаў», якія рабавалі й ліквідавалі расстрэламі нявінных людзей. Далей таксама бараніў беларускае насельніцтва ад нападаў і расстрэлаў, польскімі нацыяналістамі з А.К.А. Батальён БКА ніякіх карных акцыяў не праводзіў, нічога ў нікога не забіраў і не забіваў, а наадварот яшчэ дапамагаў пакрыўджаным «мсьціўцамі» (палякамі й немцамі) розным чынам. Батальён БКА стаўся вельмі папулярным сярод беларускага грамадзтва й яго

папулярна называлі рагуляўцамі й шчыра ўсюды віталі.

А што датычыцца афіцэра забесьпячэньня Канстанціна Мерляка, то яго функцыя вымагала толькі атрымоўваць і дастаўляць харчы, вопратку (мундзіры) і зброю ў батальён. Ён ніколі беспасрэдна ня браў удзелу ў ніякіх акцыях і экспэдыцыях. К.Мерляк, на працягу свайго жыцьця, ніколі ня выстраліў у бок чалавека. Усякія абвінавачваньні, прыпісаныя Мерляку, выдуманыя пасьля вайны дзеля яго дзейнасьці за вызваленьне Беларусі з-пад расейска-камўністычнага панаваньня.

Нейкі В.В.(«Голас Радзімы» № 699(854) 1964 г.) пытаецца: «Хто-ж такі Кастусь Мерляк, які так старанна выступаў за Бары?» (Гольдвотэр, кандыдат на прэзыдэнта ЗША ў 1964 годзе). Адказваючы на гэтае пытаньне, аўтар піша: «Гэта ён паслаў яму (Мерляку) тэлеграму, пасеяў у душы яго сяброў па здрадніцтву ілюзарную надзею на так званае «вызваленьне» Беларусі».

А.Стук «Прафэсія іх здрада» (Мн. 1969) пісаў: «Што-ж датычыць спрыту, кемлівасьці й энэргіі, то яму іх не пазычаць. Хто калі не ён, Кастусь Мерляк, у часы прадвыбарчай кампаніі заключыў саюз з Гольдвотэрам, дамогся яго абяцаньня падтрымаць вызвольны рух, калі выбяруць прэзыдэнтам. Не яго, вядома, Кастуся Мерляка віна, што Гольдвотэра пракацілі на вараных». А далей А.Стук прадаўжаў: «І што атрымалася? Так як ён Кастусь Мерляк прадбачваў, яму на ўсё жыцьцё запомніліся тыя пранікнёныя словы прэзыдэнцкага пасланьня « Л. Д. Джонсан, Прэзыдэнт Злучаных Штатаў Амэрыкі, гэтым самым абвяшчаю Тыдзень Паняволеных краін. Я заклікаю народ Злучаных Штатаў Амэрыкі адзначыць гэты тыдзнь адпаведнымі цырымоніямі справядлівых імкненьняў усіх людзей да нацыянальнай незалежнасьці й чалавечай свабоды». На такія абвінавачваньні адказваць няма патрэбы.

Нейкі З.Н. («Голас Радзімы» №8 (665) 1962,) у гэтай справе пісаў: «На сустрэчы з нагоды абвешчаньня Тыдня Паняволеных народаў гэтае пытаньне Мерляк абмяркоўваў з Джонсанам, і той хіба даў на гэта згоду».

Ільля Гурскі («Полымя» № 12(488) пісаў: «Мерляк у Нью Ёрку завязаў сувязь з такімі кангрэсмэнамі Злучаных Штатаў, як Самуэль Стратан, Д.Рычардсан, спэцыяльным прадстаўніком горада Джонам Бэрнам, губэрнатарам штата Нью Ёрк Нельсанам Ракфэлерам і ды-

рэктарам Фэдэральнага бюро па расьледаваньню антыамэрыканскай дзейнасьці Эдгарам Гувэрам».

Кантакты й сувязі з палітычнымі дзейнікамі ў вольным сьвеце, асабліва ў ЗША, розныя дэмаршы, мэмарандумы, рэзалюцыі й прамовы, робленыя беларускай эміграцыяй, а ў даным выпадку Канстанцінам Мерляком, раскрывалі народагубную палітыку Масквы ў Беларусі, жудасную русыфікацыю. Паказвалі, што расейска-камуністычны імпэрыялізм ня ёсьць у інтарэсах беларускага народу, што ўрад БССР не зьяўляецца выканаўцам волі свайго народу, а выканаўцам загадаў Масквы. Дзеля гэтага беларуская эміграцыя лічыла сваім абавязкам дэмаскаваць хлусьню Масквы й інфармаваць пра праўдзівы стан у Беларусі на Захадзе. Такую дзейнасьць Масква называла «паклёпам савецкага ладу», за што строга каралі, але эміграцыі не магла нічога зрабіць, акрамя як пісаць фальшывыя памфлеты.

В.Раманоўскі, «Голас Радзімы» №37(722), піша: «У ЗША, ФРГ, Англіі, Канадзе й іншых капіталістычных дзяржавах знайшлі прыстанішча й апеку Астроўскі, Абрамчык, Кушаль, Рагуля, Станкевіч, Мерляк і іншыя злачынцы й здраднікі беларускага народу. У гады вялікай Айчыннай вайны яны былі актыўнымі саўдзельнікамі й памагатымі фашысцкіх захопнікаў і разам зь імі люта распраўляліся зь іншым народам.»

В.Казлоў, Старшыня прэзыдыюма Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, «Известия» 6 лістапада 1965 г.: «Вся история Белоруссии с древних времен неразрывно связана с Россией. Трудно провести грань между культурой и общностью интересов наших народов. Несмотря на это до сих пор не затихает злобный голос групки белорусских буржуазных националистов Островского, Абрамчика, Станкевича, Рогули, Мерляка, Кушеля и других провокаторов давным-давно бежавших за границу... Они, дескать, хотят видеть Белоруссию «незалежнай»—прямо говоря, оторвав ее от Союза Советских Социалистических Республик».

Аб супрацоўніцтве зь немцамі, аб удзеле ва ўсіх злачынствах, учыненых гітлераўцамі падчас акупацыі Беларусі ў 1941-1944 гадах, пісалі ў савецкіх газэтах і абвінавачвалі нявінных людзей бяз ніякіх доказаў, такія асобы як: Леанід Прокша, Сяргей Новік-Пяюн, А.Будзейка, Мікола Заруцкі, В.Раманоўскі, В.В. Ражко-Ружыцкі, В.Мацкевіч, Ільля Гурскі, М.К., А.Стук, Макар Пасьлядовіч, І. Сачанка, Уладзімер Ла-

дысёў, Мікалай Сташкевіч, Уладзімір Бягун, З.Жураўлёў, Сяргей Кажан ды іншыя, некаторыя зь іх расейцы.

Кожны зь іх, пералічваючы сьпіс«злачынцаў», у якім заўсёды былі адны й тыя-ж самыя асобы, з дадаткам іншых (у залежнасьці ад абставін) як пісьменьнікаў, працаўнікоў культуры ці грамадзкіх дзеячоў. З гэтага выглядае, што яны абвінавачвалі ў сутнасьці за дзейнасьць на эміграцыі, якая раскрывала жудасьці чырвонай Масквы.

З усяе іхняе пісаніны ясна відаць таксама, што гэтыя людзі (буржуазныя нацыяналісты) вінаватыя ў тым, што Гітлер напаў на Савецкі Саюз і што ўсе праступствы на Беларусі былі дакананыя ня немцамі, а толькі гэтымі некалькімі асобамі.

Між аўтарамі, якія прысьвяцілі нямала часу й паперы Кастусю Мерляку, мы не знаходім Валянтына Таўлая й Алену Шырму. Яны маглі-б напісаць шмат больш, бо іхні лёс нейкі час быў зьвязаны зь лёсам Кастуся Мерляка. Відаць, сумленьне ім не дазволіла хлусіць, а праўду напісаць не дазволіла савецкая цэнзура.

## А дзе-ж яны былі?

Саракагадовы пэрыяд ад заканчэньня вайны да 1985 году назвалі пэрыядам пабудовы сацыялізму й пераходу да камунізму. Народ гэты пэрыяд назваў у гонар Хрушчова «дагнаць і перагнаць Амэрыку».

Пасьля прыходу Міхаіла Гарбачова ў 1985 годзе, перахрысьцілі тыя гады на «пэрыяд застою». У сутнасьці гэты назоў не адпавядаў рэчаіснасьці, яго павінны былі назваць «пэрыядам самаволі й вандалізму кампартыі».

Цяперака зьвернем увагу на тое, што рабіла ў жудасным пэрыядзе «застою» творчая інтэлігенцыя Беларусі, г.з. пісьменьнікі, паэты, кампазытары й артысты ўсякага жанру. А таксама інтэлігенцыя грамадзкая, прафэсыйная, тэхнічная, а галоўна, інтэлігенцыя акадэмічная, навуковая ўсіх галінаў грамадзкага жыцьця. У кнізе «Акадэмія Навук Беларускай ССР» (Мінск, 1958) было пададзена 1564 навуковых і навукова-тэхнічных працаўнікоў.

У першыя гады пасьля вайны праводзіўся ўлік загінуўшых падчас вайны людзей ды зьнішчанай грамадзкай маёмасьці. Дасьледчыкі

праязджалі па ўсіх кутках краіны, усё лічылі й дакладна запісвалі. З пункту гледжаньня палітычна-дзяржаўнага, гэты ўлік быў неабходным для беларускага народу, калі-б ён быў непамыльна зроблены як і належыцца ў статыстычным сьвеце й навуцы. Але справа ў тым, што да лічбы стратаў, нанесеных немцамі, дадалі лікі стратаў, нанесеных камуністычным рэжымам ў пэрыядзе застою, і стратамі, нанесенымі падчас вайны мсьціўцамі й палякамі, ня выключаючы Катыні й Курапатаў. На вялікі жаль, беларускія палітыкі, гісторыкі, дэмографы й іншыя навукоўцы, не дагледзелі, што фальшуюцца факты, спрабуючы прыхаваць маскоўскіх віноўнікаў.

Цяперака, у часе «галоснасьці», неабходна направіць сфальшаваныя лічбы й паказаць, хто ёсьць большы злачынца: чырвоны камунізм ці чорны фашызм. Пачынаць трэба ад Курапатаў, Менскага парку Чэлюскінцаў, крымінальных засьценкаў ва ўсіх гарадах Беларусі. Аб'ехаць усю тэрыторыю СССР, Салаўкі, Паўночны Урал, уздоўж Мурманскай чыгункі, уздоўж Чорнае ракі на Варкуце, на берагу Белага мора, вакол Анежскага возера й Паповага абтоку. Асабліва вялікая колькасьць беларусаў пахаваная ў Каме, Пэрме, Магнітагорску, Турынску й Чэрудыне. Усіх магільнікаў і агульных магілаў, мабыць, ніхто ня будзе ў стане дакладна пералічыць.

У 1980 г. налічвалася больш за 1117 лягероў у СССР, 119 лягероў і вязьніцаў для жанчын і дзяцей, 81 псыхіятрычных вязьніцаў і шпіталяў, 93 лягероў сьмерці. У БССР у 1980 г. было больш за 33 лягероў, вязьніцаў і псыхушак. За 60 гадоў ў Савецкім Саюзе было забітых або згінуўшых у зьняволеньні больш за 60 мільёнаў нявінных людзей.

У бальшыні беларуская інтэлігенцыя мала дбала пра свой народ, каб запабегчы генацыд, нішчэньне беларускай культуры, гістарычнай спадчыны, а самае галоўнае пачуцьця чалавека й нацыянальнае годнасьці.

У 1959 годзе ў праўленьне Саюзу пісьменьнікаў Беларусі ўваходзілі: П.Броўка—старшыня, І. Шамякін і М.Калачынскі —заступнікі, М.Ткачоў— сакратар. У прэзыдыюм уваходзілі, акрамя ўпамянутых: Я.Брыль, П.Глебка, Я.Васілёнак, Гурскі, Грамовіч, П.Крапіва, А.Куляшоў, М.Лынькоў, П.Панчанка, П.Петрык, М.Танк і Я.Шарахоўскі.

Ліст ад М.Гарбачова з 16 сьнежня 1986 году, у якім беларускія патрыёты патрабавалі спыненьня русыфікацыі й прызнаньня беларускае мовы дзяржаўнай ў БССР, падпісалі толькі двух — Я.Брыль і П.Панчанка.

У 1962 годзе выйшла кніга «Война под крышами», напісаная Алесям Адамовічам, у якой ён пераконвае, што быццам-бы ўсе беларусы ўліліся ў расейскае рэчышча. У гэты-ж самы час аўтар выступаў у «Голасе Радзімы» як абаронца беларускае літаратуры й мовы ад пасягненьняў на яе беларускае эміграцыі. Адамовіч— і той ня бачыў, што пасягае не эміграцыя, а Масква.

У 1966 годзе, ў «Звяздзе» ад 15 кастрычніка, пад подпісам васьмі выдатных маладых пісьменьнікаў быў надрукаваны артыкул, у якім эміграцыя абвінавачвалася ў здрадзе інтарэсам беларускага народу й пагоне за далярамі.

Іван Сачанка ў сваёй брашуры «Хто такія беларускія патрыёты», выдадзенай у Менску ў 1975 годзе бібліятэкай газэты «Голас Радзімы» выхваляе гэтых восем аўтараў так: «Беларускія паэты і празаікі, драматургі і крытыкі, творча карыстаючыся марксісцка-ленінскім філасофскім мэтадам, адлюстроўваюць у сваіх творах трывалы і моцны ў сваёй ідэйнай аснове сацыялістычны спосаб жыцьця, высокую маральную чысьціню савецкага чалавека, палітыку Камуністычнай партыі—арганізатара і натхняльніка ўсіх нашых перамог».

Штосьці падобнае мог напісаць толькі савецкі чалавек, але не беларус. Відаць, гэтым сваім творам Іван Сачанка хацеў забясьпечыць на прышласьць сваю месячную плату.

Акрамя Саюзу пісьменьнікаў Беларусі існавалі іншыя творчыя саюзы, нязьлічоныя прафсаюзы, а таксама Камуністычная партыя БССР, якая была пры ўладзе й кіравала ўсім жыцьцём Беларусі. Усе гэтыя творчыя арганізацыі складаліся пераважна зь беларусаў, якія аднак не адважываліся аказаць ніякага супраціву Маскоўскай навале.

Усім добра ведама, што Масква сама не змагла-б давесьці беларускую нацыю ледзь не да згубы, без дапамогі беларускай інтэлігенцыі, якая адказалася ад свайго народу й свае зямлі й пачала служыць адвечнаму ворагу — расейскаму імпэрыялізму й крамлёўскім катам.

Я, Канстанцін Мерляк, пытаюся: «Хто быў саўдзельнікам у злачынствах? Хто ёсьць сапраўдны вораг беларускага народу? Інтэлігенцыя на Бацькаўшчыне ці беларуская эміграцыя на чужыне?

Няхай мы, беларуская эміграцыя, сваёй дзейнасьцю шкодзілі беларускаму народу. Але гэта было толькі на працягу пару гадоў.

«Патрыёты» Радзімы, памагалі Маскоўшчыне нішчыць ўсё беларускае, народ і зямлю на працягу некалькіх дзесяткаў гадоў. І шкода, прынесеная імі, непараўнальна большая.

Дык хто-ж тады віноўны?

На гэта пытаньне павінен адказаць сам сабе кожны сумленны беларус. Але адказу ад «савецкага» чалавека, напэўна, ня будзе. Адзіны чалавек ня патрабуе даваць сабе адказу. Ён мужна бараніў на працягу шматлікіх гадоў інтарэсы беларускага народу. За гэта ём моцна пацярпеў у турмах «вялікага братняга народу», але гэтым ён абараніў гонар працоўных Беларусі. Імя гэтага героя Міхась Кукабяка.

Нажаль, беларуская інтэлігенцыя не змагла здабыцца хаця-б на аднаго Сахарава.

# Перастройка

Міхаіл Гарбачоў з прыходам да ўлады ў Маскве распачаў новы пэрыяд, які назваў перастройка. Ён напісаў кнігу пад такім самым загалоўкам. Для яго й «мудрай» партыі камунізм быў ужо пабудаваны й перастрайваць ён яго не зьбіраўся, а толькі хацеў падгладзіць й зьмякчыць сэрцы чэкістаў, энкавэдыстаў і кэгэбістаў, каб такім чынам паказаць, што Савецкі Саюз ня ёсьць «імпэрыя зла», ды пераканаць палітыка ў вольнага сьвету, а перадусім палітыкаў Амэрыкі, што Савецкі Саюз заслугоўвае на чарговую дапамогу, якая можа збавіць ад немінучае сьмерці непераможны камунізм і развал імпэрыі.

Маладое пакаленьне, пераважна студэнты з нацыянальна сьведамай інтэлігенцыяй, выкарыстоўваючы палітыку й галоснасьць, распачалі адраджэнскую працу. У хуткім часе зарганізавалі Беларускі Народны Фронт, аб'ядноўваючы беларускія грамадзкія арганізацыі й клюбы, каб адбудаваць незалежную беларускую дзяржаву. Але гэтая мэта не супадае з мэтай Гарбачова. Нажаль, беларускія адшчапенцы разам з прыстасаванцамі прадаўжаюць надалей выслугоўвацца Маскве.

На X зьездзе Саюзу пісьменьнікаў Беларусі, які адбыўся ў травені 1990 году, была выбраная рада й выканаўчы камітэт у колькасьці 55 чалавек. У раду ўвайшлі й тыя самыя тры асобы, што ўваходзілі ў праўленьне Саюзу пісьменьнікаў Беларусі ў 1959 годзе: І.Шамякін, Я.Брыль і М.Танк.

1990 год быў багаты на цікавыя падзеі ў жыцьці Саюза пісьменьніка ў Беларусі. Адна з гэтых падзеяў—выхад кніжкі Барыса Сачанкі «Сняцца сны аб Беларусі», з падзагалоўкам «Літаратурна-крытычныя артыкулы, інтэрв'ю». Хіба толькі пісьменьнік, які кіруецца ленінскім мэтадам і сталінскім рэалізмам, можа пісаць, што памардаваным энкавэдыстамі «сняцца сны».

Барыс Сачанка, відаць, яшчэ па прывычцы, як некалі сталінскія прапагандысты, на зборках , пахваліўшы «вялікага» Сталіна, гіганцкія пабудовы камунізму ды шчасьлівае жыцьцё, пераходзіў да перасьцярогі, што сярод нас ёсьць ворагі Савецкае ўлады ўнутры і навонкі, а дзеля гэтага трэба нам быць вольнымі й раскрываць іх, гэта значыла рабіць даносы ў КДБ. У сваёй кнізе Сачанка апісаў патрыятычныя сны аб Беларусі выдатных дзеячоў і пісьменьнікаў. Але, нажаль, ён прадаўжаў, што бяда ў тым, што таксама сьняцца сны яшчэ жывым у Амэрыцы—Рагулі, Мерляку й Акуле, імёны якіх ён перапісаў з кніжкі псэўда-гісторыка В.Раманоўскага.

Акрамя сяброўства ў ЦК КПБ аўтар напэўна атрымаў шчодрую ўзнагароду ад хлапцоў «Памяці».

Другая кніга, што выйшла таксама ў 1990 годзе, належыць пяру Міколы Ермаловіча. «Старажытная Беларусь»—паважная й вялікая праца. Яна была напісана раней, у часе застою й выкрывае нясумленных і неаб'ектыўных марксісцкіх і суседніх гісторыкаў. Ліквідуе так званыя белыя плямы ў беларускай гісторыі.

Ва ўступе да кнігі Міхась Ткачоў кажа: «Гэтаму чалавеку ніхто не даводзіў навуковых плянаў, не плаціў грошаў, не адчыняў «зялёную вуліцу» на старонкі выданьняў, не абнадзейваў публікацыяй манаграфіі.»

Вось гэтыя дзьве кнігі паказваюць,з аднаго боку, прыстасаванца савецкага чалавека, а з другога боку, беларуса-патрыёта.

Нельга абмінуць яшчэ аднаго прыстасаванца,савецкага пісьменьніка, Леаніда Прокшу. Калі стала ня модным пісаць артыкулы, памфлеты і фэльетоны, вульгарнага й абразьлівага характару на беларускую эміграцыю, ён пачаў друкаваць ў «Голасе Радзімы» (Гл. №48, ад 29 лістапада 1990г.) дакумэнтальную аповесьць «Цімафей Глебка й яго сябры» пра паўстаньне ў Кранштаце, падчас рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. Ці так актуальна сёньня гісторыя ўкладу некалькіх беларускіх матросаў ў час рэвалюцыі 1905 году, якая пазьней сваім вынікам

прынесла паняволеньне беларусам і ўсім народам СССР бальшавікамі? Ці Прокша ня бачыў цяперашніх патрэбаў адраджэньня беларускага народу, ня ведаў, пра што трэба пісаць і як змагацца з Вандэяй? Мабыць, яму патрэбная валюта, якую ён мог атрымаць толькі ў ЦК КПБ, бо рублям цана ноль, як і цана ягонай перадавой творчасьці.

На 1990 год выпадае яшчэ адна падзея. «Літаратура і Мастацтва» ад 5 кастрычніка (№40) надрукавала адкрыты ліст Цэнтральнаму Камітэту Кампартыі Беларусі «Каму, якому народу служым?». Гэты ліст падпісалі 22 партыйных беларускіх пісьменьнікаў, зь якіх 18 належаць да рады Саюзу пісьменьнікаў Беларусі. З гэтага ліста сьмяяўся ўвесь сьвет, а найбольш генсек Гарбачоў, які, пэўна, паўтараў у голас словы: «Во якія дурні, яны й гэтага ня ведаюць».

Сапраўды, на што было пісаць такі ліст. Ня лепш было спакаваць партыйныя білеты й адаслаць іх Сакалову або Гарбачову, дадаўшы пры гэтым: «Досыць служыць партыйнай Маскве, будзем цяперака служыць беларускаму народу».

Толькі час пакажа, хто зь іх шчыра пачне служыць свайму народу. А пакуль што надзея застаецца на тых, як Ермаловіч, якія ніколі не пазводзяцца. Яны жылі й будуць жыць, а зь імі будзе жыць і беларус.

*Паўстаньце, рабскія натуры,*  
*Пакіньце свой адвечны сон,*  
*Загаманіце віхрам, бурай,*  
*Каб ажно дрогнуў ваш палон!*

*. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .*

*Забылі ўсё, згубілі долю,*  
*Зьмяшалі славы цьвет з гразёй*  
*І запрадаліся ў няволю,*  
*З душой і скурай шчэзьлі ў ёй.*  
*Пара ў рукі браць паходні,*  
*Ўставаць, ісьці ноч расьсьвятляць!*  
*Бо што ня возьмеце сягоньня,*  
*Таго і заўтра вам ня ўзяць.*  
*На зло крывавым перашкодам*  
*Ськідайце ёрмы, клічце сход,*  
*І дайце знаць другім народам,*  
*Які вы сільны йшчэ народ!*  
*(Прарок, Янка Купала)*

Нью Ёрк, сьнежань 1990 г.

# Дадаткі

## Асьвета Кастуся Мерляка

Кастусь Мерляк пражываў у часе й месцы, дзе ня меў магчымасьці здабываць нармальным ходам пачатковае, сярэдняе й вышэйшае асьветы.

На шляху атрыманьня асьветы стаялі ўсякага роду перашкоды: месца пражываньня, матарыяльныя вымогі, зьмена дзяржаўных уладаў і г.д. Палітычныя й ваенныя падзеі не садзейнічалі набыцьцю агульнай і прафэсыйнай асьветы. Аднак наперакор няспрыяючым абставінам былі выкарыстаныя на працягу ўсяго жыцьця нават мінімальныя нагоды ў паглыбленьні ведаў.

Былі скончаныя:

Szkola Powszechna w Dzietomili/Wsielub pow.Nowogrodzki 1927-1934 Kierownik: M. Gejslerowna

Szkola Rolnicza w Kuszelewie, pov.Nowogrodzki
Wrzesien 1935- Czerwiec 1937, Kierownik prof. Bartkiewicz
Szkola Spoldzielczosci Rolniczej w Naleczowie kolo Liblina
Wrzesien 1937- grudzien 1938, Dyrektor: prof. S.Paczos

Курсы крэдытовых інспэктароў рэспубліканскай канторы Дзяржаўнага банка СССР, гор.Беласток, БССР, травень-кастрычнік 1940 г.

Прыватна вывучаў нямецкую мову ў Наваградку пад кіраўніцтвам сержанта Вэнцэля Наваградзкае камэндатуры, а пазьней, да канца 1943 году студыяваў самастойна.

Прыватна вывучаў італьянскую мову ў г.Вэрона, Ляго ді Грарда і Сна Міхель пад кіраўніцтвам двух прафэсараў. Далей, ад кастрычніка 1944 году да верасьня 1946 году прадаўжаў вучыць італьянскую мову ў лягеры «інтэрнаваных» у г.Тэрні й Рыміні, Італія.

Будучы ў лягеры «інтэрнаваных», вывучаў ангельскую й францускую мовы. Ангельскую мову выкладаў для групы зацікаўленых дырэктар нямецкіх радыёперадачаў гэр.Гэдэль, а францускую праф. Фанторы. У гэтым часе ў лягеры праслухаў незьлічоную колькасьць рэфэратаў на розныя тэмы, браў удзел у канфэрэнцыях ды прачытаў вялікую колькасьць кніжак.

Прыватна вывучаў гішпанскую мову ў Буэнос Айрэс, Аргентына, на працягу 18 месяцаў пад кіраўніцтвам праф.Руссо.

School of World Trade in New York
Evenings 1957-1958, Director, S.Bosse.
Seminar of Cash Management & Strategies for the Eighties, N.Y, May 1979.

## Вайсковая служба Кастуся Мерляка

Удзельнік першых афіцэрскіх курсаў у Менску Беларускае Самааховы—чэрвень1942 г. Атрымаў ступень падафіцера (сяржант)

Кіраўнік курсаў Ф.Кушаль, маёр.

Заст.кіраўніка: В.Мікула, старшы лейтэнант.

Старшыня Беларускае Самапомачы: др.Я.Ярмачэнка.

Удзельнік у арганізацыі батальёна Беларускае Самааховы ў Лідзе Ліпень-кастрычнік 1942 г.

Камандзір батальёну: Касацкі, капітан

Муж даверу ў Лідзе: інж. А.Клімовіч.

*Заўвага: Арганізацыя батальёнаў Беларускае Самааховы была спынена нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў канцы 1942 г.*

У сьнежані 1943 г. быў накіраваны ў Наваградзкі эскадрон кавалерыі выконваць абавязкі інтэнданта (ранг афіцэра). Дэмабілізаваўся ў канцы жніўня 1944 г. у горадзе Дальвіц, Усходнія Прусы.

Камандзір Наваградзкага эскадрону: Б.Рагуля, капітан.

*Заўвага: Пасьля мабілізацыі* аб'яўленай *Прэзыдэнтам БЦР, Наваградзкі эскадрон* пераіменаваўся *ў «93 дывізіён БКА», але незалежна ад гэтага яго называлі й надалей «Наваградзкі эскадрон».*

«93 Дывізіён БКА» *складаўся: аддзел матарызацыйны, кампанія кавалерыі й тры кампаніі пяхоты.*

*Камандзір «93 дывізіёну БКА»: Б.Рагуля, маёр.*

## Праца і службовыя пасады Кастуся Мерляка

Праца й заробкі на пражыцьцё ў розных установах, прадпрыемствах, якія давалі магчымасьць належнага забясьпячэньня для сябе, сям'і, для грамадзкай працы.

### Бацькаўшчына пад Польшчай

Buchalter/Ksiegowy, Luty-Listopad 1939

Zwiazek Gospodarczy,Spoldzielnia z Odpowiedzialnocia Ograniczona

Ul. Zamkowa, Nowagrodek

Prezes: Kucharski, Kierownik: Zaleski

## Бацькаўшчына пад Саветамі

Памочнік старшага крэдытовага інспэктара, сьнежань 1939-красавік 1940

Дзяржаўны банк СССР, г.Наваградак

Упраўляючы: Папоў, старшы крэдытовы інспэктар: Бараўкоў,

Старшы крэдытовы інспэктар (па пасадзе намесьнік упраўляючага)

Дзяржаўны банк СССР, г. Карэлічы, Валеўскі р-н, Баранавіцкая воб.

Упраўляючы: Місюль (з Рэчыцы).

## Бацькаўшчына пад немцамі

Памочнік загадчыка гаспадарчага аддзелу гарадзкое ўправы г.Наваградка, кастрычнік 1941-травень 1942,

Старшыня: Панко,

Загадчык гаспадарчага аддзелу: А.Цехановіч.

Сакратар Беларускай Самапомачы, Наваградзкі раён,

Кіраўнік: А.Стагановіч.

Старшыня трох сельсаветаў Наваградзкага раёну (в. Сулятычы, Нягнявічы й Ваўкавічы), лістапад 1942-кастрычнік 1943

Сакратар: Валентын Таўлай

Старшыня г.Наваградак : М.Буляк.

## Італія —Italia

Sekretarz/Tlumacz, grudzien 1946- luty 1947

Stowarzyszenie Technikow Polskich w W.Brytanii -Oddzial we Wloszech, Rzym, via Remuria,2a, Prezes; Inz.L. Goczalkowski, Kapt.

Assistant to the office Manager, May-September, 1947.

Mediterranean Distributors Co, Ltd., Rome Branch

Rome via Vittoria Colonna No1.

## Аргентына—Argentina

Ayudante Baggagista, Enero 6-Enero 31 de 1948

City Hotel, c.Bolvar 160, Buenos Aires, Argentina.

Accountant and later Assistant to the Chief of Accounting and Finance Department, February 8, 1948-June 30, 1954
Company Maritima Holandesa (Argentina) SAC
Maipu 66/72, Buenos Aires
President: Tj. de Boer
Chief Accountant: A.J.Landsmeer
Owners: Van Nievetl, Goudrian & Co. Stoomvaart Maatschapij, N.V.
Rotterdam -Zuid America Lijn

## Злучаныя Штаты Амэрыкі-U.S.A.

Nederlandschh-Americanche Stoomvaart Maasdchapij, N.Y.
Holland -America Line
Holland America Cruises, Inc.
Presidents: F.R. Wierdsma, A. van L.Maas. H.Reurs. A.C.Buchanan, A.van Tol, J.R. Berry and S. Rhinssmith.

У гэтай кампаніі й другіх, якія былі ўласнасьцю Голянд-Амэрыка Лайн, працаваў ад 17 жніbeня 1954 г. да 8 студзеня 1982 г. ды займаў наступныя становішчы:

Accountant, Aug. 1954-Dec.1963
Assistant Manager of Passenger Control Division, Jan. 1964-Dec.1967.
Manager Passenger Revenue Division, Jan.1968-Dec.1971.
Manager of Accounting Department, Jan. 1972- Dec. 1974.
Controller Federal Steel Tank, Inc.
Gransboro Property, Inc
Fuel Systems, Inc. Jan-Dec.1975.

Assistant to the President, Jan 1976-Dec. 1978
Monarch Crude Lines, Inc,Miami, Florida
President: A.van Tol, General Manager J.Boeren.

Assistant Controller, July 1978-Jan 8, 1982
Holland-America Cruises, Inc, New York
President: J.Berry and S.Rhinesmith

Controller, Feb. 8, 1982-Jan. 21, 1983
Fantasy Cruises Inc, 666 Fifth Ave, New Yirk
President F. Kasner

Controller, Aug.9, 1982-Dec. 5,1983,
Scandinavian World Cruises
17 Battery Place. New York, N.Y.
1080 Port Boulevard, Miami, Florida
President: Odd Kval, Exec, V.P. Niels-Eric Lund, Mng.F.Christinat
Owners: D.F.D.S Group of Companies-Copenhagen, Denmark.

Controller, Feb. 15, 1984 -Nov. 20, 1987
Sun Line Cruises
1 Rockefeller Plaza, New, York, N.Y.
Owners: Oceans Sun Line Shipping Co.
lassonos 3, Piereaus, Grees, and Meriott Corporation, International Headquarters Washington, D.C. 20058
President: George A.Sotir, Exec.President: Mohan Chittal

Secretary/Treasurer, Nov. 20, 1987-Feb. 15, 1989
Sun Line Cruises, Inc,
1 Rockefeller Plaza, New York, N.Y.
Owners: Sun Line Special Shipping Co.
lassonos, Pireaus, Greece
President: M.P, Keusseoglou.

15 лютага 1989 г. пасьля 40 гадоў бесперапыннай працы ў параплаўных кампаніях Галяндыі, ЗША, Даніі й Грэцыі Кастусь пайшоў на пэнсію.

## Грамадзкая дзейнасьць

Кастусь Мерляк на працягу свайго дзейнага жыцьця выконваў розныя функцыі ў беларускіх і іншанацыянальных арганізацыях і ўстановах і займаў наступныя становішчы:

Сябра Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ад 5 жніўня 1948 г.

Заснавальнік Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, 4 красавіка 1948 г.

Старшыня ўправы Згуртаваньня Беларусаў у Аргентыне, 1948-1952.

Старшыня сэктару Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў Аргентыне, 1949-1953.

Прадстаўнік Ураду БНР ў Аргентыне, 1949-1953.

Арганізатар і кіраўнік беларускіх радыёперадачаў у Аргентыне.
Радыёстанцыя «Эксельсёр» 26 сакавіка 1954,
Перадачы паўтараліся другімі дзьвюма радыястанцыямі ў Буэнос Айрэс.

Старшыня акруговае ўправы Нью Ёрк Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Амэрыцы (БАЗА). Byelorussian-American Association in the USA, кастрычнік 1954-чэрвень 1958, чэрвень 1964-чэрвень1965.

Старшыня Галоўнай Управы БАЗА, чэрвень 1959-чэрвень 1963.

Старшыня Беларуска-Амэрыканскага Аб'еднаньня Нью Ёрку. (Byelorussian-American Union of New York), з чэрвеня 1965 г.

Старшыня Беларуска-Амэрыканскага камітэту Вэтэранаў дзеля адзначэньня 20-годзьдзя у 1964 г. Беларускай Краёвай Абароны.

Старшыня ўправы Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў у Нью Ёрку, 1964-1965.

Заступік камандора Згуртаваньня Беларуска-Амэрыканскіх Вэтэранаў (Byelorussian-American Veterans Association, Passai, N.J.), 1973-1975.

Сакратар Згуртаваньня Беларуска-Амэрыканскіх Вэтэранаў, Нью Ёрк, з кастрычніка 1976 г.

*Даведка: Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады Р.Астроўскі прызнаў сп. К.Мерляку рангу капітана Беларускай Краёвай Абароны, 17 жніўня 1974 г.*

Старшыня камітэту набыцьця Беларускага народнага дому й царквы ў Нью Ёрку, 1955-1957.

*Даведка: Царкоўны будынак куплены пры 401 Атлянтык Авэню, Бруклін, Нью Ёрк, 15 кастрычніка 1957 г.*

Адзін з заснавальнікаў і падпішчыкаў «Чартару» фундацыі імя П.Крэчэўскага й сябра яе рады дырэктараў, красавік 1960-сакавік 1966.

Заступнік старшыні карпарацыі рэсорту Бэлэр—Менск (Vice-president of Resort Belair Miensk, Inc. Glen Stey, New York), люты 1964-сакавік 1965.

Сябра дырэкторыі рэлігійнага адпачынкавага цэнтру Бэлэр-Менск

(Religious Recreation Center Belair-Miensk, Glen Stey, New York), чэрвень 1970.

Заступнік старшыні Беларускага Кангрэсовага Камітэту Амэрыкі. (Vice-President of Byelorussian Congress Committee of America), 1971-1974.

Заступнік старшыні рады катэдральнага сабору сьв.Кірылы Тураўскага, БАПЦ у Брукліне, Нью Ёрк, лістапад 1965-верасень 1968.

Заступнік старшыні царкоўнай управы Амэрыканска-Беларускай Праваслаўнай Царквы сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк (пад апекай Усяленскага Канстантынопальскага Патрыярхату, кастрычнік 1965-люты 1981.

Заступнік старшыні камітэту пабудовы царквы сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк.

*Даведка: камень умураваны пад царкву 21 чэрвеня 1970 г. Першая Божая служба ў царкве 20 кастрычніка 1972 г. Высьвечаная царква сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, 30 кастрычніка 1983 г.*

Старшыня Царкоўнае Ўправы Амэрыканска-Беларускай Праваслаўнай Царквы сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, з лютага 1982 г.

Старшыня сэктару Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў ЗША, сьнежань 1954-красавік 1962 (перавыбраны 6кастрычніка 1958 г.)

Сакратар нутраных справаў сакратарыяту Беларускай Народнай Рэспублікі. Выбраны на УІІІ сэсіі Рады БНР 18 лістападу 1956 г. да 8 красавіка 1962 г.

## Інтэрнацыянальныя арганізацыі

The League for the Liberation of the Peoples of the USSR the Paris Bloc),Munich, Germany. Founded in March 1953 in Paris, France.

Ліга Вызваленьня Народаў СССР (Парыскі блёк), старшынёю якога быў інж.Мікола Абрамчык, складалася з наступных краінаў: Арменіі, Азэрбайджану, Беларусі, Казахстану, Крыму , Ідэл Уралу, Паўночнага Каўказу ,Туркестану й Украіны.

Камісія ў Нью Ёрку Лігі вызваленьня народаў СССР (Парыскі блёк) была створана ў 1955 г., у якой ад Беларусі сп.К.Мерляк займаў наступныя становішчы:

Скарбнік, 1955-1957,

Сакратар, 1957-1959,

Старшыня, 1959-1962, калі была зложана адстаўка.

Наступным старшынёй быў грузін др.Г.Накашыдзе.

Ганаровы сябра: Bloque Democratico Anticomunista Buenos Aires, Argentina, 1949-1954.

Сябра дырэкторыі:Alliance of Americans of Foreign Origin Wichita, Kansas in 1962.

Сябра дырэкторыі:Americans to Free Captive Nations, Inc. 1965-1967.

Генэральны сакратар: Secretary General of American Conference for the Liberation of the Non-Russian Nations in the USSR 1960-1962.

## Рэспубліканская партыя ЗША

Chairman of Byelorussian Section of the Republican National committee's Nationalities Division(Старшыня Беларускае сэкцыі аддзелу нацыянальнасьцей Рэспубліканскае партыі ў Вашынгтоне), 28 жніўня 1964-25 сакавіка 1968.

Chairman of the Commission for creation of Nationalities Division in the Campaign for Governor Rockefeller (Старшыня камісіі па арганізацыі аддзелу нацыянальнасьцей для выбару Рокафэлера на губэрнатара штату Нью Ёрк), травень-кастрычнік 1966.

Chairman of Byelorussian Division of Friends of the Rockefeller Team for 1970 election year.(Старшыня Беларускага аддзелу прыяцеляў Рокафэлера й яго супольнікаў у выбарах 1970 г.)

Representative of Byelorussia in the Committee of Ethnic Americans for Nixon-Agnew for 1972 election year (Прадстаўнік ад беларусаў у Камітэце этнічных амэрыканцаў за Ніксана —Агню у 1972 г. выбараў).

Chairman of the Byelorussian American Republican Club of Queens, New York, Member of Byelorussian American Republican Federation (Старшыня Беларускага Амэрыканскага Рэспубліканскага клюбу ў Квінсе, Нью Ёрк), ад красавіка 1983 г.

Member of Queens County Republican Committee
Elected on Primary Election Day-June 20, 1972 and
Elected of Primary Election Day-April 6, 1974.
Сябра Камітэту ад акругі Квінс, Нью Ёрк, Рэспубліканскае партыі, выбраны на агульна-партыйных выбарах 20 чэрвеня 1972 г. і 6 красавіка 1974 г.

## Удзел у друку

Артыкулы, мэмарыялы, лісты карэспандэнцыі, прамовы й нэкралёгі Кастуся Мерляка ў розныя гады друкаваліся пад прозьвішчам К. Мерляк і псэўданімамі К. Мацкевіч, Аргентынскі, К.Мароз, К.Мельнік, А.Гурда, Д.Маяк, К.М.,К.Ц. Акрамя гэтага карэспандэнцыю для хронікі падпісваў «Прысутны». Ніжэй падаем важнейшыя матэрыялы, якія былі друкаваныя на працягу жыцьця.

*К. Мерляк.* Простым розумам—Б. № 24(27), 11 ліпеня 1948.
Аб рэпрэзэнтацыі беларускае эміграцыі на чужыне.

*К. Мерляк.* Сталася гэта ў Аргентыне — Б. №5(49), 6 лютага 1949.
Пра забойства беларуса, які нядаўна прыбыў у Аргентыну ў г. Бэрысо.

*К.Мерляк.* Ліст з Аргентыны — Б. №9(53) 6 красавіка 1949.
Інфармацыя пра магчымасьці эміграцыі ў Аргентыну.

*К.Мацкевіч.* Фашысты могуць ехаць на «родину»—Б. 70, 15 верасьня 1951.
Аб савецкай акцыі вяртаньня беларусаў з Аргентыны ў БССР.

*К.Мацкевіч.* Беларуская эміграцыя ў Аргентыне-Б № 71, 30 верасьня 1951 і № 72, 15 кастрычніка 1951.
Гістарычны нарыс аб беларускай эміграцыі.

*К.Мацкевіч.* Як савецкі консуль у Аргентыне ліквідаваў беларускую арганізацыю—Б. № 38(117), 21 верасьня 1952.

Акцыя прылучэньня беларускай арганізацыі «Бібліятэка імя Івана Луцкевіча» да Славянскага Саюзу. Гэтым самым ліквідавалася найбольшая беларуская бібліятэка ў Аргентыне. Славянскі Саюз быў апанаваны й кіраваны Савецкімі агентамі да часу яго зьліквідаваньня прэзыдэнтам Пэронам.

Беларусы ўшанавалі памяць Эвы Пэрон—Б. №33(112), 17 жнівеня 1953.

Аб удзеле беларускае дэлегацыі ў пахавінах сьв.пам.Эвы Пэрон, жонкі Прэзыдэнта Аргентыны генэрала Хуана Домінго Пэрон.

*К. Мацкевіч.* Узорная праца Беларусаў Аргентыны —Б. №18(149), 3 травеня 1953.

Аб дзейнасьці Згуртаваньня Беларусаў ў Аргентыне.

*К.Мацкевіч.* Віцік Жывіца —Б. № 21-22(152-153), травень 1953.

Рэцэнзія на повесьць Флёрыяна Чарнышэвіча (310 бачынкаў) з часоў 1918–1919 гадоў. Выд. Аб'еднаньне польскіх літаратараў і журналістаў у Аргентыне.

*К.Мароз.* За правільную пастаноўку справаў—Б. №29(259), 17 ліпеня 1955.

Аб працы й парадку ў беларускіх арганізацыях Нью Ёрку.

*К.Мароз.* 25 Сакавіка ў Нью Ёрку —Б. №15(297), 8 красавіка 1956, №16(298), 15 красавіка 1956, №17-18(299-300), 29 красавіка 1956.

Аб сьвяткаваньні незалежнасьці Беларусі ў Нью Ёрку. Рэха сьвяткаваньня сакавіковае гадавіны й водгукі ў амэрыканскім кангрэсе й іншанацыянальнай прэсе ў Амэрыцы.

*К.Мельнік.* Прэсавая канфэрэнцыя ў Нью Ёрку—Б. №41(323), 7 кастрычніка 1956.

З нагоды прыезду Старшыні Рады БНР інж. Міколы Абрамчыка ў Амэрыку.

*К.Мельнік.* Заканчэньне 8 сэсіі Рады БНР і ад'езд праз. М.Абрамчыка ў Эўропу—Б. №5(339), 3 лютага 1957

*Карэспандэнцыя аб заканчэньні 8 сэсіі Рады БНР.*

*К.М.* Сьвяткаваньне сакавіковых урачыстасьцей—Б. № 15-16(343-350) Вялікдзень 1957.

Аб сьвяткаваньні 39 угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларусі.

*А.Груда.* Тыдзень Паняволеных народаў, радыё «Свабода» й беларусы—Б. № 41(477), 6 лістапада 1959.

Аналіз становішча Парыскага блёку і радыё «Свабода» ў сьвятле праклямацыі Тыдня Паняволеных народаў Прэзыдэнтам ЗША. Д.Д. Айзэнгаўэрам 17 ліпеня 1959 г.

*А. Груда.* Ушанаваньне ахвяраў камуністычнае тыраніі— Б, №25-26(461-462), 28 чэрвеня 1959.

Аб жалобнай акадэміі ў Карнэгі Гол, Нью Ёрк 14 чэрвеня 1959, прысьвечанай ахвярам паняволеных народаў Расейскім камунізмам.

*А.Груда.* Аб 8 Кангрэсе БАЗА ў сэнаце ЗША—Б. №25-26(461-462) 28 чэрвеня 1959.

Выступленьне сэнатара Кэннэт Кітынг аб рэзалюцыі, прынятай на 8 кангрэсе БАЗА.

*А.Груда.* Дэманстрацыі супраць Хрушчова ў Нью Ёрку—Б. №37 (473), 4 кастрычніка 1959.

Аб дэманстрацыі беларусаў у Нью Ёрку й рэзалюцыі «Мы адказваем Хрушчову» з нагоды наведаньня ім Амэрыкі.

*Д.Маяк.* Беларусы Нью Ёрку дэманструюць— Б. №39(523), 9 кастрычніка 1960.

Аб дэманстрацыі з нагоды прыезду Хрушчова й сакратара КПБеларусі К.Мазурава на чарговую Асамблею Аб'еднаных нацыяў у Нью Ёрк.

*Д.Маяк.* Канфэрэнцыя нацыянальных арганізацыяў у Вашынгтоне—Б. №39(523), 9 кастрычніка 1960.

Тэма канфэрэнцыі—прыезд Хрушчова й паўстрыманьне савецкае экспансыі ў вольным сьвеце.

*Д.Маяк.* Гадавы сход Беларуска-Амэрыканскай Дапамогі (БАД) — Б. №46-47 (530-531), 27 лістапада 1960.

Справаздача з дзейнасьці БАД у дапамозе беларусам за межамі ЗША.

Пытаньні, парушаныя сп. К.Мерляком—Б. №46-47 (530-531), 27 лістапада 1960.

Аб прадвыбарчым вечары 15 кастрычніка 1960 г. у Беларускім грамадзкім цэнтры ў прысутнасьці прадстаўнікоў рэспубліканскай і дэмакратычнай партыяў.

Прыкладнае сьвяткаваньне—ЗН, №6-7, люты-сакавік 1951.

З нагоды Калядаў, ладжаных Згуртаваньнем Беларусаў у Аргентыне.

*К.Мацкевіч.* Хроніка з жыцьця беларускай калёніі ў Аргентыне —ЗВ, № 7, 1951, 15 кастрычніка.

К.Мерляк, прамова старшыні Галоўнае Управы БАЗА на акадэміі, прысьвечанай 45-м угодкам незалежнасьці Беларусі, якая адбылася 24 сакавіка 1963 г.ў Нью Ёрку, БД, №5, 1963

*К.Мерляк.* Ушанаваньне ці паклёп — ЗВА, №3(15), верасень 1979.

Адказ на артыкул А.Калодкі «Пётра Родзевіч у 36-я ўгодкі арышту й 35-я ўгодкі сьмерці, надрукаваным ў часопісе «Зважай» № 1(13) за сакавік 1979 г.

*Кастусь Мерляк.* Вызваленьне Беларусі магчымае — ЗВА, №4(52), лістапад 1988.

Агляд палітычнага стану ў Беларусі падчас першае спробы вызвалéньня ў 1918-1920, другое спробы ў 1941-1944 і сучаснага палажэньня ў СССР і БССР, якое будзе выкарыстанае да ўстанаўленьня сувэрэннай беларускай дзяржавы ў канцы XX ст.

*К.Мерляк.* Справядлівасьць рэдакцыі «Бацькаўшчына» — БГ, №78, люты 1961.

Аб справе няправільнага падаваньня фактаў зь дзейнасьці БАЗА.

*Кастусь Мерляк.* Правакацыя прадаўжаецца—БГ, № 184, чэрвень 1970.

Аб выяўленьні нацыяналізму ў літаратуры й паэзіі пісьменьнікаў БССР на бачынах эміграцыйнае прэсы, што дапамагала К.Д.Б. узяць іх пад кантроль і *прасьледаваньне*

*К.Ц.* Забаранілі маліцца—БГ № 184, чэрвень 1970.

У справе забароны беларускім *сьвятарам,*якія не належаць да юрысдыкцыі БАПЦ маліцца на магільніку ў Іст Брансьвік, Нью Джэрзі.

*Кастусь Мерляк.* Нават Арсеньневу панізілі—БГ, № 200, сакавік 1972,

Да выданьня зборніка «Між Берагамі».

*К.Ц.* Беларусы Нью Ёрку ўвайшлі ў сваю новую царкву—БГ, № 207, лістапад 1973.

Аб першай службе й малым высьвячэньні царквы сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, 29 кастрычніка 1972 г.

*Сябра.* Сьвятой памяці Васіль Юрцэвіч—БГ, № 217, лістапад 1973.

Некралёг.

*Кастусь Мерляк.* Пісьмо ў Рэдакцыю—БГ, №218, сьнежань 1973.

У справе пабудовы помніка беларускім змагарам-героям на беларускім магільніку ў Іст Брансьвік, Нью Джэрсі.

*Кастусь Мерляк.* Беларускія бібліятэкі й архівы на эміграцыі—БГ, № 225, верасень 1974.

Аб агульным стане бібліятэкаў й архіваў ды магчымасьці заснаваньня бібліятэкі й музэю ў ЗША.

*Кастусь Мерляк.* Будова царквы закончана—БГ, № 240, студзень 1976.

Паведамленьне аб тым, што пабудова царквы сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, закончана ў Дзень удзячнасьці 1975 году.

*К.Мерляк.* Сьв. пам. Міхась Брэзоўскі—БЕ, № 209, верасень 1974. Некралёг.

*К.Мерляк.* Царква сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк (1969-1980)—БЕ, №288, сакавік 1981.

Агляд жыцьця й развою прыходу.

*К.Мерляк.* Сьв. пам. Адам Горбат—БЕ, №322, верасень-кастрычнік 1984.

Некралёг.

*К.Мерляк.* Сьв.Пам.Васіль Захаркевіч—БЕ, №320, верасень 1986, Некралёг.

Discurso proninciado en la Miting de la Liga Eslava por el senor Constantino Mierlak, dirigente de los Bielorrusos en la Liga Eslava -TP. #24, Oct.11, 1948

*K. Mackievic* Compendio de la historia de Bielorrussia.

La emigracion Bielorrusa en la Argentina.

Нарыс з гісторыі жыцьця беларусаў Аргентыны. Пэрыяды: пасьля першай сусьветнай вайны, 1924-1939, 1946-1951.

La situacion politica actual de Bielorrusia, In: Memorandum para el Primer Congreso Anticomunista Panamericano. Mexico, Febrero de 1954.

*K. Mierlak* Prirodni sapeznici Byelorusya --HR, #4(148), #5(149), 1954.

*Канстанцін Мерляк.* Так у чым справа? —УВ, №6,7лютага 1960.

Да Тыдня Паняволеных народаў, аб радыё «Свабода» і Беларусі.

Under the Red Heel --NY, #26, October 6, 1961.

Ліст аб каланіялізме Савецкага Саюзу.

Congressional Record

Vol 106 washington, March 31, 1960, #59, p.A2877.

Address by Constant Mierlak at Byelorussian-American Meeting, CR, #59, March 31, 1960

Extension of remarks of Hon Kenneth B.Keating of New York in the Senate of the United States, Thursday, March 31, 1960

Congressional Record

Proceedings and debates of the 87 th Congress, First Session.

More Voice of America for Byelorussia.

Extension of remarks of Hon. Kenneth B.Keating of New York in the Senate of the United States. Monday, February, 6, 1961.

Letter to the President of the United States, Re: Byelorussian Language broadcasts by the Voice of America by Constant Mierlak, National President, Byelorussian -American Association.

The Crimes of Khrushchev, part 6

Commitee on Un-American Activities--House of Representatives Eighty-Sixth Congress, First Session.

Statement of Mr.Constant Mierlak, December 17, 1959, pp.14-18.

Information about Byelorussians in the United States and their organizations. Political situation in the BSSR and Khrushchev policy of ruthless russification and collonial exploitation of Byelorussian people.

Congressional Record

Wachington, D.S. may 4, 1960, p. A 3810.

Observation on the Forthcoming Summit Conferrence.

Letter to the Hon. Christiaan A.Herter, Secretary of the State by Constant Meirlak, National President of the Byelorussian-American Association, contraining some very sound advice on the eve of the Big Four Summit Conference which will take place in Paris on May 16, 1960.

## Зь ініцыятывы й пры ўдзеле Кастуся Мерляка былі выдадзеныя наступныя выданьні:

Bielorrusia y los Bielorrusos en la Republica Argentina, Buenos Aires, 1953.

Byelorrussia's Independence Day March 25, 1918, New York, 1953,

For freedom and Independence of Byelorrussia, New York, 1960,

Памятка Высьвячэньня Царквы сьв. Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл, Нью Ёрк, 30 кастрычніка 1983,

## Іншанацыянальная прэса

Акрамя беларускае прэсы на эміграцыі артыкулы, карэспандэнцыі й зацемкі аб Беларусі й дзейнасьці беларускіх арганізацыяў друкаваліся ў іншанацыянальных газэтах, часопісах ды іншых выданьнях.

EH. #21009, 14 abpril, 1950,

Cr. #14, 256, 14 Jun, 1954,

Hr.#4(243), 23 Feb, 1958.

NK.#27, 10 Jul, 1948
NK.#21(813) 7 Jun, 1951
NK.#22(1020), 17 Jon, 1954
NK. #24 (1022), 1 Jil, 1954

ALB. #876, Abril 14, 1949
ALB. #881, Junio 21, 1949
ALB. #882, Agosto 4, 1949
ALB. #883, Agosto 18, 1949
ALB. #897, Marzo 23, 1950
ALB. #898, Abril 6, 1950
ALB. #910, Diciembre 6 1952

ALB. #944, Marzo 13, 1952
ALB. #975, Junio 25, 1953
ALB. #993, Marzo 11, 1954
ALB. #1000, Junio 24, 1954

S. # 57, March 26, 1956
S. #58, March 27, 1956
S. #61, April 1, 1956
S. #64, April 4, 1958
S. #74, April 19, 1958
S. #152, August 8,1959
S. #34, February 20, 1960

P. #28, September, 1959

BN. #168, Jule 18, 1956

BD. # 308, March 30, 1956

SS. #12, Den 18, Marz 1956

UW. #75. 5 zpvtmia 1958

DD.#2826. 21 de Marzo de 1957,

VS.#9. April 4, 1966

NS.# (?) March 26, 1955
NS.#74, March 29, 1955
NS.#81, April 7, 1956
NS.#74, Mach 29, 1958
NS.#80, April 5, 1958

CL.#50, April, 1957
CL.#62, April, 1958
CL.#80, Octovber 1959
CL.#82, December 1959
CL.#87, May 1960
CL.#92, October 1960

C.#4, June 1962

NYJ.#41, 861, July18,.1961

UV.#3, Hanuary 21, 1970

NT.* 14, March 29, 1956

NV. * 14, 29 marta 1956

SEP. vol 228 *3, July 16, 1955

L. *81, June 1958,

LM.* 13, Agosto de 1953
LM.* 15, Octobre de 1953

## Скароты

Б—Бацькаўшчына,
Ворган Беларускай Нацыянальна-Вызвольнай думкі
Die Weissrruthenicshe Zeitung
"Das Vaterland"
Munchen, Deutchland

БГ—«Беларускі Голас»
Byelorussian Voice, Torontò, Canada

БД—»Беларуская думка».
Грамадзка-палітычны й літаратурны часапіс—Нью Ёрк-Саўт Рывэр

БЕ—«Беларус»
Газэта беларусаў у вольным сьвеце
"Bielorus" Byelorussian Newspaper in the Free World, New York

ЗВ—«За волю»
Часапіс Беларускай вызвольнай думкі — Парыж, Францыя

ЗВА—«Зважай»
Часапіс беларускіх вэтэранаў —Таронта, Канада

З—«Зьніч»
Беларускі рэлігійна-адраджэнскі часапіс—Рым, Італія

ALB-"Argentinos Lietuviu Balsas" La voz de los Litianos en la Argentina

BD-"Brooklyn, New York

BN-"The Beacon News'

C-"Cossakia", Kosakenland

CL-"The cossacks Life" Monthly Magazine

CR-"Critica" El Diario de Buenos Aires

DD-"El Diario  de la Nueva York"

EH-"El Hogar"- Buenos Aires

HR-"Hrvatska" Glasilo Hrvata Juzne Amerike, Buenos Aires, Argentina

HRC-"Hrcatska" (Croacia) Buenos Aires

L-"Holland -American Line Nasm News"

LM-"Lirose" Organo Mensial de la Mutalidad Lirosa.

NK-"Nash Kluch" Nustro Llamado organo de la collectividad Ukrainiana en la Argentina

NS-"Nowy Swiat" Th Polish Morning World

NT-"New Times" A weekly Jornal

NV-«Новое время», Еженедельный журнал

NY-"New York Herald tribune"

NYJ-"New York Journal American"

P-"Prometeus" Ukrainia  Weekly

S-"Svoboda", Ukrainian Daily

SS-"Sontagsbvlatt Stats-Zeitumg und Herald"

SEP-"The Saturday Evening Post", Magazin

TR-"Tribuna Popular", Buenos Aieres

UV-"Ukrainian Voice"

UW-"Uxrainski Wisti"

VS-"Vilni Svit"-Free World, Ukrainan Weekly

## Ліста беларускіх арганізацыяў, якія тварылі Фэдэрацыю Беларускіх Арганізацыяў у Аргентыне ў1949 годзе

1. Collectividad Bielorrussa
V.V.Maiakovski
C.Madariaga 809
Buenos Aires-Argentina

2. Collectividad Bielorrusa
Ivan Franko
C.Borgez 1902
Olovos
prov.Buenos Aires-Argentina

3. Collectividad Bielorrusa
Jakob Kolas
c. Curupaiti 3350
Valentin Alsina
prov.Buenos Aires-Argentina

4. Redaccion "Nustra Voz"
c. Terrada 1976
Buenos Aires-Argentina

5.Union Bielorrusa en la Argentina
c.Terrada 1976
Buenos Aires-Argentina

6 Collectividad Bielorrusa
"Aleksej Tolstoy"
c.Pio Diaz 2346
Buenos Aires-Argentina

7.Collectividad Bielorrusa
c. Loria 1246
Buenos Aieres Argentina

8.Collectividad Bielorrusa
"Minsk"
c.Raul Angullo 1488
Dock Sud-Avellaneda
prov.Buenos Aires-Argentina

9.Biblioteca Bielorrussa
"Ivan Lyckevich"
c.Nicasio Orono 1246Buenos Aires-Argentina
10. Collectividad Bielorrusa en Caseros
c.Caseros 146
Caseros
prov.Buenos Aires-Argentina

11. Centro Cultiral Bielorrusso
"M.Gorki"
c.Turquia 3842
Montevideo- Urunguay

12, Comite Bielorrusoa de Ayuda
c.Hipolito Irigoyen 723
Buenos Aires-Argentina

13.Centro Cultural Bielorrusso
"M.Gorki"
c.Terrada 1976
Buenos Aires-Argentina

14. Collectividad Bielorrusa
"Georgi Skaryna"
c.Lisboa 728
Berisso
prov.Buenos Aires-Argentina

15. Biblioteca Bielorrusa
"A.S.Pushkin"
Rosario
prov. Buenos Aires-Argentina

16. Biblioteca Bielorrusa
"Janka Kupala"
Comodoro Rivadavia
Argentina

# Імянны паказальнік

A

Абабурка, а.—365
Аблажэй, Макар—213
Абрамчык, інж. Мікалай—78, 89, 92,96,97,100,113,117,118,120,121, 122, 123,126,128,129,132,133,136, 137,138,139,140,141,145,147, 152, 153,154,155,159,160,163,170, 171, 172,179,10,181,183,184,186,193, 211, 212, 215, 217, 221, 222, 223, 224, 225, 226, 244, 270,
Абрэмскі, а.Юры—260, 261,338, 339, 340, 342, 346, 347, 349, 368
Агню, Спіро, заст.прэз.ЗША—294
Адабо, кангрс. Джозэф—379
Адамовіч, Алесь—421
Адамовіч, праф.Антон—111,123, 128,129,132,135,140,159, 160, 162, 163,166,170, 173, 214, 216, 224, 239, 240, 241, 248, 260,402,408, 409
Адамсм, Шэрман—155
Адонізіё, кангрс. Г'юз Дж.—144
Айзэнгаўэр, Двайт Д. Прэз. ЗША—110, 145, 154, 155, 161, 166, 168, 171,176, 180, 187, 191,
Акула, Кастусь—137, 138, 228,369, 429
Акэрман, кангрс, Гары—379
Александровіч—21,30
Алехнік—326
Аляксандр, мгр,—168
Аляксандр I, цар—3
Аляксандр, фэльдмаршал—41
Анацкі, праф. Аўген—94
Андэрс, ген, Уладылаў—39,51,54.81, 102, 104,
Андропаў, Юры—325
Андрэй, мітр.БАПЦ (А.Крыт)—301,336, 337, 340,347, 349. 354, 355, 357, 358, 359, 360, 363, 364, 366, 36,
Анфузо, кангрс, Віктар Л.—200
Апанас, архіяп.РЗЦ—115, 146, 389
Арамбуру, ген.Пэдро —63, 340, 342, 346, 347, 349, 368
Аркадыев—78
Аркей, А.(псэўданім)—147
Армстронг, кангрс, К.К.—155
Арсеньнева, (Кушаль) Натальля—128,138,140,159, 161,167,170,184,1948,211,215, 216,228,239,409
Арцішэўскі, Міраслаў—94
Арцюх, Мікалай—359
Арцюх, Язэп—128,213,253,292
Арцюшэнка, Грыгоры—397, 398
Арцюшэўскі, М.—193,
Арыйчук, а.Барыс, УАПЦ—59,
Арэхва, др.А.—146,190,404
Асіповіч, А.—144,
Астроўскі, праф. Радаслаў—25, 95,99,112,113,118,121,123,127, 146, 176,189,190,213,252,253,404, 420, 424
Атэнагорас I, Усяленскі Патрыярх—335,386,388,390

Б

Бабаян, В.К.—138,
Багдан, архіяп. УАПЦ—134,
Багушэвіч, Францішак—330
Базылеўскі, праф. I—139,
Бандарук, а.Канстанцін—393
Барбур, —176.
Барткевіч, Леанід—331
Бартуль, Вера—167
Бартуль др.Анна—216
Бартуль, Францішак—167, 187, 211, 216, 228,409, 412, 413
Басік, Ігнат—104
Басік, (Мерляк) Люба—104
Басік, Валдэмар—252
Батыста, Фульджэнсіё, прэз. Кубы—174
Батюк—149,
Бахар, Міхась—229, 230, 235, 247, 259,311

Безуглава, Вера—75
Белямук, Міхась—187
Беразоўскі—138
Берут—24
Бітус—22
Бітэ, М—94
Блеір, Гунтэр—161
Бобрык, Арно—94
Бойка—11
Бортнік, Ул—404
Брылеўская, Л—165, 229,247, 394
Брылеўскі, Уладзімір—279
Быкава, Аляксандра—6
Быкаў Сяргей—6
Бычкоўска, Мальвіна—71, 73
Бычкоўскі Ўладзімір —71, 73, 174
Буляк Мікалай—21,23
Бунчук, П.—128,130,
Бурджэс, Гай—118
Бэрнгам, Джэймс—119
Будзейка, А.—422, 424
Багровіч, Андрэй—234,
Булгай, ген.—251
Бураўкін, Г.—414
Бурэн, Ян—259,277
Бурч, Дын—253
Буш, Джордж, прэз. ЗША—300
Бор, Т'ёмэ дэ—58
Браўн, др.Гарыс Фрэдэрык—156, 235
Броўка, П.—426
Брыль, Янка—426, 427, 429
Брынкевіч, а.Мячыслаў—381, 391, 392, 393
Брэзоўскі, Міхась—261,340, 342, 347, 372, 373, 374, 375
Брэжнеў, Леанід—258,262,324, 325
Бубаноў, ген.—193
Бэйкер—363
Бэк, Ю.—10, 94
Бэн, Рыгор—381
Бэнзон, Бранко—94
Бэнэдыкт, архіяп.БПЦ—114,115
Бэрд, праф. Томас—379, 381
Бэры, Джон—180,206, 424
Бэры, Джон, Р.—380
Бэрыя, Л.—197, 417
Бялыніцкі—15,19

## В

Вагнэр, Робэрт Ф.мэр Нью Ёрку—134,136,155,162,207, 211,213,217,221, 227, 247
Валентын А.—273
Валіс, Гэрмэні—221
Ван Каўэлярт а.Робэрт дэ Уільс—135
Ван Тол, Ары—277
Ван дэр Ворм—277
Вайцяхоўскі (Ворт) Кастусь—253, 259
Вайцяхоўскі, Ксенафорд—171
Валюкевіч, В.—340
Варава, Б.—127
Варонка Язэп—125,326
Васілеўскі, (Войтэнка) др. і а.Віктар—169, 188,245, 340, 346, 351, 352, 257
Васілёнак, Я.—426
Васіль, архіяп.БАПЦ (Тамашчык) —87,115,125,129,130,131,134, 141, 148,149,152,153,155,163,167, 168, 174, 180, 188,191, 204, 209, 217, 220,29,230,235,239,240,245, 247,248,249, 259,261,265,308, 333, 335, 336, 337, 338, 339, 340, 341, 342, 344, 345, 346, 347, 349, 353, 361, 367, 369, 372
Васіль, мітр. Варшаўскі й усяе Польшчы—380
Ваўлі, інсп. Люіс—85
Вашчыловіч, Іван—65, 76
Вежын,Ю.—32
Вежонскі, (Чырык) Іван, 91,

Вербаловіч, Б.—105
Велёнда, Ул.—26
Вельфмаер—23
Вілей, сэн. Аляксандар—205
Вілер—45
Віліс, др.—45
Візнер, Фрэнк Ф.—117, 176, 177
Вільямс, Робэрт—390
Вільямс, сэн. Г.А.—315
Вініцкі, А.—203
Войтэнка, прат.Сьцяпан—357
Войтэнка, мгр і а.Расьцілаў—357, 358, 361
Войтэнка, Мікалай—357, 358, 360
Волтэр, Франсіс —173
Вольф, сяржант—37
Воскобійнік, М.—163
Вострыкаў, М.—193
Вронскі—Карачы, граф Аляксандр—45,49,51,54
Вранчыц—45
Высоцкі, Ф.—248
Вытвыцкі, др. С.—134, 171, 221, 222
Вэнцэль—21
Вэнтгольт—124
Вялікі, прат. Павал—379, 381, 391
Вярбіцкі, др.Аўген —221,253, 292
Вячаслаў, архіяп. УАПЦ—115
Вячорка, прат. Васіль—67, 73, 76, 86, 87,102, 213

## Г

Габрыеле, а.Францішканін—44
Гавліна, біскуп—51
Гаворка, Надзя—30
Гайлевіч—88
Галічын, Ген.—46
Галпэрн, кангр.Самуэль—259, 264
Галяк мгр. Леанід—128, 133,141,165,187,242,243,260, 342, 349, 396, 397, 399
Ганчарэнка, Галіна—105,
Ганько, М.—138 134,135,206
Ганэцкі, Пётр—1647,210,211, 240, 241,260
Гаратуньян, Г.—163
Гарбачоў, Міхаіл С.—325,425, 428, 429, 430
Гарошка, а.Леў—50, 80, 89, 144
Гарошка, мгр. Валянтын —346, 355, 360, 361, 362, 363, 365, 366, 367, 368, 398, 399
Гарошка, інж. Мікалай—123, 129, 149, 223, 261, 264, 354, 355, 400, 408, 409, 410, 411, 414, 413
Гарошка Расьціслаў—249, 250, 358, 368, 400, 401
Гарыман, Авэрэль—162
Гасіч—84
Гасьцеяў, Юры—187, 188, 252
Гашыс, капт.—79, 84
Гейхрох, а.Іван—73, 76,102
Гейхрох, Вольга—79
Гілі, Томас—279
Гільдэбрант, Усевалод—23
Гімпель, А—72
Гіслінг—44
Гіцкі, (Дудзіцкі) Уладзімір—136
Гладкі, Я.—158, 409
Глазкоў, др.Васіль—163,171, 222,315
Глебка Цімафей—426
Глінскі, Кастусь—146
Голікаў, ген.—420
Гольдбэрг—206
Гольдвотэр, Бэры—253, 255,257, 289, 423
Гольштэйн, К.—399
Гольштэйн мгр. Л—398, 399
Гомэз, Нэлі—71
Грамовіч—426
Граймс, мгр. Джэймс Ф.—346,398,399

Груцько, Поля—174
Груша, Стэфанія—5
Грыгоры, архіяп.УАПЦ—165
Грынкевіч, Анатоль—45, 46, 65, 73
Грынкевіч, др.Станіслаў—239, 241, 402
Грышанс, а. Марянін—89,
Грыцук, Алесь—138
Грэбень, Мікалай—292
Губэрт, Аляскандра—246,283
Губэрт, Антон—59,66,246,263
Гувэр, Джон Эдгар—206,424
Гудрыян, ван Нівэльт—103
Гузэнко, Ігар—72
Гумен, М—187, 340, 355
Гумпфры, Г.Губэрт—257
Гурскі, Ільля—324,425, 426
Гутар—21
Гутар, Люда—21
Гуткоўскі, Язэп—260
Гэйслерувна, Марыя—7
Гэрман, Эб.—191, 220
Гэрмановіч, а.Язэп—198, 204
Германос, мітр—311, 313
Гэртэр, Крыст'ян А. 171, 181
Гэрдж—124

## Д

Дабранскі, праф.Леў Е.—133
Д'Амато, сэн, Альфонс—379, 381
Дакарытдзе дон Л—94
Далей, кангрс. Джон—155
Далес, Джон Фостэр—145
Дальтон Вілфрэд—296
Даніловіч, А.—264, 311
Даніловіч Браніслаў—239
Данілюк Барыс—125,140,149, 163,245, 265. 341, 346
Данілюк, прат. Хведар—158. 339
Дарашэвіч, М.—123
Даўкантас, ген.Тодар—79, 94
Дземідзенка, Ліда—71
Дземідзенкі—66
Дзешук-Цішэўска, Г.—21
Дзімітріёс, Усяленскі Патрыярх—382
Дзімітрый, япіскап (сэрбс. П.Ц)—347
Дзяковіч—21
Дзямідаў ген.—187 ,252, 253
Джавіц, дэн, Якоб К—204
Джонсон, Лындон Б.прэз. ЗША—192, 204, 211, 217, 235, 257, 262, 289, 423
Довнінг, Робэрт—195
Дол, сэн. Боб—381
Дорн, кангр.Францішак—134, 141,143,150,151,152,155,158,163,-171,180
Дочэф, др.І—315
Другавец,Уладзімір—73, 75, 76, 77, 79, 83, 84, 92, 102, 203
Дубовік, Аўген—264
Дубовік, Элізабэта—245
Дубяга, Віктар—352
Дубяга, Янка—352
Дубоўскі, Ф.—253, 292
Дунец, Уладзімір —187, 209, 340
Дурчанскі, Фэрдынанд —94
Душнык, Вольтэр—105
Дырксэн, сэн—235
Дэды, Монтана—49, 54
Дэк, Павал—161
Дэрвінскі, кангрс.Эдвард—235

## Е

Евец, А.—190
Езавітаў, К—251,252, 326
Ермаловіч, Мікола— 429

## З

Завалока, Марыя—246
Завістовіч, Р—230
Залескі—12, 14
Заморскі Мікалай—260, 413

Занкавіч, Аўген—254
Занкоф, Аляксандр—94
Запольскі—34
Запруднік Ольга—250
Запруднік, др.Ян—140, 144, 161, 164, 176, 184, 209, 216, 223, 224, 264, 380, 404, 409, 413
Заруцкі, Мікола—424
Зарэцка, Алена —82
Зарэчны, палк. Л.А.—121, 123
Захарка, Васіль—113, 245, 250, 326
Захаркевіч, Васіль—134,149, 261,342, 347, 315
Зеленко, кангрс. Ф.—141
Зенковіч, П—67
Зіняк, (Хмара) Сяргей—138, 228
Зорко, др.Вінко—94
Зуй, Міхась—127, 404, 406
Зубковіч, праф. Э.—216
Зыбайла, Ганна—171, 292, 311
Зыбайла, Пётр—325,372, 397, 398
Зыглінг, ген.—31

## Ж

Жамойда, дырг, Сымон—315, 325, 373, 376, 381, 394
Жук-Грышкевіч, др.В—123, 132,136,137,138, 216, 362, 402, 408
Жук-Грышковіч—др.Раіса—339
Журко—12, 14, 15, 18
Жураўлёў, З.—425
Жытка, Янка—121
Жыхар, Юліян—76

## І

Іванюк, а.Ануфры—368
Ідэн, Антоні—145
Ізяслаў, архіяп.БАПЦ (Бруцкі)—239, 357, 358, 359, 360, 361, 362, 363, 364, 365, 366, 367, 370
Ількевіч—88
Ірвінг, дэн.Айвс М—156
Ітурбі, Альбэрто Я.—100

## К

Кабушка, Уладзімір—175, 352
Кабыш, С.—123, 140
Кабяка, Аўген—340
Кажан, Віталі—140, 153, 159, 161, 184, 224, 404, 409, 410
Кажан, Сяргей—425
Кажура, П.—168, 175, 329
Казлоў, В.—424
Казлоўскі—10
Казлоўскі, Васіль—65,73,76, 80, 82
Казьлякоўскі, Міхась—235, 251, 260, 261
Казьлякоўскі, Ян—216, 245, 261,308, 339, 340, 342,347, 349, 375, 377, 386
Калачынскі, М.—426
Каленік, Міхась—67,102
Каліноўскі, Кастусь—231, 233,330
Калоша, Кастусь —253, 292, 358
Каляда, Клаўдзія—340
Камар, Сымон—65, 71, 80, 102
Канарчук, Іван—253, 292,
Канібано, Мануэль—79
Канстанцін, прат. дыякан—381
Кампэльман, амбас, Мах М.—323
Капітанава, Ірына—5
Каптуровіч, А.—206, 260,
Капэтанакос, Васілёс—283
Каралевіч, П.—247
Каралькевіч, Янка—19
Карась, Леанід—421
Карповіч—190
Карповіч, Алесь—65, 80, 83
Карсэн, капт. Карс—106
Картэр, Джымі, прэз.ЗША—324,

325, 412
Касацкі, капт. П.—22
Касмовіч, палк, Дзімітры—123, 127, 190, 326
Кастро, Фідэль—174
Кастэлё, З.—97
Касьцюк, А.—193, 194
Касьцюк, Мікалай—244
Касьцюкевіч, В.—228
Касяк, інж. Іван —127, 148, 189,190, 213, 229, 236, 238, 248, 311,315,321,374,386,388,391, 392, 393, 396
Катовіч, Уладзімір—75
Кендыш, а.Васіль—140, 183, 184, 224, 346, 351,355, 357,360, 361, 363, 364, 365, 366, 367, 409
Кейзік, Мікалай—65, 76
Керенскі—121
Керно, мгр.Аўген—346
Кіпель, др.Вітаўт—215, 144,145, 170, 294, 300, 312, 321, 322, 326, 394, 395, 396, 397, 409, 413
Кіпель, мгр. Алеся—245
Кіпель, Яўхім—133,189,213, 253
Кірэл, Аксіня—4
Кіслы, К—187, 340
Кіт, праф. Барыс—36
Кітынг, сэн. Кэнэт Б.—162, 171, 181, 204
Клімовіч, інж. Адольф—23
Клімовіч, Уладзімір—96, 97
Клінцэвіч, капт. Даніла—134, 149, 151, 161, 212, 216, 220, 229, 236, 247, 249, 250, 251, 252, 260, 261, 337, 338,340
Клінцэвіч, Поля—346
Кліфордс, Алекс.—220
Клярк, Вільям—145
Когэн, Рычард—360, 363
Кокс, Джэймс А.—155
Кольгров, праф. Кэнэт—155
Конюх, Пётр—51, 54, 139, 141, 216
Корбут, Вольга—331
Колёдро, дон Хозэ—83
Корн, Альфрэд—268
Коршун—7
Коўш, прат. Сьвятаслаў—247, 252, 267, 311, 313, 315, 351, 373, 374, 379, 381, 382, 386, 388, 389, 391, 393, 397, 399
Коч, Эдвард—379, 381
Краўчанка, П.—414
Краўчанка, Усевалад—421
Крапіва, П.—426
Крыванос—249
Крэсла, Янка—260
Крэчэўскі, Пётр —113, 170 264, 265, 409
Кубэ, Вільгельм—22, 45
Кудрэз, П.—80
Кужаль, Р.13
Кузьміцкі, а.Якаў—213, 252
Кулак, А.—102
Кулій, В.—176
Кулік, Д.—102
Куліковіч, камп. М.—187, 402
Кунцэвіч, мгр.Мікалай—155,161, 166,209, 411
Кукабака, М.—428
Кукель, сэн.Томас Ф.—218, 219
Кулакоўскі—365
Куляшоў, А.—426
Куніцкі, Б.—22
Кунінгольм, Б.Е.—171
Куомо, Марыя—379, 381
Купала, Янка—134, 326
Курага-Скарга—421
Курыла, Уладзімір—216, 246, 346, 365, 397, 398, 400
Курыла, Юрка—216
Кухарскі—12, 13,14
Кучура, Міхась —253, 292
Кушаль, ген.Франьціш— 22,128, 130, 140, 158, 192, 207, 223, 224, 226,241, 251, 252, 25, 424
Куэл, Дан.—300
Куэрэль, Віторэ—45,48, 49
Кэлемэры, дон, Г.—84

Кэльлі, К—178
Кэрк, адм.—178
Кэнэды, Джон Ф. прэз.ЗША—191, 192, 203, 204, 211, 213, 227, 245, 247, 257. 289
Кэнэды, Робэрт—206
Кэры, Гюз—206
Кэрстэн, кангрс, Чарлес—132, 133
Кэсэоглю, М.П.—284
Кярапа, Умбэрто—45

## Л

Ладысёў, Уладзімір —425
Лазоўскі, М.—292
Лазорайтіс, І.—55
Лазюк, Мікалай—72
Ланкевіч, Мікалай—65,73, 79, 80, 83, 92, 100, 102
Лапаціна—103
Лапіцкі, мітр. прат. Мікалай—115, 116, 127, 133, 147, 162, 163, 189, 213, 214, 229, 235, 247, 248, 249, 252, 253, 259, 308, 315, 335, 374, 375, 386, 388, 389, 397
Лашук, Аляксандр—51, 425
Левіцкі, М.—172, 181
Ледніцкі, а.А.—79
Леўковіч, Леанід—245,250, 342, 347, 352, 375
Лёмбарді, ген. Эдуардо —63
Лёфтус, Джон—325, 399,400
Лібхабэр—19, 20
Лівач—Валейніцкі, Гэнрык—180, 221
Ліманоўскі, Я.—132, 140, 141
Ліндсэй, Джон—262
Літвінскі Аляксандр—65,73,80, 83,102
Лодж, Кабот—289
Лойка—88
Лойка З.—73
Лоўш, сэн. Фрэнк—188
Лынькоў, М.—326
Лысюк, Аўген—357
Люміс, Гэнры—144, 220
Лютэр—206
Ляйенс, Юджэн—120
Ляндсмір, Хуан—59

## М

Магатма, Ганді—44
Мазура, Каця—274
Мазура, Тодар—421
Мазура, Ю.В. і Т.—30, 33
Мазураў, М.—190
Майко, Лазар—83ё
Макарэвіч, прат.Мікалай—67, 72, 86, 87, 145
Мак Артур, ген. Дуглас—105
Мак Карты, Ю.—187
Мак Кензі—363
Мак Элрой, Марк—188
Макакрыёс, архіяп.—340
Маклін, Дональд—118
Манінг, праф. Клярэнс—180
Манькоўскі Пётр—96, 129, 133,138,140, 346, 349, 355, 357,411
Манядакіс, Канстанцін—94, 95
Масакас, Аляксандр—94
Маскалік, а.—89
Марговіч, А.—163
Маркевіч, Антон—161
Маркоўская, Л.—216
Маркоўскі, др. П.—244, 394, 397, 399, 400
Маркізіё—145
Махноўскі, Аляксандр—123, 129, 141
Махнюк, дыяк. Алег—315, 386
Махровіч, кангрс. Т.М.—141
Мацкевіч, В.—422, 424
Мельяновіч, Васіль—247,300
Мельяновіч, Долёрэс—300
Мельяновіч, Іван— 209
Мельяновіч, Пётр— 250, 261,340, 342, 347, 372, 374,375

Мерляк, Анна—4
Мерляк, Алена—5, 7
Мерляк, Аўген—5
Мерляк, (Бальдо) Барбара—275, 288
Мерляк, Вікторыя—283, 288
Мерляк, Вінцусь —4
Мерляк, Вінцусь Рой—280, 282, 284, 286, 287, 288
Мерляк, (Губэрт) Ганна—105, 263, 331, 385
Мерляк, др.Даніла К.—280, 282, 286, 287, 288, 316, 379
Мерляк, др.Юліян А.—216, 252, 280, 283, 286, 288
Мерляк, Дэна—280, 288
Мерляк, Іван—5, 7, 20
Мерляк, Ільля—4, 5, 7, 20, 274
Мерляк, Марыя—331
Мерляк, Мікалай—5, 26
Мерляк, Несьцер—4
Мерляк, Юры—4.7.53,104
Мерляк, Янка—4
Мешкоўскі—88
Мігай, а. Міхаіл—213
Мікалай,мітр. БАПЦ (Мацукевіч)—137, 337, 340, 346, 347, 357, 358, 359, 360, 361,362, 363, 364, 365, 366, 367, 377
Мікалай, архіяп. Віньніпэскі (Канада)—165
Мінкевіч, др.Мікалай—66, 67, 95, 279
Міpановіч, а.А.—386
Місюль—19, 340
Місюль, В.—133,261
Мітчэль, Джэймс—180, 191
Міхаіл, архіяп. Экзарх—116,163
Міхайлеску, Тутус—94
Міхалюк—187
Міцкевіч, Аляксандр—161, 241, 245, 250, 265, 326,338, 341, 346, 361
Міцкевіч, Міхась—158,164
Мойніган, сэн. Данель—381
Мойсік, Янка—285
Молатаў, В.—19, 417
Монгі, Слім—215
Моравска—10
Морандэ, атташэ Люіс—96
Морысей, Джон—143
Мсьціслаў, мітр. УАПЦ—361
Мусаліні, Бэніто—37,44
Муроў, Эдварт—206
Муха, Іван—260
Мугавэры, біскуп Франьціш—379
Мысьлівец, Т.—21
Мэйштовіч, пралат.—55
Мядзейка, Нікандра—127, 253, 404, 406
Міхайлаў, ген.—420

## Н

Набагез, др. Уладзімір—174, 224, 228, 250, 260, 409
Навіцкі—141
Найдзюк, Часлаў—326
Накашыдзэ, др. Грыгоры— 221, 222
Напалеон—3, 53
Неслухоўская, Н.—352
Несьцеровіч (Нестар),Аўген—211, 247, 250, 260, 409
Нікас, Джон—379
Ніксон, Рычард М.прэз. ЗША—155, 166, 191, 289, 294, 323, 373
Ніхаёнак, Янка—150, 164, 209, 245, 265, 338
Новік, К.—213
Новік—Пяюн, Сяргей—424
Нора—Нэй—14
Норык, М.—22
Норкус, Канстанцін—94
Нядзелька—88
Нядзелька,Н.—71,73

## О


Обэрман, Г.—58
О'Браен, Джэймс—217, 221, 247
Ожынскас, дон Ф.—84
О'Кіф, ігумен а.Рыгоры—377,379, 381
Олінс, др.Р.—94
Онысько, М.—102
Орвід, праф.—195
Орса, др.Аляксандр—22, 105, 114, 126, 128, 129, 130, 352
Орса, Галіна—152, 1647, 211
Орса, Наталія—212
О'Рурке, граф.—3
Орэст, архіяп. УАПЦ—361
Осіндэ, дон Хорхэ М.—83, 94
Осінскі, Язэп —36, 67
Отлоўскі, Г.—259


## П


Падзява, а.Альфонс—89
Падлазьнік, ген.—251, 252
Падліпскі, В.— 21
Пазьняк, Язэп—161, 165, 279
Паланевіч, Іпаліт—105
Палюховіч, Міхась—311
Палядій, япіскап УАПЦ—342
Панамарэнка—419
Пануцевіч, В.—144, 402
Панько, М.—21
Панькоў, Мікалай—83, 141, 187, 215, 260
Пантос, монсінёр Фотас—87
Панцельман, мітр.БАПЦ—114, 115, 147
Панцелейман, япіскап, РЗЦ—72, 87
Панчанка, П.—426, 427
Папа Павал Ян II—286
Папа, Ян XXIII—183, 227
Пархоменка, В.—332
Пасьлядовіч, Макар— 192, 425
Патон, ген, Джордж—109,177
Патэрсон, П.Р.—134, 135
Паўлоўскі, Антон—88
Пачос, Стэфан—11
Пашкевіч, П.—138, 322
Пекарсеі, а.—21, 365
Пелеса, Уладзімір—149, 229, 244, 246, 247, 25, 312, 394, 395
Перацкі—21
Петраш, Лявон—73, 83, 84
Петрык, П.—476
Петрыковіч, др.С.М.—84
Пецько, Пётр—372
Пірута, а.Якуб—392, 393
Пітушка, Я.—267
Платон, япіскап, УАПЦ—115
Плескачэўскі, Анатоль—247, 292, 311
Пляскач, мгр. Васіль—21, 167, 188, 211, 253, 292, 401, 402
Плюм, Вільям—315
Попко, М.—406
Прокша, Леанід—424, 429, 430
Пронін, ген,—193
Прохала (Кіт) Уладыслаў—94
Протас, Аўген—164,253, 260, 261, 292, 340, 342, 349, 409
Прыходзька, др. Е.—173
Пунтус, В.—213
Пэнда, М.—340
Пэрон, ген. Хуан Д. прэз. Аргентыны—62, 63, 74, 76,79, 84, 95, 97,160
Пэрон, Эва Дуатрэ дэ—62, 76, 77, 78, 96, 98
Пэтронельлі—42
Пэч—99
Пятроўскі, Юліян —8, 53
Пятроўскі, др. пастыр. Ян —257


## Р


Рагалевіч, Сяргей—397, 398
Рагуля, Васіль—131
Рагуля, др.Барыс—20 ,28, 30, 31, 32, 33, 89, 96, 193, 228, 321, 322,

358, 402, 403, 424, 429
Рагуля, Ліда—216
Рагуля, Міхась—21,141,149
Радзюк, В.—340
Раданковіч, а.—365
Ражко—Ружыцкі—424
Разанаў, Георгій Ф.—90
Раковіч, Янка—300, 326, 340
Ракфелер, Нэльсон А.—207, 211, 213, 221, 268
Ракфелер, Джон Ф.—424
Раманава, Вольга—44, 45
Раманоўскі, Васіль—416, 417, 424, 429
Рамук, др. Вітаўт—326
Раск, Дын—257
Рашыд, др.—222
Робінсон—357
Родзька, Г. —21,
Родзька, Георгій Ф.—90
Родзька, Філарэт—22, 164. 409
Ротман А. А. —143
Рубінэц, др.Міхэль А.—75,79, 84
Рудзінскі, Лявон—244
Рузвельт, Франклін Д.—прэз. ЗША—46, 109
Русак, Васіль—128, 216, 352,357
Русак, інж. А.—113, 127
Русак, П.—22
Русак, Уладзімір —134, 149, 152, 163, 164, 261,361, 409
Руссо, праф.—58
Рыбэнтроп—417
Рыдлеўскі, інж. Лявон—54
Рыжы—Рыскі, монс.У.—127, 187, 188
Рымко, Юліян—315
Рыч, Вера—325
Рычардсон, Джон —191,206, 424
Рыхлін —15
Рэйбурн, кангр. Сэм—141
Рэйган, Рональд, прэз.ЗША—300, 325, 379, 381, 412
Рэурс, Джон—273

## С

Сабалеўскі, Юры—113,127
Савёнак, Л.—123, 141, 260
Сагайдаківскій, а.Віталій—162, 335
Сажыч, др.Язэп—21,22, 229, 239, 241, 252, 253, 321, 322, 359, 361, 375, 402, 403
Сакалоў—430
Сакалоўская—82
Салавей, а.—83
Саланевіч—72
Сан Мартын, ген.—69
Сантангэлё, кангс.А.—139,141
Сантыні, др.Джордж—96
Саржэнт, Гоўленд—141,226,209, 239, 241, 252, 253
Саўчыц, Пётр—66, 87, 127, 190, 342, 374, 376, 377, 404
Сачанка, Барыс—429
Сачанка, Іван—425, 427
Сегень, а.—391
Семянчук, В.—239
Сенька, Міхась—229, 270, 326, 386, 388, 397
Сергій, архіяп.БАПЦ (Охотэнько)—115, 163, 165, 334, 335,337, 355, 357
Сіповіч, біскуп Чэслаў—50, 51, 54, 89, 123, 144, 183, 189, 213, 228, 277
Сітнік, а.Аляксей—358
Сітнікаў, Аляксандр—195, 197
Сітнікаў, Васіль Р. —196
Скіпра—88
Складоўскі—138
Слёзак, падп. —145, 148
Слёсканс, біскуп Балеслаў—89,128
Смаршчок, а.—337, 365
Смірноў—90
Сосік, Іван—6, 7, 20
Сосік, (Мерляк) Алена—6, 20, 282

Сосік, Сымон—7
Сосік, Уладзімір—20
Сотір, Джордж—284
Сотырос, Міхаіл—379
Спаліч (Амор), Віктар—104, 193
Спэльман, кардынал Франьціш —207
Стагановіч, Аляксандр —140, 159, 175, 203, 216, 224, 334, 337, 351, 409
Сталін, І.В.—сакр. ЦК КПБ СССР—17, 20, 64, 68, 109, 112, 196, 417, 418, 429
Станкевіч—88
Станкевіч Вячаслаў—158, 209, 221, 400
Станкевіч, др.Станіслаў (СТ)—948, 99, 123, 163, 188, 212, 224, 228, 239, 241, 243, 245, 246, 248, 249, 251, 260, 261, 270, 407, 408, 424, 289, 307, 315, 316, 350, 400, 401, 406
Станкевіч, др. Янка—11, 122, 129, 131, 140, 158, 159, 164, 165, 176, 187, 250, 251, 270
Станкевіч, Зіна—249, 250
Станкевіч, Марыя—210
Станкевіч, Раіса—300
Станкевіч, Юрка—135, 152, 161, 215, 244, 245, 246, 250, 259, 260, 394, 395
Станковіч, а.—22
Стар, а.Карп—357, 360, 361, 364, 365
Старк, а.—143
Старэнбэрг, Эрнст—94
Сташкевіч, Мікалай—425
Стома, Ніна—167,210, 211
Сторм, Гэрыт—124
Стоядынов, Мілан—94
Страпко, а.—365
Стратан, кангрс. Самуэль—424
Строк, архіманд. Язэп—377,381, 385, 386
Стрэчын, а.—187
Самуэль—206, 217, 220
Студніцкі, праф.Уладыслаў—52
Стук, А.—423, 425
Стукаліч, (Віцьбіч), Ю.—114
Стывэнс, адм.—99,121
Сыч, П.—193
Сьлівінскі, інж. С.—79, 84
Сьвірковіч—88
Сьпічонак, В.—187
Сэрафіні—42
Сянкевіч, А.—190
Сянкевіч, В.—153
Сянкевіч, Г.—55

## Т

Танк, Максім—426, 429
Тарасевіч, др. А.Ул.—166
Татарыновіч, пралат Пётр—51,55, 89, 144, 213
Таўлай, Валянтын—425
Таўмасьян—163
Таўпейка, а.Максім—358, 359, 365, 374,
Ткачоў, Міхась—426, 429
Томас (Тамашчык), Міхаіл—355
Топтані, др.Мубарак—94
Траўб—23
Трубецкой, Андрэй—73
Тругве, Ліе—73
Трумен, Гары, прэз. ЗША—110
Трусевіч, др. Лявон—279
Трухан, Чэслаў—30, 432
Трэцякоў, М.—340
Тсянг, др.Гангфу Ф.—143
Тулейка, мгр, Міхаіл—12
Тулейка, Міхась—96, 125, 130, 131, 133, 134, 135, 137, 140, 141, 147,149, 150, 152, 154, 161, 164, 166, 212, 241, 245, 249, 265, 409, 337, 340, 341, 355, 397
Тумаш, др. Вітаўт—126, 127, 128, 129, 132, 133, 136, 140, 147, 152, 161, 173, 183, 184, 212, 215, 216, 223, 239, 402, 408, 409, 410,

412
Тумаш Ксенія—198
Тур, Віктар—326
Туронак, Зіна—331
Тэльмашэўскі—95
Тэодосій, мітр,Амэрыканскай П.Ц.—380
Тэрпак, М.—137
Тэсайрэ, дон Альбэрто—100

## У

Уладзімір, архіяп. (Фінкоўскі)—165, 189, 162, 213, 214
Урбан, П—163

## Ф

Файзі, др.—171
Фамін, інж. Фока—78, 80, 102, 103
Фамін, Ніна—71
Фамін, Уладзімір—71
Фалько—191
Фарына—88
Філарэт, мітрп. Р.З.П.Ц.—389
Філафэй, япіскап БПЦ—196
Філістовіч—193
Філіпаў, інж.—100
Філотэос, япіскап—Гр.П.Ц.—374
Фільбі (Кім)—Гарольд, А.П.—118, 119, 176
Фінкельштэйн—357
Фотіос, япіскап Гр.П.Ц.—347
Форд, Геральд, прэз.ЗША—323, 324
Форд, кангр.Д—141
Фурт—191
Фейган, кангр .Міхаэль А.—141, 188
Фэйдэн—345, 346
Фэлпс,Ф.—206

## Х

Ханяўка, Марыя—397
Ханяўка, Чэслаў—216, 239
Хмелеўска, (Бітус) Ніна—38
Хомэні, Антола—324
Хроль—88
Хроль, Соня—73
Хрушчоў, Н.С.—172, 173, 177, 186, 197, 234, 258, 262, 269, 425
Хрэптовіч, граф Міхаіл—21

## Ц

Цанава—417
Целеш, М.128, 141
Цехановіч Антон—5
Цехановіч, Аўген—9, 12, 21, 25, 30
Цехановіч, Вольга—5
Цімашэнка, маршал С.—193
Ціто, прэз. Югаславіі—68
Цьвікевіч, Аляксандр—326
Цьвірка, Ул.—163
Цярпіцкі, Віталі—404, 406
Цяўлоўскі, Эміль—102

## Ч

Чарняўскі, кс.Франьцішак, —54, 89, 144, 158, 198, 240
Чарапук, Змагар—125
Чарненка, Канстанцін—325
Чэрчыль, Вінстон—46, 109, 110
Чэнг-ган-Кім—206

## Ш

Шабовіч, Фаня—131
Шаляпін—139
Шамяціла, а.Усевалод—325, 377, 381, 391
Шаманскі, Фрэнк—349
Шамякін, І—426, 429

Шархоўскі, Я.—426
Шастак, Аляксандр—253, 292
Шастак, мгр.Уладзімір—67
Шах, Рэза Палеві—324
Шольтэ, др.—277
Шумскі—24
Шукелайц, Антон—135, 139,140, 159, 164, 166, 170, 173, 176, 184, 194, 195, 209, 215, 216, 224, 229, 239, 249, 250, 270, 321, 322, 404, 409, 413
Шчорс, Барыс—229
Шчорс, Ігар—190
Шчорс, др.Мікалай—32, 113, 126, 127, 133, 147, 148, 165, 2187
Шырма Лена—24, 425
Шырма Рыгор—24
Шыбут, Т.—114
Шчэцька, Васіль—167, 211, 215, 241, 245, 247, 249, 250, 251, 260, 261, 315, 317, 319, 325, 331, 332, 342, 346, 347, 349, 375, 409
Шэйман, Люіс—398, 399
Шэлок, Джон—94
Шміт, мгр.—206

## Э

Эгрэт, Міхаель—399

## Ю

Юзэфовіч, Генрык—51, 71, 97, 98
Юрцевіч, Васіль —149, 244, 245, 246, 250, 261, 312, 340, 341, 342, 344, 347, 372, 375, 394, 395
Юрцэвіч, Кацярына—346
Юрцэвіч, Крыстына—292
Юрцэвіч, Міхаіл—245
Юхнавец, Янка—260, 342

## Я

Яблонскі, Пётр—51, 98
Якавас, архіяп. Экзарх—373, 375, 381, 382, 386, 388
Якуцэвіч, П.—22
Яновіч, Я.—338, 341
Яноўскі, а.Аляксандр—358, 359, 360, 365
Ярмачэнка, др. Іван—22
Ярэма, мгр.Стэфан—221
Ясюк, Эмзнуіл—253,270,292
Яшчук, В.—194

# Pakazalnik imionau
(lacinkaju)

A

Ackerman, congrsm, Harry 309
Adams, Sherman 155
Addabo congrsm, Joseph 379
Adonizio, congrsm, Hugh, J.141
Agnew, Spiro T. 294
Alexander, fieldmarshall 41
Anders, gen, Wladyslaw 38,51,54,87,102,104
Anfuso, congrsm, Victor L.200
Aramburu, gen.Pedro 63
Arciszewski, Miroslaw 94
Armstrong, congrsm, O.K. 155

B

Barbour 171
Battista, prez.Cuba Fulgencio 174
Beck, Josef 10, 94
Benzon, Branko 94
Berry, John 380
Bird, prof, Thomas 379, 381
Bitte, M. 94
Blair, Hunter 161
Bobric, Arno 94
Boer, T. de 58
Boeren, Jan 259, 277
Brown, dr.Harris Frederic 155, 235
Bush, prez. USA George 300
Burch, Dean 253
Burges, Guy 118
Burn, John180, 206, 424
Burnham, James 119

C

Canibano, Manuel 79
Castello, Z. 97
Castro, prez. Cuba Fidel 174
Caney, gov.Hugh A. 217
Carter, prez. USA Jimmi 324, 325, 412
Chiarroveappa, Umberto 45
Chugrchill, Winston 46,109, 110
Colgrove, prof. Kenneth 155
Cohen, RIshard 360, 363
Colodro, don Jose A 83
Cox, Joseph 155
Clark, William 145
Cliffords, Alex 220
Cuomo, gov. Mario 379, 381

D

Dalles, John Foster 145
Dalley, John 155
Dalton, Wilfred 296
D'amato, senator Alfons 379, 381
Daukantas gen, Teodor 79, 94
Deak, Paul 161
Dedi Montana 49, 54
Derwinski, congrsm Edward, J. 235
Dirksen, senator 235
Docheff, I. 315
Dobriansky, dr. Lev E. 133
Doll, senator Bob 381
Dorn, congrsm. Francis 134, 141, 143, 150, 151, 152, 155, 158, 163, 171, 180
Downing, Robert 195
Dushnyk, Walter 105
Durchansky, F. 94

E

Eden, Anthony 145
Eisenhower, prez. USA Dwight D. 110, 145,
Ehret, Michael 399

F

Falco 191
Feighan, congrsm, Michael, A. 141, 188
Feiden 345, 346
Finkelstein 357
Flood, congrsm, Daniel, J. 206, 235
Ford, congrsm, D. 141
Ford, prez. USA Gerald 323, 324
Furt 191

G

Gabriele, Franciscano 44
Gawlina, biskup 51
Geislerowna, Maryja 7
Germanos, metropolitan of Hierapolis 311, 373
Giesling 44
Golstein, mgr. L. 398, 399
Golstein, K. 399
Goldberg 206
Goldwater, Barry 253, 255, 257, 289,423
Gomez, Nelie 71
Grimes, James, F. 346, 398, 399
Guderiaan, van Nievelt 103
Gurge 124

H

Harriman, Averel 162
Halpern, congrsm, Samuel 259, 264
Healy, Thomas 279
Herman, Eb 199, 220
Herter, Christian 171, 181
Hitler, Adolf 23, 35, 112, 417, 418, 425
Hoover, John Edgar 206, 424
Humphry, Hubert, H. 254

J

Johnson, prez. USA Lyndon B. 192, 204, 211, 217, 235, 257, 262, 289,
Javits, senator Jakob, K. 204

K

Kapetanakos, Vsiolios 283
Karsen, kapt. Kars 103
Kampelman, amb. Max M. 323
Keating, senator Kenneth B. 162, 171, 181,203, 204, 211, 213, 227, 245, 247, 257, 289
Kelemery, don H. 84
Kelly, K. 178
Kennedy, prez. USA John F. 191, 192, 203
Kennedy, Robert 206
Kerster, conrsm, Charles
Keusseoglou, M.P.
Kerno, Eugene 346
Korn, Alfred 268, 292
Khomeni, Ayatola 324
Kieinfield, Phillips, M. 346
Kirk, adm. 121
Koch, Edward 379, 381
Kube, Wilhelm 22, 45
Kucharski, Mieczyslaw 12,13, 14
Kuchel, senator Thomas, F. 218, 219
Kunninholm, B.E. 171

I

Iturbi, Alberto, J. 100
Irving, senator Ives 156

L

Landsmmer, Juan 59
Lazoraitis, I 65
Laushe, senator Frank 188
Ledniski, ks. A. 79
Ledsmmer, Juan 59
Liwacz-Walejnicki, Henryk 180. 221
Libchaber 19, 20
Lindsey. John 262
Lodge, Cabot 289
Loftus, John 325, 399, 400
lombard, gen, Eduardo 63
Lumis, Henry 144, 220
Lyons, Eugene 120

M

Mac Arthur, gen. 105
Mac Carty, E. 187
Mac Elroy 188
Machrowich, congrsm A. 141
Mac Lean, Donald 118
Mac Kenzi, 363
Mahatma, Gandi
Maniadakis, Konstantin 94, 95
Marchizio 145
Manning, prof. Clarence 180
Massakis, Alexander 94
Meysztowich, pralat 55
Michajlescu, Tytys 94
Mitchell, James 180. 191
Moynihan, senator Daniel 381
Morand don Louise 97
Morrisey, John 143
Muussolini, Benito 37, 44
Murrow Edward 206

N

Napoleon 3, 53
Nikas, John 379
Nixon, prez, USA Richard, M. 155, 166, 191, 289, 294, 323,373
Nora - Nei 14
Norkus, Constantine 94

O

Oberman, H. 58
O'Bryan, James, I 217, 221, 247
O'Keefe, Igumen Gregory 377, 379, 381
Olins, dr. R.94
O'Rourke, graf. 3
Orwid, prof. 195
Osinde, don Jorge. M. 83, 94
Ozynskas, don, F. 84

P

Paczos, Stefan 11
Patch 99
Patterson, P.R. 134, 135
Patton, gen. George 109, 177
Peron, gen. Juan, D. 62, 63, 68, 74, 76, 79, 84, 95, 97, 98, 160
Peron, Eva Duarte de 62, 76, 77, 78, 96, 98
Petronelli 42
Philby (Kim) Harold, A.R.118, 119, 176
Pherps, amb. F.206
Plum, William 315
Prchala, dr. Wladyslaw 94

Q

Querell, Vittore 45, 48, 49
Quayklem, vice prez. USA Dan 300

R

Rayburn, senator Sam 141
Reagan, prez. USA Ronald 300, 325, 379, 381, 412
Reed 206
Reurs, John 273
Ribentrop 417
Rich, Vera 325
Richardson, John 191, 296, 424
Rockefeller, Nelson, A. 207, 211, 213, 221, 268, 424
Robinson 357
Roosevelt, prez USA Franklin, D. 46, 109
Rotman, A. 143
Rusk, Dean 257
Russo, prof. 58

S

San, Martin, gen. 69
Santini, dr. Georges 96
Santangelo, congrsm. A. 139, 141
Shamansky, Frank 349
Schmidt, dr. 37, 38
Schmit 206
Scholte, dr.227
Seargeant, Howland 141, 226, 257
Serafini, 42
Shah Riza Pahlevi N, 324
Shamansky, Frank 349
Sheiman Ioise B. 398, 399
Shelloch, John 94
Slezak, plk 145, 146
Sliwinskiu, inz. S. 79, 84
Sotir, George 284
Sotiros, Michael 379
Starenberg, Ernst 94
Stark, A 143
Storm, Gerrit 124
Studnicki, prof. Wladyslaw 52
Stevens, adm. 99, 121
Spelman, cardinal Francis 207
Stratton, congrs. Samuel 206, 217, 220, 474

T

Tesaire, don Alberto 100
Tingfu, dr. Tsiang. F. 143
Toptani, dr. Mubarak 94
Traub, 23
Truman, prez. USA Harry S. 110
Trugvie, Lie 73

V

Van der Vorm 277
Van Tol, Arie 277
Valentine, A. 273
Vauli, insp. Louise 85
Van Kauvelaart de Uils, a. Robert 165
Ventholt, 124
Vrancyc, 45

W

Wagner, Robert, G. 134, 136, 165, 162, 207, 211, 213, 217, 221, 227, 247
Walter, congrsm, Francis, E. 173
Wenzel 21

Wheeler, 45
Willey, senatorAlexander 205
Willis, dr. 45
Wisner, Frank, F. 117, 176, 177
Willams, senator  H.A. 315
Wolf, 37
Wolfmeir, 23
Wronski- Carachi, conte Alessan-
dro 45, 49, 51, 54

Z

Zaleski, Witold 12,14
Zankof, Alexander 94
Zelenko, congrsm. F. 141
Zigling, gen 31
Zorko, dr. Vinko 94

# Зьмест

Прадмова. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . УІІ
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 473

## *Частка першая*

Паходжаньне-Мясцовасьць. . . . . . . . . . . . . . . . 3
Школа ў Кушалеве. . . . . . . . . . . . . . . . 9
Школа ў Налэнчове. . . . . . . . . . . . . . . . 10
У міжчасе. . . . . . . . . . . . . . . . 12
Савецкая акупацыя. . . . . . . . . . . . . . . . 14
Нямецкая акупацыя. . . . . . . . . . . . . . . . 20
Вялікая астатняя выправа эскадрону. . . . . . . . 27
Варшава. . . . . . . . . . . . . . . . 32
Дальвіц. . . . . . . . . . . . . . . . 33
Кэнігсбэрг . . . . . . . . . . . . . . . . 34
Бэрлін. . . . . . . . . . . . . . . . 34
Вена. . . . . . . . . . . . . . . . 35
Вэрона . . . . . . . . . . . . . . . . 37
Конрад Мацкевіч. . . . . . . . . . . . . . . . 38
Італія . . . . . . . . . . . . . . . . 39
Internee Camp "R" Лягер Інтэрнаваных. . . . . . . . 43
Рым. . . . . . . . . . . . . . . . 51
Буэнос Айрэс. . . . . . . . . . . . . . . . 56
Беларусы ў Аргентыне . . . . . . . . . . . . . . . . 62
II. . . . . . . . . . . . . . . . 64
III. . . . . . . . . . . . . . . . 68
ІУ. "Ano del Libertador general San Martin 1950"
(Год вызвольніка генэрала сан Мартына 1950). . . . . . . . 69
У. . . . . . . . . . . . . . . . 75
УІ. . . . . . . . . . . . . . . . 78
Спроба арганізацыі рэлігійнага жыцьця ў Аргентыне. . . . . . . . 86
Савецкая дзейнасьць у Аргентыне. . . . . . . . 90
Прадстаўніцтва Ўраду БНР у Аргентыне. . . . . . . . 92
Пасьляслоўе. . . . . . . . . . . . . . . . 102
Падарожжа ў Амэрыку. . . . . . . . . . . . . . . . 103

## *Частка другая*

Падзеі пасьля заканчэньня вайны. . . . . . . . 108
Беларусы выяўляюцца. . . . . . . . . . . . . . . . 110
Фарміраваньне палітычнае думкі. . . . . . . . 112
Рэлігійныя падзеі (1941-1950 гг.). . . . . . . . 114
Сапраўдная сутнасьць падзелу. . . . . . . . 117
Амэрыканскі камітэт вызваленьня. . . . . . . . 119

Новыя пачынаньні ў Амэрыцы . . . 124
1955 . . . 130
1956 . . . 134
1957 . . . 141
Справа набыцьця БНД і царквы . . . 148
1958 . . . 152
1959 . . . 165
Тыдзень Паняволеных народаў . . . 169
1960 . . . 174
Ненапісаная кніга . . . 192
Спроба заманіць Мерляка на Радзіму . . . 194
1961 . . . 198
1962 . . . 217
1963 . . . 229
1964 . . . 246
1965 . . . 258
1966 . . . 263

## *Частка трэцяя*

Кастусь Мерляк сам пра сябе . . . 272
Рэспубліканская дзейнасьць у Амэрыцы . . . 289
Беларуска-Амэрыканскае Аб'еднаньне ў Нью Ёрку . . . 307
Гісторыя БАПЦ у Амэрыцы . . . 333
Працяг падзей . . . 336
Дзейнасьць БАПЦ у Амэрыцы . . . 354
Прыход сьв.Кірылы Тураўскага ў Рычмонд Гіл . . . 372
Лёс архімандрыта Язэпа . . . 385
Епархія без беларускага япіскапа . . . 386
Беларускі цэнтр адпачынку Бэлэр-Менск . . . 394
Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне ў Амэрыцы . . . 400
Рада Беларускай Народнай Рэспублікі . . . 402
Беларуская Цэнтральная Рада . . . 404
Незакончаная гісторыя фундацыя імя Крэчэўскага . . . 409

## *Частка чацьвёртая*

Хто каго мае судзіць? . . . 416
А дзе-ж яны былі? . . . 425
Перастройка . . . 428

*Дадаткі*

Асьвета Кастуся Мерляка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 432
Вайсковая служба Кастуся Мерляка . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 433
Праца й службовыя пасады Кастуся Мерляка . . . . . . . . . . . 433
Грамадзкая дзейнасьць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 436
Удзел у друку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 440
Іншанацыянальная прэса . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 446
Ліста беларускіх арганізацыяў, якія тварылі Фэдэрацыю
Беларускіх арганізацыяў у Аргентыне ў 1949 г. . . . . . . . . . . . 450
Імянны паказальнік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 454
Pakazalnik imionau (lacinkaju) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 468
Зьмест . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 472



Дзейнасьць Кастуся Мерляка